ПАМЯТЬ

ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ ХРОНІКІ ГАРАДОЎ І РАЁНАЎ БЕЛАРУСІ

ШМАТТОМНАЕ ВЫДАННЕ СТВАРАЕЦЦА ПАВОДЛЕ РАШЭННЯ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ЛАСІПОВІЦКІ РАЁН

МІНСК
БЕЛТА
2002

УДК 947.6
ББК 63.3 (4 Беи)
П 15

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

Г.К.КІСЯЛЁЎ (галоўны рэдактар выдавецкага цэнтра БЕЛТА),
П.С.КАЧАНОВІЧ, Б.В.УЛЬЯНКА, М.П.ХОБАТАЎ, В.У.ХУРСІК, В.У.ШЧЭЦЬКА

РАЁННАЯ КАМІСІЯ ПА СТВАРЭННІ
ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ХРОНІКІ:

В.У.ШЧЭЦЬКА (старшыня райвыканкома — старшыня камісіі),
А.У.ТАМАШЭЎСКІ (намеснік старшыні камісіі), П.С.КАЧАНОВІЧ (сакратар камісіі), У.П.ЗОРЫН,
Ю.В.КЛЕВАНЕЦ, В.А.КУЛАКОЎ, Дз.В.САЎРЫЦКІ, С.А.СЕМЯНЦОЎ, І.А.ТОЎСЦІК, У.І.ШАЎЧЭНКА

АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ ЦЭНТР
ПА ВЫДАННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ ХРОНІК ПАМЯЦІ
МІНІСТЭРСТВА ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ:

Б.В.УЛЬЯНКА (кіраўнік цэнтра), У.І.ЛЕМЯШОНАК (галоўны рэдактар),
М.З.БАШЛАКОЎ (галоўны метадыст), Р.А.ЧАРНАГЛАЗАВА (рэдактар)

Укладальнікі:
П.С.КАЧАНОВІЧ, В.У.ХУРСІК

Мастак
Э.Э.ЖАКЕВІЧ

Распрацоўка мастацка-тэхнічнага афармлення серыі В.А.РАГАЛЕВІЧА

ISBN 985-6302-36-6

© БЕЛТА, 2002

Уезд у Асіповічы.

9 — 5-е тысячагоддзі да н.э.	Адбывалася засяленне тэрыторыі раёна чалавекам.
Канец 3 — 2-е тыс. да н.э	У час бронзавага веку на асіповіцкай зямлі жылі плямёны сярэднедняпроўскай культуры.
Не пазней за III стагоддзе да н.э.	На тэрыторыі сучаснай Асіповіччыны ўзніклі першыя ўмацаваныя паселішчы — гарадзішчы.
Канец 1— пачатак 2-га тысячагоддзя.	Цэнтральную Беларусь, у тым ліку тэрыторыю сучаснага Асіповіцкага раёна, пачынаюць засяляць славянскія плямёны.

Чыгуначны вакзал у Асіповічах.

XII — сярэдзіна XIV стагоддзя.	На тэрыторыі Асіповіччыны існавала самастойнае Свіслацкае княства.
Сярэдзіна XIV стагоддзя.	Асіповіччына ўвайшла ў склад Вялікага княства Літоўскага.
1506 г.	Паселішча Свіслач спалена крымскімі татарамі.
2 ліпеня 1655 г.	Свіслацкі замак узяты штурмам і спалены казакамі ў ходзе вайны Расіі з Рэччу Паспалітай.

На цэнтральнай плошчы горада.

1793 г.	Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай тэрыторыя Асіповіцкага раёна ўключана ў склад Расійскай імперыі: паўночная частка ў Ігуменскі, паўднёвая — у Бабруйскі паветы Мінскай губерні.
1872 г.	За 2 км ад Асіповіч заснавана чыгуначная станцыя з той жа назвай.
1876 г.	Пушчана ў эксплуатацыю станцыя Асіповічы Лібава-Роменскай чыгункі.
1880-я — 1-я палова 1890-х гадоў.	У Асіповічах пабудаваны 2 лесапільныя заводы, млын, адкрыта паштовае аддзяленне.



Помнік на брацкай магіле партызан, загінуўшых у барацьбе з польскімі інтэрвентамі ў 1918—1920 гг.

1895 г.	У в. Вяззе ў 3-гадовым узросце некалькі месяцаў жыў разам з маці будучы беларускі паэт М.Багдановіч.
1897 г.	Паводле перапісу на месцы сучаснага горада існавалі 3 паселішчы з назвай Асіповічы: вёска (526 жыхароў), станцыя (каля 100 жыхароў) і пасёлак (каля 200 жыхароў), якія пазней зліліся.
1900 г.	У Асіповічах пабудаваны шпалапрапітны завод.
	Пабудаваны лесапільны завод «Ялізава», вакол якога пачаў складвацца аднайменны пасёлак.

Мемарыяльны комплекс ахвярам фашызму, савецкім воінам і партызанам у в. Брыцалавічы.

1905 г.	Заснаваны лесапільны завод у Градзянцы.
17 сакавіка 1908 г.	Рабочыя шпалапрапітнага завода правялі эканамічную стачку.
1909 г.	Пачаў працаваць тэлеграф.
1912 г.	У Ялізаве пабудаваны шклозавод.
1917 г.	У Асіповічах каля 4,2 тыс. жыхароў.

Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў, партызан і ахвяр фашызму ў г. Асіповічы (вул. Сумчанкі).

Май — лістапад 1918 г.	Тэрыторыя раёна акупіравана германскімі войскамі.
Жнівень 1919 г. — ліпень 1920 г.	Асіповіччына акупіравана польскімі войскамі.
17 ліпеня 1924 г.	Утвораны Асіповіцкі раён.
1930 г.	Арганізаваны Асіповіцкі леспрамгас.

Народны хор ветэранаў вайны і працы Асіповіцкага раённага цэнтра культуры.

1931 г.	Пасля здачы ў эксплуатацыю чыгуначнай лініі Рослаўль — Магілёў — Асіповічы адбылося значнае пашырэнне станцыі і чыгуначнага вузла Асіповічы.
	Пачала выходзіць раённая газета «Калгасная праўда» (пазней называлася «Калгасная праца», з 1965 г. «Запаветы Леніна», з 2001 г. «Асіповіцкі край»).
15 ліпеня 1935 г.	Асіповічы сталі горадам.
30 чэрвеня 1941 г.	Нямецка-фашысцкія захопнікі акупіравалі Асіповічы.

Свята-Увядзенская царква ў Асіповічах.

Ліпень 1941 г. — чэрвень 1944 г.	У г. Асіповічы і раёне дзейнічала патрыятычнае падполле.
Ліпень 1943 г.	Створана Асіповіцкая ваенна-аператыўная група на базе 1-й Асіповіцкай партызанскай брыгады.
28 чэрвеня 1944 г.	Асіповічы вызвалены ад гітлераўцаў войскамі 1-га Беларускага фронту.
20 верасня 1944 г.	Асіповіцкі раён увайшоў у Бабруйскую вобласць.

У Асіповіцкім гарадскім Доме абрадаў.

1951 г.	Усе прадпрыемствы Асіповіч дасягнулі даваеннага ўзроўню па выпуску валавой прадукцыі.
	Пры раённым Доме культуры створаны цымбальны аркестр. У 1965 г. атрымаў званне народнага.
1952 г.	Пабудаваны кінатэатр «Радзіма».
	Адкрылася раённая дзіцячая бібліятэка.
1953 г.	На р. Свіслач пабудаваны Асіповіцкае вадасховішча і Асіповіцкая ГЭС.
	Уступіў у строй хлебазавод.
8 студзеня 1954 г.	Асіповіцкі раён увайшоў у склад Магілёўскай вобласці.

Фрагмент экспазіцыі «Наша мінулае» ў краязнаўчым музеі Дараганаўскай сярэдняй школы.

1956 г.	У Асіповічах адкрыта музычная школа.
1959 г.	У Асіповічах 15,8 тысяч жыхароў.
1961 г.	Дзіцячы дом у Дараганаве пераўтвораны ў школу-інтэрнат.
7 сакавіка 1963 г.	Асіповічы сталі горадам абласнога падпарадкавання.
1967 г.	Пачаўся рух цеплавозаў на асіповіцкім участку чыгункі.
	Завершана электрыфікацыя ўсіх населеных пунктаў раёна.
	Закончаны мантаж аўтаматычнай тэлефоннай станцыі ва ўсіх аддзяленнях сувязі раёна.

Народны
культуры.

Народны фальклорны ансамбль «Вечарынка» Ялізаўскага сельскага Дома культуры.

Пачатак 1970-х гадоў.	У раёне 20 пачатковых, 15 васьмігадовых і 16 сярэдніх школ.
Снежань 1975 г.	Здадзены ў эксплуатацыю доследна-прамысловы комплекс па прасаванні сфагнавага торфу на торфапрадпрыемстве «Татарка» — першае прадпрыемства такога роду ў рэспубліцы.
1983 г.	У Асіповічах адкрыта стаматалагічная паліклініка.
Красавік 1983 г.	У Асіповічах адбыўся першы штогадовы спартыўны марафон, які ў 1995 г. атрымаў статус міжнароднага.

Асіповіцкае вадасховішча і будынак ГЭС.

31 снежня 1986 г.	Уведзены ў эксплуатацыю завод камунальнага машынабудавання.
1987 г.	Асіповіцкі раён стаў адным з пераможцаў па выніках года ў сацыялістычным спаборніцтве абласцей і раенаў за лепшыя паказчыкі сацыяльна-эканамічнай дзейнасці.
1993 г.	У г. Асіповічы адкрыта беларуская гімназія
2001 г.	У Асіповіцкім раёне 57 700 жыхароў, у г. Асіповічы на 1.1.2001 г. — 35,7 тыс. жыхароў.

Да чытача

Асіповіцкі край мае такую ж багатую і старажытную гісторыю, як і іншыя раёны нашай краіны. Тут што ні назва — то адкрыццё, то цэлая эпоха. Як сведчаць дакументы, пераважная большасць гэтых назваў застаецца нязменнай з дня існавання (пяць, шэсць, а то і болей стагоддзяў).

Багаты наш край на таленавітых людзей. Многія прозвішчы праслаўлялі нашу старонку ў старажытнасці, многія — у новай гісторыі. Аўтары імкнуліся не забыць іх.

Па дробных крупінках работнікі дзяржаўных устаноў і аматары-краязнаўцы збіралі звесткі, якія мелі дачыненне да гістарычнай спадчыны Асіповіцкага раёна. Пры напісанні гэтай кнігі былі даследаваны фонды Нацыянальнага гістарычнага архіва Рэспублікі Беларусь, Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва і іншых архіўных устаноў, фонды буйнейшых беларускіх і расійскіх бібліятэк, выкарыстаны друкаваныя працы краязнаўцаў мінулага і сучасных даследчыкаў краю, а таксама шматлікія публікацыі з рэспубліканскіх газет і часопісаў, абласной газеты «Магілёўская праўда» і раённай — «Асіповіцкі край». Жыхары раёна далі для кнігі не толькі свае ўспаміны, але і унікальныя фотаздымкі. Многія з іх — адзіная і самая дарагая рэліквія, што засталася ў сям'і ад продкаў.

Выкарыстоўваючы самыя розныя крыніцы, аўтарскі калектыў імкнуўся падыходзіць да напісання гісторыка-дакументальнай хронікі непрадузята, з пазіцыі гістарычнай праўды. Стыль і мова многіх дакументаў, звязаных з дарэвалюцыйнай гісторыяй і савецкім часам, захаваныя для таго, каб найбольш дакладна перадаць атмасферу той пары.

Стваральнікі кнігі стараліся даць звесткі пра розныя бакі жыцця Асіповіччыны. Але, магчыма, штосьці не знайшло свайго адлюстравання на старонках кнігі, магчыма, ёсць і недакладнасці. Хронікі пішуцца ўпершыню. Спадзяёмся, што наступныя даследчыкі гісторыі Асіповіцкага раёна дапоўняць нашы звесткі.

Раённая камісія па напісанні гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць. Асіповіцкі раён» выказвае шчырую ўдзячнасць установам, арганізацыям, прыватным асобам, якія прымалі ўдзел у падрыхтоўцы і выданні кнігі.

АСІПОВІЦКІ РАЁН



Асіповіцкі раён размешчаны на паўднёвым захадзе Магілёўскай вобласці. Утвораны 17.7.1924 г. у складзе Бабруйскай акругі (да чэрвеня 1930 г.). З 15.1.1938 г. у Магілёўскай, з 20.9.1944 г. у Бабруйскай, з 8.1.1954 г. у Магілёўскай абласцях. 25.12.1962 г. скасаваны, тэрыторыя перададзена ў Бабруйскі раён. 6.1.1965 г. адноўлены.

Плошча — 1,95 тыс. км². Насельніцтва — 57 700 чалавек (2001). Населеных пунктаў — 162, у тым ліку горад Асіповічы, 3 рабочыя пасёлкі (Градзянка, Татарка, Ялізава), 12 сельсаветаў: Асіповіцкі, Вязеўскі, Дараганаўскі, Дрычынскі, Каменіцкі, Карытненскі, Лапіцкі, Ліпеньскі, Пагарэльскі, Пратасевіцкі, Свіслацкі, Ясенскі.

Тэрыторыя раёна знаходзіцца ў межах Цэнтральна-Бярэзінскай раўніны. Паверхня раўнінная, з невялікай узгорыстасцю ў заходняй частцы. Пераважная вышыня 150 – 160 м. Найвышэйшы пункт 206,5 м (за 4 км на З ад в. Пратасевічы). Карысныя выкапні: 4 радовішчы торфу з агульнымі запасамі 0,27 млн. м³, кварцавыя пяскі, гравій, гліна. Сярэдняя тэмпература студзеня -6,7 °С, ліпеня — 18,2 °С. Гадавая колькасць ападкаў 586 мм, вегетацыйны перыяд 194 сут. На тэрыторыі раёна працякаюць рэкі: Бярэзіна з прытокамі Каменка, Ваўчанка; Свіслач з прытокамі Сіняя, Граўка, Ботча, Жыцінка і інш.; Пціч з прытокамі Арыжня, Красная. Найбольшае возера Лочынскае. На рацэ Свіслач створана Асіповіцкае вадасховішча. Глебы сельскагаспадарчых угоддзяў: дзярновыя забалочаныя (49,2%), дзярнова-падзолістыя (21,6%), тарфяна-балотныя (8%), поймавыя (1,9%). Паводле механічнага складу глебы падраздзяляюцца на сугліністыя (2,1%), супясчаныя (68,6%), пясчаныя (14,6%), тарфяныя (14,7%). Размеркаванне зямель: пад лесам 110 250 га,

пад сельгасугоддзямі 61 848 га, ворных зямель 36 799 га, воднай прасторы 3848 га. Меліярацыйны фонд складае 55 500 га, з іх асушаных 23 291 га (42%).

На 1.2.2001 г. у раёне працавала 15 калгасаў, калектыўна-долевая гаспадарка «Ліпень», унітарнае камунальнае сельскагаспадарчае прадпрыемства «Пратасевічы». Прамысловых прадпрыемстваў у г. Асіповічы — 12, у раёне — 6. На рацэ Свіслач дзейнічае Асіповіцкая ГЭС.

На 1.9.2001 г. у г. Асіповічы было 5 сярэдніх школ, гімназія, спецшкола для дзяцей, хворых на поліяміэліт, 13 дашкольных устаноў; у раёне 16 сярэдніх школ, 7 базавых, 1 пачатковая, санаторна-лясная, для дзяцей з захворваннямі органаў дыхання, 20 дашкольных устаноў. Працуюць дзіцяча-юнацкі клуб, спартыўная школа, Цэнтр выхаваўчай работы, шэраг клубаў па інтарэсах.

Установы культуры: у г. Асіповічы — раённы Цэнтр культуры, гарадскі Дом афіцэраў, раённы Цэнтр народных рамёстваў, 3 клубы, кінатэатр, 2 музычныя школы, 5 бібліятэк; у раёне — 19 вясковых дамоў культуры, 13 клубаў, 6 музычных школ, 30 бібліятэк.

У раёне працуе 10 бальніц (2 гарадскія), 3 паліклінікі, 22 фельчарска-акушэрскія пункты, 13 аптэк (4 гарадскія).

Па тэрыторыі раёна праходзяць аўтамабільныя дарогі Мінск — Гомель і Асіповічы — Баранавічы. Асіповічы з'яўляюцца буйным чыгуначным вузлом на лініях Мінск — Гомель і Магілёў — Баранавічы. Працуе чыгуначная лінія мясцовага значэння Асіповічы — Градзянка.

Выдаецца раённая газета «Асіповіцкі край».

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Асіповіцкага раёна

Горад Асіповічы

Рабочыя пасёлкі: Градзянка, Татарка, Ялізава.

Асіповіцкі сельсавет: Агула, Асіповічы 2-я, Асіповічы 3-я, Брадзішча, Булгары, Вялікая Гарожа, Дзераўцы, чыгуначная станцыя Дзераўцы, Дубралева, Задняя Града, Замошша, Заручэўе, Засялечча, Кастрычнік, Кляпчаны Мост, Ліцвінава, Лучыцы, Малая Гарожа, Малоціна, Осава (Восава), Прудок, Ставішча, Ягаднае, Ясянец.

Вяззеўскі сельсавет: Вяззе, Вярэйцы, Зборск, Камарына, Леніна, Орча, Паташня, Смык, Цяплухі.

Дараганаўскі сельсавет: Востраў, Дараганава, Камарына, Каўгары, Краі, Крынка, Лука, Мязовічы, Птушычы, Радуцічы, Свіханава, Слопішча, Сялец, Ульянаўка.

Дрычынскі сельсавет: Астроўкі, Вялікі Бор, Дворышча, Дрычын, Жыцін, Заняцечча, Канцы, Крамок, Майсеевічы, Пясчанка.

Каменіцкі сельсавет: Асавок, Казіміра-ва, Каменічы, Прыцерпа, Цэзарава, Яноўка.

Карытненскі сельсавет: Дземенка, Караны, Карытнае, Коханаўка, Краснік, Старое Сяло, Тарасавічы, Убалацце, Шыпы.

Лапіцкі сельсавет: Азярышча, Брадок, Буда, Вялікая Грава, Вярбілава, Гоманаўка, Дуброва, Дубраўка, Жорнаўка, Жукаўка, Зорка, Крычавец, Лапічы, чыгуначная станцыя Лапічы, Лочын, Малая Грава, Палядзёе, Ражышча, Ручай, Сасновы, Слабодка, Троіцкая, Уборак, чыгуначная станцыя Уборак, Ялцоўка, Ямпаль.

Ліпеньскі сельсавет: Бозак, Брыцалавічы, Вязаўніца, Знаменка, Ігнатоўка, Лапковіца, Ліпень, Малінаўка, Няччо, Пасекі, Рафалін, Семіровічы, Усціж, Хімное.

Пагарэльскі сельсавет: Амінавічы, Градзянец, Лазовае, Пагарэлае.

Пратасевіцкі сельсавет: Верхі, Верайцы, Дражня, Дубавое, Забалацце, Пабокавічы, Паплавы, Перарожкі, Пратасевічы, Пратасевічы 2-я, Цэль.

Свіслацкі сельсавет: Баранцы, Буда, Вуглата, Вязычын, Галынка, Копча, Краснае, Навасёлкі, Паліцкае, Свіслач, Слабада, Сталяры, Чучча, Шэйпічы.

Ясенскі сельсавет: Аляксандраўка, Асяродак, Вайнілава, Грынёўка, Журавец, Заельнік, Залессе, Люлева, Матавіла, Ражнетава, Татаркавічы, Ясень, чыгуначная станцыя Ясень, Ясяноўка.

Населеныя пункты Асіповіцкага раёна, якія не існуюць

Асіповіцкі сельсавет: Барок, Дубавое, Зашыбіна, Казарма, Май, Перамога, Паляна.

Вяззеўскі сельсавет: Зялёная Дуброва, Каменка, Лянёўка, Пасёлак гідраэлектрастанцыі, Селішча.

Дараганаўскі сельсавет: Буда, Восы, Каменка, Мяжное, Халькі.

Дрычынскі сельсавет: Юравічы.

Каменіцкі сельсавет: Краснае.

Карытненскі сельсавет: Білоб, Борт нае, Гальчаўка, Гумнішча, пасёлак Карытнае, Смалярня, Сафіеўка, Старонка, Сухлава.

Лапіцкі сельсавет: Амялішча, Бор, Весялова, Віктарова, Восава (Осава), Жалязянка, пасёлак Жорнаўка, Забродцзе, Зарэчча, Курган, Лесазавод № 2, Навіна, Недароддзе, Падброддзе, Падбярэззе, Палянка, Папоўка, Прытыка, Раз'езд 9-ы км, Сёмкіна Слабада, Трактар, Цалянка, Цалянская Слабада, Чырвоная Ніва.

Ліпеньскі сельсавет: Акоп, Барок, Валадарск, Гай, Красналенск, Крынічкі, Новае Жыццё, Стараселле, Тодараў Кут.

Пагарэльскі сельсавет: Буда, Воля, Дуброўскі раз'езд, Колас, Макаўе, Палядкі, Партызан, Чарот.

Пратасевіцкі сельсавет: Рэпішча.

Свіслацкі сельсавет: Заельнік, Карма, Кассё, Максімаўка, Новая Ніва, Падзіра, Перадзіла, Прудзішча, Рыдлё.

Ясенскі сельсавет: Дуброва, Заграддзе, Свабода.

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

1917

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ

КАМЕННЫ ВЕК

Засяленне тэрыторыі раёна чалавекам адбывалася ў эпоху мезаліту (9—5-е тыс. да н. э.). Пра гэта сведчаць выяўленыя стаянкі, тры з іх вядомы на р. Пціч: пры выездзе з в. Дрычын у бок Крамка (моцна пашкоджана ў час будаўніцтва аўтадарогі), каля вёсак Радуцічы (таксама моцна разбурана) і Слопішча. Усе стаянкі на Пцічы выяўлены ў пачатку 1930-х гадоў беларускім вучоным А.Рынейскім у час археалагічнай экспедыцыі. На стаянках былі знойдзены крамянёвыя пласціны, адшчэпы, скрабкі і праколкі. Стаянка эпохі мезаліту ёсць і на Бярэзіне — паміж вёскамі Краснае і Кассё Свіслацкага сельсавета. Гэты помнік даследаваў У.П.Ксяндзоў. Ім знойдзены крамянёвыя праколкі, разцы і інш.

У часы неаліту ў нашым краі пражывалі плямёны днепра-данецкай культуры. З цягам часу ў цэнтральную Беларусь сталі прасочвацца носьбіты культуры грабеньчата-ямкавай керамікі (так называліся з-за характэрнага арнаменту на гліняным посудзе). Паселішчы эпохі неаліту на тэрыторыі сучаснага Асіповіцкага раёна размяшчаліся таксама ўздоўж рэк. На Свіслачы вядомы 2 помнікі: каля в. Малая Гарожа, ва ўрочышчы Вусце, адкрыта ў 1926 г. М.М.Улашчыкам і С.С.Шутавым; каля в. Ліпень, ва ўрочышчы Старасельле, адкрыта тымі ж даследчыкамі.

Стаянку эпохі неаліту каля Асіповіч выявіў у пачатку 1980-х гадоў настаўнік гісторыі В.П.Шчыглоў.

На ўсіх згаданых помніках знойдзены ножападобныя пласціны, скрабкі, адшчэпы. На стаянцы каля Асіповіч сабраны ўзоры неалітычнай керамікі.

Зуб маманта, знойдзены на тэрыторыі Асіповіцкага раёна ў 1960-я гады.

Каменныя прылады працы з Асіповіцкага раёна.



Крамянёвыя нож і пласціна з в. Вяззе.

Абломак каменнай матыкі, знойдзены ў г. Асіповічы.

Паселішчы эпохі неаліту былі і на Пцічы: у Дрычыне, там, дзе знаходзілася стаянка эпохі мезаліту, у Радуцічах (урочышча Сялец), насупраць вёскі Лука, на процілеглым беразе ракі. Усе яны былі адкрыты А.Рынейскім. Сістэматычных навуковых раскопак на тэрыторыі раёна пакуль што не было.

БРОНЗАВЫ ВЕК

У бронзавым веку (канец 3-га – 2-е тыс. да н. э.) на асіповіцкай зямлі распаўсюдзілася сярэднедняпроўская культура. Стаянкі гэтай эпохі выяўлены каля вёсак Галынка, Майсеевічы, Радуцічы, могільнікі каля вёсак Вялікая Гарожа, Буда, Ставішча, сляды паселішча каля в. Усціж. Аб развіцці земляробства ў гэты час сведчаць знаходкі ў Асіповіцкім раёне, як і на ўсёй Беларусі, шматлікіх каменных шліфаваных сякер-кліноў, пры дапамозе якіх ажыццяўлялася масавая высечка лясоў. Паблізу Асіповіч знойдзена каменная матыка (паводле меркаванняў вучоных-археолагаў, яна адносіцца да бронзавага веку) — яшчэ адно сведчанне развіцця земляробства ў гэты час. Варта адзначыць, што прылады працы ў бронзавым веку ў цэлым засталіся каменнымі і драўлянымі, і менавіта тады дасягнулі сваёй даскана-

Курганы каля в. Свіслач.

ласці, але траплялiся вырабы касцяныя, бронзавыя (бронза была вельмі дэфіцытным матэрыялам). Знаходкі каменных прылад бронзавага веку былі ў вёсках Амінавічы, Вялікая Гарожа, Вялікая Грава, Вязаўніца, Вяззе, Дараганава, Дрычын, Краі, Лука, Лапічы, Ліпень, Навасёлкі, Радуцічы, Свіслач, Сялец, Халькі, Усціж, Пагарэлае, Ягаднае, Яноўка, урочышчы Жужлянка.

Акрамя названых вышэй сякерклiноў выраблялiся прасвідраваныя шліфаваныя сякеры. Распаўсюдзіліся каменныя зерняцёркі, выраблялiся крамянёвыя нажы, кінжалы, сярпы, наканечнікі стрэл і коп'яў і інш. Шматлікія знаходкі баявых прасвідраваных сякер на тэрыторыі Асіповіцкага раёна гавораць пра тое, што плямёны індаеўрапейцаў, якія насялялі нашу зямлю ў эпоху бронзы, вялі бясконцыя войны.

Праіснаваўшы каля тысячы гадоў, сярэднедняпроўская культура змянілася культурай сосніцкай, сляды якой знойдзены каля в. Лука, на граніцы з Глускім раёнам.

Ю. В. Клеванец.



Фрагменты керамікі жалезнага веку з гарадзішча ў в. Зборск.

ЖАЛЕЗНЫ ВЕК

На тэрыторыі Беларусі эпоха жалеза пачынаецца прыкладна ў VII—V ст. да н. э. Яна змяніла бронзавы век. Першапачаткова старажытныя паселішчы жалезнага веку амаль не адрозніваліся ад стаянак папярэдняга часу. Яны ўяўлялі сабой адкрытыя селішчы, якія не мелі абарончых умацаванняў. У Асіповіцкім раёне выяўлены такі тып паселішчаў каля вёсак Цэль і Камарына. На іх знойдзены абломкі глінянага посуду другой паловы 1-га тысячагоддзя да н. э. Першыя ўмацаваныя паселішчы старажытнае насельніцтва пачало будаваць на тэрыторыі сучаснай Асіповіччыны, відаць, не пазней за III ст. да н. э. З'яўленне гарадзішчаў было абумоўлена ростам вытворчых сіл у земляробстве і жывёлагадоўлі. Значную ролю тут сыграла старажытная металургія жалеза. Стварыліся ўмовы для атрымання прыбавачнага прадукту ў выглядзе запасаў збожжа, жывёлы, прадметаў хатняга рамяства. Паміж родамі ўзнікаюць супярэчнасці, і гэта прыводзіць да ваенных сутыкненняў. Ва ўмовах ваеннай пагрозы найлепшым выйсцем было сяліцца на ўмацаваных узвышаных месцах. Спачатку паселішчы агароджвалі толькі драўляным тынам, пазней пачалі насыпаць земляныя валы і выкопваць равы. Так узніклі гарадзішчы.

На тэрыторыі сучаснага Асіповіцкага раёна яшчэ на пачатку XX ст. было вядома каля 20 гарадзішчаў. Яны размяшчаліся каля вёсак Сёмкава Слабада, Ражнетава, Каменічы, Лучыцы, Гарожа, Радуцічы, Лапічы, Цэль, Свіслач, Паліцкае, Смык, Зборск. Да нашага часу захаваліся толькі 4 апошнія. Астатнія разараны, сапсаваны сучаснымі могілкамі ці зусім зніклі з твару зямлі.

Гарадзішча ў в. Зборск Вяззеўскага сельсавета размешчана на мысе, на левым беразе р. Свіслач. Яно мае 2 пля-



Жалезныя нажы са Свіслацкага гарадзішча.

цоўкі — вялікую і малую, якія падзяляе курганападобны вал вышынёй 2 м і дыяметрам каля 15 м. Вялікая пляцоўка амаль круглая, дыяметрам да 60 м. Умацавана з усходняга, паўднёвага і паўднёва-заходняга бакоў валам вышынёй да 1,5 м і шырынёй да 20 м. Вышыня гэтай пляцоўкі над узроўнем ракі дасягае 5,25 м. Малая пляцоўка выцягнута з поўдня на поўнач і мае памеры па доўгай восі 26 м, а па кароткай 17 м. Яна ўзвышаецца над узроўнем вады на 3,8 м.

Гарадзішча вядома як помнік старажытнай гісторыі яшчэ з канца XIX ст., калі яго апісаў Ян Завіша. У XX ст. гэта паселішча абследавалі А.Г.Немцаў (1925), Л.Д.Побаль (1965), А.Р.Мітрафанаў (1978). У 1999 г. на помніку праведзены раскопкі А.У.Ільюцік з дапамогай вучняў з розных школ раёна, якія знаходзіліся ў лагеры працы і адпачынку. Раскоп плошчай 56 м² быў закладзены на малой пляцоўцы. Магутнасць культурнага пласта дасягала 0,6 м. Знойдзена шмат фрагментаў ляпнога посуду, які адносіцца да апошняй чвэрці 1-га тысячагоддзя да н. э. Асноўная маса абломкаў была ад посуду грубаляпнога гладкасценнага, частка штрыхаванага. Гэтым жа часам датуюцца гліняныя прасліцы, жалезныя нажы і рыбалоўны кручок, тыгель для плаўкі бронзы, абломак глінянага грузіка з насечкамі па краі.

Амаль насупраць, на правым беразе ракі Свіслач, у месцы ўпадзення ў яе невялікай рачулкі Жужлянкі, за 2 км на паўночны захад ад в. Смык Вяззеўскага сельсавета знаходзіцца другое гарадзішча. Яно вядома ў навуковай літаратуры пад назвай Жужлянка. Паселішча размешчана таксама на мысе, які ўзвышаецца над ракой на 9 м. Мае пляцоўку трохвугольнай формы памерам 100х130 м, з боку поля ўмацавана валамі і двума равамі. Помнік абследавалі ў 1925 г. А.Г.Немцаў, у 1926 г. С.С.Шутаў і М.М.Улашчык, у 1958 г. і 1965 г. Л.Д.Побаль. У 1963 г. і 1964 г. на гарадзішчы праведзены раскопкі пад кіраўніцтвам Ю.І.Драгуна. Ускрыта 140 м² культурнага слоя пры магутнасці яго ад 0,2—0,3 м (у цэнтры) да 0,8 м (каля вала). Знойдзены абломкі ляпных гладкасценных і штрыхаваных пасудзін і гліняныя прасліцы ранняга жалезнага веку. Былі часткова вывучаны ўмацаванні гарадзішча, якія складаюцца з 2 валоў і равоў. На адным з валоў стаяў яшчэ і драўляны тын. Даследчык аднёс раннія слаі гарадзішча да часу бытавання культуры штрыхаванай керамікі.

Два іншыя буйныя помнікі знаходзяцца на рацэ Бярэзіне. Свіслацкае гарадзішча пабудавана на высокім мысе, у месцы ўпадзення р. Свіслач у р. Бярэзіну, у вёсцы Свіслач. Амаль трохвугольная пляцоўка мае памеры 70х70 м. З 2 бакоў меліся прыродныя ўмацаванні — стромкія схілы вышынёй каля 10 м ад падэшвы. З боку поля насыпаны вал вышынёй да 1,5 м і выкапаны глыбокі і шырокі роў.

Помнік вядомы з канца XIX ст. У 1923 г. у час разведак па Бабруйскім павеце гарадзішча наведаў А.Рынейскі. У 1926 г. абследавалі С.С.Шутаў і М.М.Улашчык. Раскопкі праводзіў у 1962 г., 1969 — 1971 гг. Э.М.Загарульскі. Ім даследавана каля 700 м² плошчы пры магутнасці слоя да 2 м. У 2000 г. невялікую плошчу (36 м²) раскапала А.У.Ільюцік. У ніжніх пластах выяўлены матэрыялы культуры штрыхаванай керамікі: жалезная посахападобная шпілька, гліняныя прасліцы, нажы, шлакі, каменная зерняцёрка, фрагменты ляпнога гладкасценнага, штрыхаванага і глянцаванага посуду. У верхніх слаях змяшчаюцца рэчы XI — XIV ст. і больш позняга часу.

Апошняе, пакуль яшчэ часткова захаванае, умацаванае паселішча размешчана за 1,5 км на ўсход ад в. Паліцкае Свіслацкага сельсавета, на правым высокім беразе р. Бярэзіны, ва ўрочышчы Гарадок. Да 1995 г. у навуковай літаратуры гарадзішча было вядома як Навасёлкаўскае (па назве вёскі Навасёлкі, размешчанай за 4 км на паўночны захад ад яго). Помнік адкрылі ў 1926 г. С.С.Шутаў і М.М.Улашчык. У 1963 г. яго абследаваў Л.Д.Побаль. У 1970 г. тут былі праведзены раскопкі Э.М.Загарульскім і Л.В.Жыхаравай. Ускрыта 48 м². У 1978 г. паселішча наведаў А.Р.Мітрафанаў. У час першых абследаванняў гарадзішча мела 4 пляцоўкі. Памеры іх адпаведна 32х30 м, 55х27 м, 42х32 м і 50х45 м. Пляцоўкі аддзяляліся адна ад адной валамі і равамі. З цягам часу рака падмывала бераг, і помнік разбураўся. Калі ў 1926 г. шырыня гарадзішча дасягала 46 м, у 1963 г. — 27 м, у 1970 г. — 22 м, то да нашых дзён захавалася толькі некалькі метраў культурнага слоя. У 1995 — 1997 гг. ратавальныя раскопкі правёў М.І.Лашанкоў. Ён ускрыў 200 м². Магутнасць культурнага пласта дасягала 0,4 — 0,6 м. Знойдзены абломкі ляпнога гладкасценнага, штрыхаванага і глянцаванага посуду, косці жывёл, шлакі і кавалкі жалеза, камяні ад зерняцёрак, гліняныя прасліцы, бронзавыя бранзалеты і шпількі. Даследчык аднёс паселішча да апошняй чвэрці 1-га тысячагоддзя да н.э. — I ст. н.э. і лічыць, што яго засялялі плямёны культуры штрыхаванай керамікі.

У выніку шматгадовага археалагічнага вывучэння помнікаў ранняга жалезнага веку ў Асіповіцкім раёне сабраны багаты рэчавы матэрыял, які дае магчымасць зрабіць вывад аб тым, што берагі Свіслачы і сярэдняга цячэння Бярэзіны засялялі плямёны культуры штрыхаванай керамікі. У той час насельніцтва займалася земляробствам, жывёлагадоўляй, паляваннем, рыбалоўствам, збіральніцтвам. Былі развіты металургія жалеза і бронзы, ганчарства, апрацоўка дрэва і косці, прадзенне, ткацтва і пляценне.

Земляробства ў лясной паласе Усходняй Еўропы, у тым ліку і на тэрыторыі Беларусі, на ўсім працягу жалезнага веку было лядным. Вырошчвалі гарох, палявы боб, віку, проса, пшаніцу. На Паліцкім гарадзішчы знойдзены абломкі посуду з адбіткамі зярняткаў проса і пшаніцы. Ураджай здымалі жалезнымі сярпамі. Абломкі сярпоў, напрыклад, знойдзены на паселішчы Жужлянка. Перамолвалі зерне на каменных зерняцёрках, якія выяўлены ў Свіслачы і Паліцкім.

Аб заняцці жывёлагадоўляй гаворыць астэалагічны матэрыял. У час раскопак на гарадзішчах Паліцкае і Зборск знойдзены косці коней, кароў, свіней, авечак і коз. Хатнія жывёлы давалі не толькі ежу, але і воўну, выкарыстоўваліся ў якасці цяглавай сілы і сродка перамяшчэння.

Нягледзячы на новы дадатковы спосаб здабывання ежы, па-ранейшаму вялікую ролю адыгрывала паляванне, рыбалоўства і збіральніцтва. Палявалі на лася, аленя, дзіка, мядзведзя. Здабывалі і пушнога звера. На гарадзішчы Зборск знойдзены косці бабра. Аб рыбалоўстве сведчаць жалезны кручок са



Тыгель для плаўкі бронзы з гарадзішча ў в Зборск.

Зборска і гліняныя грузілы для рыбалоўных сетак. Косці рыб у пясчанай глебе на помніках жалезнага веку ў Асіповіцкім раёне не захаваліся. Знойдзены косці і луска рыбы толькі ў культурным слоі Свіслацкага замка. Але вызначыць, якая частка з іх адносіцца да жалезнага веку, а якая да сярэднявечча, немагчыма. Можна меркаваць, што асетр, шчупак, сом, лешч, жэрах, карась, галавень, язь, лінь, акунь, судак вадзіліся як у пачатку 2-га тысячагоддзя, так і ў раннім жалезным веку.

Прыкладна ў VII—V ст. да н. э. на тэрыторыі Беларусі людзі авалодалі спосабам атрымання жалеза з жалезнай руды, якую збіралі ў балоце і на паплавах. «Варылі» руду ў печах-домніцах. Печ рабілі з гліны і мелу. Яна была паўсферычнай формы. Унізе знаходзілася адтуліна, у якую ўстаўлялі гліняныя трубкі-соплы. У домніцу засыпалі пластамі драўняны вугаль, вапну і раздробленую руду. Вугаль падпальвалі, а праз соплы ў печ пампавалі паветра. Тэмпература ў печы дасягала прыкладна 1200°, і з руды выдзяляліся часцінкі жалеза, якое ў выглядзе крыцы асядала на дно печы. Пасля заканчэння працэсу печ разбівалі, крыцу даставалі, награвалі, апрацоўвалі молатам і атрымлівалі жалеза. На гарадзішчах Асіповіцкага раёна знойдзены кавалкі шлаку, крыцы, жалезныя загатоўкі і рэчы: нажы (Зборск, Паліцкае, Свіслач), сярпы (Жужлянка), посахападобныя шпількі (Свіслач).

Плямёны жалезнага веку былі добра знаёмыя з бронзаліцейнай вытворчасцю. Бронзу на Беларусь прывозілі, тут з яе рабілі рэчы. Плавілі бронзу на вогнішчах у маленькіх таўстасценных гліняных пасудзінках-тыглях. На гарадзішчы Зборск знойдзены такі маленькі тыгель. Вышыня яго 4 см, сценкі таўшчынёй 8—9 мм, дыяметр зверху 3,5 см. З бронзы рабілі ўпрыгажэнні. На Паліцкім гарадзішчы знойдзены 2 бронзавыя шпількі і бранзалет. У Зборску — абломак бронзавага дроту, які мог быць загатоўкай ці абламанай шпількай.

На кожным помніку жалезнага веку заўсёды шмат абломкаў глінянага посуду. Увесь ён леплены ўручную і абпалены на вогнішчы. У гліну дабаўлялі тоўчаны камень, буйназярністы пясок і зрэдку шамот. Дзякуючы гэтым дамешкам сценкі вырабаў атрымліваліся больш шчыльныя, трывалыя і вогнеўстойлівыя. На паселішчах Асіповіцкага раёна знойдзены абломкі гладкасценных, штрыхаваных і глянцаваных гаршкоў. Некаторую частку фрагментаў удалося склеіць і графічна аднавіць знешні выгляд посуду таго часу. Ганчары ляпілі ў асноўным начынне вялікіх (дыяметр па краі венчыка са Свіслачы 42 см, з Паліцкага — 30 см) і сярэдніх (дыяметр венчыка са Свіслачы 12 см, з Паліцкага — 15, 19, 22 см; дыяметр днішча са Зборска 10 см) памераў. Сустракаліся і маленькія пасудзінкі. Вялікія прадметы выкарыстоўваліся ў якасці тары для захоўвання гаспадарчых запасаў. У гаршках сярэдніх памераў гатавалі ежу. Сталовую кераміку рабілі больш якасную. У гліну дабаўлялі дробназярністы пясок

ці дробную жарству і вельмі старанна вымешвалі. Сценкі загладжвалі амаль да бляску. Памеры гэтага посуду па верхнім краі не перавышалі 10 см.

На гарадзішчах Асіповіцкага раёна пераважалі гаршкі круглабокія з адагнутымі вонкі ці вертыкальна пастаўленымі шыйкай і венчыкам. У калекцыі прысутнічае невялікая колькасць посуду рабрыстай формы. Майстры ўпрыгожвалі свае вырабы. Выкарыстоўвалі такія арнаментальныя прыёмы, як ямкі па шыйцы і плечуку, насечкі ці пальцавыя ўціскванні па краі венчыка. Штрыхоўка таксама магла быць сваеасаблівым аздабленнем.

Пра заняткі старажытнага насельніцтва прадзеннем і ткацтвам гавораць знойдзеныя на ўсіх гарадзішчах прасліцы і грузікі. Прасліцы ўяўляюць сабой пляскатыя кружочкі дыяметрам ад 3 да 4 см і таўшчынёй 0,8—2 см. Яны маюць у цэнтры адтуліну дыяметрам 5—9 мм. Іх надзявалі на верацяно, каб яно добра круцілася і не білася з боку ў бок. З атрыманых нітак выраблялі тканіну, хутчэй за ўсё на вертыкальных ткацкіх станках, ніткі на якіх нацягвалі з дапамогай гліняных грузіл. Адбіткі тканіны можна бачыць на некаторых донцах пасудзін. З тканін шылі адзенне жалезнымі іголкамі, якія знаходзяць даволі часта на паселішчах жалезнага веку.

У выніку раскопак шэрагу ўмацаваных паселішчаў культуры штрыхаванай керамікі стала магчымым высветліць іх планіроўку і забудову. Жылыя і гаспадарчыя пабудовы размяшчаліся галоўным чынам уздоўж краю пляцоўкі. Цэнтральная частка заставалася незабудаванай. Яна выкарыстоўвалася для грамадскіх спраў. На гарадзішчах Асіповіцкага раёна пакуль не знойдзены рэшткі жылля. Але на іншых помніках насельніцтва будавала вялікія доўгія наземныя дамы слупавой канструкцыі, падзеленыя на асобныя жылыя памяшканні плошчай 20—25 м². Сустракаліся і невялікія аднапакаёвыя дамы квадратнай ці прамавугольнай формы, трохі заглыбленыя ў зямлю. Ацяпляліся яны вогнішчамі.

Побач з дамамі размяшчаліся гаспадарчыя пабудовы, рэшткі якіх у выглядзе ям знойдзены на гарадзішчы Зборск Асіповіцкага раёна.

Плямёны культуры штрыхаванай керамікі жылі ва ўмовах першабытнаабшчыннага ладу, на стадыі развітога патрыярхату. Асноўнай і самай дробнай гаспадарчай адзінкай грамадства была патрыярхальная сямейная абшчына.

Аб этнічнай прыналежнасці плямён культуры штрыхаванай керамікі няма адзінай думкі. Адны вучоныя звязваюць іх з балтамі. Іншыя лічаць, што носьбіты культуры штрыхаванай керамікі маюць прамыя адносіны да славянскага этнагенезу.

На тэрыторыі Асіповіцкага раёна гарадзішчы культуры штрыхаванай керамікі спынілі сваё існаванне ў I—II ст. н. э. Па якой прычыне замірае жыццё на помніках — невядома. Магчыма, людзі сталі перасяляцца на селішчы. Селішчы, якія датуюцца прыкладна сярэдзінай — 2-й паловай 1-га тысячагоддзя н. э., у Асіповіцкім раёне вядомы каля вёсак Ліпень, Цяплухі, Чучча, Усціж, Зарэчча. На жаль, раскопкі на іх не праводзіліся. Гэтыя помнікі толькі абследаваліся. На іх пабывалі ў 1926 г. С.С.Шутаў і М.М.Улашчык, у 1965 г. Л.Д.Побаль, у 1978 г. А.Р.Мітрафанаў. Даследчыкі збіралі кавалкі керамікі, якую знаходзілі на разараным полі. Па гэтым матэрыяле яны і змаглі прыкладна датаваць селішчы.

У V—VIII ст. у цэнтральнай Беларусі (у тым ліку і ў Асіповіцкім раёне) пражывалі плямёны, аднесеныя вучонымі да культуры тыпу верхняга слоя Банцараўшчыны. Этнічны склад гэтага насельніцтва канчаткова не вызначаны. Большасць даследчыкаў лічыць, што банцараўская культура належала балтам.

ЭПОХА СЯРЭДНЯВЕЧЧА

У канцы 1 — пачатку 2-га тысячагоддзя тэрыторыю сярэдняй Беларусі пачынаюць засяляць славяне. У Асіповіцкім раёне сляды славянскіх паселішчаў знойдзены археолагамі каля вёсак Смык (Жужлянка), Свіслач, Зборск, Паліцкае, Лапічы, Ліпень, Чучча, Усціж, Цэль, Гарожа, Казімірава, Краснае. Акрамя ўмацаваных і неўмацаваных паселішчаў захавалася шмат пахавальных помнікаў. Курганы ёсць на тэрыторыі Дараганаўскага сельсавета (вёскі Дараганава, Каўгары, Крынка, Лука, Радуцічы), Вяззеўскага сельсавета (Камарына, Орча, Селішча). 5 курганных могільнікаў знаходзіцца вакол в. Каменічы, шмат іх каля вёсак Брыцалавічы, Няччо, Усціж, Хімное Ліпеньскага сельсавета і ў іншых месцах раёна.

Значны ўклад у вывучэнне гісторыі Асіповіцкага раёна гэтага часу зрабіў У.З.Завітневіч. У 1892 г. ён раскапаў 73 курганы каля вёсак Гарожа, Ясень, Брыцалавічы, Усціж і абследаваў курганны могільнік каля в. Камарына. Ва ўсіх раскапаных курганах былі пахаванні па абраду трупапалажэння на падэшве або ў яме. У асноўным было па адным пахаванні і толькі зрэдку па 2 пад адным насыпам. Як правіла, нябожчыка клалі галавой на захад, і толькі ў 2 курганах — на ўсход. У некалькіх курганах захаваліся сляды драўляных церамкоў, або збудаванняў у выглядзе хаткі, якія рабіліся над магілай перад насыпаннем кургана. Гэта з'ява асабліва характэрная для курганоў дрыгавічоў у басейне сярэдняга цячэння Бярэзіны.

У некаторых курганах Асіповіцкага раёна фіксуецца звычай, калі на расчышчаную паверхню клалі нябожчыка і вакол абстаўлялі дошкамі — 2 падоўжнымі і 2 папярочнымі. Каб яны трымаліся, убівалі калочкі. Зверху пахаванне накрывалі дошкамі і часта паверх іх яшчэ бярозавай карой.

У час раскопак курганоў У.З.Завітневічам было знойдзена шмат упрыгожанняў: цыліндрычныя ажурныя металічныя пацеркі, 2 якарападобныя падвескі, падвеска ў выглядзе пласціністага коніка, маленькія шарападобныя гузікі, шкляныя пацеркі рознага колеру, у тым ліку пазалочаныя, сердалікавыя і з горнага крышталю, металічныя драцяныя скроневыя кольцы, драцяныя пярсцёнкі і бранзалет. На некаторых скроневых кольцах былі нанізаны па 3 металічныя зярнёныя пацеркі. У некаторых пахаваннях знаходзілі глінянае начынне і жалезныя абручы ад драўлянага вядзерца. У гліняным посудзе звычайна неслі на магілу вуголле з хатняга агнішча. У вядзерцах нябожчыку ставілі мядовы напой. Сярод знаходак ёсць жалезныя нажніцы, серп, сякеры, спражкі, шыферныя прасліцы. Паводле абраду пахавання і рэчаў раскапаныя курганы датуюцца XI — XII ст., яны належалі дрыгавічам.

Доўгі час пахавальныя помнікі Асіповіцкага раёна не раскопваліся. Археалагічныя даследаванні ўзнавіліся ў 2-й палове XX ст. У 1960 г. Л.Д.Побаль раскапаў адзін курган каля в. Азярышча, а ў 1963 г. — каля в. Чучча. Слядоў пахавання не выяўлена. Зафіксаваны толькі вугальныя праслойкі. У 1991 г. 2 курганы каля в. Азярышча даследаваны Ю.А.Зайцам. Знойдзены пахаванні з абрадам трупаспалення. На гэтым жа могільніку ў 1999 г. Л.У.Дучыц даследавала 2 насыпы, у якіх выяўлены сляды трупаспалення. Рэчаў не было.

У гэты ж час пачалося археалагічнае вывучэнне славянскіх паселішчаў на тэрыторыі раёна. У 1963 — 1964 гг. Ю.І.Драгун праводзіў раскопкі гарадзішча каля в. Смык. У выніку было высветлена, што на месцы гарадзішча жалезнага веку ў канцы 1 — пачатку 2-га тысячагоддзя існавала славянскае паселішча. Ад гэтага часу засталіся рэшткі ганчарнага посуду, шкляныя пацеркі, наканечнік дзіды. Побач з гарадзішчам знаходзяцца 2 селішчы. На адным была сабрана кераміка X — XI ст.

На другім Ю.І.Драгун раскапаў 244 м². Выяўлены 2 гарызонты. У ніжнім знойдзены гліняныя прасліцы і фрагменты раннеславянскіх гаршкоў VI — VII ст., у верхнім — шкляныя пацеркі, бісер, ганчарная кераміка эпохі Кіеўскай Русі.

У 1962, 1969 — 1971 гг. экспедыцыя Беларускага дзяржаўнага універсітэта пад кіраўніцтвам Э.М.Загарульскага праводзіла раскопкі на гарадзішчы ў в. Свіслач. Пачаткам 2-га тысячагоддзя датуюцца рэшткі наземных драўляных пабудоў з дашчатай падлогай. Сярод рэчаў побыту жалезныя сякеры, нажы, нажніцы, замкі, ключы, іголкі, дужкі ад драўляных вядзёр, касцяныя грабеньчыкі, жалезныя крэсівы для высякання агню і інш. Аб занятках земляробствам сведчаць жалезныя сашнікі, матыка, каса-гарбуша, абломкі каменных жорнаў і жалезная порхліца (устаўка) для іх. Знойдзены разнастайныя прылады для рыбнай лоўлі (кручкі, восці, гарпуны, гліняныя грузілы, іголкі для пляцення сетак). Шматлікія знаходкі зброі, рыштунку каня і вершніка (наканечнікі дзідаў і стрэлаў, цуглі з псаліямі, фрагменты шпор, рэшткі пласціністых даспехаў і інш.) сведчаць, што ў тагачасным Свіслацкім замку быў ваенны гарнізон, які кантраляваў водныя вароты ў раку Свіслач. Аб занятках прадзеннем і ткацтвам сведчаць знойдзеныя на помніку шыферныя прасліцы і гліняныя грузікі. Насельніцтва замка займалася апрацоўкай косці і рога. Знойдзены наверша, арнаментаванае дзяржанне нажа, шахматная фігурка.

У замку знойдзена вялікая колькасць жаночых упрыгажэнняў з бронзы (бранзалеты, пярсцёнкі, падвескі) і шкла (бранзалеты, пацеркі, пярсцёнкі). Асабліва шмат абломкаў шкляных бранзалетаў. Яны бытавалі ў асноўным ад сярэдзіны XII ст. да сярэдзіны XIII ст. Археолаг Т.С.Скрыпчанка, якая вывучала свіслацкія шкляныя бранзалеты, лічыць, што яны паступалі сюды



Шыферныя прасліцы і каменныя асялкі са Свіслацкага гарадзішча.

з Кіева і нават з Канстанцінопаля. У XIII ст. пасля разгрому Кіева манголататарамі вытворчасць бранзалетаў была наладжана ў самой Свіслачы.

Аб гандлёвых сувязях жыхароў Свіслачы з Прычарнамор'ем сведчаць таксама знаходкі кавалкаў амфар, у якіх прывозілася віно.

Жыхары замка ў той час былі ўжо хрысціянамі. Аб гэтым гавораць знойдзеныя ў час раскопак крыжы-складні (адзін цэлы і абломкі ад другога).

У 2000 г. на гарадзішчы ў в. Свіслач правяла невялікія раскопкі А.У.Ільюцік. Работа была арганізавана аддзелам народнай асветы Асіповіцкага раёна. Быў створаны лагер працы і адпачынку, у які ўвайшлі вучні з розных школ раёна. З іх дапамогай знойдзены разнастайныя рэчы з жалеза (нажы,



Касцяныя вырабы (гузікі, наверша, накладкі, праколка) са Свіслацкага гарадзішча.

Абломкі бранзалетаў, знойдзеныя на тэрыторыі Свіслацкага замка



«Бабка» — цацка для гульні са Свіслацкага гарадзішча.

дужкі ад вядзёр, замкі, ключы, рыбалоўны кручок, наканечнікі стрэл, спражкі, падковы, шпоры), косці (наверша, арнаментаваныя накладкі, гузікі, праколкі ці качадык для пляцення рыбалоўных сетак, «бабка» з адтулінай у цэнтры, залітай нейкім металам, якая выкарыстоўвалася ў якасці цацкі і для гульні на грошы), шкла (бранзалеты розных колераў, пацеркі, абломкі пасудзінкі XII –1-й паловы XIII ст.), каменю (сердалікавая пацерка, асялкі, шыферныя прасліцы).

У пачатку 2-га тысячагоддзя н. э. у Асіповіцкім раёне існаваў яшчэ адзін даволі значны ўмацаваны пункт, размешчаны на р. Свіслач у в. Зборск. На гэтым помніку, як ужо адзначалася вышэй, таксама былі праведзены археалагічныя даследаванні. З таго часу да нас дайшлі кавалкі глінянага посуду, шыферныя прасліцы, жалезныя нажы і адзін музычны інструмент — варган. Гэта вельмі рэдкая знаходка. На тэрыторыі Беларусі падобны варган знойдзены толькі ў г. Друцк. Там ён датуецца XII ст.

Да эпохі Старажытнай Русі адносіцца і частка матэрыялаў з гарадзішча Гарадок, размешчанага каля в. Паліцкае. Тут былі знойдзены фрагменты ганчарных гаршкоў, жалезныя падкова і шпора, бронзавая бразготка. Шпора датуецца XII — 1-й паловай XIII ст. Даследчык гэтага паселішча М.І.Лашанкоў выказаў меркаванне, што ў пачатку 2-га тысячагоддзя тут знаходзіўся вартавы пост ад Свіслацкага замка, які быў заселены адным з плямён дрыгавічоў.

У Асіповіцкім раёне вядомы яшчэ і такія віды помнікаў, як культавыя камяні і каменныя крыжы. Напрыклад, каля в. Крынка пры дарозе з Жыціна ў Асіповічы ляжыць вялікі камень пад назвай Валы. Шмат камянёў да нашых дзён не захавалася, але звесткі пра іх былое месцазнаходжанне да нас дайшлі. Так, нейкі цудоўны камень знаходзіўся яшчэ ў пачатку XX ст.

каля пас. Каменка (зараз Леніна). Ад гэтага каменя і паходзіць быццам бы назва вёскі. Каля в. Мязовічы былі невялікія камяні Гусь і Баран. Камяні-следавікі былі каля вёсак Журавец, Малая Гарожа, станцыі Гай.

У пачатку XX ст. у раёне каменныя крыжы стаялі каля вёсак Пабокавічы, Цяплухі, Лучыцы, пры дарозе ў в. Мязовічы і ў ваколіцах Забалацця. Цяпер лёс гэтых помнікаў даўніны не вядомы.



Музычны інструмент варган з гарадзішча ў в. Жорск.

ЛІТАРАТУРА:

Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1993. С. 559 – 560.

Драгун Ю.И. Раннеславянское поселение в нижнем течении р. Свислочь Белорусские древности. Мн., 1967. С. 422 – 431.

Завитневич В.З. Археологические изыскания в бассейне реки Березины Отчет Императорской археологической комиссии за 1892 г. СПб., 1894. С. 124 – 153.

Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць. Мн., 1986.

Лошенков М.И. Городище Палицкое Is baltų kulturos istorijos Vilnius, 2000. С. 125 – 140.

Лысенко П.Ф. Дреговичи. Мн., 1991.

Поболь Л.Д. Славянские древности Белоруссии. Мн., 1974. С. 265 – 273.

Скрыпчанка Т.С. Свіслацкія шкляныя бранзалеты XII – XIV стст. Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук. 1980. № 3.

Штыхов Г.В. Археологическая карта Белоруссии. Вып. 2. Мн., 1971. С. 228 – 231.

А.У.Ільюцік.

Нямыя сведкі мінуўшчыны

Аб пражыванні старажытнага чалавека на тэрыторыі Асіповіцкага раёна сведчаць шматлікія знаходкі каменных прылад працы. І знайшлі іх часта не навукоўцы, а мясцовыя жыхары розных сельсаветаў раёна. Знаходкі — больш за 40 старажытных прадметаў, большасць з якіх сякеры. Зберагаюцца яны часам у школьных музеях, іншыя — у прыватных калекцыях, некаторыя перададзены даследчыкам-археолагам.



Карта распаўсюджання каменных сякер на тэрыторыі Асіповіцкага раёна. Складзена Ю.В.Клеванцом.

Каменная сякера-клін з в. Вялікая Гарожа.

Свідраваная сякера, знойдзеная ў в. Дараганава.

Свідраваная сякера, знойдзеная ў в. Ліпень.

У музеі калгаса «Авангард» (в. Вяззе) захоўваюцца свідраваныя сякеры і сякера-клін з чорнага каменя.

У няпоўнай сярэдняй школе ў в. Вязаўніца настаўнікамі гісторыі сабраны свідраваныя сякеры і сякеры-кліны.

Знаходкі, якія зберагаюцца ў школьным музеі в. Дараганава, зроблены ў 1980—90-я гады. Сабрала іх З.Р.Верашчака.

Экспанаты, якія захоўваюцца ў музеі Ліпеньскай сярэдняй школы, сабраны М.К.Хількевічам.

Знаходкі для школьнага музея ў в. Пагарэлае сабраў М.А.Булавацкі ў в. Амінавічы.

У школьным музеі в. Свіслач захоўваюцца экспанаты, здабытыя ў час раскопак на замчышчы, якія праводзіліся ў пачатку 1970-х гадоў. Тут было выяўлена гарадзішча культуры штрыхаванай керамікі, пазней, у XI—XII ст. узнікла паселішча замкавага тыпу. Ёсць на ім і магутныя напластаванні XIII—XVIII ст. Раскопкі праводзілі Э.М.Загарульскі, А.У.Ільюцік. Экспанаты для школьнага музея сабрала І.І.Цімошчанка.

Экспанаты для школьнага музея в. Ясень сабраў Э.М.Васільчанка на месцы не існуючай зараз в. Дуброва-Ясенская, каля в. Журавец.

У прыватнай калекцыі Дж.А.Курчэўскага зберагаюцца экспанаты, знойдзеныя паміж лініяй чыгункі Асіповічы — Магілёў і прасёлачнай дарогай Малая Гарожа — Вялікая Гарожа. У раёне апошняй, паводле меркавання археолага У.Ф.Ісаенкі, знаходзіўся могільнік сяроднедняпроўскай культуры.

В.П.Шчыглоў збіраў знаходкі на тэрыторыі раёна на працягу 1970—1990-х гадоў. У яго прыватнай калекцыі цэлы шэраг сякер, нажоў, пласцін і іншых каменных прылад.

На тэрыторыі раёна вядома 5 старажытных стаянак. 2 з іх адкрыў К.М.Палікарповіч у 1927 г. каля в. Дараганава і ў 1929 г. каля в. Радуцічы Дараганаўскага сельсавета. У 1930 г. яшчэ 2 адкрыў А.Рынейскі паблізу населеных пунктаў Майсеевічы Дрычынскага сельсавета і Слопішча Дараганаўскага сельсавета. Гэтыя помнікі даследаваў у 1978 г. В.Ф.Капыщін, які па выяўленым матэрыяле аднёс іх да бронзавага веку. Адна стаянка адкрыта недалёка ад вёскі Краснае Ясенскага сельсавета ў 1982 г. В.П.Ксяндзовым, які ўстанавіў яе прыналежнасць да каменнага веку.

Такая значная калекцыя старажытных прадметаў, выпадкова знойдзеных на тэрыторыі сучаснага Асіповіцкага раёна, сведчыць аб даволі інтэнсіўным жыцці ў нашым краі ў часы каменнага і бронзавага вякоў.

Ю.В.Клеванец.

Городище Палицкое

Полевыми исследованиями 1995—1997 годов завершены спасательные раскопки на городище Палицкое, что в Свислочском сельсовете Осиповичского района Могилевской области. Это укрепленное поселение находится в урочище Городок, в 1,5 км восточнее деревни Палицкое, в пойме правого берега Березины на высоком останце. Памятник открыт в 1926 году экспедицией, которая проводила разведки в бассейне нижнего течения реки Свислочь. С.С.Шутов и Н.Н.Улащик описали его форму, размеры, укрепления, сняли план. Городище они привязали к деревне Новоселки (Шутаў, Улашчык, 1930, с. 115—116). В 1963 году его обследовал Л.Д.Поболь. Он заложил шурф на площадке, в обрывах зачистил валы и снял их профили, описал выявленные материалы (Поболь, 1974, с. 269—272). В 1970 году небольшие раскопки на нем провела экспедиция Белгосуниверситета. В северо-западной четверти городища разработан раскоп площадью 12х4 м. Результаты раскопок Э.М.Загорульского и Л.В.Жихаревой опубликованы весьма кратко (Жихарева, 1971, с. 45—48). Также это поселение обследовали в 1978 году А.Г.Митрофанов, в 1985 году О.В.Иов, а в 1994 году — автор (Лашанкоў, 1997а, с. 30).

Изучаемое городище было в плане неправильной прямоугольной формы с закругленными углами. Оно располагалось на западном краю останца. Длина его с востока на запад 61 м, ширина с севера на юг 46 м. С северо-востока и востока оно отделялось рвом от остальной части послеледниковой возвышенности. Раскопом 1997 года исследовалась северо-восточная окраина памятника с прилегающим к нему рвом. Установлено, что площадка городища с напольной стороны была ограничена рвом шириной 4 м и глубиной 1,3—1,4 м от материкового горизонта. Стенки у рва пологие, дно чашеобразное. Отсутствие ям от столбов и кольев в материке по краю площадки говорит о том, что поселение изначально не имело деревянных ограждений. В процессе жизни склоны останца эскарпировались, по-видимому, не один раз, а земля набрасывалась на край площадки. Данное обстоятельство привело к тому, что края городища стали более возвышенными по сравнению с его центральной частью. К середине 90-х годов от городища сохранилась лишь северная окраина шириной 2—4 м. Примерно лет 50 тому назад река Березина начала постепенно менять свое русло, подмывая правый берег. Процесс естественного разрушения памятника осуществлялся по всей его длине. Если в 1926 году ширина городища составляла 46 м, то в 1963 году — 27 м, в 1970 году — 22 м, а в 1994 году — от 2 до 4 м. Автор ставил своей задачей доисследовать оставшуюся часть памятника.

За три полевых сезона вскрыто 200 кв. м. Раскапывать пришлось, по существу, северный край городища. Суммарная коллекция материалов из раскопов составила 4926 единиц. Культурный слой состоял из супеси серого и черного цветов. Два верхних раскопочных пласта имели серую окраску, а все остальные до материка — черную. Исходя из нивелировочных данных, толщина культурного слоя была от 0,72 до 1,65 м. Дневная поверхность и материк в раскопах имели уклон на запад. В западной части сохранившегося памятника дневная поверхность возвышалась над уровнем воды в Березине на 6,63 м (в середине июня 1995 года). Органику слой рассматриваемого поселения сохраняет плохо, поэтому кости животных встречались в полуистлевшем состоянии. Единичными находками в слое были кусок глиняной обмазки и кальцинированная косточка, два кусочка железа и три кремневых отщепа. Коллекция индивидуальных находок небольшая — 20 экземпляров. Массовые материалы, такие как керамика, кости и шлаки, составляют 99,5% от всей коллекции. Отметим, что результаты раскопок за 1995 год уже опубликованы, как и некоторая информация по керамике за 1995—1996 годы (Лашанкоў, 1997а, с. 30—38; Ильютик, 1998, с. 25—39).

На Палицком городище керамика самый выразительный и большой по количеству материал. Вся она четко делится на две неравные в количественном и хронологическом отношении группы. Меньшую ее часть составляют обломки гончарных сосудов (28 экз.), о чем будет сказано ниже. На памятнике доминирует лепная керамика железного века — 3760 фрагмен-

Кераміка з паселішча Паліцкае.

тов, среди них 82 днища от плоскодонных сосудов, 271 венчик и 3407 стенок. Рассматривая керамику, заметим, что подавляющее большинство посуды представлено в виде мелких обломков. Толщина стенок варьируется в пределах 0,4—0,8 см и изредка достигает 1 см, а днищ — от 0,5 до 1 см. Снаружи цвет их бурый, черный, светло-коричневый, а внутренняя поверхность — темно-бурая и черная.

О технологии изготовления посуды мастерами-керамистами необходимо сказать следующее. В процессе подготовки глины к лепке в тесто специально подсыпались искусственные отощители, такие как дресва, шамот и, по-видимому, болотная руда. Включения шамота видны на внешней поверхности крайне редко. Для этих целей мастер использовал не только керамический бой, но и обожженную глину. Комочки последней заметны иногда на поверхности как окатанные. Дресва, в отличие от шамота, хорошо видна как в изломах, так и на поверхностях фрагментов. Ее зерна с угловатыми гранями имеют величину 0,05—0,5 см. В формовочной массе искусственные добавки вымешивались неравномерно, поэтому в отдельных обломках дресвы очень много. Но есть и такие фрагменты, на которых она почти незаметна. В лощеной керамике ее нет. Отметим, что разная степень измельченности дресвы соответствует определенной толщине стенок лепных сосудов: мелкие зерна присутствуют у тонкостенных, а крупные — у толстостенных.

Формовка сосудов начиналась с изготовления дна и придонной части. Фрагменты придонных частей и днищ позволяют отметить три варианта соединения плоского дна и стенки. В одних случаях низ стенки прикреплялся к плоскому дну сверху, и тогда наружная поверхность стенки заглаживала торец диска дна. В других — края торца днища заворачивались вверх, а стенка снаружи присоединялась к горизонтальному низу и заглаживалась под дно. В третьих — днище и стенка присоединялись друг к другу под тупым углом, как два острых угла. Разломы нижних частей сосудов позволяют говорить о том, что мастера поселка лепили посуду, используя не только донный, но и донно-емкостный начин. Образцы донного начина уже рассмотрены. Вариант донно-емкостного сводился к тому, что из кома глиняного теста формировалось не только плоское дно, но одновременно конструировались придонные части стенок тулова. Судя по наблюдениям, этот способ начала лепки был свойственен профилированным горшкам милоградного облика. У одного сосуда, изготовленного рассмотренным способом, высота придонной стенки от дна снаружи составляла 2,5 см, а с внутренней стороны — 1,5 см. Стенки тулова сосудов, как и их верхняя часть, наращивались путем ленточно-кольцевого налепа. Нельзя не отметить, что способы обработки поверхностей у готовых изделий были разные. В коллекции обломков посуды нами выделены следующие разновидности фактур: груболепная, штрихованная, гладкостенная и лощеная. Шершавая внешняя поверхность с выступающими зернами дресвы и бугристыми неровностями — свидетельство ее плохого заглаживания. В то же время внутренние поверхности стенок у груболепных горшков заглажены немного лучше. Следы внутреннего заглаживания позволяют говорить о горизонтальных движениях руки мастера по

тулову. Штриховка изредка покрывала всю поверхность горшков. Чаще она начиналась от плечика и продолжалась до дна либо придонной части. Венчик с шейкой были незаштрихованными. В обиходе у жителей городища была не только грубая, но и хорошо обработанная посуда — гладкостенная и лощеная. У гладкостенных сосудов поверхность тщательно заглажена и зерна дресвы с шамотом почти незаметны. Внешние и внутренние поверхности у них ровные, гладкие. Цвет преобладает коричневый. Лощеная посуда была черного и бурого цвета. Весьма показательно соотношение выделенных фактур посуды на изучаемом памятнике. Подсчеты показали, что на первом месте в количественном отношении была посуда с грубой фактурой (51,7%), на втором — штрихованная (44,2%), на третьем — гладкостенная (3,5%) и на четвертом — лощеная (0,6%). В расчет не принимались только днища. Отмеченные способы обработки поверхностей посуды наибольшее распространение имели у жителей городища, как видим из стратиграфических наблюдений, в третьем — пятом раскопочных пластах, которые соответствуют горизонту супеси черной окраски.

Весьма важной для нас является форма сосудов, которыми пользовались обитатели поселка. Выявить в культурном слое развалы горшков не удалось, несмотря на скопления керамики в некоторых местах. Материалы коллекции не позволили склеить хотя бы один горшок. Реконструкции частей сосудов по крупным фрагментам показывают, что отдельные горшки имели диаметр по краю венчика 21,3, 22,5, 24, 26, 28 и 42 см. У самых малых диаметр равен 14 и 9 см. Верхние части горшков имели отогнутый наружу край венчика. Венчики были следующих разновидностей: с горизонтальным срезом края, с закругленным верхом и утончающиеся к краю. Один из небольших сосудов имел расширение округлобокого тулова до 10 см в средней части высоты. Небольшое количество крупных обломков сохранилось с плечиками и верхними частями расширения тулова. Данное обстоятельство позволило зафиксировать размеры максимального расширения тулова у горшков конической формы. У маленьких эти данные равны 11—16 см, у сосудов средней величины — 22—24 см, тогда как у больших они достигают 30—43 см. Заметим, что в коллекции рельефные плечики двух видов: с закругленным ребристым выступом и с биконическим ребром. Горшки с биконическим ребром были редкостью на поселении, о чем свидетельствуют единицы обломков (20 шт.). Среди фрагментов есть одна стенка, которая на внешней поверхности имеет оттянутое ребро в виде рельефного биконуса. В большем количестве в пользовании у жителей городища находились горшки с ребристым плечиком закругленной формы. Один из крупных фрагментов штрихованного горшка имеет цепочку горизонтальных защипов через равные промежутки. Они нанесены по закругленному ребру плечика. Горизонтальные защипы по плечику — редкий орнамент на штрихованных сосудах. А.В.Ильютик отмечает такие факты на городищах Лабенщина и Збаровичи (Ильютик, 1995, с. 67; Она же, 1998, с. 27). Исходя из материалов керамического комплекса, на данном памятнике можно выделить две разновидности горшков: профилированные S-образной формы и ребристые.

Профилированные сосуды имеют отогнутый наружу венчик, суженную шейку, плавно переходящую в округлобокое тулово. В придонной части тулово сужалось и переходило в уплощенное дно небольшого диаметра. У рассматриваемых горшков шейки были как плавно вогнутые, так и с резким изгибом под тупым углом. Большинство венчиков сломано по изгибу шейки. Верхние половины профилированных горшков имеют некоторое подобие с сосудами милоградской культуры, за что их следует называть милогроидными. Шейки у профилированных сосудов украшались иногда ямочными вдавлениями в один ряд через определенные промежутки. Ямочки выполнены круглой в сечении палочкой, которая ставилась перпендикулярно поверхности сырого изделия. Фактура у них груболепная и штрихованная.

Горшки ребристой формы имели плоское дно. Стенки тулова расширялись прямо от дна к плечикам. Плечики у них в виде рельефного выступа, который постепенно переходит в вогнутую шейку. Верхние части у рассматриваемых сосудов были трех разновидностей: у одних венчик был наклонен внутрь, образуя тупой



Глянцаваная і ганчарная кераміка з Паліцкага гарадзішча.

угол с туловом; у других плавным изгибом шейки он отгибался наружу, у третьих от плечика венчик наклонялся внутрь, но верхний край его затем отгибался наружу. Степень отогнутости венчиков была разной — от 10 до 30°. На Палицком городище у ребристых горшков преобладали венчики третьей разновидности.

Керамический комплекс позволяет констатировать лишь такие формы посуды, как горшки профилированных и ребристых форм. Сосуды же баночной формы у населения данного поселка в употреблении не имелись. Посуда баночных форм редко встречалась и на других поселениях «штриховиков» в бассейне Березины, о чем свидетельствует ее низкий удельный вес по сравнению с охарактеризованными выше формами (Ильютик, 1998, с. 26–28, табл. 3,4).

Ассортимент посуды у жителей изучаемого поселения не ограничивался горшками профилированных и ребристых форм, которые имели грубую и штрихованную поверхности. Обломки стенок гладкостенных сосудов толщиной 0,4 см могут свидетельствовать о небольших размерах столовой посуды. Обломки мисок не имеют нагара. А лощеная посуда на городище Палицкое — явление редкое. Горшки и миски были небольших размеров. Крупный обломок лощеной миски имеет диаметр по ребру максимального расширения 24 см. Использование лощеной посуды было ограниченным. Ее употребляли, по-видимому, для хранения жидкостей либо в ритуальных целях.

На всю керамическую коллекцию приходится две стенки, плечико и шейка от сосудов со сквозными отверстиями. Такое явление некоторые московские археологи рассматривают как «следы починки сосудов» (Розенфельдг, 1974, с. 117). Гладкостенная, лощеная и штрихованная посуда на поселении не орнаментировалась.

Визуальный осмотр фрагментов керамики позволил отобрать стенки, днища и венчики с отпечатками зерен растений. В коллекции 1995 года было 8 обломков с 9 отпечатками (на одном два). А в материалах 1996 года у 10 фрагментов имелось по одному отпечатку. Интересно, что у найденных в 1995 году преобладали оттиски пшеницы, а в 1996 году – проса. Среди всех 19 оттисков 10 — от проса, 7 — от пшеницы и 2 — от других злаковых культур. Идентификацию их выполнил кандидат биологических наук Д.И.Третьяков в лаборатории систематизации растений Института экспериментальной ботаники НАН Беларуси. Несмотря на малое количество фактов искусственных добавок зерен растений в формовочную массу, они все же нуждаются в объяснениях. Рассматриваемое явление имело место у жителей городища, хотя и носило, видимо, весьма ограниченный характер. Нам представляется, что вряд ли оно было обусловлено технологической необходимостью. Если бы это было так, то отпечатки зерен растений обнаруживались бы почти на каждом обломке посуды, как это наблюдается с другими примесями. Единичность же подобных случаев, с нашей точки зрения, следует рассматривать как результат каких-то ритуальных действий. Такие действия — обрядность, которую можно связывать с аграрной магией. При каких обстоятельствах она осуществлялась, неизвестно. Вполне возможно, что такое символическое действие, как осыпание зерном, выполнялось в первый день весенней

пахоты либо же в начале или по окончании уборки нового урожая. Думается, нельзя исключать и обожествления самого процесса изготовления посуды местным мастером (Лошенков, 1994б, с. 95; Лашанкоў, 1997а, с. 32). Возможно, зерном осыпали начало работы ученика, своеобразно приобщая его к будущему ремеслу, или таким действием переводили молодого умельца в профессионального мастера. Зерна растений мастер мог подсыпать в глиняное тесто для лепки специальной ритуальной посуды. Рассматриваемый факт не единственный на памятниках раннего железа лесной полосы Беларуси. Автором уже отмечались подобные немногочисленные случаи на городищах Эсьмоны в Белыничском, Петровичи в Бобруйском районах и поселении Сорочи в Любанском районе (Лашанкоў, 1994а, с. 30; Он же, 1997а, с. 32). Ранее отпечатки зерен на древней керамике отмечались исследователями у населения милоградской и зарубинецкой культур (Мельниковская, 1967, с. 97; Пачкова, 1974, с. 11—30, табл. 1).

Коллекция фаунистических материалов из раскопов небольшая, всего 205 экземпляров (4,2% от всех материалов), в числе которых 28 зубов и 177 костей. В культурном слое поселения они встречались планиграфически и стратиграфически неравномерно. Зубы и кости животных фиксировались в отдельных местах преимущественно в четвертом, пятом и шестом раскопочных пластах. Единичными экземплярами фоссилии находились во втором, третьем, седьмом и восьмом пластах и ямах. В первом пласте они не выявлены. Целых костей и зубов почти не сохранилось, большинство их выявлено в разломанном и полуистлевшем виде. Среди них много обломков от разбитых трубчатых костей, что говорит о преднамеренном их расщеплении для употребления костного мозга. П.Ф.Калиновскому удалось определить 21,5% всех материалов. Среди 44 определимых костей и зубов остатки только домашних животных. Крупный рогатый скот — 32 фоссилии принадлежат 8 особям. На втором месте по количеству особей находится свинья. От трех голов животных есть четыре экземпляра костей с зубами. Останков лошади мало — 7 костей от двух особей. Исходя из материалов, последнее место в домашнем стаде занимал мелкий рогатый скот: козы, овцы. Они представлены минимальным количеством костей. Выполненная П.Ф.Калиновским работа позволила определить не только видовую принадлежность животных, но и, что очень важно, установить количество особей — 14. Учитывая то, что 78,5% остеологической коллекции оказалось непригодной для определения видов, можно полагать, что среди них были остатки и диких животных. Трудно себе представить, что, проживая в лесной местности, обитатели изучаемого городища не занимались охотой. На памятниках населения этой же культуры Кимия, Лабенщина, Новоселки, которые находятся в 150 км северо-западнее Палицкого, кости диких животных есть в культурном слое (Митрофанов, 1978, с. 44, 46—47, табл. 11).

Часть коллекции массовых материалов на поселении составляют отходы черной металлургии — шлаки. Их собрано 906 кусков, что составляет 18,4% всех находок. В толще культурного слоя куски шлаков встречались неравномерно. Они фиксировались с первого по шестой раскопочные пласты включительно. Подсчеты показывают, что наиболее насыщенными являлись второй (98 шт.), третий (116 шт.), четвертый (219 шт.) и пятый (118 шт.) пласты. Попадались шлаки и в материковых ямах, где их выявлено 261 единица. Так, в одной яме на склоне останца их имелось 250 штук. Довольно часто шлаки фиксировались по одному куску на квадрат, а в некоторых квадратах вовсе отсутствовали. Вместе с тем в отдельных местах раскопов они встречались концентрированно. В подавляющем большинстве шлаки металлургии железа были небольших размеров. Куски большой величины — явление редкое. В коллекции шлаки густотекучие, пористые и со стекловидной коркой. Визуальный просмотр показал, что отдельные куски содержат отпечатки древесины либо древесного угля.

Помимо статистических подсчетов, стратиграфических и планиграфических наблюдений, визуальных просмотров, они проверялись еще на взаимодействие с магнитом. Из всей коллекции шлаков 75 реагируют на магнит. Одни слабо притягиваются, другие — удерживают себя в «подвешенном» состоянии, а третьи — очень сильно «держатся» за магнит. Благодаря последнему обстоятельству



Знаходкі з бронзы (1—4), гліны (5—10) і крэменю (11) з Паліцкага гарадзішча.

М.Ф.Гуриным обнаружены два небольших кусочка железа. Исследование отходов металлургии магнитом показало, во-первых, что вместе с кусками шлаков иногда выбрасывались и кусочки железа, а во-вторых, небольшое количество железа (доли процента) оставалось в шлаках, о чем свидетельствует их слабая реакция на магнит. Несмотря на то, что получена большая коллекция отходов металлургии железа, найти объекты его производства — развалы печей-домниц на исследованном памятнике не удалось. Не обнаружены в слое поселения и железные изделия кузнецов, относящиеся к последним векам до н. э. — началу I тысячелетия н. э. Это можно объяснить только тем, что на раскопанной окраине городища железных предметов просто не было. А те изделия, которыми пользовались обитатели поселка, уже навсегда поглощены рекой.

Небольшая коллекция индивидуальных предметов в зависимости от материалов изготовления делится на изделия из камня, бронзы и глины.

Среди каменных орудий труда есть два сделанные из кремня. Одно из них — сечение пластинки с заломами по краям, согласно определению В.П.Ксензова. Оно продолговатой формы и трапециевидное в сечении. Пластинка, несомненно, являлась вставкой какого-то комбинированного орудия. Другое — по определению И.Н.Езепенко — скобель. Он сделан из обломанной пластины и оформлен крутой ретушью по одному краю. Размеры кремня: длина 2,5 см, ширина 1,5 см, толщина от 0,45 до 1 см. На одном участке пластины есть меловая корка.

Значительно большую часть каменных предметов составляют находки зернотерок. В культурном слое памятника их обнаружено семь единиц. В числе выявленных четыре нижних камня, включая обломки. Для нижних камней зернотерок жители поселка использовали валунный камень серого цвета, по-видимому, гранит. О размерах рассматриваемых орудий можно судить по наиболее сохранившемуся экземпляру, который состоит из пяти кусков. Размеры камня: длина 16 см, ширина — 13,5 см, толщина — 10 см. У данной зернотерки есть три рабочие плоскости. Самая большая из них — прямоугольной формы с закругленными углами. Две другие, треугольной и овальной формы, — меньших размеров. Они находятся на боковых поверхностях. Все рабочие поверхности у нижних зернотерок шершавые с неглубокими ямочками-насечками. Верхние камни зернотерок — терочники — также найдены на поселении. Их три. Они имеют естественную округлую форму и по одной рабочей стороне. Размеры их разные, от 4х6 см и более. Они удобны для удержания в одной руке. Таким образом, судя по материалам раскопок, жители Палицкого городища для размалывания зерна в муку пользовались одноручными зернотерками, вероятно, небольших размеров.

Металлических изделий обнаружено примерно на половину меньше, чем каменных. Важно подчеркнуть, что все они бронзовые: две булавки, браслет и стержень. Булавки разных видов. Они сделаны из круглой в сечении проволоки толщиной 0,3 см. У них обломаны нижние концы стержней, поэтому длина изделий неизве-

стна. Одна из булавок посоховидная. Она имеет навершие округлой формы большого размера (2,6х3,1 см). S-видный завиток в виде маленького колечка, конец которого раздвоен. Другая булавка — зажим. Ее конструкция вполне соответствует такой функции. Верхняя часть ее — небольшое кольцо-пружина, от которой отходят параллельно два стержня. Один, прямой и более длинный, к концу утончается. Второй тоже длинный (до 5,5 см), но короче первого. Его конец расклепан в пластинку и загнут в колечко наружу. Булавки-зажимы — новый тип. Они встречаются пока только на памятниках бассейна Березины. Кроме Палицкого, они найдены еще на городищах Чижаха, Щатково и селище Красная Зорька. Всего известно пять булавок данного типа.

Браслет найден в деформированном виде и разломанным на четыре части. Форма его овальная, концы разомкнуты. Он сделан из граненой проволоки сечением 0,4х0,45 см. Внутренняя поверхность браслета линзовидно выгнутая, внешняя — биконическая, бока закруглены. Максимальная толщина стержня — в средней части изделия, а концы у него утончаются. В слое поселения найден еще один бронзовый предмет — граненый стержень с нарезным орнаментом. Длина его 3,8 см, толщина 0,3х0,43 см.

Глиняных изделий из раскопов происходит немного. Пряслиц всего шесть. Целых среди них нет. Обломки позволили сделать реконструкцию их форм. По способу изготовления они разные: четыре лепные и одно точеное из стенки чернолощеного сосуда. Размеры пряслиц такие: диаметры от 2,6 до 3,4 см, толщина 0,5—2,5 см, отверстия 0,5—1,1 см. Лепные пряслицы, как и посуда, с примесями дресвы. Цвет их коричневый. Еще две пряслицы найдены Л.В.Жихаревой и Л.Д.Поболем (Жихарева, 1971, с. 46; Поболь, 1974, рис. 94: 9).

Материалы раскопок городища Палицкое убедительно показывают принадлежность его населения культуре штрихованной керамики. С нашей точки зрения, их нельзя отождествлять с племенами милоградской и зарубинецкой культур, как это делалось ранее (Лашанкоў, 1997а, с. 32—33). Ярким подтверждением сказанному является рассмотренный нами керамический комплекс. Тем не менее не существует единого мнения о рассматриваемых древностях. Так, А.А.Егорейченко активно отстаивает милоградскую и зарубинецкую атрибуцию подобных материалов (Егорейченко, 1996, с. 66, 68—69; Он же, 1997, с. 75; Егарэйчанка, 1999а, с. 117—118; Он же 1999б, с. 223). Охарактеризованные индивидуальные находки с Палицкого городища не имеют узких датировок. Население изучаемого памятника являлось частью общего массива племен «штриховиков», проживавших в бассейне Березины во II в. до н.э. — I в. н.э. (Лошенков, 1996, с. 51—53; Лашанкоў, 1997б, с. 147—155; Ильютик, 1998, с. 25—39).

В начале 60-х годов рядом с городищем Палицкое найден случайно фрагмент железного наконечника копья (Поболь, 1974, с. 272, рис. 94: 11). Длина сохранившегося экземпляра 13,6 см. Перо у него обломано. Оно ромбовидное в сечении. Его длина до излома около 9 см, а ширина — 2,6 см. Перо плавно переходит в черенок, прямоугольный в сечении (0,8х0,3 см). Утончающийся конец черенка обломан. Форма сохранившегося экземпляра позволяет найти ему аналоги. По классификации наконечников копий балтского населения В.Казакявичюса, он относится ко 2 группе VIII типа, черешковых, лавролистообразной формы (Казакявичюс, 1988, с. 22, 57—60). Подобные наконечники датируются VII—VIII в.в. н.э. Они были характерны для легто литовских и угро-финских племен в указанное время, а в начале IX в. н.э. выходят из употребления.

На рассматриваемом памятнике выявлены в небольшом количестве материалы начала II тысячелетия. В процессе раскопок в первом и втором раскопочных пластах обнаружена керамика от посуды, изготовленной на гончарном круге. Среди 28 обломков — 12 венчиков и 16 стенок. Формы венчиков разные. На этом поселении гончарную керамику в небольшом количестве находили Э.М.Загорульский и Л.Д.Поболь (Лашанкоў, 1997а, с. 33), встречалась она и в пойме около городища (Шутаў, Улашчык, 1930, с. 116). Кроме керамики эпохи Киевской Руси, из слоя поселения происходят еще бронзовый бубенчик и железная шпора. Бубенчик находился во втором пласте на глубине 0,35 м от поверхности. Он шарообразный с одной продольной прорезью внизу, в средней его

части есть три неглубоких ровика. Диаметр шара около 2,3 см. Украшение найдено в деформированном состоянии. Подобные вещи датируются XI—XIII в.в. н.э. (Дучыц, 1991, с. 52). Железная шпора была в первом пласте, рядом с остатками сгоревшего столба, на глубине около 0,2 м. Дуга шпоры V-образной формы. Одна из ее боковых сторон слегка деформирована. По форме дужки она близка к группе «угловых» шпор III типа по классификации А.Н.Кирпичникова (Кирпичников, 1973, с. 65—66). На краях дужки — пластинчатые петли прямоугольной формы с двумя узкими прорезями для крепления кожаными ремнями. Шип соединен с дужкой под прямым углом и опущен вниз, он простой формы. Такие шпоры по аналогиям датируются XII—первой половиной XIII в. (Кирпичников, 1973, с. 65—66).

Вышеотмеченные материалы начала II тысячелетия н.э. оставлены, несомненно, населением летописных племен дреговичей. Отметим, что заметного горизонта культурного слоя славян-дреговичей на Палицком городище не зафиксировано. Следы же их непродолжительного пребывания на городище раннего железа есть. В каких целях использовалось укрепленное поселение «штриховиков» славянским населением, сказать трудно. Присутствие славян зафиксировано не только около городища в пойме, но и еще в нескольких местах. В 0,6 км западнее данного памятника, в лесу, есть одиночный курган. В 1 км далее на запад, на левом берегу речушки Кровавой, протекающей между деревнями Новоселки и Палицкое, напротив бывшего поселка Ямного имелась курганная группа из шести насыпей. В 0,8 км северо-западнее городища, в лесу — одиночный курган по дороге в деревню Притерпа. Эти факты свидетельствуют о проживании в данной местности немногочисленного сельского населения дреговичей.

В результате раскопок городища Палицкое удалось установить следующее. Это укрепленное поселение было основано балтскими племенами культуры штрихованной керамики примерно во II в. до н. э. Жизнь на нем продолжалась около трех веков. К концу I в. н.э. поселок прекращает функционировать. Подобное явление наблюдается и на близлежащих памятниках: Чижаха, Щатково, Петровичи. Примерно через тысячу лет в окрестностях Палицкого городища появляются славяне-дреговичи. Сельское население дреговичей, по-видимому, немногочисленное, оставило следы своего пребывания не только на городище «штриховиков», но и на сопредельной с ним территории.

Друкуецца паводле: Лошенков М.И. Городище Палицкое// Is baltų kulturos istorijos. Vilnius, 2000.

Свіслацкае княства

Прыкладна з апошняй трэці 1-га тысячагоддзя нашай эры пачынаецца пранікненне на тэрыторыю Беларусі славянскіх плямён і фарміраванне дзяржаўных адносін у іх асяроддзі. На жаль, немагчыма падрабязна прасачыць храналогію падзей тых даўніх гадоў, але ўсё ж археалагічныя помнікі, старажытныя летапісы, даныя тапанімікі і этнаграфіі даюць магчымасць уявіць карціну гэтай эпохі.

Першыя славянскія плямёны, якія з'явіліся з сярэдзіны VI ст. н.э. да VIII ст. н.э. на тэрыторыі цэнтральнай Беларусі, былі, верагодней за ўсё, дулебы, але замацавацца на новых землях ім не ўдалося — літаральна праз некалькі дзесяцігоддзяў яны былі часткова знішчаны, а часткова адціснуты на левабярэжжа Бярэзіны больш дужымі і ваяўнічымі дрыгавічамі.

Цікава, што нягледзячы на адносна кароткі перыяд існавання, аб дулебах засталіся ў народнай памяці добрыя ўспаміны. Шэраг населеных пунктаў на левым беразе Бярэзіны носіць назву Дулебы, Дулебія і г.д., а ў адной з кніг Г.Х.Татур прыводзіць легенду, запісаную ім у Ігуменскім павеце (паўночна-заходняя частка сучаснага Асіповіцкага раёна некалі ўваходзіла ў Ігуменскі павет). «Некалі ўсю мясцовасць... займаў народ Дулы, які вызначаўся вельмі ціхмяным і добразычлівым норавам. Аднойчы правадыр яго, Кумар, выйшаў са свайго жытла і са здзіўленнем і занепакоенасцю ўбачыў на зямлі «тор» ад калёс...» (Татур Г.Х. Очерк археологических памятников на пространстве Минской губернии и ее археологическое значение. Мн., 1889. С. 241.) Гэта быў, як

лічыць Г.Х.Татур, след перадавога атрада чужынскай разведкі). Сапраўды, праз некаторы час невядомае племя ўварвалася на зямлю дулаў. Правадыр захопнікаў Гуд выклікаў Кумара на адзінаборства і адсек яму галаву.

У 2-й палове IX ст. дрыгавічы займалі вялікую плошчу паміж Прыпяццю і лініяй Навагрудак — Мінск — Барысаў.

Тагачаснае асваенне новай тэрыторыі мела своеасаблівы характар — людзі сяліліся толькі там, дзе ўжо існавалі прыдатныя для жыцця і вядзення гаспадаркі ўмовы. Колькасць такіх мясцін была абмежаваная, і здаралася, што на адным месцы паслядоўна жылі роды і плямёны розных эпох і культур. У цэнтры размяшчалася гарадзішча вядучага роду, а ў наваколлі сяліліся роды-сатэліты.

Л.В.Аляксееў, вывучаючы асаблівасці рассялення славян у IX — X ст., вызначыў, што ўсе іх паселішчы групаваліся вакол пэўных цэнтраў, своеасаблівых племянных сталіц. У цэнтральнай частцы Беларусі сярод такіх цэнтраў, на месцы якіх зараз існуюць гарады Мінск, Клецк, Слуцк, і было гарадзішча Жужлянка, згінуўшае ў віры бязлітаснага часу. Рэшткі яго знаходзяцца на тэрыторыі сучаснага Асіповіцкага раёна. Фарміраванне дзяржаўных адносін у цэнтральнай Беларусі ў канцы IX ст. спрыяла развіццю гандлю паміж яе рознымі часткамі. Адзінымі надзейнымі шляхамі зносін у той час былі рэкі, і тэрыторыя Жужлянскай воласці, па якой працякалі Свіслач, Бярэзіна, Пціч і вялікая колькасць іх прытокаў, стала ажыўленым гандлёвым перакрыжаваннем: па Пцічы адкрываўся шлях у Прыпяць да Пінска і Турава — дрыгавіцкіх цэнтраў, па ёй жа ішла дарога на Валынь і ў польскія землі (на гарадзішчах Асіповіцкага раёна былі знойдзены шыферныя прасліцы — тыповы валынскі экспарт IX — X ст.). Рухаючыся па Пцічы ўверх, можна было дайсці да Балтыйскага мора (цераз волак каля Мінска і далей па Нёмане), а па Свіслачы і Бярэзіне ішоў галоўны гандлёвы шлях з Беларусі ў Ноўгарад — на поўнач і ў Кіеў — на поўдзень. На тэрыторыі Жужлянскай воласці Свіслач і Пціч сыходзіліся вельмі блізка, а некаторыя іх прытокі пачынаюцца літаральна з адной крыніцы. Гэта асаблівасць гідраграфічнай сеткі была добра вядома нашым продкам, якія злучылі цераз прытокі Свіслач і Пціч, адкрыўшы такім чынам яшчэ адзін гандлёвы шлях — з Оршы і Друцка на Валынь, Польшчу і Прусію. Галоўны шлях са Свіслачы ў Пціч пачынаўся ва ўрочышчы Вусце — там ладдзі з таварам пераходзілі ў рэчку Сінька, падымаліся па ёй уверх да вусця ракі Карчанка і па ёй ішлі да вялікага балота-возера, што знаходзілася ў раёне сучаснай в. Караны. Цераз балота ладдзі перавалаквaліся у Чырвоную рэчку — левы прыток Пцічы. На думку аўгара, старажытны Глуск, зараз в. Гарадзішча Глускага раёна, размяшчаўся каля месца ўпадзення Чырвонай рэчкі ў Пціч.

Верагодна, паміж Свіслаччу і Пціччу існаваў яшчэ адзін волак — па рэках Талька і Суцінка.

Акрамя рачных гандлёвых шляхоў у IX — X ст. пачала развівацца сетка сухапутных дарог, адна з якіх, верагодна, так званая дарога Вітаўта — шлях з Кіева ў Ноўгарад, прайшла праз Жужлянскую воласць.

Дарога гэта ў адрозненне ад большасці сухапутных шляхоў Усходне-Еўрапейскай раўніны, якія выдзяляліся на мясцовасці толькі каменнымі бабамі (слупамі-арыенцірамі), курганамі ды раскіданымі дзенідзе касцямі, была добра наезджана, ва ўсялякім разе на жужлянскай зямлі. Справа ў тым, што яна ішла па вузкім прыбярэжным вале высокага правага берага Бярэзіны, за якім адразу пачыналіся вялікія балотныя масівы, і тагачасны вандроўнік проста не мог выбраць іншы напрамак і быў вымушаны рухацца па ўжо пракладзенай каляіне. Характэрна, што дарога гэта была да таго зручная, што праіснавала амаль да сярэдзіны XIX ст. (на карце маёнтка Незабытоўскіх добра бачна сцежка, якая пятляе ўздоўж берага Бярэзіны, заварочвае да старажытных паселішчаў Чучча, Вуглата, Свіслач і заходзіць на добра бачныя гарадзішчы Вуглата і Ялізава. (Нацыянальны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 120. Воп. 2. Спр. 81.) Крыху пазней з'явіліся яшчэ 2 сухапутныя шляхі Слуцк — Свіслач — Друцк і Глуск — Свіслач. Той, хто кантраляваў шляхі зносін, меў з гэтага пэўны прыбытак. Развіццё гандлю спрыяла ўсебаковаму ўздыму Жужлянскай воласці. Ужо ў пачатку X ст. у ёй склалася дастаткова развітая земля-

робчая культура. Пачалі выкарыстоўвацца больш эфектыўныя прылады працы: барана-смык, двух- і трохзубыя сохі з жалезнымі сашнікамі, каса-гарбуша, сярпы вялікіх памераў. Новы інвентар дазволіў узняць прадукцыйнасць сельскай гаспадаркі, што забяспечыла базу для развіцця грамадскіх адносін, і ў гістарычна кароткія тэрміны радавая абшчына змянілася суседскай, якая ў сваю чаргу пачала ператварацца ў класавае грамадства. У X ст. сярод жыхароў усходніх славянскіх плямён з'явіліся элементы сацыяльнага раздзялення.

У IX—X ст. паводле свайго сацыяльна-эканамічнага стану, узроўню ўмацаванасці і інш. паселішчы дзяліліся на сёлы, весі і гарады, а таксама існавалі і іншыя ўмацаванні — пагосты. У мірны час яны былі цэнтрамі рэлігійнага жыцця, а ў ваенны за іх трывалымі сценамі хаваліся жыхары навакольных паселішчаў. Жужлянка ў апошні перыяд свайго існавання (X—XI ст.) таксама ператварылася ў пагост.

Дрыгавічы ўвайшлі ў склад Кіеўскай Русі ў 2-й палове IX ст. Уплыў Кіева на землі паўднёвай і цэнтральнай частак Беларусі праяўляўся ў асноўным «эканамічна». Тагачасныя візантыйскія хронікі адзначаюць, што «...па ўсіх Дняпроўскіх прытоках жывуць даннікі кіеўскага князя... у якасці даніны прыганяюць у Кіеў лодкі, зробленыя ў вярхоўях рэк». (Рыбаков Б.А. Киевская Русь и русские княжества XII—XIII вв. М., 1982. С. 68—73.)

Пашырэнне сферы ўплыву Кіева ў бок Полацкага княства не абыходзілася без прымянення сілы, што, безумоўна, адбівалася на жыцці Жужлянскай воласці. Так, ужо ў IX ст. кіеўскія князі Аскольд і Дзір спрабавалі захапіць Полацк. Іх войска ішло ўздоўж Бярэзіны і, значыць, не магло абмінуць Жужлянку.

Прыкладна праз 100 гадоў пасля паходу Аскольда і Дзіра пачалася міжусобная барацьба паміж дзецьмі кіеўскага князя Святаслава Ігаравіча. Па нашай зямлі ў той час прайшла на поўдзень наўгародская дружына Уладзіміра Святаславіча, які намагаўся выгнаць з Кіева свайго старэйшага брата Яраполка.

«Па дарозе» наўгародцы разбурылі Полацк і падпарадкавалі Полацкую зямлю «старэйшым» рускім гарадам.

Пасля смерці Уладзіміра Святаславіча пачаўся новы этап барацьбы ў родзе кіеўскіх князёў. Дзеці Уладзіміра настолькі ўцягнуліся ў бойку паміж сабой, што князь полацкі Брачыслаў Ізяславіч (унук Уладзіміра і Рагнеды) адважыўся на захоп паўднёвых беларускіх зямель.

Аднак спроба пашырэння Полацкага княства вылілася ў шматгадовую вайну, якую з пераменным поспехам давялося весці не толькі Брачыславу, але нават і яго сыну Усяславу Чарадзею. Гэта міжусобная вайна цяжка адбілася на жыцці Жужлянскай воласці. Ю.І.Драгун лічыць, што Жужлянка была ў гэты час разбурана і спалена, верагодна, полацкім войскам. (Драгун Ю.И. Раннеславянские поселения в нижнем течении р. Свислочь // Белорусские древности. Мн., 1967. С. 422—431.) Значная частка насельніцтва воласці, каб пазбегнуць наступстваў ваенных дзеянняў, перасялілася на поўдзень, у раён сучасных вёсак Усціж, Брыцалавічы, Гарожа, Ясень. Прыкладна па гэтых мясцінах у канцы XI ст. устанавілася мяжа паміж Полацкім княствам і землямі, падуладнымі Кіеву. Палачане, верагодна, у 1-й палове XI ст. пабудавалі Свіслацкі замак — абарончы і гандлёвы фарпост на сваёй новай паўднёвай мяжы і пачалі каланізацыю захопленых дрыгавіцкіх зямель. Аб гэтым сведчаць археалагічныя знаходкі — рэчы ў выглядзе каня (конь — радавы знак крывічоў-палачан), а таксама тапанімічная спадчына — шэраг населеных пунктаў мае назвы, аналагічныя тыповым крывіцкім, напрыклад, Вязаўніца, Вяззе, Вязычын (ёсць у Мінскай і Смаленскай абласцях). Назва вёскі Цэль, відавочна, дадзена новымі гаспадарамі, бо для іх гэта было новае месца — цаліна.

Экспансія палачан адрэзала Глуск ад раней адзінай воласці, але новаму цэнтру — Свіслачы — падпарадкаваліся землі дулебаў на левым беразе Бярэзіны (сучасны Клічаўскі раён). З умацаваннем Свіслачы зноў аджылі старажытныя гарадзішчы — Навасёлкі, Вуглата, Цэль, што, безумоўна, гаворыць аб грамадска-эканамічным уздыме, які перажывала воласць у канцы XI ст.

Але ўздым гэты не меў пад сабой трывалага грунту — хваля драбнення Рускай дзяржавы і бязлітасныя міжусобныя войны мелі для свіслацкай зямлі самыя трагічныя вынікі.

У самым пачатку XII ст. ад Полацкай зямлі аддзялілася Мінскае княства, да якога перайшла тагачасная Свіслацкая воласць. У выніку міжусобнай вайны паміж мінскім князем Глебам і кіеўскім князем Уладзімірам Манамахам паўднёвая частка Мінскага княства перайшла да Кіева.

Пасля смерці Манамаха полацкія князі ў 1125 г. і 1128 г. спрабавалі вярнуць свае ўладанні, але беспаспяхова — спустошаныя вайной землі цэнтральнай Беларусі неаднаразова пераходзілі з рук у рукі, і ўсё ж засталіся за кіеўскімі і чарнігаўскімі князямі. Слуцк і, па ўсёй верагоднасці, Свіслацкая воласць увайшлі ў склад Чарнігаўскага княства. Аднак пасля смерці чарнігаўскага князя Святаслава ў 1164 г. яго нашчадкі пачалі міжусобную вайну, у час якой далёкая беларуская ўскраіна княства засталася фактычна нічыёй. І з гэтага часу, верагодна, пачаўся адлік самастойнага існавання Свіслацкага княства.

У тагачасных летапісах новаму маленькаму княству, зразумела ж, удзялялася няшмат увагі, таму звесткі пра першы перыяд яго існавання вельмі фрагментарныя. Тым не менш дакументы (у асноўным больш позняга часу — XVI ст.) дазваляюць, зразумела, з пэўнымі агаворкамі, лічыць, што ўдзельнае Свіслацкае княства займала тэрыторыю сучасных Асіповіцкага, Бабруйскага, Клічаўскага раёнаў і значную частку Чэрвеньскага, Бярэзінскага, Кіраўскага, Светлагорскага, Акцябрскага, Старадарожскага і Пухавіцкага раёнаў. Насельніцтва княства складала прыкладна каля 10 тысяч чалавек, не менш, чым 90%, былі сяляне. Уздоўж Бярэзіны размяшчаўся шэраг гарадкоў-замкаў, якія ахоўвалі падыходы да сталіцы княства. Сярод гэтых умацаваных паселішчаў трэба адзначыць бліжэйшыя — Навасёлкі, Вуглата, Ялізава, Чучча, Бабруйск. Што ўяўляла сабой у той час Свіслач, была яна замкам ці горадам — дакладна невядома.

Станаўленне Свіслацкага княства прыпала на вельмі складаны гістарычны перыяд, калі да ўжо звыклых княжацкіх міжусобіц дадаліся заняпад сельскай гаспадаркі, шэраг прыродных катаклізмаў, іншаземныя нашэсці.

Аналізуючы звесткі, сабраныя вучоным Я.Р.Рыерам, можна зрабіць вывад, што ў канцы XII ст. у міжрэччы Свіслачы і Бярэзіны пачаўся адчувальны недахоп ворных зямель: на абодвух берагах Свіслачы, пачынаючы ад в. Цэль і да самага вусця, лес быў цалкам зведзены. (Риер Я.Г. Древние леса, один из способов реконструкции. Наука и жизнь. 1985. № 8.) Ад Вяззя і Гарожы высечкі працягваліся на некалькі кіламетраў у бакі, даходзячы да Ясеня на правым беразе і да лініі Ігнатоўка – Бозак на левым, змыкаючыся там з ачышчанай ад лесу прасторай уздоўж Бярэзіны. Высечаны лес быў таксама і ўздоўж Пцічы ад Жыціна да Лукі, прычым на левабярэжжы высечка падымалася да Пратасевіч і Цяплух.

На ачышчаных ад лесу мясцінах былі размешчаны палі. Аднак урадлівасць зямель была вельмі нізкая, і пры існуючым узроўні земляробчай культуры пашырэнне плошчы сельгасугоддзяў было немагчыма. Насельніцтва ж павялічвалася, што вяло да драблення надзелаў і канцэнтрацыі паселішчаў уздоўж рэк, каб карыстацца больш урадлівымі поймавымі землямі.

Пачатак XIII ст. адзначыўся шэрагам неўрадлівых гадоў: то засухі і пажары, то потым пайшлі зімы з лютымі маразамі. У Свіслацкім княстве пачаўся голад. Зразумела, неўраджаі здараліся і раней, але вынікі іх не былі такія цяжкія — недахоп збожжа звычайна пакрываўся экспартам з кіеўскіх зямель. На гэты раз дапамогі чакаць не было адкуль — неўраджай ахапіў амаль усю Старажытную Русь.

Страшэнны ўдар татара-мангольскіх заваёўнікаў давяршыў шэраг няшчасцяў рускіх княстваў. На землі Свіслацкага княства іх полчышчы, верагодна, не прайшлі, але наступствы нашэсця і гібелі магутнейшых рускіх княстваў для нашых продкаў былі адчувальныя: былое гаспадарчае жыццё было парушана, заняпаў гандаль, частка ўмацаваных гарадкоў (Навасёлкі, Вуглата) і некаторыя іншыя паселішчы (Зборск і Чучча) былі пакінуты жыхарамі.

Менавіта на гэты смутны час прыходзіцца першае ўпамінанне Свіслацкага княства ў Галіцка-Валынскім і Іпацьеўскім летапісах.

«...В лето 6764 (1256 г.) поиде Данило на Ятвизе с братом и сыном Львом и Шеварном, младу сущу ему и посла по Романа в Новгородок. И приде к нему Роман со всеми говгородци и с отцем

Глебом и со Изяславом со Вислочьским. И была рать велика, яко же наполнити болота ятвяжская полком». (Полное собрание русских летописей (ПСРЛ). Т. 2. М., 1962. Стб. 831.)

Прыведзены ўрывак з летапісу апісвае вельмі цікавы гістарычны эпізод — спробу Данііла, князя Чырвонай Русі (Валыні), знайсці саюзнікаў і васалаў для працягу барацьбы з татарамі. Важнай часткай яго планаў была перамога над літоўскімі і яцвяжскімі дружынамі і далучэнне да Валыні беларускіх зямель.

Імкненне Данііла знаходзіла ў душы ўдзельных князёў цэнтральнай Беларусі добры водгук, бо пасля разгрому паўднёвых рускіх княстваў яны апынуліся ў вельмі складанай палітычнай сітуацыі.

Для Ізяслава Свіслацкага, папярэднікі якога традыцыйна арыентаваліся на поўдзень, выбару ў гэтай сітуацыі наогул не было.

Але ж надзеі беларускіх князёў на Данііла не спраўдзіліся. Татары, якія пільна сачылі за дзейнасцю гэтага няўрымслівага князя, хутка ўбачылі ў ёй пагрозу і адправілі ў Галіцкае княства свайго лепшага палкаводца Бурундая з вялікім войскам.

Данііл, не бачачы магчымасці супраціўляцца, скарыўся, папярэдне падгаварыўшы Бурундая пайсці на Літву, і, хутчэй за ўсё, да гэтага часу трэба аднесці разбурэнне беларускіх гарадоў — Клецка, Слуцка і Свіслачы.

Татары ў цэнтральнай Беларусі не затрымаліся, так што з 2-й паловы XIII ст. тэрыторыя паміж Полацкам, Смаленскам, Гомелем і Мінскам засталася апошняй непадуладнай татарам тэрыторыяй былой Кіеўскай Русі.

Аднак праявы крызісу, з-за якога загінула некалі магутная Кіеўская Русь, працягваліся і на апошніх незалежных рускіх землях. Не спыніўся падзел зямлі — напрыклад, у свіслацкіх уладаннях у пачатку XIV ст. выдзяляюцца ўмацаваныя двары Глуск, Любашаны, горад Бабруйск. Прыпыніўся гандаль: вывозіць футра, мёд і іншыя мясцовыя тавары пасля заняпаду Кіева, асноўнага спажыўца, не было куды; да таго ж, зусім зніклі з абароту грошы. Заўважаўся прыкметны спад у развіцці сельскай гаспадаркі — асновы тагачаснага эканамічнага жыцця.

У суседняй Літве ў гэты час скончыўся перыяд міжусобіц, і літоўскія князі, карыстаючыся слабасцю Белай Русі, пачалі захоп зямель.

Ужо ў канцы 1-й трэці XIV ст. усходняя мяжа Літвы праходзіла якраз паміж Свіслацкім і Мінскім княствамі, а ў сярэдзіне XIV ст. Свіслач прызнала свой васалітэт у адносінах да вялікага князя Альгерда.

КРЫНІЦЫ:

1. Алексеев Л.В. Полоцкая земля. М., 1966 г.

2. Завитневич В.З. Археологические изыскания в бассейне реки Березины Отчет Императорской археологической комиссии за 1892 год. СПб., 1894.

3. Коробушкина Т.Н. Земледелие на территории Белорусии в 10 13 вв. Мн., 1979.

4. Лысенко П.Ф. Дреговичи. Мн., 1991.

Ю.В.Клеванец.

Свіслацкі замак

Узнікненне замка каля вусця р. Свіслач адносіцца да XI ст., калі ў выніку міжусобных войнаў паміж нашчадкамі кіеўскага князя Уладзіміра Святаславіча Полацкае княства здолела захапіць частку сучаснай цэнтральнай Беларусі і пачало ўмацоўваць новую мяжу.

Археалагічныя даныя сведчаць, што будаўнічыя работы вяліся ў Свіслачы з вялікім размахам: вал старажытнага гарадзішча культуры штрыхаванай керамікі быў ссыпаны ў роў з мэтай павелічэння плошчы пляцоўкі. Сам роў значна пашыраны, уздоўж яго насыпаны новы вал. Перыметр новай пляцоўкі ў выніку меў памеры 70х70 м (для параўнання: замак Уладзіміра Манамаха — Любеч, у якім праводзіліся княжацкія з'езды, меў памеры 60х30 м)[1]. Будаўніцтва гэтага абарончага фарпосту сведчыла аб вялікай увазе полацкіх князёў да абароны сваёй новай паўднёвай мяжы і гандлёвых шляхоў, якія тут праходзілі.

У час раскопак 1962—1971 гг. на месцы Свіслацкага замка знойдзена вялікая колькасць рэчаў XI ст., яўна прывезеных з-за мяжы. У першую чаргу гэта прадметы раскошы — шкляныя жаночыя бранзалеты і пацеркі, асколкі келіхаў, амфар і флаконаў.

Першасную ацэнку і класіфікацыю шкляных прадметаў зрабіла Н.Гаўрылюк[2]. Яна адзначыла, што знойдзеныя прадметы вельмі разнастайныя як па форме (напрыклад, сярод бранзалетаў вылучаюцца кручаныя, перавітыя, трохкутныя, рыфленыя і інш.), так і па колеры.

Аналіз якасці і тэхналогіі апрацоўкі матэрыялу дазваляе ўявіць характар і прыярытэтныя напрамкі гандлёвых зносін цэнтральнай Беларусі ў XI ст. Так, большая частка шкляных рэчаў (да 70%) зроблена ў Кіеве, сярод астатніх шмат прывезеных з-за мяжы старажытнарускай дзяржавы — з Закаўказзя, Карынфа, Херсанеса, Сірыі і інш.

Размяшчэнне на гандлёвым перакрыжаванні спрыяла росту дабрабыту жыхароў Свіслачы, што красамоўна пацвярджаюць археалагічныя знаходкі. Так, ва ўсіх 4 дамах, размешчаных унутры замка, былі драўляныя падлогі (сапраўдная раскоша для XI ст.), да таго ж знойдзена шмат прадметаў, якія распавядаюць аб укладзе жыцця ў замку. Гэта нажніцы, замкі, ключы, дужкі ад вядзёр, шыферныя прасліцы, жорны, разнастайныя рыбалоўныя прылады і інструменты для іх вырабу, сякеры (у тым ліку баявыя), зброя (наканечнікі стрэл і коп'яў, кісцяні), рэшткі даспехаў і конскай збруі, шахматная фігурка, бронзавыя крыжы-энкалпіёны, бронзавыя ўпрыгажэнні, мегалічны посуд і інш.[3] Мяркуючы па знаходках, можна

Абломкі грэчаскай амфары са Свіслацкага замка.

сцвярджаць, што жыхары Свіслачы займаліся паляваннем, рамесніцтвам, рыбалоўствам (вядома, што яшчэ ў XIX ст. у Бярэзіне лавілі асятровых рыб), але галоўным іх заняткам была тады вайна і баявая падрыхтоўка.

У перыяд існавання незалежнага Свіслацкага княства замак, як найбольш магутнае абарончае збудаванне, стаў рэзідэнцыяй князя.

На жаль, аб Свіслацкім княстве вядома пакуль мала. Шмат «белых плям» і ў гісторыі Свіслацкага замка і яго гаспадароў. Напрыклад, невядома, у які час умацаваны двор-замак пераўтварыўся ў горад.



Знаходкі з раскопак Свіслацкага замка.

Т.С.Скрыпчанка, якая даследавала з дапамогай спектральнага аналізу шкляныя бранзалеты, знойдзеныя ў Свіслачы, здолела вызначыць месца вытворчасці большай іх часткі. Але групу зялёных бранзалетаў, якія мелі своеасаблівы, непадобны на іншыя спектр, ідэнтыфікаваць па месцы вытворчасці не ўдалося. Апрача таго, зялёныя бранзалеты маюць своеасаблівае размеркаванне па археалагічных слаях (стагоддзях). Калі для ўсіх іншых бранзалетаў даследчыца вызначыла моцны спад у слаях, адпавядаюць сярэдзіне XIII ст., што прыкладна супадае з пачаткам татарскага нашэсця і прыпыненнем гандлёвых зносін з Кіевам, то зялёныя бранзалеты размеркаваны раўнамерна[3].

Вынік гэтага даследавання не перашкаджае выказаць думку аб мясцовай вытворчасці зялёнага шкла і прадметаў з яго. Але калі ў Свіслачы былі рамеснікі, то яна магла быць горадам ужо ў XIII ст.

Яшчэ адным ускосным аргументам на карысць гэтай гіпотэзы з'яўляецца і сама колькасць знойдзеных у замку жаночых упрыгажэнняў — некалькі соцень. Верагодна, у замку жылі адчайныя модніцы! Але калі гэта было толькі феадальнае ўмацаванне, акружанае сёламі, калі да бліжэйшых «сапраўдных» гарадоў — Мінска, Слуцка, Друцка было не менш як сотня кіламетраў, то перад кім жа тады яны «моднічалі»?

Але археалагічных доказаў пакуль няма, а самы старажытны культурны слой, выяўлены археолагам Ю.А.Зайцам пры выбарачным даследаванні часткі прылеглай да замка тэрыторыі, датуецца XIV ст.

Найбольш старажытны дакумент, змест якога дазваляе зрабіць вывад аб існаванні ў Свіслачы царквы, датуецца 1518 г. Гэта запіс судовай справы над свіслацкім паповічам Васечкай (так у арыгінале), які паступіў на службу да пана Якуба Кунцовіча. Пан Якуб скардзіцца: «Я яго безпечне допустил до коморы своей, а он, там ходячы, крадывал со скрыни моей пенязи...»[4]. Калі паповіч да 1518 г. быў здольны па ўзросце несці службу, якая патрабавала пэўнай падрыхтоўкі, і нават паспеў стаць злодзеем, то поп, зразумела, жыў раней. Інакш кажучы, у 2-й палове XV ст. царква (абавязковы атрыбут сярэдневяковага горада) ужо існавала.

Якая з гэтых версій бліжэй да ісціны, без грунтоўных палявых даследаванняў вызначыць немагчыма.

Не менш цікавае пытанне аб тым, ці заваявалі Свіслацкае княства татары. Археалагічных знаходак безумоўна татарскага паходжання вакол замка пакуль не знойдзена, але ўскосныя аргументы на карысць станоўчага адказу на гэта пытанне ёсць. Так, добра вядома, што ў сярэдзіне XIII ст. Свіслацкі замак быў разбураны. В.Л.Насевіч лічыць, што прыкладна ў гэты ж час татары знішчылі Клецк і Слуцк[5]. Верагодна, Слуцк, Клецк і Свіслач разбураны ў час адной ваеннай кампаніі. Такім чынам, узнікае пытанне: хто, калі не татары, мелі дастаткова часу і сілы, каб узяць штурмам і знішчыць Свіслацкі замак?

Апрача таго, з дакументаў вядома, што ў XV ст. Свіслач плаціла ардыншчыну — даніну ў Арду, якую звычайна плацілі землі, што былі ў падпарадкаванні татар.

І, бадай што, самае інтрыгуючае пытанне, на якое, відаць, адказ ніколі не будзе знойдзены — хто і калі быў уладаром замка на працягу амаль двухсотгадовага існавання Свіслацкага княства? Па вельмі абрывачных летапісных звестках устаноўлены асобы толькі 2 свіслацкіх князёў. Адзін — Ізяслаў Свіслацкі — паплечнік ці васал Данілы Галіцкага ў паходзе на яцвягаў у 1256 г.[6] Да самага апошняга часу аўтары гістарычных работ «сялілі» гэтага князя ў розныя мясціны: акрамя асіповіцкай Свіслачы рэзідэнцыяй Ізяслава называлі аднайменныя паселішчы ў Гродзенскай і Мінскай абласцях. Аднак, паводле даных археалагічных даследаванняў, ні ў Свіслацкім раёне Гродзенскай, ні ў Пухавіцкім раёне Мінскай вобласці няма доказаў існавання аналагаў Свіслацкага замка. Другі свіслацкі князь, імя якога вядома, Сямён, пры якім незалежнае дагэтуль княства ўвайшло ў склад Літвы. Вядома, што, служачы новаму гаспадару — вялікаму князю літоўскаму, Сямён удзельнічаў у дыпламатычных зносінах з Залатой Ардой, але няўдала. Летапіс паведамляў: «В лето 6857 (1348—1349) ... того же лета князь великий Литовский Ольгерд послал в Орду к царю Чжанибеку брата своего Корияда просить себе помощи на великого князя Семена. Слышав же то великий князь Семен и посла своих киличеев (послов. — *Ю.К.*) ко царю жаловать-

ся на Олгерда. Слышав же царь от послов великого князя, яко Олгерд с братиею улус его отчину князя великого испустошил и выдает царь послом великого князя братию Ольгердову, князей литовских Кориада да Михаила, Семена Свислочскаго да Айшка и дружину их, приведени быти на Москву, послом царевым Тотуем»[7]. І далей: «В лето 6858 Великий князь Ольгерд присла на Москву послы своя... прося мира и живота братьи своей князем литовским ... и всей дружины их, князь же Семён дары его прият... а братью его, князей литовских отпусти».

Асоба Сямёна Свіслацкага, як, дарэчы, і Ізяслава, парадзіла вялікую колькасць здагадак. Некагорыя крыніцы прытрымліваюцца меркавання, што гэта быў Сямён Яўнутавіч, унук вялікага літоўскага князя Гедзіміна. Складальнікі 27-га тома «Збору рускіх летапісаў» назвалі гэтага князя Сямёнам Гедзімінавічам. Аднак сярод шматлікіх дзяцей Гедзіміна Сямёна не было, затое былі 2 унукі — Сямён Яўнутавіч і Сямён Любартавіч. Але першы ў 1348 г. знаходзіўся, хутчэй за ўсё, у Маскве разам са сваім бацькам, які ўцёк пад заступніцтва Сямёна Маскоўскага ад празмерна няўрымслівых малодшых братоў, а Сямён Любартавіч у гэты час быў яшчэ зусім малы, бо дата нараджэння яго бацькі 1320 (?) г.

Такім чынам, застаецца адна гіпотэза, яшчэ ў XIX ст. створаная М.К.Любаўскім: Сямён Свіслацкі — наследны князь рускай (Рурыкавіцкай) лініі, магчыма, нашчадак Ізяслава Свіслацкага[8].

Сямён, на жаль, з'яўляецца апошнім свіслацкім князем. Пасля яго смерці ў 1350-я гады (хутчэй за ўсё ад чумы, эпідэмія якой лютавала па ўсёй Еўропе) не засталося нашчадкаў, і княства перайшло да вялікага князя літоўскага. Прыкладна ў 1358 г. яно было падзелена на часткі, і ў выніку Свіслач стала цэнтрам аднайменнай дзяржаўнай воласці.

У XIV ст. Свіслач была дастаткова вядомым паселішчам і таму ўнесена ў знакаміты «Спіс рускіх гарадоў далёкіх і блізкіх»[9].

Як дзяржаўная маёмасць Свіслацкая воласць кіравалася намеснікам вялікага князя (першае ўпамінанне гэтай акалічнасці датуецца 1410)[10]. Яны карысталіся замкам у якасці рэзідэнцыі. Зразумела, сярод іншых спраў намеснікі павінны былі клапаціцца і аб падтрымцы яго абараназдольнасці. Вядома, рамонтныя работы ў замку праводзіліся рэгулярна, прыкладна адзін раз у 3 гады.

У пачатку XVI ст. крымскія татары пашырылі зону сваіх набегаў далёка на поўнач, у глыб тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага. Ужо ў 1506 г. яны дайшлі да Свіслачы і спалілі яе. У 1508 (?) г. у час вайны з Маскоўскай дзяржавай рускі атрад прарваўся да Свіслачы і зноў спаліў яе. Сітуацыя паўтарылася ў 1534—1535 гг., калі рускія войскі на «...городы Речицу, Свислачь, Горваль, Петров Городок, Мозырь, Случеск, Рогачев, Бобруеск... посады жгли и волости и села воевали...». Не адступалі і татары, якія таксама спалілі Свіслач. Верагодна, у XVI ст. Свіслацкі замак як абарончы фарпост ужо састарэў і не адпавядаў патрабаванням ваенных дзеянняў з шырокім выкарыстаннем артылерыі.

У сярэдзіне XVI ст. у ВКЛ была праведзена валочная памера, свайго роду інвентарызацыя дзяржаўнай маёмасці. Дакументы, якія захаваліся, даюць падрабязнае апісанне тагачаснага аблічча і стану Свіслацкага замка, які стаяў «на гары высокай над ракою Свіслач, на адно стрэльбішча з лука ад вусця тае ракі»[11]. Высокая гара на самай справе — пясчаны ўзгорак вышынёй каля 10 м, абмежаваны штучным ровам — «перакопам» ад асноўнага ўзвышша, на якім быў размешчаны пасад. Пад стрэльбішчам разумелася максімальная адлегласць палёту стралы (300—400 м). Абарончы роў істотна пашыраўся з боку адзінай дарогі, што вяла да замка. Прайсці ў замак магчыма было толькі па пад'ёмным мосце.

Акрамя рова замак па перыметры быў умацаваны валам, прычым з боку вусця Свіслачы яго, верагодна, не было. Над валам узвышаліся пяць драўляных вежаў, якія мелі па 4 баявыя ярусы. У адной вежы былі зроблены вароты. Паміж вежамі стаялі гародні — зрубныя сцены. Бліжэйшая да ракі вежа ў час правядзення валочнай памеры была пераўтворана адным з намеснікаў-дзяржаўцаў у царкву, што істотна зменшыла каштоўнасць замка як абарончага ўмацавання: «... тую вежу князь Ковельский за держанья своего скинул и на том месцу церковь поставил, ко-

торая обороной быти не может, потреба знов вежу ставити».

Унутры замка знаходзіўся драўляны дом, у якім было два пакоі-святліцы, злучаныя сенцамі. Побач стаяў такі ж па канструкцыі і памерах дом, але стары і пакрыўлены, як жыллём ім не карысталіся. Яшчэ на замкавай пляцоўцы знаходзіліся 3 хлявы (клеці) і 2 склепы (піўніцы). Астатняя тэрыторыя не забудоўвалася — гэта перашкаджала б абараназдольнасці замка.

Арсенал замка быў не вельмі багаты: усяго адна жалезная гармата, 22 «гакаўніцы» (цяжкія доўгія крапасныя стрэльбы, весці агонь з якіх можна было толькі з дапамогай дадатковай апоры), 7 аркебуз — цяжкіх караткаствольных стрэльбаў, і 3 «ручніцы» — стрэльбы ў сучасным разуменні. Пораху было паўтара пуда.

За зброяй сачыў наёмнік - пушкар, немец па нацыянальнасці. «Повинен тот пушкар на том замку службу господарскую служити и стрелбу доглядати и што бы невеликого слесарской работы належа чого, запсовало, поправовати. А пад то в каждый год по 60 фунтов пороху з свое селитры мает на замок давати»[12].

Ахову замка ў мірны час неслі 11 вартаўнікоў, 10 з іх кожны тыдзень выстаўляла ўся воласць, а 1 — мястэчка Свіслач.

Рамонтныя работы ў замку таксама ўваходзілі ў павіннасці валашчан. За кожнай вёскай былі замацаваны канкрэтныя гарады, вежы і г. д.

У канцы XVI ст. Свіслацкая воласць і адпаведна замак перайшлі ў валоданне былога тутэйшага дзяржаўцы пана Міхайлы Гарабурды. Прыкладна з 1630-х гадоў прасочваецца сумеснае валоданне Свіслаччу родаў Гарабурдаў і Радзівілаў.

Пад кіраўніцтвам Багуслава Радзівіла былі ў гэты час праведзены рэканструкцыя замка і ўмацаванне пасада. Захаваліся ўласнаручныя малюнкі-эскізы князя Багуслава — планы нерабудовы замка[13].

Паводле гэтых планаў, замест сцен, складзеных са зрубаў — «гародзен» —будаваўся «астрог» – частакол. Вежы пры гэтым захоўваліся, толькі замест той, што стаяла ў баку вусця р. Свіслач, князь Багуслаў пажадаў пабудаваць двухпавярховае параднае памяшканне - «сталовую». Да яе планавалася прыбудаваць 2 перпендыкулярныя крылы ў выглядзе баракаў з галерэямі — памяшканнямі для замкавага гарнізона. Планы князя, хутчэй за ўсё, не былі ажыццёўлены.

Такім чынам, падобна большасці замкаў Вялікага княства Літоўскага, Свіслач у XVII ст. ператварылася з выключна ваеннага аб'екта ў феадальны двор, больш утульны, але слаба прыстасаваны для абароны, што і пацвердзіла чарговая вайна з Расіяй.

13 чэрвеня 1655 г. казацкі атаман Залатарэнка атрымаў загад цара Аляксея



Свіслацкі замак у XVII ст. Рэканструкцыя А.Сергачова.

Міхайлавіча «укрепя осаду под Старым Быховом, итти из-под Быхова всем войском на Свислочь и к Минску...»[14].

Загад гэты быў для Свіслачы фатальны — 2 ліпеня раніцай Свіслач была ўзята штурмам атрадам палкоўніка Івана Паповіча, а замак разбураны і спалены. Стольнік Міхаіл Дзмігрыеў, які знаходзіўся ў казацкім войску, у сваім рапарце цару адзначыў: «... город Свислочь взяли, острог и город и посад выжгли...»

Казакі стаялі ў знішчанай Свіслачы прыкладна да верасня 1655 г.

Гэтым сумным фактам заканчваецца гісторыя Свіслацкага замка. Як фартыфікацыйнае ўмацаванне ён ужо не аднаўляўся.

Зараз ад уласна замка засталіся толькі рэшткі земляных валоў і рова. Руіны мураванага будынка, які ўспрымаецца як частка замкавай забудовы, на самай справе датуецца XIX ст. і з'яўляецца рэшткамі гаспадарчай пабудовы, якая належала памешчыкам Незабытоўскім.

КРЫНІЦЫ:

1. Дайчык Г. Топография и оборонительные сооружения Свислочского замка 12 века Тезисы третьей региональной студенческой археолого-этнографической конференции вузов северо-запада СССР Рига, 1971. С. 42—45.

2. Гаврилюк Н. Стеклянные изделия Свислочского замка (по материалам раскопок 1969—70 гг.) Тезисы третьей региональной студенческой археолого-этнографической конференции вузов северо-запада СССР. Рига, 1971. С. 40—42.

3. Скрыпчанка Т.С. Свіслацкія шкляныя бранзалеты 12—14 стагоддзяў Весці АН БССР, серыя «Грамадскія навукі». 1980. № 3. С. 66—71

4. Русская историческая библиотека (РИБ). СПб., 1903. Т. 20. Кн. 3. Док. 59.

5. Насевіч В. Пачаткі Вялікага княства Літоўскага. Мн., 1993. С. 47.

6. Полное собрание русских летописей (ПСРЛ). М., 1962. Т. 2. С. 831.

7. Тамсама. Т. 7. С. 215, 856.

8. Любавский М.К. Областное деление и местное управление Литовско-русского государства. М., 1892. С. 12.

9. Новгородские летописи. М., 1950. С. 476.

10. Акты, собранные и изданные Виленской археографической комиссией (АВАК). Вильно, 1880. Т. 11. С. 5.

11. Даўгяла З. Свіслацкі замак у 1560 годзе Наш край. 1927. № 11.

12. Даўгяла З. Свіслацкая замкавая воласць у 1560 годзе Наш край. 1927. № 12.

13. Сергачев С.А. Деревянный замок середины 17 века в Свислочи Архитектурное наследие. 1982. № 3.

14. Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России. СПб., 1889. Т. 14. С. 406.

Ю.В.Клеванец.

У СКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА І РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

У XIV ст. тэрыторыя Асіповіцкага раёна ўвайшла ў склад Вялікага княства Літоўскага.

На пачатку 1350-х гадоў па ўсім свеце пракацілася эпідэмія чумы, якая значна скараціла і без таго нешматлікае насельніцтва. Не прамінула гэта ліха і Свіслацкае княства. Верагодна, ад чумы памёр і князь Сямён Свіслацкі, не пакінуўшы пасля сябе нашчадкаў. Свіслацкае княства засталося без гаспадара і перайшло ў дзяржаўную маёмасць. Прыкладна ў 1358 г. княства было падзелена на воласці — Любашанскую, Свіслацкую, Бабруйскую і Глускую. Паселішчы Ясень, Карытнае, Мяжное-Мязовічы, Жыцін, Радуцічы пры падзеле адышлі да Глускай воласці, а астатняя частка сучаснага Асіповіцкага раёна засталася ў падпарадкаванні Свіслачы.

Даніна з гэтых валасцей дзялілася паміж літоўскімі князямі Альгердам і Кейстутам.

Пасля смерці Альгерда паміж яго нашчадкамі пачалася барацьба за велікакняжацкі трон, у міжусобнай вайне верх узяў князь Ягайла Альгердавіч, які з дапамогай малодшага брата Скіргайлы здолеў уціхамірыць іншых прэтэндэнтаў — сваіх старэйшых братоў Андрэя і Дзмітрыя.

Новы вялікі князь высока ацэньваў адданасць Скіргайлы і ў 1387 г. шчодра ўзнагародзіў яго за сумленную службу: «Владислав, божье милостью король полски, литовски, руски и иных земель...

Бог дал нам всего много, а ныне...со братом Скиргайлом оумыслили есми и принимаем божий дар честно по божью

изволению и его пречистое матери девици богородици Марье...

А брата ми своего не оутаити, сказати ми ему и лихо и добро. А держати ми его выше оусее нашее братье и слушати ми его более оусех своих приятели и братьи...»

Скіргайла атрымаў у валоданне Полацк «...а тако же на руской стороне город Менеск... так же волость Свислочь и с данью и с землею и с людми и со всем доходом... тако же Бобруеск...».

Валадар Свіслачы — Скіргайла — памёр у 1395 г., і новы вялікі князь — Вітаўт — забраў сабе маёмасць свайго канкурэнта, галоўнага паплечніка Ягайлы.

Свіслацкая воласць, такім чынам, стала дзяржаўнай маёмасцю і непасрэдна падпарадкоўвалася велікакняжацкім намеснікам. Першыя звесткі аб наяўнасці ў Свіслацкай воласці намесніка датуюцца 1410 г.

Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г.

У 1396 г. Глускую воласць Вітаўт перадаў ва ўласнасць Івану Альгімантавічу Гальшанскаму за верную службу. Такім чынам, заходняя частка Асіповіцкага раёна на паўтара стагоддзя стала маёмасцю роду Гальшанскіх.

Глуская воласць у 1457 г. была падзелена паміж праўнукамі Івана Гальшанскага. Старажытны Глуск (зараз — вёска Гарадзішча Глускага раёна) перайшоў да Сямёна, верагодна, старэйшага брата. Іван, сярэдні брат, пабудаваў новы горад — Глуск Дубровіцкі (сучасны гарадскі пасёлак Глуск). Гэты горад-замак кантраляваў старажытны гандлёвы шлях са Свіслачы і Бабруйска ў Пінск. Аляксандр, малодшы брат, атрымаў Жыцін.

У выніку гэтага падзелу маленькая Глуская воласць пераўтварылася ў тры зусім маленькія. Мяжа паміж Жыцінскай воласцю і землямі Глуска Пагарэлага (так пасля падзелу стаў называцца старажытны Глуск) пралягала па лініі існаваўшага яшчэ ў час Кіеўскай Русі волака па рэчках Сіняя — Карчанка — Красная. Вёскі Карытнае, Караны, Ясень адышлі да Глуска Пагарэлага, а Радуцічы і ўсе іншыя паселішчы ўверх па цячэнні Пцічы — да Жыціна.

Ганна, сястра братоў Гальшанскіх, атрымала ў надзел асобныя сёлы ў кожнай з новых валасцей, у тым ліку існуючыя да нашага часу Ясень і Мязовічы. Ганна выйшла замуж за Гаштольда, знатнага літоўскага баярына, і перадала яму атрыманыя сёлы ў якасці шлюбнага пасагу.

У 70-я гады XV ст. пачаліся сістэматычныя набегі крымскіх татар на паўднёвыя землі ВКЛ (сучасную Украіну), што патрабавала пастаянна трымаць войска напагатове. Грошай жа ў казне хранічна не хапала, і таму вялікі князь Казімір Ягелончык быў вымушаны раздаваць дзяржаўныя землі (назаўсёды ці на пэўны тэрмін) у якасці натуральнай аплаты за паслугі шляхты. Трэба адзначыць, што практыка аплаты паслуг дзяржаўнымі землямі стала ў ВКЛ звыклай, паколькі «все преемники Витовта на великокняжеском престоле находились в стесненных денежных обстоятельствах».

Частка свіслацкіх зямель у перыяд з 1473 г. да 1480 г. (больш дакладнае датаванне немагчыма — архіўны дакумент не да-

таваны) таксама перайшла ў прыватныя рукі — княгіня Марыя Гальшанская, удава Сямёна Гальшанскага, атрымала ў часовае карыстанне сяло Пратасевічы, якое ў XV ст. называлася «Прудошевичы». А.Немцаў адзначае, што яшчэ на пачатку XX ст. мясцовыя жыхары называлі сваё сяло «Прадашэвічы». Пан Андрэй Саковіч стаў гаспадаром часткі сяла Пагарэлае, якое назаўсёды выходзіць з дзяржаўнай Свіслацкай воласці і становіцца прыватным уладаннем.

Пераход дзяржаўных маёнткаў у прыватныя рукі, безумоўна, азначаў павелічэнне эксплуатацыі ўсяго залежнага насельніцтва, і гэта выклікала з яго боку пэўны пратэст. Дакументы сведчаць, што Свіслацкая воласць спрабавала змагацца за свае правы з баярамі Катовічамі, якія атрымалі частку Свіслацкай воласці ў сучасных Бярэзінскім і Клічаўскім раёнах, праз каралеўскі суд. З першага акта 1497 г. бачна, што свіслачане, не жадаючы бачыць на сваёй зямлі баяр, упарта спрабуюць адсудзіць іх уладанні, пры гэтым свіслацкі і бабруйскі намеснікі выступаюць за інтарэсы жыхароў воласці (намеснікі не былі зацікаўлены ў змяншэнні памераў падатковых ім тэрыторый), тым не менш суд у выніку пацвердзіў усе правы Катовічаў.

Аднак, прайграўшы першую справу (а за вядзенне судовай справы трэба было заплаціць), свіслачане не скарыліся і зноў звярнуліся «за праўдай» у суд. На гэты раз сэнс скаргі значна змяніўся: прызнаючы правы Катовічаў на новых землях, жыхары воласці звяртаюць увагу вялікага князя на тое, што сяляне, аддадзеныя Катовічам, не выконваюць дзяржаўныя павіннасці. Такім чынам не толькі гаспадарскія намеснікі, але нават вялікі князь станавіліся саюзнікамі свіслачан у барацьбе супраць Катовічаў. Гэта зацікаўленасць, напэўна, і паўплывала на рашэнне суда — рашэнне нелагічнае і несправядлівае з пункту гледжання феадальнага права: сяляне Катовічаў павінны былі не толькі забяспечваць і абслугоўваць сваіх гаспадароў, але і выплачваць дзяржаўныя падаткі, выконваць дзяржаўныя павіннасці. Падобныя судовыя казусы былі магчымы толькі ў перыяд фарміравання феадальнага права і з пашырэннем правоў шляхты болей не паўтараліся.

Тым не менш свіслачане маглі лічыць гэта судовае рашэнне сваёй перамогай. Кругавая парука, пры якой юрыдычнай ці фізічнай асобай (у нашым разуменні) з'яўлялася ўся абшчына ці нават воласць, дазваляла вялікаму князю, раздаючы маёнткі, не змяншаць агульную павіннасць воласці, што механічна павялічвала асабістыя павіннасці кожнага жыхара воласці.

Падаткі з абшчыны былі істотнай часткай дзяржаўных даходаў, таму дзяржава старалася ўсяляк іх павялічыць, звычайна спасылаючыся на недахоп сродкаў для вядзення вайны. Так, напрыклад, у 1500 г. у Свіслацкай воласці ў сувязі з вайной з Масковіяй праводзіўся збор нядоімак з працэнтамі — за адзін рубель запазычанасці трэба было аддаць 1 р. 20 капеек, за недахоп скур ці мёду таксама бралі грошы. Такія зборы падаткаў, якія больш нагадвалі рабаўніцтва, праводзіліся і ў 1511 г. і пазней, фактычна пад час кожнай вайны.

Даходам ад дзяржаўных валасцей, што ўжо адзначалася, карыстаўся вялікі князь. Гэта дазваляла яму разлічвацца з уласнымі даўгамі і запазычанасцю сваіх папярэднікаў. З пачатку XVI ст. сталі здавацца ў арэнду даходныя месцы ў валасцях. Так, напрыклад, вялікі князь Жыгімонт, расплачваючыся за даўгі, зробленыя яго братам, у 1508 г. аддаў у часовае карыстанне корчмы ў Свіслацкай воласці.

Дзяржаўныя землі, як зазначалася раней, у ВКЛ кіраваліся велікакняжацкімі намеснікамі. Намесніцтва як з'ява ўзнікла яшчэ ў Кіеўскай Русі, у сувязі з пашырэннем сферы дзейнасці дзяржавы і патрэбай замацавання цэнтральнай улады на перыферыі.

Намеснік у межах сваёй воласці быў самым галоўным начальнікам — ваенным, адміністрацыйным, судова-паліцэйскім. Пасада гэта каралём і вялікім князем не аплачвалася, воласць павінна была забяспечваць намесніка ўсім неабходным, што давала магчымасць мець з гэтай пасады добры прыбытак.

Каб намеснікі ў сваіх апетытах не заходзілі надта далёка, тэрмін знаходжання на гэтай пасадзе абмяжоўваўся, не перавышаў звычайна трох гадоў. Аднак за пэўныя паслугі перад «гаспадаром» гэты тэрмін мог быць і павялічаны. Намесніка, які кіраваў воласцю больш за тры гады, часцей за ўсё называлі дзяржаўцам.

Існаванне інстытута дзяржаўства згубным чынам адбівалася на дзяржаўнай гаспадарцы — дзяржаўцы клапаціліся ў пер-

шую чаргу пра ўласны прыбытак, таму дзейнасць іх мела драпежніцкі характар і павялічвала ступень эксплуатацыі жыхароў воласці.

Першым свіслацкім дзяржаўцам, імя якога захавалася, быў Рыгор Ісаевіч Грамыка. Упершыню ён упамінаецца ў дакументах 1512 г. Ён, напэўна, нічым не адрозніваўся ад сваіх калег у жаданні ўласнага ўзбагачэння, і таму час ад часу абураныя жыхары воласці шукалі ўправу на свайго дзяржаўцу праз каралеўскі суд. Юрыдычна жыхары дзяржаўных валасцей былі паўнацэннымі грамадзянамі, яны ведалі свае правы і ўмелі за іх змагацца. Так, у 1513 г. суд прызнаў Грамыку вінаватым у незаконных грашовых паборах і прымусіў яго вярнуць значную частку нарабаванага.

У 1516 г. (?) дзяржаўства Грамыкі скончылася, але ўжо праз год ён зноў атрымаў гэту пасаду ў Свіслачы, а ў наступным 1518 г., пазычыўшы каралю 600 коп грошаў (360 рублёў) у заклад за маёмасць — усё тую ж Свіслацкую воласць, стаў у ёй сапраўдным гаспадаром. Праўда, трэба адзначыць, што кароль істотна абмежаваў магчымасці ўласнага ўзбагачэння часовага гаспадара воласці: у дамове аб умовах закладу кароль падрабязна пералічвае ўсё, што Грамыка можа браць сабе, асобна падкрэслівае, што калі нехта дасць каралю большую суму, то Грамыка атрымлівае свае грошы назад, а воласць пераходзіць у новыя рукі.

Свіслацкія жыхары, зразумела, не маглі аспрэчыць гэту дамову, але Грамыка ім настолькі не падабаўся, што яны нават выдумалі прычыну, з якой зноў звярнуліся ў суд. На гэты раз пан Грамыка і яго слугі абвінавачваліся не толькі ў празмерных паборах, але нават у забойстве аднаго з жыхароў Свіслачы. Суд апраўдаў Грамыку. І ўсё ж ён заставаўся ўладаром Свіслачы нядоўга, усяго паўгода, бо ў 1520 г., заплаціўшы ў казну 1000 коп грошаў, дзяржаўцам у Свіслачы стаў Войцех Навасілоўскі (ці Насілоўскі). Праз 2 гады яго ў сваю чаргу змяніў Андрэй Неміровіч, які кіраваў воласцю з 1523 г. па 1536 г. Аб дзейнасці пана Андрэя на гэтай пасадзе сведчыць дакумент 1534 г. — скарга на яго свіслачан, змест якой паказвае, з якім уражваючым размахам спрабаваў абіраць жыхароў новы дзяржаўца: да звычайных грашовых паборaў ён дадаў сапраўдную паншчыну — па 2—3, а здаралася і па 6 чалавек ад сяла на розныя работы на тыдзень, увёў манаполію на гандаль мясам і жывёлай — адзін з найбольш прыбытковых тавараў у сярэднявеччы.

Зразумела, кароль не мог пакінуць без увагі гэткае нахабнае беззаконне, тым болей, што ад празмерных паборaў людзі разбягаліся, і такім чынам «...в том дань и плат господарски вменьшал».

Гаспадарыў у сваёй воласці дзяржаўца не адзін — у дакументе пералічваюцца яго намеснікі, ябеднікі, весаўшчыкі (вашчыя), гараднічы. Верагодна, гэты штат чыноўнікаў застаўся з часоў незалежнага Свіслацкага княства — гэтыя пасады існавалі яшчэ ў час Кіеўскай Русі. Дарэчы, значная колькасць чыноўнікаў з'яўляецца ўскосным доказам таго, што Свіслач была даволі вялікім мястэчкам. Нельга, аднак, сказаць, што жыхары Свіслацкай воласці былі цалкам аддадзены на самавольства дзяржаўцаў. Захаваўся вельмі цікавы дакумент, датаваны 1540 г. — «Статут Свіслацкай воласці», у якім падрабязна пералічваюцца ўсе правы і абавязкі яе жыхароў.

Гэты статут, па сутнасці, быў «маленькай канстытуцыяй» воласці. Так, жыхары самых буйных населеных пунктаў — горада Свіслач і вёскі Орліна (зараз у Клічаўскім раёне) — карысталіся льготамі па падаткаабкладанні. Жыхары воласці маглі самастойна весці маёмасныя спрэчкі і караць злодзеяў мёду, але абвінавачаны павінен быў акрамя пакарання ад абшчыны заплаціць пэўны штраф у казну (звычайна на замак 10 грошаў, за суд 3 грошы). Калі нейкі жыхар воласці нанёс іншаму чалавеку шкоду («выкинулся») на 10 рублёў, то павінен быў заплаціць у замак 1 рубель штрафу (гэта акрамя пакарання ад абшчыны).

Спадчына памерлага цалкам перадавалася яго дзецям і іншым сваякам (гэты пункт з'явіўся, відаць, таму, што дзяржаўца і яго чыноўнікі мелі звычай забіраць сабе маёмасць памерлых).

Калі дзяўчына са Свіслачы выходзіла замуж у іншую воласць, то трэба было заплаціць куніцу ці 6 грошай, але калі жаніх быў свой, то плаціць не трэба.

Кожны, хто прыехаў у Свіслач, павінен быў паведаміць намесніку — даць «грош обестный». Зразумела, «маленькая канстытуцыя» Свіслацкай воласці зусім не пада-

балася яе дзяржаўцам, і таму жыхарам увесь час даводзілася змагацца за свае правы і прывілеі. Дарэчы, нават калі вярхоўная ўлада спрабавала павялічыць павіннасці жыхароў Свіслачы, яны ўпарта супраціўляліся. Характэрны эпізод: у 1542 г. свіслацкія цесляры ў чарговы раз адправіліся рамантаваць Кіеўскі замак. Але з 60 чалавек, якіх запатрабаваў вялікі князь, да месца прызначэння прыбылі толькі 45, ды і то без коней і будаўнічага лесу. Свіслачане, якія заўсёды пасылалі ў Кіеў 30—40 чалавек, палічылі патрабаванне вялікага князя парушэннем сваіх правоў і фактычна адмовіліся яго выконваць. Дарэчы, прыбыўшыя ў Кіеў цесляры хутка збеглі з будоўлі.

За такое свавольства кароль наклаў на воласць штраф у 60 коп грошаў (36 рублёў) і катэгарычна загадаў свіслацкаму намесніку Кузьму Іванавічу Заслаўскаму выслаць у Кіеў яшчэ 60 чалавек, каб яны завяршылі пачатую справу, пагражаючы такім пакараннем, якога «они яко жывы, над собою не мели».

Але паміж радкоў гэтага грознага ўказа легка чытаецца няўпэўненасць у тым, што і на гэты раз загад будзе выкананы.

У адрозненне ад жыхароў валасцей, якія былі дзяржаўнай маёмасцю, прыгонныя сяляне не мелі ніякай магчымасці абараняць свае чалавечыя правы, маёмасць, а здаралася і жыццё ад шляхецкага самавольства, якое раз-пораз пераходзіла ўсе межы. Так, напрыклад, у Літоўскай метрыцы ад 1536 г. захаваўся запіс судовай справы паміж панам ачыжскім і балоцкім Іванам Васільевічам Лядскім і пані Марынай Касцевіч, уладаркай маёнтка Турын. Пан Лядскі, атрымаўшы ад караля вёскі Ачыжу і Балоча, якія раней уваходзілі ў Свіслацкую воласць, скардзіўся на тое, што пані Касцевіч «у моих подданных земли захватила, бортные деревья порубила, в реке Волме бобров переловила на гонах...» і г. д. Пані Марына ў сваю чаргу апраўдвалася: маўляў, пан Лядскі сам добры злодзей — калі ішоў на вайну з маскалямі да Старадуба, дык завітаў разам са сваім атрадам на яе, пані Марыны, уладанне: «...людей наших збили и поранили, с которого ж бою иншые померли, жоны и дочки погвалтовали...». Пан Лядскі, відавочна, такімі дзеяннямі жадаў узняць баявы дух уласнага воінства і не чакаў, што ў пані Марыны ўзнікне думка разлічыцца гэткім жа чынам.

Але ў абодвух выпадках пакутавалі бязвінныя сяляне.

Прыгонным, дарэчы, даводзілася цярпець не толькі ад сваіх паноў. Свіслачане, здаралася, таксама рабілі ім шкоду. Так, напрыклад, яшчэ ў 1517 г. жыхары вёскі Пратасевічы, якая пасля смерці Марыі Гальшанскай зноў увайшла ў Свіслацкую воласць, зрабілі напад на землі вёскі Мязовічы, якая належала ў той час Альбрэхту Гаштольду. У сваю чаргу пан Альбрэхт падаў скаргу ў суд.

Эканамічны стан Свіслацкай воласці ў XVI ст., як і іншых валасцей Падняпроўя, быў даволі дрэнны. Паводле дакументаў бачна, што ўжо з пачатку стагоддзя гэта тэрыторыя не мела магчымасці выплачваць устаноўленыя для яе падаткі. Спробы дзяржаўнай улады ўпарадкаваць збор падаткаў увядзеннем штату спецыяльных чыноўнікаў нічога не далі — гаспадарскія пісары не столькі збіралі даніну, колькі рабавалі насельніцтва.

Пастаянны недахоп грашовых сродкаў вымусіў урад ВКЛ шукаць шляхі для павелічэння прыбытковасці дзяржаўных маёнткаў і валасцей. Да сярэдзіны XVI ст., пасля шэрагу больш-менш удалых спроб, была распрацавана сістэма так званай валочнай памеры, якая з'явілася сапраўднай эканамічнай рэформай. Сэнс яе зводзіўся да больш рашучага адмаўлення ад састарэлых спосабаў гаспадарання, што засталіся ў спадчыну ад больш старажытных эпох. Зараз, напэўна, немагчыма нават уявіць, як заблытвала тагачасную эканоміку адсутнасць адзінага падаткаабкладання, уніфікаванай сістэмы мер, вагі, адзінага спосабу рахункаводства.

Рашэнне, прынятае каралём і вялікім князем літоўскім Жыгімонтам II Аўгустам, было адносна нескладаным: належала абмераць усе ворныя і іншыя дзяржаўныя землі, падзяліць іх потым на роўныя ці прапарцыянальныя долі — валокі і паўвалокі (адна валока = 30 маргоў = 21,36 га), размеркаваць іх сярод дзяржаўнага сялянства і тым самым зрабіць больш прыдатнымі для ўліку і кантролю збор падаткаў і размеркаванне павіннасцей. Тым не менш для выканання гэтага плана патрабавалася некалькі гадоў напружанай работы ўсяго дзяржаўнага механізма.

У Свіслацкай воласці валочная памера пачалася ў 1557 г. з наступнага каралеўскага загаду: «Девятогонадцать дня мая почнутся личбы... з Свислочи... а доконаються личбы остатнего дня того же месяца мая». Да нашага часу захаваліся дакументы з вынікамі рэвізіі і абмеру, па якіх можна рэканструяваць шматлікія старонкі жыцця горада Свіслач і Свіслацкай воласці ў сярэдзіне XVI ст.

Акрамя Свіслачы ў воласць уваходзілі яшчэ 19 вёсак: Бацэвічы, Багушэвічы, Брыцалавічы, Ворча, Востраў, Вяззе, Вярэйцы, Гарадзец, Гарожа, Грава, Задобрычы, Зборск, Каменічы, Колбча, Лапічы, Орліна, Цэль, Цяплухі, Шэйпічы. Рэвізоры мелі загад удакладніць межы вёсак, якія ў той час праводзіліся па прыродных аб'ектах. Некаторыя «межавыя знакі» захаваліся і да нашых дзён — балоты Міркава, Лукомскае (Лукорскія) і Нясівель, рэкі Жыцінка, Краня (Раняя), Цэленка, Гарожка, Таль, Прыцерпа (Каменка).

Захаваліся вельмі цікавыя інвентарныя спісы мястэчка Свіслач і іншых населеных пунктаў воласці. Так, Свіслач злучалася з замкам перакідным мостам, перад якім ляжала гандлёвая плошча, справа (калі глядзець ад замка) на ёй стаяла карчма, а насупраць яе — там, дзе зараз пошта, — царква Святога Мікалая. Вуліца, якая ішла на поўнач ад плошчы, называлася Мінскай, тая ж, што паварочвала налева, да моста цераз Свіслач, мела назву Бабруйскай. Па краі пясчанага ўзвышша, на якім размяшчалася места Свіслач, ішла агароджа — паркан, за якім пачыналіся агароды. Там, дзе да паркана падыходзілі дарогі, былі зроблены вароты. Усяго ў Свіслачы налічвалася 78 двароў і пражывала каля 500 чалавек — «места» было зусім невялікае. За ракой Бярэзінай, насупраць замка, размяшчаўся «дворец» — былая летняя рэзідэнцыя свіслацкіх князёў.

Свіслацкая воласць займала пад час памеры прыкладна палову сучаснага Асіповіцкага раёна — усю тэрыторыю на ўсход ад ракі Сіняй і на поўнач ад вёскі Асяродак, акрамя зямель паміж рэчышчамі Орчы, Жыцінкі і Гравы, а таксама далей — да возера Лочын, большую частку сучасных Клічаўскага і паўднёвую частку Бярэзінскага раёнаў. З поўдня і ўсходу воласць межавала з дзяржаўнымі землямі Бабруйскай воласці, з іншых бакоў была акружана прыватнымі і царкоўнымі ўладаннямі.

На чале воласці стаяў старац, які распараджаўся ўсімі сялянскімі справамі і падпарадкоўваўся намесніку. На момант рэвізіі на гэтай пасадзе знаходзіўся жыхар вёскі Грава Сапон Апанасавіч. Яму падпарадкоўваліся «заказнікі», якія жылі ў вёсках. Усяго ў воласці мелася 510 дымоў (двароў), а насельніцтва не перавышала 2500—3000 чалавек.

У выніку падзелу зямель на кожны дым прыпала прыкладна 1/3 частка валокі (каля 6 га). Асноўнай цяглавой сілай у гаспадарках былі валы і толькі 5% дымоў мелі коней болей, чым валоў. З даных рэвізіі вынікае, што забеспячэнне жывёлы кармамі было недастатковым (відаць, не ўсе лугі і сенажаці трапілі пад абмеры рэвізораў).

Жыхары воласці плацілі грашовы падатак — чынш: па 60 грошаў са службы з тых вёсак, што мелі добрую зямлю, і па 50 грошаў са службы з вёсак, надзелы якіх былі бяднейшыя. За кожны воз сена трэба было заплаціць па 4 пенязі (1 пенязь = 0,4 гроша, 1 грош = 1 рускай капейцы). Абкладаліся падаткам і промыслы: за лоўлю баброў 105 рублёў, за іншыя ловы 93 рублі з воласці.

Палюддзе плацілася па 1,5 гроша са службы. Жыхары воласці выконвалі таксама шэраг натуральных павіннасцей і адпрацовак.

Пад час правядзення ў Свіслацкай воласці валочнай памеры пачалася Лівонская вайна (1558—1583), у якой Вялікае княства Літоўскае прыняло самы актыўны ўдзел.

Ваенныя дзеянні патрабавалі вялікіх выдаткаў, і таму, пачынаючы з 1561 г., дзяржаўныя воласці ВКЛ (у тым ліку і Свіслацкая) абкладаліся грашовымі падаткамі і павіннасцямі. Да таго ж казна больш жорстка стала адносіцца да тых, хто меў перад ёй запазычанасць.

Так, у сакавіку 1561 г. дваранін Васіль Сямашка павінен быў сабраць у Свіслацкай воласці нядоімкі за 1559 г. і 1560 г. пад пагрозай поўнай канфіскацыі маёмасці.

У верасні таго ж года прайшоў новы збор падаткаў. Вялікі князь, тлумачачы патрэбу ў яго правядзенні, пісаў: «для найма войска... выдана великая сума со

скарбу нашого», таму неабходна было сабраць для яе пакрыцця з валокі па 15 грошаў, з паўвалокі — па 4, ад агарода — 3 грошы і 7,5 пенязі і г. д.

Яшчэ праз паўгода, у сакавіку 1562 г., вялікі князь паслаў загад свіслацкаму дзяржаўцу Станіславу Давойне, у якім патрабаваў ад апошняга дадаткова сабраць з жыхароў пэўную суму грошай на камплектаванне і забеспячэнне ўсім неабходным коннага і збройнага атрада, які павінен быў размяшчацца ў Свіслацкім замку і чакаць далейшых загадаў. Цікава, што кароль зазначае, што Давойна не мае права блытаць гэты Свіслацкі «почт»[1] з тым, што выстаўляўся ад уласных маёнткаў пана Станіслава: з уласных зямель ён наймае вершнікаў толькі на свае грошы. Не павінен таксама дзяржаўца хавацца за спіны свіслацкага баярства, якое мабілізуецца само па сабе. Гэты дакумент, дарэчы, змяшчае цікавыя дадатковыя звесткі аб сацыяльным складзе насельніцтва Свіслачы — акрамя мяшчан і сялян у воласці мелася і ваеннаслужылае баярства, якое, верагодна, з'яўлялася нашчадкамі баяр часоў існавання Свіслацкага княства.

Удзел у Лівонскай вайне цяжкім грузам ляжаў на гаспадарцы Вялікага княства Літоўскага і ў першую чаргу на дзяржаўных землях. Не была выключэннем і Свіслацкая воласць. Так, у ліпені 1562 г. жыхары вымушаны былі плаціць чарговы надзвычайны грашовы падатак, а ў верасні здаваць жывёлу — «яловицы и вепри». Да таго ж воласць зноў павінна была адправіць на рамонт Кіеўскага замка цесляроў, коней і будаўнічы лес.

У сакавіку 1563 г. Свіслач павінна была зноў адправіць у Кіеў 1800 бярвёнаў і пэўную колькасць дранак (дошак), а пазней заплаціць яшчэ адзін надзвычайны падатак.

Ход вайны складваўся для ВКЛ няўдала — да 1563 г. рускія войскі кантралявалі амаль усё правабярэжжа Заходняй Дзвіны і захапілі Полацк.

Шляхта з паўночна-ўсходніх зямель эвакуіравалася ў цэнтральную частку ВКЛ, дзе атрымлівала ў часовае карыстанне (да вызвалення акупіраванай тэрыторыі) маёнткі на дзяржаўнай зямлі. Вось выпіска з «Инвентаря имений, розданных полочанам» ад жніўня 1561 г.: «Войтеху Стабровскому у волости Свислоцкой село Колбчо — служб осьм... Ивану а Властному Свольненским з двема братами стрыечными... у Свислочу село Городец — служоб шесть». Кароль і вялікі князь літоўскі Жыгімонт II Аўгуст клапаціўся не толькі пра бежанцаў, але і пра тую шляхту, што заставалася недалёка ад раёнаў баявых дзеянняў. Так, напрыклад, для сямей мсціслаўскай шляхты быў выдадзены прывілей, паводле якога яны маглі перасяляцца ў Свіслач.

Пераход дзяржаўных сялян ва ўладанне шляхты, няхай і часовае, азначаў для іх павышэнне ступені эксплуатацыі, і таму ўспрымаўся сялянскай масай з непрыкрытай незадаволенасцю, якая раз-пораз выбухала сапраўднымі бунтамі, як гэта мела месца ў Свіслацкай воласці.

Адным са шляхцічаў, што атрымалі ў гаспадарскай Свіслацкай воласці маёнтак, быў пан Войцех Руткоўскі. Яму дасталася вёска Багушэвічы, дзе пан Войцех паспрабаваў весці гаспадарку па ўласным разуменні, але сяляне, не жадаючы станавіцца фактычна прыгоннымі, адмовіліся яму падпарадкоўвацца. Руткоўскі ўзяўся наводзіць парадак з дапамогай гвалту: «...косы, уши и губы обрезывал», а некага нават павесіў. У адказ на гэта катаванне частка сялян збегла ў суседнюю вёску Задобрычы і павяла супраць пана Войцеха сапраўдную партызанскую вайну — знішчала маёмасць, рабавала яго памагатых і г.д. Барацьба сялян з ненавісным панам не спынялася некалькі гадоў, прычым бунтаўшчыкам дапамагалі не толькі жыхары Багушэвіч. Жыхары воласці, якія засталіся дзяржаўнымі, былі таксама на іх баку. Нават свіслацкі поп Фёдар Аляксеевіч і ўраднік Сямён Глушанін праходзяць у судовай справе як абвінавачаныя ў саўдзельніцтве з сялянамі, якія ўзбунтаваліся.

А свіслацкія казакі Яшка Галавачонак, Васька і Выпанковіч прабраліся ў Мінскі замак, дзе хаваўся паранены ўласнымі сялянамі пан Войцех, і спрабавалі яго там забіць, праўда, няўдала — перашкодзіла варта.

---

[1] Почтам у ВКЛ называўся воінскі атрад

Свіслацкія дзяржаўцы — Баркулаб Корсак, Андрэй Курбскі (той самы знакаміты князь, што збег ад Івана Грознага), Міхайла Гарабурда ў адносінах да сялянскага бунту прытрымліваліся нейтралітэту, а фактычна былі на баку сялян, бо на шматлікія скаргі і просьбы пана Руткоўскага аб дапамозе не звярталі ўвагі. Пазіцыя дзяржаўцаў увогуле дастаткова зразумелая — наплыў беззямельных паноў памяншаў іх даходы, і таму адносіны іх да шляхетных бежанцаў з гэтай нагоды ніяк не маглі быць добрымі. Да таго ж, дзяржаўцы былі вяльможамі і князямі, а Руткоўскі — дробны шляхціц, быў з іх пункту гледжання нахабным выскачкам. Застаўшыся ў адзіноце супраць цэлай воласці, пан Руткоўскі пачаў шукаць заступніцтва ў караля, які нарэшце ў 1569 г. вырашыў умяшацца і паслаў у воласць карны атрад з загадам: завадатараў бунту пакараць смерцю, астатніх багушэвіцкіх сялян аддаць у палон да пана Руткоўскага, памагатых бунтаўшчыкоў — сялян і мяшчан гаспадарскіх — аштрафаваць на карысць пацярпелага пана. Але Міхайла Гарабурда жыхароў воласці ў крыўду не даў: штрафаў не накладаў і абмежаваўся адпіскамі.

Лівонская вайна зацягвалася, абодва бакі напружвалі апошнія сілы ў спробах нанесці праціўніку рашучае паражэнне ці хоць бы прыстойна выйсці з вайны. У 1566 г. ад караля і вялікага князя літоўскага да цара маскоўскага Івана Грознага адправілася пасольства з мэтай дамовіцца аб перамір'і. «Того же дни пришли к царю и великому князю из Литвы от Жигимонта-Августа... послы Юрий Александрович Хоткевич... да писарь и державца Свислочский Михайло Харабурда...» — так распавядае аб гэтай падзеі Ніканаўскі летапіс.

Перамовы былі няўдалыя, але паслоў за гэта, відаць, не лічылі адказнымі, бо ў 1568 г. Міхайла Гарабурда за заслугі перад каралём і дзяржавай атрымаў у спадчыннае валоданне рэшткі Свіслацкай воласці разам з мястэчкам Свіслач.

Як чалавек разумны і прадбачлівы, новы гаспадар адразу не дзейнічаў так, як небарака Руткоўскі. Ён, наадварот, жадаў быць для сваіх прыгонных «добрым пастырам». Свае сапраўдныя намеры пан Гарабурда пачаў выказваць толькі праз некалькі гадоў. Адчуўшы ўзмацненне прыгнёту, свіслачане па старой звычцы сталі скардзіцца каралю. Аднак новы кароль, Стафан Баторый, загадаў знайсці дакументы, падпісаныя яго папярэднікам — Жыгімонтам II Аўгустам, які памёр у 1572 г., і ў 1578 г. пацвердзіў поўнае права пана Гарабурды на валоданне Свіслацкай воласцю і кіраванне яе насельніцтвам.

Для спрэчак, здаецца, месца не засталося — дзяржаўная Свіслацкая воласць канчаткова ператварылася ў прыватны маёнтак. І ўсё ж у дакументах канца XVI ст. адзначаюцца масавыя ўцёкі жыхароў Свіслачы ў Бабруйск, які заставаўся дзяржаўным. Там нават з'явілася цэлая вуліца, заселеная былымі свіслачанамі. Такі вось апошні аргумент у абарону ўласнай свабоды...

На працягу ўсяго XVI ст. розныя часткі Глускай воласці пераходзілі ад аднаго ўладара да іншага, перасякаліся магутныя роды Гаштольдаў і Гальшанскіх, іх землі перайшлі часткова да дзяржавы (Жыцінская воласць), часткова — да княжацкіх родаў Чартарыйскіх і Заслаўскіх (Жаслаўскіх). Жыцін быў падараваны каралём за ўдзел у вядзенні мірных перамоў з Масковіяй вяльможнаму пану Яну Хаткевічу, які хутка прадаў гэты маёнтак князю Юрыю Алелькавічу Слуцкаму. Такім чынам, да князёў Слуцкіх адышла ўся паўночна-заходняя частка сучаснага Асіповіцкага раёна, акрамя Цэлі, якая належала пану Яну Цадроўскаму. Мяжа валоданняў Гарабурды і Алелькавічаў праходзіла прыкладна па ўсходняй ускраіне сучасных Асіповіч. Захаваліся два дакументы, у якіх адлюстроўваюцца справы Глускай і Жыцінскай валасцей XVI ст.

Першы дакумент — дамова 1571 г. паміж князем Заслаўскім і яго цёткай Чартарыйскай аб падзеле маёмасці — горада Глуска з усім яго насельніцтвам і тых вёсак, што засталіся ў спадчыну ад Гальшанскіх, у тым ліку Ясеня, Карытнага, Замошша.

Другі дакумент — тлумачальная запіска вознага (судовага выканаўцы) Мінскага гарадскога суда аб тым, як ён ездзіў з «пазовам» на суд ад пана Цадроўскага, уладара вёскі Цэль, на княгіню Слуцкую, якая загадала жыхарам вёскі Пратасевічы і сваім слугам пераносіць межавыя знакі, псаваць борці, жаць збожжа і наносіць іншую шкоду маёмасці пана Цадроўскага і яго сялян.

Вознага ў двор маёнтка Слуцкіх не пусцілі, а ён жа, добра памятаючы, што некаторы час назад Слуцкія збілі іншага вознага Мінскага павета, вырашыў не рызыкаваць – уваткнуў «пазоў» у вароты і ўцёк.

Веска Цэль яшчэ раз упамінаецца ў дакументах 1599 г., у гэты час яна знаходзілася ў дзяржаўстве ў князя Горскага.

У 2-й палове XV ст. у сярэдзіне Свіслацкай воласці, як ужо адзначалася, выдзелілася прыватнае ўладанне — сяло Пагарэлае было аддадзена пану Андрэю Саковічу. У XVI ст. гэта прыватнае ўладанне раздзялілася спачатку на 2 часткі — выдзеліўся двор Жыцін, які стаяў на рацэ Жыцінка (зараз там знаходзіцца вёска Ігнатаўка). Першым уладаром Жыціна быў былы свіслацкі дзяржаўца пан Навасілоўскі. Пазней гэты маёнтак падзяліўся на 3 уладанні (да гэтага часу вёска Ігнатаўка складаецца нібыта з трох частак). Потым, калі сталі дарослымі ўнукі і праўнукі Навасілоўскага, маёнтак Жыцін падзяліўся яшчэ на некалькі частак, якімі валодалі Осцікі, Нарушэвічы, Ваўчкі, Навасілоўскія, Макаровічы, Зенавевічы. У 1582 г. частка ўладанняў пана Яраша Ваўчка — некалькі сядзіб вёскі Пагарэлае, што належалі да Жыцінскага двара, была перададзена пану Станіславу Рудзінскаму ў якасці шлюбнага пасагу.

Астатнія часткі жыцінска-пагарэльскіх зямель належалі ў канцы XVI ст. панам Мікалаю Зенавевічу, Рыгору Макаровічу і Мікалаю Нарушэвічу.

Між іншым, пан Макаровіч быў вельмі неспакойным чалавекам. Пан Зенавевіч і пан Нарушэвіч у 1590 г. скардзіліся на свайго суседа: слуга пана Макаровіча — Сямён Хлудзень — па загадзе свайго пана рабаваў і збіваў падданых Зенавевіча і Нарушэвіча.

Дакументы сведчаць, што ў канцы XVI ст. шляхта ў нашых краях актыўна развівала ўласную гаспадарку, займалася не толькі працоўкай зямлі, але і наладжвала прамысловасць. Так, напрыклад, у Жыцінскай воласці была створана вытворчасць драўнянага вугалю, які карыстаўся вялікім попытам не толькі ў ВКЛ, але і за мяжой.

На пачатку XVII ст. спыніў сваё існаванне знакаміты род князёў Алелькавічаў-Слуцкіх. Апошняя князёўна Соф'я Алельковна ў 1600 г. выйшла замуж за Януша Радзівіла, а ў 1612 г. памерла, пакінуўшы мужу ўсю сваю маёмасць, у тым ліку і землі на тэрыторыі сучаснага Асіповіцкага раёна.

Да 1616 г. памерлі ўсе старэйшыя нашчадкі Міхаіла Гарабурды, унукі ж яго, відаць, былі яшчэ зусім малыя, таму з 1630-х гадоў прасочваецца сумеснае валоданне Свіслаччу родаў Гарабурдаў і Радзівілаў.

Мір і спакой, якія ўстанавіліся ў Вялікім княстве Літоўскім у канцы XVI ст. пасля заканчэння Лівонскай вайны, дасталіся вельмі дорага і праіснавалі нядоўга.

Праблемы, з якімі пастаянна сутыкалася грамадства ВКЛ, яшчэ больш абвастрыліся, бо для вырашэння іх у Рэчы Паспалітай — новай польска-літоўскай дзяржаве — у шляхецкай дэмакратыі не было сіл і магчымасцей. Павелічэнне прыгнёту сялянства, антыправаслаўная ўнутраная палітыка прывялі да росту незадаволенасці і сепаратысцкіх настрояў, перш за ўсё на тэрыторыі сучаснай Украіны, што скончылася Пераяслаўскай радай, вынікам якой была прапанова гетмана Правабярэжнай Украіны Багдана Хмяльніцкага ўвайсці ў склад Расіі.

У 1653 г. рускі цар Аляксей Міхайлавіч прыняў рашэнне далучыць Украіну да сваёй дзяржавы. Гэта з'явілася аўтаматычным абвяшчэннем вайны з Рэччу Паспалітай, і вясной 1654 г. рускае войска першым пачало ваенныя дзеянні.

Рэч Паспалітая змагла арганізаваць адпор толькі ў 2-й палове таго ж года. Вось данясенне цару магілёўскага шляхціца Паклонскага: «Имею в том подлинную ведомость, что ляхи, собравшися на сее сторону реки Березины переправляются и крестьян православныя веры в дву местах, в Бобруйску и Свислочи по той стороне высекли, для чего надо о том прежде времени промышляти, чтобы ляхи не распространялися. Писан в Могилеве лета 1654 месяца сентября 25 дня...»

Польска-літоўскае зімовае контрнаступленне было няўдалым, і з наступнага 1655 г. маскоўскае войска пачало хутка займаць тэрыторыю сучаснай Беларусі. Цар Аляксей загадаў казацкаму атаману Залатарэнку: «...укрепя осаду под Старым Быховом итти из-под Быхова со всем войском на Свислочь и к Минску» (13 чэрвеня 1655 г.).

16 чэрвеня 1655 г. Залатарэнка адказаў цару: «...а ныне наперед себя посылаем дву братов своих, Василья Никифоровича, полковника нежинского и Тимоша Аникеенка, полковника стародубского с частью войска, обозом и нарядом к Свислочи». У адказ ад цара зноў прыйшоў загад дзейнічаць хутчэй. 24 чэрвеня ганец павёз цару шматслоўны даклад Залатарэнкі пра тое, што яго войскі пачалі пераправу цераз Бярэзіну. «А войска неприятельские поблизу войск наших пребывают в нескольких местах, в Борисове, в Свислочи, в Менску».

2 ліпеня Свіслач была ўзята штурмам. З гэтай весткай да цара паскакалі 2 ганцы ад Залатарэнкі. Першы — з рапартам ад Залатарэнкі, поўны пахвальбы і праслаўлення да цара. Другі ганец вёз данясенне царскага стольніка пры запарожскім войску Міхаіла Дзмітрыева. У ім пісалася: «...Наказной гетман Иван Золотаренко посылал черниговского полковника Ивана Поповича с ратными людьми к городу к Свислочи... город Свислочь взяли, острог и город и посады выжгли, и которые были польские и литовские люди в городе Свислоче, и тех всех людей мечу предали, и привели языки к наказному гетману Золоторенку...»

Да восені 1655 г. у спаленай і разрабаванай Свіслачы стаялі казакі.

Пабачыўшы слабасць Польшчы, у вайну ўступіла Швецыя, і хутка вайна ператварылася ў жудасную бойку ўсіх супраць усіх. 14 гадоў бесперапыннага кровапраліцця знішчылі амаль палову насельніцтва былога Вялікага княства Літоўскага.

Ю.В.Клеванец.

КРЫНІЦЫ:

Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России. СПб., 1889. Т. 14. Стб. 406, 705, 709—712, 717, 718, 725, 743—746, 747—748, 889.

Дакументы сведчаць

АДКАЗ КАРАЛЯ ЖЫГІМОНТА І НА СКАРГУ ЖЫХАРОЎ СВІСЛАЦКАЙ ВОЛАСЦІ АБ АДМОВЕ СЯЛЯН ПАМЕШЧЫКАЎ ВІШНЕЎСКІХ І КАТОВІЧАЎ АД РАБОТ У СВІСЛАЧЫ І КІЕВЕ

1528 г.

Жикгимонт.

Смотрели есьмо того дела с паны радами нашими. Стояли перед нами очевисто. Жаловали нам мещане и люди наши вси волости Свислоцкое на потужников своих, людей князей Вишневских и дворан наших панов Котовичов на имя на Оран а на Бродчан, а на Максимовичов о том, иж они не хотят поспол з ними городов нашых робити, Свислоча и Киева и иных городов, где мы их робити посылаем, и мостов мостити, подле давного обычая. И князи ... положыли перед нами на тых людей прывилей наш ино в том прывили их выписаны иж есьмо тым людем их отпустили старыи пошлины — дубасчину, воловщину, сенничое, што тые люди их хоживали к Рудомине сена косити и к томуж отпустили есьмо им доходы вси наместников Свислоцких, а от городовых роботи от мощения мостов тых людей их есьмо не вызволили.

А так мы угледивши того прывилья их и бачачы, иж в земском прывильи жадных подданых нашых от робот городовых не вызволено, росказали есьмо тым людем князей Вишневских и панов Котовичов Огораном а Бродчаном и Максимовичом городы нашы Свислоч и Киев и иные, которых будет потреб, поспол с иншыми людми Свислочаны робити и мосты мостити по тому, как перед тым бывало. А што нашы люди Свислочане минулых годов тыи городы Свислоч и Киев сами одны робили и мосты мостили, а тые люди князей Вишневских и Котовичов, их потужники, в том им не помогали, и для того они за них не мало себе шкодуют; ино, на што наши люди довод слушный учинять, то мают тые Огоране и Бродчане и Максимовичы нашым людем Свислочаном заплатити.

И на то есьмо тым нашым людем Свислоцким дали сесь наш лист судовый за нашою печатью.

Писан у Вильни месяца июня 10 дня индикт 1.

Малиновский И. Сборник материалов к истории панов-рады Великого княжества Литовского. Томск, 1901. С. 323.

ГРАМАТА КАРАЛЯ ЖЫГІМОНТА II АЎГУСТА СТАНІСЛАВУ ДАВОЙНЕ НА ВАЛОДАННЕ СВІСЛАЦКІМ МАЁНТКАМ З АПІСАННЕМ АБАВЯЗКАЎ ДЗЯРЖАЎЦЫ

2 сакавіка 1562 г.

Жикгимонт Август, Божью милостью король польский, великий князь литовский, руский, прускій, жомойтский, мазовецкий, инфлянтский, и иных. Ознаймуем сим листом нашым, иж умысливши порадок и постановенье слушное при замках и волостях наших руских вчинити и всякие незбожности выкоренити, для того есмо певные, а врочистые платы постановили через посланцов наших до скарбу нашого и на вряд наш подданым нашим давати. И вжо тую уставу и повинность подданых также яким обычаем и вряд наш ку подданым нашим заховатися мает, то от посланцов наших при кождом замку з волею и ведомостью нашою на писме зоставлено якож и в замку Свислоцком постановенье вчинено. В которую же справу угленувши и хотячи, абы тым способней пан Станислав Станиславович Довойна нам, господару служил, а ку подданым без обтежливости заховался, даем и поступуем его милости з платов наших, которые на нас, господара, з места и з волости того замку приходити мают, в кождый год двесте коп грошей, а ку тому доход весь пенежный и теж жито водлуг новое уставы постановеное на державцу тамошнего. И тот доход почнет он брати от свята прошлого светого Мартина в нинешнем же року шестьдесят первом, также и потом на кождый год, поколе его милость тот замок от нас держати будет, мает тую суму с платов наших господарских на себя брати, а обецне служебников своих на тамошнем замку тридцать коней мети мает, абы завжды при нем самом и без бытности его милости тот почот конно збройно на том замку был. А естли быхмо где его милость с тым всим почтом ехати, або пак часть которую почту того послати казали, он повинен будет сам там ехати, або почот слати, где его милость листом ознаймено будет. Ведь же он за тые пенези не мает ховати за слуг своих бояр, ани слуг тамошних, звлаща хто повинен сам за себе службу служити. А што ся дотычет почту, который он з ыменей своих ку службе земской ставити повинен, ино часу посполитого рушенья естли бы есмо не казали его милости того почту слати, тогды и он тот почот свой з именей весь сполна, конно, збройно, як службу земскую служити повинен, на том же замку нашом мети мает до науки нашое. Теж хочем мети, абы того з пильностью стерег, яко бы подданым нашим над уставу никакого обтяженья, он сам, врадник и слуги его милости нечинили, але абы людей осаживали и пожитков наших примножали подле набольшого баченья своего, уставы нашое не отступаючи. А где бы ся то показало, жебы чим подданых обтяженье не ведле уставы заховался и чим з уставы и с постановенья нашого он сам або врадник его милости выступовал, а он бы того не дозрел, тогда за таковым выступ мает зложон быти з того вряду, а хотя бы лист на доживотье мел, таковый лист и право ку помочи ему быти не мает, кгды не для обътеженья, але для обороны а вспокоенья подданых и для дозренья пожитков наших врады даем и именья наши врадником злецаем. А на тыи вси речи дали есмо его милости сесь наш лист, до которого на твердость того и печать нашу приложити казали. Писан у Вилни, лета Божего нарожденья тысяча пятьсот шестьдесят второго, месяца марца, девятого дня. Подпись руки господарское. Остафей Волович.

Друкуецца па кн.: Довнар-Запольский М.К. Очерки по организации западно-русского крестьянства. Киев, 1905.

З ЗАПІСУ Ў МІНСКАЙ ГРОДСКАЙ КНІЗЕ АБ АБРАБАВАННІ ПАНАМІ КАСМОЎСКІМІ ШЛЯХЦІЦА ЯНА МЯДЗВЕДСКАГА, ЯКІ СЛУЖЫЎ У ІХ

Люты 1590 г.

На враде кгородском в замку гдрском Менском передо мною, Яном Петрашковичом, подстаростим Менским, жаловал и оповедал шляхетны пан Ян Медведски на его милость пна Яна Якубовича Космовского, секретара его королевской млсти и на малжонку его млсти, ее млсть пни Ядвигу Юревну Носиловского, воеводянку витебскую, о том, што ж дей служачы мне помененому пану Яну Космовскому, от которого дей есми добре а цнотливе, тат яко на учстивого пристоин, пожекгнавши их млсть, яко панов своих, отстал в сем же року, афч (1590, далее числа даются только арабскими цифрами. — *Ю.К.*), мсца февраля, осмого, в четверг, и отставши от их млсти того ж дня, в четверг, мсца февраля осмого дня, заехал был есми до села их млсти Жорновки, именя их млсти Свислоцкого, у повете Менском лежачого, до дому подданого их млсти Тишка для покормения коня, то пак дей его млсть пан Ян Космов-

ский и малжонка его помененая, не маючы в то до мене никоторое потребы, тогож дня вышей помененого, у четверг, сами особами своими и з слугами своими, приехавши до того дому подданого своего, мене, чоловека учстивого, словы неучстливые лаял и соромотил. А на том мало, маючы, маетность мою, которую пры собе мел, его млсть пан Космовский и малжонка его млсти отобрали и безправне пограбили, а меновите дей то есть: на первей взяли шкатулку, в которой было грошей готовых монеты литовское коп петдесят, тлумок скураный, у которым было напервей то ест: кобеняк фалюндушовый, пырваный, китайскою жолтою подшитый, коштовал (7) коп грошей литовских... шапка чорная, кунами подшитая, коштовала (5) злотых полских, другая чорная, горлами лисьими подшитая, коштовала (4) золотых польских, сукна фалюндрышового бурнатного локот, куплен по тры таляры, боты сафьяновые жолтые новые двои, коштовали полторы копы грошей литовских, бачмаки сафьяновые жолтые новые, коштовали полкопы грошей литовских, кошул коленских осм, вышываных едвабем, кождая по 15 грошей литовских коштовала, куниц шесть, каждая по пол копы грошей литовских коштовала, поес едвабный, коштовал грошей сорок пят литовских, нож, серебром оправный, коштовал сорок осм грошей литовских, шабля, серебром оправная, позлотистая, которая коштовала (50) золотых полских, ручниц коротких тры, кождая коштовала по пети золотых полских. И просил, абы тое оповеданье его до книг кгородских менских записано было, што ест записано.

Акты Виленской археографической комиссии. Вильно, 1912. Т. 36. С. 387—388.

ЗАПІС АБ ПЕРАДАЧЫ ЯНАМ РЫГОРАВІЧАМ ОСЦІКАМ МАЁНТКА ЖЫЦІН МІКАЛАЮ НАРУШЭВІЧУ

1593 г.

Я, Ян Григорьевич Остик, дворянин е. кор. мил., чиню ведомо и объявляю тем моим листом добровольным и вечным ограничоным записом, что в року теперешним, 1593 мсца июля 20 дня передал на вечность имение мое, названное Житин, а иным названием Свислочь, в воеводстве Минском лежащее, его милости пану Миколаю Нарушевичу, кастеляну Жмудскому, старосте Ушпольскому, Пенянскому и Куписскому, в известных границах и обсягах лежащее, а заводим и показуем е. м. пану Жмудскому все границы и грунты маетности Житинской, которая включает в себя следующее.

У Свіслачы салдаты нарабавалі 1199 злотых і 15 грошаў, 32 чвэрці аўса, 5 бараноў, 25 гусей, 24 курыцы. З в. Шэйпічы было ўзята 120 злотых, 2 чвэрці аўса і 20 курэй, з в. Татаркавічы — 300 злотых, 2 бараны, 42 гусі, 6 курэй і 3 чвэрці ячменю, з в. Каменічы — 225 грошаў. Прыкладна гэтак жа абабралі кавалерысты і Бацэвіцкую воласць. А для таго, каб перавозіць здабытае дабро, салдаты ўзялі з сабой некалькі мяшчан і сялян: са Свіслачы — Грышкаву ўдаву, Яўсея Сідаравіча, Рамана Плытніка, Мацвея Перавозніка, Андрэя Буцко, Лаўрына Ермака, Ваську Прынчука, Карпа Хадаровіча, Івана Вадап'яна, Кашку, Ермака Сімонавіча, Акулу Шкодку, Трышку Почнара; з Каменіч — Сямёна Рудага, Фёдара Цішку, Івана Коваля. У в. Брыцалавічы салдаты адлупцавалі трох вяскоўцаў і з тым пайшлі.

У гэты ж час выступленні супраць туркаў былі і з маскоўскага боку — князь Галіцын спрабаваў захапіць умацаванні Перакопа.

Праз некалькі гадоў пасля апісаных падзей Свіслацкая воласць атрымала новага гаспадара — ім стаў пан Незабытоўскі, былы «служебник» Багуслава і Людвігі Радзівілаў, які выкупіў у сваіх гаспадароў частку іх маёнткаў. Самі ж Радзівілы працягвалі валодаць заходняй часткай Асіповічыны. Ім належалі вёскі Дражня, Майсеевічы, Крынка, Пратасевічы, Забалацце, Асіповічы, Смык-Слабада, Мязовічы, Пабокавічы, Радуцічы (гэта было валасное сяло), Слопішча, Сялец, Птушычы, Краі. Усе гэтыя населеныя пункты сустракаюцца ў дакументах Нясвіжскага архіва Радзівілаў[3]. У адным з іх, датаваным 1768 г., упамінаецца в. Асіповічы. Зыходзячы з раскладу грашовых павіннасцей, у Асіповічах у тым жа годзе жылі: Марцін Санкевіч, Клім Бабыль (стражнік), Паўлюк Дарашонак, Пархім Андрэеў, Антон Санкевіч (патужнік, або саўладальнік), Дзям'ян Санкевіч, Цімох Астапаў, Майсей Астапаў, Прохара Астапава ўдава, Сцяпан Астапаў, удава Гаўрыліха, Грышка Астапаў, Цімох Дарашонак. Зразумела, што тут пералічана не ўсё насельніцтва, а толькі «старэйшыя», гаспада сямей. Такім чынам, у в. Асіповічы ў 1768 г. было 14 двароў. У гэтым жа раскладзе чыншу ёсць і іншыя вёскі цяперашняга Асіповіцкага раёна. Мы можам даведацца, што ў в. Смык-Слабада Траянская жылі выключна адны Налівайкі, у Пратасевічах жылі Доўгалі, Пратасічы і Жукі, у Забалацці — Грышчукі, Еўдакімовічы і інш. Усе вёскі, пералічаныя ў дакуменце, невялікія — не больш за 15 двароў.

Там жа знаходзіцца яшчэ адзін цікавы дакумент — «Претензии волощан фальварка Протасевичи», у якім жыхары некалькіх валасцей скардзяцца ў Нясвіж «до Альбы» на арандатара пана Плацкавіцкага, які меў чын падлоўчага.

«...Претензии веси Мойсеевичи

Стражник, в той веси живущий, а с Дражни другой по наказу упомянутого пана Плацковицкого ходили до фольварка его Пташковичи названного, за 17 миль на косьбу, за которую работу им только 45 грошей заплатили, а работали они 3 недели, а при уходе им добавили 3 злотых... Дней всего отработа-

но восемнадцать за вычетом праздничных, считая, что за каждый (день) положено заплатить по 1 злоту, претендуют на доплату в 15 злот...

Той же веси за вступление в лес за два года пан подловчий вымогал овса 2 корца, злотых 6, грошей 12, да еще злотых 12, грошей 24. Поскольку такое вымогательство незаконно («не слушне»), пан должен вернуть веси 12 злотых, 24 гроша...

В той же веси от каждого господара в году предыдущем под предлогом недостачи выбрал овса по полосьмины, которого с 46 дворов («дымов») собрано 23 осьмины.

Претензии веси Крынки

Петрок Минчук жалуется и плачет, что Павлюк Логвин, десятник в Мойсеевичах, будучи с другими стражниками по шкодливому для подданства приказу пана подловчего пограбили несколько коп жыта на поле, издавна разработанном... (за тое, каб вярнуць сабе збожжа, давялося даваць пану падлоўчаму грошы. — *Ю.К.*)[4].

З весі Асіповічы прыйшоў па даручэнні ўсіх сялян Цімох Астаповіч і скардзіўся, што пан падлоўчы патрабаваў ад яго землякоў «паклону» ў выглядзе злотага і 15 грошаў.

З жыхароў Смык-Слабады злосны пан патрабаваў «...рубль и семъ злотых, меду гарнец, овса 1, 2 корца под угрозой кары вязенней» (турмы) за тое, што мужыкі вывозілі з лесу бярвенне для будаўніцтва царквы.

З дакументаў бачна, што пан Плацкавіцкі — не ўладальнік сялян у пералічаных вёсках, а ўсяго толькі служачы ў Радзівілаў. Тыя работы, якія для Радзівілаў сяляне рабілі бясплатна, падлоўчы павінен быў аплачваць, паколькі для яго сяляне — наёмныя работнікі. Аднак гэты адміністратар (як і большасць да яго падобных) выкарыстоўваў любую магчымасць для асабістага абагачэння: альбо за кошт сваіх гаспадароў, альбо за кошт сялян, кіраваць якімі ён быў пастаўлены. Такая сітуацыя была тыповай для ўсіх прыватнаўласніцкіх маёнткаў Рэчы Паспалітай.

У 1786 г. у Свіслачы адбылася знамянальная падзея на грошы Барбары Незабытоўскай, народжанай Завіша, быў пабудаваны касцёл Хрыста Раскрыжаванага. Праз 10 гадоў гэты касцёл перайшоў у падпарадкаванне манаскага ордэна езуітаў.

Трохі пазней намаганнямі той жа Барбары Незабытоўскай была пабудавана новая царква Святога Мікалая. Адначасова з гэтай царквой была ўзведзена царква Успення.

У 1815 г. Асіповічыну наведаў падарожнік, вучоны-батанік А.К.Башняк, праязджаючы з Пецярбурга на Украіну. У сваім дзённіку ён пакінуў запіс аб тым, што бачыў у Свіслачы 3 касцёлы. Верагодна, абедзве праваслаўныя царквы былі пабудаваны на заходні манер — з вежамі замест купалоў, таму пецярбургскі госць і прыняў іх за касцёлы.

Магчыма таксама, што і Мікалаеўская і Успенская цэрквы ў канцы XVIII -пачатку XIX ст. былі уніяцкімі, як царква ў Зборску (А.Г.Немцаў зазначаў, што царкоўныя кнігі там вяліся спачатку на польскай мове).

Захаваўся краявід свіслацкага замчышча, зроблены ўдзельнікам школьнай краязнаўчай экспедыцыі ў 1928 г. На малюнку за руінамі замкавых збудаванняў узвышаецца купал Мікалаеўскай царквы. Магчыма, царква набыла «руска-праваслаўныя» рысы ў час рамонту ў 1860—1870-я гады — у той час у архітэктуры з'явіўся псеўдарускі стыль.

Паводле рэштак, што засталіся ад касцёла, а таксама інвентарнага апісання можна сказаць, што архітэктура гэтага храма тыповая для падобных пабудоў. Свіслацкі касцёл быў драўляны, меў двухсхільны дах і 2 вежкі пры ўваходзе. Да спісу клерыкальных збудаванняў Свіслачы, вядома ж, трэба дадаць яўрэйскі малельны дом і абавязковую школу пры ім. Кагал, які абасноўваўся ў Свіслачы, ніяк не мог абысціся без гэтых абавязковых для яго атрыбутаў. Аднак звесткі аб яўрэйскіх культавых збудаваннях, якія дайшлі да нас, настолькі нязначныя, што не даюць магчымасць меркаваць ні аб іх вонкавым выглядзе, ні аб месцазнаходжанні.

У 1786 г. пры перадачы ад Радзівілаў у маёмасць брацтву езуітаў фальварка Замошша быў складзены інвентар, які змяшчаў пералік жыхароў і іх павіннасцей[5]. У 13 дварах фальварка пражывалі са сваімі сем'ямі Яська Дзёмка, Максім Пінчук, Марко, Грышко, Вайсевіч, Пятрусь Дзёмка, Васіль Мокіч, Цімошка Мокіч, Мішка Дзёмка, Сымон Яўсеіч, Кіршко Кудлін, Хвёдар Дзёмка, Максім.

У Замошшы быў панскі двор, у якім жылі: Сцяпан Белы з жонкай, Арцём Дзёмка, Сямён Аўсееў з сынам і дочкамі, Атрахім Амяльянчык, Аўгусціна і Катрына Дзямковы.

Акрамя грашовых выплат (чыншу) сяляне павінны былі адпрацоўваць ад 1 валокі зямлі па 2 мужчынскія і па 2 жаночыя дні, з чым двор укажа, з паўвалокі — па 1 мужчынскім і па 1 жаночым дні. Гвалт штогодні таксама, з чым двор укажа. Службу яны павінны адбываць ад усходу да захаду сонца.

У 1793 г. адбыўся другі падзел Рэчы Паспалітай. Паводле ўказу ад 8.12.1792 г. рускім генералам на новых землях прадпісвалася: скласці тапаграфічныя карты, правесці перапіс усіх жыхароў, сабраць звесткі аб усім, што датычыцца вытворчасці спіртных напояў і г.д.

23.4.1793 г. імператрыцай быў падпісаны ўказ аб неабходнасці ўтварэння Мінскай губерні. У маі таго ж года выйшаў яшчэ адзін указ — аб утварэнні на тэрыторыі будучай губерні акруг, у т. л. Бабруйскай і Ігуменскай, і аб прызнанні цэнтраў акруг павятовымі гарадамі, аб перапісе сялян і аб складанні дваранскіх радаслоўных кніг, падобных да расійскіх.

У 1795 г. распараджэннем мінскага генерал-губернатара ў Мінскай губерні ўводзіліся асобныя суды для татар і яўрэяў. А ўказам імператрыцы ад 6.9.1795 г. прадпісвалася арганізаваць у новых губернях паштовую сувязь. Паводле гэтага ўказу пачалося будаўніцтва дарог, у прыватнасці дарогі Мінск — Чарнігаў з паштовымі станцыямі ў м. Свіслач і в. Галынка. На гэтых станцыях пастаянна дзяжурылі па 6 пашгальёнаў пры 12 конях. На добраўпарадкаванне дарог на працягу 3 гадоў у губерні патрэбна было сабраць 69 тыс. рублёў. Дарогі павінны быць падсыпаны пяском і абсаджаны бярозамі ў 2 рады. Пасадка дрэў — гэта натуральная павіннасць сялян пад наглядам паліцыі, а самі дрэвы трэба было дастаўляць з памешчыцкіх і казённых лясоў. Вось такім чынам на карце раёна з'явілася Кацярынінская шаша, якая праходзіла прамой лініяй па правым беразе Бярэзіны (там, дзе калісьці праходзіў шлях з Кіева ў Ноўгарад).

У тым жа годзе да 22 верасня былі складзены спісы дваран, праведзены выбары дваранскіх прадвадзіцеляў і, нарэшце, у Мінску пры гарматнай стральбе, прынародна была абвешчана Мінская губерня.

24 чэрвеня 1812 г. французскія войскі перайшлі граніцу Расійскай імперыі, пачалася вайна. 10 ліпеня перадавыя раз'езды французаў з'явіліся ў Свіслачы, апярэдзіўшы рускія часці, якія адступалі праз Бабруйск да Масквы.

У Бабруйску да гэтага часу была пабудавана магутная па еўрапейскіх мерках крэпасць. Адступаўшыя рускія войскі пакінулі ў крэпасці параненых, папоўнілі запасы і рушылі далей на ўсход. Крэпасць засталася на тэрыторыі, захопленай французамі. Для штурму Бабруйска спатрэбілася б цэлая армія, але нават самы паспяховы штурм не апраўдаў бы затрачаных на яго сіл і часу. Паколькі асноўнай задачай Напалеона было ўзяцце сталіцы і знішчэнне рускіх войскаў да наступлення халадоў, то асаду Бабруйска ён перанёс на больш позні час. Напалеон даў загад польскай дывізіі генерала Дамброўскага кантраляваць, каб не прарваліся часці гарнізона. Дамброўскі са сваім штабам размясціўся ў Свіслачы. Менавіта да гэтага часу адносяцца расказы старажылаў, запісаныя ў 2-й палове XIX ст. аб тым, што на замчышчы ў Свіслачы размяшчалася батарэя, трымаючы пад абстрэлам дарогу на Бабруйск. На месцы пераправы цераз Бярэзіну (там, куды вядзе брукаваная дарога, якая захавалася да нашых дзён) было пабудавана перад мостам умацаванне.

Французы нядоўга затрымаліся ў Свіслачы: 12 кастрычніка дывізія Дамброўскага рушыла да Мінска на злучэнне з арміяй Напалеона, якая адступала з Масквы.

Пасля заканчэння вайны 1812 г. імператар Аляксандр абвясціў сваім маніфестам «Прощение и забвение» усім жыхарам былога Вялікага княства Літоўскага, якія паспелі выказаць лаяльнасць французам. Але ж такіх аказалася вельмі многа, і царскі ўрад вырашыў пачаць некаторыя рэпрэсіі. Пад апалу трапіў і манаскі ордэн езуітаў. У 1820 г. манахі гэтага ордэна абвяшчаліся «неблагодарными» і «неблагонадежными» і належалі высылцы ў Аўстрыю, а маёмасць іх канфіскоўвалася. У 1823 г. езуіты канчаткова спынілі дзейнасць на тэрыторыі Беларусі. У 1831 г. такі ж лёс спасціг ордэны бернардзінцаў і дамініканцаў. Землі ордэнаў перайшлі да новых гаспадароў. З 1827 г. пачынаецца наступленне на уніятаў з мэтай падпарадкавання гэтай канфесіі праваслаўнаму Свяшчэннаму Сіноду. Вя-

дома, што Зборская царква зноў стала праваслаўнай у 1836 г. Да гэтага ж часу трэба аднесці «пераход у праваслаўе» цэркваў у Свіслачы і Халуі.

Паўстанне 1830 г. выклікала новыя рэпрэсіўныя меры. У 1831 г. выйшаў указ аб адмене пасад і званняў, якія захаваліся з часу ВКЛ, а таксама Літоўскага трыбунала, гродскіх і падкаморскіх судоў. Потым было распараджэнне аб новай інвентарызацыі маёнткаў (ужо па расійскіх правілах), аб пераводзе ўсёй дзелавой перапіскі на рускую мову і, урэшце, у 1840 г. на тэрыторыі Мінскай губерні была скасавана дзейнасць Статута ВКЛ.

У гэты ж час працягвалася картаграфаванне мясцовасці, вызначэнне меж паветаў, вывучэнне водных шляхоў. Прыкладам гэтай дзейнасці з'яўляюцца карты меж Ігуменскага і Бабруйскага паветаў. У той жа час пачынаецца складанне планаў асобных маёнткаў.

У выніку распараджэнняў аб інвентарызацыі ўладанняў з'явілася мноства актаў. У 1820—1830-я гады паменшыліся ўладанні Незабытоўскіх. Так, частка Лапічаў, Зборска і Халуя перайшла ва ўласнасць казны, а частка да Завішаў.

Паводле вопісу, складзенага ў час правядзення інвентарызацыі, і карты, дастасаванай да гэтага вопісу, бачна, што Незабытоўскія валодалі на Асіповіччыне землямі на правым беразе Свіслачы і на правым беразе Бярэзіны — ад Гарожы да Кася і Матавілы. Да 1842 г. ва ўласнасці гэтых памешчыкаў знаходзілася 3385 душ абодвух полаў. У актах рэвізій прыводзіцца доўгі спіс сялян Незабытоўскіх, праўда, не ўсе яны мелі прозвішчы. Абсалютная большасць падданых называецца толькі па бацькавым імені. Тыя ж прозвішчы, што сустракаюцца ў дакуменце, і па сённяшні дзень распаўсюджаны ў Асіповіцкім раёне. Гэта Дайнэкі, Каганы, Зяновічы, Рудыя, Шэўчыкі, Белахвосты, Дрэні і інш.

Павіннасці сялян у Незабытоўскіх такія, як і ў маёнтках іншых уладальнікаў. Гэта паншчына, аброк жытам, ячменем, аўсом, яйкамі, грыбамі, мёдам, хмелем, ягадамі, арэхамі, сенам, дровамі, грашамі. Паколькі Свіслач знаходзілася на вялікай дарозе, шмат прыгонных Незабытоўскіх былі пераведзены сваімі гаспадарамі ў рамізнікі і зараблялі на сябе і сваіх паноў перавозкай грузаў і людзей.

Пасля рэвізіі 1842—1844 гг. частка сялян Незабытоўскіх (463 мужчыны і 476 жанчын, ці ўся в. Брыцалавічы і яшчэ вёскі ў Бацэвіцкай воласці) былі перададзены ў казну, гэта значыць сталі дзяржаўнымі. Дзяржаўнай была і вёска Цэль, да яе далучылася м. Лапічы і інш. У XIX ст. — асноўная маса зямель у раёне належала буйным уладальнікам (Радзівілам, Вітгенштэйнам). Затым ішлі ўладанні сярэдніх (Незабытоўскія) і дробных (шляхецкі род Бокшаў і інш.) памешчыкаў. Аднадворцамі былі населены засценкі і ваколіцы — Углата, Ясянец, Прудок, Рэпішча, Мяжное, Жужлянка, Раны і інш. Калі аднадворцы сяліліся на зямлі памешчыкаў, то яны плацілі чынш, такі ж, як і сяляне. Такіх была большасць.

На становішчы дробнай шляхты жылі татары — нашчадкі тых, што пасяліліся ў нашых краях яшчэ ў даўнейшыя часы. У межах Асіповіччыны на пачатку XIX ст. татары ўжо амаль поўнасцю забылі сваю мову і звычаі, зліўшыся з масай малазямельнай і беззямельнай шляхты.

У мястэчках большую палову насельніцтва складалі яўрэі. Жыцін, што на Пцічы, таксама зваўся мястэчкам, аднак, па сведчанні аўтараў XIX ст., статус мястэчка ён меў хутчэй за ўсё дзякуючы сваёй гісторыі і вялікаму жаданню яго ўладальнікаў. Ні памерамі, ні заняткамі яго жыхароў Жыцін не вылучаўся з рамак сялянскага паселішча.

Яўрэйскае насельніцтва мястэчак зарабляла на жыццё ліхвярствам і пасрэдніцтвам паміж шляхтай, прадстаўнікамі ўлады і сялянамі (так званыя фактары), аптовай скупкай тавараў і развозкай па вёсках (такія гандляры звaліся прасоламі). Акрамя таго яўрэі трымалі корчмы, займаліся дробным рамесніцтвам (яўрэйскіх рамеснікаў звалі партачамі). Некаторыя яўрэі дасягнулі за кошт такой дзейнасці вялікага багацця, асноўная ж маса жыла ў нядолі і нават у галечы.

Паны, мяшчане (у тым ліку і яўрэі), аднадворцы, свяшчэннікі, чыноўнікі — усе разам узятыя — ніколі не складалі на гэтай тэрыторыі больш за 30% насельніцтва. Асноўная маса жыхароў была прыгоннымі і дзяржаўнымі сялянамі. Асновай гаспадаркі ў іх было земляробства з перавагай шматпольна-папранай сістэмы, аднак захавалася і больш старажытная падсеч-

на-агнявая (лядная). Трохполле ўжывалася толькі самымі заможнымі сялянамі і шляхтай, паколькі такая сістэма патрабуе ўгнаення глебы, а жывёлагадоўля ў нашым краі была развіта слаба.

А.К.Башняк зрабіў займальныя запісы аб жыцці тагачаснай Беларусі, аб неймавернай галечы сялян. Упамінаецца в. Прыцерпа, праўда, яна названа «При Церкви». Падарожнік апісвае таксама «небольшое местечко Свислочь, лежащее на берегах реки Свислочи, через которую построен деревянный длинный мост. На дороге к Свислочи — курганы, что остались памятниками происходивших здесь сражений. От Свислочи до Галынки и далее дорога идет бором»[6] (гэта значыць, мясцовасць тады выглядала зусім не так, як цяпер).

Сяляне выкарыстоўвалі прылады працы, якія яны атрымалі ў спадчыну з часу Кіеўскай Русі. Хаты, як і раней, былі з аднаго пакоя з печчу без коміна. Печы выкладваліся ў куце не на асобным падмурку, а на бэльках, якія ўмацоўваліся ў сцяне. З-за гэтага ўся хата з часам перакошвалася, завальваючыся на адзін бок. Хаты не мелі ні падмурка, ні падлогі, мэбля, у сучасным разуменні, складалася толькі са стала і лавак. Посуд, як і стагоддзе таму, заставаўся гліняным і драўляным.

У мяшчан і больш багатых сялян да хат прыбудоўваліся сенцы, а ў некаторых — яшчэ і клець без печкі, такім чынам атрымлівалася двух- і трохкамернае жыллё.

Дзяржаўныя чыноўнікі прымушалі сялян, якія жылі на казённых землях, рабіць коміны ў печах, бо ў курнай хаце зімой лёгка было прастудзіцца або ўчадзець. Сяляне супраціўляліся новаўвядзенням, адказваючы на ўсе ўгаворы: «Нашы бацькі так жылі». На самай жа справе яны такім шляхам эканомілі на цэгле, якая была дарагая. Але затое сяляне не эканомілі на гарэлцы. Статыстычныя справаздачы паказваюць, што па вёсках прапіваліся сумы, якія былі роўныя па велічыні ўсім чыншам і падаткам.

З далучэннем да Расіі Крыма пачаў будавацца Чарнаморскі флот, на патрэбы якога ішло шмат драўніны. У нашых краях усё больш станавілася лесарубаў і плытагонаў. З'явіліся новыя прафесіі: адны ацэньвалі дрэва, іншыя секлі, чысцілі ад сучча і кары (пры гэтым выкарыстоўваліся своеасаблівыя сякеры — склюды). Па рацэ бурлакі цягнулі баржы, «дубы», «камягі», «байдакі» з соллю, збожжам (Свіслач у XIX ст. стала хлебнай прыстанню). Буйныя бурлацкія ватагі не раз парушалі спакой у прыбярэжных мястэчках.

У гэты час існавалі і промыслы: выпальванне драўнянага вугалю, атрыманне паташу, вываранне дзёгцю, шкіпінару і вытворчасць гарэлкі. На месцы сучаснага пасёлка Ялізава ўжо ў той час працавала гута.

КРЫНІЦЫ:

1. Нацыянальны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 8208.

2. Тамсама.

3. Тамсама. Спр. 2455. Л. 87—89.

4. Тамсама. Л. 9—29.

5. Тамсама. Ф. 1727. Воп. 1. Спр. 25. Л. 293—294.

6. Дневные записки путешествия А.Бошняка в разные области Западной и Полуденной России в 1815 г. Ч. 1—2. М., 1820—21.

Ю.В.Клеванец.

Уздым і заняпад Жорнавак

На вокладцы тоўстай папкі дакументаў, што захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным архіве Рэспублікі Беларусь, выведзена: «Жорнаўкі. 1508—1923». Першы дакумент гэтай справы датаваны 1552 г. Гэта выпіс з кніг судовых «Яго Міласці пана Рыгора Айгарэвіча Осціка».

«Лета Божаго нарожения 1552 месяца мая 9-га. Оповядал и жаловал пред Его милосцю Паном дворенин Его Королевской Милосци Пан Миколай Нарушевич юж дзесь тых часов недавно минулыго понеделок месяца апреля 25-го старец его милосци князя Павла бискупа Виленского игуменски на имя Андрей Хлудзович з волости Юревицкой и з игуменцы нашедшы моцно гвалтом на владную землю Его Заямницкую. Людей Его, которые на он час на тэй земли Заямницкой лада пратали й пры них урадника Его Лаврына Яновича и сторону людей добрых, которые пры них были побили, поранили и вельмкое мордерство над ними вчынили, а одного з них на имя Олисея Братишкевича до смерци забили и нет ведома где оного подели. Которое гвалтовное нагложение на той земли его Заямницкой о побитте и взранение урадника и подданых своих оное дзесь

урадник его Лаврын враду замка Господарского Свислоцкому оповедал и жаловал и в книги то записати дал, нашто и выпис з книг под печатию оного урадника Свислоцкого на то у себя мел. Пры котором же оповеданию и ожалованию своим пан Миколай Нарушевич просил его милосци пана Виленского абы сий лист до отца бискупа Виленского послал з им дворенина Господарского пры котором бы как тот жал збыття и шкоды з подданых своих его Милосци оповядавшы, зложения року навчынения справедливосци тым старцом игуменским и з иншыми паддаными Его Милосци игуменцы просил. Яко ж Его Милосци дал ему на то дворенина Господарского Пана Семёна Коптя пред которым князь Бискуп Виленски затым обжалованию Пана Миколаева поведал юж дзесь околе вчынения справедливости з старцом и поддаными своими игуменскими з Юревцы. Року з аднаго непокладаю бо дзесь ешчо околе того достаточные уведомшты ад урадника своего не маю але на он час когды з почты ведомости околе того од врадника своего Свислоцкого мети буду Пану Миколаю тым старцем игуменским и з иншыми поддаными своими игуменскими справедливосци учынитти дложу. Его Милосци Пан Виленски тое оповедание Пана Миколая Нарушевича и отказ Его Милосци князя Бискупа Виленского до книг своих записал и на то выпис з книг Пану Миколаю под печатию своею дал.

Писан в Вильни»*.

Як бачна са зместу, надзвычайныя здарэнні таго часу нават не расследаваліся. Дастаткова было засведчыць факт крыўды ў адміністрацыі, да якой належалі крыўдзіцелі, і пасля перадаць заяву ў суд. Суд даводзіў аб здарэнні адпаведнаму землеўладальніку, і ўжо той прымаў рашэнне аб пакаранні сваіх падданых. Можна не сумнявацца, што гэта рашэнне звычайна было суровым, часцей са смяротным прыгаворам: беларускія дваране былі зацікаўлены ў захаванні агульнага спакою ў дзяржаве і разбою не дапускалі.

За старабеларускім арыгіналам 1552 г. у пашцы захоўваецца больш позняя копія на лацініцы. Гэта сведчанне таго, што дакументу надавалася асаблівае значэнне. Заключалася яно, відавочна, у тым, што тут упершыню згадваецца Заямніцкая зямля, размешчаная дзесьці непадалёку ад Свіслацкага замка, і яе ўладальнік — Мікалай Нарушэвіч. Відаць, для захавальнікаў дакумента гэтыя вехі былі вызначальнымі. Можна меркаваць, што зямля Заямніцкая так ці інакш мела потым дачыненне да Жорнавак (паколькі дакумент на працягу вякоў захоўваўся ў пашцы гэтага маёнтка), а прозвішча яе ўладальніка нейкім чынам звязана з больш познімі іх гаспадарамі.

Першыя пісьмовыя звесткі аб гаспадарах Жорнавак адносяцца да канца XV ст., калі мінскі мешчанін Харытановіч прадаў памешчыку Андрэю Іванавічу Маслянку за 50 коп грошаў літоўскіх значныя землі ўздоўж ракі Свіслач.

Жорнаўкі былі ў цане, і нездарма. Яны размяшчаліся на стратэгічным шляху з поўдня ў сталіцу. Войскі і звычайны гандлёвы транспарт з Гомеля накіроўваліся на Бабруйск, праз Свіслач, Вязаўніцу, Лапічы і далей — на Пухавічы, Мінск, Вільню. Дастаткова паглядзець на старыя карты, каб пераканацца ў тым, што іншых значных дарог на Мінск тады не існавала. Калі ж улічыць, што да маёнтка спрадвек былі прыпісаны Лазовае, Пагарэлае, Амінавічы і іншыя вёскі ўздоўж дарогі, то стане зразумелым, што ўладар Жорнавак трымаў у руках не толькі зямлю, а і шлях зносін з поўднем і быў знаны ў дзяржаве. Мінскі бурмістр Маслянка не быў выключэннем. Разбагацеўшы на сваёй пасадзе (ён зарабляў, дарэчы, шаснаццаць коп грошаў у год) і завалодаўшы Жорнаўкамі, ён перайшоў у разрад найбольш уплывовых сямействаў княства.

Пасля Маслянкі Жорнаўкі перайшлі Самуілу Карэйве, а ад яго Мікалаю Нарушэвічу. Хутчэй за ўсё гэта адбылося ў XV ст., таму што ўжо ў 1552 г. Жорнаўкі звязаны з яго імем. Дакументы сведчаць аб тым, што ў 1612 г. Нарушэвіч здаваў Амінавічы і Жорнаўкі ў арэнду Буткевічу і распараджаўся імі на працягу далейшых гадоў.

У 1837 г. згодна з царскім указам у Мінскі губернскі дваранскі сход звярнуўся памешчык Пётр Нарушэвіч. Ён хацеў пацвердзіць сваё дваранскае паходжанне. Паколькі прамых дакументаў, якія б сведчылі радавод, у яго не было, то ён прадставіў паказанні дзевяці сведкаў — чыноўнікаў і дваран губерні, якія гарантавалі яго прыналежнасць да шля-

* Нацыянальны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь (далей па тэксце НГАРБ). Ф. 694. Спр. 1012. Л. 1 — 1 адв.

хецкага саслоўя, а таксама паперу, датаваную 1688 г. — закладны грашовы запіс на валоку зямлі і фальварак Невяроўшчына для забеспячэння сумы ў 30 коп грошаў літоўскіх ад лоўчага Ражанскай зямлі Грабкоўскага зямяніну Яго Каралеўскай Міласці Ашмянскага павета Мікалаю Нарушэвічу. Менавіта гэтага Мікалая і паказаў Пётр Нарушэвіч як свайго родапачынальніка.

Цалкам верагодна, што далейшая перадача Жорнавак ад Нарушэвічаў Валовічам адбылася ў выніку шлюбу нашчадкаў ці продажу маёнтка.

Кацярына Нарушэвічава — дачка падканцлера Вялікага княства Літоўскага — выйшла замуж за абознага ВКЛ Яна Валовіча. Зазірнём у той час і адзначым, што гэты шлюб аб'яднаў два даволі ўплывовыя беларускія роды.

Род Валовічаў спрадвечна карыстаўся гербам «Багорыя» (выява дзвюх зламаных стрэл на чырвоным полі). Гэты герб прыняў сабе і нашчадкам у 1413 г. на Гродзенскім сейме Станіслаў Высіжэн (што азначае: які ўсіх ахоўвае).

Род Валовічаў даў Беларусі выдатных дзяржаўных дзеячаў, пісараў, ваяроў.

Ён радніўся з Радзівіламі (Тэкля Валовіч была жонкай стольніка літоўскага, маршалка надворнага, ваяводы полацкага Аляксандра Людвіка Радзівіла — аднаго з родапачынальнікаў асіповіцкай галіны гэтага роду.

У 1552 г. — годзе крымінальнага здарэння на Асіповіччыне «ў зямлі Заямніцкай», калі інтарэсы двараніна яго каралеўскай міласці Мікалая Нарушэвіча пацярпелі ад нахабства падданых Віленскага біскупа князя Паўла, адзін з самых вядомых прадстаўнікоў роду Валовічаў Астафі пачынаў свой узыход да першай службовай прыступкі — пасады каралеўскага пісара ў Вялікім княстве Літоўскім. Канешне ж, ён ведаў сваю радню, іншых Валовічаў, у тым ліку і па лініі свайго дзядзькі Марака. Яго стрыечны брат - вядомы ў краіне дзяржаўны дзеяч, мсцібаўскі староста і маршалак надворны Рыгор (Грыгоры) Валовіч — хутчэй за ўсё і вырашаў з Нарушэвічамі лёс асіповіцкіх зямель у 1-й палове XVI ст.

Дакументы XVII—XVIII ст. захавалі факты аб тым, што Валовічы былі дбайнымі і чулымі гаспадарамі, і хоць жылі ў Вільні, далёка ад Жорнавак, але ведалі пра ход тутэйшых спраў і не дазвалялі крыўды ў адносінах да сябе і сваіх падданых. Гэта чалавечнасць была вядома далёка за межамі іх уладанняў.

Напрыклад, калі ў 1662 г. палкоўнік Колкштэйн са сваімі палкамі разрабаваў Жорнаўкі, сын Вінцэнта Валовіча Дамінік, канонік віленскі, староста обальскі запатрабаваў аднаўлення страт і пакарання вінаватых. Паратунку ў Валовічаў шукалі прыгонныя іншых землеўладальнікаў, даведзеныя да адчаю самадурствам сваіх гаспадароў.

У радаводах тых часоў злучаліся прозвішчы, вядомыя калі не ўсёй дзяржаве, то бліжэйшаму наваколлю абавязкова. Марцыян Валовіч, у якога было тры сыны і дзве дачкі, ухваліў пачуцці свайго сына Яна, калі той паведаміў, што Кацярына Нарушэвіч кранула яго сэрца. Яшчэ б: парадніцца з падканцлерам дзяржавы! Аб гэтым можна толькі марыць. Зрэшты, Ян быў відным хлопцам, вызначаўся не толькі знешнасцю, выпраўкай, але і розумам. Згодна з прыжыццёвым бацькоўскім завяшчаннем 1670 г. яму належалі Вязаўніца, Ерамонічы, Навасёлкі, Янаўская Слабада, Каменічы, маёнтак і мястэчка Халуй. Калі дадаць жончын пасаг, то можна было і не хвалявацца за будучыню.

Маладыя жылі шчасліва. Ян хутка ішоў па службовай лесвіцы і дасягнуў пасады абознага дзяржавы. Кацярына ўсё жыццё кахала яго, нарадзіла дзвюх дачок: Ганну і Фядору. Службовыя справы не адпускалі Яна з Вільні і не дазвалялі часта наведваць Мінск і вотчынныя землі, але ўсё ж аднойчы ён з сям'ёй адправіўся ў Халуй. Дзеці былі рады падарожжу, іх кранула прыгажосць наваколля і тое, што тут усё было іхняе: прыгажуня Свіслач, кваціcты дыван уздоўж дарогі і гэтыя дзіўныя, як лялькі, людзі, якія нізка кланяліся ў бок карэты, што пралятала з пылам па шляху...

Здавалася, што дружным паміж сабой дзяўчынкам лёс аднолькава адмерае шчасця. Аднак жыццё распарадзілася па-свойму. Ганна двойчы пабывала ў шлюбе, але так і засталася бяздзетнай. Спачатку яе выдалі замуж за генерала Фелікса Урбановіча, а пасля яго смерці ёй прапанаваў руку і сэрца трокскі падкаморы Укольскі. Даволі ганарлівыя Урбановічы другі шлюб Ганны прынялі як абразу (род

Укольскіх стаяў ніжэй у дваранскай іерархіі) і, паколькі атрыманыя Ганнай у пасаг багацці пасля другога шлюбу перайшлі ў рукі новага мужа, доўгі час даймалі яе матэрыяльнымі прэтэнзіямі.

Сястра Фядора як магла дапамагала ёй. Урэшце менавіта Фядора атрымала ў спадчыну ад свайго бяздзетнага дзядзькі Вінцэнта маёнтак Жорнаўкі з аднайменнай вёскай, Амінавічы, Пагарэлае, Лазовае, Ляды, Бозак, Малыя Жорнаўкі, Граўку, Казубавічы, Сёмкаву Слабаду, Снусцік і менавіта яна, захаваўшы лепшыя якасці свайго дзеда па матчынай лініі — Мікалая Нарушэвіча, — паклала пачатак радавой лініі Завішаў, якая без змены прозвішча жыла і валодала прасторамі ад Беразіны да Лапіч аж 2 стагоддзі да самай Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Сярод імён беларускага сярэднявечча Завішы адны з многіх, аднак для гісторыі Асіповіцкага раёна значэнне іх роду вызначальнае. Менавіта Завішы на працягу некалькіх стагоддзяў валодалі тут зямлёю, як маглі развівалі гэты край, пабудаваўшы не толькі фальваркі, заводы і школы, але ў рэшце рэшт і чыгунку ад Верайцоў да фальварка Градзянец і да Халуя.

Прадстаўнікі роду Завішаў мелі герб «Лебедзь». Спачатку карысталіся гербам «Ружа», менавіта яго выкарыстоўвала асіповіцкая галіна, якая ў сваім радаводзе мела вядомых і яскравых прадстаўнікоў.

Спрадвечным радавым гняздом Завішаў быў маёнтак Кухцічы (зараз Уздзенскі раён). Да маёнтка ў Ігуменскім павеце (у розных яго частках) былі прыпісаны шматлікія вёскі, засценкі і фальваркі. Непасрэдна ў Кухцічах размяшчаўся цагляны палац — рэзідэнцыя Завішаў — і хоць ён уступаў у раскошы Нясвіжскаму палацу князёў Радзівілаў, але і тут былі багата аздобленыя залы і жылыя пакоі, захоўваліся мастацкія каштоўнасці і кнігі. Тут было месца музе і бесклапотнаму вяселлю. Завішы любілі прымаць гасцей і радніліся са старажытным, вядомым на ўсю краіну як багаццямі, так і культурай, родам Радзівілаў. Завішы былі не толькі вялікімі землеўладальнікамі, але і добрымі ваярамі. Яны ведалі, што трэба абараняць, за што змагацца, і выступалі за ўмацаванне дзяржаўнасці. Каралі іх ведалі асабіста і ў гонар іх вайсковых заслуг неаднойчы ўзнагароджвалі ордэнамі і прывілеямі.

Крыштоф Завіша на Бакштах быў адным з найбольш вядомых прадстаўнікоў роду ў часы Вялікага княства Літоўскага. Унук Крыштофа Завішы Ян Ежы пабраўся шлюбам з Фядорай Валовіч, гаспадыняй Жорнавак. Дзе і як першы раз Ян сустрэў сваю каханую — невядома. Не выключана, што першую сустрэчу падрыхтаваў яе стары бацька. Нам ніколі ўжо не спазнаць тайну сардэчнага яднання Фядоры Валовічавай і Яна Ежы Завішы. Застаецца толькі сведчыць факт: яны аднойчы сустрэліся, каб не толькі назаўсёды стаць мужам і жонкай, але і пакінуць нам праз тры стагоддзі ўзор сямейных узаемаадносін і адданасці. Іх каханне было чыстым і ўзнёслым, а шлюб аб'яднаў у адно два магутнейшыя і старэйшыя роды. І калі стары Завіша радаваўся на вяселлі пашырэнню зямельных уладанняў сына (за Фядорай былі аддадзены землі па левым беразе Свіслачы ад Лапіч амаль да Свіслацкага замка), то Ян Валовіч разам з зяцем набываў надзею на працяг роду і перадачу ўнукам сваёй багатай спадчыны.

Маладая сям'я жыла ў Кухцічах і мела шмат сяброў у розных кутках: у Мсціславе, Браславе, Смаленску і Мінску, дзе даволі часта сустракалася з сям'ёй мінскага ваяводы Крыштофа Завішы — стрыечнага брата Яна Ежы. Не без яго ўдзелу Ян імкліва ішоў па службовай лесвіцы, стаў палкоўнікам, атрымаў пасаду мінскага харунжага. У іх з Фядорай нарадзіліся двое хлапчукоў. Удала ў маладой сям'і ладзіліся справы, кожны год прыбаўляў дабрабыту, пашыраў кола сяброў. Не раз прыслуга ў Жорнаўках мітусілася, чакаючы прыезду з Кухціч шумнай кампаніі. Бывала, вясной, пасля Вялікадня ў парку непадалёк ад рачулкі Граўкі (на тым месцы зараз захаваліся векавыя дубы і ліпы) рассцілаўся вялікі абрус, лілося віно, гучалі жарты і смех. На такія сняданні запрашаліся войты завішаўскіх маёнткаў. Ішла гаворка аб выкананні павіннасцей сялянамі, выказваліся меркаванні аб будучым ураджаі. Гэта былі не сухія даклады, а зацікаўленае абмеркаванне спраў. А чалавечыя адносіны таго часу мала чым адрозніваліся ад сучасных. У архівах знаходзіцца безліч дакументаў, якія сведчаць аб моцных пачуццях і роспачы ад

ашуканства, гаспадарчых здольнасцях і звычайных крадзяжах. Усё гэта было ўласціва і сям'і Завішаў. У сямейнай перапісцы, гандлёвых дакументах, шматлікіх задакументаваных спрэчках з-за зямельных пытанняў яны паўстаюць звычайнымі людзьмі. Бадай, адзінае адрозненне паміж імі і нашымі сучаснікамі ў тым, што яны значна больш шанавалі бацькоўскі дом, радавое гняздо. Дзе б ні жылі і працавалі тыя Завішы — у Браславе, Вільні, Мінску ці Віцебску — яны ведалі, што варта апынуцца ў Кухцічах, як пытанне чый ты і адкуль знікне само сабой.

Пераехаўшы на пастаяннае месца жыхарства да мужа ў Кухцічы, Фядора змагла раскрыцца тут не толькі як ветлівая гаспадыня, але і як сапраўдная ўладарка. Не парываючы сувязі з бацькоўскай спадчынай — Жорнаўкамі, яна кіравала імі з вялікай любоўю і карысцю не толькі для свайго дома, але і для асіповіцкіх сялян. Яе подпіс стаіць пад шматлікімі купчымі, распіскамі, іншымі гаспадарчымі дакументамі гэтага маёнтка, у тым ліку і пад лістом вызначэння павіннасцей за 1724 г. Сярод жыхароў вёскі таго часу значацца Савасцей Стэльмах, Міна Мухаморын, Марцін Хадуй, Паўлюк Маскаленка, Паўлюк Акулін, Ян Тальчэўскі, Карп Калюшаў, Грышко Вергеен...

Клопат Фядоры аб спадчыне быў блізкім мужу. Знаходзячыся на дзяржаўнай службе, ён выдзяляў час і дапамагаў жонцы вырашаць шматлікія маёмасныя пытанні па Жорнаўках у ваяводскіх установах Мінска, сачыў за своечасовым выкананнем абавязацельстваў арандатарамі і спраўнай работай млыноў, падтрымліваў устойлівую духоўную сувязь жонкі з касцёлам бернардзінцаў у Мінску. Ён любіў дзяцей, быў чулым, уважлівым мужам. Фядора і Ян жылі душа ў душу, ва ўзаемнай павазе і любові, што было шырока вядома навакольным. Да нас жа водгукі іх замілавання і ласкі данёс Фядорын духоўны запавет-тастамент. Дакумент гэты вялікага эмацыянальнага запалу і духоўнай сілы быў прадыктаваны ёю пры жыцці ў 1715 г. У ім адлюстраваны не толькі духоўны запавет і прызнанне ў каханні, але і сувязі вядомых беларускіх родаў. Разам з магутнай любоўю да жыцця, да сваіх блізкіх выказана ў ім пяшчота да свайго мілага адзінага мужа: «...з якім праз чысціню пачуццяў нашых, калі б узаемнае двухбаковае каханне працягнулася яшчэ гады, заўжды нязменна яго кахала б сама спазнаючы пяшчоту і ўзаемнасць як адзінай у маім жыцці радасці салодаснага кахання сэрцам. Усё жыццё яму хацела служыць, заўжды — аж да апошняй рысы. У гэтай боскай тваёй пяшчоце сведчанне кахання твайго ў жыцці нашым, асляпляючага кахання — пачуцця, за якое з глыбіні майго сэрца зыходзіць удзячнасць на век і аб ім зараз праўдзівы нашу доказ кахання майго і такім яго захавала...» (НГАРБ. Ф. 694. Воп. 5. Спр. 177.)

Аб'яднаная спадчына, якая акрамя Кухціч упершыню ўключала і Жорнаўкі, пасля смерці бацькоў спачатку перайшла сынам Фядоры Крыштофу Тэабольду і Феліцыяну, а потым (паколькі Феліцыян не меў дзяцей) дзецям Крыштофа.

Фядорыным унукам давялося жыць у цяжкі і складаны час. Дзяржава распадалася на вачах. Пасля трох падзелаў Рэчы Паспалітай у 1795 г. Беларусь поўнасцю была ўключана ў склад Расійскай імперыі. Жорнаўкі апынуліся на яе тэрыторыі...

Двое з чатырох сыноў Крыштофа Завішы — Ян і Казімір — аказаліся ў гэты час найбольш блізка да палітычных падзей. Ян, які наследаваў асіповіцкую спадчыну і які ў 1785 г. атрымаў ад караля Станіслава Аўгуста патэнт на пасаду камергера польскага двара, усю будучыню звязваў толькі з Каронай. І шлюб з Тэрэзай Свентаржыцкай, і нараджэнне сына Івана Тадэвуша (Фадзея), і ўзнагарода — ордэн Святога Станіслава былі для яго шчасцем, якое збылося дзякуючы каралю. Ён падтрымаў рашэнні вальнага сойму з-за таго, каб набыць большую значнасць у мясцовай ігуменскай шляхты, і сына хрысціў, прыехаўшы ў Жорнаўкі (у касцёле ў Блоні), каб лішні раз падкрэсліць — былі Завішы для вас гаспадарамі і будуць! Усе чуткі і размовы аб надыходзячым канцы дзяржавы ён абвяргаў. Нават тады, калі рускія вершнікі несліся па шляху ад Каменіч да Гравы, палкоўнік войскаў літоўскіх Ян Карал Завіша верыў у сілу і вечнасць Польшчы.

Яго брат Казімір Аляксандр быў большым рэалістам. Ён таксама прысвяціў сябе вайсковай службе, меў чын капітана войс-

ка. Да службы адносіўся сумленна, быў патрабавальным камандзірам. За высокае прафесійнае майстэрства і мужнасць атрымаў два ордэны: Святога Станіслава і Белага Арла і сустрэў анексію Вялікага Княства ў чыне палкоўніка. Тое, што адбылося, Казімір перажываў як асабістую трагедыю.

Улічваючы тое, што шляхта Рэчы Паспалітай не вельмі змагалася за сваю незалежнасць, Кацярына II даволі лаяльна аднеслася да яе лёсу. Практычна ўсім вядомым родам былі захаваны прывілеі. Некаторыя прадстаўнікі іх увайшлі ў новыя органы мясцовай улады.

Улічваючы погляды і вопыт Казіміра Завішы, начальства Гродзенскай губерні хадайнічала перад імператарам аб прадастаўленні яму вайсковай пасады. Казіміру было прысвоена званне генерал-маёра расійскіх войскаў, і ён пачаў новую службу.

Ян Карал з Тэрэзай і маленькім Фадзеем працягваў жыць у Варшаве. Ён адышоў ад палітыкі і поўнасцю аддаўся выхаванню сына і паляпшэнню спраў маёнтка, хоць сам у Жорнаўках па-ранейшаму бываў даволі рэдка. Падчас кампаніі 1812 г. ён не супрацоўнічаў з Напалеонам, дзякуючы чаму не толькі захаваў свае ўладанні, але і жыццё сваіх сялян.

Ён меў у Жорнаўках амаль 30 тысяч дзесяцін зямлі і заставаўся адным з самых буйных землеўладальнікаў Ігуменскага павета, саступаючы мабыць толькі князю Вітгенштэйну і Радзівілам. Акрамя прыпісаных да маёнтка Жорнаўкі фальваркаў Новая Ніва, Пагарэлае, Трэцын, Вязаўніца, Навасёлкі, Завішын, Паташня, Заграддзе, Вяззе, мястэчка Халуй, засценкаў Стайцы, Сценкі, Крычавец, Блыхава, Буда, Амінавічы, Градзянец (Градзянка), Бозак, Лісіца, Прыцерпа, Баравуха, Ямнае і іншых Завішу належалі таксама прыпісаныя да маёнтка каля сотні дваровых людзей, 3 млыны, 3 карчмы і дзягцярны завод. Фадзей Іванавіч быў добрым гаспадаром. Ён разумеў, што займацца земляробствам на нізкародных землях — справа малапрыбытковая і бесперспектыўная. Куды больш надзейна займацца лесам, тым больш што прырода адарыла жорнаўскае наваколле унікальнымі ўмовамі для росту карабельных бароў, зараснікаў дубу і іншых каштоўных парод дрэў. Паступова яго лясная дача стала не толькі буйнейшай, але і самай дагледжанай. Яна спаборнічала па якасці лесу з дзяржаўнымі, размешчанымі ў Цэлі, Лапічах і іншых месцах раёна. Лесасекі, якія былі пры ім закладзены, падлягалі высечцы ў пачатку, а то і ў сярэдзіне XX ст.

Менавіта ў гэты край прыехаў у свой час упаўнаважаны Расійскага флоту. Добры знаўца матэрыялаў для караблебудавання аб'ехаў за сваё жыццё не адну лясную вярсту. Ужо не адзін месяц ён ездзіў і па заходніх губернях. На жаль, для патрэб флоту тут нічога вартага не сустракалася. У дзяржаўных лясных дачах пераважалі ліставыя пароды, а калі і траплялася хвоя, дык такой якасці, што толькі ў печы паліць. Тое, што ён убачыў у Лапіцкай лясной дачы, было ашаламляльным: векавая хвоя расла борам. Стромкая, па даўжыні больш за сто сажняў яна, як потым высветлілася, мела неабходную колькасць смалы і з поспехам магла быць выкарыстана для пабудовы караблёў.

У памяшканні лясніцтва, схіліўшыся над планам дачы, стары карабел уздыхнуў з палёгкай: камандзіроўка ў Паўночна-Заходні край атрымалася не марнай.

— А чый лес мы бачылі ля Жукаўкі? — запытаў ён у начальніка лясной варты.

— Мясцовага памешчыка Завішы, ваша высакароддзе.

— Завішы? Бачу, бачу... Цудоўны лес. Шкада, што не дзяржаўны. Аднак, пазначу, што яго можна набыць для патрэб флоту...

Фадзей Завіша імкнуўся падтрымліваць добрыя адносіны з усімі прадстаўнікамі роду і дапамагаў усім, хто да яго звяртаўся. Калі яго пляменнік Ігнат захацеў паступіць на службу афіцэрам Лубенскага гусарскага палка, дзядзька гарантаваў яго фінансаванне. Ён цаніў адукацыю, хоць добра разумеў: яна не забяспечыць дабрабыту. Каталіку ў Расіі было шмат што забаронена ў той час.

Калі Фадзею Завішу было 32 гады, у яго нарадзіўся сын. Ні сам Фадзей, ні яго жонка не ведалі тады, што іх Іван стане апошнім мужчынам роду. У тостах, якія пасля прыезду з Уздзенскага касцёла гучалі на хрэсьбінах у гонар нашчадка, было адно — працяг роду яшчэ на незлічоную колькасць гадоў. Аднак гэтыя заклікі не былі пачуты богам...

Іван пэўны час выхоўваўся дома, атрымаў пачатковую адукацыю, а потым прадоў-

жыў вучобу ў Курляндскай гімназіі. Пасля заканчэння вярнуўся ў Мінск, дзе, дзякуючы клопату бацькі і з дазволу імператара, быў прызначаны на службу ў Мінскі дваранскі дэпутацкі сход, дзе і працаваў больш за 10 гадоў.

Позні шлюб мужчыны ў той час быў заканамерны, аднак Фадзею хацелася яшчэ пры жыцці паглядзець на нявестку. Урэшце сын паведаміў аб намеры скончыць халасцяцкае жыццё. І Фадзей Завіша, і сам Іван, які доўга прыглядаўся да дзяўчат, засталіся задаволены выбарам — маладая прыгажуня была каталічкай, акрамя прыемнай знешнасці мела графскі тытул і дом у Варшаве, дзе, зрэшты, у 1855 г. і адбылося вяселле Івана Завішы з фрэйлінай двара Яго Імператарскай Высокасці, дзявіцай, графіняй Марыяй Кванецкай. Маладая пара пасялілася ў Варшаве.

Зразумела, што Івану, які з правінцыяльнага Мінска аб'ехаў з жонкай паў-Еўропы і трапіў у сталіцу царства Польскага, было не да Жорнавак. Усё даглядаў у маёнтку стары Фадзей. Ён прыязджаў у Варшаву на наступны год пасля шлюбу сына, расказваў аб справах, імкнуўся адрадзіць яго цікаўнасць да вотчыны, аднак сын не спяшаўся назад. Тым больш, што неўзабаве маладая і прыгожая жонка нарадзіла яму дзвюх дачок, і стала зразумелым, што дзеля іх дабрабыту лепей назаўсёды застацца ў Варшаве. Іван звярнуўся да імператара з просьбай дазволіць змяніць краіну пражывання і неўзабаве стаў грамадзянінам Польшчы.

Гэты факт не мог не адбіцца на стане мясцовых спраў. Некаторыя тутэйшыя адміністратары шукалі спосаб скампраметаваць Івана Фадзеевіча, які не вельмі любіў наведвацца ў вотчыну. У 1867 г. уздзенскі валасны старшыня Кандрат Герасімовіч «даводзіў да ведама» губернскага начальства, што Завіша высяляе з сваіх уладанняў асоб праваслаўнай веры, а на іх месцы селіць католікаў.

Безумоўна, тыя, каму прапаноўвалі пераехаць на новае месца жыхарства, не дзякавалі памешчыку. І гэта зразумела: сям'я траціла мястэчка, пэўныя выгоды і сувязі. Аднак права асабістай уласнасці, якімі б горкімі не былі часам яго бакі, непарушнае. Завіша ўсё рабіў законна, зыходзячы не з царкоўных ці палітычных перакананняў, а з права сваёй уласнасці на зямлю.

Пасля смерці бацькі ў 1866 г. адносіны Івана да спадчыны змяніліся, да Жорнавак ён пачаў адносіцца з большай цеплынёй і павагай. Паказаў маёнтак сваёй жонцы, аднойчы яны прыязджалі на лецішча ў Халуй разам з малалетнімі Марыяй і Магдалінай.

Пасля адкрыцця чыгункі даязджалі цягніком да Мінска, дзе сустракаліся з кіраўніком маёнткаў, слухалі даклад, удзельнічалі ў невялікім застоллі, куды звычайна запрашаліся шматлікія знаёмыя, а потым — да Асіповіч, дзе іх сустракала цэлая світа мясцовых служкаў. Калі ж картэж накіроўваўся ў Халуй, многія з мясцовых прыгажуноў сарамліва касіліся на Завішынскіх дзяўчат: варшаўскае выхаванне, пэўная раскаванасць, а галоўнае — прыгажосць пакаралі юначыя сэрцы.

Сам Іван любіў аб'ехаць усе вёскі маёнткаў. Галоўная сустрэча і першы прыпынак — у Жорнаўках. Супастаўленне пісьмовых дакладаў з рэчаіснасцю, сустрэчы з ляснічымі. Варшава — Варшавай, а галоўнай крыніцай даходу ўсё ж такі заставаўся далёкі ад яе жорнаўскі лес. Іван Фадзеевіч пераняў бацькоўскі падыход і займаўся лесам на навуковай аснове, шмат сродкаў аддаваў на папаўненне фонду. У 1880 г. у Жорнаўскай лясной дачы па яго ўказанні былі закладзены буйныя плантацыі хвоі і дубу, вырабы з якога і раней карысталіся павышаным попытам на знешнім рынку.

У Расійскай імперыі пільна сачылі за лесакарыстаннем. Незалежна ад прыналежнасці лясоў разліковая лесасека ўзгаднялася з дзяржаўнымі органамі, новыя культурныя пасадкі заахвочваліся: да 30 гадоў з плошчы такіх пасадак памешчык не плаціў падаткі. Ён быў зацікаўлены ў тым, каб пасля гэтага тэрміну маладзенькія бары нагадвалі абрысы карабельнага бору, бо разам з падаткамі прыблізіцца і час іх скарыстання. Нягледзячы на абцяжаранасць сервітутам, разбіты на кварталы прасекамі лес Завішы добра ахоўваўся і прарэджваўся, крадзяжы і пажары ў ім былі з'яваю вельмі рэдкай.

Мерапрыемствы па лесаразвядзенні патрабавалі немалых капіталаўкладанняў, і Іван Фадзеевіч ішоў на іх, хоць ведаў, што сам скарыстаць багацці ўжо не зможа (ча-

лавечы век, на жаль, карацейшы, чым век дуба). Яго клопат павінен быў даць плён і даход унукам і праўнукам, якія, як меркаваў ён, будуць жыць у далёкім ад яго шчаслівым дваццатым стагоддзі... Не ведаў ён, што гэты век стане векам выпрабаванняў для яго сям'і і ўжо на яго пачатку будуць беззваротна страчаны багацце і слава Завішаў.

Магдаліна ўвайшла ў валоданне маёнткамі Завішаў 3 студзеня 1889 г., праз год пасля смерці бацькі, і ў маі таго ж года даверыла кіраванне Жорнаўкамі Антону Асоўскаму. Спадчына ёй дасталася значная. На пачатку XX ст. яна была, бадай, самай багатай памешчыцай Ігуменскага павета. Ёй належала 41 тысяча дзесяцін зямлі! Падатковай інспекцыяй маёнтак Жорнаўкі разам з усімі прыпісанымі да яго вёскамі і іншым скарбам у 1910 г. быў ацэнены ў астранамічную па тым часе суму 2 765 775 рублёў 86 капеек. Ёй належаў таксама багацейшы радавы маёнтак Завішаў у Кухцічах. Акрамя таго Магдаліна Завіша была самым буйным уладальнікам лясных угоддзяў Асіповіччыны. Яе лясная дача ад Лапіч да Градзянкі налічвала 27 тысяч дзесяцін.

Першы раз яна выйшла замуж у 20 гадоў за чалавека, які быў значна старэйшы за яе. У 34 гады яна стала ўдавой. Пасля смерці граф Людвік Красінскі пакінуў ёй добры ўспамін аб сабе, спадчыну і прозвішча. Вядома, такая багатая жанчына была на вачах, мела шмат паклоннікаў, аднак яна не спяшалася з выбарам. Неяк у час падарожжа па Еўропе яна выпадкова пазнаёмілася з маладым Мікалаем Радзівілам — пляменнікам нясвіжскага ардыната Антона Радзівіла. Малады чалавек спазнаў у адносінах да Магдаліны вялікае каханне.

Мікалай нарадзіўся ў Прусіі ў сям'і вайскоўца. Яму было 8 гадоў, калі бацька змяніў грамадзянства і, атрымаўшы тытул камер-юнкера «высочайшего двора», перасяліўся з Берліна ў Санкт-Пецярбург. Там і прайшло дзяцінства Мікалая. Атрымаўшы універсітэцкую адукацыю, маючы шмат сяброў, ён вырас упэўненым прыгажуном, здольным на смелыя ўчынкі. Шлюб з жанчынай, якая старэйшая на 19 гадоў, быў для яго зусім натуральным. Вяселле згулялі ў Берліне, жылі ў Варшаве. Пакрысе Мікалай уваходзіў у курс спраў. Ён бачыў, што кіраванне агромністымі ўладаннямі патрабуе абсалютнага даверу да выканаўцаў і сучасных падыходаў да выкарыстання рэсурсаў. З дазволу жонкі (якая цалкам давярала яму) ён запрасіў да кіравання маёнткамі свайго знаёмага і сябра, інжынера, спецыяліста па выкарыстанні лесу корпуса ляснічых надворнага саветніка Роберта Брутана. З'яўленне гэтага чалавека ў Жорнаўках паклала канец рабаванню спадчыны Магдаліны. Менавіта Брутан разам з іншымі даверанымі асобамі гаспадыні на працягу 9 гадоў вёў цяжбу за засценак Бозак. Справа была ў тым, што невялікі гэты засценак у 20 дзесяцін зямлі быў прыпісаны да маёнтка Жорнаўкі і належаў спрадвеку Завішам. Апошнія паўвека Бозак арандавалі дваране Піятровічы: Іван, потым яго сын Вікенцій, і ўрэшце сын Вікенція Антон. Калі ў 1903 г. выйшаў закон, які даваў сталым арандатарам права першаснага выкупу зямлі, то сын і бацька Піятровічы не зрабілі адпаведных захадаў (ці то «праспалі», ці то проста ў іх не было грошай) і не падалі на працягу года (тэрмін, устаноўлены законам) заяву на выкуп засценка. Праз 3 гады 28-гадовы Антон «ачухаўся», але афарміў дакументы з парушэннямі. Справа цягнулася да 1912 г. і, нягледзячы на пратэсты памешчыцы, закончылася тым, што Антон Піятровіч атрымаў усё ж такі права на выкуп засценка... У засценку Таўстуха Кухціцкага маёнтка патрабаваў зямлю Серафім Юрэвіч, хацелася зямлі і іншым арандатарам, якія не мелі грошай. Судовыя справы, якія Брутан перадаваў у воласць, разглядаліся марудна, не паслядоўна. Яму даводзілася шмат ездзіць па вёсках, каб і бягучыя справы не ўпусціць, і да суда паспець.

Для гісторыі барацьба за невялікі кавалак зямлі побач з вёскай (у самой вёсцы Бозак, якая існуе і сёння, у той час жыло больш за 4 сотні жыхароў) уяўляецца не такой ужо і важнай, аднак яна пралівае святло на ўзаемаадносіны ў асіповіцкіх вёсках на пачатку XX ст. Лаянкі і папрокі арандатараў, абыякавасць чыноўнікаў і адкрытае парушэнне імі законаў стваралі вакол памешчыкаў атмасферу нецярпімасці. Усё большую моц адчувалі дробныя землеўласнікі, арандатары і нават батракі.

Менавіта Брутан падтрымаў і ўхваліў ідэю аб будаўніцтве чыгуначнай веткі для

асваення лясных багацця́ў, а пазней выступіў у ролі адказнага за яе будаўніцтва. Вось што сведчыць дакумент:

«В ноябре 1907 года князь Николай Вильгельмович Радзивилл через своего поверенного тайн. сов. В.В.Максимова, обратился в министерства Путей Сообщения и Финансов с ходатайством о разрешении ему сооружения железнодорожной ветви общего пользования, нормальной колеи, от станции Верейцы, Либаво-Роменской жел. дороги, до фольварка Гродзенки, с ответвлением от означенной ветви к местечку Холуй, общим протяжением около 53 верст и стоимостью, по исчислению предпринимателя, без рельс и скреплений, в 804 340 руб.

Сооружение Верейцовской ветви, которая пересечет лесную часть Игуменского уезда Минской губернии, предпринимается кн. Радзивиллом в целях сделать возможным вывоз лесных материалов из примыкающих к проектируемой ветви обширных лесных дач как частновладельческих, так и казенных, площадью около 60000 десятин, из коих около 27000 десятин составляют собственность княгини Радзивилл... Срок строительства — двухлетний...» (Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф. 1276. Воп. 4. Спр. 360. Л. 5.)

1 мая 1908 г. міністэрствы фінансаў і шляхоў зносін Расійскай імперыі прынялі сумесную пастанову аб задавальненні хадайніцтва князя, якую падпісалі міністр шляхоў зносін інжынер генерал-лейтэнант Шаўфус і міністр фінансаў статс-сакратар Какоўцаў. На наступны дзень гэты дакумент ляжаў на стале прэм'ер-міністра Мікалая фон Плеве і праз пэўны час быў зацверджаны Кабінетам Міністраў і ўхвалены імператарам Мікалаем II. Тэрмін акупнасці веткі быў вызначаны ў 4 гады.

Прашэнне міністру шляхоў зносін аб пабудове пад'язнога пуці да ст. Асіповічы. 16 лістапада 1895 г.

Ад Лапічаў да фальваркаў Градзянец і Завішын належала не толькі зрабіць прасекі ў векавым лесе, але і «фарсіраваць» водныя перашкоды, сярод якіх найбольшай была Свіслач. Будаўніцтва пачалося ў пачатку 1909 г. З навакольных вёсак люд пацягнуўся на заробкі. Кіраўніцтва будоўлі ставілася да найму вельмі адказна: дзяржава абавязала забяспечыць працуючых працоўнымі кніжкамі, медыцынскай дапамогай. На Радзівіла ўскладвалася персанальная адказнасць за захаванне тэхнікі бяспекі на будоўлі. За ходам работ пастаянна назіралі прадстаўнікі Упраўлення Лібава-Роменскай чыгункі. Работы ішлі спорна. Забастовак не назіралася. Будаўнікам хацелася грошай, а сялянам навакольных вёсак хацелася на свае вочы ўбачыць той цуд, што зваўся чыгункай.

У кастрычніку 1911 г. па ветцы быў адкрыты рэгулярны рух. Згодна з раскладам, на Градзянец і Завішын цераз вузлавую станцыю Уборак (якая спачатку называлася Жорнаўкамі) з Верайцоў штодня адпраўлялася па адным груза-пасажырскім цягніку. Яны пачалі перавозіць пасажыраў і багаж, а таксама вывозіць лес з усіх чарговых лесасек, якія былі прададзены Магдалінай Радзівіл купцу Мярэцкаму на 8 гадоў з разліку высечкі 350 дзесяцін у год па цане 205 рублёў за дзесяціну. Сяляне навакольных вёсак атрымалі магчымасць пастаяннага заробку. На станцыях узніклі пасёлкі, запрацаваў тэлефон, а неўзабаве адкрыліся і паштовыя аддзяленні.

Выдача заробку будаўнікам чыгуначнай веткі Верайцы — Градзянка. Маёнтак Жорнаўкі, 1909 г.

Чыгуначная станцыя Завішын. 1913 г.

Першымі начальнікамі чыгуначных станцый былі: у Лапічах — Яўген Пятровіч Златавярхоўнікаў, ва Уборку — Уладзімір Радзівонавіч Музычэнка-Цыбульскі, у Завішыне — Мікалай Якаўлевіч Дзмітрыеў, у Градзянцы — Уладзімір Дзмітрыевіч Цітоў.

Чыгуначная ветка на Градзянку дала магчымасць жыхарам навакольля далучыцца да даброт цывілізацыі і засталася вечным помнікам, які пакінуў малады Мікалай Радзівіл.

На вялікі жаль, іх агульная радасць ад будаўніцтва была нядоўгай. З пагаршэннем адносін Расіі з Германіяй адносіны да землеўладальнікаў каталіцкай веры таксама пагаршаліся. Асабліва неспакойна паводзілі сябе шматлікія даносчыкі і «добразычліўцы» з Кухціч і Узды. Многія з іх захавалі злосць яшчэ на бацьку Магдаліны — Івана Завішу. Каб пазбегнуць непатрэбнага напружання, параіўшыся з Магдалінай, Мікалай Радзівіл выкупіў на сваё імя маёнтак пад агульнай назвай Кухцічы з фальваркамі, якія належалі да іх, вёскамі, засценкамі і ўрочышчамі. 10 жніўня 1912 г. купчая на суму 1 200 000 рублёў была зацверджана.

Добра разумеючы змяненне палітычнай сітуацыі ў горшы бок, развітаўся з Радзівіламі і Роберт Брутан. Ён выехаў з сям'ёю спачатку ў Курляндыю, а потым перабраўся ў Германію.

З пачаткам вайны Мікалай Радзівіл пайшоў на фронт. Ён загінуў па-геройску 30 лістапада 1914 г. ва Усходняй Прусіі. Магдаліна глыбока смуткавала. Акрамя асабістага гора, яна бачыла, як Расія спаўзае ў бездань, як узрастае бунт. Яна была яшчэ ў жалобе, як ва Уздзе адбыўся самавольны захоп зямлі яе мужа. 11 красавіка 1915 г. гэта зрабіў мясцовы жыхар Даніла Булынка...

Апошняя жорнаўская гаспадыня заўсёды лічыла сябе беларускай, а дакладней — вялікалітоўкай. Нягледзячы на ўсе выпрабаванні, яна захоўвала любоў да сваёй Бацькаўшчыны. Відаць, яна добра ведала свой радавод, прыналежнасць продкаў да эліты Вялікага Княства. Свой агромністы духоўны патэнцыял і грошы яна скарыстоўвала то на падтрымку першых беларускіх палітычных плыняў, то на падтрымку беларускай адукацыі (адчыніла беларускія школы ў Кухцічах, Каменцы і Уздзе), то на падтрымку першых перыядычных беларускіх выданняў. Яна апекавала выдавецтва «Загляне сонца і ў наша аконца» ў Пецярбургу, Беларускае выдавецкае таварыства ў Вільні, газету «Наша ніва», каталіцкі часопіс «Belarus» і іншыя выданні. З яе фінансавым удзелам былі надрукаваны першыя кнігі Максіма Багдановіча, Канстанцыі Буйло і інш.

Князь Мікалай Радзівіл.

Усё тое добрае, што здзейсніла на нашай зямлі гэта жанчына, цяжка пералічыць. Яе дабрачынная дзейнасць не перапынялася ні на хвіліну. У 1918 г. яна выехала ў Варшаву, адкуль праз год паспрабавала вярнуцца на радзіму, аднак атрымала адмову. У 1922 г. Магдаліна перабралася ў Літву, у Коўна, дзе неўзабаве Літоўскі ўрад за фундатарства ўзнагародзіў яе ордэнам «Вялікі крыж Гедзіміна». Праз 10 гадоў, у сталым узросце, яна перабралася праз ахопленую фашысцкім рухам Германію ў Швейцарыю і пайшла ў манастыр, але і

Магдаліна Радзівіл з дачкой Людвікай. Партрэт невядомага мастака. Канец 1880 — пачатак 1890-х гадоў.

адтуль працягвала сваю дабрачынную дзейнасць. Сэрца шчырай беларускі перастала біцца 6 студзеня 1945 г. на восемдзесят чацвёртым годзе жыцця.

У тапаніміцы раёна няма населеных пунктаў, названых у гонар Валовічаў, Завішаў, Радзівілаў. Разам са знікненнем веткі ад Уборка на Завішын неўзабаве знік з карты і сам Завішын, няма і населенага пункта пад назваю Двор, дзе некалі размяшчаліся будынкі старажытнага Жорнаўскага маёнтка, нават з мясцовых старажылаў не ўсе скажуць, дзе некалі размяшчаўся засценак Блыхава княгіні Магдаліны Радзівіл. Аднак сама асіповіцкая зямля, вядома, помніць падзеі і імёны тых, хто некалі на ёй шчыраваў і праслаўляў яе.

В.У.Хурсік.

Бароны Асіповіччыны

Род памешчыкаў Офенбергаў знік з айчыннай гісторыі напярэдадні Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. Ніводны даведнік не змяшчае звестак пра яго. Між тым даследаванні паказваюць, што асобныя яго прадстаўнікі імкнуліся аказаць уплыў на палітычнае і культурнае жыццё Беларусі ў перыяд знаходжання яе ў складзе Расійскай імперыі.

Офенберг (Offenberg) у перакладзе з нямецкай — адкрытая гара. І сапраўды, на чырвоным полі радавога герба дзве голыя гары, якія маюць унізе адтуліны[1]. Горы на гербе з'явіліся, відаць, невыпадкова і ўказваюць на геаграфію паходжання роду. Хутчэй за ўсё гэта нейкая мясцовасць у Германіі ці ў Чэхіі. Аднак у дакументах на пацвярджэнне дваранства сваёй радзімай Офенбергі паказвалі Курляндыю, дзе старажытны дваранскі род быў унесены ў Палажэнне рыцарскага Судзілішча 20 ліпеня 1634 г. і карыстаўся ўсімі правамі, перавагамі і вольнасцямі, дараванымі 9-м параграфам граматы караля Жыгімонта II Аўгуста 1561 г.[2] Род паходзіў ад Фрэдэрыка Ежы Офенберга і меў 2 галіны[3]. Прадстаўнікі адной з іх пастаянна жылі ў Курляндыі (дваранскае паходжанне гэтай галіны пазней было зацверджана пастановай расійскай Герольдыі 3 красавіка 1862 г. за нумарам 2823 [4].

Іван Эбергард Фрыдрых Юрый фон Офенберг паклаў пачатак другой, беларускай, галіне роду. Ён таксама паходзіў з Курляндыі, але валодаў зямлёй на Беларусі, меў маёнтак Дайневічы ў Браслаўскім павеце. Пасля яго смерці па завяшчанні 1729 г. гэта вотчына перайшла яго сынам Дамініку і Сцяпану[5].

Можна меркаваць, што на Міншчыне Офенбергі з'явіліся ў перыяд знаходжання на пасадзе мінскага ваяводы Крыштофа Завішы, род якога таксама меў заходнія карані і з дапамогай якога, відаць, Сцяпан Офенберг атрымаў пасаду рэчыцкага скарбніка (Рэчыцкі павет уваходзіў у склад Мінскага ваяводства).

Сяброўскія сувязі родаў перадаліся і далей. Калі ўнук Сцяпана межавы суддзя Ігуменскага павета Якаў Офенберг пасля дзяржаўнай службы і жаніцьбы вырашыў, урэшце, асесці на зямлі і набыць ціхі куток, ён звярнуўся да Ігнася Есьмана, зяця маршалка таго ж павета Фадзея (Тадэвуша) Завішы. Есьман і яго жонка Антаніна з Завішаў прапанавалі лясны фальварак Лочын са свайго маёнтка Жорнаўкі, які і быў куплены Якавам Офенбергам у 1820 г. разам з вёскай Сёмкава Слабодка за 7500 руб. серабром.

Размешчаны за 10 вёрст ад Жорнавак Лочын быў у Завішаў аддаленым лясным фальваркам. Гаспадары сюды наведваліся вельмі рэдка, часцей за ўсё на паляванне, і таму быў ён не надта дагледжаны, патанаў у атачэнні векавечных бароў і дуброў з невялікай колькасцю гаспадарскіх пабудоў і ворнай зямлі. Амаль у самым лесе, на пясочку тулілася некалькі крытых саломай хацінак прыгонных сялян.

Янам Офенбергам фальварак быў ператвораны ў прыгожы маёнтак. Тут былі закладзеныя касцёл, парк, сад і нават водаправод з фантанамі (рэшткі ўсяго гэтага можна знайсці на былой сядзібе і зараз). Паводле ўспамінаў жыхаркі в. Лочын Вольгі Кедзіч, тут было зроблена добраўпарадкаванне спуску Лочынскага возера, амаль да самай яго гладзі працягнулася алея з каштоўных парод дрэў. Асноўныя лясныя дарогі — да Пагарэлага і Жорнавак дзякуючы новым гаспадарам былі выдатна дагледжаны, па іх можна было ехаць у любы час да сядзібы Завішаў і

далей аж да Мінска і Вільні. Праз год фальварак ператварыўся ў сапраўдны квітнеючы маёнтак. Сюды, у толькі што пабудаваны двухпавярховы будынак, бацькі прывезлі сваіх пяцярых малалетніх сыноў. А яшчэ праз 5 гадоў — у 1826 г., калі Якаву Офенбергу ішоў 68-ы год, у яго нарадзіўся апошні з іх — Нікадзім.

Жыццёвая ідылія ў Лочыне працягвалася амаль 2 дзесяцігоддзі. За гэты час Якаў і яго жонка Феліцыяна з Жыманскіх здолелі даць сынам адукацыю, пакінулі ім добрыя прыяцельскія сувязі з многімі памешчыкамі краю. Ладзіліся і гаспадарчыя справы: зямля і лес давалі неблагі прыбытак.

Усё змянілася пасля смерці гаспадара ў 1839 г. Паводле яго тэстаменту, маёнтак, ацэнены ў 2000 руб., быў адпісаны жонцы. Вотчынныя землі ў роўных частках дасталіся адпаведна старэйшым сынам Віктару і Ігнату. Цэзару, Вільгельму і Нікадзіму бацька завяшчаў выплаціць з даходаў маёнтка (да паўналецця і пакуль жывая маці) па 500 чырвонцаў.

На сямейным савеце было вырашана, што за капітал, які застаўся пасля бацькі, сям'я будзе арандаваць зямлю ў навакольных памешчыкаў.

Аднак справы пайшлі не так, як меркавалася. Стаўшы ўладальніцай маёнтка, Феліцыяна не здолела распарадзіцца сродкамі як належала, яна мала што кеміла ў сельскай гаспадарцы і крэдытах, што вяло да прамых страт. Да таго ж некалькі гадоў запар летам стаяла сухое надвор'е, што выклікала небывалую засуху — мерла не толькі скаціна, а і прыгонныя. Эканамічны стан маёнтка апынуўся на мяжы краху. Каб выправіць сітуацыю, Феліцыяна ў снежні 1845 г. перадала маёнтак старэйшаму сыну Віктару, а на пачатку студзеня наступнага года прадаў яму сваю частку вотчыны за 3860 руб. срэбрам і брат Ігнат, які з гэтага часу ўжо стаў сталым арандатарам фальварка Геленберг Мінскага губернскага прадвадзіцеля дваранства графа Льва Оштарпа.

Віктар, юрыст па адукацыі, зрабіў рашучыя захады па выпраўленні становішча. Паколькі малодшым братам таксама прыспела вызначыцца ў жыцці, то ён, выконваючы запаветы бацькі, прадаў 70 валок зямлі яўрэям. Продаж быў настолькі значны, што адразу разлічыцца за набытак не ўсе з іх змаглі. Рубін Гольнік, Янкель Марон, Захар Кацнельсон, Іцка Гельфанд і Арон Голуб засталіся вінны Офенбергам па закладной у банку 480 руб. Права на атрыманне гэтай сумы, па ўзаемнай згодзе, запісалі за Нікадзімам.

Атрымаўшы свае 500 руб., Вільгельм далучыўся да Ігната ў арэндзе Геленберга, а Цэзар, разам з сябрам Яфімам Луцкевічам, прадаўжаў арэнду Клічава ў графа Патоцкага. Паколькі Нікадзім у гэты час вучыўся ва універсітэце, то, улічыўшы плату за навучанне, па ўзаемнай згодзе вырашылі пакінуць за ім закладную суму, што былі вінны яўрэі. Зрэшты, сам Нікадзім ніколі не заікаўся пра бацькаву спадчыну. Яго ніхто ніколі не пазбаўляў бацькоўскага дома, і нават калі ён падрос і апынуўся ва універсітэце, то заўсёды прыязджаў у Лочын дамоў, а не ў госці. Родным яму тут было ўсё: сам маёнтак, прыгожы і дагледжаны, возера, якое вабіла прахалодай, сябры.

Кола знаёмых яго дзяцінства было даволі шырокім. Гэта былі дарослыя і дзеці радавітых дваранскіх сямей Ігуменшчыны. Сярод іх старэйшы на чатыры гады за Нікадзіма Ян Завіша, што часта гасціваў у вотчыннай Жорнаўцы, сябра братоў Крыштоф Незабытоўскі, да якога апошнія любілі праехацца ў старажытную Свіслач, дзеці памешчыкаў Асоўскага і Татура, Есьманаў, Быкоўскіх, графа Забелы і іншых, а таксама службовых асоб з Ігумена, да якіх часта ездзілі яны сям'ёй на розныя балі і святы. Такія сустрэчы былі насычаны абмеркаваннем важных палітычных падзей таго часу: апошні падзел Рэчы Паспалітай, паход Напалеона, паўстанне Касцюшкі, кватараванне расійскіх войскаў, засяленне Асіповіччыны стараверамі, знішчэнне уніяцкай веры, набор рэкрутаў і г.д. Дзеці бачылі настроі дарослых, прымалі іх як узор адносін да рэчаіснасці і з імі ішлі ў далейшае жыццё.

У Нікадзіма адмоўныя адносіны да царызму і расійскай прысутнасці ўмацаваліся ва універсітэце. Тут ён пазнаёміўся з творамі заходніх свабодалюбцаў, з думкамі расійскіх дэмакратаў і землякамі, якія рабілі практычныя крокі для ўзброенай барацьбы за свабоду Рэчы Паспалітай. Менавіта ў аднаўленні былой беларускай дзяржавы мроілася ім тады адраджэнне.

Каб быў жывы бацька, то можа лёс Нікадзіма і не склаўся б так трагічна: усё ж стары ведаў, да чаго здатныя хлопцы ў такім узросце, мог бы параіць нешта разумнае, менш небяспечнае. А так Нікадзім апынуўся сярод тых, хто меў непасрэднае дачыненне да дзейнасці віленскага «Саюза вольных братоў». Гэта арганізацыя змагалася за правядзенне рэформаў і надання волі сялянам і меркавала выступіць са зброяй у руках за свабоду Рэчы Паспалітай. Адам Міцкевіч, які ў 1848 г. у Італіі арганізаваў з гэтай мэтай узброены легіён з суайчыннікаў, быў для юнакоў прыкладам служэння народу. Ні маці, ні браты не ведалі, што, перад тым як завітаць у Лочын, Нікадзім наведваў Мінск і сяброў па «Саюзе».

Гром у сям'і Офенбергаў грымнуў у 1849 г., калі гэта падпольная арганізацыя была разгромлена.

З дакумента:

«Губернское Правление слушали следующее:

По произведенному в Вильне Особою военно-судною комиссией делу над двадцатью лицами виновными в соучастии в открытом там мятежническом заговоре против Правительства и заключению Полевого аудиториата армии, конфирмациею Его Светлости господина генерал-фельдмаршала между прочим определено: имущество приговоренных к ссылке в Сибирь в каторжную работу, родовое и благоприобретенное... конфисковать в казну, а на то, которое могло бы достаться по наследству, наложить запрещение. К числу таковых лиц, осужденных к ссылке в каторжную работу, принадлежат уроженцы Минской губернии:

Константин Яковлев Добкевич, 20 лет, из вольных хлебопашцев Новогрудского уезда,

Цезарь Францев Мокржецкий, 21 год, из дворян Минской губернии,

Франц Яковлев Цивинский, 22 лет, из дворян той же губернии,

Михайло Иванов Бокио, 27 лет, из однодворцев той же губернии,

Павел Антонов Вейшторд, 20 лет, из обер-офицерских детей,

Никодем Яковлев Оффенберг, 24 лет, из дворян Игуменского уезда...»

Далей у дакуменце, датаваным 23 снежня 1850 г., прапанавалася правесці пошук маёмасці «дзяржаўных злачынцаў» і рэквізаваць яе ў казну «...на точном основании Высочайше утвержденных 17 июля 1831 г. правил о секвестре и конфискации имений мятежников»[6].

Узрост барацьбітоў за лепшую будучыню для народа быў даволі малады, а сацыяльны стан іх — разнастайны. Гэта сведчыць аб тым, што яднанне членаў «Саюза вольных братоў» вялося не на аснове маёмаснага стану ці грамадскага стану бацькоў, а выключна на адданасці ідэі.

Вестка аб арышце Нікадзіма была ўдарам для сям'і. 25 лістапада 1849 г. Цэзар, Ігнась і Вільгельм тэрмінова выехалі ў Мінск з надзеяй неяк уладкаваць справу[7]. Былі выкарыстаны ўсе магчымасці, задзейнічаны ўсе сувязі, аднак ніякія захады па вызваленні яго з-пад варты вынікаў не далі. Неўзабаве разам з іншымі змоўшчыкамі этапам ён быў адпраўлены на катаргу.

Упраўленне ўнутраных спраў губерні прыняло дзейсныя меры па пошуку маёмасці палітычных «злачынцаў». Высветлілася, аднак, што большасць з іх маёнткаў не мае.

І толькі Нікадзім Офенберг праходзіў па спісе як чалавек, надзелены нерухомасцю.

«Лочын — весь і маёнтак у павеце Ігуменскім у гміне Пагарэльскай над пекным рыбным возерам маючым абшару да 200 моргаў; весь мае асад влочных 11; маёнтак, дзедзіцтва польскай родзіны Офенбергаў, каля 112 валок у грунтох лёгкіх; лугоў і лясоў даволі»[8] — так пісаў аб Лочыне вядомы беларускі краязнавец і этнограф А.К.Ельскі. У гэтым апісанні ўсё правільна, акрамя дзвюх акалічнасцей: Офенбергі не былі палякамі, Лочын быў набытым маёнткам і да Якава спадчынным не з'яўляўся. Гэта, на жаль, нічога не мяняла ў мясцовай драме. Бяда была ў тым, што да арышту Нікадзім ніякай часткі ў маёмасці маёнтка не паспеў атрымаць. Секвестр біў па брату Віктару, які ўжо працаваў суддзёй і быў на Лочыне аднаасобным гаспадаром. Пасля таго як у 1842 г. Віктар атрымаў пацвярджэнне баронскага тытулу, ён ужо збіраўся браць шлюб, і раптам неспадзявана яму належала выдзеліць са сваёй гаспадаркі Нікадзімаву долю і аддаць яе ў казну. Гэта была сапраўдная трагедыя, таму Віктар зрабіў спробу юрыдычна аспрэчыць акалічнасці секвестра, аднак пісьмом ад 12 сакавіка 1852 г. Віленская губернская ліквідацыйная камісія яшчэ раз пацвердзіла, што брат яго належыць да той катэгорыі злачынцаў, чыя маёмасць падлягае безумоўнай канфіскацыі. Гэта змусіла Офенбергаў шукаць іншыя шляхі для выратавання маёмасці. У ліквідацыйную

камісію былі прадстаўлены 2 распіскі, напісаныя ў 1847 г. Адна з іх сведчыла аб тым, што Нікадзім атрымаў ад брата Вільгельма 1580 руб. срэбрам як сваю поўную долю ў маёмасці Лочына. Калі б камісія прызнала гэтую распіску, то з загаворшчыка не было б чаго спаганяць: Нікадзім уласнікам маёнтка, нават у частцы, не значыўся б і Лочын застаўся некранутым. Таму разам з адмовай прызнання згаданых распісак (на падставе іх натарыяльнай незасведчанасці) у маёнтак была накіравана камісія ў складзе чыноўніка па асобых даручэннях Змайлы і штатнага землямера Мілеўскага. Прадстаўнікамі ўлады быў складзены дакладны рэестр маёмасці і ацэнены яе кошт. У прыватнасці, зямельнае карыстанне склала 120 валок (палова з іх была пад лесам). Офенбергам належалі адна вёска ў 10 двароў, пустка, карчма, дваровыя пабудовы: жылы панскі дом, дом для прыслугі, клець, збожжавы хлеў, гумно, пуня, двор для быдла, валовы млын, лазня, лядоўня, склеп. Будынкі былі ацэнены ў 207 руб. 50 кап., карчма ў 36 руб., сялянскія пабудовы ў 362 руб. У Лочыне пражывалі 62 душы прыгонных мужчынскага полу і 56 жаночага. Гадавы даход па маёнтку склаў 292 руб. срэбрам. Рухомая маёмасць была ацэнена ў 400 руб., з якой, як высветлілася, раней Нікадзіму ўжо было законным чынам выплачана 80 руб.

Прыезд камісіі ўзрушыў Офенбергаў. Браты аднесліся да прадстаўнікоў улады без ласкі і нават не паказалі ім бацькава завяшчанне, сказаўшы, што яно страчана. Гэта выклікала гнеў мінскага начальства, і таму Нікадзімаву долю ў маёмасці вызначылі ў суму, азначаную ім некалі ў распісцы — 1580 руб. Улічыўшы ўсе абставіны па атрыманых ім раней сумах, гэта лічба была зменшана да 1100 руб., але ўсё роўна гэта быў амаль што кошт існуючага маёнтка!

Існаванне радовай спадчыны было на мяжы краху, і таму прадпрымаліся ўсе меры, каб захаваць яе. Для гэтага ў Офенбергаў былі адпаведныя сувязі і сябры. Можна меркаваць, што ў першую чаргу Віктар правёў кансультацыі з графам Оштарпам, у якога арандаваўся Геленберг. Апошні ведаў сям'ю Офенбергаў, і, відаць, не без яго падтрымкі справа з Мінскай палаты дзяржмаёмасцей трапіла ў Ігуменскі павятовы суд, дзе працаваў Віктар. Там многія непасрэдна ведалі былога межавага суддзю Якава Офенберга і імкнуліся дапамагчы яго сыну. Пасля савета было вырашана замарудзіць справу. Феліцыяна напісала скаргу ў Сенат, у якой ставілася пад сумненне аб'ектыўнасць праведзенай ацэнкі кошту маёнтка. Як і меркавалася, папера пайшла па крузе і не без вынікаў. У Пецярбургу пагадзіліся з тым, што ацэначны ліст меў хібы, і вярнулі справу на даследаванне. Ігуменцы ж не спяшаліся даследаваць, цягнулі час, рабілі розныя бюракратычныя запыты, аж пакуль сама Віленская ліквідацыйная камісія не была ў 1861 г. ліквідавана. Урэшце справа па секвестры апынулася ў Мінскай палаце грамадзянскага суда, потым зноў у Ігумене, адкуль пазней і была спісана ў архіў.

Нікадзім пасля катаргі не аб'явіўся ў родных мясцінах. Імя гэтага пакутніка за волю Беларусі аказалася на доўгія гады выкрасленым з народнай памяці.

Як толькі ўсё ўляглося, Віктар узяў шлюб з дачкой арандатара недалёкай ад Лочына Вязаўніцы — Антанінай Іванаўнай Раўкевіч. У 1861 г. у іх нарадзіўся адзіны сын Часлаў, якога неўзабаве ахрысцілі ў Свіслацкім касцёле, і Лочын пачаў жыць новымі спадзяваннямі. Але нядоўга. Подых паўстання 1863—1864 гг. даляцеў і ў гэты край. Былі арыштаваны і сасланы ў Тобольскую губерню Канстанцін і Іван Раўкевічы[9]. Пацярпелі многія знаёмыя і сябры. Усё гэта ўзмацніла адмоўнае стаўленне Офенбергаў да расійскага панавання. Адкрыта супраць улады яны не выступалі, але ў дзецях выхоўвалі патрыятызм і супрацьстаянне царызму.

Пакуль у Лочыне Часлаў рабіў першыя крокі, у Клічаве ў яго дзядзькі Цэзара, у якога ўжо быў першынец Антон Цэзар (1860), нарадзіліся яшчэ двое сыноў: Стафан Аўгусцін (1864) і Ян Якаў (1867). Разам з гэтымі малымі і жонкай Леанільдай з Луцкевічаў Цэзар не раз наведваў вотчыну. Для дзяцей тут было раздолле: вабіў дагледжаны парк, ціха журчэлі фантаны, але асаблівае задавальненне прыносіла катанне на лодках па возеры. Пазней, калі дзеці падраслі, мужчыны бралі іх на паляванне. Качак і дзічыны вадзілася тут незлічона.

Аднойчы Цэзар узяў дзяцей у Асіповічы, каб паказаць чыгунку. Убачанае іх уразіла. Асабліва ўзрушаным быў Ста-

фан. Ён выказаў дзіцячую мару прысвяціць сваё жыццё транспарту. Пазней, у 1891 г. ён скончыў Інстытут шляхоў зносін, і з яго сапраўды атрымаўся бліскучы інжынер. У пачатку стагоддзя ў якасці інжынера VI класа быў накіраваны працаваць начальнікам Усурыйскага аддзялення службы пуці Кітайска-Усходняй чыгункі. А ў 1914 г., на пяцідзесяцігадовым юбілеі, у асобе Стафана Офенберга сябры віталі стацкага саветніка, кавалера ордэнаў Святога Уладзіміра IV ступені, Святой Анны II і III ступеняў, Святога Станіслава II і III ступеняў, кавалера асаблівага ганаровага знака Чырвонага Крыжа, апекуна Хабараўскага чыгуначнага вучылішча. Пазней рэвалюцыя вярнула яго на радзіму. Апошнія гады ён дажываў у Варшаве.

Багатымі на падзеі быў лёс і яго брата Яна. Трагедыя дзядзькі Нікадзіма яшчэ ў дзяцінстве была ўспрынята ім як злачынства, і ён вырашыў змагацца з уладай. У 1882 г. падчас навучання ў Мінскай 8-класнай гімназіі ён разам з братам Стафанам заснаваў тайны гурток, які, змяняючы назвы, як тайная арганізацыя праіснаваў да 1920 г. Пасля заканчэння гімназіі ў 1885 г. Ян паступіў на медыцынскі факультэт Варшаўскага універсітэта, дзе працягваў актыўна цікавіцца палітыкай. Зусім невыпадкова ён аказаўся ў групе студэнтаў, што вітала прыезд з Швейцарыі Зыгмунта Баліцкага і яго праект палітычнай арганізацыі «Zet». У 1889—1890 гг. Ян Офенберг стаў не толькі актыўным членам гэтай арганізацыі, а і адным з кіраўнікоў яе варшаўскай групы. Ён быў таксама членам іншых тайных арганізацый.

У 1890 г. пасля заканчэння Варшаўскага універсітэта Ян Офенберг атрымаў кваліфікацыю лекара, вярнуўся на радзіму, наведаў Клічаў, заглянуў у Лочын, пабываў у Жорнаўках — вотчыне Завішаў. Сям'ю археолага Яна Завішы ён ведаў з дзяцінства, быў знаёмы з яго дочкамі. Асабліва прыхільна ставіўся да Магдаліны, з якой не раз сустракаўся падчас навучання ў Варшаве. Магдаліна, старэйшая за яго на шэсць гадоў, была замужам за вядомым польскім магнатам Людвікам Красінскім, мела дачку, але заўсёды была рада сустрэцца і пагутарыць з земляком.

Ян пачаў працаваць лекарам у Радашковічах, пазнаёміўся з местачковай інтэлігенцыяй. У вольную часіну любіў бываць на прыродзе. Памочнік радашковіцкага аптэкара ўспамінаў: «...Доктар Оффэнбэрг прызнаў гэту ваколіцу зусім прыдатнаю для лячэння хворых на грудзі, і ўжо не адны дачнікі тут пабывалі»[10].

Урачом ён быў апантаным. Вось што піша аб гэтым літаратурны даследчык Уладзімір Содаль: «Ён браў у рукі сваю доктарскую валізку і ехаў ці ішоў туды, дзе патрэбна была дапамога, дзе яго чакалі. Аднаго разу, згадваюць, па яго прыехалі... на карове. Была восень, сляката, гразь, цемра. Ян Офенберг, ні слова не кажучы, сеў на воз і паціху паехаў на такім экіпажы ў далёкую, за дваццаць з лішнім вёрстаў ад мястэчка вёску. Ягонымі пацыентамі былі багатыя і бедныя, радашкоўскія месцічы і сяляне навакольных вёсак. Ян Офенберг цікавіўся духоўным жыццём народа, сярод якога жыў. Яму быў блізкі і зразумелы побыт беларусаў... Гэта быў адзін з тых радашковіцкіх энтузіястаў, з якімі Ядвігін Ш. яшчэ пры канцы мінулага стагоддзя зрабіў першую спробу паставіць спектакль паводле сваёй п'есы «Злодзей»... Ванда Лявіцкая (жонка Ядвігіна Ш. — *В.Х.*) згадвала, што калі праз нейкі час слыннага доктара паклікалі з Радашковічаў на працу ў Мінск, местачкоўцы і ягоныя пацыенты наладзілі развітальную вячэру. На гэтую вячэру прыйшоў і Ядвігін Ш. Сваё развітальнае слова славутаму доктару ён сказаў вершам:

Чую прамовы я прашчальныя
З усіх старон і ўсё ад паноў.
А я ад сэрца пажагнаю —
Ад сэрца бедных мужыкоў.
Прашчай жа!
Зычу жыцця 100 гадоў,
Грошы сто мяшкоў.
Пекну жонку і то скора,
Потым дзетачак шасцёра»[11].

Яшчэ ў Радашковічах адначасова з лекарскай практыкай ён працягваў спасцігаць навуку, вучыўся на інтэрнатуры універсітэта ў такіх тагачасных свяціл медыцыны, як Тэадор Дунін і Эдмунд Нейсер. У 1898 г. пасля заканчэння інтэрнатуры Ян Офенберг пераехаў у Мінск. Спрыяла пераезду графіня Магдаліна Завішына (Красінская). Пасля смерці мужа ў 1895 г. яна вярнулася з Варшавы на радзіму, жыла то ў радавых Кухцічах, то ў Жорнаўках, то ў Мінску. Статная прыгожая жанчына, якая валодала велізарнымі багаццямі, была філантропкай

і шмат ахвяравала на патрэбы беларускай адукацыі, царквы і медыцыны.

У 1902 г. пасля смерці галоўнага ўрача Мінскага таварыства дабрачыннасці Тамаша Віткоўскага Яну Офенбергу было прапанавана заняць яго пасаду, пасля чаго Магдаліна разам з сястрой Марыяй Евай і іншымі мецэнатамі выступілі ініцыятарамі будаўніцтва новага шпіталя гэтага таварыства. Ян, як ніхто іншы, падыходзіў на пасаду кіраўніка гэтай справы. Не толькі чулыя адносіны да хворых і простага люду, а і выдатныя арганізатарскія здольнасці здабылі яму добрую славу на Міншчыне.

Спачатку меркавалася толькі пашырыць існуючы шпіталь, аднак калі падлічылі, то аказалася, што новае будаўніцтва будзе танейшым. Будаваць разлічвалі на сродкі мецэнатаў. Так і атрымалася.

Дзверы новага прасторнага будынка шпіталя былі адчынены ў 1906 г. То было сапраўднае свята. Шматлікія абяздоленыя і бедныя людзі з усёй Беларусі атрымалі надзею на бясплатнае высокакваліфікаванае лячэнне.

Адносіны паміж удавой-графіняй і Янам, якія былі да таго часу даволі прыязнымі, прынялі больш афіцыйную афарбоўку якраз у гэтым годзе: Магдаліна выйшла замуж за маладога князя Радзівіла, а Ян пабраўся шлюбам з Аляксандрай Іосіфаўнай Жылінскай — дачкой вядомага ў краі генерала-гідратэхніка. Гэта, аднак, не паўплывала на працяг сяброўства лекара і княгіні. Пад уплывам апошняй Ян выйшаў з складу польскай нацыяналістычнай Ligi Narodowej і да пачатку 1-й сусветнай вайны займаўся выключна ўрачэбнай практыкай на пасадзе галоўнага ўрача шпіталя Чырвонага Крыжа Мінскага таварыства дабрачыннасці. Аўтарытэт яго ў гэты час быў настолькі высокім, што газета, паведамляючы аб справаздачы лячэбніцы Мінскай абшчыны сясцёр міласэрнасці Чырвонага Крыжа, падкрэсліла; «У кансультацыях у лячэбніцы прыняў удзел Офенберг»[12].

Высокаадукаваны спецыяліст, інтэлігент, ён жыў у гэты час багатым духоўным жыццём, наведваў тэатр, сустракаўся са святарамі, беларускімі пісьменнікамі і паэтамі. Ёсць звесткі, што Ядвігін Ш. пазнаёміў Офенберга і з маладым Купалам. Хоць, хутчэй за ўсё, Ян пазнаёміўся з Купалам праз братоў Луцкевічаў, якім даводзіўся дзядзькам па лініі маці Леанільды Луцкевіч. Адбывалася гэта сустрэча, верагодней за ўсё, у 1904 г.[13] Урач упэўніваў будучага народнага паэта, што толькі на шляху беларускасці той можа знайсці сваё месца.

Рост рэвалюцыйных настрояў і нацыянальнай самасвядомасці вымушалі адукаваную частку насельніцтва Беларусі шукаць сваё месца ў падзеях, што выспявалі. Ян, атрымаўшы адукацыю ў Польшчы, больш схіляўся да палякаў, у якіх былі грошы і адчувалася большая згуртаванасць. Спачатку яго імя можна адшукаць сярод членаў розных непалітычных польскіх арганізацый, што дзейнічалі ў той час у Мінску. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі Ян Офенберг апынуўся сярод тых беларусаў, што спадзяваліся на станаўленне беларускай дзяржаўнасці без Расіі, у рамках былой старажытнай саюзнай дзяржавы — Рэчы Паспалітай. З 1918 г. Ян Офенберг прымаў актыўны ўдзел у палітычным жыцці Беларусі і Мінска, быў сярод кіруючага складу некалькіх палітычных і грамадскіх арганізацый. Ён не пакінуў горад ні ў час нямецкай акупацыі, ні ў час прыходу ўлады бальшавікоў. У перыяд польскай акупацыі Ян Офенберг з'яўляўся паўнамоцным прадстаўніком Польскага Чырвонага Крыжа, арганізаваў у Мінску шпіталь і быў кіраўніком гарадскога аддзела гэтай арганізацыі.

21 сакавіка 1920 г. ён, як прадстаўнік ад лекарскага таварыства, прыняў удзел у «акруговым сойме» — з'ездзе прадстаўнікоў паветаў і грамадскіх арганізацый Міншчыны, што існавалі ў час польскай акупацыі. Меркавалася, што гэты з'езд пакладзе пачатак арганізацыі, якая будзе выказваць польскаму ўраду жаданні народа ў арганізацыі свайго жыцця.

Аднак ні гэтае мерапрыемства, ні іншыя захады беларускіх землеўладальнікаў вярнуць уплывовасць пры паляках поспеху не мелі. У хуткім часе яны вымушаны былі назаўсёды развітацца з радзімай і большасць з іх эмігрыравалі на захад.

Ян, які ўсё жыццё аддаваў справе захавання здароўя беларусаў, не збіраўся жыць за мяжой, не звязваў з гэтым сваіх планаў і надзей. Аднак і ён пад пагрозай бальшавіцкай расправы вымушаны быў пакінуць родны кут і перабрацца ў Польшчу. У Варшаве ён год працаваў на

пасадзе ардынатара Макатоўскага шпіталя. Пазней перайшоў на іншае месца працы, але дзе б ні працаваў Ян Офенберг, ён нязменна заставаўся Урачом. Нават падчас фашысцкай акупацыі былы радашковіцкі лекар не здрадзіў прафесіі. Ён знаходзіўся ў Варшаве, удзельнічаў у Варшаўскім паўстанні 1944 г.

За сваё жыццё Ян Офенберг напісаў і выдаў каля 20 прац па медыцыне, якія друкаваліся ў медыцынскіх часопісах, некалькі брашур з успамінамі і інш.

Наш зямляк быў узнагароджаны высокімі польскімі ўрадавымі ўзнагародамі.

Ян Цэзаравіч Офенберг пражыў доўгае жыццё. Ён памёр у 1953 г., у Варшаве ва ўзросце 86 гадоў. Шлюб яго з Аляксандрай Жылінскай не даў нашчадкаў. Пахаваны ён у Варшаве на могілках Павонзкі.

* * *

Перад рэвалюцыяй Лочын квітнеў. У 1913 г. землі маёнтка складалі больш за паўтары тысячы дзесяцін і ацэньваліся амаль у 20 тыс. руб. Узлёту яго садзейнічала чыгунка Магдаліны Радзівіл, пабудаваная яе мужам у 1911 г. за 6 вёрст ад маёнтка. У Лочыне працавала паравая лесапілка, прадукцыя якой грузілася на станцыі Уборак. Дзякуючы Офенбергам рацыянальна вялося лесакарыстанне, ажыццяўлялася меліярацыя, непадалёку ў лесе былі заснаваны новыя паселішчы: засценак Барсукі і засценак Блыхава, які пазней у гонар бацькі Часлаў назваў Віктаровам (зараз гэта нічым не прыкметныя кавалкі ворнай зямлі непадалёку ад Лочына па дарозе на станцыю Уборак). У Часлава Офенберга і яго жонкі Марыі з Каншэўскіх было 2 дзяцей — сыны Віктар (1888) і Юрый (1893). Яны абодва нарадзіліся ў Лочыне і былі хрышчоныя ў Свіслацкім касцёле. 18.6.1914 г. было пацверджана іх права на баронскі тытул[14].

Перад Кастрычнікам 1917 г. парадку ў вотчыне заставалася ўсё менш і менш. Большасць сялян даўно сталі свабоднымі і распараджаліся зямлёй па сваіх меркаваннях: адны з'язджалі з Лочына, іншыя прыязджалі. 18 жніўня 1914 г. прадаў зямлю Рыгор Лапатка[15], 18 лютага 1915 г. Павел Кедзіч. Аднак самі Офенбергі, нягледзячы на гэта, заставаліся ў Лочыне даволі доўга. Аб гэтым сведчаць дакументы: просьба Марыі Канстанцінаўны фон Офенберг, якая па даверанасці мужа прасіла аб'яднаць у адзін абкладны ліст шэраг вёсак, датаваная 25 лістападам 1917 г.[16] і датаванае 20 верасня 1918 г. паведамленне Ігуменскай земскай управы аб далучэнні да маёнтка Лочын 2 фальваркаў і ўрочышчаў Макаўя, Язвінкі, Кучышча, Расохі і іх залічэнні асобным артыкулам за дваранінам Чаславам Віктаравічам фон Офенбергам. На апошнім дакументе ёсць надпіс старшага міліцыянера аб тым, што Часлаў Віктаравіч і Марыя Канстанцінаўна Офенберг выбылі ў Мінск 3 красавіка 1919 г. і рэзалюцыя аб тым, што перапіску па гэтым пытанні належыць перанравіць у Мінскую рабоча-сялянскую міліцыю. Ёсць яшчэ даведка аб тым, што Марыя Канстанцінаўна фон Офенберг жыве ў Мінску па вуліцы Богаяўленскай у доме Нусбейке, кватэра 25, датаваная пачаткам 1919 г.

Дзе апынуліся Часлаў і Марыя Офенбергі пазней, як склаўся лёс іх дзяцей — невядома. Несумненна адно — гэты род праславіў не толькі Асіповіччыну, а і ўсю Беларусь сваёй нецярпімасцю да нацыянальнага прыгнёту, імкненнем захаваць лепшыя традыцыі свабодалюбства, выхаваныя ў Вялікім Княстве.

КРЫНІЦЫ:

1 S. Olgenbranda Encyklopedija Powszechna. Warszawa, 1901. T. 11. C. 39.

2 Нацыянальны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 319. Воп. 2. Спр. 2401. Л. 41.

3 Тамсама. Л. 3.

4 Тамсама. Л. 70.

5 Тамсама. Л. 37.

6 Нацыянальны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 27. Воп. 1. Спр. 350.

7 Минские губернские ведомости. 1849, 25 ліст. Неафіцыйная частка.

8 Slownik geograficzny. Warszawa, 1884. T. 5. C. 675.

9 Нацыянальны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 27. Воп. 1. Спр. 789.

10 Ядвігін Ш. Думкі кутніка Полымя. N 9. 2000.

11 Содаль У. Карпілаўка. Мн., Пейто. 2001. С. 34.

12 Минское слово. 1912, 17 сак.

13 Сідарэвіч А. Луцкевічы і Луцэвіч Крыніца. 1999. N 4—5.

14 Нацыянальны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 319. Воп. 2. Спр. 2401.

15 Тамсама. Ф. 327. Воп. 1. Спр. 874.

16 Тамсама. Ф. 327. Воп. 1. Спр. 1373.

В.У.Хурсік.

Радзівілы, Вітгенштэйны і Дараганы на асіповіцкай зямлі

Пасля смерці ў 1813 г. аднаго з уладальнікаў асіповіцкіх зямель Дамініка Радзівіла за яго малалетняй дачкой Стэфаніяй засталіся Радуціцкі, Жыцінскі і Пратасевіцкі маёнткі з прыпісанымі да іх вёскамі. Потым Стэфанія выйшла замуж за Льва Вітгенштэйна, сына вядомага рускага палкаводца генерал-фельдмаршала П.Х.Вітгенштэйна.

Пасля смерці Стэфаніі Радзівіл Леў Вітгенштэйн ажаніўся другі раз з княгіняй Баратынскай і, атрымаўшы з ашчаднай казны пад залог маёнткаў больш за 7 мільёнаў рублёў, выехаў на пражыванне за мяжу. Па даравальным запісе ад 25 лютага 1854 г ён пакінуў свайму сыну ад першага шлюбу — князю Пятру Львовічу Вітгенштэйну на Асіповіччыне наступныя вёскі з азначаным памерам зямлі пры іх: Жыцін — 6149 дзесяцін, Каўгары — 4049, Крынка — 1179, Майсеевічы — 10 993, Пратасевічы — 7946, Радуцічы — 12 301, Смык-Слабада — 170 дзесяцін.

Каб зразумець стан асіповіцкіх вёсак у азначаны час, трэба мець на ўвазе, што Пётр Вітгенштэйн наўрад ці калі асабіста бываў у іх. Жыў ён у асноўным за мяжой, а калі і прыязджаў у Беларусь, то спыняўся ў Вільні, Мінску ці Вярках — радавым маёнтку.

Цікавае апісанне стану спраў у гэтых землях пакінуў памочнік галоўнага адміністратара маёнткаў па эканамічнай і юрыдычнай частках Кірыла Місевіч. Перш чым прыйсці на службу да князя ў 1874 г., ён дваццаць гадоў служыў у вышэйшых губернскіх урадавых установах, дзе добра спазнаў законы і, безумоўна, быў самым адукаваным чалавекам у адміністрацыі. Запісы Місевіча раскрываюць механізм гаспадарання на землях Вітгенштэйнаў і лішні раз падкрэсліваюць, што не можа ісці гаворка пра любоў да сваіх уладанняў і людзей, якія там жывуць, калі чалавек не нарадзіўся на той зямлі, якой уладарыць.

Місевіч пасля смерці Пятра Вітгенштэйна, які не меў дзяцей і які перадаў спадчыну сваёй сястры Марыі (яна выйшла замуж за іншаземца і насіла ўжо ў гэты час прозвішча Гогенлоэ), у красавіку 1889 г. звярнуўся да сваёй новай гаспадыні з пісьмом-пасланнем. У ім, у прыватнасці, акрамя сваіх заслуг (магчыма дзесьці спрэчных) ён адзначыў вельмі гаротны стан маёнткаў Вітгенштэйнаў. У першую чаргу ён растлумачыў гэта дрэннымі чалавечымі і гаспадарчымі якасцямі галоўнага адміністратара Дзмішэвіча. Атрымаўшы ад князя поўны дазвол на кіраванне маёнткамі, Дзмішэвіч мала турбаваўся аб памнажэнні дабрабыту гаспадара, кіраваў па сваім разуменні і выгадзе, не прыслухоўваючыся да іншых меркаванняў. У выніку многія справы былі выкананы ім з прамымі стратамі для гаспадаркі. Князь Пётр у гэты час клапаціўся аб тым, каб неяк закрыць свае шматлікія пазыкі і адначасова рабіў за мяжой усё новыя і новыя даўгі. Часткова іх (як і старыя даўгі яго бацькі Льва Вітгенштэйна) удалося ліквідаваць за кошт продажу зямель па рэформе 1861 г., аднак змяншэнне прыбытку з-за адмены прыгону не дазваляла карэнным чынам выправіць сітуацыю. У выніку разам са спадчынай у 842 875 дзесяцін Марыя ад бацькі і брата атрымала даўгі ў памеры 7 548 622 рублі і абавязацельствы па выплаце працэнтаў. Адзін толькі доўг брата ў заклад амаль усіх маёнткаў Рускаму знешнегандлёваму банку складаў больш за 5 мільёнаў рублёў. Аналіз стану гаспадаркі паказваў, што нават пры добрым вядзенні спраў маёнткі будуць стратныя, а гадавыя страты складуць 116 793 рублі. Вядома, калі б Марыя жыла ў Беларусі ці хоць бы была рускай падданай, то неяк можа і паўплывала б на сітуацыю, але яна стала нямецкай грамадзянкай, жыла за мяжой і таму валодала інфармацыяй слаба. Справа ўскладнялася яшчэ тым, што паводле закону ад 10 снежня 1865 г. забаранялася купляць маёнткі асобам польскага паходжання, католікам, іншаземцам і яўрэям. Закон ад 14 сакавіка 1886 г. забараняў іншаземцам купляць нерухомасць. Іншаземны падданы, атрымаўшы спадчыну, быў абавязаны на працягу 3 гадоў з моманту законнага пераходу да яго маёнткаў прадаць іх. Калі ж ён гэтага не рабіў, то ўрад пускаў маёнткі з малатка і вяртаў грошы ад продажу былому ўладальніку. Гэта акалічнасць рабіла маёмасць значна таннейшай. Аб гэтым было добра вядома мясцовым памешчыкам, вольным людзям, сялянам. Кожны прыкідваў, як адхапіць ад пірага

Вітгенштэйнаў большы кавалак. У такіх умовах Марыя Гогенлоэ рабіла спробы захаваць за сабой спадчыну. Яе муж звяртаўся да рускага імператара з просьбай адтэрмінаваць продаж зямель, аднак той быў няўмольны. Продаж пачаўся са спазненнем і праходзіў вельмі неарганізавана.

Нешта, магчыма, прадавалася, нешта здавалася ў арэнду. Адсутнасць дысцыпліны, нядобрасумленнасць адміністрацыі ўсё больш зацягвалі ўладанні Вітгенштэйнаў у даўгі і спрэчкі. Сітуацыя значна пагоршылася пасля смерці Марыі Львоўны. Кіраваць з Германіі землямі ў Віленскай і Мінскай губернях стала проста немагчымым, ды і нашчадкі Марыі, якія належалі да нямецкай кіруючай эліты, не вельмі хацелі праяўляць любоў да сваіх беларускіх каранёў і ўнікаць у стан сельскіх спраў. Ішоў новы век з тэлефонам і фота, веласіпедамі і аўто, мяняўся светапогляд, усё большай павагай карысталася тэхніка, а не зямля...

13 лютага 1900 г. у Берліне было заключана пагадненне паміж «наследниками Ея Светлости княгини Марии Гогенлоэ-Шилингфюрст...» з аднаго боку і дваранінам Паўлам Карлавічам Кнорэ з другога. Наследнікі даручылі Кнорэ ліквідацыю нерухомасці Марыі Львоўны ў беларускіх губернях на ўмовах, якія ён палічыць прымальнымі. Яму пакідалася выручка ад продажу зямель і поўная свабода дзеянняў. Узамен на гэтыя шчодрасці Кнорэ перадаў нашчадкам 175 тыс. рублёў і запэўніў, што выканае даручэнне па звальненні ўсіх служачых існаваўшых ліквідацыйных кантор у Вільні, Мінску, Слуцку і іншых месцах і па жаданні наследнікаў пакіне персанал у маёнтку Вяркі — радавым гняздзе Вітгенштэйнаў. Ён таксама абавязаўся спагнаць даўгі па вэксалях і нядоімках на суму больш як 50 тыс. рублёў, з якіх палову дазвалялася яму пакінуць сабе. Кнорэ быў папярэджаны, што з 1 мая 1900 г. ён будзе звольнены з пастаяннай пасады, аднак яму надалей будзе даверана поўнае права па распрадажы маёнтка Вяркі.

Цяжка сказаць, наколькі добрасумленным быў Кнорэ і наколькі дбайна гаспадарыў у спадчынных землях Вітгенштэйнаў. Кіраваў ён у асноўным са свайго маёнтка Няклюдаўка ў Пензенскай губерні. Гісторыя сведчыць, што яшчэ за тыдзень да падпісання азначанага пагадненне, 7 лютага 1900 г. ён сустрэўся з дваранінам Аляксандрам Сігізмундавічам Скродзскім і купцом Хаімам Нафтэлевічам Крэйнусам, каб абмеркаваць план сумесных дзеянняў па атрыманні барышоў з запланаванай распрадажы зямель. Было дамоўлена, што Крэйнус і Скродзскі будуць непасрэдна займацца продажам і накіроўваць грошы на адрас, указаны Кнорэ, а апошні будзе змяшчаць грошы ў Віленскі Арлоўскі банк. Як вынікае з дамовы, неабходная сума на перадачу нашчадкам у 175 тыс. рублёў была сабрана загадзя. 20 тыс. даў Крэйнус, 135 тыс. — Кнорэ, а рэшту ў 20 тыс. узялі (укралі) з таго, што ўжо належала Вітгенштэйнам ад продажу часткі іх зямель.

Дакументы сведчаць, што сам продаж былых зямель Радзівілаў — Вітгенштэйнаў суправаджаўся рознага роду махінацыямі. Нягледзячы на існаваўшы ўжо ў той час закон аб перавазе, якая аддавалася пры продажы нерухомасці пакупнікам, што доўгі час працавалі і жылі ў азначанай мясцовасці, Крэйнус і Скродзскі шукалі тых, хто мог болей заплаціць. Пакрыўджаныя сяляне-чыншавікі пачалі скардзіцца на тое, што цана за землі, вызначаная акладам, пачала расці, і іх мары набыць яе рухнулі на вачах.

...У асіповіцкіх вёсак новыя гаспадары з'явіліся яшчэ пры жыцці Марыі. У Майсеевічах гэта былі браты Цвіркі, Іван Максімавіч Бугор пачаў гаспадарыць у Пратасевічах, у маёнтку Жыцінская дача купіў зямлю Васіль Уладзіміравіч Максімаў, у Жыціне на 20 тыс. дзесяцінах пачала гаспадарыць Лізавета Фёдараўна Дараган. Непадалёку аселі яе браты: у Крынцы — Іосіф Фёдаравіч, у Смык-Слабадзе — Іван Фёдаравіч. Дараганы купілі Радуцічы і аказаліся новымі ўладальнікамі большасці зямель Марыі Гогенлоэ-Шылінгфюрст у асіповіцкім краі.

Дараганы — нашчадкі дваранiна Палтаўскай губерні, камандзіра Суздальскага пяхотнага палка палкоўніка Фёдара Дарагана. З трох сыноў і чатырох дачок палтаўскага палкоўніка на Асіповіччыне аб'явіліся сыны Іван, Іосіф (Восіп) і дачка Лізавета, а таксама Мацвей Якаўлевіч Дараган. Іх з'яўленне наўрад ці было выпадковым. Багатым людзям купляць зям-

лю, нават за бясцэнак, уздоўж Пцічы ад Слопішча да Жыціна — марна патраціць грошы. Глеба тут — пясок ці балота, надзеі на ўраджай малыя. Праўда, ёсць лес, аднак паспрабуй яго распрацаваць і прадаць. Толькі вар'яты ці вельмі дальнабачныя прадпрымальнікі маглі рызыкнуць на такую куплю. Хутчэй за ўсё Дараганы адносіліся да іншай катэгорыі. З іх паводзін вынікае, што з'явіліся яны на асіповіцкіх землях не для таго, каб усур'ёз заняцца земляробствам. Яшчэ да куплі зямлі яны прыкінулі план будаўніцтва чыгункі. Ва ўсялякім разе, як толькі ў 1894 г. была зацверджана купчая аб набыцці ў Марыі Гогенлоэ Восіпам, Іванам і Мацвеем маёнткаў Радуцічы, Крынка, Пратасевічы і Майсеевічы з 17 798 дзесяцінамі, адразу ж пайшоў ва ўрад зварот-хадайніцтва аб атрыманні дазволу на будаўніцтва чыгункі для вывазу лесу. Такі паварот справы выглядае лагічным, асабліва калі ўлічыць, што сапраўды стацкі саветнік Восіп Дараган з'яўляўся інжынерам шляхоў зносін. Дараганы прыклалі ўсе намаганні для таго, каб чыгуначная ветка пралягла да іх маёнтка — у Радуцічы і далей да Старых Дарог. Іх аднадумцам выступаў уладальнік Дзераўцоў інжынер Антон Шоманскі.

Пабудаваць чыгуначную ветку па тым часе было справай даволі няпростай. Не толькі па фінансавых прычынах. Расійскі ўрад патрабаваў дакладных фінансавых разлікаў, што нельга прызнаць самадурствам, бо пасля пабудовы за кошт прыватнага капіталу чыгунку прымалі ў казну з абавязковым абгрунтаваннем яе прыбытковасці на працягу агляднага часу. Відавочна, што сувязі Восіпа Дарагана ў Міністэрстве шляхоў зносін (ён праз пэўны час узначаліў Рыга-Арлоўскую чыгунку) і капітал братоў дазвалялі абысціся і без прыцягнення дадатковых удзельнікаў будаўніцтва, аднак па нейкіх прычынах першапачатковую заяву ў 1894 г. акрамя іх падпісала жонка палкоўніка Волыа Васільеўна Васільева, а таксама браты Сахаравы: інжынер шляхоў зносін Уладзімір Васільевіч, кандыдат матэматычнага факультэта Аляксандр Васільевіч і падпаручык Усевалад Васільевіч. Менавіта яны разам з Дараганамі звярнуліся афіцыйна ў Міністэрства шляхоў зносін і Міністэрства фінансаў Расійскай імперыі з прапановай пракласці за свой кошт 39 вёрстаў чыгуначнага палатна ад станцыі Асіповічы Лібава-Роменскай дарогі да станцыі Старыя Дарогі Маскоўска-Брэсцкай шашы. Прасіцелі

Сям'я Дараганаў. Сядзіць у цэнтры Восіп Фёдаравіч Дараган, злева ад яго жонка Юстына Мікалаеўна і сын Дзмітрый, справа — Восіп Восіпавіч Дараган. Імёны астатніх невядомы.

атрымалі дазвол. Аднак справа ад гэтага не зрушылася, і пытанне аб будаўніцтве было адкладзена яшчэ на год. Дараганы, не маючы вопыту ў будаўніцтве і ўвогуле ўдзелу ў такіх праектах, на першым этапе выкарысталі веды інжынера-чыгуначніка Уладзіміра і матэматыка Аляксандра Сахаравых па складанні каштарысу будаўніцтва і па правядзенні неабходных разлікаў. Сам факт атрымання дазволу сведчыць на карысць таго, што папярэдняя работа была выканана бліскуча (урад не знайшоў у разліках вялікіх хібаў). Без Сахаравых нельга было прыступаць да справы і таму, што генеральшы Сахаравай належаў у той час маёнтак Дарогі, да якога трэба было весці ветку. Пасля таго, як стала зразумела, колькі каштуе будаўніцтва, як яно будзе весціся і як будзе фінансавацца, Дараганы вырашылі звузіць кола ўдзельнікаў і тым самым павялічыць свае будучыя барышы. У «Высочайше утвержденном 19 января 1896 года Положении Соединенного Присутствия Комитета Министров и Департамента Государственной Экономии Государственного Совета», якое абавязвала паўнамоцных дзяржаўных прадстаўнікоў заключыць дагавор з ініцыятарамі будаўніцтва чыгункі, прозвішчы Васілеўскай і Сахаравых ужо не значыліся, а ў 1904 г. дарогамі ўжо валодала Лізавета Дараган. На падставе згаданага дакумента 27 сакавіка 1896 г. Упраўленне Лібава-Роменскай чыгункі ў асобе яе начальніка сапраўднага стацкага саветніка інжынера шляхоў зносін П.А.Ласкіна разгледзела з удзелам Мацвея Дарагана праект дагавора. Праект гэты не задаволіў прадпрымальніка, і ён зрабіў да яго нейкія свае заўвагі. Тычыліся яны хутчэй за ўсё кабальных умоў пабудовы веткі, навязаных Упраўленнем чыгункі. Да заўваг чыгуначнікі аднесліся без належнай увагі. Атрымаўшы «Высочайше утвержденное положение» ад 19 студзеня 1896 г., яны палічылі, што пабудове адкрыта зялёнае святло і, не чакаючы канчатковага зацвярджэння дагавора, ужо ў лютым аддалі неабходныя распараджэнні. Дараганы ж, палічыўшы, што іх заўвагі прыняты да ведама і маюць законную сілу, пачалі фінансаванне па абумоўленай у дагаворы схеме; яны не ведалі, што дагавор пайшоў «наверх» і, як гэта прынята было ва ўсе часы ў Расіі, заблукаў у бюракратычных калідорах. Будаўніцтва ішло хуткімі тэмпамі. У рабочай сіле недахопу не было. Добра ведаючы аб заробках, якія колісь былі на будаўніцтве Лібава-Роменскай чыгункі, мясцовыя сяляне з навакольля стаялі ў чарзе з вазамі, прапануючы свае паслугі. Будаўніцтву спрыяла добрае надвор'е і тое, што паводле праекта лінія чыгуначнай веткі ішла па старажытнай грунтавой дарозе з Радуціч на Пратасевічы з аднаго боку і з Радуціч на Каўгары, Халькі і далей на Старыя Дарогі з другога. Праўда, само чыгуначнае палатно не супадала з воссю дарогі, але часам падыходзіла да яго вельмі блізка, што дазваляла аператыўна ажыццяўляць пракладку прасекі, падвозку шпал і іншых будаўнічых матэрыялаў.

Сядзіба Дараганаў у в. Крынка. Здымак 1930-х гадоў.

(З пабудовай чыгункі гэта дарога страціла сваё значэнне, але і зараз, пры жаданні, можна прайсці па лесе з Дараганава да Дзераўцоў, адзначыўшы яе існаванне, зрэшты, як і існаванне кар'ераў па здабычы пяску.) Следам за адсыпкай палатна ішла ўкладка шпал і рэек, па якіх неўзабаве пачынаў рухацца паравоз. Рэха разносіла па лесе яго гудкі і пыхценне. Людскі гоман, ляскат металу, пах машыннага масла будзілі наваколле, бы магнітам прыцягвалі навакольных жыхароў. І цуд нараджаўся на вачах.

Па першапачатковых прыкідках галоўную станцыю — Радуцічы — меркавалася размясціць на правым (Каўгарскім) беразе Пцічы, якраз на палове шляху ад ракі да дарогі з Каўгароў на Радуцічы (яна не перасякае ракі і закінутая існуе і зараз). Відаць, у гэтым праекце Дараганаў вабіла тое, што станцыя размяшчалася б на аднолькавай адлегласці ад гэтых населеных пунктаў, якія ў той час ужо былі куплены ў Марыі Гогенлоэ-Шылінгфюрст і з'яўляліся іх уласнасцю. У далейшым, калі ажыццяўленне праекта набыло рэальныя абрысы, станцыю і станцыйны пасёлак вырашана было будаваць паміж Пціччу і яе прытокам — ракой Дзеземля (зараз невялікая безымянная рачулка-ручай у ваколіцах Смалярні). Такое рашэнне было больш правільнае, асабліва, калі ўлічыць, што ветка будавалася для вывазу драўніны. Пасёлак з двух бакоў ахоплівалі ўжо існаваўшыя ў той час дарогі: адна з Радуціч праз Пціч на Каўгары і другая з Радуціч на Птушычы (недалёка ад Дзеземлі), што давала магчымасць без дадатковых страт ажыццяўляць падвоз лесу да станцыі. На месцы ж самога запраектаванага станцыйнага пасёлка (сучаснага Дараганава) тады раслі хвоі. Акрамя станцый Радуцічы і Старыя Дарогі на ветцы меркавалася пабудаваць 2 раз'езды: Дзераўцы і Буда (апошні сёння вядомы пад назвай Фалічы). Тэмпы будаўніцтва былі такімі высокімі, што ўжо 18 лістапада 1896 г. асобая камісія, прызначаная міністрам шляхоў зносін Расіі, пад старшынствам інспектара інжынера Грачова правяла агляд веткі, а 28 снежня 1896 г. напярэдадні Новага года пасля прыёмкі яе ў казну з Асіповіч да Старых Дарог быў адкрыты пасажырскі і таварны рух. 39 вёрстаў палатна разам з мастамі (у тым ліку цераз Пціч), іншымі інжынернымі збудаваннямі і станцыямі (у тым ліку мураваным будынкам самой станцыі Радуцічы) былі пабудаваны практычна за 9 месяцаў.

Між тым заключэнне дагавора з Дараганамі не было завершана. Канчаткова Міністэрства шляхоў зносін здолела яго ўзгадніць з Дзяржкантролем толькі 19 снежня 1896 г., і толькі ў канцы лютага наступнага года начальніку Лібава-Роменскай чыгункі прадпісаннем за № 9004 было прапанавана заключыць дагавор з Дараганамі. Калі прадпрымальнікаў пачалі прымушаць да падпісання дагавора без уліку іх заўваг, яны катэгарычна адмовіліся гэта зрабіць. Па-першае яны спаслаліся на тое, што яшчэ ў верасні, калі завяршалася будаўніцтва і начальнік Лібава-Роменскай чыгункі прыгразіў ім спыненнем дастаўкі грузаў, яны згадзіліся і падпісалі толькі тыя артыкулы дагавора, у якіх выкладзены спосаб выплаты ім, Дараганам, страт па будаўніцтве. Па-другое, няма сэнсу падпісвацца пад тымі пунктамі, ажыццяўленне якіх ужо завершана.

Валакіта з падпісаннем дагавора цягнулася яшчэ амаль год, Дараганаў перыядычна палохалі спыненнем перавозак, пакуль 11 снежня 1897 г. не з'явіўся на свет даклад тэхнічнага ўпраўлення казённых чыгунак Расіі, у якім канчаткова былі расстаўлены ўсе кропкі над «і», які прызнаў праўду за прадпрымальнікамі і спыніў на іх ганенні.

Будаўніцтва чыгуначнай веткі мела выключнае значэнне для развіцця заходняй часткі Асіповіцкага раёна. Станцыя Радуцічы (пазней па просьбе Дараганаў названа Дараганавам) вельмі хутка ператварылася ў рабочы пасёлак. Тут запрацаваў лесапільны завод, па чыгунцы ў абодва бакі пацёк паток багажу, камерцыйных грузаў і пасажыраў. Па афіцыйных даных за 1905 г., па ветцы было перапраўлена толькі лесу 4 913 000 пудоў. Спрыяла ўздыму чыгункі і гандлёва-прамысловая дарога даўжынёй 16 вёрстаў ад станцыі Дараганава праз в. Старыя Фалічы да Новых Дарог. Вопыт эксплуатацыі асіповіцкай веткі атрымаў шырокі водгук сярод чыгуначнікаў, ён быў абагульнены і паслужыў адпраўной кропкай пры праектаванні і будаўніцтве чыгуначнай веткі Верайцы — Градзянка. Адначасова з будаўніцтвам

чыгункі Мацвей Дараган пусціў паравы лесапільны завод у сваім маёнтку Радуцічы.

Характарызуючы значны ўплыў Дараганаў на дарэвалюцыйнае развіццё прыпцічанскай часткі раёна, нельга не адзначыць наступнае. Людзі гэтыя з'явіліся на Беларусі, дзякуючы пэўным палітыка-эканамічным абставінам. Хутка зразумеўшы, што пасля паражэння паўстання 1863 г. адносіны да карэннага насельніцтва Беларусі неправаслаўнага веравызнання з боку цэнтральнай улады яшчэ больш пагоршыліся, яны, адчуваючы сваю перавагу, скупілі за бясцэнак спрадвечныя беларускія землі, на якіх пачалі хутка багацець. Дастаткова сказаць, што Лізавета Фёдараўна Дараган толькі ў Жыціне мела каля 20 тыс. дзесяцін зямлі, а яе ўладанні ў 1911 г. прасціраліся да Старых Дарог. Мацвей Дараган, карыстаючыся інфармацыяй Восіпа Дарагана, скупліваў вакол Асіповіч тыя надзелы, на якіх павінна была развівацца чыгунка, ашукваючы, па сутнасці, мясцовых землеўладальнікаў. Напрыклад, ён загадзя танна купіў надзел, на якім неўзабаве быў пабудаваны шпалапрапітны завод. Пакупка была настолькі ўдала спланаванай, што Мацвей Дараган акрамя выкупной цаны атрымаў за ўчастак заахвочванне ад урада: за «разуменне» дзяржаўных патрэб...

Мацвей уважліва сачыў за настроямі ў вёсцы, жорстка праводзячы лінію па недапушчэнні вальнадумства, строга прытрымліваючыся ўказанняў царскага ўрада. Асабліва выразна гэта праяўлялася ў адносінах да куплі-продажу зямлі. Спрэчкі і крыўды па гэтым пытанні ва ўладаннях Дараганаў былі звычайнай справай. Скажам, калі ў 1904 г. згодна з законам ад 19.1.1893 г. надышла пара выкупу зямлі ў в. Старыя Фалічы, Ігнату Кернажыцкаму, Фёдару Капцэвічу, Сільвестру Казлоўскаму, Антону Адамовічу і Фадзею Нічыпаровічу ўдалося выкупіць свае надзелы без асаблівых перашкод. А вось іх аднавяскоўцу і старэйшаму арандатару Восіпу Казлоўскаму — ніяк. Нават праз суд, бо быў ён католікам і не хацеў цурацца сваёй веры.

Падзел карэннага насельніцтва па веравызнанні і нацыянальнасці поўнасцю адпавядаў тэзісу «падзяляй і ўладар», і Дараганы карысталіся ім у поўнай меры. За 10 гадоў жыцця на Беларусі яны здолелі сфарміраваць вакол сябе кола адданых служак з прадстаўнікоў мясцовай улады, якія ахоўвалі інтарэсы гэтых памешчыкаў. Прабіцца «наверх» са скаргай было амаль немагчыма.

Грошы сям'і Дараганаў сапраўды пераўтварылі прыпцічанскую частку раёна. Чыгунка дала штуршок развіццю вытворчых сіл, гандлю. Вопыт будаўніцтва і эксплуатацыі веткі атрымаў водгук па ўсёй імперыі. Аднак, пілуючы радзівілаўскія пушчы, Дараганы не дбалі аб іх аднаўленні. Яны не пабудавалі на гэтай зямлі ні школы, ні царквы. Але іх прозвішча і да сённяшняга дня ўвекавечана ў назве станцыі і населенага пункта.

Прозвішчаў Радзівілаў і Вітгенштэйнаў ніколі не было ў раённай тапаніміцы.

В.У.Хурсік.

1917

1941

НА КРУТЫМ ПАВАРОЦЕ ГІСТОРЫІ

Вестка аб перамозе Кастрычніцкай рэвалюцыі прыйшла на тэлеграф чыгуначнай станцыі Асіповічы 25 кастрычніка (7 лістапада) 1917 г. Тэлеграму прыняў загадчык тэлеграфа Яфім Іосіфавіч Лагацкі і паведаміў аб гэтым усім службам чыгуначнага вузла. У гэты ж дзень аб пераходзе ўлады ў рукі Саветаў даведаліся жыхары Асіповіч і ўсёй Замошскай воласці, у якую яны тады ўваходзілі. У лакаматыўным дэпо, на станцыі і ў цэнтры воласці — в. Замошша — былі праведзены мітынгі.

Рабочыя і служачыя, актывісты чыгуначнага вузла стварылі рэвалюцыйны камітэт, у які выбралі Лагацкага, Гарбузава, Бляцко і іншых. Рэўком узначаліў гаспадарча-палітычную работу не толькі на чыгуначным вузле, але і ў рабочым пас. Асіповічы, аказваў практычную дапамогу Савету рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Замошскай воласці ў арганізацыі кіраўніцтва, нацыяналізацыі зямлі і канфіскацыі маёмасці памешчыкаў.

У гэты ж час на станцыі Асіповічы была арганізавана партыйная ячэйка. Лагацкі быў прыняты ў члены партыі і абраны яе сакратаром. Застаючыся на пасадзе загадчыка тэлеграфа станцыі, ён падтрымліваў сувязь з кіруючымі партыйнымі органамі чыгункі ў Мінску і з Бабруйскім рэўкомам. Партыйная ячэйка сумесна з рэвалюцыйным камітэтам назначылі камісараў: чыгуначнай станцыі — Г.Скварцова, паравознага дэпо — Д.А.Дзям'янава.

Пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі контррэвалюцыйныя сілы пачалі сцягвацца ў Магілёў, дзе размяшчалася Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага на чале з генералам М.М.Духоніным. На барацьбу з савецкай уладай у Магілёў прыбылі — Арэнбургскі і 60-ы Сібірскі казачы палкі, 1-ы ўдарны полк і іншыя часці. На фронце для адпраўкі ў Магілёў было падрыхтавана 40 ударных батальёнаў.

З мэтай разгрому Стаўкі Рэўваенсаветам былі высланы войскі пад камандаваннем М.В.Крыленкі. З Петраграда ў Магілёў накіраваны атрады салдат Маскоўскага палка, матросаў Балтыйскага флоту і чырвонагвардзейцаў. Адначасова Паўночна-Заходнім камітэтам бальшавікоў быў утвораны рэвалюцыйны зводны атрад пад камандаваннем Р.І.Берзіна і Я.Лысякова, які складаўся з 2 эшалонаў. Адзін эшалон (пяхота з бронемашынамі на чале з Р.І.Берзіным) атрымаў заданне рухацца на Магілёў. Другі эшалон (пяхота і браняпоезд на чале з В.І.Пралыгіным) павінен быў наступаць на Стаўку з поўдня, з боку

Жлобіна. 11 лістапада 1917 г. гэты эшалон прыпыніўся ў Асіповічах і пасля праведзенай разведкі пайшоў на Жлобін. У ноч на 19 лістапада савецкія войскі пад камандаваннем М.В.Крыленкі ліквідавалі Стаўку Вярхоўнага галоўнакамандуючага.

Першым паспрабаваў перашкодзіць развіццю рэвалюцыйных падзей на Беларусі 1-ы польскі корпус легіянераў генерала І.Р.Доўбар-Мусніцкага. Корпус размяшчаўся ў раёне Рагачова, Жлобіна і Бабруйска.

У снежні 1917 г. галоўнакамандуючы Заходнім фронтам А.Ф.Мяснікоў загадаў Доўбар-Мусніцкаму поўнасцю падпарадкавацца рэвалюцыйнаму камандаванню. Але генерал, якога падтрымлівалі памешчыкі Польшчы і Мінскай губерні, адхіліў гэты загад. У гэты час у Брэст-Літоўску пачаліся перамовы аб заключэнні мірнага дагавора з Германіяй.

На пачатку 1918 г. становішча вакол Асіповіч рэзка абвастрылася ў сувязі з контррэвалюцыйным выступленнем генерала І.Р.Доўбар-Мусніцкага, легіянеры якога пачалі рухацца на захад. На досвітку 12 студзеня яны пачалі наступленне на Жлобін, але былі адкінуты чырвонагвардзейцамі і адышлі да Бабруйска. На 2-і дзень мяцежнікі зноў перайшлі ў наступленне, занялі Бабруйск, Рагачоў і Оршу, рушылі на Магілёў і Мінск. Атрады Чырвонай гвардыі, што абаранялі Бабруйск, адышлі ў заходнім напрамку і далучыліся да атрадаў, якія дзейнічалі на Рагачоўскім і Асіповіцкім участках. Пад в. Ясень паміж легіянерамі і чырвонагвардзейцамі завязаўся бой. Супраць 1,5 тысячы легіянераў выступіў атрад Чырвонай гвардыі ў 500 байцоў. Чырвонагвардзейцы падбілі 2 гарматы і прымусілі кавалерыю палякаў адступіць. У гэтым баі страты ворага склалі каля 600 салдат, рабочыя атрады страцілі 100 чалавек забітымі і параненымі.

Асіповіцкі рэўком і бальшавіцкая ячэйка, выконваючы загады Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта Заходняга фронту, пачалі работу па фарміраванні атрадаў Чырвонай гвардыі. На станцыі Асіповічы пры дапамозе Замошскага і Восаўскага валвыканкомаў быў сфарміраваны атрад колькасцю больш за 1000 чалавек. Многія жыхары Асіповіч увайшлі ва ўнутраныя войскі пад камандаваннем намесніка загадчыка і члена калегіі Усерасійскай надзвычайнай камісіі (ВЧК) В.В.Каменшчыкава. Яны рыхтаваліся абараняць чыгуначную станцыю і пас. Асіповічы. Акрамя таго, супраць войскаў Доўбар-Мусніцкага быў накіраваны рэвалюцыйны атрад у колькасці 2500 чырвонагвардзейцаў 1-й Мінскай рэвалюцыйнай арміі. Агульная колькасць савецкіх войскаў на Асіповіцкім напрамку складала 4000 чалавек. Перад імі была пастаўлена задача: разграміць мяцежнікаў і не дапусціць іх у Мінск. Адначасова для ўмацавання сіл Чырвонай гвардыі была разгорнута работа ў валасцях Бабруйскага павета па фарміраванні новых атрадаў: у Глускай воласці ўступіла ў атрад 300, Калачах — 200 і Балашэвічах — 150 чалавек. Адным з арганізатараў гвардзейскіх атрадаў быў старшыня Глускага рэўкома С.Л.Вілюга.

18 студзеня 1918 г. легіянеры пад камандаваннем капітана Юркевіча падышлі да Асіповіч. Перад наступленнем у пасёлак былі накіраваны разведчыкі, пераапранутыя ў форму чырвонагвардзейцаў. Ім удалося ўзарваць чыгуначны мост на Слуцкім напрамку. У ноч на 19 студзеня легіянеры адкрылі па Асіповічах моцны артылерыйскі і кулямётны агонь. У гэты час групы лазутчыкаў атакавалі з тылу. Атрад унутраных войскаў і чырвонаармейцаў пад націскам перавышаючых сіл працаўніка з фронту і тылу быў вымушаны з баямі адысці ў бок Мінска. Члены Асіповіцкага рэўкома, камуністы партыйнай ячэйкі,

прадстаўнікі Замошскага валвыканкома, выконваючы дырэктыву вышэйстаячых партыйных органаў і камандавання, пайшлі ў бліжэйшыя лясы і вёскі, каб партызанскімі метадамі працягваць барацьбу.

Заняўшы Асіповічы і разагнаўшы ўстановы савецкай улады ў пасёлку, Замошскай воласці і ўвогуле па раёне, легіянеры размясцілі на станцыі сваю камендатуру. Пачаліся рабаванні, гвалтаванні, масавыя забойствы мірных жыхароў. Акупацыя працягвалася 3 тыдні, але і за такі тэрмін легіянеры прычынілі насельніцтву значныя страты.

З лютага пачалося агульнае наступленне атрадаў Чырвонай гвардыі. Рэшткі 1, 2 і 3-й польскіх дывізій сканцэнтраваліся ў раёне Бабруйска і спрабавалі аказаць ім супраціўленне. Але сіламі Магілёўскага атрада, які рухаўся з боку Рагачова, 1-га Мінскага атрада — з боку Жлобіна, і Асіповіцкага атрада — з боку Асіповіч, легіянерам быў нанесены ўдар. 26.2.1918 г. у Бабруйску заключана пагадненне аб падпарадкаванні 1-га польскага корпуса немцам.

Міжнароднае становішча Беларусі заставалася складаным. 16 лютага германскае камандаванне паведаміла савецкай дэлегацыі аб тым, што 18 лютага заканчваецца тэрмін перамір'я і аднаўляецца вайна. Германія парушыла ўмовы перамір'я і зноў пачала ваенныя дзеянні. Кайзераўскія войскі перайшлі ў наступленне па ўсім фронце ад Балтыйскага мора да Карпат.

У напрамку Бабруйска і Гомеля рушыў 21-ы рэзервовы корпус нямецкай арміі, які ў першы ж дзень наступлення заняў Асіповічы. Захопнікі аднавілі прыватную ўласнасць, шырока выкарыстоўвалі дзеля сваіх патрэб чыгунку, прамысловыя прадпрыемствы рабочага пасёлка, вывозілі ў Германію лесаматэрыялы і харчаванне. На захопленай тэрыторыі ўлада цалкам перайшла ў рукі германскіх акупацыйных войскаў.

В.В.Каменшчыкаў.

Загадам нямецкіх камендатур забаранялася жыхарам у начны час хадзіць з вёскі ў вёску, а ў дзень толькі з пропускам каменданта (коштам 1 рубель і 10 рублёў закладу), абсалютна забаранялася ездзіць чыгуначным транспартам.

Рэўком і бальшавікі Замошскай воласці Я.І.Лагацкі, Г.І.Скварцоў, Д.А.Дзям'янаў і іншыя пад кіраўніцтвам старшыні Замошскага рэўкома Гарбузава пайшлі ў брыцалавіцкія лясы і адтуль праз Дзмітрыя Малаковіча (Малаховіча), які кіраваў Крынкаўскай групай падпольшчыкаў з 33 чалавек, устанавілі сувязь з Бабруйскім падпольным камітэтам РКП(б). Пазней кіраўніцтва гэтай групай было перададзена прадстаўнікам Глускай падпольнай партыйнай ячэйкі М.А.Ляўкову і Л.Я.Адзінцову. Гэта група праводзіла актыўныя баявыя дзеянні супраць акупантаў. Рашуча змагалася з акупантамі таксама група Трубачова (прыбыў з Заходняй Беларусі). Камісарам у ёй быў ураджэнец в. Крынка Дзяніс Харытонавіч Пінчук. Партызаны выводзілі са строю сувязь паміж Асіповічамі і Старымі Дарогамі, разбіралі рэйкі, падпальвалі вагоны і склады з ваеннай маёмасцю.

З пачатку нямецкай акупацыі Бабруйскі падпольны камітэт РКП(б) пад кіраўніцтвам П.Ф.Равінскага і П.М.Серабракова стварыў у валасцях падпольныя рэвалюцыйныя камітэты і

партыйныя ячэйкі, перад якімі ставілася мэта праводзіць арганізацыйную і палітычную работу сярод насельніцтва, а пры наступленні Чырвонай арміі ўзяць уладу ў свае рукі. Старшынёй Замошскага падпольнага рэўкома быў абраны бальшавік, матрос Балтыйскага флоту Фёдар Антонавіч Бугроў, яго намеснікам — М.Ф.Трыбушэўскі і членам рэўкома — А.Ф.Юркавец. Пражываючы і працуючы на акупіраванай тэрыторыі ў цяжкіх умовах, Ф.А.Бугроў і А.Ф.Юркавец захварэлі на тыф і, не маючы магчымасці атрымаць медыцынскую дапамогу, у хуткім часе памерлі.

1 сакавіка 1918 г. у Брэст-Літоўску аднавілася мірная канферэнцыя. ЗША, краіны Антанты, белагвардзейскія генералы рабілі ўсё магчымае для таго, каб сарваць заключэнне мірнага дагавора з Германіяй, аднак 3 сакавіка бакі падпісалі яго з умовай ратыфікацыі праз 2 тыдні.

IV Надзвычайным Усерасійскім з'ездам Саветаў (14 — 16 сакавіка 1918) гэты дагавор быў ратыфікаваны, але ўжо 15 сакавіка Антанта прыняла рашэнне не прызнаваць яго і распачаць дзеянні па звяржэнні ў Расіі савецкай улады. Мірныя прапановы Савецкай Расіі не сустрэлі разумення і ў польскага ўрада.

У тыле нямецкіх інтэрвентаў у гэты час актыўную работу праводзіў Бабруйскі падпольны камітэт РКП(б). Члены камітэта П.Дз.Малаковіч, І.А.Вейнер, Шумілін, Пятроў па ініцыятыве П.Ф.Равінскага пачалі наладжваць сувязь з камуністамі, якія пражывалі на тэрыторыі Бабруйскага павета і вырашылі аднавіць партыйныя арганізацыі ў павеце, актывізаваць вусную і друкаваную агітацыю сярод насельніцтва, наладзіць сувязь з абкомам у Смаленску і дастаўку літаратуры. У партыйную ячэйку пас. Свіслач быў накіраваны для работы Авяр'янаў.

У ліпені 1918 г. Бабруйскі партыйны камітэт быў рэфармаваны ў раённы камітэт РКП(б), які праводзіў работу пад кіраўніцтвам Паўночна-Заходняга абласнога камітэта. Адным з галоўных пытанняў, з якім сутыкнулася партыйная арганізацыя у той перыяд, быў клопат аб забеспячэнні насельніцтва хлебам.

Нямецкія вайсковыя часці, захапіўшы Беларусь і Прыбалтыку, да восені 1918 г. апынуліся перад фактам непазбежнага разгрому і выгнання з беларускай зямлі.

На пасяджэнні савецка-германскай камісіі, якое праводзілася ў Оршы 21 кастрычніка 1918 г., абмяркоўваліся пытанні аб выхадзе немцаў з тэрыторыі, што знаходзілася на ўсход ад ракі Бярэзіны. Прадстаўнікі нямецкага камандавання самі прапанавалі на месяц раней, чым сказана ў дагаворы, вызваліць гэту тэрыторыю. Было відавочна, што немцы спяшаюцца. І нездарма: у пачатку лістапада 1918 г. грымнула рэвалюцыя ў Германіі.

13 лістапада УЦВК прыняў пастанову скасаваць Брэсцкі мірны дагавор. Усе ўключаныя ў яго абавязацельствы былі аб'яўлены несапраўднымі. 28 лістапада 151-ы і 152-і стралковыя палкі 17-й дывізіі Чырвонай арміі вызвалілі Бабруйск, а 4 снежня атрад чырвонаармейцаў пад камандаваннем Майсеенкі вызваліў Асіповічы. 6 снежня 1918 г. чыгуначнікі паслалі ў адрас УЦВК і СНК тэлеграму, у якой віталі савецкую ўладу, паведамлялі, што яны не далі немцам адправіць са станцыі 23 паравозы і шмат іншай маёмасці.

Асіповіцкія бальшавікі, якія выйшлі з падполля, яшчэ да прыходу Чырвонай арміі ўтварылі чыгуначны рэвалюцыйны камітэт, у які увайшлі Зыкаў, Чорны, Цітоў, Мымрыкаў і іншыя, і сфарміравалі ўзброены атрад. Рэвалюцыйны камітэт узяў у свае рукі кіраўніцтва станцыяй і Асіповічамі, пачаў прыцягваць жыхароў да працы па аднаўленні станцыйнай і пуцявой гаспадаркі.

У пачатку студзеня 1919 г. быў утвораны Замошскі і іншыя валасныя

Саветы. Асіповіцкі чыгуначны рэўком аказваў усебаковую практычную дапамогу Замошскаму валвыканкому.

Са жніўня 1919 г. пачаў работу Бабруйскі падпольны камітэт. Дзеля правядзення партыйнай работы ў вёсках быў створаны парабкоўскі цэнтр, а таксама было арганізавана 15 падпольных партыйных ячэек і раённы партыйны камітэт у в. Ясень. Для правядзення партыйна-палітычнай работы і арганізацыі партызанскай барацьбы з акупантамі ў Бабруйскім павеце ЦК КП(б) Літвы і Беларусі накіраваў Максіма Архіпавіча Ляўкова — аднаго з актыўных удзельнікаў Рудабельскага падполля і партызанскага руху ў барацьбе з палякамі і немцамі ў 1917—1918 гг.

Польскія войскі, якія разгарнулі наступленне і 8 жніўня захапілі Мінск, 20 жніўня былі ў Асіповічах.

Акупанты размясцілі штаб вайсковай часці ў маёнтку памешчыка І.Ф.Дарагана ў в. Смык-Слабада, контрразведку (дэфензіву) — у будынку, які зараз займае леспрамгас, камендатуру і войскі — у паўночнай частцы Асіповіч. З дапамогай ксяндза, праваслаўнага святара і равіна акупанты стварылі магістрат. У хуткім часе захопнікі дэманціравалі шпалапрапітны завод і вывезлі яго абсталяванне ў Польшчу.

Камуністы Замошскай воласці дзейнічалі ў падполлі. Непадалёку ад Асіповіч, у Крынкаўскім і Дараганаўскім лясах, аднавіў дзейнасць партызанскі атрад. Яго байцы арганізоўвалі дыверсіі на ўчастках чыгункі Асіповічы—Старыя Дарогі, разбіралі пуць, падарвалі чыгуначны мост цераз раку Пціч.

У пачатку чэрвеня 1920 г. крынкаўскія партызаны ажыццявілі напад на станцыю Дараганава і разграмілі гарнізон палякаў. На другі дзень польскім акупантам пры дапамозе здрадніка — сельскага старасты, удалося арыштаваць групу партызан, у тым ліку: Захарыя Іванавіча Сашчэку, Рыгора Кузьміча Кузьміча, Цімафея Іванавіча Кузьміча, Івана Майсеевіча Пінчука, Савелія Іванавіча Пінчука і Васіля Іларыёнавіча Ярашэвіча. Пасля допытаў партызаны былі расстраляны камандай каменданта Верыка ў кар'еры на ўсходняй ускраіне Асіповіч.

У першыя дні ліпеня 1920 г. партызаны напалі на чыгуначную станцыю Асіповічы з мэтай захопу браняпоезда, які рыхтаваўся адправіцца на Мінск, і разам з разведчыкамі Чырвонай арміі і чыгуначнікамі захапілі яго. Палякі ў Мінску атрымалі звесткі аб захопе браняпоезда і паслалі яму на дапамогу другі — з Мінска. Каб не дапусціць яго падыходу, партызанскі атрад А.Каралька і байцы 14-га стралковага палка Чырвонай арміі разабралі пуць на станцыі Верайцы, і браняпоезд да Асіповіч не дайшоў.

4 ліпеня 1920 г. войскі Заходняга фронту перайшлі ў наступленне. Разам з часцямі Чырвонай арміі змагаліся

Помнік партызанам грамадзянскай вайны ў г. Асіповічы.

І.І.Ляховіч.

асіповіцкія партызаны. Яны падрывалі і палілі вайсковыя склады, разбіралі чыгуначныя пуці, парушалі сувязь. Рух цягнікоў на ўчастку Жлобін — Асіповічы — Мінск быў практычна паралізаваны.

Палякі адступілі на захад. Пры гэтым яны спалілі ў Асіповічах лесапільныя заводы, пакгаўз, канторы паравознага дэпо і кандуктарскага рэзерву, падарвалі чыгуначны мост цераз раку Сінюю. Спроба спаліць будынак вакзала была папярэджана. 10 ліпеня 1920 г. часці Чырвонай арміі вызвалілі Асіповічы.

Вярнуўшыся з партызанскіх атрадаў, камуністы выбралі рэвалюцыйны камітэт на чале з Леанідам Шымковічам і сакратаром Васілём Гуськовым. У камітэт таксама ўвайшлі Я.І.Лагацкі, прыбыўшы пасля вызвалення са ссылкі І.І.Ляховіч і іншыя. Рэўком стварыў 2 аддзелы (1-ы для кіраўніцтва пасёлкам, 2-і для арганізацыі работы чыгуначнага вузла) і пачаў прымаць меры па аднаўленні гаспадаркі ў Асіповічах.

16 ліпеня 1920 г. рэўком тэлеграфаваў наркому шляхоў зносін і загадчыку чыгункі ў Гомель: «...Приступили к ремонту дорожных путей в сторону Минска, Бобруйска и Слуцка, взяли под охрану государственное имущество и восстановили связь с Бобруйском; пригнали на ремонт в Осиповичи паровозы со станции Пуховичи; вернули имущество паровозного депо; составили рабочий поезд и отправили в распоряжение Главдарма; восстановили мост на верейцовской ветке. Ведутся работы по восстановлению моста через реку Синюю».

У канцы 1920 г. асіповіцкія камуністы для паляпшэння забеспячэння насельніцтва харчовымі і прамысловымі таварамі арганізавалі спажывецкую кааперацыю. Першы кааператыў аб'яднаў 638 пайшчыкаў.

Партыйная ячэйка Замошскага валаснога цэнтра і Асіповіч да 1 верасня 1920 г. стварыла Асіповіцкую партыйную арганізацыю. Была намечана праграма палітычнай і культурнай работы сярод насельніцтва. Па

Уваход Чырвонай арміі ў Свіслач у час савецка-польскай вайны 1920 г.

ініцыятыве А.Я.Сташкевіча на чыгуначным вузле арганізавалася ячэйка Камуністычнага Саюза Моладзі Беларусі (КСМБ) з 20 чалавек.

Ворагі савецкай улады не хацелі змірыцца са сваім паражэннем. Барацьба з імі працягвалася да канца 1920 г. У раёне Асіповіч і Старых Дарог дзейнічалі контррэвалюцыйныя атрады Пташынскага і Цвіркі, дробныя групы марадзёраў і дэзерціраў. Лютавала такая група і ў раёне чыгуначнай станцыі Градзянка.

Бабруйскі павятовы камітэт кампартыі ў спецыяльным звароце заклікаў быць гатовымі для бязлітаснай барацьбы і знішчэння злачынных бандаў. У сувязі з гэтым указаннем Замошскі Савет і валасны партыйны камітэт увялі ваеннае навучанне для ўсіх членаў партыі, кандыдатаў у члены партыі і савецкага актыву. Усе былі залічаны ў часці асобага прызначэння (ЧАП). Камандзірамі атрадаў прызначаліся

А.Я.Сташкевіч.

камуністы, якія мелі баявы вопыт. На станцыі Асіповічы былі сфарміраваны дзве роты ЧАП і рота міліцыі.

У канцы 1920 г. часці Чырвонай арміі, атрады Усерасійскай надзвычайнай камісіі, апіраючыся на дапамогу мясцовых камуністаў і камсамольцаў, перамаглі атрады Булак-Балаховіча і іншыя групы. Рэшткі іх яшчэ некаторы час хаваліся ў лесе, але дні іх былі злічаны.

В.У.Зорын.

Змагаліся за ўладу Саветаў

ЗАГІНУЛІ АД РУК БАНДЫТАЎ

ПАЛАНЕЙЧЫК Апанас Кузьміч. Удзельнік партызанскага руху ў Беларусі ў грамадзянскую вайну. Нарадзіўся ў 1900 г. у в. Радуцічы Асіповіцкага р-на. З 1919 г. на падпольнай рабоце ў Слуцкім і Бабруйскім паветах. Вясной 1920 г. у раёне Старых Дарог арганізаваў некалькі партызанскіх атрадаў, якія на чале з Паланейчыкам разбурылі чыгуначную ст. Дараганава, мост цераз Пціч, пусцілі пад адхон варожы эшалон, перадавалі камандаванню Чырвонай арміі звесткі разведкі, вялі агітацыйную работу сярод сялян. У чэрвені 1920 г. партызанскі атрад Паланейчыка разам з Чырвонай арміяй удзельнічаў у фарсіраванні Бярэзіны каля мястэчка Ялізава і вызваленні Асіповіч. З ліпеня 1920 г. на партыйнай рабоце. Забіты бандытамі. Пахаваны на радзіме.

СТАШКЕВІЧ Аляксандр Якаўлевіч. Нарадзіўся ў 1898 г. у Асіповічах. У 1920 г. арганізаваў на чыгуначным вузле камсамольскую ячэйку з 20 чалавек, добраахвотна ўступіў у атрад асобага прызначэння, які вёў барацьбу з сабатажам і бандытызмам на чыгуначным вузле. 27 кастрычніка 1920 г. на чыгуначнай станцыі Градзянка быў цяжка паранены і захоплены бандытамі ў палон. Пасля катаванняў расстраляны 28 кастрычніка 1920 г. У 1969 г. на магіле пастаўлены абеліск. Яго імем названа вуліца ў Асіповічах.

ЧУМАКОЎ Акім Мацвеевіч. Машыніст паравоза Асіповіцкага чыгуначнага вузла. 27 жніўня 1922 г. яму было даручана даставіць з Слуцка ў Асіповічы эшалон, у якім адзін вагон быў з каштоўнасцямі. У гэты час у раёне паміж Асіповічамі і Старымі Дарогамі дзейнічалі разбойныя групы Пташынскага і Цвіркі, якія рабавалі насельніцтва. Банда дазналася аб вагоне з каштоўным грузам. На раз'ездзе Пасекі бандыты вывелі са строю чыгуначную сувязь, разабралі стыкі рэек і, прывязаўшы да рэйкі вяроўку, каб яе сарваць з месца, заляглі ў чаканні цягніка. Чумакоў здалёк заўважыў пашкоджаныя пуці і збавіў рух

цягніка. Бандытам не ўдалося сарваць з месца рэйку, бо яна ўрэзалася ў шпалу, і цягнік прайшоў перашкоду. Але адзін з бандытаў паспеў ускочыць на прыступку паравоза і запатрабаваў спыніць цягнік. У адказ машыніст толькі павысіў хуткасць. Тады бандыт выстраліў у яго 2 разы. Цяжка паранены, сыходзячы крывёю Чумакоў працягваў весці састаў, пакуль не вывеў яго ў бяспечнае месца. Выратаваць жыццё адважнага машыніста не ўдалося. 29 жніўня 1922 г. жыхары Асіповіч правялі А.М.Чумакова ў апошні шлях. Вялікай сям'і Чумакова, якая засталася без кармільца, па рашэнні беларускага ўрада бязвыплатна быў перададзены дом на вул. Серпухаўскай (пазней была перайменавана ў вуліцу А.М.Чумакова). Да 50-й гадавіны савецкай улады імем Чумакова быў названы цеплавоз станцыі Асіповічы, а на лакаматыўным дэпо адкрыта мемарыяльная дошка.

* * *

АКТЫЎНЫЯ ЎДЗЕЛЬНІКІ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ

АЗАРОНАК Міхаіл Іванавіч, н. у 1893 у в. Кассё Свіслацкай воласці, удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, рэвалюцыі 1917, служыў на Балтыйскім флоце, удзельнік паходу з Гельсінгфорса ў Кранштат, качагар эсмінца «Аўтраіл» у 1918. З усім экіпажам «Аўтраіла» трапіў ў палон да англічан 27.12.1918, калі ў баі каля Таліна эсмінец быў пашкоджаны і захоплены караблямі інтэрвентаў.

Увечары 26.12.1918 г. з Кранштата выйшаў у мора эсмінец «Аўтраіл» з задачай: сумесна з эсмінцам «Спартак», які выйшаў у мора раніцай, адшукаць праціўніка на Рэвельскім (Талінскім) рэйдзе, абстраляць берагавыя аб'екты, а потым адысці пад прыкрыццё лінкора «Андрэй Першазванны» і крэйсера «Алег». Каля 14 гадзін 27 снежня «Спартак» сеў на банку (каменная падводная града) Курадзімуна (Дзебельсей), калі з боем адыходзіў ад 2 англійскіх крэйсераў і эсмінца, дзе і быў захоплены англічанамі.

Эсмінец «Аўтраіл» каля 11 гадзін на мерыдыяне вострава Рамусор заўважыў некалькі англійскіх караблёў і стаў адыходзіць. У 12 гадзін 25 мінут у раёне вострава Мохні (Эхкольм) «Аўтраіл» быў абстраляны крэйсерам і 2 эсмінцамі, якія ішлі з усходу. Атрымаўшы пашкоджанні, «Аўтраіл» праз паўгадзіны быў захоплены праціўнікам.

Нашы лінкор і крэйсер, не маючы радыёсувязі з эсмінцамі, вярнуліся ў Кранштат. Захопленыя эсмінцы англічане перадалі Эстоніі, такім чынам 251 марак апынуўся ў палоне. З студзеня і 4 лютага 1919 г. 36 маракоў-камуністаў былі расстраляны на востраве Нойсаар (Нарген), многія памерлі ад голаду ці замерзлі. У 1919 – 1920 гг. з палону ўцяклі 94 маракі. Лёс паланёнага М.І.Азаронка высветліць пакуль не ўдалося. (Расійскі дзяржаўны архіў Ваенна-марскога флоту. Ф. 402. Воп. 1. Спр. 373. Л. 1 – 8.)

АЛЬХАВЕЦ Сямён Міронавіч, н. у 1895, з мая 1918 па снежань 1921 служыў у Чырвонай арміі. Прымаў актыўны ўдзел у фарміраванні 25-й стралковай Чапаеўскай дывізіі, у яе складзе на пасадзе камандзіра эскадрона 1-га коннага палка актыўна ўдзельнічаў у барацьбе супраць войскаў Калчака. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны пайшоў у партызаны і на пасадзе камандзіра, а потым камісара партызанскага атрада імя Кірава актыўна ваяваў супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі «Партызану Айчыннай вайны» I і II ступеней, «За перамогу над Германіяй», «За доблесную працу ў Айчыннай вайне 1941 – 1945 гг.».

АЛЯХНОВІЧ Рыгор Ісідаравіч, н. у 1894 у в. Вязычын. Праходзіў службу памочнікам выкладчыка класа электрыкаў Балтыйскага флоту ў Кранштаце. Удзельнічаў у 1919 у абароне Петраграда ад войскаў генерала Юдзеніча. Унтэр-афіцэр.

АНДРОСІК Піліп Іванавіч, н. у 1897. З 1917 чырвонаармеец 611-га Кунгурскага палка 36-й дывізіі. Ваяваў супраць белагвардзейцаў. Быў паранены ў баях на р. Пціч. Лячыўся ў шпіталі ў Кіеве, потым у Арле. Пасля выздараўлення з 1918 па 1919 у складзе 25-й стралковай Чапаеўскай дывізіі ўдзельнічаў у баях пад Аляксандравым-Гаем, радавы, быў паранены паўторна і знаходзіўся на лячэнні ў г. Самара. З 1920 па 1921 ваяваў на Заходнім фронце радавым асобнага батальёна 8-й дывізіі. Узнагароджаны медалём «За адвагу».

АНДРЫЕВІЧ Пётр Дзмітрыевіч, н. у 1896. Праходзіў службу з 1918 па 1922 у кавалерыйскім палку. Пражываў у в. Вяззе.

АРЦЁМ'ЕЎ Іосіф Акімавіч, н. у 1901. З сакавіка 1920 па 1922 служыў у арміі чырвонаармейцам 13-га стралковага палка 5-й Віцебскай дывізіі. Актыўна ўдзельнічаў у ліквідацыі банд. У час Вялікай Айчыннай вайны з 1943 у дзеючай арміі. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу», «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй».

БАРАЗНА Сцяпан Паўлавіч, н. у 1898. У 1917 быў выбраны старшынёй палкавога рэвалюцыйнага Савета 736-га кавалерыйскага палка. У складзе палка ўдзельнічаў у баях на Паўднёвым фронце пад камандаваннем К.Я.Варашылава. У 1929 г. 736-ы полк быў аб'яднаны з 1-й Коннай арміяй, у складзе якой удзельнічаў у ліквідацыі белапалякаў.

БАРЫСЕВІЧ Іван Апанасавіч, н. у 1901. Праходзіў службу ў Чырвонай арміі з 1922 па 1924. Пражываў у г. Асіповічы.

БАРЫСЕВІЧ Міхаіл Іосіфавіч, н. у 1900. Праходзіў службу ў Чырвонай арміі з 1919 па 1925. Пражываў у г. Асіповічы.

БЕЛЫ Павел Іосіпавіч, н. у 1900 у в. Ясень. Праходзіў службу з 1917 па 1922. Прымаў удзел у барацьбе супраць белапалякаў.

БЛІЗНЕЦ Іван Сямёнавіч, н. у 1894. Будучы радавым 36-га палка 1-га грэнадзёрскага корпуса, у лістападзе 1917 перайшоў на бок Чырвонай арміі. У 1918 у складзе 1-й Коннай арміі ваяваў супраць белапалякаў. У 1922 быў дэмабілізаваны. Прымаў удзел у Вялікай Айчыннай вайне. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

БОНДАР Сцяпан Максімавіч, н. у 1896. З лістапада 1917 служыў у Чырвонай арміі радавым. Прымаў удзел у ваенных аперацыях супраць белагвардзейцаў пад Пінскам. З ліпеня 1944 служыў у 563-м двойчы Чырванасцяжным Смаленскім стралковым палку снайперам. Пасля ранення ў ліпені 1945 быў дэмабілізаваны. Узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі».

ВАДАХОДАЎ Савелій Сцяпанавіч, н. у 1895. Праходзіў службу з 1918 па 1921. Жыў у г. Асіповічы.

ВАСІЛЬЕЎ Майсей Васільевіч, н. у 1899. Праходзіў службу ў Чырвонай арміі з 1919 па 1922. Жыў у г. Асіповічы.

ВЯЧАСЛАВАЎ Аляксандр Ільіч, н. у 1896 у Гатчынскім р-не Ленінградскай вобл. Праходзіў службу з 1919 па 1920. Служыў на браняпоездзе № 21, які дзейнічаў у раёне Мурманска супраць англійскіх інтэрвентаў. На пасадзе камандзіра ўзвода ваяваў пад Нарвай супраць Юдзеніча. З 1920 па 1921 браняпоезд знаходзіўся ў Петраградзе. З 1941 па 1945 ваяваў на франтах Айчыннай вайны. Узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй», «За перамогу над Японіяй».

ГАДЛЕЎСКІ Сямён Піліпавіч, н. у 1892. Удзельнік грамадзянскай вайны. Жыў у г. Асіповічы.

ГАРЭЙНАЎ Аляксандр Мікалаевіч, н. у 1895. Праходзіў службу з 1917 па 1922. Жыў у г. Асіповічы.

ГАЦМАН Фёдар Лявонавіч, н. у 1897. Удзельнічаў у грамадзянскай вайне з 1920 па 1921. Жыў у в. Убалацце.

ДАВІДОВІЧ Іван Майсеевіч, н. у 1895. З верасня 1921 па снежань 1922 служыў чырвонаармейцам 58-га стралковага палка. Прымаў удзел у баях за вызваленне Украіны, у ліквідацыі банд. У гады Вялікай Айчыннай вайны партызан атрада «За Савецкую Беларусь». Узнагароджаны медалямі «За адвагу», «Партызану Айчыннай вайны» II ступені, «За перамогу над Германіяй».

ДЗІВАК Сямён Уласавіч, н. у 1899. З 1918 па 1923 служыў у асобнай Каўказскай Рабоча-Сялянскай арміі 28-й дывізіі чырвонаармейцам. Актыўна ваяваў супраць войскаў Дзянікіна, Урангеля. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны медалямі «За адвагу» (двойчы), «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй», Граматай Рэўваенсавета.

ДЗМІТРЫЕВА Софія Андрэеўна, н. у 1902. Праходзіла службу з 1918 па 1920 у 156-м стралковым палку. Жыла ў р.п. Градзянка.

ДЗЯГЦЯР Іван Рыгоравіч, н. у 1898. З 1 верасня 1917 па красавік 1921 служыў чырвонаармейцам 28-га стралковага палка 1-й стралковай дывізіі. У 1919 ваяваў супраць арміі Калчака, затым да 1921 — супраць арміі Урангеля. У 1921 дэмабілізаваны па стане здароўя.

ДОЎГАЛЬ Уладзімір Іосіфавіч, н. у 1901. Праходзіў службу з 1922 па 1923. Жыў у г. Асіповічы.

ДОЎГІ Аляксандр Міхайлавіч, н. у 1898. Удзельнічаў у баявых дзеяннях з

1919 па 1920 у г. Асіповічы супраць белапалякаў. Жыў у в. Тарасавічы.

ДОЎГІ Андрэй Барысавіч, н. у 1899. Удзельнічаў у грамадзянскай вайне з 1920 па 1921. Жыў у в. Тарасавічы.

ДОЎГІ Максім Кузьміч, н. у 1897. Праходзіў службу з 1916 па 1919 у 124-м Варонежскім пяхотным палку, потым у 80-м стралковым палку. Жыў у г. Асіповічы.

ДУБОВІК Антон Васільевіч, н. у 1901. Удзельнічаў у 1920 у баях з Польшчай. Жыў у в. Карытнае.

ДУРЭЦ Зэлік Іоселевіч, н. у 1897. Са снежня 1917 па май 1922 служыў у Чырвонай арміі, спачатку радавым чырвонагвардзейскага атрада Дыбенкі, затым чырвонаармейцам 367-га палка 13-й арміі. Удзельнічаў у баях супраць сіл контррэвалюцыі, у ліквідацыі банд. Узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

ЕРЛІК Рыгор Іванавіч, н. у 1897. З 1916 па 1919 служыў у арміі ў 123-м пяхотным палку сувязістам. У лістападзе 1917 перайшоў на бок рэвалюцыі. У складзе палка прымаў удзел у разгроме арміі Юдзеніча, у разгроме белагвардзейскіх банд Ананьеўскай воласці на Тамбоўшчыне. З кастрычніка 1942 па чэрвень 1944 — радавы партызан атрада імя Катоўскага партызанскага атрада імя Шашуры. Узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі».

ЖАЛЕЗНЯКОЎ Павел Іванавіч, н. у 1896. Са жніўня 1919 па жнівень 1920 служыў у Чырвонай арміі памочнікам камандзіра ўзвода 56-га стралковага палка 20-й стралковай дывізіі. У жніўні 1924 быў накіраваны на курсы малодшага камсастава. У складзе курсантаў удзельнічаў у задушэнні Кранштацкага мяцяжу. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, медалём «За перамогу над Германіяй».

ЖУК Яфім Сцяпанавіч, н. у 1895. Удзельнік грамадзянскай вайны з 1918 па 1922. Жыў у в. Камарына.

ЗАСУЛЬКА Андрэй Нічыпаравіч, н. у 1903. У маі 1918 добраахвотна пайшоў у Чырвоную армію. Служыў радавым у 153-м стралковым палку 17-й стралковай дывізіі. У складзе палка прымаў удзел у баявых аперацыях супраць нямецкіх акупантаў, у разгроме банды Пятлюры, супраць белапалякаў. Удзельнічаў у барацьбе з бандытызмам у раёне г. Мазыр.

ЗАЦЯПЛІНСКІ Леанід Мікалаевіч, палкоўнік царскай арміі. У Чырвонай арміі з 1918. У 1919 камандзір 9-га пагранічнага палка. Ваяваў супраць белапалякаў пад Пінскам, Ляхавічамі, Сіняўкай, Баранавічамі, арганізоўваў дапамогу мясцовым партызанам. Жыў у г. Асіповічы.

ЗІНАВЕНКА Мікалай Ануфрыевіч, н. у 1898. У час грамадзянскай вайны праходзіў службу ў 128-м артылерыйскім палку. Жыў у р.п. Градзянка.

ЗІНАВЕНКА Пётр Дзмітрыевіч, н. у 1897. У 1918 добраахвотна пайшоў на службу ў Чырвоную армію. У ліпені 1919 удзельнічаў у баях супраць белапалякаў, затым на пасадзе камандзіра ўзвода накіраваўся на нарыхтоўку харчавання і фуражу для арміі. У 1920 быў прызначаны камандзірам 6-й роты 2-га батальёна 16-й арміі, займаўся нарыхтоўкай харчавання для арміі. У канцы 1920 быў накіраваны на станцыю Дно для работы ў органах чыгуначнай міліцыі.

ІЖЭЎСКІ Часлаў Антонавіч, н. у 1893. Праходзіў службу з 1918 па 1920, удзельнічаў у баях супраць інтэрвентаў у 1-м кавалерыйскім палку Латышскай дывізіі. Жыў у в. Малая Грава.

КАБАНАЎ Антон Іосіфавіч, н. у 1892. У лютым 1919 уступіў у рады Чырвонай арміі. Пасля заканчэння курсаў кулямётчыкаў з мая 1919 па студзень 1920 прымаў удзел у баях у складзе кулямётнага эскадрона 21-га кавалерыйскага палка 4-й кавалерыйскай дывізіі. У баях супраць войскаў Дзянікіна пад г. Батайск быў паранены і з лютага па красавік 1920 знаходзіўся на лячэнні ў г. Пенза. Пасля выздараўлення праходзіў службу ў 65-м стралковым палку 8-й стралковай дывізіі, ваяваў супраць белапалякаў. У 1921 удзельнічаў у задушэнні Кранштацкага мяцяжу, затым у барацьбе з бандытызмам на тэрыторыі Мазырскага павета. У час Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у партызанскім руху ў складзе атрада «Слава». Узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «Партызану Айчыннай вайны» I ступені, «За перамогу над Германіяй».

КАВАЛЬСКІ Рыгор Сямёнавіч, н. у 1895. У 1918 паступіў працаваць рабочым на завод у г. Бежыца Бранскай вобл. па будаўніцтве бронепаяздоў. З лютага 1920 на браняпоездзе № 91 артылерыстам прымаў удзел у разгроме войскаў Дзянікіна на

Украіне ў г. Праскураў, Жмерынцы, Пяціхатках, затым з чэрвеня па снежань 1920 артылерыстам браняпоезда № 38 «Данецкі камуніст» змагаўся з белапалякамі. Узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі».

КАЗЛОЎСКІ Дзмітрый Антонавіч, н. у 1891. З красавіка 1918 па снежань 1921 працаваў загадчыкам радыёстанцыі, спачатку ў г. Растоў Яраслаўскай губерні, затым са снежня 1918 у г. Магілёў, з лістапада 1919 — у г. Шадрын Екацярынбургскай губерні. Са снежня 1921 па май 1926 працаваў кіраўніком спраў і радыстам павятовага камітэта РКП(б) у г. Слуцк. Узнагароджаны медалямі «За працоўную доблесць», «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.».

З успамінаў Дз.А.Казлоўскага

...У 1913 г. быў прызваны ў царскую армію. З Бабруйска, адкуль пачыналася служба, быў пераведзены ў Кранштат, на флот...

У 1915 г. атрымаў накіраванне ў школу радыётэлеграфістаў, па заканчэнні ў званні унтэр-афіцэра апынуўся на мінаносцы «Вершнік».

Наш карабель прымаў удзел у розных аперацыях Балтыйскага флоту, але найбольш запомнілася адна — паляванне за нямецкім крэйсерам.

У тым баі «Вершнік» атрымаў некалькі пападанняў буйнакаліберных снарадаў. Германскімі «гасцінцамі» эсмінец быў пашкоджаны, экіпаж панёс страты забітымі і параненымі. Не пашанцавала і мне — з раненнем давялося паляжаць у шпіталі.

Пасля выздараўлення мяне чакала новае месца службы — лінейны карабель «Гангут». Экіпаж лінкора лічыўся ў камандавання флоту небяспечным: яшчэ ў 1915 г. матросы ўзнялі паўстанне, але яно было знішчана вернымі прысязе войскамі.

У перыяд Кастрычніцкай рэвалюцыі амаль увесь экіпаж карабля перайшоў на бок бальшавікоў. З таго вірлівага часу запомніліся сустрэча з У.І.Леніным, яго зварот да салдат і матросаў і першае заданне новага рэвалюцыйнага ўрада: мне было загадана ўзначаліць групу па ахове партыі электрарухавікоў, што перапраўляліся з Фінляндыі ў Петраград.

Жыццё ў той час было хуткім і непрадказальным: у 1918 г. я працаваў радыётэлеграфістам у г. Растоў-Яраслаўскі, праз год узначаліў кантрольна-шыфравальную станцыю ў Магілёве. Пасада была вельмі адказная: станцыя забяспечвала сувязь Масквы з усёй Еўропай.

У кастрычніку 1919 г. удзельнічаў ва ўзнаўленні радыёсувязі па тэрыторыях, што вызваляліся Чырвонай арміяй. Давялося пад час гэтай работы і паваяваць з калчакаўскімі войскамі...

КАЗЮЧЫЦ Іван Рыгоравіч, н. у 1900. Са жніўня 1920 па май 1921 служыў чырвонаармейцам штаба 5-й дывізіі, удзельнічаў у баях супраць сіл контррэвалюцыі пад Харкавам. Затым праходзіў службу ў чыгуначных войсках у гарадах Жлобін і Бабруйск.

КАМАРОЎСКІ Антон Міхайлавіч, н. у 1894. Праходзіў службу ў Чырвонай арміі з 1917 па 1924. Жыў у г. Асіповічы.

КАНДРАЦЕНКА Іван Іванавіч, н. у 1898. Служыў з мая 1917 старшым унтэрафіцэрам 1-й Сібірскай стралковай брыгады. Затым стралок рэвалюцыйнага партызанскага атрада, са студзеня 1918 начальнік сувязі 92-га артдывізіёна 32-й Туркестанскай стралковай дывізіі. Акгыўна ўдзельнічаў у баях супраць белапалякаў, у ліквідацыі банд басмачоў. З сакавіка па май 1920 начальнік сувязі атрада чырвоных партызан, які дзейнічаў у Бабруйскім павеце. З мая 1920 па люты 1921 камандзір эскадрона тэхнічнай сувязі асобнай Башкірскай кавалерыйскай брыгады Заходняга фронту. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй», «За перамогу над Японіяй».

КАНДРАЦЬЕЎ Яўген Піліпавіч, н. у 1901. Праходзіў службу ў Чырвонай арміі з 1919 па 1922. Жыў у г. Асіповічы.

КАРАЛЬКЕВІЧ Міхаіл Міхайлавіч, н. у 1900. Са жніўня па снежань 1923 служыў у Чырвонай арміі радавым 16-га стралковага палка 8-й стралковай дывізіі. Прымаў удзел у разгроме контррэвалюцыйных мяцяжоў і ліквідацыі банд. У перыяд Вялікай Айчыннай вайны працаваў у г. Чэлябінск начальнікам цэха в/ч 54779 па вырабе лыжаў, а з мая 1942 па жнівень 1945 — парторгам 70-й батарэі зенітнага батальёна 3-й Паветранай арміі. Узнагароджаны двума медалямі «За баявыя заслугі», медалём «За перамогу над Германіяй».

КАРНУШЭНКА Емяльян Кузьміч, н. у 1901. У 1918 яшчэ да прызыву ў армію ў складзе партызанскага атрада пад кіраўніцтвам Батракова змагаўся з белапалякамі. У 1920 быў прызваны ў Чырвоную армію. Служыў у кавалерыйскім палку ў Мінску да 1924. Пасля дэмабілізацыі служыў у міліцыі, прымаў удзел у ліквідацыі банд.

КОЙПІШ Захар Савельевіч, н. у 1893. З 1917 працаваў старшынёй выканкома 50-га артдывізіёна 10-й арміі. З 1918 па 1919 служыў у Чырвонай арміі на пасадзе камандзіра граматы 1-й Арлоўскай батарэі Звенігародскага палка. У складзе палка ўдзельнічаў у баях супраць Калчака і Урангеля. З 1919 па 1922 служыў старшыной каманды кіравання дывізіёна.

КОШАЛЬ Фёдар Іосіфавіч, н. у 1900. З 1918 да канца 1922 служыў у Чырвонай арміі радавым 1-й Коннай арміі, затым разведчыкам 78-га браняпоезда. Прымаў удзел у барацьбе з белапалякамі ў раёне г. Маладзечна, у ліквідацыі банд. Узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі».

КУРС Андрэй Мацвеевіч, н. у 1897. З 1918 па 1920 служыў чырвонаармейцам 1-га Ржэўскага савецкага атрада, у складзе якога ваяваў супраць арміі Калчака. У 1920 накіраваны ў школу каманднага саставу 34-й стралковай дывізіі ў г. Омск. У 1923 быў дэмабілізаваны. Узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі».

КУРС Гаўрыіл Піліпавіч, н. у 1898. Удзельнічаў у баях з інтэрвентамі з 1918 па 1919. Жыў у в. Канцы.

КУРЫЛЬЧЫК Мікалай Пятровіч, н. у 1904. З 1919 добраахвотна ўступіў у рады Чырвонай арміі. Змагаўся радавым у складзе 1-й кулямётнай каманды 95-га палка 32-й брыгады 15-й арміі на Заходнім фронце супраць белапалякаў, з баямі прайшоў да Варшавы. Па заканчэнні баявых дзеянняў з белапалякамі ў складзе свайго палка быў накіраваны ў Царскае Сяло. У сакавіку 1921 удзельнічаў у задушэнні Кранштацкага мяцяжу. За баявыя заслугі быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. У баі быў паранены і знаходзіўся на лячэнні ў шпіталі ў г. Кранштат. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, двума медалямі «За баявыя заслугі», медалямі «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй», «За перамогу над Японіяй».

ЛАЦІННІК Якаў Васільевіч, н. у 1898. Удзельнічаў у баях з інтэрвентамі ў 1920. Жыў у в. Жыцін.

ЛЕЙЧЫК Мітрафан Якаўлевіч, н. у 1900. У 1918 добраахвотна пайшоў у Чырвоную армію і служыў у 20-й Самарскай пяхотнай дывізіі, у складзе якой ваяваў пад Уфой супраць арміі Калчака. У 1919 быў пераведзены ў 4-ю пяхотную дывізію, якая была накіравана ў Беларусь для барацьбы з белапалякамі. Пасля выгнання белапалякаў удзельнічаў у ліквідацыі банд. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны медалямі «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй».

ЛУКІЕНКА Якаў Фядотавіч, н. у 1905. З лістапада 1919 па люты 1921 служыў радавым атрада часцей асобага прызначэння, прымаў удзел у ліквідацыі контррэвалюцыйных мяцяжоў у Паўночна-Казахстанскай вобласці ў раёне Какчэтава. У перыяд Вялікай Айчыннай вайны ваяваў на Заходнім, Сталінградскім, Украінскіх, Беларускіх франтах. Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі», «За абарону Масквы», «За абарону Сталінграда», «За перамогу над Германіяй».

МАЗАЛЕЎСКІ Антон Віктаравіч, н. у 1903 у Пухавіцкім р-не Мінскай вобл. У 1921 праходзіў службу ў 24-м артылерыйскім дывізіёне 8-й дывізіі, удзельнічаў у ліквідацыі банды Булак-Балаховіча.

МАЛАХАЎ Іван Якаўлевіч, н. у 1899. Праходзіў службу з 1919 па 1922. Жыў у г. Асіповічы.

МАЛЯРЭВІЧ Аляксандр Пахомавіч, н. у 1897. Удзельнічаў у баявых дзеяннях у складзе 14-га стралковага палка 2-й стралковай дывізіі. Жыў у р.п. Градзянка.

МАМСІКАЎ Еўдакім Рыгоравіч, н. у 1892. З ліпеня 1919 па лістапад 1920 служыў у Чырвонай арміі на пасадзе камандзіра ўзвода 301-га стралковага палка Самарскай ваеннай акругі. Прымаў актыўны ўдзел у разгроме белагвардзейскіх войскаў Урангеля. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», медалямі «За абарону Ленінграда», «За перамогу над Германіяй».

МІХНАВЕЦ Іван Яфімавіч, н. у 1903. З чэрвеня 1920 па сакавік 1921 чырвонаармеец-добраахвотнік 74-га кавалерыйскага палка. У складзе палка прымаў актыўны ўдзел у ліквідацыі банды Шышкіна ў Сяміпалацінскай вобласці, у задушэнні паў-

стання басмачоў. Узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «За абарону Сталінграда», «За перамогу над Германіяй».

НОВІК Барыс Якаўлевіч, н. у 1893. У 1918 уступіў у партызанскі атрад, якім камандаваў Дз.Х.Пінчук. Вялі барацьбу з нямецкімі акупантамі. У жніўні 1919 быў прызваны ў Чырвоную армію. Служыў у 1-й Коннай арміі. Ваяваў з белапалякамі. У 1920 пад Кіевам быў паранены. Пасля лячэння служыў пры штабе 12-й арміі. У 1921 быў дэмабілізаваны.

ПАНЧАНКА Сяргей Несцеравіч, н. у 1899. Удзельнічаў у баявых дзеяннях з 1919 па 1921 у складзе 1-га Сібірскага стралковага палка, вызваляў г. Царыцын. Жыў у в. Ясянец.

ПАПОЎ Міхаіл Мікалаевіч, н. у 1901. З 1918 па снежань 1926 служыў у Чырвонай арміі, удзельнічаў у задушэнні эсэраўскага мяцяжу ў Курскай вобл., ліквідацыі банд у Арлоўскай вобл. Удзельнічаў у баях на Паўднёвым фронце, у ліквідацыі банд басмачоў. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

ПАПОЎ Сяргей Сцяпанавіч, н. у 1900. У верасні 1919 быў прызваны ў Чырвоную армію. Служыў у 72-м стралковым палку 8-й дывізіі да кастрычніка 1922. У 1919 прымаў удзел у вызваленні Беларусі ад белапалякаў. Узнагароджаны двума медалямі «За баявыя заслугі».

ПАРШЫН Дзмітрый Антонавіч, н. у 1902. Са студзеня 1919 працаваў інспектарам у Дзернавіцкім валасным рэўкоме. У жніўні 1919 добраахвотна пайшоў у Чырвоную армію. Спачатку служыў у батальёне асобага прызначэння пры Гомельскім губЧК. З кастрычніка 1919 па красавік 1920 служыў у 2-м Гомельскім крапасным палку. З красавіка 1920 па сакавік 1921 служыў у 404 м стралковым палку. У складзе гэтых ваенных часцей удзельнічаў у баях супраць польскіх легіянераў Доўбар-Мусніцкага на участку Бабруйск—Жлобін, супраць Дзянікіна, Урангеля і белапалякаў. З верасня 1921 памочнік упаўнаважанага па барацьбе з бандытызмам. Узнагароджаны медалямі «За працоўную доблесць», «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.».

ПАТАШЕЙКА Андрэй Міронавіч, н. у 1899. Са жніўня 1919 па май 1922 служыў

Ф.М.Паўлюц.

у Чырвонай арміі ў 8-м стралковым пагранічным палку. У складзе палка прымаў удзел у разгроме арміі Юдзеніча пад Петраградам, а са снежня 1921 па май 1922 ваяваў супраць белапалякаў. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны», медалямі «За адвагу», «Партызану Айчыннай вайны» II ступені, «За перамогу над Германіяй».

ПАТОЦКІ Іван Кандратавіч, н. у 1878. З верасня 1917 па красавік 1919 служыў чырвонаармейцам 60-га Маскоўскага чырвонагвардзейскага зборнага атрада, затым да студзеня 1924 камісарам у г. Бахмач. Актыўна ўдзельнічаў у задушэнні контррэвалюцыйнага мяцяжу, у ліквідацыі банд. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, медалямі «Партызану Айчыннай вайны» I ступені, «За перамогу над Германіяй».

ПАЎЛОВІЧ Якаў Георгіевіч, н. у 1897. У сакавіку 1918 добраахвотна пайшоў у Чырвоную армію ў першы Самарскі сялянскі полк 52-й стралковай дывізіі, у складзе якога прымаў удзел у барацьбе супраць інтэрвентаў. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны медалямі «За ўзяцце Кёнігсберга», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй».

ПАЎЛЮЦ Франц Міхайлавіч, н. у 1887. Марак Балтыйскага флоту, удзельнічаў у абароне Петраграда. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Жыў у г. Асіповічы.

ПЕРУНОЎСКІ Мікалай Антонавіч, н. у 1896. З ліпеня 1918 па студзень 1920 наводчык гарматы 1-га кавалерыйскага палка 1-й Коннай арміі, у складзе якога ўдзельнічаў у баях на Заходнім фронце. Узнагароджаны медалямі «За працоўную доблесць», «За перамогу над Германіяй».

ПІЛЕЦКІ Іосіф Васільевіч, н. у 1898. Удзельнічаў у баявых дзеяннях з 1920 па 1922 у складзе 1-й Коннай арміі.

ПІНЧУК Марк Кандратавіч, н. у 1900. З 1918 па 1920 знаходзіўся ў партызанскім атрадзе, які дзейнічаў на тэрыторыі Дараганаўскага сельсавета. У складзе атрада вёў актыўную барацьбу супраць польскай жандармерыі, удзельнічаў у зрыве карабельных аперацый польскіх акупантаў. Узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй».

З успамінаў М.К.Пінчука

... У лютым 1918 г. тэрыторыя сучаснага Дараганаўскага сельсавета была захоплена нямецкімі войскамі. Акупанты ўстанавілі рэжым жорсткага прыгнёту мясцовых жыхароў, я ў гэты час працаваў батраком у памешчыцы Дараган...

Для барацьбы з германцамі была створана падпольная група, у якую ўваходзілі: Барыс Якаўлевіч Новік з в. Мязовічы, Цярэнцій Дзям'янавіч Пінчук і Павел Прохаравіч Кузьміч з в. Крынка, Антон Фёдаравіч Пінчук з в. Камарына і я. Кіраваў нашай групай Дзям'ян Харытонавіч Пінчук. Ён меў сувязь з Бабруйскім падпольным цэнтрам, які ўзначальваў П.Дз.Малаковіч.

Такія ж падпольныя групы былі ўтвораны ў вёсках Жыцін, Майсеевічы, Краі, Птушычы, Радуцічы.

Падпольшчыкі актыўна змагаліся з акупантамі: праводзілі дыверсіі, знішчалі прадуктовыя абозы.

Пасля капітуляцыі Германіі ў 1919 г. на нашу зямлю прыйшла польская армія. Пры новых акупантах становішча мясцовага насельніцтва амаль не змянілася: новая ўлада нічым не адрознівалася ад папярэдняй.

Падпольную арганізацыю ў гэты час узначальваў Трубачоў (імя, на жаль, не памятаю), а памочнікам у яго быў Васіль Іларыёнавіч Яршэвіч. (Пад час Вялікай Айчыннай вайны былы падпольшчык быў забіты ў Бабруйскім лагеры ваеннапалонных.) Наша група падпарадкоўвалася мінскаму цэнтру і вяла актыўную барацьбу супраць польскай жандармерыі, праводзіла дыверсіі на шляхах зносін і лініях сувязі, што праходзілі паблізу, зрывала карныя экспедыцыі акупацыйнай адміністрацыі.

Пасля выгнання белапалякаў я да 1923 г. служыў у чыгуначнай міліцыі, прымаў удзел у ліквідацыі антысавецкага супраціўлення, што пэўны час існавала на тэрыторыі Асіповіцкага раёна.

ПРЫШЫВАЛКА Канстанцін Пятровіч, н. у 1899. З 1919 па 1921 служыў у Чырвонай арміі ў 398-м стралковым палку 145-й пяхотнай дывізіі, у складзе якой прымаў удзел у баях супраць белапалякаў на Варшаўскім напрамку.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй».

ПЯНЬКОЎСКІ Фёдар Андрэевіч, н. у 1899. З верасня 1917 па 1922 служыў у Чырвонай арміі у 2-м Петраградскім палку. Прымаў удзел у баях супраць арміі Юдзеніча, у задушэнні Кранштацкага мяцяжу. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны медалямі «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй».

РУБІНШТЭЙН Ліпа Аронавіч, н. у 1891. Са студзеня 1918 па сакавік 1921 служыў у Чырвонай арміі радавым 17-га асобнага артылерыйскага палка ў Мінску. Прымаў удзел у баях супраць белапалякаў пад Барысавам і Радашковічамі. Узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі».

САСІНОЎСКІ Уладзімір Мікалаевіч, н. у в. Люлева Замошскай воласці. Матрос Балтыйскага флоту. У 1919 на эсмінцы «Звераў» у якасці інжынера-механіка ўдзельнічаў у абароне Петраграда.

СВІРЫД Клім Кузьміч, н. у 1897. З мая 1919 служыў у Чырвонай арміі ў 2-м артдывізіёне 18-й стралковай дывізіі заражаючым. Прымаў удзел у баях супраць інтэрвентаў пад Архангельскам, супраць белапалякаў на Варшаўскім напрамку, супраць дашнакоў у Арменіі.

У перыяд Вялікай Айчыннай вайны ваяваў на 1-м Беларускім фронце ў 20-й танкавай брыгадзе 11-га танкавага корпуса аўтаматчыкам. Узнагароджаны медалямі «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй».

СІКІЛІНДА Андрэй Гаўрылавіч, н. у 1901. 25 кастрычніка 1919 быў прызваны ў Чырвоную армію. Ваяваў у складзе 133-га стралковага палка 12-й арміі супраць войскаў Дзянікіна, удзельнічаў у ліквідацыі банд на Украіне. Потым змагаў-

ся супраць белапалякаў, бандытаў. Дэмабілізаваны ў 1924.

СТЭЛЬМАХ Аляксандр Мікалаевіч, н. у 1891. У перыяд 1-й сусветнай вайны ўдзельнічаў у баях з немцамі, быў узнагароджаны Георгіеўскім крыжам і медалём. З 1917 па 1921 служыў у Чырвонай арміі радавым, камандзірам узвода. Прымаў актыўны ўдзел у Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Петраградзе. Удзельнічаў у разгроме войскаў Юдзеніча. У 1921 у складзе 237-й стралковай роты ўдзельнічаў у задушэнні Кранштацкага мяцяжу. За актыўны ўдзел быў узнагароджаны 2 ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Чырвонай Зоркі.

СТЭЛЬМАХ Міхаіл Фёдаравіч, н. у 1898. З 1920 ваяваў супраць белапалякаў на Заходнім фронце. З кастрычніка 1920 служыў у чыгуначнай ахове на ст. Асіповічы да 1921. У лістападзе 1921 быў дэмабілізаваны. У сакавіку 1933 быў мабілізаваны ваенаай акругай і праслужыў у арміі да жніўня 1953 на розных пасадах. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

СТЭЛЬМАХ Надзея Пятроўна, н. у 1903. У 1920 прымала актыўны ўдзел у арганізацыі Пагарэльскага рэўкома, затым працавала сакратаром Пагарэльскага, Градзянскага сельскіх Саветаў. З 1938 да пачатку вайны працавала народным суддзёй. Узнагароджана медалём «За працоўную доблесць».

СУГАКА Антон Ільіч, н. у 1900. Удзельнічаў у баявых дзеяннях з 1918 па 1922 у складзе 105-га стралковага палка. Жыў у в. Дуброўка.

СУГАКА Лукаш Цімафеевіч, н. у 1893. Праходзіў службу з 1918 па 1920 у 79-м Сібірскім стралковым палку.

СЯНЮК Васіль Паўлавіч, н. у 1900. Удзельнік грамадзянскай вайны з 1920 па 1923. Жыў у г. Асіповічы.

СЯЦІНСКІ Аляксандр Антонавіч, н. у 1901. Удзельнік грамадзянскай вайны з 1918 па 1923. Жыў у г. Асіповічы.

ФІЛАТАЎ Пётр Сямёнавіч, н. у 1898. З лістапада 1917 да снежня 1922 — чырвонаармеец, спачатку 72-га стралковага палка, з ліпеня 1919 — харчаддзела. Удзельнічаў у баях супраць арміі Калчака. Узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі».

А.М.Стэльмах.

ХОМІЧ Максім Фёдаравіч, н. у 1889. Удзельнічаў у баявых дзеяннях з 1918 па 1922 у складзе 5-га артылерыйскага корпуса. Жыў у в. Вязаўніца.

ЦЫГАНОК Афанасій Сямёнавіч, н. у 1899. З сакавіка 1918 па верасень 1919 служыў у Чырвонай гвардыі, з верасня 1919 па кастрычнік 1922 — у Чырвонай арміі ў 7-м чыгуначным стралковым батальёне радавым байцом. Удзельнік Айчыннай вайны. Узнагароджаны медалём «За перамогу над Германіяй».

ЧАБАТАРОЎ Мікалай Афанасьевіч, н. у 1891. Са студзеня 1918 па снежань 1921 служыў у Чырвонай арміі чырвонаармейцам 5-й кавалерыйскай дывізіі. У складзе дывізіі актыўна ўдзельнічаў у баях супраць арміі Калчака і белагвардзейцаў. Са студзеня 1922 па верасень 1926 служыў у акружным аддзяленні міліцыі Бабруйска. Актыўна ўдзельнічаў у барацьбе з контррэвалюцыяй. У органах НКУС служыў да 1947 г. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, медалямі «За баявыя заслугі», «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.», «За перамогу над Германіяй».

ЧАРОПКА Мікіта Іосіфавіч, н. у 1896. З лістапада 1919 па сакавік 1923 служыў чырвонаармейцам штаба Заходняга фронту. Удзельнічаў у баях супраць белапалякаў, у ліквідацыі банд. Узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.».

ЧАРОПКА Пётр Васільевіч, н. у 1880 у в. Замошша Асіповіцкага р-на. Марак Балтыйскага флоту, машыніст лінкора «Севастопаль». У 1921 удзельнічаў у абароне Кранштата.

ШАВЯЛЁНАК Карл Гаўрылавіч, н. у 1898. З 1921 удзельнічаў у баях супраць арміі Калчака ў складзе Аршанскага палка. Жыў у в. Верайцы.

ШАРАМЕТ Фёдар Андрэевіч, н. у 1894. Служыў у радах Чырвонай арміі з 1918 па 1923 спачатку радавым 84-га стралковага палка, затым радавым у батальёне чыгуначнай аховы Заходняй чыгункі. Прымаў удзел у баях супраць белапалякаў, у барацьбе з бандытызмам. Узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

ШКЛЯНІК Якаў Міхайлавіч, н. у 1888. З лютага 1917 па красавік 1918 узначальваў бальшавіцкую ячэйку ў Ляхавіцкім р-не, з красавіка 1918 па верасень 1918 працаваў старшынёй рэўкома Ляхавіцкага р-на. Праводзіў вялікую работу па арганізацыі аддзелаў рэўкома, падборы кадраў, па барацьбе з ворагамі савецкай улады і аказанні дапамогі Чырвонай арміі харчаваннем, зброяй і мабілізацыяй добраахвотнікаў. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», медалём «За перамогу над Германіяй».

ШМІГЕЛЬСКІ Іван Міхайлавіч, н. у 1892 у в. Дубавое Асіповіцкага р-на. З 1920 удзельнічаў у баях супраць белапалякаў, будучы камандзірам кананерскай лодкі «Магутны» Дняпроўскай ваеннай флатыліі.

ШНАЙ Рыгор Іванавіч, н. у 1880 у в. Свіслач. У 1920 — буфетчык вучылішча камсаставу (цяпер ВМВ імя Фрунзе ў Санкт-Пецярбургу). 26.11.1920 памёр ад туберкулёзу лёгкіх, пахаваны на Смаленскіх могілках у Петраградзе.

ШЫШАЕЎ Віктар Васільевіч, н. у 1903. З мая 1918 па кастрычнік 1918 служыў у Волжскай ваеннай флатыліі на параходзе «Адважны». Удзельнічаў у баях супраць арміі Калчака. Актыўна ўдзельнічаў у барацьбе з контррэвалюцыяй, бандытызмам у р-не г. Царыцына. З мая 1922 па 1948 працаваў у органах дзяржбяспекі. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі «За абарону Сталінграда», «За перамогу над Германіяй».

ЯШЫНСКІ Віктар Уладзіміравіч, н. у 1898. У 1921 удзельнічаў у баявых дзеяннях у складзе 8-га стралковага палка.

Пры складанні спіса выкарыстаны звесткі раённай камісіі па падрыхтоўцы кнігі «Памяць», а таксама матэрыялы Расійскага дзяржаўнага архіва Ваенна-марскога флоту, падрыхтаваныя І.Я.Краўцовым.

Першая школа

З успамінаў Іны (Міхаліны) Буйло, роднай сястры беларускай паэтэсы Канстанцыі Буйло

«У Мінск прыехаў Керэнскі, па вуліцах ішлі дэманстранты. Керэнскі ехаў на грузавой машыне з апушчанымі бартамі і трымаў прамову... На вуліцах было шмат народу і ўсе слухалі яго...

Праз некалькі дзён у Мінск увайшлі немцы. Яны ішлі з аркестрам, што складаўся з якіхсьці свісцюлек. Народу на вуліцах было шмат, у тым ліку і я са Стасяй (сястрой. — *В.Х.*). З іх прыходам для нас насталі чорныя дні. Без працы і грошай... Сталі хадзіць па Мінску ў пошуку любой работы. Аднак дарэмна. Усе ўстановы зачыніліся, была безрабоціца... Вось тут Стася і ўспомніла пра княгіню Радзівіл. Учапілася за яе, як за якар выратавання. Пачалі думаць, як мы да яе пойдзем, што будзем казаць. Канешне, напомнім пра Костачку*, але галоўнае, што нас хвалявала, ці ў Мінску яна. Аднойчы мы падышлі да яе дома, убачылі старога ў ліўрэі, запыталі, ці тут княгіня. Адказаў, што тут. Назаўтра вырашылі пайсці да яе абедзве. Апрануліся ва ўсё лепшае, што ў нас было, і пайшлі з апошняй надзеяй, з жахам думаючы, што калі яна нам не дапаможа, мы загінулі!

Мы ўвайшлі ў пярэдні пакой. Пакаёўка сустрэла нас не вельмі прыязна, але пайшла далажыць. Мы сказалі, што сёстры беларускай паэтэсы Буйло. Нас паклікалі ў пакой да княгіні. Мы ўбачылі сівую, худзенькую, маленькую старую, сціпла адзетую, якая трымала на каленях сабачку. На яе пытанне, чаго нам патрэбна, мы выклалі нашу прапанову і папрасілі дапамагчы нам. Яна спытала, ці закончылі мы гімназію...

* Так ласкава сёстры звалі Канстанцыю Буйло.

Мы не задумаўшыся сказалі: «6 класаў». Чаму «6», не ведаю... Мы ж нават у калідоры гімназіі не былі. Спрацаваў інстынкт самазахавання. Яна нам паверыла і адказала: «Заўтра пойдзе мая падвода ў Кухцічы» (гэта непадалёк ад станцыі Негарэлае). І дадала, што Стасю яна адправіць туды навучаць дзяцей батракоў. Навучаць трэба па-беларуску, а галоўнае катэхізісу.

Мы пайшлі ад княгіні, не верачы свайму шчасцю. Мне паабяцала, што праз тыдзень адправіць у іншы маёнтак, і я павінна зайсці даведацца пра вынік...

Праз тыдзень я пайшла да княгіні і яна мне сказала, што заўтра едзе карэта ў Кухцічы, і яна пакуль адправіць мяне туды. Мяне пасадзілі ў карэту, запрэжаную чацвёркай цудоўных коней. Я села на сядзенне, а фурман у ліўрэі на козлы. Я ехала адна, і мяне ўразіла, што ў вёсках сяляне здымалі шапкі і кланяліся, думаючы, што ў карэце сядзіць вяльможа. А гэта я... убогая дзяўчынка, бяздомная. Так я дабралася да Кухцічаў. Гэта прыгожы маёнтак. Вялікі дом з калонамі... У доме было вельмі многа пакояў, усе пустыя, без мэблі. У другім канцы жыў стары лёкай з дачкой, мілай дзяўчынай гадоў 20... Ежу нам прыносілі з кухні, праўда, адзін абед на дваіх, прытым вельмі мізэрны. Але мы былі радыя таму, што ёсць работа і дах над галавой.

Я некалькі месяцаў пажыла ў Стасі без справы, чакала распараджэння княгіні. Тут таксама былі немцы. Але паводзілі сябе карэктна. Часта мы гулялі са Стасяй у парку, сустракалі нямецкіх афіцэраў, якія ветліва кланяліся...

Але вось у адзін цудоўны дзень мяне таксама па аказіі павезлі ў карэце ў маёнтак Жорнаўка Бабруйскага павета*. Жорнаўка — гэта вялікі аднапавярховы дом, ужо стары і не такі прыгожы, як у Кухцічах. Там мяне сустрэла «ахмістрыня», г.зн. ключніца. Далажыла, хто я, і яна мяне змясціла ў камфартабельны пакой з поўнай абстаноўкай, цудоўнай пасцеллю і бялізнай. У адным калідоры жыла я і яна. У другім канцы калідора жыла разведзеная графіня з двума хлопчыкамі і няней, з якой гэта самадурка страшэнна здзеквалася...

Мне адвялі пад школу асабняк, размешчаны за паўкіламетра ад сядзібы. Там былі чатыры цудоўныя асабнякі ў выглядзе лецішчаў, побач лес, і жыў ляснічы, немец Шталь з жонкай. Яна пазнаёмілася са мною, і я бывала ў іх у гасцях.

У школу прывезлі вялікія сталы і лаўкі, і я пайшла па парабках у пошуку вучняў, набралася чалавек трыццаць. Усе яны, на шчасце, былі ці зусім няграматныя, ці ледзь-ледзь чыталі і пісалі, у адваротным выпадку мне было б цяжка з «6-і класнай адукацыяй». Я вучыла дзяцей пісаць палкі, лічбы і крыху катэхізісу па загаду княгіні. Пасля ўрокаў я хадзіла з дзецьмі ў лес гуляць. Яны былі вельмі добрыя, паслухмяныя, ніякага свавольства, забітыя і сарамлівыя. Мяне ніхто не кантраляваў, ніхто не правяраў. Я была прадастаўлена самой сабе...

Калі я прыехала ў Жорнаўку, там стаялі немцы, яны займалі частку дома. Я з імі таксама пазнаёмілася, часта сустракалася ў парку, але размаўляць было цяжка.

Неяк ранкам... за мною прыехалі з Кухціч (там цяжка захварэла Стася. — *В.Х.*). Калі я вярнулася ў Жорнаўку, там ужо немцаў не было, прыйшлі польскія ўланы. Іх кіраўнік, нехта барон фон Ранке, прыпыніўшыся ў нашым доме, харчаваўся разам з намі. За стол садзіліся ён, юрыст (хутчэй за ўсё гэта быў Рыгор Царык. — *В.Х.*), пані Марыя, электрык і я. Харчаванне было тут вельмі добрае, не параўнаць, як у Кухцічах... Так прайшоў год. Лета і зіму я займалася з дзецьмі. Барон нават заляцаўся да мяне, ён быў цікавым...

К восені пачалі пагаворваць, што наступаюць чырвоныя. Газеты пісалі пра страшэнныя зверствы чырвоных у Расіі: шыбеніцы, забойствы, насілле, пажары і г.д. І вось у адзін цудоўны дзень спешна ад'язджаюць польскія войскі, у тым ліку Ранке. Да ганку дома сталі пад'язджаць карэты, фурманкі, і амаль у адзін дзень усе паехалі. Угаворвалі ехаць і мяне, але я вырашыла застацца з пані Марыяй (ключніцай. — *В.Х.*). Я баялася, што мяне чакае тое ж, што і ў Мінску. Тут таксама было страшна заставацца, калі верыць газетам...

Застаўшыся адны з пані Марыяй, мы вырашылі перабрацца з вялікага дому ў маленькі флігель ля дарогі з адным пакоем і кухняй. Школу сваю я таксама перабазіравала на сядзібу, туды, дзе жылі батракі, у адну свабодную кватэру. Пасля бегства ўсёй

* Аўтарка памыляецца. Жорнаўка адносілася да Ігуменскага павета.

знаці наступіла поўнае зацішша, як быццам усе гаварылі шэптам, поўнае безуладдзе працягвалася некалькі дзён. Я хадзіла ў школу, займалася з дзецьмі, а пані Марыя вяла нашу няхітрую гаспадарку... Адной-чы, калі я была ў школе з дзецьмі, прыйшла жанчына-парабэчка і сказала, што ідуць чырвоныя. Я вельмі спужалася...»

Голас Радзімы. 1997. 1, 8 мая.

Гады аднаўлення і сацыялістычных надзей

Пасля заканчэння грамадзянскай вайны Замошскі валасны камітэт партыі бальшавікоў, выканком валаснога Савета рабочых і сялянскіх дэпутатаў, партыйныя ячэйкі Асіповіцкага чыгуначнага вузла накіравалі свае намаганні на аднаўленне чыгункі і станцыі. Выконваючы гэту работу, яны кіраваліся пастановай ЦК РКП(б) ад 7 верасня 1921 г. і загадам народнага камісара шляхоў зносін Ф.Э.Дзяржынскага, якімі чыгуначны транспарт быў пастаўлены пад кантроль партыйных і савецкіх органаў. У сувязі з гэтым былі заснаваны пасады камісараў чыгуначных раёнаў і вузлоў.

Камісарам Асіповіцкага чыгуначнага вузла быў прызначаны камуніст Чыкаў. Дзейнічаў асіповіцкі аператыўны пост управлення транспартнай надзвычайнай камісіі (УТНК) па барацьбе з контррэвалюцыйнымі праяўленнямі, сабатажам і спекуляцыяй. Выконвалі гэту работу старыя камуністы — начальнік поста І.С.Істомін, аператыўны ўпаўнаважаны І.К.Патоцкі. Начальнікам узброенай варты вузла працаваў М.Л.Мысін.

Пры актыўным удзеле рабочых-чыгуначнікаў за кароткі час былі адноўлены механічныя майстэрні і паравознае дэпо. Камуністы Я.Лагацкі, Л.Шымковіч, В.Гуськоў і іншыя арганізавалі суботнікі па ўпарадкаванні станцыі, нарыхтоўцы і адгрузцы дроў вялікім гарадам.

Па ініцыятыве Рымшы, пры ўдзеле Рубінчыка і Цярэнцьева ў воданапорнай вежы абсталявалі электрастанцыю. З яе пускам каля чвэрці дамоў пасёлка і станцыі было электрыфікавана. (Упершыню электрычнае асвятленне ў Асіповічах з'явілася ў 1917 г., калі прадпрымальнік Нямцоў пабудаваў маленькую электрастанцыю. Яе электраэнергіяй былі асветлены некалькі прыватных дамоў і ўстаноў. У час польскай акупацыі ў 1920 г. яна была зруйнавана.)

1921 год быў багаты на важнейшыя для воласці падзеі. 1-га ліпеня адбыліся першыя выбары ў Замошскі валасны Савет рабочых і сялянскіх дэпутатаў, якому ў адміністрацыйных адносінах падпарадкоўваліся Асіповічы. Адчынілася паштовае аддзяленне (з адным тэлефонам «Эрыксан»), праз які падтрымлівалі сувязь з Бабруйскам, а ў кастрычніку запрацаваў тэлеграф. Арганізавалася пасялковая камсамольская ячэйка. Яе арганізатар і першы сакратар Віктар Воінаў прыцягнуў камсамольцаў у атрад часцей асобага прызначэння (ЧАП), арганізаваў ахову Асіповіч. Адначасова камсамольцы стварылі драматычны гурток, ставілі спектаклі, давалі самадзейныя канцэрты і вялі антырэлігійную прапаганду, удзельнічалі ў выкананні харчразвёрсткі.

Увосень 1921 г. аднавіліся заняткі ў чыгуначнай школе-сямігодцы, была адчынена сямігодка для дзяцей прыстанцыйнага рабочага пасёлка і бліжэйшых вёсак. У ёй пачало навучацца 60 чалавек (у 1922 яе наведвалі 224, а ў 1927 — 373 навучэнцы). У гэтым жа годзе пачалі стварацца культурна-асветныя ўстановы. У памяшканні майстэрань кватэрнай часткі чыгуначнага вузла быў адчынены клуб «Чырвоны Кастрычнік», пры якім арганізавалі драматычны гурток, духавы аркестр і бібліятэку-чытальню.

1 студзеня 1922 г. цэнтр Замошскай воласці быў перанесены ў Асіповічы і воласць пачала называцца Асіповіцкай. Затым яе перайменавалі ў Чычэрынскую. Але хутка гэта назва была адменена. 14 студзеня быў абраны новы склад Асіповіцкага валаснога камітэта КП(б)Б у складзе 9 чалавек: Родзіна, Я.І.Лагацкага, Л.Ф.Блюдава, М.Л.Мысіна, Ш.Л.Кацмана, Целя-Цеслянка, Пятровічава, Шэймана і Міхадзюка. Старшынёй Асіповіцкага валвыканкома быў выбраны камуніст Гарбузаў.

У склад Асіповіцкага валкома партыі ўваходзілі не толькі члены партыі бальшавікоў, але і члены яўрэйскага рабочага саюза (Бунд). У кіраўніцтве воласцю, а пазней і раёнам утварылася двухпартыйнасць, якая існавала да 1924 г.

У сувязі з ад'ездам сакратара валкома Родзіна на вучобу ў партыйную школу быў давыбраны склад валкома, у які ўвайшлі: Я.І.Лагацкі — адказны сакратар, Д.Абакшонак — намеснік адказнага сакратара і адказны за кіраўніцтва камсамольскай арганізацыяй, Ш.Л.Кацман — адказны сакратар яўрэйскай секцыі валкома, членамі валкома начальнік атрада ЧАП Ляўкоў і Калігаеў.

У карыстанне валвыканкома быў перададзены адноўлены пасля пажару ў 1920 г. лесапільны завод, які раней належаў купцу Янкелю Рыўкіну. На ім дзейнічалі рухавік у 65 конскіх сіл, 2 піларамы, цыркулярная піла. Пры заводзе меліся млын-крупадзёрка і сукнавальны цэх. На заводзе распілоўвалася ў год 5574 м³ драўніны, размолвалася 1106 т збожжа і выраблялася 1728 м сукна. На яго вытворчасці было занята 37 рабочых. Прадукцыя, вырабляемая гэтым і іншымі прадпрыемствамі, спажывалася не толькі ў воласці, але вывозілася за яе межы.

У гэтым жа годзе пасялковая камсамольская ячэйка ператворана ў Асіповіцкую валасную камсамольскую арганізацыю на чале з сакратаром Віктарам Воінавым, якога хутка змяніў Аляксандр Шпак.

У Асіповіцкі камітэт КП(б)Б пачалі паступаць звесткі аб дзейнасці падпольнай сіянісцкай арганізацыі. 25 жніўня 1922 г. на пасяджэнні камітэта партыі па гэтым пытанні быў заслуханы даклад адказнага сакратара яўрэйскай секцыі Ш.Л.Кацмана. У працэсе абмеркавання высветлілася, што ў Асіповічах падпольна працуе яўрэйская сіянісцкая арганізацыя, яе прыкрыццём з'яўляецца яўрэйскі драматычны гурток, які рэгулярна ставіць платныя спектаклі ў клубе і іншых месцах, а атрыманыя грошы накіроўвае ў Мінск, у яўрэйскі нацыянальны фонд, адтуль жа атрымлівае ўказанні і літаратуру, аб чым ведаюць у Асіповічах.

Пастановай валаснога камітэта КП(б)Б было даручана І.К.Патоцкаму і Л.М.Мысіну ліквідаваць яўрэйскі драмгурток і папярэдзіць аб роспуску сіянісцкай арганізацыі. Хутка пасля гэтай падзеі Ш.Л.Кацман, Н.Шуб і некаторыя іншыя яўрэі выйшлі з Бунда і ўступілі ў члены КП(б)Б.

Да канца 1922 г. актывізавалася дзейнасць ячэйкі прафсаюза работнікаў чыгуначнага транспарту, якую ўзначалілі Д.Абакшонак, Я.Н.Удзельнік, Э.Кацман, Ф.Капцееў, І.А.Сямашка, В.Вараб'ёў. На чыгуначным вузле ў гэты час налічвалася 370 членаў прафсаюза. Яны праводзілі работу па паляпшэнні ўмоў працы, рабочага забеспячэння і быту. Паток грузаперавозак праз Асіповічы да гэтага часу значна павялічыўся. Толькі за жнівень 1922 г. было адпраўлена грузаў малой хуткасцю 30 922 пуды, багажу 470, прынята грузаў малой хуткасцю 178 200 і багажу 534 пуды. За паўгода

Кіруючы партыйна-савецкі актыў раёна 1920-х гадоў

было адрамантавана 660 вагонаў і 58 паравозаў.

1923 г. стаў пераломным у тэхнічным абсталяванні Асіповіцкага чыгуначнага вузла і арганізацыі яго работы. Старыя паравозы былі заменены новымі чатырохвосевымі, што дало магчымасць павялічыць вагу паяздоў. Палепшылася рамонтная база: у паравозным дэпо былі змацірованы новыя станкі, абсталяваны майстэрні, дыстанцыі пуці. У рабочым пасёлку дзейнічаў шэраг лесанарыхтоўчых дзяржаўных арганізацый, працавала таксама некалькі прыватных прадпрыемстваў і майстэрань.

Паступова наладжваўся гандаль. У 1-й палове 1923 г. у Асіповічах мелася 58 магазінаў і крам. З магазінаў усяго 1 быў дзяржаўны і 2 кааператыўнага гандлю, астатнія — прыватныя.

Адначасова з вырашэннем гаспадарчых задач кіраўніцтва воласці надавала ўвагу барацьбе з неадукаванасцю, развіццю культурнай работы. У 1923 г. у Асіповічах дзейнічалі 3 школы. Была адкрыта бібліятэка. У клубе чыгуначнікаў «Чырвоны Кастрычнік» пачалася дэманстрацыя кінафільмаў. Узнікла піянерская арганізацыя.

У 1924 г. у БССР была праведзена перабудова адміністрацыйнага падзелу. Замест паветаў былі ўтвораны акругі і раёны, у тым ліку Бабруйская акруга з шэрагам раёнаў. 17.7.1924 г. шляхам аб'яднання Асіповіцкай воласці, частак Гарадоцкай, Гарбацэвіцкай і Жыцінскай валасцей Бабруйскага павета,

Група асіповіцкіх актывістаў 1922—1923 гг. Злева направа: старшыня спажыўкааперацыі Карпенка, сакратар камсамольскай ячэйкі Шпак, сакратар партыйнай арганізацыі Станкевіч, начальнік оперпункта Істомін.

Камсамольская арганізацыя Асіповіч. 1920-я гады.

Кнорынскай і Пагарэльскай валасцей Ігуменскага павета быў утвораны Асіповіцкі раён з цэнтрам у Асіповічах, якім быў нададзены статус мястэчка. Раён увайшоў у склад Бабруйскай акругі.

Райцэнтр стаў хутка развівацца. У вагавым цэху шпалапрапітнага завода, дэманціраванага палякамі, і ў паравозным дэпо былі абсталяваны электрастанцыі з дызельнымі рухавікамі. Гэта дазволіла забяспечыць электраэнергіяй чыгуначны вузел, асвятліць установы, кватэры рабочых і служачых. У Асіповічах было арганізавана крэдытна-прамысловае таварыства, якое садзейнічала стварэнню саматужных прамысловых арцеляў і аказвала дапамогу саматужнікам-адзіночкам. Былі створаны 4 арцелі: «Чырвоны хімік», «Перадавік», «Звязда» і «Прагрэс», а таксама шэраг саматужна-рамесных майстэрань, якія выраблялі кавальскія, шорныя, бандарныя і іншыя прадметы і прылады гаспадарчага прызначэння.

У пачатку 1920-х гадоў Асіповіцкі раён быў падзелены на 8 сельскіх Саветаў: Верайцоўскі, Дзераўцоўскі, Замошскі, Зборскі, Лапіцкі, Ліпеньскі, Асіповіцкі, Ясенскі, якія аб'ядналі 201 населены пункт і 2 мястэчкі – Асіповічы (2433 жыхары) і Лапічы (680 жыхароў). У раёне дзейнічала 7 прадпрыемстваў, працавалі на іх больш за 40 рабочых. Трыма прадпрыемствамі валодалі арцелі прамкааперацыі, а 4 знаходзіліся ў руках прыватных прадпрымальнікаў. Вытворчасць уяўлялі сабой млыны з крупадзёркамі. У кожным прадпрыемстве былі цыркулярныя пілы для пілавання драўніны і сукнавальныя цэхі. Дзейнічалі 2 смалакурні прамкааперацыі з нізкай прадукцыйнасцю. У гэты ж перыяд у раёне працавалі 236 саматужнікаў і рамеснікаў, з якіх займаліся пашывам абутку 62, кавальскім рамяством — 62, цяслярным — 23, кушнерскім — 11, вобадна-колавым — 6, шорным — 4, пашывам шапак — 5 чалавек. 83 чалавекі займаліся іншымі промысламі.

Асноўнай сыравіннай базай мясцовай прамысловасці і прамкааперацыі быў лес. Асіповіцкі леспрамгас меў 7 лесанарыхтоўчых пунктаў, якія выпрацоўвалі вялікі асартымент лесапрадукцыі, напрыклад сыравіну для клеенай і струганай фанеры і вытворчасці запалак, розных піламатэрыялаў, спецыяльныя калоды для самалёта- і суднабудавання, вырабу лыж, музычных інструментаў, тэлефонных слупоў і вялікую колькасць руднічных стоек. Заданні леспрамгаса па лесавывазе дасягалі 500 тыс. кубаметраў у год.

У пачатку 1920-х гадоў з агульных 95 тыс. дзесяцін зямельных угоддзяў раёна ў сельскай гаспадарцы выкарыстоўвалася 32 тыс., пад лясамі знаходзілася 46 тыс., пад балотамі і няўдобіцамі — 17 тыс. дзесяцін. Лепшыя глебы па раёне цягнуліся паласою па левым беразе р. Свіслач (Лапіцкі і Зборскі сельсаветы), захопліваючы таксама частку тэрыторый Карытненскага і Ясенскага сельсаветаў.

Асноўнай сістэмай землекарыстання ў той час было трохполле. Іншы раз яно змянялася двухполлем (беспарныя палеткі і зяблевае ворыва). Апрацоўка зямлі вяла-

Дом на вуліцы Чумакова, у якім размяшчаўся першы Асіповіцкі райваенкамат.

ся простымі прыладамі працы: коннымі плугамі, сохамі і баронамі. З сельскагаспадарчых культур пераважалі азімае жыта, бульба, ячмень, авёс, грэчка, лён, азімая пшаніца, яравыя жыта і пшаніца, проса і каноплі.

У сярэдзіне 1920-х гадоў лепшая ўраджайнасць была на палях Лапіцкага, Зборскага, Карытненскага і Ясенскага сельсаветаў. У сярэднім дзесяціна бульбы давала 96—112 ц, жыта 6,4—8, аўса 8—9,6 ц. Пачалі часцей ужывацца дасягненні агранамічнай навукі, пашырыліся пасевы палявых траў.

Жывёлагадоўля развівалася слаба. Буйной рагатай жывёлы змешаных малапрадукцыйных парод налічвалася 10 832 галавы. Толькі некаторыя гаспадаркі мелі кароў элітных парод.

Свінагадоўляй займалася кожная сялянская гаспадарка, але свінні былі беспародныя і гадаваліся толькі для прыватных патрэб. Амаль кожная гаспадарка мела авечак. Мелася каля 5 тыс. коней, таму і прыватныя гаспадаркі сялян, і калгасы былі поўнасцю забяспечаны цяглавой сілай.

У 1925 г. пашырылася сетка медыцынскіх устаноў. У мястэчку адкрыліся бальніца на 15 ложкаў, амбулаторыя і стаматалагічны кабінет, дзе працавалі 2 урачы, 3 фельчары, 2 акушэркі. Чыгуначны вузел меў сваю амбулаторыю, прыём хворых у якой вялі 2 урачы і 3 фельчары.

Да канца 1926 г. з мясцовай прамысловасці быў канчаткова выцеснены прыватнік. Смалакурны завод Айзіковіча адышоў да арцелі прамкааперацыі «Чырвоны хімік». Шырока разгарнуліся лесанарыхтоўчыя работы леспрамгаса, сельскагаспадарчага інстытута і Палесзапалкапрама. У мястэчку ў гэты час працавалі больш за 70 кааператыўных саматужнікаў, дзейнічала вялікая вобадная майстэрня. Пануючае становішча заняла кааперацыя ў гандлі, на яе прыпадала 68% усяго тавараабароту. У прамысловай кааперацыі і гандлі ўкаранялася метрычная сістэма мер і вагі, практыкавалася ўцэнка нехадавых вырабаў, продаж тавараў па заяўках пакупнікоў і ў крэдыт. Аўтарытэт дзяржаўнага і кааператыўнага гандлю падымаўся ўсімі шляхамі.

У адпаведнасці з пастановай ЦВК БССР аб увядзенні ўсеагульнага абавязковага навучання, Асіповіцкая сямігадовая школа была пераўтворана ў сярэднюю і пераведзена ў больш прасторныя дамы, рэквізаваныя ў купца Рыўкіна.

На пачатак 1926 г. у Асіповічах акрамя 2 агульнаадукацыйных школ, якія тут меліся, пачалі працаваць 2-я яўрэйская і польская школы, школа рабочай моладзі, у якой навучаліся 85 рабочых. Быў праведзены ўлік неадукаванага насельніцтва ва ўзросце ад 16 да 50 гадоў і арганізавана таварыства «Прэч непісьменнасць». У гэты ж час утварылася раённае таварыства краязнаўства, якое ўзначальваў завуч чыгуначнай школы А.Г.Немцаў. Члены таварыства вывучалі прыроду, адшуквалі археалагічныя помнікі і даследавалі іх,

Заняткі фотагуртка ў 11-й чыгуначнай школе. 1920-я гады.

збіралі мясцовы фальклор. Члены таварыства рабілі даклады перад насельніцтвам і праводзілі асветную работу. У 1928 г. Цэнтральнае бюро краязнаўства Інстытута беларускай культуры выдала працу «Асіповіцкі раён», падрыхтаваную А.Немцавым і М.Азбукіным. Таварыства праіснавала да 1938 г. У час масавых палітычных рэпрэсій у краіне А.Г.Немцаў быў рэпрэсіраваны, дзейнасць таварыства спынілася.

Першы Народны дом мясціўся ў прыстасаваным для работы пажарным хляве. Аднак за правядзенне ў ім антырэлігійнай прапаганды жыхары яго спалілі. Раённы і местачковы Саветы ўзбудзілі хадайніцтва перад Бабруйскім акрвыканкомам аб выдзяленні сродкаў на будаўніцтва новага Народнага дома. Неабходныя сродкі былі выдзелены, і Народны дом быў пабудаваны. У 1927 г. клуб чыгуначнікаў «Чырвоны Кастрычнік» атрымаў пераабсталяваны для яго будынак былога шпалапрапітнага завода з залай на 300 месцаў. Штат клуба быў павялічаны на 5 чалавек. У новым будынку разгарнулі працу гурткі, у якіх займаліся каля 80 чалавек.

У 1929 г. у Асіповіцкім раёне было 14 сельскіх і адзін пасялковы Савет, якія аб'ядноўвалі 52 060 чалавек. Паводле нацыянальнага складу ў раёне пражывалі: беларусаў 42 552, рускіх 1247, яўрэяў 4655, палякаў 2875, іншых нацыянальнасцей 731 чалавек. Паводле сацыяльнага стану: рабо-

Асіповіцкі піянерскі лагер. 1927 г.

Выпуск Асіповіцкай чыгуначнай школы 1924 г.

чых 2770, калгаснікаў 14 944, саматужнікаў 634, служачых 1234, беднякоў 2745, серадняком 21 149, кулакоў і заможных 2232, іншых 6349 чалавек.

У савецкай краіне ў гэты час праводзілася калектывізацыя. У раёне было аб'яднана 2830 бядняцкіх і серадняцкіх сялянскіх гаспадарак у 116 калгасаў (ці 44,2% ад агуль-

Духавы аркестр клуба чыгуначнікаў «Чырвоны Кастрычнік». 1926 г.

Настаўнікі Асіповіцкай чыгуначнай школы. Злева направа ў 1-м радзе: Сава Тарасавіч, М.А.Шымкевіч, П.Г.Пятроў, М.Г.Цяцерская, Ю.Г.Яроменка, А.Г.Немцаў, Гламбоцкі; 2-і рад: З.М.Яроменка, М.І.Падгурская, М.А.Цяцерскі, В.С.Баговіч, В.А.Немцава, М.Дз.Кутарга, М.Р.Кутарга; 3-і рад: В.Р.Кутарга, Беразоўскі, К.І.Вараб'ёва, Пагоскі, Лісун, М.А.Гамановіч, Дунаеўскі.

най колькасці сялянскіх гаспадарак раёна). Меўся 1 саўгас. Былі заснаваны 2 машынна-конныя станцыі для аказання дапамогі калгасам па апрацоўцы зямлі. На пачатак 1940 г. было праведзена ўзбуйненне калгасаў. Вясковае насельніцтва павялічылася і склала — 53 470 жыхароў, а гарадское (мястэчка Асіповічы, шклозавод «Кастрычнік», торфапрадпрыемствы «Татарка» і «Свабода») 18 135 чалавек. Гады 1-й пяцігодкі адзначыліся значным пашырэннем станцыі Асіповічы і чыгуначнага вузла ў сувязі з будаўніцтвам чыгункі Рослаўль — Магілёў — Асіповічы. Яе будаўніцтва пачалося ў 1928 г. і было скончана ў 1931 г. Было распачата будаўніцтва 2-га пуці на Слуцк, пабудаваны матэрыяльныя склады, дом кандуктарскіх брыгад і іншыя службовыя памяшканні, уведзены мураваныя двухпавярховыя, трохпавярховыя жылыя дамы і лазня. Для забеспячэння вадой паравозаў на р. Свіслач была пабудавана вадакачка і вадавод да станцыі працягласцю 6 км. Аддзелам рабочага забеспячэння чыгункі былі адкрыты 2 сталовыя для харчавання рабочых і служачых чыгуначнага вузла.

Прамысловасць мястэчка папоўнілася ўступіўшым у строй прамкамбінатам. Значна пашырыў сваю вытворчасць леспрамгас.

У 1931 г. у Асіповічах пачала выходзіць раённая газета «Калгасная праца». Першы яе нумар пабачыў свет 10 ліпеня.

У 1935 г. станцыя Асіповічы і паравознае дэпо перавыканалі план па перавозцы грузаў. Ударнікі і наватары прамысловасці, паслядоўнікі крыванасаўскага руху,

Група ўдзельнікаў самадзейнасці «Беларускай хаткі» пры клубе чыгуначнікаў. 1927 г.

Першы калгасны сход у мястэчку Свіслач. Пачатак 1930-х гадоў.

асвоіўшы новую тэхніку, перавыканалі норму рамонту рухомага саставу. За высокія паказчыкі былі ўзнагароджаны ордэнам Леніна машыніст Лявонцій Фоціевіч Байкачоў, знакам «Ганаровы чыгуначнік» Аляксей Карпавіч Курчэўскі, Міхаіл Андрэевіч Немагай і інш.

Развіваліся сродкі сувязі мястэчка. Пачалася пракладка кабельных тэлефонных ліній. У новым памяшканні быў змантіраваны радыёвузел, пашырылася сетка трансляцыйных кропак.

15.7.1935 г., у сувязі з ростам мястэчка, развіццём чыгуначнага вузла, ростам насельніцтва, Асіповічы атрымалі статус горада раённага падпарадкавання.

Будаваліся аўтамабільныя дарогі. У 1935 г. у Асіповічах быў утвораны

Абмер калгаснай зямлі ў мястэчку Свіслач. Пачатак 1930-х гадоў.

4-ы клас Ліпеньскай няпоўнай сярэдняй школы. 1936 37 навучальны год.

будаўнічы эксплуатацыйны ўчастак, які пачаў будаўніцтва шашы Асіповічы — Бабоўня працягласцю 90 км. Умацоўвалася матэрыяльна-тэхнічная база прамысловых прадпрыемстваў. Леспрамгас у 1934 г. для тэхнічнага абсталявання вытворчасці атрымаў першыя аўтамашыны-самазвалы, пачаў ужываць механізаваную пагрузку драўніны. На лесаўчастках пачалі будавацца невялікія лесапільныя заводы. Леспрамгас быў асноўным пастаўшчыком паліва для Мінска. У 2-й пяцігодцы ў Асіповічах былі пабудаваны 2 сярэднія школы. На вуліцы Ленінскай адкрыўся дзіцячы садок для дзяцей чыгуначнікаў. У 1937 г. пачалося будаўніцтва раённай бальніцы на 75 ложкаў. Былі пабудаваны гарадская лазня на 60 месцаў на вуліцы Кастрычніцкай і крыты рынак.

2-я палова 1930-х гадоў у гісторыі савецкай краіны азнаменавана не толькі ростам працоўнай і творчай актыўнасці мас і дасягненнямі першых пяцігодак. На вялікі жаль, гэта быў час, азмрочаны развіццём культу асобы Сталіна, які прывёў да разгулу самавольства і беззаконня. Шпіёнаманія, усеагульная падазронасць у «шкодніцтве» і ў арганізацыі контррэвалюцыйнай дзейнасці, якія прыкрываліся ўзмацненнем «палітычнай пільнасці» і «выкарчоўваннем ворагаў народу», ахапілі і раён. У Асіповічах многія былі арыштаваны. Начальнік Асіповіцкага РА НКУС Кісялёў і оперупаўнаважаны Галіноўскі пры ўдзеле начальніка 3-га аддзела НКУС БССР Генштэйна дапускалі фальсіфікацыю крымінальных спраў, інкрымінавалі некаторым арыштаваным прыналежнасць да польскай арганізацыі вайсковай «ПАВ», якой у Беларусі не існавала. (Генштэйн, Кісялёў і Галіноўскі за свае злачынствы пазней былі асуджаны.)

Пасля развенчвання культу асобы Сталіна справы на асуджаных да расстрэлу і зняволеных на розны час былі перагледжаны транспартнай калегіяй Вярхоўнага суда СССР, Ваенным трыбуналам Беларускай ваеннай акругі, судовай калегіяй па крымінальных справах Вярхоўнага суда БССР, а некаторыя судом Магілёўскай вобласці.

На канец 1939 г. была скончана ўкладка 2-й каляі чыгункі Асіповічы — Бабруйск, а таксама скончана будаўніцтва шашы Асіповічы — Бабоўня. Як і ў мінулыя пяцігодкі, лідэрамі ў выкананні вытворчых заданняў былі чыгуначнікі. Яны на працягу 1939—1940 гг. поўнасцю забяспечвалі перавозку ўзросшай колькасці народнагаспадарчых грузаў. За ўдарную працу машыніст Аляксей Аляксандравіч Райкевіч і слесар-брыгадзір па рамонце паравозаў Уладзімір Еўдакімавіч Валько ў гэтыя гады былі ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалём «За працоўную адзнаку» машыніст Іван Герасімавіч Селіванаў, знакам «Ганаровы чыгуначнік» машыністы

Танцавальны гурток у чыгуначнай школе № 36 (цяпер СШ № 2 г. Асіповічы). 1939 г.

Пётр Кірэевіч Гайсенка, Дзям'ян Сцяпанавіч Кучын, шматлікія пуцейцы, вагоннікі і рабочыя.

На пачатак 1941 г. у Асіповічах працавала 12 прадпрыемстваў, у тым ліку паравознае дэпо, вагонарамонтны пункт, машынна-трактарная майстэрня, леспрамгас і прамкамбінат, арцель «Чырвоны хімік», майстэрня па рамонце сродкаў сувязі і рамонце тэлефонаў і сродкаў кіравання чыгункі, абутковая арцель «Звязда», кравецкая «Прагрэс», завод маслапрама, харчовая арцель «Перадавік». На ўсіх гэтых прадпрыемствах было занята каля 2000 рабочых і служачых.

Рост эканомікі райцэнтра і раёна дазволіў выдзеліць значныя сродкі на развіццё культуры і ахову здароўя. У 1939 г. па вуліцы Заводскай (цяпер вул. Сумчанкі) быў пабудаваны новы двухпавярховы будынак сярэдняй школы на 600 месцаў (пасля вайны школа № 1 імя Героя Савецкага Саюза Б.М.Дзмітрыева). У 1940 г. скончылася ўзвядзенне будынка раённай бальніцы, пры ёй быў створаны пункт хуткай дапамогі. У сярэдзіне 1941 г. працавалі паліклініка, дзіцячая кансультацыя, радзільны дом, чыгуначная амбулаторыя, процітуберкулёзны дыспансер. Пашырылася гандлёвая сетка. Асіповіцкі райспажыўсаюз і філіял Бабруйскага харчпрамгандлю на канец 1940 г. мелі ў горадзе 51 гандлёвую кропку і 1 сталовую. Акрамя гэтага, працаваў шэраг магазінаў і 3 сталовыя іншых гандлёвых арганізацый.

На пачатак 1941 г. у Асіповічах жылі каля 13 тыс. чалавек. З 1918 г. па 1941 г. у горадзе быў пабудаваны 961 будынак агульнай плошчай 59 тыс. м², у тым ліку жылой — 31 тыс. м².

Інтэнсіўна праводзіліся работы па добраўпарадкаванні горада: брукаванне праезнай часткі вуліц, будаўніцтва тратуараў, азеляненне.

Поспехі прыносілі радасць жыхарам Асіповіч і раёна, надавалі сілы на новыя працоўныя дасягненні.

У.П.Зорын.

Наш край у гады першых пяцігодак

РАНІЦА ВЁСКІ

Дробная, разрозненая сялянская гаспадарка страчвала свае магчымасці далейшага ўздыму. Вёска тармазіла развіццё сацыялістычнага будаўніцтва. Партыя заклікала сялянства да стварэння калгасаў і саўгасаў на добраахвотных пачатках. Падрыхтоўчая работа да калектывізацыі вялася і на Асіповіччыне. 25 сакавіка 1928 г. адбылася раённая нарада прадстаўнікоў беднаты. 56 дэлегатаў прынялі ў ёй удзел. Па сваім жаданні прыехалі на нараду Аляксандр Адамавіч Ерка з в. Смык-Слабада, Вера Ягораўна Шпак з в. Ворча, Аляксей Іванавіч Сабела з в. Зборск, Аляксандр Міхайлавіч Раковіч з в. Таўсцец, Мікіта Данілавіч Чыгілейчык з в. Вярэйцы Зборскага сельсавета.

Нарада разгледзела некаторыя пытанні далейшай работы ў вёсцы, якія выцякалі з рашэнняў партыйнага з'езда, задачы пасяўной кампаніі.

Аднак утварэнне калектыўных гаспадарак пачыналася з восені. Раённая партканферэнцыя, якая адбылася 16 лістапада 1928 г., адзначала, што ў в. Вялікая Грава на зямлі працоўнага карыстання арганізавана сельскагаспадарчая арцель з 6 прыватных гаспадарак. Праведзена падрыхтоўчая работа да арганізацыі яшчэ дзвюх арцелей: у в. Вяззе на зямлі працоўнага карыстання і ў в. Бярозавая Града. Створаны два машынныя таварыствы ў п. Кляпчаны Мост і в. Бортнае.

Праз год з'явілася яшчэ 10 сельскагаспадарчых арцелей, якія аб'ядналі 145 сялянскіх гаспадарак. Прыбавілася 1500 гектараў зямлі, якую сталі апрацоўваць калектыўна.

Людзі бачылі перавагу калгасных гаспадарак. Утвараліся новыя сельгасарцелі. Да вясны 1933 г. іх было ўжо 105. 1600 сялянскіх гаспадарак сталі жыць па-новаму. У сярэднім на двор калгаснікаў прыпадала 8 га зямлі, а ўласніка-аднаасобніка — па 3,5 га.

Дзяржава аказвала дапамогу створаным калектыўным гаспадаркам. Ім адпусцілі 900 тыс. руб. на набыццё жывёлы, інвентару, насення.

9 сакавіка 1933 г. калгаснікаў-ударнікаў вітаў раённы злёт. Скупыя радкі колішніх характарыстык даюць уяўленне аб першапраходцах, піянерах калгаснага ладу. Сярод

іх — Надзея Герасімчык з калгаса «Авангард» Зборскага сельсавета. Да ўступлення ў калгас была бяднячкай. З першых дзён калектыўнага жыцця праявіла сябе як лепшая працаўніца, стала ўдарніцай.

Па-ўдарнаму працаваў камсамолец Аляксей Дземідовіч у калгасе «Трактар» Градзянскага сельсавета. Першым уступіў у калектыўную гаспадарку.

У ліку 128 дэлегатаў злёту былі старшыні калгаса «Новы шлях» Дзераўцоўскага сельсавета Клаўдзія Кароўчанка, калгаснік калгаса «Чырвоная слабада» Верайцоўскага сельсавета Іван Малахаў, старшыня калгаса «Слава» Пагарэльскага сельсавета, сакратар партячэйкі Аляксей Паляшчук.

Потым яны былі абраны на Усебеларускі злёт калгаснікаў-ударнікаў.

Раніца вёскі наступіла. Калектыўнае жыццё наладжвалася. У створаныя калгасы ўлівалася ўсё большая і большая колькасць сялян. Дробныя арцелі аб'ядноўваліся. У 1935 г. зліліся ў адзін калгасы «Ударнік» і «Селькор» Зборскага сельсавета, імя Калініна і імя Галадзеда Дзераўцоўскага, імя Варашылава і імя Ільіча Ліпеньскага, «16-годдзя Кастрычніка» і «Перамога» Замошскага, «Чырвоны колас» і імя Дзяржынскага Карытненскага сельсавета і г. д. У ліку буйнейшых сельгасарцелей былі: «Новая ніва», у якой працавалі 166 чалавек і мелася 417 га зямлі, «Усход» — 133 чалавекі і 590 га зямлі, «Камунар» — 102 чалавекі і 595 га зямлі.

У красавіку 1938 г. з 7128 сялянскіх гаспадарак у калгасы аб'ядналася 6077. 99 калгасаў мелі 25 075 га ворнай зямлі і 14 779 га сенажацей, 82 малочнатаварныя, 64 — свінагадоўчыя, 63 — авечкагадоўчыя фермы. Пагалоўе буйной рагатай жывёлы выросла да 8913 галоў, свіней — 3915, авечак — 2344, коней — 4289 галоў. На машына-трактарных станцыях раёна працавала 47 трактароў.

СТАХАНАЎЦЫ

Краіна будавалася. Драўніну асіповіцкіх лясоў чакалі на многіх новабудоўлях. Рыхтаваць яе трэба было болей і болей. Ранейшыя метады лесараспрацоўкі не давалі магчымасць спраўляцца з выкананнем заданняў. Трэба было шукаць больш эфектыўныя. Дапамог вопыт знатнага лесаруба краіны з Архангельска тав. Гузіенкі. Першым яго на практыцы выкарыстаў стаханавец Дуброўскага лесапункта Васіль Антонавіч Гоцін. Калі да гэтага часу не было падзялення вытворчых аперацый па нарыхтоўцы драўніны, то звяно Гоціна, у склад якога ўвайшлі лесарубы Іосіф Антонавіч Вярыга, Ігнат Данілавіч Хамянок, Іван Фаміч Барысік, Пётр Мікалаевіч Лісаковіч і Леанід Паўлавіч Шкутко, прымяніла яго. Размеркаваўшы паміж сабой абавязкі, яны рэзка павялічылі прадукцыйнасць працы. 18 студзеня 1938 г. у першы дзень работы стаханаўскае звяно за 8 гадзін нарыхтавала 232 кубаметры драўніны. Дзённую норму калектыў выканаў на 483 працэнты.

Прыклад В.А.Гоціна распаўсюджваўся сярод лесанарыхтоўшчыкаў раёна з небывалай хуткасцю. З кожным днём павялічвалася колькасць звенняў і брыгад, якія працавалі па яго метадзе. Звяно Васіля Грышаковіча з Градзянскай аўтабазы па нарыхтоўцы асіны для запалак, вольхі і бярозы для вырабу фанеры, абадовага і піловачнага ясеня дзённую норму выканала на 650 працэнтаў. Звяно Зіновія Сугакі з Цэльскага лесапункта заданне выканала на 601 працэнт. Здабыткі новай арганізацыі працы былі захапляючымі. Асобныя звенні лесарубаў выконвалі за дзень па 10 і больш зменных нормаў.

Сіла стаханаўскага руху была ў яго масавасці. Для пашырэння метаду работы звяна В.А.Гоціна нарком лясной прамысловасці БССР тав. Гайсін прыняў рашэнне абагульніць вопыт і на базе Асіповіцкага леспрамгаса правесці Усебеларускі злёт стаханаўцаў-лесарубаў і майстроў лесанарыхтоўчай прамысловасці. 23 студзеня 1938 г. у Асіповічах адбыўся гэты злёт.

За праяўлены працоўны энтузіязм загадам наркома лясной прамысловасці БССР звяно В.А.Гоціна было адзначана прэміяй у 3000 руб. Гоцін прадстаўлены да ўзнагароды знакам «Ганароваму работніку лесапрамысловасці».

РАДЗІМА СЛАВІЛА РУПЛІВЫХ

У 1937—1939 гг. працаўнікі калгасаў спаборнічалі за права ўдзелу ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. У 1940 г. яна адбылася. Хочацца нагадаць стаханаўцаў таго часу, першапраходцаў калгаснага

руху. Аб іх сумленнай працы забываць нельга. Іх дасягненні — яркая старонка слаўнага летапісу калектыўнага ўкладу ў грамадскае жыццё.

Ганаровая кніга Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1940 г. дае права расказаць аб руплівых майстрах палёў і фермаў.

Сярод 178 прозвішчаў асіпаўчан, якія навечна занесены ў Ганаровую кнігу галоўнай выстаўкі краіны, назавём асобныя.

Марфа Пятроўна Адынец, звеннявая калгаса «III Інтэрнацыянал», у сярэднім за 1938—1939 гг. дабілася ўраджаю бульбы па 314 цэнтнераў з плошчы 2 га.

Праскоўя Сцяпанаўна Астаповіч, загадчыца хаты-лабараторыі калгаса «Чырвоная слабада», у 1938 г. правяла 8 доследаў, арганізавала 4 звяны, узорна паставіла работу хаты-лабараторыі; у 1939 г. атрымала ўраджай: азімага жыта па 35,3 ц з гектара з плошчы 1,5 га, бульбы — па 293 ц з гектара. У сярэднім за 1938—1939 гг. ва ўсім калгасе павысіўся ўраджай збожжавых у два разы.

Марыя Адамаўна Бяляўская, даярка калгаса «Чырвоны сцяг», дабілася надою малака па 1961 кг ад кожнай каровы мясцовай пароды.

Павел Ільевіч Баразна, старшыня калгаса «Новая Ніва». Да 1 студзеня 1940 г. калгас укамплектаваў тры жывёлагадоўчыя фермы: малочную з пагалоўем 55 кароў, авечкагадоўчую — 55 аўцаматак, свінагадоўчую — 11 свінаматак.

Сцяпан Міхайлавіч Булавацкі, даглядчык авечак калгаса «Камунар», дабіўся па атары авечак выхаду 132 ягнят у разліку на 100 матак і ярак; настрыгу воўны — 2,8 кг з авечкі.

Фаня Несцераўна Бычанок, загадчыца хаты-лабараторыі калгаса «Чырвоны барэц», дабілася ўраджаю грэчкі па 15,7 цэнтнера з плошчы 5 га.

Рыгор Максімавіч Вайцянкоў, сакратар РК КП(б)Б. У сярэднім за 1938—1939 гг. калгасы раёна атрымалі ўраджай: сена канюшыны па 26,6 ц з гектара, бульбы — па 118 ц.

Вікенцій Іванавіч Гайдучэня, брыгадзір калгаса «За ўраджай», дабіўся ўраджаю буракоў, бручкі і морквы па 483,5 ц з гектара, пладоў — 108 ц, захаваў дрэўцы маладога саду на 96 працэнтаў.

Міхаіл Рыгоравіч Гацман, даглядчык авечак калгаса «Перамога», дабіўся па атары авечак па 152 ягняці на 100 аўцаматак і ярак; настрыг воўны склаў 3,06 кг ад авечкі.

Ілья Сямёнавіч Гацура, звеннявы калгаса «Чырвоныя ўсходы», дабіўся ўраджаю бульбы па 312 ц з плошчы 2 га.

Зося Іванаўна Гінтава, член калгаса «Чырвоны сцяг», у 1938 г. перавыканала норму выпрацоўкі на 165 працэнтаў, у 1939 г. атрымала ўраджай аўса па 24,8 ц з плошчы 5 гектараў.

Дзмітрый Мікалаевіч Ясько, звеннявы калгаса «Усход», у сярэднім за 1938—1939 гг. атрымаў ураджай ячменю 26,9 ц з гектара.

Ганна Васільеўна Заблоцкая, цялятніца калгаса «Усход», дабілася сярэднясутачнай прывагі цялят мясцовай пароды да 6-месячнага ўзросту па 650 г пры поўным захаванні маладняку.

Анатолія Трафімаўна Задоля, свінарка калгаса «1 Мая», у сярэднім за 1938—1939 гг. вырасціла па 16,2 парасяці ў разліку ад свінаматкі.

Марфа Сямёнаўна Заяц, звеннявая калгаса «III Інтэрнацыянал», дабілася ўраджаю бульбы па 314 ц з гектара з плошчы 9,5 га.

Ганна Ігнатаўна Ліпская, свінарка калгаса «III Інтэрнацыянал», у 1938—1939 гг. вырасціла па 18 парасят ад кожнай свінаматкі.

Ганна Іванаўна Рудая, член калгаса «Усход», дабілася ў сярэднім па 22,2 ц з гектара з плошчы 2,2 га.

Цярэнцій Карнеевіч Сядун, член калгаса «Сноп», атрымаў ураджай сена канюшыны па 65,5 ц з гектара.

Ганна Апанасаўна Сідаровіч, загадчыца фермаў калгаса імя Сталіна. Да 1 студзеня 1940 г. калгас укамплектаваў 3 жывёлагадоўчыя фермы: малочную — 101 карова, авечкагадоўчую — 81 аўцаматка, свінагадоўчую — 18 свінаматак.

Павел Васільевіч Трацэўскі, адказны рэдактар раённай газеты «Калгасная праца». У 1938 г. газета апублікавала 68 артыкулаў па сельскай гаспадарцы і 37 артыкулаў спецыялістаў, у 1939 г. 35 артыкулаў па сельскай гаспадарцы, 40 артыкулаў спецыялістаў, 72 выступленні стаханаўцаў сельскагаспадарчай вытворчасці.

Фёдар Рыгоравіч Хамянок, брыгадзір калгаса «Чырвоны маяк», дабіўся ўраджаю сена на балоце па 44 ц з 10 га.

Іван Міхайлавіч Чаропка, адказны за вырошчванне лёну калгаса «Чырвоны сцяг», дабіўся ўраджаю льновалакна па 6,5 ц, насення — па 7,5 ц з гектара з плошчы 5 га.

Іван Казіміравіч Шыманскі, звеннявы калгаса «Чырвоны сцяг», у 1938 г. выпрацаваў 443 працадні; у 1939 г. атрымаў з 5 га па 24,8 ц аўса.

Сцяпан Кузьміч Яноўскі, звеннявы калгаса «Усход», дабіўся ўраджаю сена канюшыны па 57 ц з гектара на 24 га.

У Ганаровую кнігу Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1940 г. занесены Асіповіцкі раён. Сельскія працаўнікі яго ў сярэднім за 1937—1939 гг. атрымалі ўраджай бульбы па 118 ц з гектара, сена канюшыны па 27,3 ц.

По выніках работы за 1937—1939 гг. многія калгасы і калектывы фермаў сталі ўдзельнікамі Усесаюзнай выстаўкі.

Запаветы Леніна. 1967. 6,12,25,30 кастр., 2 ліст.

Газеты паведамлялі...

На старонках бабруйскай акруговай газеты «Коммунист» за 1924 г.

№ 131

Деревенские болячки. Учебные занятия начинаются в Татарковичской школе поздней осенью и заканчиваются самой ранней весной. Учитель Савенко живет у жены в 7—8 верстах от школы, на уроки является поздно и рано их оканчивает. Бывает так, что школа не открывается несколько дней подряд. Учащиеся соберутся у запертой двери и, не дождавшись учителя-отлучника, расходятся по домам. Бывают и такие дни, что учитель Савенко явится в школу, а учеников нет, последние не знают ни дня ни часа, когда явится учитель. На рождественские каникулы учитель Савенко оставил школу за 5 дней до роспуска и после каникул начал работать несвоевременно. В бытность Савенко у нас учителем наши дети забыли и то, что приобрели при его предшественниках. Наша школа обижена учителем и ждет труженика-просветителя.

Я откровенно скажу, что наш учитель к своей службе не имеет призвания и слабо к ней подготовлен. УОНО, обрати внимание на Татарковскую школу и дай нам работника, ибо мы, татарковцы, бездельников гоним от себя прочь.

Осередовец.

№ 137

СУД НАД ЗНАХАРСТВОМ

В субботу, 26 июня в переполненном гражданами клубе (ст. Ясень) был инсценирован суд над знахарем-гадальщиком. Вопрос этот имеет большое общественное и практическое значение, несмотря на наличие в поселке фельдшерского пункта, многие по некоторым видам болезней обращаются к темным элементам деревни, которые хитростью дурачат темных и невежественных пациентов.

Инициаторы инсценировки имели в виду бороться с этой темной стороной деревенской жизни, нередко связанной с жертвами. После допроса обвиняемого зачитывается тот материал, при помощи которого он излечивал больных. Медицинский эксперт объясняет причины болезней... Суд, найдя в действиях подсудимого обман с целью возбуждения суеверия в массах населения, а также с целью извлечь таким путем выгоду, приговорил его к трем годам лишения свободы, но, принимая во внимание старческий возраст, считать приговор условным.

Очевидец.

№ 141

БЕЗ ЗЕМЛЕМЕРОВ ТОЛКУ МАЛО

На земле бывшего имения Корытное Корытнянского сельсовета в прошлом году образовано много поселков. Землемером были указаны границы, и поселковцы были предоставлены сами себе. Поселковцы не знают, как лучше разделить землю. Образовалась та же чересполосица, что и в деревне. Из-за каждого кусочка лучшей, унавоженной раньше земли происходят драки. Почти целыми неделями ходят поселковцы кучей и делят сенокосы. Сколько ни бьется агрономия, но к правильному севообороту не переходят крестьяне. Необходимо при создании поселков ставить непременное условие переход к правильному севообороту... Нужно при

слать землемера и только после правильной разбивки будет возможна широкая агрономическая работа.

П.Н.Сергейчик.

№ 166

БУДЕТ ЭЛЕКТРИЧЕСТВО

Общее собрание родителей и учащихся Осиповичской семилетки, заслушав доклад зав. школой тов. Ясюнаса о необходимости замены освещения керосином электричеством, так как керосиновое освещение обходится гораздо дороже электричества, постановило ввести в школу электричество.

Деньги в сумме 180 р., которые потребуются для этого, решено собрать путем самообложения. На каждого ученика, кроме освобожденных от взноса платообучения, их около 50 чел., приходится по 90 коп. Работу по проводке уже начали, с 15-го числа 2-я смена и кружки будут работать и учиться при электрическом свете.

Рубинчик.

№ 185

В деревнях Протасевичи и Дражня Верейцовского сельсовета кулачество свило себе прочные гнезда. Там, где сильно кулачество, почему-то не может не процветать и кустарное производство самогона в самых широких размерах...

Падрыхтаваў Ю.В.Клеванец.

Аб чым пісала газета «Камуніст» у 1929 г.*

4 студзеня

УСЕ НА ВЫБАРЧЫЯ СХОДЫ!
КАГО ВЫСТАЎЛЯЮЦЬ КАНДЫДАТАМІ ЖЫЦІНСКІЯ КУЛАКІ

Кулакі вёсак Жыціна і Крамка рыхтуюцца для перавыбараў, вылучыўшы сваіх кандыдатаў у саветы. Хто яны, кулацкія кандыдаты?

Мошчын Мацьвей — быўшы валасны старшыня, заможнік, чужды партыі і ўладзе элемент.

Шляхцін Пракоп — быўшы бандыт.

Перапыка Паўла — кулак, абкладзены ў індывідуальным парадку.

Кутынка Кірыла — быўшы валасны судзьзя, які прабыў судзьзей 12 год да Кастрычнікавай рэвалюцыі.

Капейка Іван — унтэр-афіцэр царскай арміі, мае добры аўтарытэт сярод кулачча.

Беднаta і серадняцтва павінны даць рашучы адпор кулаччу і іх кандыдатам, якія хочуць раскласьці працу саветаў.

Яршоў.

НЯ ЛАЗЬНЯ, А ГРАЗЬНЯ

У вёсцы Вубалацьці Асіповіцкага раёну прыблізна на 10 двароў прыходзіцца адна лазьня. Здаецца і добра. Але ж ня зусім. Лазьні бяз сянец, дзіравыя, брудныя, без цёплае вады. Памыўшыся ў іх выйдзеш, як той чорт з пекла, да таго ж брудны і паскудны.

Звычайна мы находзім грошы і на папоў, і на дзякоў, а вось каб за добрыя лазьні ўзяцца, дык гэтага ў нас і нямашака.

Брудны.

6 студзеня

ПЕРАМАГАЮЧЫ СУПРАЦІЎЛЕНЬНЕ КУЛАКА, ПРАВОДЗІМ САМААБКЛАДАНЬНЕ

На сходзе вёскі Карытнае (Асіповіцкі раён) кулакі імкнуліся сарваць самаабкладаньне, але яны праваліліся. Добра арганізаваныя беднякі і середнякі далі ім адпор і прынялі самаабкладаньне на пашырэньне школы і набыцьце школьнага інвентару.

А.Сяўрук.

КВАДРАТОВЫ САЖАНЬ ЗЯМЛІ ДАЎ ПУД КАРНЯПЛОДАЎ

Шчыра дзякую рэдакцыю газэты «Камуніст» за насеньне морквы і буракоў, якое яна мне прыслала вясной мінулага году... Усё лета мае карняплоды расьлі добра, я толькі стараўся прапалваць і праражваць. Увосень я са ўсяго куска накапаў 100 пудоў карняплодаў. Асобныя буракі важылі па 10 ф., а морква па 5 ф.

Цяпер карняплоды пачаў даваць карове. Карова адразу пачала прыбаўляць малака. Я на лета засею большую плошчу пад карняплоды і раю ўсім сялянам сеяць карняплоды ў сябе.

Сіротка. Сухлава, Асіповіцкі раён.

*Захаваны тагачасны стыль і арфаграфія

11 студзеня

ЖАНЧЫН — У САВЕТЫ

Трэба адзначыць арганізаванасьць жанчын на выбарах у Зборскім сельсавеце. Наведаваньне імі сходаў дасягае 50 проц. У вёсцы Смык-Слабада ў савет абрана 1 жанчына, у рэўкамісію — таксама 1 жанчына, у вёсцы Цяплуха — таксама 1 жанчына. Трэба спадзявацца, што процант жанчын у сельсавеце будзе даведзены да 25.

В'юркоў.

16 студзеня

З ВЫБАРЧЫХ ВУЧАСТКАЎ

Праваліліся кулакі ў вёсцы Кассё (Сьвіслацкі раён). Намецілі яны ўжо і склад савета, але амаль на 100 процантаў прайшлі кандыдаты партыйнай ячэйкі і беднаты. Бедната была добра арганізавана.

У перавыбарах значна дапамаглі рабочыя шклозавода «Акцябр», якія правялі вялікую растлумачальную работу і арганізавалі канцэрт пасьля сходу. Работніцы завода арганізавалі на час выбараў дзіцячы пакой.

А. Крацар.

6 лютага

РАЕШНІК

Як у Ясеньскім савеце
Бацюшкі!
Сакратар гарэлку хлешча
Матушкі!
Па гарэлку па па пьяную
Бацюшкі!
Гатоў ісці вярсту-другую
Матушкі!
Носам счуе ён то зельле
Бацюшкі!
Кожны дзень у яго пахмельле
Матушкі!
Яго сьвіньні цалавалі
Бацюшкі!
Ледзь вушэй не абарвалі
Матушкі!

Дзед Няфёд.

15 лютага

ЦЯГА Ў ПАРТЫЮ. ЦІ НЯМА АДВОДАЎ?

Кандыдаты.

Кісялеў Мітрафан Васілеў, Марушкевіч Міхась Савельлеў — стрэлачнікі станцыі Асіповічы.

Панкратовіч Сергей — памочнік машыніста ст. Асіповічы.

Пугачоў Міхась Федараў, Маслоўскі Станіслаў Рыгораў, Зіньковіч Іван Сцяпанаў — рабочыя шклозаводу «Кастрычнік»

Міхалькевіч Фэлікс Андрэянаў, Ібрагімаў Гарай Гараеў, Кудракоў Цімох Янкаў — грузчыкі ст. Градзянка.

Шаціла Нікола Міхасёў — рабочы шклозавода «Кастрычнік».

Родаў Арон Гіршаў — сябра арцелі ў Ясені.

Шаціла Антон Антонаў — грузчык ст. Градзянка.

17 красавіка

НАША ДАПАМОГА СЕЛЯНІНУ

Калі пачалася падрыхтоўка да веснавой сяўбы, то вучні Сьвіслацкай сямігодкі пачалі таксама рыхтавацца. Перш за ўсё на сходзе вучняў быў заслухан даклад аб веснавой сяўбе, дзе і было парашона: кожнаму вучню 2-га канцэнтру ў абавязковым парадку ўнесьці «сельска-гасп. пятачок» для закупкі сельска-гаспадарчай літаратуры, каб гэтую літаратуру раздаць па вёсках сялянам. Апроч таго, вучні разбіліся на групы па 15 чалавек. Кожная група павінна выйсці у вёскі бліжэйшых саветаў, там праводзіць сходы сумесна з другімі арганізацыямі, рабіць пастаноўкі і іншае. Таксама кожны вучань вядзе агітацыю аб ачыстцы і сартыроўцы насеньня...

Селькор.

3 красавіка

АРГАНІЗУЕМ КАМСАМОЛЬСКАЕ МАШЫННАЕ ТАВАРЫСТВА

Нарада сэкратароў камсамольскіх ячэек Асіповіцкага раёну пасьля абгаварэньня пытаньня аб удзелу камсамольскай арганізацыі ў пасяўной кампаніі парашыла арганізаваць у адной з вёсак машыннае таварыства з камсамольцаў пад назваю «Асіповіцкі камсамолец».

Сэкратары ячэек на гэту справу парашылі ўнесьці па два рублі і выклікаюць пайсці па іх прыкладу камсамольцаў.

12 красавіка

Паважаны т. рэдактар

Не адкажыце зьмясьціць у вашай газэце наступнае: за апошні час зьявіліся чуткі,

што я быў у арганізацыі яўрэйскай моладзі «Кадымо». Запраўды, з 1921 года мяне акружаў такі асяродак. Магчымасьць жа наступлення на чыгунку у 1922 годзе і штодзенная работа на чыгунцы ў якасьці рабочага на фактах даказала мне, што толькі савецкая ўлада пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі правільна вырашае нацыянальнае нытаньне, і ў 1923 годзе, зразумеўшы буржуазную падаплёку «Кадымо», я канчаткова парваў сувязі з гэтым асяродкам і з 1924 года я зьяўляюся сябрам ЛКСМ і актыўна ў ім працую.

Электраманцёр Рубінчык Давід Ісакавіч, ст. Асіповічы.

1 мая

БУДЗЕМ СЕЯЦЬ ЧЫСТЫМ ЗЯРНОМ

У вёску Каменічы Сьвіслацкага раёну прыбыў доўгачаканы зернаачысціцельны абоз. Камсамольская група арганізавала ачыстку збожжа ўдовам, беднякам і інвалідам, за 10 днёў работы ачышчана на вёсцы 1822 пуды насення. Такім чынам, насенне для пасеву аказалася поўнасьцю ачышчаным.

Камяніцкі.

22 мая

БАНДЫЦКІ ДРУГ — АБ'ЕЗДЧЫК

У Градзянскім лясніцтве працуе аб'ездчыкам Трэпашко. Тут дадзім маленькую характэрыстыку гэтага «савецкага працаўніка».

У 1920 годзе пры белапаляках Трэпашко быў начальнікам павятовай міліцыі ў Чэрвені. Праводзіў ён агітацыю супраць камуністаў разам з камісарам Жылінскім, які трымаў сувязь з бандытамі. Пасьля выкрыцьця бандытскага друга Жылінскага яго кампаньён Трэпашко пралез у Жорнаўскую лясную школу, якую скончыў і быў прызначан аб'ездчыкам. Вось і ўсё. Астатняе слова, спадзяемся, скажа камісія па чыстцы савецкага апарату.

Селянін.

24 мая

У Лапіцкай сямігодцы (Асіповіцкі раён) у апошні час разьвіўся антысемітызм. На лекцыі ў час выпытаў вучаніца 6 класы, дачка папа Залезінская Надзя пракрычала: «праклятыя жыдзеняты». Кулакі і дэклясіраваны элемент школы разьвівае антысемітызм, б'е дзяцей саматужнікаў і рабочых...

3 ліпеня

СЬПЯЦЬ ЦЭЛЫ ГОД

У вёсцы Татаркавічы, Касянскага сельсавету, ячэйка Асаавіяхіму за цэлы год не правяла ніводнага сходу. Сябры ня ведаюць, каму плаціць адлікі, сэкратар ячэйкі Усаў Янка сьпіць у шапку.

Лёгкая кавалерыя.

СПАБОРНІЦТВЫ ПА ВАЕНІЗАЦЫІ НАСЕЛЬНІЦТВА

Асіповіцкі райсавет Асаавіяхіму выклікае на сацыялістычнае спаборніцтва Стара-Дароскі райсавет.

Умовы спаборніцтва наступныя: лік сяброў давесці да 2500, з іх жанчын — 300. Канчаткова арганізацыйна аформіць ячэйкі, у кожным сельсавеце мець апорную ячэйку. Ліквідаваць запазычанасць па сяброўскіх адліках. Пачаць працу з начскладам запасу. Разгарнуць летнюю вайскавую вучобу ў полі, ахапіць ей 50 процантаў сяброў, восенню падагуліць вынікі зімовай і летняй вучобы на стрэчных манэўрах, да зімовай вучобы набыць усе неабходныя падручнікі, мець пры кожнай ячэйцы куток, бібліятэчку. У кожнай моцнай ячэйцы мець дробна-каліберную стрэльбу, для вясковых ячэек мець у райсавеце перасоўку з двох стрэльб. Пашырыць падпіску на часопісы «Осоавиахим», «Авиация и химия», у кожнай ячэйцы мець іх. Распаусюдзіць 300 значкоў. Вынікі спаборніцтва падагульняюцца пасьля сканчэньня летняга перыяду працы — у кастрычніку.

Асіповіцкі райсавет.

5 ліпеня

ЯК БУДУЮЦЬ У АСІПОВІЧАХ

З будаўнічых работ, якія сёлета праводзіць Асіповіцкі камгас, зварачае на сябе ўвагу пабудова вэтэрынарнай лячэбніцы. На яе адпушчана звыш 14 тысяч рублёў, за якія сёлета будуюцца тры будынкі: лячэбніца, заразнае аддзяленьне, дом для кватэр пэрсаналу. Будаўніцтва аддана Замоскаму агнятрываламу таварыству «Бэтон». Гэта яго першая буйная праца, дагэтуль яно вырабляла толькі трубы і чэрапіцу...

Камгас прыклаў усе стараньні да пацяненьня будаўніцтва: вялікая эканомія маецца на закупцы матэр'ялаў, скарыстоўваецца цэгла ад разабраных будынкаў. Першы обжыг вапны з Сталшчанскіх пакладаў, што саматужна распрацоўвае «Бэтон» да пуску ў ход вапнянага заводу, які тут ужо будуецца — пайшоў на пабудову лячэбніцы. Але ўсё ж у каштарыс на 30 процантаў не ўкладуцца. Акруга склала яго нерэальна, не ўлічыла шмат чаго. Зварачвае на сябе ўвагу адсутнасьць цэманту, яго няма дзе дастаць і ўся пабудова ідзе на вашне.

Вельмі дзіўная і недарэчная гісторыя атрымалася з бальніцай, якую летась прыстасавалі з былога будынку РВК, зрабіўшы вялікую прыбудову. Гэтую таксама буйную і знячную пабудову ніяк нельга скончыць. Камгас для сканчэньня працы па перабудове для абсталяваньня ваннай, прыбіральні, пастаноўкі пячэй, накатцы столі, афарбоўцы падлог, жасцянай страхі і інш. — патрабуе 8 тысяч рублёў; паслаў у Акрздраў каштарысы, пайшоў нават на даволі рызыкоўную штуку: набыў за лік сродкаў вэтэрынарнай лячэбніцы шмат матэр'ялаў, якія знайшоў па таннай цане і якія цяпер нідзе не адшукаеш, а Акрздраў лічыць каштарыс «дутым», свайго ня шле, на мейсца для праверкі патрэб нікога з спецыялістаў не пасылае. Урэшце на сканчэньне бальніцы надзеі няма — сэзон пройдзе.

Тое ж і з нардомам: будуецца ён ужо два гады, укладзена 20 тысяч рублеў (каштарыс ізноў нерэальны — 17 тысяч), а зроблена далёка ня ўсё... Будынак жа скарыстоўваць для працы нельга.

Трэба на такое становішча з Асіповіцкімі пабудовамі, якое мае і шмат іншых недахопаў, ...зьвярнуць сваю ўвагу Рабоча-сялянскай інспэкцыі. Падштурхнуць тут трэба, і як мага хутчэй.

РЭЛ.

21 ліпеня

НЕ ДАДЗІМ БЕДНАТУ Ў ЭКСПЛЕАТАЦЫЮ

У вёсцы Ясень Асіповіцкага раёну ёсць больш дзясятку бядняцкіх гаспадарак. Шмат тут ёсць і ўдоў. Раней гэтая бедната прымушана была ў час касавіцы ісці да кулака, прасіць дапамагчы прыбраць сенажаць з тым, каб потым у жніво адпрацаваць кулаку. Бязьлітасна эксплуатавалі кулакі вясковую беднату.

Але ў гэтым годзе ўжо няма такога становішча. Вясковая камсамольская ячэйка выявіла ўсе бядняцкія гаспадаркі і прынялася за дапамогу беднаце. Частка беднаты ўжо абслужана дружынаю.

М.Рамашка.

26 ліпеня

АСІПОВІЧЫ БУДУЮЦЦА

Такі невялікі параўнаўча пункт Асіповічы. А будаўніцтва ў ім штогодна пашыраецца. Сёлета на новае будаўніцтва будзе патрачана каля 1.178 тысяч рублёў, з іх 211.916 рублёў на пабудову 24-кватэрнага трохпавярховага дому.

Пабудова гэтага дому мае для нас велізарнае значэньне, прымаючы на ўвагу маючыйся кватэрны крызіс. Гэты дом — каштоўны ўклад у паляпшэньне рабочага быту.

Пабудова трохпавярховага дому, нягледзячы на некаторыя недахопы, хутка пасоўваецца наперад. Першы і другі паверх ужо выведзены. Цяпер працуюць над трэцім паверхам.

Акрамя пабудовы дома ідзе праца па паляпшэньню чыгуначных шляхоў у сувязі з ростам нашага тавараабароту...

А.С.

21 жніўня

ПАБУДУЕМ ТАНК ІМЯ ГАЗЭТЫ «КАМУНІСТ»

...Унашу адзін рубель і выклікаю Дорняка Е., Дзеркрса В., Сідаровіча А., Камарніка, Яцко, Валенчыца А., Пінчука В., Сяліцкага В., Чаропка, Боева, Ганчарова А., Юркаўца А. і Бугорфскага (Ясень).

Трыбушэўскі.

4 верасня

ДАДЗІМ СРОДКІ НА ПАБУДОВУ ТАНКА

31 жнівеня асьветаўцы Асіповіцкага раёну на сваёй канферэнцыі аднагалосна парашылі адлічыць аднадзённы заробак з верасьнёўскай пэнсіі на пабудову танка імя газэты «Камуніст». Асіповіцкія асьветаўцы выклікаюць асьветаўцаў Сьвіслацкага раёну правесьці таксама збор сродкаў на пабудову танка.

22 верасня

АДДАЮСЯ АБАРОНЕ СССР

У сувязі з апошнімі падзеямі на Кітайска-Усходняй чыгунцы аддаюся абароне айчыны пралетарыяту — СССР і прашу Рэвалюцыйны Вайсковы Савет паслаць мяне ў шэрагі Далёка-Усходняй арміі.

П.Войнаў, в. Вязаўніца.

Падрыхтаваў Ю.В.Клеванец.

Па старонках асіповіцкай раённай газеты «Калгасная праўда»

1936 г.

21 жніўня

ТРАЦКІСТ, ДВУРУШНІК СНЕЖЫН ВЫКЛЮЧАН З ПАРТЫІ

«Ніштo так не варожа партыі большэвікоў і працоўным масам, як двурушніцтва» («Правда»).

Больш двух год працаваў рэдактарам раённай газеты «Калгасная Праўда» «член партыі» Снежын М. Увесь час прабывання ў партыі Снежын скрываў аб сваёй сувязі з трацкістамі. Будучы студэнтам Маскоўскай Акадэміі комуністычнага выхавання імя Крупскай, з 1927 па 1930 гг., ён атрымаў цесную сувязь з ад'яўленымі трацкістамі Грынчанка і яго жонкай Яблонскай Руняй — сястрой жонкі Снежына — Яблонскай Іды. Да Грынчанкі Снежын хадзіў на кватэру, меў гутаркі з імі і др. Пасля XV з'езда партыі за актыўную трацкісцкую дзейнасць Грынчанка быў судзім і выслан, а праз некаторы час ён звярнуўся. І пасля гэтага Снежын працягвае трымаць цесную сувязь з Грынчанка, якога, як неразброіўшагася трацкіста — ворага партыі судзяць і высылаюць у другі раз. Снежын пасля гэтага не толькі не парывае сувязь з жонкай Грынчанкі-Яблонскай Руняй, выключанай у 1933 годзе з партыі за трацкісцкую контррэволюцыйную дзейнасць, а наадварот аказвае ёй матэрыяльную дапамогу. У 1934 годзе трацкістка Яблонская Руня прыязджае к Снежыну і пакідае ў яго на некаторы час сваё дзіця.

У ліпені 1936 года да Снежына з Кіева прыязджае яго швагерка (жонка брата Яблонскай Іды). Ад яе ён даведваецца, што Яблонская Руня за контррэвалюцыйную трацкісцкую дзейнасць выслана. Снежын адразу ж не заявіў аб гэтым ні райкому, ні сваёй партарганізацыі, ні партарганізацыі, дзе працуе яго жонка Яблонская Іда. І толькі 2 жніўня ён заяўляе аб гэтым факце і ні слова аб сваёй сувязі з трацкісцказіноўеўскім контррэвалюцыйным ахвосцем.

Аб сваёй сувязі з трацкістамі Снежын не гаварыў ні ў час праверкі, ні пры абмене партдакументаў. Варта адзначыць, што нават тады, калі ў яго ў час праверкі затрымлівалі партбілет, двурушнік ні слова аб сваёй сувязі з трацкістамі. Яго дадаткова правяраюць камісіі, прымаўшыя партарганізацыю. І на гэты раз ён утайвае ад партыі аб сваёй сувязі з контррэвалюцыйнымі трацкістамі.

17 жніўня Бюро РК КП(б)Б разглядала справу аб сувязі Снежына з трацкістамі Грынчанка і яго жонкай Яблонскай Руняй. Ён усяк адхіляўся ад прамога адказу на пастаўленыя яму пытанні, двурушнічаў, імкнуўся і на гэты раз абмануць партыю, утайваў сваю сувязь з трацкістамі — праклятымі ворагамі нашай радзімы. Але гэта яму не ўдалося. Сувязь Снежына з трацкістамі ўстаноўлена. Двурушнік не здаецца. Ён імкнецца па-абывацельскі апраўдваць сваю сувязь з трацкістамі тым, што моў яму непрыемна было ненаведваць радных. Для Снежына, бачыце, галоўнае не пакрыўдзіць радню, а што гэта радня з'яўляецца заклятымі ворагамі партыі і Савецкай улады — для яго ўсё роўна.

Усё гэта адбівалася і на практычнай рабоце рэдакцыі і друкарні газеты. Хіба-ж не факт, што Снежыным, без папярэдняй праверкі, прымаліся работнікі, як у рэдакцыю, так і ў друкарню. У выніку чаго ў друкарні быў прынят наборшчык Трахтэнберг, раней судзімы і высланы за друкаванне контррэвалюцыйнага трацкісцкага матэрыяла. Быў прынят таксама Ляховіч, звольнены з работы Гомельскай друкарні Палесдруку. У штат работнікаў рэдакцыі быў прынят нехта Гурэвіч, які будучы ў калгасе імя Чарвякова выступіў з контррэвалюцыйнай прамовай аб немагчымасці пабудовы комунізма ў нашай краіне. Не было большэвіцкай барацьбы наладжванне партыйнага аддзела ў газеце і работы селькорамі.

За абман партыі аб сваёй сувязі з контррэволюцыйнымі трацкістамі Грынчанка і Яблонскай Руняй, за ўкрыццё іх контррэволюцыйнай дзейнасці, за прамое пасобнічэство гэтым трацкістам, за акружэнне сябе неправеранымі, а па сутнасці

класава-варожымі элементамі ў друкарні і рэдакцыі Снежын знят з пасады рэдактара і выключан з партыі.

23 жніўня

НАШ ПРЫГАВАР — РАСТРАЛЯЦЬ!

21 жніўня адбыўся пленум Верайцоўскага сельсовета. Удзельнікі пленума, азнаёміўшыся з абвінаваўчым заключэннем Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда па справе контррэвалюцыйнай трацкісцка-зіноўеўскай банды, з абурэннем выказвалі свой гнеў і нянавісць да бандытаў фашысцкага тэрора, забіўшых лепшага сталінца — Сяргея Міронавіча Кірава, і рыхтаваўшых тэрор на любімага Сталіна і др. кіраўнікоў партыі і Совецкай дзяржавы.

Брыгадзір калгаса «Кастрычнік» тав. Нелепка і члены сельсовета т. т. Ласіцкі, Грышановіч і іншыя патрабавалі ад суда бязлітаснай кары адраднікам працоўнага народу. Яны заклікалі ўвесь актыў сельсовета яшчэ больш узмацніць класавую пільнасць, яшчэ лепш працаваць па выкананню важнейшых мерапрыемстваў партыі і ўрада.

Пленум абавязаўся за час стаханаўскага дэкадніка ў асноўным закончыць усе гаспадарчыя работы і выканаць план дарожнага будаўніцтва і лесавывазак.

Лук'яновіч.

КАРАЦЬ СМЕРЦЮ ВОРАГАЎ НАРОДА

У рэдакцыю працягваюць паступаць матэрыялы ад рабочых, калгаснікаў і служачых раёна, прасякнутыя гневам і нянавісцю да подлых ворагаў працоўных, да прадажных сабак міжнароднага фашызму — трацкісцка-зіноўеўскага ахвосця, імкнуўшыхся адабраць у працоўных іх любімых правадыроў.

Рабочы-машыніст Асіповіцкай электрастанцыі тав. Ласіцкі гаворыць:

— Гэтыя гады ўвесь час вялі шкодную работу ў нашай краіне, і калі яны ўбачылі, што з гэтага нічога не выйдзе, што краіна пераможна будуе соцыялізм, — гэтыя выродкі чалавецтва сталі на шлях забойства кіраўнікоў партыі і ўрада з-за вугла. Жыццё нашага роднага, любімага Сталіна мы будзем берагчы і ахоўваць, як зяніцу вока.

Т.т. Чэчэня, Красны, Івінскі, Закржэўскі, Науменка і інш. рабочыя дэпо заяўляюць аб сваёй бязмежнай любві і адданасці да любімага тав. Сталіна. Яны патрабавалі караць смерцю ворагаў народа.

* * *

— Няможа быць месца ў нашай краіне гадам фашысцкага тэрору, — заяўляюць члены калгаса імя Будзённага, Ліпеньскага сельсовета.

Выступаючы на сходзе членаў калгаса, тав. Чыгілейчык сказаў:

— Раней у мяне не хапала хлеба, жыў я вельмі бедна. Зараз, дзякуючы любімаму Сталіну, жыву заможна і культурна. І гэтага, што даў нам тав. Сталін, мы не аддамо нікому, і будзем стальной сцяною ахраняць нашага роднага бацьку тав. Сталіна.

Падрыхтаваў В.У.Хурсік.

Вернутыя імёны

Складанымі і супярэчлівымі ў гісторыі савецкай улады былі перадваенныя дзесяцігоддзі. Гэта быў час не толькі вялікіх сацыяльных і палітычных пераўтварэнняў, але і час небывалых па працягласці і маштабах неабгрунтаваных масавых палітычных рэпрэсій, якія сталінскі рэжым разгарнуў супраць свайго народа.

Атмасфера падазронасці і страху, даносы, паклёпы, сфальсіфікаваныя суровыя справы і іншыя праявы беззаконня і парушэння элементарных правоў чалавека сталі характэрнай асаблівасцю савецкай рэчаіснасці, асабліва ў канцы 1920 — 1930-х гадоў.

Кіраўнікоў усіх рангаў арыентавалі на пошук ворагаў народа і шкоднікаў, якія перашкаджаюць сацыялістычным пераўтварэнням і асабліва калгаснаму будаўніцтву. Рэпрэсіўны аппарат таталітарызму працаваў і пасля вайны.

Людзі розных узростаў і прафесій, розных нацыянальнасцей, поглядаў і веравызнанняў, людзі, поўныя сіл і жадання працаваць, гадаваць дзяцей, поўныя надзей на лепшую будучыню, траплялі раптам у шэрагі «ворагаў народа», былі асуджаны да высылкі ці доўгіх тэрмінаў зняволення ў папраўча-працоўных лагерах, а хто і да рас-

стрэлу. Хто толькі ні трапіў пад бязжаласныя колы рэпрэсіўнай машыны. Ёсць у гэтым сумным спісе і прадстаўнікі інтэлігенцыі, і ваеннаслужачыя, і чыгуначнікі, і сяляне. Якіх толькі абвінавачванняў не навешвалі на іх тагачасныя апрычнікі. Прыгаворы стракацелі штампаванымі фармулюроўкамі: «за антысавецкую прапаганду», «за захоўванне контррэвалюцыйнай літаратуры», «за шпіёнскую дзейнасць у калгасе», «за сувязь з замежнымі разведорганамі», «за шпіянаж на карысць Польшчы», «за членства ў контррэвалюцыйнай тэрарыстычнай шпіёнскай арганізацыі» і інш.

У 1950—1960-я гады, калі адбылося развянчанне культу асобы Сталіна, многа нявінных ахвяр рэпрэсій было рэабілітавана. Рэабілітацыя астатніх адбылася ў апошнія дзесяцігоддзі XX ст., калі на дзяржаўным узроўні пачалася планамерная работа па пераглядзе сфабрыкаваных спраў і рэабілітацыі ахвяр палітычных рэпрэсій.

Ніжэй прыводзіцца спіс жыхароў Асіповіцкага раёна, якія сталі ахвярамі рэпрэсій і былі рэабілітаваны на момант стварэння нашай кнігі. Але работа па вяртанні людзям іх чэсных імёнаў працягваецца.

Ураджэнцы і жыхары г. Асіповічы і Асіповіцкага раёна, якія падверглісяся беспадстаўным палітычным рэпрэсіям і пазней былі рэабілітаваны

АБРАМОВІЧ Гвідон Аляксандравіч, н. у 1880 на хутары Прудзішча Бярэзінскага р-на. Жыў у в. Пасекі Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 23.1.1933. Рэабілітаваны 15.8.1958.

АБРАМОВІЧ Іосіф (Есіп) Аляксандравіч, н. у 1880 на хутары Грыкіца Бярэзінскага р-на. Земляроб. Жыў у в. Пасекі. Рэпрэсіраваны 23.1.1933. Рэабілітаваны 15.8.1958.

АБРАМОВІЧ Казімір Станіслававіч, н. у 1914 у в. Прудок Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў, малатабоец паравозната дэпо ст. Асіповічы. Рэпрэсіраваны 28.7.1938. Рэабілітаваны 3.3.1939.

АБРАМОВІЧ Міхаіл Браніслававіч, н. у 1912 у в. Прудок, дзе і пражываў. Калгаснік калгаса «17 партз'езд». Рэпрэсіраваны 28.7.1938. Рэабілітаваны 3.3.1939.

АБРАМОВІЧ Міхаіл Іосіфавіч, н. у 1907 у в. Іванаўка Клічаўскага р-на. Калгаснік калгаса імя Варашылава. Пражываў у Асіповіцкім р-не. Рэпрэсіраваны 17.9.1937. Рэабілітаваны 10.2.1958.

АБРАМОВІЧ Фларыян Ігнатавіч, н. у 1876 у в. Прудок, дзе і пражываў. Вартаўнік 115-га кавалерыйскага палка. Арыштаваны 3.7.1938, адбываў пакаранне ў Мінскай турме. Расстраляны 29.10.1938. Рэабілітаваны 27.11.1989.

АГЕЕНКА Фёдар Максімавіч, н. у 1904 у в. Ляхавічы Чашніцкага р-на. Бухгалтар станцыі Асіповічы Беларускай чыгункі. Пражываў на ст. Асіповічы. Арыштаваны 20.2.1938. Расстраляны 24.5.1938. Рэабілітаваны.

АДАМОВІЧ Іван Яўменавіч, н. у 1884 у в. Сіманаўка Жлобінскага р-на. Пражываў у в. Свіслач Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 14.2.1937. Рэабілітаваны 28.2.1968.

АДАМОВІЧ Іван Яўменавіч, н. у 1887 у в. Селівонаўка Рагачоўскага р-на. Пражываў у в. Свіслач Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 20.11.1932. Рэабілітаваны 12.12.1967.

АДЫНЕЦ Павел Лукіч, н. у 1897 у в. Жорнаўка. Служыў у 70-й арміі. Рэпрэсіраваны 4.5.1943. Рэабілітаваны 1.6.1943.

АЖГІРЭЙ Фёдар Якаўлевіч, н. у 1886 у в. Машчанава Пухавіцкага р-на. Калгаснік калгаса «Чырвоны сцяг». Пражываў у в. Семіровічы Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 18.9.1937. Рэабілітаваны 5.8.1939.

АЗАРОНАК Мікалай Паўлавіч, н. у 1898 у в. Кассё, дзе і пражываў. Прыёмшчык Бабруйскага мясакамбіната. Арыштаваны 21.12.1937. Расстраляны 8.3.1938. Рэабілітаваны 27.11.1989.

АЗОЛЬ Вольга Паўлаўна, н. у 1896 у в. Каменічы Асіповіцкага р-на, дзе і пражывала. Калгасніца калгаса «Новы шлях». Рэпрэсіравана 23.1.1933. Рэабілітавана.

АКУЛЁНАК Андрэй Кандратавіч, н. у 1871, **АКУЛЁНАК Соф'я Мікалаеўна**, н. у 1890, іх дзеці **АКУЛЁНАК Васіль Андрэевіч**, н. у 1909, **АКУЛЁНАК Мікалай Андрэевіч**, н. у 1922, **АКУЛЁНАК Міхаіл Андрэевіч**, н. у 1917, **АКУЛЁНАК Уладзімір Андрэевіч**, н. у 1916 пражывалі ў в. Селянка Асіповіцкага р-на. Раскулачаны ў 1930. Пакаранне адбывалі ў г. Таўда Свярдлоўскай вобл. Рэабілітаваны 7.7.1993.

АКУЛЁНАК Марыя Андрэеўна, н. у 1911 у в. Заручэўе Асіповіцкага р-на, дзе і пражывала. Рэпрэсіравана 2.6.1930 за пабег з месца пасялення. Рэабілітавана 23.10.1989.

АКУЛІЧ Аляксандр Мікітавіч, н. у 1898 у в. Пабокавічы. Слесар 13-й дыстанцыі ст. Асіповічы. Пражываў на ст. Асіповічы. Арыштаваны 14.4.1938. Расстраляны 4.6.1938. Рэабілітаваны 18.10.1957.

АЛЕКСАНДРОВІЧ Вікенцій Адамавіч, н. у 1887 у в. Кум Вілейскай губерні. Стрэлачнік дэпо ст.

Асіповічы. Пражываў у в. Асіповічы. Арыштаваны 21.10.1937. Расстраляны 17.11.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

АЛЕКСАНДРОВІЧ Канстанцін Вікенцьевіч, н. у 1892 у в. Старыя Дарогі Чэрвеньскага р-на. Лесаруб лясгаса. Пражываў у р.п. Градзянка Асіповіцкага р-на. Арыштаваны 18.7.1937. Расстраляны 9.9.1937. Рэабілітаваны 16.3.1959.

АЛЕКСАНДРОВІЧ Канстанцін Сцяпанавіч, н. у 1915 у в. Старыя Дарогі Чэрвеньскага р-на. Сталяр. Пражываў у в. Лапічы Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 6.8.1937. Рэабілітаваны 22.3.1957.

АЛЬХОВІК Лявон Рыгоравіч, н. у 1893 у в. Чучча Асіповіцкага р-на. Калгаснік. Пражываў у в. Чучча. Арыштаваны ў 1937. Расстраляны 25.2.1938. Рэабілітаваны 24.12.1958.

АЛЬХОВІК Макар Адамавіч, н. у 1894 у в. Брыцалавічы Асіповіцкага р-на. Загадчык АРС лясгаса. Пражываў у Асіповічах. Рэпрэсіраваны 1.1.1945. Рэабілітаваны 25.11.1961.

АЛЬХОВІК Фядос Паўлавіч, н. у 1894 у в. Усціж Асіповіцкага р-на. Брыгадзір калгаса. Пражываў у в. Усціж. Рэпрэсіраваны 31.1.1945. Рэабілітаваны 14.8.1945.

АЛЬШЭЎСКІ Андрэй Васільевіч, н. у 1909 у в. Стаялава Клічаўскага р-на. Выдзімальшчык шкла шклозавода «Кастрычнік». Пражываў у Асіповіцкім р-не. Рэпрэсіраваны 10.12.1944. Рэабілітаваны 5.2.1955.

АЛЬШЭЎСКІ Гаўрыла Міхайлавіч, н. у 1888 у в. Падгародна былой Валынскай губ. Галоўны кандуктар Асіповіцкага кандуктарскага рэзерву. Рэпрэсіраваны 3.12.1937. Рэабілітаваны 31.12.1957.

АЛЬШЭЎСКІ Дзмітрый Іосіфавіч, н. у 1905 у г. Клічаў. Майстар па выдзіманні шкла шклозавода «Кастрычнік» Асіповіцкага р-на. Пражываў у Асіповіцкім р-не. Рэпрэсіраваны 24.8.1937. Рэабілітаваны 7.5.1958.

АЛЬШЭЎСКІ Мікалай Іванавіч, н. у 1906 у в. Радзівілішкі, Літва. Пражываў у г. Асіповічы. Арыштаваны 26.7.1938. Расстраляны 19.10.1938. Рэабілітаваны 11.5.1989.

АЛЯКСАНДРАЎ Антон Рыгоравіч, н. у 1903 у в. Аляксандраўка Старадарожскага р-на. Працаваў у Ліпеньскай школе. Пражываў у в. Вярбілава Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 19.9.1937. Рэабілітаваны 22.2.1990.

АЛЯКСАНДРАЎ Вячаслаў Міхайлавіч, н. у 1912 у в. Вярэйцы Асіповіцкага р-на. Стрэлачнік. Пражываў у в. Вярэйцы. Арыштаваны 6.7.1938. Расстраляны ў Мінску 19.10.1938. Рэабілітаваны 6.6.1989.

АЛЯХНОВІЧ Аляксей Ісідаравіч, н. у 1900 у в. Каменічы Асіповіцкага р-на. Селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Каменічы. Рэпрэсіраваны 25.3.1930. Рэабілітаваны 13.7.1989.

АЛЯХНОВІЧ Мікалай Міхайлавіч, н. у 1906 у в. Вязычын Асіповіцкага р-на. Стрэлачнік. Пражываў на ст. Свіслач Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 30.9.1940. Рэабілітаваны 29.9.1965.

АЛЯХНОВІЧ Рыгор Сідаравіч, н. у 1893 у в. Вязычын Асіповіцкага р-на. Калгаснік калгаса «Камунар». Пражываў у в. Прудзішча Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 20.8.1938. Рэабілітаваны 14.12.1938.

АЛЯШКЕВІЧ Аляксей Васільевіч, н. у 1889 у в. Каменічы Асіповіцкага р-на. Пражываў у в. Каменічы. Рэпрэсіраваны 24.9.1936. Рэабілітаваны 15.7.1959.

АЛЯШКЕВІЧ Антон Іосіфавіч, н. у 1905 у в. Уголец Асіповіцкага р-на. Рабочы ваенна-будаўнічага участка ваенна-будаўнічых работ № 76. Пражываў у г. Асіповічы. Рэпрэсіраваны 13.8.1937. Рэабілітаваны 14.7.1960.

АЛЯШКЕВІЧ Васіль Раманавіч, н. у 1906 у в. Каменічы Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Рэпрэсіраваны ў 1929. Пакаранне адбываў у Зейскім р-не Амурскай вобл. Рэабілітаваны 22.1.1993.

АЛЯШКЕВІЧ Вікенцій Людвігавіч, н. у 1878 у в. Жукава былога Ігуменскага павета. Пражываў у в. Зашыбіна Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 13.1.1933. Рэабілітаваны 20.11.1964.

АЛЯШКЕВІЧ Іван Акімавіч, н. у 1897 у в. Бычына Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 2.1.1930. Вызвалены 16.6.1930.

АЛЯШКЕВІЧ Міхаіл Кузьміч, н. у 1901 у в. Каменічы Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 26.3.1930. Рэабілітаваны 13.7.1989.

АЛЯШКЕВІЧ Павел Іосіфавіч, н. у 1904 у в. Вярэйцы Асіповіцкага р-на. Рабочы ўчастка ваенна-будаўнічых работ № 76. Пражываў у г. Асіповічы. Рэпрэсіраваны 6.8.1937. Рэабілітаваны 14.7.1960.

АЛЯШКЕВІЧ Раман Агеевіч, н. у 1892 у в. Каменічы Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Рэпрэсіраваны 24.9.1936. Рэабілітаваны 27.5.1959.

АЛЯШКЕВІЧ Рыгор Сцяпанавіч, н. у 1909 у в. Каменічы Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Арыштаваны 20.1.1938. Расстраляны 19.4.1938. Рэабілітаваны 20.10.1956.

АМЕР Антон Іванавіч, н. у 1908 у Бабруйскім р-не. Рабочы-шкловыдзімальшчык шклозавода «Кастрычнік» Асіповіцкага р-на. Пражываў у Асіповіцкім р-не. Арыштаваны 15.11.1937. Расстраляны 6.12.1937. Рэабілітаваны 26.3.1959.

АНДРУСОВІЧ Павел Пятровіч, н. у 1890 у Лагойскім р-не. Грузчык леспрамгаса. Пражываў на ст. Лапічы Асіповіцкага р-на. Арыштаваны 6.8.1937. Расстраляны 15.10.1937. Рэабілітаваны 12.5.1958.

АНДРЫЕЎСКІ Канстанцін Іванавіч, н. у 1904 у в. Хвесеўка Чарнігаўскай вобл. Чорнарабочы Дуброўскага лесапункта. Пражываў у в. Вялікая Грава Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 19.9.1937. Рэабілітаваны 5.7.1958.

АНДРЭЙЧЫКАЎ Кузьма Фёдаравіч, н. у 1918 у в. Купелы Магілёўскага р-на. Электраманцёр элек-

трастанцыі. Пражываў у г. Асіповічы. Рэпрэсіраваны 6.8.1938. Рэабілітаваны 17.11.1938.

АНІСІМЧУК Аляксей Адамавіч, н. у 1913 у в. Рэчкі Чэрвеньскага р-на. Пражываў на ст. Градзянка. Рабочы завода «Спартак». Рэпрэсіраваны ў сакавіку 1931. Рэабілітаваны 9.3.1931.

АНТАНЕНКА Андрэй Ільіч, н. у 1910 на хутары Гай былой Канатопскай акругі. Рабочы. Пражываў на ст. Асіповічы. Рэпрэсіраваны 1.2.1933. Рэабілітаваны 30.8.1989.

АРБУЗ Іван Сямёнавіч, н. у 1899 у в. Кассё Асіповіцкага р-на. Пражываў у в. Копча Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 27.3.1930. Рэабілітаваны 13.7.1989.

АРЛОЎ Сямён Ільіч, н. у 1896 у в. Наваазёраўка былой Віленскай губ. Шавец. Пражываў у г. Асіповічы. Рэпрэсіраваны 17.3.1933. Рэабілітаваны 20.11.1964.

АСВЯЦІНСКІ Антон Іосіфавіч, н. у 1911 у в. Старэва Слуцкага р-на. Майстар шклозавода «Кастрычнік». Пражываў у Асіповіцкім р-не. Рэпрэсіраваны 25.7.1938. Рэабілітаваны 22.3.1939.

АСВЯЦІНСКІ Іван Іосіфавіч, н. у 1908 у в. Старэва Слуцкага р-на. Майстар шклозавода «Кастрычнік». Пражываў у Асіповіцкім р-не. Рэпрэсіраваны 24.7.1938. Рэабілітаваны 22.3.1939.

АСІЕЎСКІ Міхаіл Іосіфавіч, н. у 1899 у в. Зборск Асіповіцкага р-на. Галоўны кандуктар ст. Асіповічы. Пражываў у г. Асіповічы. Рэпрэсіраваны 18.7.1944. Рэабілітаваны 8.12.1964.

АСІПОВІЧ Фёдар Аляксандравіч, н. у 1898 у в. Крычкі былога Заслаўскага р-на. Інспектар Дзяржстраху. Пражываў у в. Новая Дражня Асіповіцкага р-на. Арыштаваны 3.6.1938. Расстраляны 10.10.1938. Рэабілітаваны 24.12.1958.

АСТАПЕНЯ Мікалай Іосіфавіч, н. у 1923 у в. Дудзічы Мінскай вобл. Машыніст друкарні. Пражываў у г. Асіповічы. Рэпрэсіраваны 24.6.1944. Рэабілітаваны 13.1.1947.

АСТАПОВІЧ Аляксандр Астапавіч, н. у 1897 у в. Асіповічы. Качагар на чыгунцы. Пражываў у в. Камарын Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 16.11.1937. Пакаранне адбываў у Волжскім ППЛ. Рэабілітаваны 7.3.1960.

АСТАПОВІЧ Канстанцін Іванавіч, н. у 1897 у в. Асіповічы, дзе і пражываў. Стрэлачнік ст. Асіповічы. Рэпрэсіраваны 11.3.1933. Рэабілітаваны 18.7.1960.

АСТРАШЭЎСКІ Піліп Ларывонавіч, н. у 1894 у в. Угалец Пухавіцкага р-на. Пражываў у в. Рэпішча Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 17.3.1933. Рэабілітаваны 22.5.1959.

АСТАШЭВІЧ Аляксандр Іосіфавіч, н. у 1883 у в. Латушкі Дзяржынскага р-на. Дэзінфікатар райздраўаддзела. Пражываў у в. Асіповічы. Рэпрэсіраваны 19.9.1939. Рэабілітаваны 26.11.1939.

АСТРЭЙКА Аляксандр Захаравіч, н. у 1908 у в. Коханаўка Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 5.4.1953. Рэабілітаваны 23.10.1989.

АЎДЗЕЕЎ Пётр Андрэевіч, н. у 1903 на ст. Бранск. Начальнік вагонарамонтнага пункта. Пражываў на ст. Асіповічы. Рэпрэсіраваны 2.12.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

АЎДЗЕЙЧЫК Тарас Цімафеевіч, пражываў у в. Крынка Асіповіцкага р-на. Раскулачаны ў 1931. Рэабілітаваны 21.10.1993.

АЎРАМЕНКА Зоя Дзмітрыеўна, н. у 1925 у в. Ясянок Мозырскага р-на. Тэлефаністка тэлефоннай станцыі ШЧ-4. Пражывала ў г. Асіповічы. Рэпрэсіравана 2.1.1945. Рэабілітавана 10.8.1973.

АЎСЯННІКАЎ Віктар Ігнацьевіч, н. у 1878 у в. Малая Грава Асіповіцкага р-на. Селянін-аднаасобнік. Пражываў у в. Малая Грава. Рэпрэсіраваны 26.2.1932. Рэабілітаваны 16.6.1932.

АХРАМОВІЧ Людвіг Аляксандравіч, н. у 1898 у в. Закуцце Клічаўскага р-на. Калгаснік калгаса імя Дзяржынскага. Пражываў на хутары Лісічкі Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 18.8.1937. Рэабілітаваны 5.5.1958.

АШЧАРБОВІЧ Кацярына Данілаўна і яе дзеці: **АШЧАРБОВІЧ Аляксандр Паўлавіч**, н. у 1910, **АШЧАРБОВІЧ Вольга Паўлаўна**, н. у 1921, **АШЧАРБОВІЧ Ганна Паўлаўна**, н. у 1921, **АШЧАРБОВІЧ Марыя Паўлаўна**, н. у 1914, **АШЧАРБОВІЧ Мікалай Паўлавіч**, н. у 1917, **АШЧАРБОВІЧ Міхаіл Паўлавіч**, н. у 1918, **АШЧАРБОВІЧ Надзея Паўлаўна**, н. у 1905, **АШЧАРБОВІЧ Ніна Паўлаўна**, н. у 1924, **АШЧАРБОВІЧ Соф'я Паўлаўна**, н. у 1916 — пражывалі ў в. Мурашкі Асіповіцкага р-на. Раскулачаны ў 1930. Пакаранне адбывалі ў Якуцкай АССР. Рэабілітаваны 6.4.1992.

БАБАРЫКА Герасім Васільевіч, н. у 1904 у в. Кабылянка Клічаўскага р-на. Дзесятнік леспрамгаса. Пражываў на ст. Градзянка Свіслацкага р-на. Рэпрэсіраваны 4.3.1931. Рэабілітаваны 10.6.1937.

БАБІНА Васіль Савельевіч, н. у 1913 у в. Пратасевічы Асіповіцкага р-на. Каменшчык 7-й пляцоўкі г. Асіповічы. Пражываў у в. Пратасевічы. Рэпрэсіраваны 18.9.1937. Рэабілітаваны 19.5.1962.

БАБІЧ Фама Савельевіч, н. у 1909 у в. Ляды Чэрвеньскага р-на. Грузчык Градзянскага лесаўчастка. Пражываў у р.п. Градзянка Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 6.8.1937. Рэабілітаваны 8.7.1965.

БАБРОЎНІК Аляксандр Васільевіч, н. у 1893 у в. Міхалевічы Пухавіцкага р-на. Грузчык Градзянскага лесапункта. Пражываў у р.п. Градзянка Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 31.7.1937. Рэабілітаваны 29.6.1963.

БАБРЫЦКІ Юліян Іосіфавіч, н. у 1897 у в. Новая Рожанка былой Віленскай губ. Прараб пагрузачна-разгрузачных работ на ст. Уборак. Пражываў на ст. Уборак. Арыштаваны 26.12.1937. Расстраляны 24.5.1938. Рэабілітаваны 5.7.1961.

БАГДАНОВІЧ Казімір Емяльянавіч, н. у 1898 у с. Узьляны Пухавіцкага р-на. Возчык Градзянскага лесапункта. Пражываў у р.п. Градзянка Асіповіц-

кага р-на. Рэпрэсіраваны 23.8.1937. Адбываў пакаранне ў бабруйскай турме. Расстраляны 15.10.1937. Рэабілітаваны 29.6.1963.

БАГДАНОВІЧ Сіла Канстанцінавіч, н. у 1897 у в. Сталяры Асіповіцкага р-на. Пражываў у р.п. Татарка Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 25.4.1933. Рэабілітаваны 23.10.1989.

БАГДАНОВІЧ Уладзімір Канстанцінавіч, н. у 1894 у р.п. Татарка Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 25.4.1933. Рэабілітаваны 27.10.1989.

БАГДАНОВІЧ Уладзімір Людвігавіч, н. у 1882 у Навагрудскім павеце. Калгаснік калгаса імя Молатава. Пражываў у в. Новыя Тарасавічы Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 2.6.1938. Рэабілітаваны 25.6.1939.

БАГІНСКІ Станіслаў Іосіфавіч, н. у 1909 у в. Быкаўка, Украіна. Майстар шклозавода «Кастрычнік». Пражываў у Асіповіцкім р-не. Рэпрэсіраваны 16.12.1937. Расстраляны 20.2.1938. Рэабілітаваны 22.12.1958.

БАГУЦКІ Эдуард Адольфавіч, н. у 1872 у в. Забродзе Чэрвеньскага р-на. Калгаснік. Пражываў у в. Засялечча Асіповіцкага р-на. Арыштаваны 24.2.1933. Расстраляны 26.3.1933. Рэабілітаваны 13.7.1989.

БАГУШЭВІЧ Аляксандр Арцёмавіч, н. у 1901 у в. Паршчага Глускага р-на. Пражываў у в. Бортнае Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 18.11.1937. Рэабілітаваны 20.9.1989.

БАЛДАКОВА Вольга Эдуардаўна, н. у 1932. Жыла ў в. Ігнатоўка. Рэпрэсіравана ў 1948. Вызвалена ў 1956. Рэабілітавана 17.3.1992.

БАМБУРАЎ Андрэй Паўлавіч, н. у 1898 у в. Зарыно Куйбышаўскай вобл. Старшыня вучэбнага камітэта чыгуначнай станцыі Асіповічы. Жыў на ст. Міхайлавічы. Рэпрэсіраваны 3.11.1937. Рэабілітаваны 29.6.1957.

БАНЬКОЎСКІ Станіслаў Палікарпавіч, н. у 1902 у в. Доўнары Дзяржынскага р-на. Рабочы лесаўчастка. Пражываў у п. Лядзецкае Асіповіцкага р-на. Арыштаваны 20.1.1938. Расстраляны 19.4.1938. Рэабілітаваны 20.10.1956.

БАРАДАЎКА Іларыён Іванавіч, н. у 1889 у в. Вялікая Грава Асіповіцкага р-на. Пражываў на хутары Максімаўскія Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 18.3.1933. Рэабілітаваны 20.2.1960.

БАРАЗНА Іван Нікіфаравіч, н. у 1905 у в. Брыцалавічы Асіповіцкага р-на. Камандзір батарэі Чырвонай арміі. Пражываў у Мінску. Арыштаваны 5.8.1937. Расстраляны ў Мінску 1.2.1938. Рэабілітаваны 10.11.1967.

БАРАЙ Мікалай Лявонцьевіч, н. у 1898 у г. Старобін Салігорскага р-на. Рабочы канторы «Заготскот». Пражываў у в. Асіповічы. Арыштаваны 29.3.1938. Расстраляны 5.10.1938. Рэабілітаваны 21.11.1989.

БАРАЙ Сямён Дзмітрыевіч, н. у 1900 у г. Старобін Салігорскага р-на. Рамонтны рабочы ст. Асіповічы. Пражываў на хутары Замошша Асіповіцкага р-на. Арыштаваны 15.6.1938. Расстраляны 5.10.1938. Рэабілітаваны 17.8.1959.

БАРАЙ Сямён Фёдаравіч, н. у 1899 у г. Старобін Салігорскага р-на. Рабочы ваенспецбуда. Пражываў у г. Асіповічы. Арыштаваны ў 1938. Расстраляны 31.7.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

БАРАНАЎ Леанід Дзмітрыевіч, н. у 1903 на хутары Буда былога Заслаўскага р-на. Рабочы шклозавода «Кастрычнік» Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 20.7.1937. Рэабілітаваны 8.2.1958.

БАРАНОЎСКІ Адам Іванавіч, н. у 1884 у в. Багаслаўка Бабруйскага р-на. Калгаснік калгаса «Чырвоны араты». Пражываў у в. Дубралева Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 1.10.1937. Рэабілітаваны 4.3.1939.

БАРАНОЎСКІ Аляксандр Іванавіч, н. у 1900 у в. Камень Салігорскага р-на. Земляроб. Пражываў у в. Пабокавічы Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 28.10.1938. Рэабілітаваны 9.3.1939.

БАРАНОЎСКІ Іосіф Сямёнавіч, н. у 1896 у в. Багаслаўка Бабруйскага р-на. Вартаўнік калгаса «Новы шлях». Пражываў у в. Дзераўцы Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 19.9.1937. Рэабілітаваны 20.2.1960.

БАРАНОЎСКІ Міхаіл Рыгоравіч, н. у 1912 у в. Хатынь Лагойскага р-на. Рабочы шклозавода «Кастрычнік». Пражываў у пасёлку шклозавода «Кастрычнік» Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 18.8.1937. Адбываў пакаранне ў Комі АССР, г. Угліч і іншых месцах. Рэабілітаваны 20.6.1961.

БАРДЗІЧАВЕЦ Майсей Іванавіч, н. у 1895 у Тураўскім р-не. Рабочы шклозавода «Кастрычнік» Асіповіцкага р-на. Арыштаваны 19.11.1937. Расстраляны 13.1.1938 у Бабруйску. Рэабілітаваны 16.1.1989.

БАРКОЎСКІ Адам Антонавіч, н. у 1905 у в. Нова-Вілейск, Літва. Машыніст ст. Асіповічы. Пражываў на ст. Асіповічы. Арыштаваны 12.12.1937. Расстраляны 2.2.1938. Рэабілітаваны 31.10.1958.

БАРКОЎСКІ Дзмітрый Дзянісавіч, н. у 1897 у в. Кабылянка Клічаўскага р-на. Святар Кабылянскай царквы. Пражываў у в. Карытнае Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 28.2.1930. Рэабілітаваны 30.10.1989.

БАРКОЎСКІ Іван Аляксандравіч, н. у 1900 у в. Татуры Капыльскага р-на. Рабочы шклозавода «Кастрычнік». Пражываў у Асіповіцкім р-не. Рэпрэсіраваны 18.7.1937. Рэабілітаваны 11.5.1989.

БАРКУН Сцяпан Еўдакімавіч, н. у 1899 у с. Лешніцы Чэрвеньскага р-на. Начальнік кандуктарскага рэзерву ст. Асіповічы. Пражываў у г. Асіповічы. Арыштаваны 5.1.1938. Расстраляны 31.3.1938. Рэабілітаваны 14.11.1957.

БАРОДЗІЧ Іван Іванавіч, н. у 1908 у в. Віктараўка Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Камандзір батальёна 2-й Беларускай стралковай дывізіі. Рэпрэсіраваны 26.7.1932. Рэабілітаваны 16.1.1989.

БАРОДЗІЧ Іван Іосіфавіч, н. у 1873 у в. Лочын Асіповіцкага р-на. Пражываў у в. Віктараўка. Рэпрэсіраваны 23.2.1931. Рэабілітаваны 20.5.1960.

БАРЧЫНСКІ Іосіф Уладзіміравіч, н. у 1904 у г. Тбілісі. Начальнік штаба МПВА Асіповіцкага аддзялення Беларускай чыгункі. Пражываў на ст. Асіповічы. Арыштаваны 21.11.1937. Расстраляны 14.1.1938. Рэабілітаваны 17.12.1957.

БАРЫСАВА Людміла Іванаўна, н. у 1924 у г. Асіповічы, дзе і пражывала. Рэпрэсіравана 28.9.1944. Рэабілітавана 5.5.1961.

БАРЫСЕВІЧ Міхаіл Фёдаравіч, н. у 1912 у Слуцкім р-не. Каваль калгаса «Перадавік» Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 8.5.1937. Рэабілітаваны 8.5.1958.

БАРЫСЁНАК Павел Васільевіч, н. у 1899 у в. Лапіца Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Калгаснік калгаса імя Варашылава. Арыштаваны 12.1.1933. Расстраляны. Рэабілітаваны 20.12.1958.

БАРЫСЁНАК Пётр Ануфрыевіч. Пражываў у в. Татаркавічы Асіповіцкага р-на. Раскулачаны ў 1931. Рэабілітаваны 5.1.1993.

БАРЫСЁНАК Трафім Дзямідавіч, н. у 1875 у в. Забалацце Асіповіцкага р-на. Пражываў у в. Свіслач Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 12.1.1933. Рэабілітаваны 10.10.1959.

БАТУР Пётр Антонавіч, н. у 1882 у в. Ясень Асіповіцкага р-на. Вартаўнік-конюх будучастка. Пражываў у г. Асіповічы. Арыштаваны 25.11.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны.

БАТУРЫН Мікалай Міхайлавіч, н. у 1907 у г. Жлобін. Дыспетчар ст. Асіповічы. Пражываў у г. Асіповічы. Рэпрэсіраваны 29.11.1937. Рэабілітаваны 28.3.1938.

БАТУС Іосіф Аляксандравіч, н. у 1908 у г. Пінск. Прараб. Пражываў на ст. Асіповічы. Арыштаваны 21.11.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны 18.7.1957.

БАХМАТОВІЧ Пётр Іосіфавіч, н. у 1904 у в. Зарэчча Мінскага р-на. Рабочы лесаўчастка леспрамгаса. Пражываў у Асіповіцкім р-не. Рэпрэсіраваны 18.7.1937. Рэабілітаваны 9.8.1968.

БАЯШКА Вікенцій Якімавіч (Яфімавіч), н. у 1887 у в. Цэль Асіповіцкага р-на. Калгаснік калгаса «Кастрычнік». Пражываў у в. Цэль. Рэпрэсіраваны 29.4.1937. Рэабілітаваны 17.11.1958.

БЕЛАНОВІЧ Мікалай Аляксандравіч, н. у 1883 у в. Быстча Барысаўскага р-на. Паштовы работнік. Пражываў у г. Асіповічы. Рэпрэсіраваны 18.9.1929. Вызвалены 17.3.1939. Рэабілітаваны.

БЕЛАХВОСТ Аляксандра Міхайлаўна, н. у 1908 у в. Вязычын Асіповіцкага р-на. Настаўніца Свіслацкай СШ. Пражывала ў в. Свіслач Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіравана 1.1.1945. Рэабілітавана 12.3.1945.

БЕЛАХВОСТ (БЕЛАХВОСТАЎ) Павел Рыгоравіч, н. у 1880 у в. Хімное Асіповіцкага р-на. Вартаўнік Градзянскага лесапункта. Пражываў у р.п. Градзянка Асіповіцкага р-на. Арыштаваны 7.12.1937. Расстраляны 15.3.1938. Рэабілітаваны 8.2.1958.

БЕЛАЯ Ганна Васільеўна, н. у 1918 у в. Ясень Асіповіцкага р-на.

БЕЛАЯ Ксенія Канстанцінаўна, н. у 1882.

БЕЛАЯ Любоў Васільеўна, н. у 1922 у в. Ясень Асіповіцкага р-на.

БЕЛКІН Залман Барысавіч, н. у 1906 у г. Дуброўна Віцебскай вобл. Начальнік забеспячэння шклозавода «Кастрычнік». Пражываў у Асіповіцкім р-не. Рэпрэсіраваны 11.12.1937. Рэабілітаваны 19.4.1939.

БЕЛЫ Васіль Андрэевіч, н. у 1885 у в. Ясень Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Рэпрэсіраваны 4.1.1933. Рэабілітаваны 8.6.1989.

БЕЛЫ Васіль Самуілавіч, н. у 1875 у в. Ясень Асіповіцкага р-на, **БЕЛЫ Мікалай Васільевіч**, н. у 1928 у в. Ясень Асіповіцкага р-на, **БЕЛЫ Цімафей Васільевіч**, н. у 1904 у в. Ясень Асіповіцкага р-на — пражывалі ў в. Ясень. Раскулачаны ў 1930. Пакаранне адбывалі ў Свярдлоўскай вобл. Рэабілітаваны 19.3.1993.

БЕЛЫ Іван Андрэевіч, н. у 1884 у в. Ясень Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Рэпрэсіраваны 4.1.1933. Рэабілітаваны 8.6.1989.

БЕЛЫ Іван Рыгоравіч, н. у 1912 у в. Старыя Рэчкі Чэрвеньскага р-на. Шафёр. Пражываў у г. Асіповічы. Рэпрэсіраваны 15.5.1948. Рэабілітаваны 26.7.1961.

БЕЛЫ Мікалай Сяргеевіч, н. у 1906 у в. Старыя Тарасавічы Асіповіцкага р-на. Пражываў у в. Смалярня Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 18.3.1933. Рэабілітаваны 20.11.1964.

БЕЛЫ Сяргей Васільевіч, н. у 1870 у в. Старыя Тарасавічы Асіповіцкага р-на. Пражываў у в. Смалярня Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 6.8.1937. Рэабілітаваны 1.9.1963.

БЕЛЬЧЫН Кузьма Мінавіч, н. у 1909 у в. Падарэссе Старадарожскага р-на. Чорнарабочы шклозавода «Кастрычнік». Пражываў у Асіповіцкім р-не. Арыштаваны 23.10.1937. Расстраляны ў г. Бабруйск 13.1.1938. Рэабілітаваны 4.6.1958.

БЕРАЗІНСКІ Баляслаў Вікенцьевіч, н. у 1880 у г. Асіповічы. Рабочы жывёлабойні. Пражываў у г. Асіповічы. Арыштаваны 17.2.1938. Расстраляны 26.9.1938 у г. Мінск. Рэабілітаваны 16.2.1989.

БЕРАЗОЎСКІ Баляслаў Адамавіч, н. у 1907 у в. Сталяры Чэрвеньскага р-на. Калгаснік калгаса імя Валадарскага. Пражываў у в. Казіміра Асіповіцкага р-на. Арыштаваны 10.1.1938. Расстраляны 31.7.1938. Рэабілітаваны 29.10.1958.

БЕРАЗОЎСКІ Іосіф Адамавіч, н. у 1887 у в. Старыя Дарогі Чэрвеньскага р-на. Калгаснік калгаса імя Валадарскага. Пражываў у в. Казіміраўка Асіповіцкага р-на. Арыштаваны 11.1.1938. Расстраляны 31.7.1938. Рэабілітаваны 29.10.1958.

БЕРАЗОЎСКІ Фёдар Іосіфавіч, н. у 1900 у в. Забалоцце Старадарожскага р-на. Рабочы Асіповіцкага леспрамгаса. Пражываў у в. Прыцерпа Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 18.7.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

БЕРАСНЕВІЧ Эдмунд Людвігавіч, н. у 1901 у в. Чарналессе Асіповіцкага р-на. Аднаасобнік. Пражываў у в. Чарналессе. Рэпрэсіраваны 25.3.1930. Рэабілітаваны 13.7.1989.

БЕРНАТ Іван Паўлавіч, н. у 1912 у в. Старая Дражня Асіповіцкага р-на. Кладаўшчык вагонарамонтнага пункта ст. Асіповічы. Пражываў у в. Новая Дражня Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 2.12.1937. Рэабілітаваны 7.3.1938.

БЕСМАН Сцяпан Іосіфавіч, н. у 1888 у в. Лочын Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Рэпрэсіраваны 23.2.1931. Рэабілітаваны 20.5.1960.

БЕСМАН Сцяпан Іосіфавіч, н. у 1888 у в. Весялова Асіповіцкага р-на. Калгаснік. Пражываў у в. Лочын Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 13.1.1933. Рэабілітаваны 26.9.1989.

БЕСПРАЗВАННЫ (БЕЗПРАЗВАННЫ) Дзмітрый Дзмітрыевіч, н. у 1892 у г. Мінск. Сталяр МТС. Пражываў у г. Асіповічы. Арыштаваны 8.1.1938. Расстраляны 31.3.1938. Рэабілітаваны 12.11.1982.

БЖЭСКІ Іосіф Іосіфавіч, н. у 1905 у в. Калкуны былой Ковенскай губ. Прараб-будаўнік рамканторы ст. Асіповічы. Пражываў у г. Асіповічы. Рэпрэсіраваны 25.1.1938. Рэабілітаваны 12.1.1957.

БІТУС Сяргей Раманавіч, н. у 1906 у в. Туркі Бабруйскага р-на. Рабочы чыгункі ст. Ясень. Пражываў на ст. Ясень Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 30.12.1944. Рэабілітаваны 16.6.1945.

БЛІЗНЕЦ Мікалай Макаравіч, н. у 1904 у в. Таўсцец Асіповіцкага р-на. Брыгадзір калгаса імя Кірава. Пражываў у в. Таўсцец Ясенскага сельсавета. Рэпрэсіраваны 6.8.1937. Рэабілітаваны 18.5.1957.

БЛІЗНЕЦ Фама Восіпавіч, н. у 1864 у в. Амінавічы Асіповіцкага р-на. Калгаснік калгаса імя Кірава. Пражываў у в. Залессе Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 6.8.1937. Рэабілітаваны 9.9.1961.

БЛІЗНЕЦ Цярэнцій Якаўлевіч, н. у 1897 у в. Пагарэлае Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 12.1.1933. Адбываў пакаранне на Поўначы. Рэабілітаваны 5.6.1962.

БЛІЗНЕЦ Цярэнцій Якаўлевіч, н. у 1887 у в. Пагарэлае Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 28.2.1931. Рэабілітаваны 20.5.1960.

БОБРЫК Васіль Арцёмавіч, н. у 1883 у в. Ясень Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Рэпрэсіраваны 5.12.1933. Рэабілітаваны 12.9.1989.

БОБРЫК Фама Арцёмавіч, н. у 1882 у в. Ясень Асіповіцкага р-на, **БОБРЫК Фёкла Іосіфаўна**, н. у 1883 у в. Ясень Асіповіцкага р-на, іх дзеці **БОБРЫК Аляксандра Фамінічна**, н. у 1924 у в. Ясень Асіповіцкага р-на, **БОБРЫК Ганна Фамінічна**, н. у 1923 у в. Ясень Асіповіцкага р-на, **БОБРЫК Марыя Фамінічна**, н. у в. Ясень Асіповіцкага р-на, **БОБРЫК Соф'я Фамінічна**, н. у 1921 у в. Ясень Асіповіцкага р-на — пражывалі ў в. Ясень. Раскулачаны ў 1930. Рэабілітаваны 21.2.1994.

БОКШЫЦ Апанас Сідаравіч, н. у 1910 у в. Таль Любанскага р-на. Рабочы кар'ера «Татарка» Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 6.8.1937. Рэабілітаваны 26.5.1989.

БОНДАР Аляксей Іванавіч, н. у 1900 у в. Шэйпічы Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Рэпрэсіраваны 14.4.1937. Рэабілітаваны 28.2.1968.

БОНДАР Іван Лук'янавіч, н. у 1862 у в. Шэйпічы Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Рэпрэсіраваны 20.11.1932. Рэабілітаваны 12.12.1967.

БОНДАР Клаўдзія Васільеўна, н. у 1914 у в. Свіслач Асіповіцкага р-на. Працавала ў Свіслацкай арцелі «Уперад». Рэпрэсіравана 1.1.1945. Рэабілітавана 5.4.1945.

БОЧКА Аляксандр Іванавіч, н. у 1908 у в. Лапацічы Слуцкага р-на. Сталяр 4-га вагоннага ўчастка Беларускай чыгункі. Пражываў у г. Асіповічы. Арыштаваны 1.12.1937. Расстраляны 14.1.1938. Рэабілітаваны 29.9.1958.

БРАНАВІЦКІ Віктар Мартынавіч, н. у 1862 у в. Уборак Асіповіцкага р-на. Пражываў у в. Пабокавічы Асіповіцкага р-на. Арыштаваны 18.7.1937. Расстраляны 16.10.1937 у Магілёве. Рэабілітаваны 16.1.1989.

БРОЦКІ Мікалай Антонавіч, н. у 1877 у в. Ясень Асіповіцкага р-на. Вартаўнік ст. Асіповічы. Пражываў на ст. Асіповічы. Рэпрэсіраваны 4.8.1938. Рэабілітаваны 14.5.1939.

БРЫЛЕЎСКІ Адам Вікенцьевіч, н. у 1878 у в. Яноўка Асіповіцкага р-на. Кладаўшчык калгаса «Камінтэрн». Пражываў у в. Яноўка. Рэпрэсіраваны 23.1.1933. Рэабілітаваны 15.8.1958.

БУГАР Ігнат Максімавіч, н. у 1876 у в. Цяплухі Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Рэпрэсіраваны 21.1.1933. Адбываў пакаранне на Поўначы. Рэабілітаваны 21.11.1989.

БУДНЕР Антон Мацвеевіч, н. у 1883 у в. Каралёўка Уладаўскага пав., Польшча. Сталяр калгаса. Пражываў у в. Казіміраўка Асіповіцкага р-на. Арыштаваны 24.8.1937. Расстраляны 13.1.1938. Рэабілітаваны 6.9.1989.

БУДНІК Мікалай Васільевіч, н. у 1884 у г. Ліда. Тэлефаніст. Пражываў у г. Асіповічы. Арыштаваны 8.7.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны 15.8.1958.

БУЗАНОЎСКІ Пётр Іванавіч, н. у 1883 у в. Уборак Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Рэпрэсіраваны 25.1.1935. Рэабілітаваны 27.11.1989.

БУЗАНОЎСКІ Уладзімір Станіслававіч, н. у 1864 у в. Уборак Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Рэпрэсіраваны 29.5.1929. Рэабілітаваны 17.11.1989.

БУЙНІКАВА Марыя Аляксандраўна, н. у 1888 у г. Адэса. Пражывала ў в. Азярышча Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіравана ў 1937. Рэабілітавана 29.5.1959.

БУЙНІКАЎ Рыгор Васільевіч, н. у 1886 у г.п. Тураў Жыткавіцкага р-на. Лесаруб Асіповіцкага леспрамгаса. Пражываў у в. Азярышча Асіповіцкага р-на. Арыштаваны 18.7.1937. Расстраляны 9.9.1937 у Бабруйску. Рэабілітаваны.

БУЙНІЦКІ Іван Іванавіч, н. у 1868 у в. Зітрыкі, Польшча. Рамонтны рабочы чыгункі г. Асіповічы. Пражываў у г. Асіповічы. Арыштаваны 27.1.1938. Расстраляны 4.6.1938. Рэабілітаваны 27.11.1989.

БУКОЎСКАЯ Станіслава Вітольдаўна, н. у 1912 у в. Уборак Асівіцкага р-на, дзе і пражывала. Рэпрэсіравана 10.6.1929. Рэабілітавана 17.11.1989.

БУЛАТ Ігнат Зянонавіч, н. у 1876 у в. Булатнікі Капыльскага р-на. Дворнік ст. Асіповічы Беларускай чыгункі. Пражываў у в. Прудок Асіповіцкага р-на. Арыштаваны 26.6.1938. Расстраляны 19.10.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 16.1.1989.

БУЛАТ Ігнат Зянонавіч, н. у 1876 у в. Булатнікі Капыльскага р-на. Рабочы Гомельскага будучастка на ст. Асіповічы. Пражываў у в. Прудок Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 21.10.1937. Рэабілітаваны 21.11.1937.

БУЛГАК-БУГЛАК Вікенцій Ігнатавіч, н. у 1902 у в. Пабокавічы Асіповіцкага р-на. Статыстык дэпо ст. Асіповічы. Пражываў у г. Асіповічы. Рэпрэсіраваны 3.1.1933. Рэабілітаваны 18.6.1965.

БУЛГАК Феліцыян Ігнатавіч, н. у 1883 на ст. Ясень Асіповіцкага р-на. Майстар ст. Дараганава Заходняй чыгункі. Пражываў на ст. Дараганава. Рэпрэсіраваны 31.3.1929. Рэабілітаваны 4.8.1958.

БУЛЫНКА Сцяпан Іосіфавіч, н. у 1893 у в. Плоская Дзяржынскага р-на. Цясляр пляцоўкі пры ст. Лапічы. Пражываў у в. Дзяржыншчына Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 17.7.1937. Рэабілітаваны 26.5.1989.

БУРАК Міхаіл Фаміч, н. у 1894 у в. Шэйпічы Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Рабочы шклозавода «Кастрычнік». Рэпрэсіраваны 27.9.1937. Рэабілітаваны 28.5.1960.

БУРДЗІН Уладзімір Кір'янавіч, н. у 1890 у Мінску. Бухгалтар аддзялення сувязі. Пражываў у г. Асіповічы. Рэпрэсіраваны 30.9.1938. Рэабілітаваны 9.3.1939.

БУРЧЭЎСКІ Лука Фаміч, н. у 1901 у в. Кошкі Гродзенскай вобл. Машыніст электрастанцыі. Пражываў у г. Асіповічы. Рэпрэсіраваны 30.9.1938. Рэабілітаваны 9.3.1939.

БУРЧЭЎСКІ Мікалай Фаміч, н. у 1912 у в. Кошкі Гродзенскай вобл. Машыніст электрастанцыі. Пражываў на ст. Асіповічы. Рэпрэсіраваны 30.9.1938. Рэабілітаваны 11.2.1940.

БУШУЕЎ Уладзімір Рыгоравіч, н. у 1904. Сцэпшчык ст. Асіповічы. Пражываў у г. Асіповічы. Арыштаваны 12.10.1937. Расстраляны 15.1.1938. Рэабілітаваны 5.11.1957.

БЫКОЎСКАЯ Бацлава Уладзіславаўна, н. у 1912 у в. Уборак Асіповіцкага р-на, дзе і пражывала. Рэпрэсіравана 10.6.1929. Рэабілітавана 17.11.1989.

БЫКОЎСКАЯ Марыя Венядзіктаўна, н. у 1874 у в. Уборак Асіповіцкага р-на, дзе і пражывала. Рэпрэсіравана 10.6.1929. Рэабілітавана 17.11.1989.

БЫКОЎСКАЯ Эмілія Цэзараўна, н. у 1884 у в. Семіровічы. Пражывала ў в. Уборак. Рэпрэсіравана 10.6.1929. Рэабілітавана 17.11.1989.

БЫКОЎСКІ Вітольд Гектаравіч, н. у 1869 у в. Уборак Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Рэпрэсіраваны 29.5.1929. Рэабілітаваны 17.11.1989.

БЫКОЎСКІ Уладзіслаў Станіслававіч, н. у 1870 у в. Уборак Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Рэпрэсіраваны 20.5.1929. Рэабілітаваны 17.11.1989.

БЫЛІНА Франц Вікенцьевіч, н. у 1876 у в. Пагарэлае Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Рэпрэсіраваны 28.2.1931. Рэабілітаваны 20.5.1960.

БЫСТРОЎ Ілья Сцяпанавіч, н. у 1908 у в. Сакроўшчына Цвярской вобл. Паязны вагонны майстар ст. Асіповічы Беларускай чыгункі. Пражываў у г. Асіповічы. Рэпрэсіраваны 25.9.1946. Рэабілітаваны 31.8.1990.

БЫЧАНОК Іван Іванавіч, н. у 1907 у в. Лапічы Бабруйскага р-на. Пражываў у в. Перарожкі Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 14.4.1932. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ШАРЖАНОВІЧ Ігнат Іванавіч, н. у 1903 у в. Зашыбіна Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Рэпрэсіраваны 19.3.1933. Рэабілітаваны 20.11.1964.

ШАРЛЕГА Фёдар Антонавіч, н. у 1895 у в. Заполле Глускага р-на. Загадчык паштовага аддзялення пры шклозаводзе «Кастрычнік». Пражываў у Асіповіцкім р-не. Арыштаваны 30.4.1938. Расстраляны 29.10.1938. Рэабілітаваны 9.6.1958.

ШАЎЛОВІЧ Вікенцій Антонавіч, н. у 1881 у в. Караваева Чэрвеньскага р-на. Рабочы Асіповіцкага леспрамгаса. Пражываў у п. Ямное Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 19.9.1937. Рэабілітаваны 29.12.1961.

ШАЎЧЭНКА Лідзія Дзянісаўна, н. у 1910 у Заходняй Беларусі. Бухгалтар разліковага аддзела торфазавода. Пражывала ў Асіповіцкім р-не. Рэпрэсіравана 31.12.1944. Рэабілітавана 18.6.1945.

ШАЎЧЭНКА Яфім Уладзіміравіч, н. у 1899 у в. Бурыкай Сумской вобл., Украіна. Цясляр. Пражываў на ст. Асіповічы. Рэпрэсіраваны 1.2.1933. Рэабілітаваны 30.8.1989.

ШАФРАНОЎСКІ Пётр Васільевіч, н. у 1876 у в. Азяраны Рагачоўскага р-на. Святар. Пражываў у г. Асіповічы. Рэпрэсіраваны 3.6.1938. Рэабілітаваны 26.5.1958.

ШВАРЦ Ігнат Іосіфавіч, н. у 1904 у в. Старое Сяло Асіповіцкага р-на. Пражываў у в. Гальчэўка Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 18.8.1938. Рэабілітаваны 14.12.1938.

ШВЕД Іван Сямёнавіч, н. у 1891 у в. Убалацце Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Калгаснік калгаса «Перамога». Арыштаваны 27.11.1932. Расстраляны. Рэабілітаваны 25.3.1965.

ШВЕД Сцяпан Рыгоравіч, н. у 1908 у в. Убалацце Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Калгаснік калгаса «Перамога». Арыштаваны 22.1.1933. Расстраляны. Рэабілітаваны 25.3.1965.

ШВОРАНЬ Рыгор Давыдавіч, н. у 1902 у в. М. Помашчка Кіраваградскай вобл. Машыніст паравознага дэпо. Пражываў у г. Асіповічы. Рэпрэсіраваны 31.12.1944. Рэабілітаваны 21.4.1961.

ШКЕЛЬ Раман Іванавіч, н. у 1891 у в. Бельзюкі Дзяржынскага р-на. Калгаснік калгаса імя Кірава. Пражываў у в. Блыхава Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 18.9.1937. Рэабілітаваны 9.5.1961.

ШКУРЫН Сяргей Паўлавіч, н. у 1893 у в. Каменічы Асіповіцкага р-на. Пражываў у в. Ясянец. Арыштаваны 20.1.1938. Расстраляны. Рэабілітаваны 20.10.1956.

ШКУТКО Раман Васільевіч, н. у 1898 у в. Харошае Бабруйскага р-на. Чорнарабочы клёпачнай арцелі. Пражываў у в. Осава Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 18.7.1937. Рэабілітаваны 13.11.1962.

ШКУТКО Рыгор Васільевіч, н. у 1893 у в. Харошае Бабруйскага р-на. Калгаснік калгаса «Чырвоны Усход». Пражываў у в. Осава Асіповіцкага р-на. Арыштаваны 1.10.1937. Пакаранне адбываў у Баб-

руйску. Расстраляны 5.12.1937. Рэабілітаваны 13.11.1962.

ШКУТКО Яфім Васільевіч, н. у 1886 у в. Пагарэлае Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 12.1.1933. Пакаранне адбываў у Казахстане. Рэабілітаваны 5.6.1962.

ШЛЯХЦІН Іван Міхайлавіч, н. у 1918, **ШЛЯХЦІН Іван Пракопавіч**, н. у 1923, **ШЛЯХЦІН Мікалай Яфімавіч**, н. у 1892, пражывалі ў в. Жыціна. Раскулачаны ў 1930. Рэабілітаваны 14.4.1994.

ШЛЯХЦІН Пракоп Іванавіч, н. у 1897, **ШЛЯХЦІНА Алена Пракопаўна**, н. у 1929, **ШЛЯХЦІНА Анастасія Малахаўна**, н. у 1902 — пражывалі ў в. Дворышча Асіповіцкага р-на. Раскулачаны ў 1930. Рэабілітаваны 30.9.1993.

ШЛЯХЦІНА Усціння Савельеўна, н. у 1895.

ШМІЦЕЛЬСКІ Канстанцін Стафанавіч, н. у 1903 у в. Навасяленне Чэрвеньскага р-на. Рэпрэсіраваны 14.8.1930. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ШНЭЙДЭРМАН Хема Шоламавіч, н. у 1912 у в. Свіслач Асіповіцкага р-на. Начальнік цэха шклозавода «Кастрычнік». Пражываў у Асіповіцкім р-не. Арыштаваны 5.11.1937. Расстраляны 5.12.1937. Рэабілітаваны 30.10.1958.

ШПАК Антон Сямёнавіч, н. у 1885 у в. Ляўкі Старадарожскага р-на. Возчык Верайцоўскага завода «Хімік». Пражываў у в. Вярхі Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 18.7.1937. Рэабілітаваны 13.11.1989.

ШПАКОЎСКІ Вікенцій Вікенцьевіч, н. у 1897 у в. Прыцерпа Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Шавец. Арыштаваны 6.8.1937. Расстраляны 2.10.1937 у Бабруйску. Рэабілітаваны 13.9.1957.

ШПАКОЎСКІ Зыгма Вікенцьевіч, н. у 1889 у в. Прыцерпа Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Земляроб калгаса імя Сталіна. Арыштаваны 6.8.1937. Расстраляны 2.10.1937 у г. Бабруйск. Рэабілітаваны 13.9.1957.

ШПАКОЎСКІ Іосіф Вікенцьевіч, н. у 1882 у в. Прыцерпа Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Рыбалоў арцелі «Прасвет». Рэпрэсіраваны 24.9.1937. Рэабілітаваны 10.2.1958.

ШПІЛЕЎСКАЯ Ванда Антонаўна, н. у 1926, **ШПІЛЕЎСКІ Антон Гіляравіч**, н. у 1892, **ШПІЛЕЎСКІ Іван Антонавіч**, н. у 1928, пражывалі ў в. Краснае. Раскулачаны ў 1932. Рэабілітаваны 28.2.1992.

ШПІЛЕЎСКІ Іван Цэзаравіч, н. у 1877 у в. Краснае Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 18.9.1937. Рэабілітаваны 9.6.1958.

ШПІЛЕЎСКІ Ігнат Гіляравіч, н. у 1875 у в. Лісічкі Асіповіцкага р-на. Пражываў у в. Краснае Асіповіцкага р-на. Арыштаваны 7.2.1933. Расстраляны. Рэабілітаваны 15.8.1958.

ШПІЛЕЎСКІ Іосіф Антонавіч, н. у 1892 у в. Казімірава Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Калгаснік калгаса «Гай». Арыштаваны 23.1.1933. Расстраляны. Рэабілітаваны 15.8.1958.

ШПІЛЕЎСКІ Леанід Ігнатавіч, н. у 1908 у в. Краснае Асіповіцкага р-на. Калгаснік калгаса імя Дзяржынскага. Пражываў у в. Лісічкі Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 19.9.1937. Рэабілітаваны 9.6.1958.

ШПІЛЕЎСКІ Лявон Гіляравіч, н. у 1887 у в. Краснае Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Рэпрэсіраваны 19.9.1937. Рэабілітаваны 9.6.1958.

ШПІЛЕЎСКІ Юльян Гіляравіч, н. у 1890 у в. Лісічкі Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Арыштаваны 23.1.1933. Расстраляны. Рэабілітаваны 15.8.1958.

ШТАБНАЯ Кацярына Фёдараўна, н. у 1910 у г. Магілёў. Настаўніца школы № 2 г. Асіповічы. Рэпрэсіравана 17.1.1945. Рэабілітавана 29.5.1965.

ШТАБНЫ Ціхан Якаўлевіч, н. у 1902 у в. Зяленкавічы Касцюковіцкага р-на. Пражываў у г. Асіповічы. Арыштаваны 20.10.1937. Расстраляны 31.1.1938. Рэабілітаваны 7.10.1957.

ШТАЛЬБЕРТ Казімір Юльянавіч, н. у 1911 у Мінску. Майстар шклозавода. Пражываў у пас. Кастрычнік Асіповіцкага р-на. Арыштаваны 8.1.1938. Пакаранне адбываў у Мінску. Расстраляны 25.2.1938. Рэабілітаваны 30.10.1958.

ШУМЕЙКА Іван Ігнатавіч, н. у 1894 у в. Круты Бераг Навагрудскага р-на. Пражываў у в. Ясень Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 21.6.1938. Рэабілітаваны 19.5.1939.

ШУМЕЙКА Таіса Канстанцінаўна, н. у 1905 у г. Днепрапятроўск. Настаўніца Ясенскай НСШ. Пражывала ў в. Ясень Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіравана 19.5.1939. Рэабілітавана.

ШУНЬКО Каленік Ермалаевіч, н. у 1887 у в. Цэль Асіповіцкага р-на. Загадчык ашчаднай касы. Пражываў у м. Лапічы Асіповіцкага р-на. Арыштаваны 19.11.1937. Расстраляны 15.1.1938. Рэабілітаваны 29.5.1958.

ШУРАБЕЙКА Мікалай Аляксандравіч, н. у 1898 у в. Быч былой Гродзенскай губ. Рабочы райспажыўсаюза. Пражываў у г. Асіповічы. Арыштаваны 1.10.1937. Расстраляны 5.12.1937 у Бабруйску. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ШЫДЛОЎСКІ Мікалай Давыдавіч, н. у 1892 у в. Старое Курганне Клічаўскага р-на. Настаўнік. Пражываў у в. Свіслач Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 4.3.1938. Рэабілітаваны 16.8.1939.

ШЫДЛОЎСКІ Фёдар Рыгоравіч, н. у 1887 у с. Варонкі Чарнігаўскай вобл. Пражываў у г. Асіповічы. Рэпрэсіраваны 12.7.1938. Рэабілітаваны 9.6.1939.

ШЫКАЛЬЧЫК Мікалай Андрэевіч, н. у 1876 у в. Падгай Мінскага р-на. Рабочы ст. Уборак. Арыштаваны 26.8.1938. Расстраляны 16.1.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ШЫКУН Іосіф Андрэевіч, н. у 1885 у Пухавіцкім р-не. Дворнік мясцовага Савета. Пражываў у г. Асіповічы. Рэпрэсіраваны 1.2.1933. Рэабілітаваны 30.8.1989.

ШЫМАНСКАЯ Юзэфа Іосіфаўна, н. у 1901 у в. Ясянец Асіповіцкага р-на. Швачка арцелі «Прагрэс». Пражывала ў г. Асіповічы. Рэпрэсіравана 27.9.1944. Рэабілітавана 5.5.1961.

ШЫМАНСКІ Антон Гіляравіч, н. у 1898 у в. Ясянец Асіповіцкага р-на. Слесар дэпо ст. Асіповічы. Пражываў у г. Асіповічы. Арыштаваны 6.11.1937. Расстраляны 29.11.1937. Рэабілітаваны 23.11.1959.

ШЫМАНСКІ Вітольд Гіляравіч, н. у 1899 у в. Ясянец Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Рэпрэсіраваны 10.5.1931. Рэабілітаваны 8.8.1931.

ШЫМАНСКІ Уладзімір Аляксандравіч, н. у 1913 у в. Парэчча Мінскай вобл. Слесар паравознага дэпо. Пражываў у г. Асіповічы. Рэпрэсіраваны 30.6.1945. Рэабілітаваны 18.7.1960.

ШЫМКЕВІЧ-ЯРОМЕНКА Марыя Аляксандраўна, н. у 1890 у г. Ліепая, Латвія. Настаўніца чыг. школы. Пражывала ў г. Асіповічы. Арыштавана 10.3.1938. Расстраляна 1.10.1938. Рэабілітавана 2.8.1961.

ШЫТКАВЕЦ Баляслаў Сідаравіч, н. у 1882 у в. Прыцерпа Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Пастух калгаса імя Сталіна. Рэпрэсіраваны 18.9.1937. Рэабілітаваны 10.2.1958.

ШЫЧКО Мацвей Аляксандравіч, н. у 1893. Пражываў у в. Залессе Асіповіцкага р-на. Раскулачаны ў 1933. Рэабілітаваны 16.4.1992.

ШЫШКАВЕЦ Віктар Андрэевіч, н. у 1875 у в. Амінавічы Асіповіцкага р-на. Пражываў на ст. Уборак Беларускай чыгункі. Рэпрэсіраваны 13.9.1938. Рэабілітаваны 22.8.1939.

ШЫШКАВЕЦ Іван Адольфавіч, н. у 1859 у в. Прыцерпа Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Рэпрэсіраваны 18.9.1937. Рэабілітаваны 10.2.1958.

ШЫШКАВЕЦ Уладзімір Сідаравіч, н. у 1893 у в. Прыцерпа Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Сплаўшчык Свіслацкага лесасплаўучастка. Рэпрэсіраваны 18.9.1937. Рэабілітаваны 10.2.1958.

ШЭМЕНКА Рыгор Лявонавіч, н. у 1899 у Чарнігаўскай вобл., Украіна. Грузчык ст. Завішань Беларускай чыгункі. Пражываў у м. Ліпень Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 20.12.1937. Рэабілітаваны 24.11.1958.

ШЭЎЧЫК Мікалай Іванавіч, н. у 1872 у в. Свіслач Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Рэпрэсіраваны 11.7.1938. Рэабілітаваны 13.4.1939.

ЭЙСМАНТ Браніслаў Міхайлавіч, н. у 1910 у в. Рачыборак Бярэзінскага р-на. Рабочы завода «Спартак». Пражываў на ст. Градзянка Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 10.2.1931. Рэабілітаваны 30.9.1989.

ЭЙСМАНТ Іван Міхайлавіч, н. у 1907 у в. Рачыборак Бярэзінскага р-на. Рабочы завода «Спартак». Пражываў у Асіповіцкім р-не. Рэпрэсіраваны 2.3.1931. Рэабілітаваны 9.3.1931.

ЮНЕВІЧ Іосіф Адольфавіч, н. у 1906 у в. Міхаліна Бераставіцкага р-на. Шкловыдзімальшчык шклозавода «Кастрычнік». Пражываў у Асіповіцкім р-не. Арыштаваны 2.10.1937. Пакаранне адбываў у г. Бабруйск. Расстраляны 13.1.1938. Рэабілітаваны 4.6.1958.

ЮРКЕВІЧ Станіслаў Іванавіч, н. у 1902 у в. Чалны Асіповіцкага р-на. Электразваршчык вагоннага дэпо. Пражываў у г. Асіповічы. Рэпрэсіраваны 2.3.1945. Рэабілітаваны 21.4.1961.

ЮРКЕВІЧ Франц Іванавіч, н. у 1897 у в. Казлы Бярэзінскага р-на. Пуцявы абходчык ст. Асіповічы. Пражываў у Асіповіцкім р-не. Арыштаваны 3.6.1938. Расстраляны 19.10.1938. Рэабілітаваны 20.8.1957.

ЮШКЕВІЧ Вікенцій Якаўлевіч, н. у 1901 у в. Дубовы Лог Бярэзінскага р-на. Калгаснік калгаса імя Калініна. Пражываў у в. Сценкі Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 5.9.1938. Рэабілітаваны 22.8.1939.

ЮШКЕВІЧ Эдмунд Якаўлевіч, н. у 1874 у в. Ракаў Валожынскага р-на. Рабочы шклозавода «Кастрычнік». Пражываў у Асіповіцкім р-не. Арыштаваны 24.7.1938. Расстраляны 19.11.1938. Рэабілітаваны 31.3.1965.

ЯБЛОНСКІ Вікенцій Ігнатавіч, н. у 1895 у г. Чэрвень Мінскай вобл. Цясляр калгаса «Чырвоны сцяг». Пражываў у в. Заграддзе Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 18.7.1937. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ЯГМІН Іосіф Якаўлевіч (Якубавіч), н. у 1888 у в. Буды былой Ковенскай губ., Літва. Калгаснік калгаса «Шлях Леніна». Пражываў у в. Карытнае Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 2.7.1939. Рэабілітаваны.

ЯЖГУНОВІЧ Фёдар Фядосавіч, н. у 1888 у в. Бабровічы Пінскага р-на. Свяшчэннік. Пражываў у в. Пагарэлае Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 25.2.1931. Рэабілітаваны 20.5.1960.

ЯЗВІНСКІ Баляслаў Іванавіч, н. у 1884 на х. Зады Уздзенскага р-на. Пражываў у г. Асіповічы. Арыштаваны 6.8.1937. Пакаранне адбываў у Бабруйску. Расстраляны 2.10.1937. Рэабілітаваны 16.4.1960.

ЯЗВІНСКІ Фелікс Антонавіч, н. у 1892 на х. Гамхуніха Асіповіцкага р-на. Пуцявы абходчык ст. Асіповічы. Пражываў у г. Асіповічы. Арыштаваны 3.5.1938. Расстраляны 19.10.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 20.8.1957.

ЯКАЙЦІС Леанід Іосіфавіч, н. у 1904 у г. Асіповічы, дзе і пражываў. Сакратар Асіповіцкага райаддзела НКУС. Рэпрэсіраваны 10.5.1938. Рэабілітаваны 22.2.1939.

ЯКАЎЛЕЎ Аляксей Якаўлевіч, н. у 1899 у в. Ноздрынка Смаленскай вобл. Рабочы шклозавода. Пражываў у Асіповіцкім р-не. Арыштаваны 16.2.1937. Расстраляны 25.2.1938. Рэабілітаваны 4.3.1958.

ЯКІМЧЫК Пётр Емяльянавіч, н. у 1886 у в. Клінок Чэрвеньскага р-на. Шавец. Пражываў у в. Цэль Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 6.8.1937. Рэабілітаваны 6.6.1959.

ЯКУБОЎСКІ Адам Францавіч, н. у 1876 у в. Яноўка Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Пастух калгаса «Камінтэрн». Рэпрэсіраваны 6.8.1937. Рэабілітаваны 19.5.1962.

ЯКУБОЎСКІ Уладзіслаў Баляслававіч, н. у 1896 у Чэрвеньскім р-не. Рабочы ст. Асіповічы. Пражываў на ст. Асіповічы. Рэпрэсіраваны 1.4.1929. Рэабілітаваны 4.8.1958.

ЯЛОВІК Адам Сцяпанавіч, н. у 1880 у в. Пагарэлае Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 6.2.1933. Адбываў пакаранне ў Казахстане. Рэабілітаваны 5.6.1962.

ЯЛОВІК Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1882 у в. Пагарэлае Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Селянін-аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 12.1.1933. Адбываў пакаранне ў Казахстане. Рэабілітаваны 5.6.1962.

ЯЛОВІК Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1882 у в. Пагарэлае Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Калгаснік калгаса «Рэкорд». Рэпрэсіраваны 18.9.1937. Рэабілітаваны 9.4.1960.

ЯМРОЎСКІ Аляксандр Адольфавіч, н. у 1887 у Жытомірскім р-не, Украіна. Працаваў на шклозаводзе «Кастрычнік». Пражываў у Асіповіцкім р-не. Арыштаваны 16.12.1937. Пакаранне адбываў у Мінску. Расстраляны 25.2.1938. Рэабілітаваны 29.10.1957.

ЯНДУЛЬСКІ Іосіф Лук'янавіч, н. у 1888 у Валынскай вобл. Старшыня калгаса імя Леніна. Пражываў у в. Галынка Асіповіцкага р-на. Арыштаваны 6.11.1937. Расстраляны 5.12.1937. Рэабілітаваны 22.10.1957.

ЯНДУЛЬСКІ Іосіф Лявонцьевіч, н. у 1897. Рабочы шклозавода «Кастрычнік». Пражываў у Асіповіцкім р-не. Арыштаваны 18.4.1938. Расстраляны 1.10.1938. Рэабілітаваны 10.9.1957.

ЯНОЎСКІ Павел Рыгоравіч, н. у 1889 у в. Свіслач Асіповіцкага р-на, дзе і пражываў. Рэпрэсіраваны 12.1.1933. Рэабілітаваны 10.10.1959.

ЯНУШЭЎСКІ Браніслаў Іванавіч, н. у 1887 у Вільнюсе. Дзяжурны па ст. Свіслач. Пражываў на ст. Свіслач. Арыштаваны 31.8.1937. Расстраляны 5.1.1938. Рэабілітаваны 5.2.1959.

ЯНУШЭЎСКІ Іван Антонавіч, н. у 1890 у г. Асіповічы, дзе і пражываў. Старшы рахункавод 13-й дыстанцыі пуці. Арыштаваны 23.8.1937. Расстраляны 28 12.1937. Рэабілітаваны 1.10.1957.

ЯРАШЭНКА Клара Фёдараўна, н. у 1925 у Мінску. Пражывала ў г. Асіповічы. Рэпрэсіравана 18.7.1944. Рэабілітавана 1.11.1944.

ЯРОМЕНКА Юрый Георгіевіч, н. у 1888 у с. Ніканаўка Серабранскага р-на, Украіна. Дырэктар сярэдняй школы г. Асіповічы. Арыштаваны 25.11.1937. Расстраляны 14.1.1938. Рэабілітаваны 1.11.1961.

ЯЎМЕНАЎ Фёдар Іванавіч, н. у 1909 у Рослаўльскім р-не, Расія. Працаваў на шклозаводзе «Кастрычнік». Пражываў у Асіповіцкім р-не. Арыштаваны 5.11.1937. Расстраляны 5.12.1937. Рэабілітаваны 30.10.1958.

ЯЎСТАФ'ЕЎ Іван Кандратавіч, н. у 1888 у в. Спорнае Смаленскай вобл. Дарожны майстар. Пражываў на ст. Асіповічы-2. Рэпрэсіраваны 15.1.1931. Рэабілітаваны 19.9.1989.

ЯЦКО Вера Сцяпанаўна, н. у 1906 у в. Свіслач Асіповіцкага р-на. Пражывала ў Мінску. Рэпрэсіравана 29.5.1948. Рэабілітавана 11.6.1955.

ЯЦКО Марыя Сцяпанаўна, н. у 1900 у в. Свіслач Асіповіцкага р-на. Начальнік аддзела Белкаапсаюза. Пражывала ў Мінску. Рэпрэсіравана 29.5.1948. Рэабілітавана 11.6.1955.

ЯЦЫНА Іосіф Ігнатавіч, н. у 1903 у в. Жорнаўка Асіповіцкага р-на. Каваль. Пражываў у п. Партызан Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 18.9.1937. Рэабілітаваны 14.1.1961.

ЯЦЭВІЧ Аляксандр Іванавіч, н. у 1885 у в. Верхняе былой Гродзенскай губ. Грузчык ст. Лапічы Асіповіцкага р-на. Пражываў у в. Новая Ніва Асіповіцкага р-на. Рэпрэсіраваны 6.8.1937. Рэабілітаваны 8.2.1958.

Падрыхтаваў П.С.Качановіч.

Жыхары Асіповіцкага раёна, якія загінулі ў час савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг.

ГРЫБАЎ Пётр Іосіфавіч, г. Асіповічы, радавы, загінуў 28.12.1939.

ІГНАТОВІЧ Міхаіл Максімавіч, в. Матавіла Ясенскага сельсавета.

КАЛОЛА Еўдакім Мікалаевіч, радавы, прапаў без вестак у лютым 1940.

МАСЛОК Рыгор Сцяпанавіч, в. Пясчанка Дрычынскага сельсавета.

ШУХАЎ Пётр Сцяпанавіч, в. Пясчанка Дрычынскага сельсавета.

1941

1945

ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

У першыя дні

Вайна, якую вераломна пачала 22 чэрвеня 1941 г. фашысцкая Германія супраць Савецкага Саюза, стала суровым выпрабаваннем для нашага народа, у тым ліку і для жыхароў Асіповіцкага раёна.

Жыхары раёна даведаліся пра пачатак вайны ў 12 гадзін з выступлення па радыё намесніка старшыні СНК СССР, наркома замежных спраў В.М.Молатава.

Жыццё горада і раёна рэзка змянілася. На прадпрыемствах і ва ўсіх сельсаветах былі праведзены мітынгі і сходы, на якіх працоўныя выказвалі гнеў і абурэнне фашысцкімі захопнікамі, упэўненасць у хуткім разгроме агрэсараў на іх жа тэрыторыі.

Тады, у першыя дні вайны, ніхто яшчэ не ведаў, нават не мог і прадбачыць, якія цяжкія пакуты, выпрабаванні, ахвяры чакаюць наперадзе.

У Асіповічах і раёне былі зроблены тэрміновыя захады па пераводзе ўсяго жыцця на ваенны лад, і перш за ўсё чыгуначнага вузла, па аказанні ўсебаковай дапамогі Чырвонай арміі. 23—25 чэрвеня райваенкамат арганізавана правёў мабілізацыю ваеннаабавязаных. Але завяршыць мерапрыемствы па пераводзе ўсяго жыцця на ваенны лад з-за хуткага прасоўвання варожых войскаў не ўдалося.

Першыя ўдары па Асіповіцкім чыгуначным вузле і ваенным гарадку нямецкая авіяцыя нанесла ў ноч з 22 на 23 чэрвеня.

На тэрыторыі Беларусі, галоўным напрамку ўдару фашысцкіх войскаў, наступала буйнейшая нямецкая група армій «Цэнтр» у складзе 4-й і 9-й палявых армій, 2-й і 3-й танкавых груп, усяго 50 дывізій, у тым ліку 15 танкавых і матарызаваных, і двух матарызаваных брыгад. Яе падтрымліваў 2-і паветраны флот — звыш 1700 баявых самалётаў. Групе армій «Цэнтр» было перададзена больш за трэць усіх інжынерных і дарожна-будаўнічых войскаў і каля паловы асобных артылерыйскіх, зенітных і процітанкавых дывізіёнаў і батарэй рэзерву сухапутных сіл Германіі.

Пачатак ваенных дзеянняў на тэрыторыі Беларусі для войскаў Заходняй Асобай ваеннай акругі (з 22 чэрвеня 1941 г. — Заходняга фронту) быў трагічны. За першы дзень баёў нямецкія перадавыя часці прасунуліся па беларускай тэрыторыі на 35, а месцамі да 50 кіламетраў, адкрыўшы прастор для вядзення баявых дзеянняў асноўным сілам групы армій «Цэнтр».

У прыгранічных баях войскі 3, 4 і 10-й армій Заходняга фронту панеслі

вялікія страты ў жывой сіле і тэхніцы і пад націскам значна большых сіл праціўніка (на асноўных напрамках гітлераўцы стварылі трайную, а ў некаторых месцах пяцікратную перавагу) вымушаны былі адыходзіць на ўсход. Абарона насіла ачаговы характар. Часці прыкрыцця ўступалі ў бой разрознена і неарганізавана. Паблізу накірункаў галоўных удараў ворага не было моцных рэзерваў. Адсутнасць суцэльнага фронту давала магчымасць танкавым і матарызаваным злучэнням гітлераўцаў, пры поўным панаванні ў паветры, абыходзіць вузлы супраціўлення нашых войскаў і наносіць ім удары ў флангі і з тылу. У выніку гэтага часці і злучэнні Чырвонай арміі ў шэрагу выпадкаў вымушаны былі змагацца ў акружэнні ці адыходзіць на ўсход, несучы вялікія страты ў жывой сіле і тэхніцы.

За Асіповічы вялікіх баёў не было, таму што злучэнні 2-й танкавай групы Гудэрыяна абышлі горад і раён з поўдня і поўначы і імкліва рушылі на Бабруйск і Магілёў. Раніцай 28 чэрвеня яны ўвайшлі ў Бабруйск, а ў Асіповічах яшчэ працягвала існаваць савецкая ўлада. Горад гітлераўцы занялі 30 чэрвеня, а да 2 ліпеня быў акупіраваны ўвесь раён.

Але яшчэ ў ліпені і нават у жніўні на тэрыторыі раёна вяліся баявыя дзеянні ў тыле варожых войскаў. Гэта змагаліся байцы 214-й паветрана-дэсантнай брыгады. Яны рабілі засады на дарогах, падрывалі масты, аўтамашыны, а ў пачатку ліпеня нанеслі артылерыйскі ўдар па размяшчэнні ворага ў ваенным гарадку ў Асіповічах. На знішчэнне дэсантнікаў немцы кінулі некалькі палкоў. 14 ліпеня ў раёне рабочага пасёлка Татарка пасля цяжкага бою брыгада, панёсшы страты, прарвалася на поўдзень і працягвала свой ге-

Байцы 214-й паветрана-дэсантнай брыгады, якая прымала ўдзел у баях на тэрыторыі Асіповіцкага раёна ў чэрвені 1941 г.: камандзір брыгады А.Ф.Левашоў (уверсе злева), М.І.Сівец (уверсе справа) і група парашутыстаў-дэсантнікаў 2-га ўзвода 1-й роты (камандзір старшы лейтэнант Р.Якаўлеў).

раічны рэйд да злучэння з часцямі Чырвонай арміі на Украіне. Больш трагічна склаўся лёс кавалерыйскай групы, якая прайшлася рэйдам па тылах ворага (гл. артыкул «Трагедыя ў лесе Ліпнікі»).

У.І.Лемяшонак.

Трагедыя ў лесе Ліпнікі

Горад Асіповічы легам 1941 г. аказаўся крыху ў баку ад напрамку галоўнага ўдару нямецкіх войскаў. Немцы занялі Асіповічы толькі 30 чэрвеня (тады як Бабруйск — 28 чэрвеня) і паставілі тут гарнізон ужо пасля таго, як горад апынуўся ў глыбокім тыле, а ў лясах навокал горада пачалі сканцэнтроўвацца савецкія часці як адышоўшыя з захаду, так і выйшаўшыя для дзеянняў па фашысцкіх тылах з поўдня.

На чыгуначным участку Гомель — Калінкавічы выгрузіліся тры кавалерыйскія дывізіі, якія прыбылі ў Беларусь з паўднёвых раёнаў краіны. Адна з іх (32-я) — з Крыма — была кадравай, дзве іншыя (43-я і 47-я) былі толькі што сфарміраваны ў скарочаных штатах на Паўночным Каўказе. Усе тры дывізіі звялі ў конную групу, на чале якой быў пастаўлены палкоўнік А.І.Бацкалевіч (родам з-пад Баранавіч), начальнікам штаба стаў бабруйчанін палкоўнік М.І.Глінскі.

Дывізіі коннай групы атрымалі задачу дзейнічаць у тыле нямецкай групы армій «Цэнтр» у агульным напрамку на Глуск, Асіповічы, Оршу — парушаць камунікацыі і граміць фашысцкія тылы, чым ускладніць наступленне ворага на смаленскім напрамку.

Выйшаўшы без асаблівых ускладненняў у рэйд, 32-я кавалерыйская дывізія авалодала Глускам і неўзабаве перарэзала шашу Бабруйск — Слуцк, па якой немцы ўзмоцнена перакідвалі рэзервы. У архіўных апісаннях тых падзей, зробленых у дывізіі цераз тры гады, прыведзены гераічныя подзвігі часцей, падраздзяленняў і асобных воінаў. І, здаецца, нішто не азмрочвала дзеянняў коннікаў, хіба што недахоп боепрыпасаў да канца рэйду. Мяне ж насцярожыў адзін малапрыкметны факт: у аператыўных зводках кавалерыйскай групы пасля рэйду ўпаміналася толькі пра два палкі, а да рэйду іх было ў дывізіі чатыры. Куды ж дзеліся яшчэ два? На гэтае пытанне не маглі адказаць нямногія, што засталіся жывымі, воіны дывізіі — відавочцы тых далёкіх падзей.

У 1989 г. мне пашанцавала сустрэцца з былым начальнікам штаба коннай групы генерал-лейтэнантам у адстаўцы М.І.Глінскім. Вось што ён расказаў:

«Пасля моцнага бою за шашу Бабруйск — Слуцк тры палкі дывізіі ад Сіманавіч цераз Радуцічы пайшлі ў лясы пад Асіповічы. Яны атрымалі задачу перарэзаць чыгуначную магістраль Мінск — Бабруйск. 153-і кавалерыйскі полк, якім камандаваў П.В.Кузьмін, павінен быў атакаваць станцыю Татарка, а 65-ы пад камандаваннем маёра А.В.Казарэза — наступаць на станцыю Ясень. 86-ы кавалерыйскі полк палкоўніка Н.Д.Шаўчэнкі быў у рэзерве.

Штаб дывізіі з 121-м кавалерыйскім палком застаўся ля шашы Слуцк — Бабруйск, бо іншыя дывізіі спазняліся, уцягнуўшыся ў бой з насядаючым з захаду праціўнікам. Хутка немцы падцягнулі рэзервы і перакрылі ўсе шляхі, якія вялі цераз Бабруйск — Слуцк на поўнач. Сувязь з пайшоўшымі наперад палкамі спынілася. Маламагутныя радыёстанцыі не маглі яе забяспечыць. Камандзіры сувязі, якія высылаліся, перахоплівaліся немцамі. Абстаноўка на поўдзень ад Асіповіч працягвала заставацца незразумелай. Па кароткіх даных было вядома, што нашы палкі выканалі задачу — рух паяздоў на чыгункі Асіповічы — Бабруйск перарваўся».

З ваеннага дзённіка Ф.Гальдэра — размова з фельдмаршалам фон Бокам 28.6.1941 г.:

«Руская кавалерыя (якая дзейнічала ў тыле групы армій «Цэнтр». — *М.Д.*) відавочна нават вывела са строю чыгунку, якая ідзе на Бабруйск...»

«Выкананне задачы (па ліквідацыі рускіх. — *М.Д.*) ускладзена на войскі апе-

ратыўнага тылу... Прыцягнуты часці тылавых дывізій. Яны будуць спрабаваць акружыць праціўніка. Выкарыстоўваецца авіяцыя...»

З успамінаў удзельніка баёў 32-й кавалерыйскай дывізіі Е.Г.Марткоўскага (г. Бабруйск):

«Пры выхадзе ў рэйд нам далі па дзве банкі тушонкі, крыху махоркі і хлеба. Гэтага, канечне, не хапіла на ўвесь рэйд. Таму камандзіры атрымалі грошы, каб купляць прадукты ў насельніцтва. Але ніхто з жыхароў грошай не браў, яны кармілі нас бясплатна, выносілі нам усё, што ў іх было. У цяжкае становішча мы траплялі толькі тады, калі працяглы час знаходзіліся ў лясах, не маючы сувязі з насельніцтвам».

З успамінаў Ю.Ф.Бабіны (г. Асіповічы):

«Да 3 жніўня многа кавалерыстаў сканцэнтравалася ў лесе Ліпнікі на паўднёвы ўсход ад Асіповіч. Часткова яны былі таксама ў лесе Вялікі Бор. Месцы гэтыя мелі многа балоцістых участкаў і вельмі мала дарог. Тут кавалерысты аказаліся ў пастцы. У гэты дзень немцы акружылі іх у трохвугольніку Асіповічы — Карытнае — Татарка. На дарозе з Асіповіч на Карытнае на ўсіх перакрыжаваннях выставілі пасты з кулямётамі, а ў Каранах паставілі на прамую наводку нават артылерыю. На высотцы Магілёўскага парка ў Асіповічах разгарнулі артылерыю і падцягнулі бронецягнік, другі бронецягнік паставілі ў Татарцы. Уся чыгунка на гэтым участку аказалася пад абстрэлам.

У 14 гадзін, падняўшы ў паветра карэкціровачную авіяцыю, немцы пачалі абстрэл лесу Ліпнікі з бронецягнікоў і гармат. Агонь вёўся прыцэльна, па самых шчыльных скапленнях савецкіх казакоў. Ад разрываў снарадаў шарахаліся з конавязей коні, запрэжаныя ў кулямётныя тачанкі і гарматныя перадкі, ламаліся дрэвы, ірвалася збруя. Калечыліся коні. Гінулі людзі.

Коннікі спрабавалі прабіцца на ўсход да чыгункі цераз тарфянікі. Многія з іх гінулі ў залітых вадой старых ямах торфараспрацовак. Тыя, хто дабраўся да чыгункі, гінулі ад агню бронецягнікоў».

З успамінаў былога жыхара в. Караны В.Пацкевіча (г. Асіповічы):

«З наступленнем цемры нашы байцы пачалі моцную атаку на Караны і далей на Максімаўку, каб прарвацца да рэчкі Пціч. Трасы куль веерамі разляталіся ў начным небе над вёскай. Хутка загарэліся вясковыя хаты. Немцы амаль бесперапынна вялі агонь з кулямётаў і гармат. Раптам нашы коннікі з лесу пайшлі ў атаку. Немцы давялі свой агонь да максімуму. Сотні коннікаў атакавалі вёску. Многія з іх загінулі пад згубным фашысцкім агнём. Толькі нямногім удалося прарвацца, але наперадзе былі новыя засады.

У гэтую ж ноч другая група рабіла прарыў у напрамку Ставішча, Зашыбіна. І там засталося мноства трупаў».

З успамінаў Е.Г.Марткоўскага:

«Хацелася б сказаць пра байцоў дывізіі. Я доўга яшчэ ваяваў у іншых часцях, магу параўнаць. Маральны дух і патрыятызм у тых кадравых кавалерыстаў быў вельмі высокі. Я больш не сустракаў такіх герояў».

З успамінаў А.С.Санковіча (г. Асіповічы):

«Раніцой 4 жніўня коннікі зрабілі, напэўна, апошнюю спробу вырвацца з акружэння. Яны павялі атаку цераз вёску Прудок і мост на рэчцы на паўднёвую ўскраіну горада. Па дарозе неслася каля сотні коннікаў. Ля першых дамоў горада камандзір чамусьці спыніўся. Магчыма, яму трэба было зарыентавацца. У гэты час з аднаго дома выскачылі немцы і адкрылі агонь. Камандзір упаў на зямлю. Коннікі памчаліся ўздоўж гарадка ў бок Осава. Камандзіра ж (гэта быў старшы лейтэнант) немцы доўга не дазвалялі пахаваць. Конь не адыходзіў ад свайго гаспадара...»

З успамінаў Ю.Ф.Бабіны:

«Больш спроб прарыву кавалерыстаў з лесу не было. Безгаспадарныя коні пасвіліся на палянах ля дарогі. Немцы яшчэ некалькі дзён не здымалі засаду. У Асіповічах ля бамбасховішчаў і ваенкамата ў дашчатай павеці арганізавалі лагер ваеннапалонных. Але палонных кавалерыстаў там аказалася мала — усяго каля сотні. У адносінах да іх фашысты асабліва лютавалі.

Казакі яшчэ доўга хаваліся ў лесе. Галодныя, заросшыя і абарваныя, яны выпаўзалі з канапель да крайніх хат Асіповіч і прасілі есці».

З успамінаў Е.Ф.Жоўнер (г. Асіповічы) і Г.К.Жука (загінуў у партызанскім атрадзе № 221):

«Для пахавання казакоў у лесе Ліпнікі немцы сабралі многа жыхароў з горада і пяці бліжэйшых вёсак. Хавалі іх каля тыдня. Адзінай брацкай магілы не рабілі. Хавалі па аднаму ці групамі там, дзе былі забіты. Побач закопвалі коней. На магілах воінаў ляжалі каскі — па колькасці загінуўшых. Асабліва многа было пахавана нашых воінаў у лесе ля дарогі Прудок—Караны, а таксама ў глыбіні лесу, дзе вёўся абстрэл. Ля Прудка ў лесе пахавалі палкоўніка, пры ім былі шашка, палявая сумка і наган».

З гутаркі з Ю.Ф.Бабінам:

«Я быў неўзабаве на месцы гэтага пабоішча. Страшны малюнак уяўляў лес: сотні свежых магіл, разбітыя брычкі, ваенная тэхніка, безгаспадарныя коні, зламаныя і паваленыя дрэвы. У лесе валялася больш дзесятка скаверканых гармат, многа кулямётаў, вінтовак».

З пісьма Марозава (даследчыка з Краснадарскага краю) ад 13.10.1988 г.:

«65-ы і 153-і кавалерыйскія палкі панеслі небывалыя страты, калі не лічыць эскадрон Д.М.Дарафеева, якому ўдалося вырвацца цераз Бярэзіну на ўсход».

З гутаркі з М.І.Глінскім:

«Так, сапраўды два палкі 32-й кавалерыйскай дывізіі з рэйду не выйшлі. А трэці быў значна абяскроўлены і практычна небаяздольны. Палкоўнік Н.Д.Шаўчэнка і маёр А.В.Казарэз, напэўна, загінулі».

Па некаторых, пакуль неправераных, даных маёр А.В.Казарэз быў цяжка паранены і пакінуты аднапалчанамі на лячэнне ў Старадарожскім раёне. Нямногім удалося вырвацца з лесу Ліпнікі. Акрамя эскадрона Дарафеева, некалькі груп прарвалася на захад да рэчкі Пціч і на поўдзень да Глушы. Некаторыя кавалерысты, згубіўшы таварышаў, да халадоў хаваліся ў лясах. Жыхар в. Карытнае Сугака расказаў, што восенню многа казакоў жыло ў вёсках у прымах. Затым немцы іх пачалі выклікаць у Асіповічы, быццам для пастаноўкі на ўлік. Першыя, хто з'явіліся на ўлік, аказаліся ў лагеры ваеннапалонных. Тады ўсе астатнія пайшлі ў лес партызанамі.

Лес Ліпнікі быў не адзіным месцам у раёне, дзе адбылася масавая гібель кавалерыстаў. Былы жыхар в. Радуцічы Мікалай Мірончык расказаў, што ў балоце ў раёне вёсак Радуцічы, Слопішча, Лука ў пачатку жніўня 1941 г. завязла кавалерыя. Там было многа ваеннага інвентару, зброі, загінуўшых коней. Жыхары выцягнулі з балота да 200 жывых коней. У лесе тады хавалася многа чырвонаармейцаў-коннікаў. Фашысты вылавілі іх, многіх расстралялі ў в. Радуцічы. Гэта былі воіны 32-й кавалерыйскай дывізіі.

Калі ў кожным кавалерыйскім палку было каля тысячы шабляў, то са сказанага раней можна зрабіць вывад, што толькі ў лесе Ліпнікі 3—4 жніўня 1941 г. фашысты акружылі і знішчылі да двух палкоў, г. зн. каля паўтары тысячы воінаў.

На жаль, ніякага помніка каля лесу Ліпнікі і ў самім лесе няма. А памяць людская нявечная, і сёння мала хто ведае пра тую трагедыю.

Падрыхтаваў М.Данілаў.

Акупацыйны рэжым

Акупацыйны рэжым, што быў устаноўлены гітлераўцамі на часова захопленай імі тэрыторыі нашай Радзімы, распрацоўваўся загадзя, яшчэ да нападу на Савецкі Саюз. Галоўныя яго накірункі былі выкладзены Гімлерам у сакрэтным мемарандуме «Некаторыя думкі пра абыходжанне з насельніцтвам на Усходзе» ад 25 мая 1940 г. У ім указвалася, што захопленыя ўсходнія тэрыторыі належыць разглядаць як аб'ект каланізацыі і германізацыі. Акупацыйная палітыка, гаварылася ў гэтым мемарандуме, павінна быць накіравана на тое, каб ператварыць актыўную масу «іншароднага насельніцтва» ў напаўпісьменных рабоў.

З мясцовым насельніцтвам увогуле ніякіх праблем нацысты не прадбачылі: бязлітаснае насілле зробіць яго паслухмяным і згаворлівым.

Тэрор на акупіраванай тэрыторыі СССР, у тым ліку і Беларусі, планаваўся загадзя. Так, у «Кіруючых указаннях аб паводзінах войскаў у Расіі», распрацаваных штабам вярхоўнага галоўнакамандавання ўзброеных сіл Германіі ў якасці дадатку да асобага распараджэння № 1 ад 19 мая 1941 г. па рэалізацыі дырэктывы Гітлера № 21, прама ўказвалася на неабходнасць бязлітасных і рашучых дзеянняў супраць «бальшавіцкіх падбухторшчыкаў, партызан, сабатажнікаў, яўрэяў і поўнага падаўлення любой спробы актыўнага або пасіўнага супраціўлення»[1]. 13 мая 1941 г. начальнік штаба В.Кейтэль падпісаў «Распараджэнне Гітлера аб ваеннай падсуднасці ў раёне «Барбароса» і асобных паўнамоцтвах войскаў». Гэта распараджэнне з'явілася тым самым афіцыйным дакументам, які здымаў з салдат і афіцэраў вермахта юрыдычную і маральную адказнасць за забойствы грамадзянскага насельніцтва на тэрыторыі нашай краіны[2].

У адпаведнасці з гэтым і іншымі распараджэннямі і загадамі любы чыноўнік акупацыйнага апарата, паліцэйскі, афіцэр і салдат вермахта мог па асабістым бачанні распараджацца жыццём савецкіх грамадзян, не кажучы ўжо аб іх маёмасці.

Акупацыйная палітыка фашысцкай Германіі на нашай зямлі ўяўляла сабой адзіны комплекс ваенных, палітычных, эканамічных і ідэалагічных мерапрыемстваў, а па сваіх мэтах і сутнасці насіла адкрыта варварскі, рабаўнічы характар. Планы па яе ажыццяўленні распрацоўваліся ў ведамстве Г.Гімлера, які ўзначальваў СС. З красавіка 1941 г. такім планаваннем занялося «бюро па цэнтралізаваным рашэнні праблем усходнееўрапейскай прасторы» на чале з Розенбергам, да яго падключыліся і розныя аддзелы штаба вярхоўнага галоўнакамандавання ўзброеных сіл Германіі. У эсэсаўскіх установах рыхтаваліся праекты планаў каланізацыі ўсходніх зямель. У далейшым абагульненыя праекты і прапановы атрымалі назву «Генеральны план «Ост», прычым ён пастаянна дапаўняўся і ўдакладняўся. Хоць канчатковага варыянта плана гісторыкам знайсці не ўдалося, але тое, што захавалася, дае магчымасць скласці даволі поўнае ўяўленне аб ім.

План «Ост» — асноўны, але і не адзіны, дакумент, які раскрываў сапраўдныя мэты гітлераўцаў. Менавіта ў ім ярчэй за ўсё ўвасобіліся ідэі генацыду, каланізацыі захопленых тэрыторый, германізацыі: высялення і знішчэння народаў Усходняй Еўропы, у тым ліку і Беларусі.

Ажыццяўленне каланіяльных планаў акупанты пачалі з першых дзён уварвання перакройкай граніц рэспублік Савецкага Саюза і стварэннем адміністрацыйнага кіравання.

Адміністрацыйна-палітычнае ўладкаванне акупіраваных тэрыторый выраша лася ў адпаведнасці з поглядамі Гітлера, якія абгрунтоўваліся яго перакананнем у спецыфічна яўрэйскай прыродзе бальшавізму і яго глыбокай нянавісцю да ўсіх славянскіх нацый. Спрадвечны, на думку фюрэра, канфлікт са славянскім мірам рабіў Расію, незалежна ад яе палітычнага строю, пастаяннай крыніцай пагрозы для немцаў. Урэшце, яго перакананасць у непаўнацэннасці славянскай расы служыла яшчэ адным доказам, каб беззваротна знішчыць у Расіі любыя формы палітычнай арганізацыі, таму што рабам дзяржава не патрэбна.

Зацверджанае летам 1941 г. упраўленне акупіраваных тэрыторый з'явілася адлюстраваннем таго, што Гітлер не ўспрымаў ніякіх іншых рашэнняў, акрамя «поўнай каланізацыі» захопленых тэрыторый СССР.

У адпаведнасці з гэтым на практыцы пачалі рэалізоўвацца тры формы адміністрацыйнай арганізацыі. Першая — гэта далучэнне захопленых рэгіёнаў да іншых дзяржаў; другая ўключала раён ваенных дзеянняў — прастору ад лініі фронту да тылавых граніц груп армій. Уся ўлада тут была сканцэнтравана ў руках ваенных інстанцый. Ім падпарадкоўваліся начальнікі тылавых раёнаў з палявымі і гарнізоннымі (мясцовымі) камендатурамі, ахоўныя дывізіі і іншыя войскі спецыяльнага прызначэння. У гэтай вялізнай пры-

[1] Преступные цели гитлеровской Германии в войне против Советского Союза: Документы и материалы. М., 1987. С. 70.

[2] Тамсама. С. 67 — 70.

франтавой зоне да кіравання ў нязначнай ступені прыцягваліся мясцовыя органы ўлады, але толькі ў населеных пунктах. І трэцяя форма — тэрыторыі, якія знаходзіліся за межамі тэатра ваенных дзеянняў. Яны былі аддадзены нямецкай грамадзянскай адміністрацыі і падпарадкоўваліся «ўсходняму міністэрству», якое з 17 ліпеня 1941 г. узначальваў тэарэтык «усходняй палітыкі» Розенберг.

План расчлянення СССР прадугледжваў стварэнне на яго акупіраваных тэрыторыях чатырох рэйхскамісарыятаў: «Остланд», «Украіна», «Каўказ», «Расія« (ці «Масковія»).

У адпаведнасці з гэтым планам быў здзейснены і падзел Беларусі, які ў асноўным быў завершаны восенню 1941 г. Яе тэрыторыю захопнікі гвалтоўна парэзалі на часткі, груба парушыўшы пры гэтым гістарычна склаўшуюся супольнасць тэрыторыі, мовы, культуры беларускага народа. Тэрыторыю рэспублікі па лініі Полацк — Барысаў на ўсходзе, Старыя Дарогі — возера Чырвонае на поўдні, па р. Зальвянка і ўсходняй ускраіне Белавежскай пушчы на захадзе вылучылі ў генеральную акругу, якая атрымала назву «Беларутэнія». Плошча акругі склала толькі чвэрць тэрыторыі Беларусі з насельніцтвам 3 138 256 чалавек (па стане на 4 снежня 1941 г.). Паўднёвыя раёны Гомельскай, Палескай і Пінскай абласцей, частка Брэсцкай вобласці былі ўключаны ў рэйхскамісарыят «Украіна». Беластоцкая вобласць, паўночныя раёны Брэсцкай і частка Баранавіцкай абласцей адышлі да акругі «Беласток», якая далучалася да Усходняй Прусіі. Частку Ашмянскага, Свірскага, Відзаўскага, Астравецкага, Смаргонскага і Пастаўскага раёнаў далучылі да генеральнай акругі «Літва». Віцебскую і Магілёўскую вобласці, усходнія раёны Мінскай, у т.л. і Асіповіцкі раён, а таксама большую частку Гомельскай абласцей аднеслі ў зону армейскага тылу групы армій «Цэнтр».

Для ажыццяўлення сваёй злачыннай палітыкі ў раён прыбылі айнзатцкаманды, зондэркаманды, тайная палявая паліцыя (ГФП), паліцыя бяспекі і СД, фельдкамендатуры, ортскамендатуры, жандармерыя і іншыя карныя органы. Усе яны дзейнічалі самастойна, альбо разам з часцямі вермахта. Уся неабмежаваная ўлада належала нямецкім ваенным палявым і мясцовым камендантам.

Для больш эфектыўнага правядзення сваёй злачыннай палітыкі акупанты жадалі заручыцца падтрымкай мясцовага насельніцтва. Для надання бачнасці мясцовага самакіравання яны стварылі марыянетачную так званую мясцовую ўладу — раённую ўправу на чале з бургамістрам, на тэрыторыях былых сельсаветаў былі створаны валасныя ўправы, якія ўзначальвалі бургамістры, у кожную вёску прызначылі старост. Самастойнасці, вядома, гэтая «мясцовая ўлада» не мела. Яна выконвала ўказанні нямецкага каменданта, сутнасць якіх — высмоктваць матэрыяльныя і людскія рэсурсы раёна.

Для падтрымання свайго «парадку» і барацьбы супраць партызан і падпольшчыкаў гітлераўцы стварылі з мясцовых жыхароў, якія перайшлі да іх на службу, так званую дапаможную паліцыю парадку. Гарнізоны з такой паліцыі былі ўстаноўлены амаль ва ўсіх буйных вёсках раёна. Разам і пад кіраўніцтвам акупацыйных

Распараджэнне акупацыйных улад.

улад яны пачалі наводзіць «новы парадак». У раёне пачаліся масавыя вобыскі, арышты, расстрэлы.

Каб надаць найбольш арганізаваны характар катаванням і знішчэнню савецкіх людзей, на тэрыторыі Беларусі была створана сістэма канцлагераў. Дзесяткі тысяч мірных грамадзян адпраўляліся ў гэтыя лагеры разам са сваімі сем'ямі без суда і ўсялякага вызначэння тэрмінаў зняволення. Умовы зняволення ў лагерах былі свядома разлічаны на тое, каб давесці вязняў да пакутнай смерці.

Нябачаныя зверствы і гвалт над мірным насельніцтвам Беларусі гітлераўцы здзяйснялі ў час правядзення карных экспедыцый. Пад выглядам барацьбы з партызанамі карнікі ператваралі ў зоны пустэчы цэлыя раёны. Тысячы вёсак змяталіся з твару зямлі, жыхары іх знішчаліся, вывозіліся ў канцлагеры ці ў фашысцкае рабства ў Германію.

Карныя экспедыцыі ажыццяўляліся войскамі вермахта, атрадамі паліцыі бяспекі і СД, паліцэйскімі, жандарскімі падраздзяленнямі. У Асіповіцкім раёне фашыстамі было расстраляна, павешана, закатавана 3829 мірных жыхароў, спалена 50 вёсак, у тым ліку 12 цалкам разам з усімі жыхарамі (Бозак, Вялікая Гарожа, Бортнае, Брыцалавічы, Весялова, Лочын, Май, Макаўе, Палядкі, Ражышча, Рэпішча, Старонка).

Гітлераўскія верхаводы яшчэ задоўга да нападу на нашу краіну падрыхтавалі праграму рабавання і раскрадання багацця ў нашага народа, якая складала неразрыўную частку агульнага плана агрэсіі супраць Савецкага Саюза.

У гэтай праграме захопнікі вельмі актыўна ўлічвалі матэрыяльныя рэсурсы і людскія рэзервы Беларусі, імкнучыся паставіць іх на службу сваёй агрэсіўнай вайне. «Мы прыбылі ў краіну, — заявіў гітлераўскі намеснік у Беларусі гаўляйтэр В.Кубэ, — з агульнай дырэктывай кіраваць гэтай краінай і паставіць эканоміку гэтай краіны на службу вайне, якую Германія вядзе на Усходзе, атрымаць з краіны ўсё, што толькі можна здабыць з яе эканамічнай магутнасці».

Метад адкрытага бязлітаснага рабавання і раскрадання народнага набытку ў захопленых раёнах Беларусі, як і ў іншых раёнах былога Савецкага Саюза, з'яўляўся адным з галоўных у фашысцкім арсенале сродкаў, з дапамогай якіх акупанты «атрымлівалі» багацці Беларусі і «ставілі» яе эканоміку на службу агрэсіі.

За два дні да нападу на Савецкі Саюз Розенберг звярнуўся з прамовай да нацысцкіх дзеячаў, якім належала ажыццяўляць кіраўніцтва эканамічным рабаваннем нашай краіны. «У пераліку задач Германіі на Усходзе, — сказаў ён, — першае месца займае пытанне забеспячэння харчаваннем нямецкага народа... Мы не бачым ніякіх асноў для абавязацельстваў з нашага боку карміць таксама рускі народ прадуктамі гэтай празмернай тэрыторыі. Мы ведаем, што гэта суровая неабходнасць, пазбаўленая якіх-небудзь пачуццяў»[1].

Планы нацысцкага кіраўніцтва ў адносінах да савецкай прамысловасці былі выкладзены ў «Дырэктывах па кіраўніцтве эканомікай у новых захопленых усходніх раёнах». Збрашураваныя ў кнігу з зялёным пераплётам, яны так і сталі называцца — «Зялёная папка». У адпаведнасці з гэтымі планамі на акупіраванай тэрыторыі нашай краіны прадугледжвалася арганізаваць здабычу і вываз у Германію тых відаў сыравіны, якія мелі жыццёва важнае значэнне для далейшых дзеянняў вермахта і функцыянавання нямецкай ваеннай эканомікі. Захаванне, аднаўленне ці арганізацыя якой-небудзь прамысловай вытворчасці дапускалася толькі ў выпадку, калі таго патрабавала германская ваенная прамысловасць.

У аграрнай палітыцы гітлераўцы кіраваліся непрыкрытым рабаваннем сялян. Яны былі пазбаўлены права на зямлю. На базе калгасаў ствараліся абшчынныя гаспадаркі, дзе панавалі парадкі часоў прыгону. Падаткі, паборы, прымусовыя пастаўкі ляжалі на сялянах непасільным цяжарам.

У доўгім спісе злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў на беларускай зямлі, у тым ліку і на Асіповіччыне, асаблівае месца займае прымусовы вываз мірных жыхароў на фашысцкую катаргу ў Германію. Для правядзення ў жыццё злачыннай рабаўладальніцкай праграмы быў створаны вялікі спецыяльны апарат на чале з

[1] От «Барбароссы» до «Терминала»: Взгляд с запада. М., 1988. С. 377.

прызначаным Гітлерам «галоўным упаўнаважаным па выкарыстанні рабочай сілы» Заўкелем[1]. Агенты Заўкеля, шастаючы па гарадах і вёсках Беларусі, стваралі «вярбовачныя» пункты, бралі на ўлік працаздольных людзей і прапаноўвалі ім «добраахвотна» паехаць на працу ў Германію. Але добраахвотнікаў амаль не аказвалася. Тады нямецкія ўлады пачалі рабіць развёрстку па гарадах і сельскіх раёнах, рассылаць загады аб абавязковай адпраўцы рабочай сілы ў Германію.

Каб ажыццявіць злачынныя планы масавага вывазу савецкіх людзей на катаржныя работы ў Германію, нямецкія захопнікі станавіліся на шлях падману, пагроз, правакацый, праводзілі паліцэйскія аблавы і карныя аперацыі. Гаспадарчай інспекцыі групы армій «Цэнтр» і генеральнай акрузе Беларусі прадпісвалася кожны дзень па-

сылаць у рэйх 500–1000 рабочых. Пачалося ў літаральным сэнсе паляванне на людзей. У гарадах людзей хапалі на вуліцах, базарах і ў іншых грамадскіх месцах.

На асобным уліку ў фашысцкіх захопнікаў былі жыхары, якія жылі ў партызанскіх зонах. Яны аб'яўляліся «бандытамі» ці «саўдзельнікамі бандытаў», ставіліся «па-за законам» і падлягалі знішчэнню ці пагалоўнаму вывазу ў рабства.

Гітлераўцам удалося захапіць і вывезці ў Германію з акупіраваных раёнаў Беларусі звыш 380 тыс. грамадзян, у тым ліку з г. Асіповічы і раёна 3884 чалавекі. Але ніякі тэрор, ніякія рэпрэсіі не прымусілі жыхароў Асіповіцкага раёна пакарыцца ворагу, стаць на калені. Яны змагаліся.

У.І.Лемяшонак.

З АДМІНІСТРАЦЫЙНАГА РАСПАРАДЖЭННЯ № 1 КАМАНДУЮЧАГА ТЫЛАМ ГРУПЫ АРМІЙ «ЦЭНТР» ГЕНЕРАЛА ПЯХОТЫ ФОН ШЭНКЕНДОРФА

7.7.1941 г.

I. О НАЗНАЧЕНИИ БУРГОМИСТРОВ В ВОЛОСТЯХ

1. На должности бургомистров в первую очередь должны быть назначены политически надежные и квалифицированные лица по возможности из числа белорусов.

2. Бургомистр является представителем волости.

3. Он является служебным начальником над всеми лицами, работающими в волости. Он принимает их и увольняет с работы.

4. Бургомистр несет ответственность за финансовые дела волости.

5. Все жители, проживающие в волости по состоянию на 21.6.1941 г., должны быть заново учтены и переписаны бургомистром.

6. Бургомистры немедленно должны позаботиться о том, чтобы все жители были обеспечены соответствующими документами, удостоверяющими их личность: фамилия и имя, время и место рождения, местожительство, состав семьи, профессия, пребывание и род занятий, социальное происхождение, вероисповедание, национальность, подданство.

7. Бургомистры привлекаются к ответственности за совершенные акты саботажа в вверенной им волости. Он должен всеми средствами предотвращать акты саботажа. В его обязанность входит охрана предприятий, расположенных на территории волости, особенно жизненно важных.

8. Бургомистров и их заместителей в населенных пунктах, насчитывающих до 20 000 жителей, назначает комендант полевой комендатуры.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 952. Л. 1.

II. О ЗАПРЕЩЕНИИ ОСТАВЛЕНИЯ КВАРТИР В НОЧНОЕ ВРЕМЯ

1. В период с 21-00 до 5-00 утра населению запрещается покидать квартиры.

2. Исключения допускаются по письменному разрешению местного коменданта для лиц, работающих в ночное время на жизненно важных предприятиях, врачами, акушерками, на машинах скорой помощи.

---

[1] На Нюрнбергскім працэсе над галоўнымі нямецкімі ваеннымі злачынцамі Заўкель быў асуджаны да пакарання смерцю і павешаны.

3. Нарушители будут строжайшим образом наказываться местными комендантами. Как вспомогательными мерами наказания могут быть временный арест с ограниченным питанием, насильственное задержание и привлечение к работам.

III. ОТЛИЧИТЕЛЬНЫЕ ЗНАКИ ДЛЯ ЕВРЕЕВ И ЕВРЕЕК

1. Все евреи и еврейки, находящиеся на занятой русской территории и достигшие 10-летнего возраста, немедленно обязаны носить на правом рукаве верхней одежды и платья белую полосу шириной в 10 см с нарисованной на ней сионистской звездой или же желтую повязку шириной в 10 см.

2. Такими повязками обеспечивают себя сами евреи и еврейки.

3. Евреям категорически запрещается здороваться. Нарушители будут строжайше наказываться местным комендантом по месту жительства.

VIII. СОЗДАНИЕ ВСПОМОГАТЕЛЬНОЙ ПОЛИЦИИ

1. Для проведения полицейских мер безопасности бургомистрам поручается привлечь во вспомогательную полицию надежных «фольксдойче», белорусов, а если таковых не имеется, то поляков, и использовать эту полицию по согласованию с начальниками команд полиции безопасности.

2. Служащие вспомогательной полиции, которые работают в тесном контакте с местными айнзатцкомандами полиции безопасности и СД, могут поддерживать связь только с местными начальниками полиции безопасности и СД или назначенными ими органами.

3. Служащие вспомогательной полиции носят белую нарукавную повязку с надписью «Вспомогательная полиция».

4. Местные комендатуры до 20-го числа каждого месяца, а впервые к 20.7.1941 года, сообщают о численности и вооружении вспомогательной полиции.

Командующий тылом группы армий «Центр» фон Шенкендорф, генерал пехоты

Пераклад з нямецкай мовы.
Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 952. Л. 1 – 5.

Падрыхтаваў У.І.Лемяшонак.

Асіповіцкае гета

З успамінаў Аляксандры (Сары) Рыгораўны Уцеўскай, былога вязня гета

Яўрэйскае гета ў Асіповічах было створана акупантамі ў пачатку ліпеня 1941 г. Для гэтага быў адведзены раён у паўднёвай частцы горада — ад вуліцы Р.Люксембург да вуліцы В.Харужай. Жыхары яўрэйскай нацыянальнасці, якія жылі ў паўночнай частцы і іншых месцах горада, былі пераселены ў гэты раён на вуліцы Акцябрскую і Прамысловую (цяпер Голанта). У дамах на гэтых вуліцах былі пабудаваны двух'ярусныя нары, на якіх у вялікай цясноце спалі людзі.

У акупіраваным горадзе жыхароў яўрэйскай нацыянальнасці заставалася прыкладна чалавек 430 – 450. Пры гета быў арганізаваны «юдэнрат» (яўрэйскі савет). Гэты савет складаўся з трох чалавек. Адным з іх быў Афроім Хаўкін, які да вайны працаваў галоўным бухгалтарам ваенгандлю, а потым райзага, астатніх не помню. Яны былі прызначаны нямецкай камендатурай па рэкамендацыі бургамістра горада Гараніна, які да вайны працаваў тэхнікам-будаўніком Упраўлення ваенна-будаўнічых работ № 76 у г. Асіповічы. У чым заключалася работа «юдэнрата», я не ведала, але помню, што яго члены па заданні нямецкага начальніка гета праводзілі рэгістрацыю яўрэяў.

Начальнікам паліцыі быў Французенка, які да вайны працаваў начальнікам пашпартнага стала ў райаддзеле міліцыі.

У раён гета ўваходзілі вуліцы Камуністычная, Чумакова, Акцябрская, Горкага, Рабоча-сялянская, Сядых (былая Палявая), Калініна і Сярова ад вуліцы Р.Люксембург да вуліцы В.Харужай і поўнасцю вуліцы К.Лібкнехта, Абросімава (былая Чырвонаармейская), Сацыялістычная, Рэвалюцыйная, К. Маркса, Голанта, Касмічная.

Жыхары іншых нацыянальнасцей з гэтага раёна не былі пераселены. Гэта дапамагала яўрэям не памерці з голаду, таму

што яны мелі магчымасць выменьваць рэчы на харчаванне. У горадзе была ўведзена картачная сістэма, па картках выдавалі на дзень па 100 г хлеба.

Яўрэі абавязаны былі насіць на левым баку грудзей і спіны жоўтыя латы круглай формы дыяметрам 8—10 см, ім было забаронена наведваць грамадскія месцы: базары, кіно, навучаць дзяцей у школе і г.д. Забаронена было вітацца і весці размовы з беларускім насельніцтвам, хадзіць па тратуарах, выходзіць за межы граніц гета, на вуліцах збірацца больш чым па тры чалавекі. За невыкананне ўсіх гэтых і іншых забарон пакаранне было адно — расстрэл.

Кожную раніцу працаздольнае насельніцтва з гета накіроўвалі на цяжкую фізічную працу па разборцы разбураных казарм, дамоў, на чыгуначную станцыю і іншыя аб'екты.

11 кастрычніка 1941 г. пад выглядам адпраўкі на работы ўсё дарослае працаздольнае насельніцтва гета было загнана ў паўднёвы ваенны гарадок і там расстраляна. Ямы былі выкапаны загадзя. На пакуты, голад і холад былі астаўлены старыя і жанчыны з малымі дзецьмі, якія былі расстраляны 5 лютага 1942 г., усяго прыкладна 420—440 чалавек. Такім чынам, пасля 5 лютага 1942 г. яўрэйскае гета было ліквідавана і «яўрэйскае пытанне» ў Асіповічах было вырашана канчаткова.

Расстрэл у Лапіцкім лесе

З успамінаў Івана Пятровіча Сугакі, жыхара в. Лапічы

Было гэта ў ліпені сорак першага года. Перад вайной я ў членах сельсавета дзевяць гадоў хадзіў. Дык у Лапічах 225 яўрэйскіх дамоў стаяла. Гандлёвыя лаўкі ўсюды. У Мінску таго не купіш, што тут. Дык вось сабралі немцы ў той дзень маладых мужыкоў і рослых хлопцаў — хто для іх, мабыць, асаблівую небяспеку ўяўляў. Чалавек 20—30 бежанцаў сюды трапіла. А ўсяго 75 чалавек. У тым ліку дзве жанчыны — адна яўрэйка і руская. Кашыцкая. Яе муж дырэктарам школы быў. Сагналі на вуглу, дзе цяпер магазін. Білі бярозавымі палкамі. І пагналі далей. У лесе дарожка была на прыстань. Там яма глыбокая — пясок на дарогу бралі. Там і расстралялі. А ўсё кругом немцамі ачэплена было.

Увогуле, яўрэяў забівалі, нягледзячы ні на ўзрост, ні на пол. Многія з іх у праваслаў'е перахрысціліся, іконы на дамах павесілі, але і гэта не ратавала.

Забівалі. Цераз зіму, вясной, усіх павезлі ў гарадок, расстралялі. У кожную хату заходзілі. Адагне вось так вуха, паглядзіць, не ведаю што там убачыць, і крычыць: «Юдэ!».

Запаветы Леніна. 1992. 11 ліст.

Паляванне на людзей

З успамінаў былога жыхара в. Дараганава У.Кісялёва

Без асаблівых прыгод увайшлі дараганаўцы ў вайну. Зацішша працягвалася каля паўтара месяца. У гэты час былі перацягнуты рэйкі чыгункі на нямецкую вузкую каляіну, пачаўся чыгуначны рух.

У пачатку жніўня 1941 года мы прачнуліся, разбуджаныя кулямётнай чаргой пад нашымі вокнамі. Маці першая выглянула ў вакно і з жахам прашаптала: «Немца забілі!» Па вуліцы хадзілі ўзброеныя нямецкія салдаты. Калі мы лепш агледзеліся, то аказалася, што на вуліцы насупраць сушылкі ляжаў чалавек у чырвонаармейскім адзенні.

Пазней даведаліся, што нямецкія жандары са Старых Дарог разам з паліцэйскімі робяць аблаву на жыхароў Дараганава. У першую чаргу яны акружылі і праверылі дзіцячы дом. Там, на іх думку, прадаўжала заставацца прасавецкае асяроддзе.

І сапраўды, да дзетдомаўцаў прыбіўся пры адступленні нейкі баец Чырвонай арміі. Ён выбег у час трывогі з дзіцячага дома і падаўся ў бок мястэчка. Казалі, што прабягаючы ля сажалкі, ён выкінуў у яе наган. Аднак ля вышкі ўжо залёг нямецкі кулямётчык, які і забіў гэтага чырвонаар-

мейца. Ля дзетдома немцы злавілі мясцовага хлопца, які спрабаваў схавацца на лузе разам з вінтоўкай. Арыштавалі яшчэ армяніна-выхавацеля, як нетутэйшага, ды яшчэ некага. Калі групу вялі ля нас у школу, то гэты армянін усё даказваў, што ён не яўрэй. У хуткім часе загрукалі і ў нашы дзверы. Немец з паліцэйскім забралі бацьку і маці. Такім чынам было сагнана ў школу ўсё дарослае насельніцтва. Маці даволі хутка вярнулася. Значна пазней прыклыпаў дамоў бацька. Яго, стрыжанага, памылкова залічылі ў камуністы. Аднак хутка выпусцілі.

У той дзень былі затрыманы ўсе яўрэі-мужчыны, арыштаваныя ў дзіцячым доме, і, верагодна, яшчэ нехта. Праз кароткі час непадалёк раздалася доўгая кулямётная чарга. Гэта былі пастраляны ўсе затрыманыя. Яма ля гасблока сухотнага санаторыя была запоўнена забітымі даверху. Паліцэйскія засыпалі забітых. Колькі іх было тады, сказаць не магу. Ведаю, што многа — чалавек дваццаць трыццаць, а можа і болей.

Здзейсніўшы сваю чорную справу, атрад ад'ехаў у Старыя Дарогі. У канцы дня быў пахаваны і невядомы баец ля дарогі на пераезд з правага боку. Яго ціха, з горкім спачуваннем аб салдацкай долі пакрылі ў магіле без труны простай беларускай посцілкай...

Неўзабаве адбыўся яшчэ адзін старадарожскі наезд, дату яго засведчыць не бяруся. Немцы і паліцэйскія размясціліся на гэты раз у дзіцячым доме. Ішло фарміраванне мясцовай улады, органаў мясцовага «самакіравання». Быў назначаны з мясцовых бургамістр (прозвішча яго не ведаю), скамплектаваны з завярбованых паліцэйскі атрад. У той час паліцэйскім не выдавалі яшчэ зброі і формы. Яны вылучаліся толькі нарукаўнай павязкай. Іх функцыі на першым часе не выходзілі за межы самааховы.

Па заканчэнні справы нямецкі афіцэр паслаў аднаго са сваіх салдат на веласіпедзе, а з ім і бургамістра, на першае «заданне»: сабраць для прыбыўшых што-небудзь перакусіць. Калі яны знаходзіліся ў пошуках яек за сельсаветам ля могілак, з кустоў раздаўся стрэл, і нямецкі салдат быў забіты. У роспачы, дрыжачы як асінавы ліст, наваяўлены бургамістр дабег да афіцэра і далажыў яму пра бяду.

Неадкладна было адабрана дзесяць маладых здаровых хлопцаў з цэнтральнай часткі мястэчка, якіх зараз жа расстралялі.

Вось такім чынам усталёўваўся ў тым далёкім 1941-м у Дараганаве «Neue Ordnung».

Тое, што ўсе загубленыя ад пачатку акупацыі былі зусім невінаватыя, усяліла ў адных местачкоўцаў пачуццё бязвыхаднасці, у другіх — асэнсаванне неабходнасці прымаць адпаведныя дзеянні ў адказ. Адбылася нейкая дыферэнцыяцыя сярод людзей. Усе адчулі ворага і вызначыліся ў адносінах да яго.

Недзе з восені, калі пачала працаваць чыгунка, у будынку новай школы быў размешчаны нямецкі гарнізон на правах камендатуры. Школа была ўмацавана, абнесена брустверам да ўзроўню першага паверха. Гэта былі два рады жэрдак і аполкаў, састаўленых вертыкальна ў два рады з прамежкам недзе каля аднаго метра, у якім быў засыпаны пясок. Па вуглах былі абсталяваны кулямётныя гнёзды. Пазней навокал быў спілены лес. Прастора пачала праглядвацца і прастрэльвацца.

Ля чыгуначнага моста, з боку лесу, быў узведзены бліндаж з кулямётнай кропкай. Пазней падыходы да яго былі замініраваны.

Змяніліся і функцыі паліцыі ў бок пашырэння іх статуса. Паліцэйскія атрымлівалі зброю і абмундзіраванне, якое было пакуль самае рознакалібернае: хадзілі і ў зялёным нямецкім, і ў чорным паліцэйскім, і проста ў цывільным. Іх паступова пераводзілі на казарменнае становішча. Начальнікам паліцыі стаў Казак.

Хоць і фармальна, але пачалі праводзіць нейкую дзейнасць і мясцовыя органы ўлады, у тым ліку і лясніцтва. Яго новыя штаты складалі 12 чалавек — запоўнены былі напалову. Лясніцтва функцыянавала з лістапада 1941 г. па ліпень 1944 г.

У сакавіку 1944 г. дзейнічалі наступныя валасныя ўстановы і падраздзяленні: млын (загадчык Багдановіч С.А.), ветэрынарны пункт (загадчык Авілаў П.), малаказавод (загадчыца жонка Авілава), школа (дырэктар Ліннік А.), валасное праўленне (сакратар Ус І.), аграном воласці Мялешка, ссыпны пункт (загадчык Клыга І.) і інш. Бургамістрам у гэты час быў Новік Іван.

З боку нямецкіх улад працягвалася палітыка жорсткіх рэпрэсій. Аднойчы, можа, у другой палове 1943 г., нямецкія жандары ці войскі СС перастралялі сваё дараганаўскае начальства. У прыватнасці, быў расстраляны першы бургамістр Андрыянаў, дырэктар малаказавода Герліванаў і іншыя. Іх забілі без усякіх тлумачэнняў на ўскраіне мястэчка выстралам у патыліцу.

Аднойчы ў час нейкай карнай экспедыцыі ў другой палове 1943 г. партызаны разграмілі паліцэйскі атрад і забілі пры гэтым брата начальніка паліцыі. У адказ паліцэйскія пазбіралі з суседніх вёсак усіх старых (маладыя ды здаровыя былі ці ў паліцыі — у меншай колькасці, — ці ў партызанах), прывезлі ў Дараганава і пасля здзекаў прывялі пад леснічоўку да ляснога пітомніка і загадалі капаць сабе магілу. Калі адзін з іх адказаўся падчыніцца, то паліцэйскі выцяў яго рыдлёўкай па галаве і той ляжаў да пачатку экзекуцыі. Потым усё ішло па выверанай завядзёнцы. Узмах хустачкай нямецкага афіцэра — і ашалелая пальба з аўтаматаў...

Існаваў тады такі «парадак»: забітых і пахаваных нельга было забіраць з могілак самым блізкім без адпаведнага на тое дазволу расстрэльшчыкаў. Каб «задобрыць» іх і атрымаць такі дазвол, сваякі неслі «гасцінцы» і «выкупы». На такіх умовах забралі і блізкія сваіх сялян і павезлі іх на драбінах у тых ірваных кажушках на сялянскія родавыя могілкі.

Адзін з прыдуркаватых паліцэйскіх хадзіў у поўнай нямецкай амуніцыі з нямецкай вінтоўкай і лічыўся першакласным служакам і трапным стралком. Аднойчы да яго з вёскі завітала яго дваюрадная сястра. На вуліцы яны за нешта паспрачаліся. Яна ў гарачцы развярнулася і пайшла. На вокрыкі «Стой! Страляць буду!» не адазвалася, не спынілася... і паліцэйскі забіў яе выстралам у галаву.

Нямецкія ўлады «пакаралі» яго: адправілі ў складзе фарміруемай «беларускай арміі» на фронт. Аднак не прайшло і двух месяцаў, як забойца зноў свабодна разгульваў па мястэчку.

Перыядычна паліцэйскія адыходзілі на «аперацыі» ў вёскі. Адтуль у якасці трафеяў цягнулі за плячыма клункі з нарабаваным сялянскім скарбам.

Паліцэйскія ўсё болей пачыналі ўцягвацца ў ваенныя дзеянні, у карныя справы. Адпаведна яны ўсё больш дэградзіравалі. Хоць перспектывы для іх не было, начальнік паліцыі ўсё больш далдоніў пра нейкае чакаючае бальшавікоў «возмездие».

У прыватнасці, яны прыцягваліся для ранішняй праверкі чыгуначных пуцей (чыгунка ўначы не дзейнічала). Партызаны іх папярэджвалі надпісамі крэйдай на рэйках: «Паліцэйскія-бобікі, рыхтуйце сабе гробікі!». А затым няўхільна выконвалі сваю пагрозу. Ляснік Кавалеўскі перайшоў адным з першых на службу ў паліцыю і быў забіты ў час чарговага абходу чыгункі.

Ён аднойчы дапытваўся ў майго бацькі, кім мог быць забіты нямецкім афіцэрам нейкі лысы партызан пры падыходзе яго да лодкі на рацэ Пціч. Бацька ўсё аднекваўся, але па ўсіх прыкметах здагадваўся аб загінуўшым. Калі паліцэйскі выйшаў, ён з горыччу пра сябе вымавіў: «Цыганка, сволачы, забілі!» (Цыганок быў лесніком перад вайной).

Партызаны забілі і старэйшага брата Кавалеўскага, таксама паліцая. Той ехаў аднойчы п'яны з Асіповіч праз лес на кані. Увесь час крычаў і страляў. Вось гаспадары лесу і вырашылі праверыць, хто ўчыняе такі гам і шум...

На пераломе вайны не згубіўшыя гонару паліцэйскія сталі ўсё часцей падавацца ў партызаны. Гэта рабіць было даволі небяспечна. Рэпрэсіі абрушваліся на блізкіх. Практыкаваліся па гэтай прычыне нават «прафілактычныя» расстрэлы паліцэйскіх.

Ці не апошняй «баявой» заслугай паліцэйскіх было выяўленне ў адной настаўніцы двух хлапчукоў-блізнят ад бацькі-яўрэя. Яны іх адшукалі, адабралі ў маці і забілі. Тая ад гэтага кранулася розумам.

Жыццё ў гады акупацыі нічога не каштавала. Пачуўшы недзе стрэл, звычайна гаварылі: «Яшчэ адной душы няма!».

Увогуле ўсе мы тады хадзілі па лязе. Як ацалелі — аднаму Богу вядома.

Тое ж датычыла і жывёл. Асабліва старанна і заўзята знішчалі буслоў. К завяршэнню вайны яны амаль што вывеліся. Такі ж лёс спасціг каршуноў, сабак і нават курэй.

Увесь час акупацыі ішло паляванне на людзей. Асабліва яно абвастрылася ў

1943—1944 гг. Так, у гэты час забралі на работы ў Германію майстра леспрамгаса Івана Міхадзюка. Наколькі мне вядома, з чужыншчыны ён так і не вярнуўся.

У студзені паліцэйскія разам з жандарамі арыштавалі ў канторы лясніцтва і на ўчастку аб'ездчыка А.С.Паланейчыка, лесніка А.У.Лубу, загадчыка смалакурнага завода Ф.Альфяровіча. Усе, за выключэннем А.У.Лубы, лёс якога мне невядомы, вярнуліся.

Немцы спрабавалі праз сваіх паслугачоў абалваніць, прыцягнуць на свой бок вясковую і местачковую моладзь, каб вывезці яе потым у Германію на работы. У прыватнасці, праз Саюз беларускай моладзі вясной 1944 г. вялася актыўная прапагандысцкая работа з мэтай прыцягнуць юнакоў да вучобы ваеннымі авіятарамі. Яна нават мела нейкі заклік у юнацкім асяроддзі. Але дзе падзяваліся тыя даверлівыя дараганаўскія хлапчукі, што далі згоду ехаць у «Вялікую Германію»? Яны бясследна зніклі альбо ў жарале вайны, альбо ў нямецкіх каменяломнях.

Падрыхтаваў В.У.Хурсік.

З успамінаў Марыі Міхайлаўны Дрозд, жыхаркі вёскі Каўгары Асіповіцкага раёна

У 1941 г., калі немцы так раптоўна аказаліся на нашай тэрыторыі, у лесе арганізаваўся партызанскі атрад 161-й брыгады імя Р.І.Катоўскага. Туды пайшоў і дырэктар мясцовага спіртзавода Зеньчык Клім Пятровіч, а Мурга Пётр Барысавіч аказваў дапамогу партызанам прадуктамі. Пётр Барысавіч працаваў на прадпрыемстве механікам.

За сувязь з партызанамі фашысты арыштавалі гэтага чалавека. Яго пыталі, білі, а потым сагналі ўсіх жыхароў вёскі Каўгары ў кучу, далі ў рукі Пятру Барысавічу кувалду і загадалі разбіць помнік У.І.Леніну, які стаяў у дварэ спіртзавода. Мурга адмовіўся зрабіць гэта. Тады немцы прыўзнялі яго штыкамі і, падштурхоўваючы, пагналі да помніка. Толькі ён усё вытрымаў, нічога не сказаў карнікам. Побач якраз ехала фурманка, дык акупанты спынілі яе, знялі з каня лейцы, зрабілі з іх пятлю і пачалі прыладжваць лейцы да дуба, рыхтаваць шыбеніцу. Толькі пятля аказалася большай. І тады Пётр Барысавіч сам, уласнымі рукамі выправіў яе памер, пасля чаго фашыст выбіў скрыню з-пад ног гэтага чалавека: лейцы былі доўгімі, так што ногі павешанага дастаўвалі да травы...

Жыхарам Каўгароў здымаць труп нябожчыка забаранялі цэлы тыдзень і прыгразілі, што так будзе з кожным, хто асмеліцца дапамагаць партызанам.

На другі дзень забралі жонку Пятра Барысавіча — Сцепаніду Іванаўну і сына Жэню, які тады якраз скончыў 10 класаў, а таксама Кантаровіча Сямёна Якаўлевіча. Вялі іх за пераезд па вуліцы, і Жэня, развітваючыся з дзяўчатамі і хлопцамі, сказаў: «Сябры, прабачце мяне, калі каго пакрыўдзіў, больш я да вас не вярнуся». Ён ведаў, куды іх вядуць...

Напачатку іх усіх прымусілі рыць сабе магілу, потым паставілі маці і сына і прашылі іх чаргой з аўтамата. Жэню куля трапіла ў нагу. Ён паваліўся побач з маці і сцішыўся. Потым паставілі Сямёна Якаўлевіча Кантаровіча. Ён быў сутулаватым. Калі паваліўся, то кашуля надулася ветрам. Немцы адышлі, паглядзелі, а сарочка трапечацца і бачна аголеная спіна. Акупанты вярнуліся і яшчэ раз прастрачылі з аўтаматаў. Адышлі, зноў ім падалося, што ён жывы, і ў трэці раз стрэлілі ва ўпор. І гэтай трэцяй аўтаматнай чаргой забілі Жэню: ён прыўзняўся і ўпаў. Усё гэта бачыў жыхар вёскі Халькі Бельчын, якога немцы схапілі на дарозе і прымусілі засыпаць яму.

Тры дні вісеў Пётр Барысавіч. Жанчыны пайшлі па хатах, збіралі яйкі. Занеслі іх каменданту з просьбай пахаваць чалавека. Усе тры дні не адыходзіў ад гаспадара яго сабака. Збегае да хаты, пасядзіць на ганку — няма нікога. Пабяжыць да дуба, цягне за штаны гаспадара, кліча яго дамоў...

Пятра Барысавіча пахавалі з жонкай і сынам у в. Халькі, на могілках. А на тым месцы, дзе забілі Сцепаніду Іванаўну, Жэню, Кантаровіча, людзі пасадзілі ружу, якая і цвіце кожны год, нагадваючы аб жахах вайны.

Расказвае аб гэтым Марыя Міхайлаўна, а ў самой поўныя вочы слёз: цяжка даюцца такія ўспаміны...

Двух дочак Мургі — Ніну і Тамару — немцы адправілі ў Германію, у рабства. Вярнуліся дамоў яны ў 1945 г.

Запісаў П.С.Качановіч.

Трагедыя вёскі Брыцалавічы

Вёска Брыцалавічы размяшчаецца сярод лясоў за 20 кіламетраў на паўднёвы захад ад Асіповіч. У гады нямецка-фашысцкай акупацыі яе жыхары аказвалі ўсебаковую падтрымку партызанам.

Партызанскі атрад № 211 імя К.К.Ракасоўскага пад камандаваннем жыхара гэтай вёскі Р.Н.Баразны размяшчаўся ў сумежных з вёскай лясах і ў сваім складзе меў многіх з яе жыхароў.

Гітлераўцы вырашылі разграміць атрад і знішчыць в. Брыцалавічы як яго апорны пункт. За некалькі дзён да прыходу карнікаў у вёсцы быў размешчаны невялікі гарнізон акупантаў. Каб усыпіць пільнасць жыхароў, нямецкія прапагандысты вялі гутаркі з імі, пераконвалі адмовіцца ад падтрымкі партызан, а апошніх заклікалі скласці зброю і пераходзіць на бок нямецкіх улад, абяцаўшы ўсім работу і мірнае жыццё.

Але ў студзені 1943 г. да занесенай снегам вёскі непрыкметна падышоў вялікі атрад эсэсаўцаў і паліцаяў. Яны сабралі мужчын, сем'і партызан і расстралялі іх у адным з хлявоў. На другі дзень карнікі здзейснілі няўдалы налёт на партызанскі атрад, пасля вярнуліся ў вёску і працягвалі свае злачынныя дзеянні. Усіх жыхароў, уключаючы старых і дзяцей, яны сагналі ў адзін хлеў і падпалілі яго. Усяго было расстраляна і спалена жывымі 667 чалавек. Карнікі забралі ўсю жывёлу, а саму вёску спалілі поўнасцю. Толькі адзінкам удалося выратавацца ад пакутнай смерці.

У пасляваенны час Брыцалавічы аднавіліся. Яе жыхары свята захоўваюць памяць аб сваіх загінуўшых аднавяскоўцах.

П.С.Качановіч.

Трагедыя вёскі Лочын

З успамінаў ураджэнца вёскі Юрыя Канстанцінавіча Кедзіча

Я памятую Лочын як вялікае паселішча. У ім дзве вуліцы: адна доўгая, з добрымі дамамі, другая карацейшая, ішла да яе ад дарогі пад прамым вуглом. Дамы на ёй стаялі не горшыя, новенькія, пабудаваныя для жыхароў былых хутароў. Была і трэцяя вуліца. Яе звалі «плянтоўка», яна знаходзілася асобна ад першых дзвюх і прытыкалася да так званага «двара» — былой панскай сядзібы. На «двары» ў доўгім каменным доме, празваным «панскім» (пазней я даведаўся, што гэта было сапраўды так), размяшчалася сярэдняя школа, у якой я да вайны паспеў скончыць адзін клас. Побач са школай размяшчаўся стары парк з ліпавымі алеямі і знаходзіўся калгасны двор з кароўнікамі, кузняй, клецямі і высокай сіласнай вежай. Непадалёк, на вуглу калгаснага саду, высіўся велічны мураваны будынак касцёла. Ён быў пераабсталяваны пад клуб, і мы, малыя, з задавальненнем глядзелі ў ім кінафільмы. Вакол вёскі (а размешчана яна ў лесе) дзецям таксама было прывольна. Тут удосталь расло ягад: журавін, чарніц, маліны, парэчак. Летам і па восені разам з дарослымі любілі мы збіраць грыбы. Аднаго нашы бацькі баяліся — каб не хадзілі на возера. Было яно побач за хмызняком і было каварным не толькі з-за вады, а і з-за тарфяністых берагоў і дна (супрацьлеглы ад вёскі яго бераг на доўгія кіламетры пераходзіў у багністае балота).

Але бяда прыйшла не з боку возера, а з чорнай талеркі рэпрадуктара, адкуль 22 чэрвеня 1941 г. упершыню для нас прагучала слова «вайна». Праўда, вайна гэта была дзесьці там, далёка, на захадзе, і нам здавалася, што да нас яна ніколі не дойдзе і прывычны ход нашага дзіцячага жыцця не будзе парушаны. Але ўсё адбылося так, як ніхто і меркаваць не мог.

Добра памятаю сонечны ліпеньскі дзень, калі я ўпершыню ўбачыў акупантаў. Невялікае нямецкае танкавае падраздзяленне завярнула ў вёску і прынесла прадчуванне немінучай бяды. Яна не прымусіла сябе чакаць. Вясковая жанчына кінулася з вёскі бегчы ў лес і была забіта аўтаматнай чаргой. Гэта была першая ахвяра вайны, якую я бачыў на свае вочы.

Немцы пабылі ў вёсцы нядоўга, гарнізона не пакінулі, і пазней я бачыў фашыстаў толькі ў час налётаў і блакад.

Ужо ў сярэдзіне жніўня 1941 г. у ваколіцах Лочына з'явіліся першыя партыза-

ны. У вёску раз за разам наведваліся то «каралёўцы», то «ціхаміраўцы», то байцы з атрада Лівенцава. Паколькі паліцаяў у вёсцы не было, партызаны трымаліся даволі ўпэўнена, і гэта неўзабаве стала нейкім чынам вядома фашыстам.

7 студзеня 1942 г. навечна засталося ў маёй памяці як «крывавая каляда». Раніцай гэтага дня на ўсходнюю ўскраіну вёскі (новы пасёлак і двор) наляцелі карнікі. Яны ішлі па вуліцах, урываліся ў дамы і забівалі ўсіх жыхароў запар. Потым паехалі ў вёску за возерам — Весялова, дзе таксама ўчынілі крывавую расправу. Вяртаючыся праз Лочын, яны падпалілі дамы, у якіх перад тым стралялі людзей. Наша вуліца тады чамусьці ўцалела.

Шукаючы паратунку, вясной 1942 г. наша сям'я, як і некаторыя іншыя з Лочына, пасялілася ў зямлянцы на балотным востраве Грудок у лясным масіве паміж Лочынам і вёскай Снусцік. Нам, малым, у лагеры падабалася. Тут усё было, бадай, як дома: пасвіліся каровы, кудахталі куры, але лепш за ўсё было ў зямлянках, дзе былі сапраўдныя печкі, на якіх выпякаўся смачны хлеб і нават булачкі.

Лясное жыццё працягвалася да восені 1942 г., пакуль на нашу лясную схову не напалі фашысты. Дзякуючы дазорам, што ахоўвалі лагер на ўскрайку лесу, яго жыхарам удалося ўцячы, але карнікі спалілі лясное жытло датла. Доўга холадам у лесе заставацца было небяспечна, і жанчыны з дзецьмі вярнуліся ва ўцалелыя хаты ў Лочыне, а мужчыны працягвалі жыць у шалашах.

Чарговы налёт на вёску адбыўся вясной 43-га. Памятаю, ужо пачаў раставаць снег. Ранкам маці разбудзіла нас: «Немцы страляюць! Бяжым у лес!» Але зрабіць гэта было ўжо немагчыма. Вёска была акружана, па ёй вёўся шчыльны агонь не толькі з ручной зброі, а і з мінамётаў. Магчыма, нехта давёў немцам аб тым, што ў вёсцы знаходзяцца партызаны.

На гэты раз жыхароў сагналі ў канец вёскі і пастроілі ў шарэнгу. Афіцэр з чорнай павязкай на воку ішоў уздоўж яе і пальцам выклікаў наперад то адну, то другую жанчыну. Адабраную групу, у якой апынулася і мая маці, пастроілі ў калону па двое і пад аховай пагналі ў вёску Снусцік, дзе быў нямецкі гарнізон (болей мы маці не бачылі). Пасля таго, як мы асірацелі, бацька зноў забраў нас у лясны лагер. Ён знаходзіўся ля балотнага канала, што звaўся Стрэлкай.

Дзень 7 мая 1944 г. выдаўся сонечным, цёплым. Лясны лагер жыў сваім жыццём. Нішто не прадказвала бяды. Раптам на ўскрайку лесу пачулася страляніна: немцы! Дарослыя разгубіліся і ўсхваляваліся, пачалася мітусня, усе кінуліся ў бок, адваротны стрэлам. Я з малодшым брацікам таксама пабег. Сэрца разрывалася ад страху. Мы беглі ў бок Выжараў (так называецца унікальнае ўрочышча, дзе пасярод балотнай расліннасці размешчаны вялікія азярыны вады). Аўтаматныя чэргі раздаваліся ўсё бліжэй і бліжэй. Рызыкуючы патануць у багне, мы кінуліся ў глыб урочышча, выбіліся з сіл, апусціліся па горла ў ваду і прытаіліся за лазовым кустом. Скрозь дрэвы было бачна, што немцы ідуць у наш бок. Адзін з іх у гумавых ботах ужо дайшоў да першай азярыны і раптам правалiўся ў яе. Другі падаў яму руку і выцягнуў на сушу. Відаць, перспектыва загінуць у багне не вельмі радавала карнікаў. Яны рушылі ў абход Выжараў і гэта нас выратавала. Як толькі стрэлы пачалі аддаляцца, мы прыйшлі да высновы, што ланцуг накіраваўся ў бок вёскі.

Холад прымусіў нас вылезці з вады. Зуб на зуб не пападаў. Адзенне было вільготным, цяжкім. Вырашылі ісці ў бок шалашоў на Стрэлку. Па дарозе сустрэлі старога па прозвішчы Вярхавень. Ён схаваўся ў балотны мох і дзякуючы гэтаму ўцалеў. Стары параіў нам адціснуць вопратку, што мы і зрабілі. Мо ад гэтага, а мо ад шпаркай хады нам пацяплела. Неўзабаве мы апынуліся ля шалашоў, дзе ўжо былі і дарослыя мужчыны. З боку вёскі чуліся стрэлы. Мяне падсадзілі на высокую хвою, каб я залез на вершаліну і паглядзеў, што там робіцца. Усё, што бачыў, я перадаваў уніз.

Да вёскі было кіламетры паўтара-два. Праз галінкі я бачыў, як ля аднаго з дамоў сабраўся вялікі натоўп людзей. Неўзабаве ён раздзяліўся на дзве часткі. Адна з іх рушыла па дарозе на вёску Пагарэлае, а другая засталася ля дома. Людзі, што засталіся ў вёсцы, пачалі знікаць з вуліцы. Пачуліся стрэлы, і вёска пачала гарэць. Паступова чорныя фігуры і машыны карнікаў пачалі адход у бок Пагарэлага і чыгуначнай станцыі Уборак. Усё адбылося настолькі хутка, што ніхто з нас у лесе не

мог уразумець, што ж адбылося на самай справе.

Прайшло дзве-тры гадзіны ў меркаваннях і цяжкіх прадчуваннях. Дарослыя вырашылі асцярожна прабрацца ў вёску. Надвячоркам яны вярнуліся і расказалі, што ў вёсцы не засталося ні жытла, ні жыхароў. У двух дамах, якія да таго часу згарэлі, былі знойдзены чалавечыя астанкі.

Крыху пазней ад людзей, якім удалося збегчы з калоны, што гналі ў Пагарэлае, стала вядома наступнае. Блакіраваўшы вёску, карнікі сагналі ўсіх жыхароў у цэнтр і прапанавалі старым і дзецям адысці ў бок, маўляў, для таго, каб адвезці іх у гарнізон на машынах. Астатнім было прапанавана ісці пешшу. Як толькі гэта калона рушыла ў бок Пагарэлага, старым і дзецям было загадана зайсці ў дамы. Першыя ішлі добравольна, астатніх заганялі. Потым зачынілі дзверы і падпалілі. Дзядулі і бабулі гарэлі разам з любімымі ўнукамі...

Калона дарослых гэтага не бачыла. У гэты час яна адышла ад вёскі мо з паўкіламетра. У лесе, ля могілак, яе супынілі і развярнулі ў шарэнгу насупраць кулямётаў. Відаць, немцы чакалі, пакуль вернецца частка карнікаў, што паліла Лочын, вяскоўцы ж вырашылі, што надышла апошняя хвіліна, нервовае напружанне дасягнула вышэйшай кропкі. Тым часам усе маўчалі і толькі нямецкі афіцэр з галінкай у руцэ прагульваўся ўздоўж строю. Раптам адбылося тое, што ніхто не чакаў. Як толькі афіцэр параўняўся з вяскоўцам Барышавым, апошні схапіў з зямлі камень і з размаху стукнуў карніка па галаве. Барышава тут жа застрэлілі, а афіцэра падхапілі пад рукі, і калона рушыла далей. Праз пару дзён вяскоўцы вырашылі пахаваць героя, аднак камень з яго рукі дастаць не ўдалося. Так і пахавалі з камнем у руцэ...

Успамін аб тым трагічным дні пастаянна ідзе са мною па жыцці. Дзіцячая памяць назаўсёды захавала пах едкага дыму папялішчаў, дзе загінулі ні ў чым не вінаватыя мае аднавяскоўцы.

Спаленне Бозака

Да вайны вёска Бозак мела 120 двароў. Стаіць яна амаль у самым лесе, далёка ад навакольных вёсак. Прыгожа тут улетку. Луг квяцістай стужкай акаймляе агароды калгаснікаў, нешта ціхенька шэпча каля лесу рэчка...

У 1930 годзе аб'ядналіся бозкаўцы ў калгас і назвалі яго імем легендарнага камандзіра Першай Коннай — Сямёна Міхайлавіча Будзённага. Хутка справы калгаснага калектыву пайшлі на лад. Разам сеялі, разам збіралі хлеб. Калі здаралася бяда — нядоўга выправіць яе грамадой. Кожны год вынікі калектыўнай працы гаварылі аб адзіна верным шляху, які выбралі сяляне. Кожны дбаў аб павелічэнні калгасных прыбыткаў, разам з тым рос і дабрабыт саміх людзей.

Толькі аднойчы жахнула маланкай чутка — вайна. Не маглі адразу паверыць. Але ўжо бамбілі Мінск, Асіповічы. 26 чэрвеня нямецкі дэсант высадзіўся ў мястэчку Ялізава. Толькі паспелі правесці жанчыны ў Чырвоную армію сваіх мужоў, нявесты — сваіх каханых, як фашысты з'явіліся ў вёсцы. Пацягнуліся страшэнныя дні акупацыі. Разам з паліцаямі гітлераўцы часта наляталі крумкачамі на вёску, каб нарабаваць паболей дабра, паздзекавацца з яе жыхароў. Аднак вяскоўцы верылі ў хуткае вызваленне, з надзеяй прыслухоўваліся да вестак аб Чырвонай арміі.

Хутка ўсё больш і больш сталі падаваць свой голас партызаны. Пачалася народная вайна. Хто мог насіць зброю — сталі ўдзельнікамі партызанскага руху і бозкаўцы. Гэта былі Раман Фёдаравіч Рудзько, Іван Цярэнцьевіч Кажанец, многія другія былі сувязнымі партызанскіх атрадаў. Вёска жыла і змагалася. Жыхары хавалі хлеб, жывёлу ад гітлераўскіх захопнікаў, а потым перадавалі народным мсціўцам. Усе чакалі дня вызвалення...

Май 1944 года. Пад магутнымі ўдарамі Чырвонай арміі, несучы вялікія страты, коціцца вораг з беларускай зямлі. Вось-вось зацягнецца пятля на яго шыі. Але фашысцкія каты яшчэ наводзяць жах на людзей сваімі расправамі і здзекамі, робяць аблавы, лясныя блакіроўкі. Вось і гэта, апошняя...

Расцягнуўшыся ланцугом ад Ліпеня да Градзянкі, карнікі прачэсваюць лес, спадзеючыся напасці на след партызан. Але ўсё дарэмна. Атрады брыгады Мікалая Піліпавіча Каралёва даўно ўжо пакінулі яго.

Толькі адзін узвод партызан з атрада Рыгора Нікіфаравіча Баразны даў бой фашыстам недалёка ад вёскі і, прарваўшы акружэнне, знік у невядомым напрамку. Тады гітлераўскія звяры вырашылі адпомсціць мірным жыхарам. Усіх, каго затрымлівалі ў лесе, каты зганялі ў адзін натоўп і гналі перад сабой да вёскі. Некаторыя бозкаўцы хаваліся ў лесе. Сярод аднавяскоўцаў быў і Ціт Пракопавіч Гоцін са сваёй жонкай і траімі дзецьмі. Восем чалавек сядзелі пад выварaтнем вялізнага паваленага дрэва. Час ад часу Ціт Пракопавіч узлазіў на вялікую хвою, што стаяла побач, і назіраў за вёскай. Там было ўсё спакойна. Хтосьці з жанчын падаў голас: «Казалі, што ў вёсцы чапаць не будуць, можа пойдзем туды? Тут зловяць, адразу расстраляюць».

Стаяла маўклівая цішыня. Толькі дрэвы, не ведаючы людскога жаху, ва ўвесь голас гаманілі аб чымсьці паміж сабой. Ды яшчэ кукавала зязюля, некаму мерна адлічваючы гады доўгага жыцця.

Думалі, разважалі людзі. Тут застацца — амаль верная смерць, а ў вёсцы жанчын, дзяцей няўжо крануць? І цяпер, расказваючы аб тым часе, Ціт Пракопавіч перапыняецца, не можа гаварыць. Блішчаць слёзы на вачах, штосьці сціскае горла:

— Усё ж адправіў жонку з дзецьмі ў вёску. Думаў, калі згіну, дык адзін. А выйшла вось зусім наадварот.

Махнатыя лапы яліны надзейна схавалі яго ад фашыстаў, калі тыя праходзілі ланцугом.

9 мая. Як зграя галодных ваўкоў, накінуліся гітлераўскія звяры на вёску. Акружылі. Сталі выганяць з хат старых, жанчын, дзяцей. З лесу карнікі выводзілі ўсё новыя і новыя групы людзей. Тут былі не толькі бозкаўцы, а таксама і жыхары з навакольных вёсак Лазовага, Палядак, Лапіч, Вязычына. Хутка вялізны хлеў на ўскрайку лесу, дзе раней быў загон для калгасных авечак, каты запоўнілі людзьмі. Праз некаторы час галаварэзы ў чорнай форме са свастыкай на рукавах вывелі адтуль некалькіх хлапчукоў, пасадзілі іх на коней і загадалі весці разам з паліцаямі нарабаваных коней у Лапічы.

Былі сярод тых хлапчукоў сын Ціта Пракопавіча Гоціна Дзмітрый і яго таварыш Сцяпан Чыпілейчык. Так цудам яны засталіся жыць.

Астатнім сказалі, што пасадзяць на машыны і адправяць у Асіповічы. Але вылюдкам веры ўжо не было. Адчуўшы нядобрае, загаласілі жанчыны. Наступіла жудасная ноч. П'яныя карнікі гарланілі песні.

Яшчэ адзін чалавек стаў сведкам страшэннай трагедыі, якая разыгралася ў вёсцы. Гэта Мікалай Захаравіч Купрэйчык — партызанскі сувязны. Рана, на досвітку, калі яшчэ вёска спала, заехаў да бацькі — Захара Фёдаравіча. Мусіць, старэчае сэрца чула бяду ў той час, таму адразу праводзіў сына з сяла. А калі ўжо вярнуўся Мікалай Захаравіч...

Назаўтра пачаўся дзень расправы. Немы крык стаяў над сялом. У адзін бок адводзілі старых, у другі — жанчын і дзяцей. Недалёка ад дарогі стаяла будоўля Сяргея Іванавіча Кажанца. Па 12—18 чалавек заводзілі ў дом і загадвалі класціся на падлогу, затым стралялі з аўтаматаў. 578 чалавек было. Трэба, каб усім было месца... Каты кідалі паверх забітых і раненых пралёты плоту, дошкі і зноў і зноў заганялі людзей...

Захар Фёдаравіч паспеў крыкнуць:

— Звяры! Не было вас на нашай зямлі і не будзе ніколі!

Аўтаматная чарга абарвала яго. Побач у хлеў завялі жанчын з дзецьмі. Забілі дзверы, будынак аблілі бензінам, будоўля ўспыхнула, як сушняк у гарачае лета...Ад'язджаючы, запалілі крайнія хаты...

Дзесьці побач кукавала зязюля. Яе кукаванне было зусім непадобнае да таго, што прарочыла гады даўгалецця. Яна, здавалася, плакала. І гэты жалобны плач звонкім рэхам разносіўся па лесе, расказваючы ўсім аб страшэнным злачынстве фашысцкіх выродкаў.

Ад чорнага дыму скручваліся маладыя клейкія лісточкі бярозы, толькі пачынаўшай сваё жыццё.

Як толькі апошнія карнікі выехалі за сяло, Мікалай Захаравіч прыбег да месца трагедыі. Наўкол маўклівая цішыня... Толькі агонь, патрэскваючы, у дзікай плясцы скакаў па сценах будоўляў. Выламаў дзверы... Там абгарэлыя людзі... Зайшлося сэрца. Абхапіў рукамі галаву, дзіка закрычаў:

— Хто жывы? Адгукніся!

Ні стогна ў адказ. Пазнаў сына, бацьку...

Раптам пачулася стралянінa. То вярталіся паліцаі. Схамянуўшыся, Купрэйчык пакрочыў па завулку ў лес.

Крыху пазней прыйшоў сюды Ціт Пракопавіч Гоцін з таварышамі Логвінам Логвінавічам Кажанцом і Піліпам Фёдаравічам Кажанцом, пахавалі ахвяр у брацкай магіле.

С. Багдановіч.
Запаветы Леніна. 1980. 3 ліп.

Вогненная памяць, вогненныя сны...

Пра сны свае, ваенныя, пасляваенныя расказваюць многія жыхары. Бо ў іх, снах тых — працяг іхніх пакут. Зноў і зноў, як самую рэальнасць, перажываюць людзі. Усё гэта — разам з загінуўшымі і як бы за іх ужо. Нават «калектыўныя» бывалі сны ў людзей — пасля таго агульнага жаху. І такія, што людзі ў лесе пагаварыўшы, перагаварыўшыся раніцай, раптам беглі на свае папялішчы — настолькі рэальным загадам былі для іх начныя, у сне, уяўленні пра пакуты родных і блізкіх...

З успамінаў жыхаркі вёскі Лазовае Грышановіч Вольгі Рыгораўны

«...Мы былі ў лесе, — гаворыць Вольга Рыгораўна Грышановіч, — ну і прыйшлі з лесу, калі нашых спалілі. Паглядзелі, сабралі попел: дзеці ляжаць, здаецца, жывое. Возьмеш папялок, рассыпаецца. У адной хаце мы сабралі ўсіх. Дзевяць цаброў — адны беленькія костачкі. А ў другой — там ужо была гара. І кроў відна была, іх, мусіць, білі. Таму што яны ў кучы, і кроў была. Па куточках былі, пад печам. Цераз год адзін дзед... яму прыснілася жонка: «Чаму ты мяне не пахаваеш? — кажа яна ў сне. — Я ж пад печам, у мухаморы».

Ну ён нікому не сказаў, дождж ідзе, ён ціхонька гэту печ раскідае. Прыходзім, кажам:

— Дзядуля, што ты робіш?

— А мне, кажа, Алеся прыснілася: «Што ты мяне не пахаваеш, я ўжо цэлы год ляжу пад гэтым печам, а ты мяне не пахаваеш».

Праўда, ён раскідаў гэту печ, а там костачкі, галёнкі, толькі костачкі асталіся. Гэтага дзеда прозвішча Пракаповіч Віктар, а яго жонку звалі Алесяй.

Ну, мы пазбіралі гэтыя костачкі і зноў закапалі... А так, як гэтых хавалі, прыйдзем у лес, нагалосімся ў лесе, зноў на папялішча прыбяжым — прыснілася нам: «Што вы нас не пахавалі?» Станем гэтую цэглу разломваць... Колькі раз прыбягалі. Раскапаем, нойдзем, апяць гэту магілку прыкопваем. Зноў пойдзем у лес, ляжам: які там сон! Але зноў сняцца: «Вы нас...» Што ўсіх не пахавалі. Зноў прыйдзем і станем гэтую цэглу разломваць, шукаць... Ну, так і асталіся, а як палілі — ніхто не знае. Ні адной душы ў нас не ўцякло. Вот ужо ў суседняй дзярэўне, у Лазку, там у Германію адбіралі. А ў нас такія былі жанчыны маладыя — ні адной душы не пакінулі. Там, дык з дзецьмі каторыя, тых палілі, а маладых — у Германію.

Калі палілі, мы хаваліся ў балоце. Трое сутак сядзелі. Узлезлі на сасну, глядзім: ніхто ні печы не паліць, ні вады не цягаюць. Ну, мы рашылі, што забралі, можа і пагналі ў гарнізон. Тады сонейка заходзіла — мы гаворым:

— Давай пабяжым, паглядзім, што робіцца... Які быў жах, калі пабачылі.

— Сто пяцьдзесят чалавек нашых толькі загінула, а тут, кажуць, прыгналі з Лочына трыццаць чалавек. І тых, што ў лесе лавілі, тожа ў агонь кідалі.

Ну, што ж, асталося на сягонняшні дзень. З усёй вёскі засталося: вот нас трох, яна са сваімі дзецьмі і яшчэ адна жанчына з дзецьмі асталася — тры сядзі сям'і...»

Успаміны жыхаркі вёскі Вялікая Гарожа Патапейка Марыі Змітраўны

«...Раненька я ў печы палю, бліны пяку, ну, а хлапчук быў у нас, сын, дык ён пабег на вуліцу — ужо гуляці к суседзям. Ужо бег ён туды, ой — нешта на вуліцы страляюць, пулі свішчуць!...

Ну дык мы закрычалі на яго:

— Вот табе нада бегчы, сядзі ціхенька!

Ну, ідуць па сяле, ідуць немцы, бачым, што немцы!.. Тут калодзеж быў, яны паставілі кулямёт. І каровы з таго канца гоняць, гоняць, гоняць.

Мой на мяне:

— Падаі.

Трэба б ісці пацвіркаць, дык баюся.

Ён:

— А чаго баяцца! Ідзі, бо во забяруць карову.

Ну, я пайшла, даю. Страляюць. Страляюць па дварах, страляюць. К суседу вот сюды падышлі ўжо, страляюць. Я кінула даіць і іду, вот тут стрэлася — бягуць! На двор бягуць, бягуць немцы. І пытаюцца, каровы ці е, гусі і коні, авечкі, усё. Ну, больш нічога ў нас не было, толькі карова яшчэ была, куры яшчэ былі... Конь быў, дык мы схавалі, схованы быў у лесе.

Ну я кажу:

— Карова е, куры е, больш нічога.

Вярнулі мяне, каб я карову выгнала. Я выгнала ім карову. Тады іду, а яны бягуць за мной у хату, бягуць. Ну, убеглі і нас на двор гоняць, ага, да каменданта. Ну, а мы дзяцей ужо кінулі, кажам:

— Дзеткі, пабудзьце ў хаце, а мы, можа, адны сходзім.

Ну, мы пайшлі, а немцы пабеглі і павыганялі дзяцей з хаты, і яны зноў к нам прыйшлі. Мы ідзём па вуліцы, і ідзе немец. Адзін, ды два яшчэ... Ідуць, халаты ў крыві — і... Стрэлі нас, пытаюцца:

— Партызаны ці былі?

Ну, мы кажам:

— Былі. Што ж, былі.

— Колькі?

— Чатыры было падводы.

— А што бралі?

— Усё бралі, што ім нада. І хлеб, і картошку, і мяса.

Тады камендант адсюль, з естага канца падышоў і на яго: «Гер-гер-гер». І сказаў каровы ўжо гнаць, ужо каровы ў Асіповічы гнаць.

Пайшоў мужык мой. І дачка. Але яна бачыць, што я не іду, дык і яна вярнулася.

Кажу:

— Чаму ты вярнулася, чаму не бегла з бацькам? Ён там недзе схаваецца, і ты б схавалася. А пойдзем туды, дык там папаляць, паб'юць нас.

Яны і праўда пастроілі дзяўчат і нас асобна. Дзяўчат каровы гнаць. І спрашваюць:

— Партызаны былі?

Першага спрасілі, ён кажа:

— Не, не было, не бачыў.

Як ён не бачыў, дык немец яго за карак. Ён дзіцятка на руках трымаў. За карак і — пад хлеў, у снег, у туру, і забіў.

— Ну і дзіця там з ім забіў. Потым жонка з дзіцяткам большым за ручку і: «Э-э-э!..» — загаласіла, загаласіла. Ён і яе туды і забіў. А хлопчык ля мяне стаяў — такі вось хлопчык... Ён тожа рваўся бегчы к ім. А я за яго і кажу:

— Не бяжы, стой, стой!

Ён, праўда, стаў, стаіць. І цяпер жыве недзе ў горадзе, Бог яго знае. Патапейка яго фамілія. А зваць як — забыла...»

Успаміны жыхара вёскі Вялікая Гарожа Патапейкі Кастуся Карпавіча

«...Гэта Новы год быў, калі па старому стылю, у сорак трэцім годзе. Раненька прыехалі якія-та і цягнуць кулямёт — вот тут калодзеж быў — усе ў белых халатах.

Мы сядзім у хаце. Печка жалезная, жацяначка. Чацвёра дзяцей у мяне, малых — самая большая дзяўчынка хадзіла ў шосты клас. А то ўсе малыя былі. Ага. І чуем, страляюць з таго канца. Каровы бегаюць па вуліцы... Ага, а потым вось тут на вугле мой дзядзька жыў родны, бацькаў брат. І вось гэты дзядзька выгнаў карову сюды на вуліцу. Ён — раз, застрэліў!

— Ну, у акно мы бачым. Ага... жонка дзядзькава гвалту нарабіла, і жонку застрэліў тут. Потым дзве дзеўкі. І дзевак абедзвюх застрэліў. Тут жа ў варотах. Я іду і гавару, што гэта людзей б'юць. Ага. А потым яны ў другую хату. Толькі зайшлі, у хаце страляюць. Ну, а мы сядзім так. Потым і ў трэцюю зайшлі, тожа страляюць... Ну, усё! А потым — раз — прыехала легкавая машына. Вылазіць адзін, ужо без халата. Ну, афіцэр, камендант яны называлі яго. Ну, тут яны ўсе прыбеглі ўжо, сабраліся, дык ён ім скамандаваў, каб не біць ужо, значыць, астатніх людзей. А сагнаць з месца. Яны прыбеглі да мяне і гавораць:

— Ідзеце да каменданта.

— А што — з дзецьмі, браць мне дзяцей?

Дык ён махнуў рукой: як хочаш, хочаш — бяры, хочаш — не. Яны знаюць, што ўсё раўно гэта... Ну, мы сабраліся з бабай:

— Вы, дзеткі, сядзіце, грэйцеся ля печкі, мы прыдом, тады забяром вас...

— Дык немец мне, — расказвае дзед, — загадаў гнаць каровы ў той канец вёскі.

— А там, — кажа немец, — мы яшчэ людзей набяром і пагонім усе каровы ў Асіповічы, таму што тут партызанскі лагер, вы снабжаеце партызан. А дзярэўню мы вашу ўнічтожым.

Так вот сказаў і пагнаў гэтыя каровы. А там мая сястра жыла — забег у хату да сястры. Забег: пабітыя ўсе датла!.. Свякру-

ха, яна, мужык і дзіцёнак — чалавекі чатыры душы. Яны прыходзяць, гады, і камандуюць: «Лажыся!» І тады вось так у галаву кожнаму страляюць, вот паб'юць, паб'юць, усё...

А хто дык і асталіся. Вот у Невяровіча напроціў — хлопец быў на пячы, пасцілкай накрыўся, убілі сястру, убілі матку і бацьку, а ён застаўся і цяпер жывы. Ён у Бабруйску работае. Таксама ў тым канцы гэта было...»

Успаміны жыхаркі вёскі Вялікая Гарожа Марыі Міхайлік

«...Было цёмна. Яны акружылі сяло і давай страляць. Мама кажа:

— Дачушка, страляюць, уставай!

Я кажу:

— А што, партызаны?

Яна адказвае:

— Партызаны.

Пазіраем мы ў акно. Ідуць у белых халатах. Маці кажа:

— Пагубляліся, а цяпер страляюць.

Бо ноччу ж яны былі ў нас, партызаны. Думаем, што шукаюць адзін аднаго. Мама кажа:

— Схадзі вады.

Я іду вады ў калодзеж, а яны вярнуліся назад:

— Ком дахаты!

Я вярнулася.

— Мама, яны не пусцілі вады. Ідзіце вы.

Маму таксама вярнулі. А пачалі яны біць з естага во канца.

Я кажу:

— Мама, дык там жа нешта гарыць ужо.

— Ну што ж, — кажа яна — гарыць. Ідзі карову падой, бо каровы бяруць, курэй б'юць.

Ну, я пайшла, падаіла карову. Тады мама кажа:

— Курэй б'юць. Памані ў хату куры.

Ну, і сядзім у хаце. Прыйшоў пляменнік мой. Пытаецца:

— Былі ў вас партызаны?

Мама кажа:

— Былі, дала ім павячэраць, хлеба, малака дала, і пайшлі.

Расказваем. А тады яна кажа:

— Дзеткі мае, глядзіце, Прахора ж у нас б'юць!..

Гэта па-суседску, праз акно мама пазірае. Яшчэ сястра мая з дачкою была ў нас.

Мама гаворыць:

— Глядзіце!..

А там тры выстралы, і дзяўчаткі на стопку палезлі.

Ну, і тут жа к нам прыйшлі. Мы стаім усе каля печкі. Вось так — ручачкі пасціскалі, а печачка гарыць. Ну, прыйшлі... Высокі-высокі прыйшоў, у акулярах. Вось, кажацца, я і цяпер яго бачу, пазнала б. Як прыйшоў, так хату і часціняе. За мяне:

— Ідзі карову выпушчаці!

А брата — на вуліцу.

Пайшла я карову выпушчаць. А яна ж не ідзе. Так сама баіцца, карова, аж на сцену лезе. Я на двор з хлява выйшла, а ён мяне як варсане, дык я і паляцела. Ручкаю з аўтамата варсануў. Два разы. Першы раз я не паляцела, дык ён другі раз.

Мама з хаты выйшла. Мама як выйшла, маму ён і шахнуў — усё во тут шыю прадзіравіў, і ўсё во гэта адвалілася. І маці мая тут жа і лягла.

Ён і пайшоў. Яшчэ мне во так нагою даў, і нас на вуліцу — карову гнаць. Я гэту карову на вуліцу выперла. А там стары адзін — ён памёр ужо — стаяў... Карова стаяла, а ён так во карову абняў... А яго так білі, так білі!..

А я на свайго брата:

— Мой братка, — кажу, — мой братка, усе паскрывіліся, а мы, кажу, вот і пападомся...

А тут каровы ідуць, коні ржуць — сумна, страшна было... Кажу:

— Не схаваемся, і ўсё наша і прапала, браточка. Пагібнем мы.

Ну, і стаім, куды ж ісці, стаім сярод вуліцы. Няма нідзе нікога — ну ні душы! Усіх ужо выбілі.

Падходзім во тут, пад край, на краю стаім. А тут немцы ляжаць з гэтымі кулямётамі. Нам няма куды. І ідуць яны к нам.

— Ну, кажу, братка, пагібнем мы. Давай уцякаць, каб уцякаючы нас, чым так...

Яны прыйшлі і гавораць:

— Не ўцякайце, а то паб'ем. Пагоніце каровы і паедзеце ў Германію.

І другі падышоў, таксама па-нашаму разгаварваў:

— Колькі вам лет?

Я кажу, што васемнаццаць, а брату — чатырнаццаць...

А я выйшла, праўду вам сказаць, толькі галошы на мне былі, так во на босую нагу, і так во голая. Нічога на мне не было.

Я кажу на свайго брата:

— Ну, давай убягаць, Іван!..

А ў хаце, што насупраць, у іх там дзетак было, як сем ці восмера. Дык там крыку! Так крычаць, так крычаць — слышна!..

Ну, усё, бяжыма! Ну, і пабеглі ў лес цераз шашу, па балоце. А снег во так, да пояса. У балота ўлезла, ужо на нагах у мяне нічога нет. А яны па нас так даюць, так даюць, вы паверыце... Але пуля ў нас ні разачку не папала!

Мы ляглі ў гэты снег, паляжалі, потым усталі і сядзелі ў лесе да вечара, пакуль не прымеркла.

Нашлі месца партызанскае, там яны, мабыць, начавалі, бо жарочак быў, яшчэ віселі вяровачкі. Ён тыя вяровачкі ўзяў, што партызаны пакінулі, а ў яго лапці былі і анучы, дык ён і мае абкруціў ногі. А за ноч у мяне ногі во такія былі, абмарозілася. Вось паглядзіце — і сёння пальцаў няма... Мы так пабылі, пераначавалі.

Я ўжо ісці не магу... Брат мне дзве палкі выламаў...»

А ў вёсцы гэтай забілі ў той снежны дзень 297 чалавек.

Успаміны партызана Паўловіча Антона з былой вёскі Макаўе

«...Гэта ў самыя маразы было, у сорак трэцім годзе, — расказвае ён, — раніцай ацапілі вёску. Я з лесу бег дадому. Тут па мне страляюць, а я кінуўся ў снег, удраў. Я хацеў сям'ю забраць у лес. У мяне двое дзетак было. Ну, па мне сталі страляць, і я ў лесе і круціўся, значыць, па лесе... Стаялі яны тры дні. Тут нельга было ніяк ткнуцца, паткнуўся — ракетай засвяцілі, пачалі страляць па мне.

Нас ужо некалькі чалавек сабралася было.

Прыйшлі — усё тут пагарана... Мы на трэці дзень падбіралі іх, харанілі... Да вайны тут сорак чатыры двары было.

Цяпер вялікая паляна, якая была калісьці вёскаю. З такой простай, дамавітай назвай — Макаўе. Ляжаць чатыры валуны, на якіх колісь стаяў на гэтым фундаменце зруб, якому выпала стаць брацкай дамавінай для макаўян. На просценькім абеліску, аброслым кустамі бэзу, напісана, што вёску Макаўе фашысты спалілі 8 студзеня 1943 года, забілі больш за 270 яе жыхароў, а таксама людзей з іншых вёсак».

Успаміны жыхаркі вёскі Брыцалавічы Ганны Патапейка

«...Я толькі як увайшла ў гэты сарай, немцы крыкнулі:

— Кіндэр брасай!

І тыя дзеці ішлі, пабраўшыся за плацце. І чужыя, і мае. Чацвёра не маіх, а тое несла на руках. Як увайшла, так яны і застрачылі...

Стралялі, стралялі... Пастралялі, а тады ўжо рагочуць:

— Рус свіння капут!

І яшчэ пастраляюць, нагамі варсаюць. Ну, я і ляжу так. Як паляцела, так во і ляжу. А кроў жа: паразрывала ж усё...

Потым пайшлі яны ў другі сарай, рагочуць, страляюць, усе там, гергечуць. Ідуць сюды! Што тут рабіць? Падымуся!.. Як падымуся, дык кроў цюрыць адусюль... Ну, і зноў лягу туды. Ляжу. Ну, яны так прыйшлі, яшчэ хто стогне — павялі вочарадзь цераз нас і пайшлі. Хляпхляп — вароты пазачынялі і пайшлі ў школу...

А пачалося гэта з таго, што фашысты пайшлі лавіць партызан. Зайшлі ў зямлянку — іх узарвала. Чалавек мо дзесяць... Ну, як узарвала іх на тых мінах, дык яны вярнуліся ды акружылі наша сяло... Ужо не глядзелі ні дзяцей, ні старых, — усіх, усіх сагналі нас. Вот сюды, дзе гэты памятнік, у сарай нас сагналі. Калгасны быў сарай, вялікі... Загналі нас, а мароз быў і снег быў бальшы. Уцякаць — дык вельмі ж трудна ўцячы. Прама снег такі, як увойдзеш, дык і ног не зменіш.

Сядзім, сядзім, назаўтра ўжо. Віднее...

— Ну, што, — гавораць, — ну, што будзе?

Нешта ж не пушчаюць нас. Ну, — гавораць, — гэта будуць выганяць кароў ды ўсё сабе забіраць: куры, каровы, а тых ужо будуць гнаць, маладзёж, дык нас не выпушчаюць, што б не плакалі маткі, ды ўсе там.

Гэта мы так рашаем.

Ну і сядзім, пазіраем у вокны... Ну, так часоў у два ідуць, ідуць, ну слава Богу, будуць нас выпушчаць! Ідуць, іх многа ідзе, і начальства ўжо, бачым, ідзе. Ну, пушчаць будуць. Э-э-э, як толькі адчынілі сарай — «Ідом, ідом на вуліцу!..» Выйшлі на вуліцу. Яны нас завярнулі туды на шлях. Ну, як завярнулі на шлях, ужо мы панялі: што-та ўжо зробяць нешта. Ужо сталі бабы плакаць, крычаць ужо...

Загналі туды, дык ужо бачылі: і шапці ляжаць і сумкі тыя — нашых мужчын... Тады ўжо мы панялі, што будуць і нас... Што-та зробяць: запаляць ці расстраляюць. Ужо ў вокны паўстаўлялі кулямёты, у кожнае акно.

...Сталі яны ў акно стукацца:

— Дайце нам чалавека.

Яны ўжо так парасстралялі, што хазяйка была, варыла ім есці, дык і тую. І немашака каму варыць ім есці. Жанчына там з намі была, па-нямецку гаварыла. Выйшла з дзіцём, дык яны за рабёнка — выкінулі, а яе павялі.

І тады сталі вадзіць. Чалавек па дваццаць — страляць...»

Успаміны былой жыхаркі вёскі Брыцалавічы Уліты Кандратаўны Альховік

«...Во тут куча людзей ляжала... Во — поўны двор жа ш, уся ш дзярэўня ляжала. І на дварэ, і ў сараі. І апусціўся вот еты месяц — нізенька, нізенька. І стаіць на месяцы чалавек. У халаце белым... Не то што нехта мне так казаў — я сама з сарая відзела гэта. Праз шчэлку. І рамянём падпаразаны, шапка зімовая і ў ботах. На етым месяцы стаіць. Над бітымі...

Я тады вельмі расцерана была. Не ведала, дзе мне дзецца. Дзве дачкі расстралялі, а два хлопчыкі — не ведаю, дзе яны...

На месячыку стаяў... На самым месячыку. А нізенька вельмі круг апусціўся... А ён на месяцы стаіць!.. Вот проста так, абыкнавенны чалавек, рамянём падпяразаны, белы халат на ём і штанэ чорныя, у ботах і шапка зімовая...

Я трое сутак сядзела ў сараі з бітымі. Ну, усё роўна што бітых людзей сцерагла. На кожным вугле страж стаяў. Абойдзе во так кругом сарая і во так вуха прыкладае ды гэта слухае, ці дышуць людзі... А там мо хто і жывы быў, дык ужо дайшоў. Я каб яшчэ адны суткі пасядзела, дык ад воздуху зайшлася б. Ужо так асмягла, піць трое сутак не піўшы...

А яны з дзярэўні ўсё вывозілі на машынах. Я праз шчэлку ўсё бачыла. І бруднае бяллё, і чыстае, дзе што аставалася ў хатах... Ну, а тады ўжо яны, бачу я, збіраюцца ехаць — ужо аблеялі сарай бензінам, запалілі. І тады неяк прачыніліся вароты... Дык я думаю: «Як ужо мне кіпець у гэтым агні, дык я выйду на двор, няхай у плечы страляюць». Яны туды-сюды па дварэ, а я так во — цераз агарод, і пайшла! Я тады ўздумала, што кажуць: «Калі цябе спасцігне такое няшчасце — ідзі і не аглядвайся!.. » Дык... я во так, спіной да іх, так во, у лес дайшла, не аглядвалася. А яны на дварэ яшчэ сюды-туды бегаюць.

Ну, там ужо прыйшла я ў лес. Рука паранена, дык скамячыла палец гэты, пацягну — не адрываецца... А там партызаны ўжо. Доктар зрабіла мне перавязку...».

Друкуецца паводле кн.: Адамовіч А., Брыль Я., Калеснік У. Я з вогненнай вёскі... Мн., 1983. С. 371, 374—375.

Ім тут не быць

Я видел, как одна женщина плакала на пепелище своей хаты. От всей деревни тут и там остались лишь груды обгорелого кирпича и несколько уцелевших заборов. Полгода назад здесь была большая деревня Маковье. Большую часть населения немцы сожгли в сарае, облив бензином, а остальные разбрелись по соседним деревням. Женщина перестала рыдать, не замечая, что один из ее валенок попал в первую весеннюю лужу, хотя слезы не прекращали катиться по ее рано состарившимся щекам. На мой немой вопрос она обернулась ко мне и безутешная в своем горе сказала:

— Всех... всех убили, сыночек... Как мне жить дальше? Неужели все так и сойдет им?..

Не помню, что я ответил этой сгорбленной страданиями белорусской женщине, но почему-то вспомнилась своя мать, и стало обидно и грустно.

Он ответит, враг, за твои страдания. Враг понесет кару за пролитые слезы. Этой карой будет его гибель!

Никогда не забыть мне труп мужчины лет 56 из деревни Брицаловичи, на который мы наткнулись весною. Кругом зеленела трава, а он лежал на земле в валенках и зимней шапке-ушанке с темными пятнами на лице и почерневшим носом. Скрюченные пальцы рук, поднятых над головой, тоже черные от начавшегося разложения и неестественно вздувшиеся, еще сжимали пучок табаку. Его застрелили немцы, бро-

сив труп. Прошло много месяцев, но его было некому похоронить. Когда-то зимой и летом хорошо наезженная дорога стала совсем пустынной, поросла первой молодой травой. Немцы сожгли деревню и уничтожили около 400 человек жителей. Теперь по ней некому ездить.

Солнце закроет черная хмарь, и пойдет дождь, если перечислить все варварства немецких иродов. Но кровь не стынет в жилах от творимых врагом ужасов. Она пульсирует с удвоенной энергией. Мускулы сжимаются, кулаки становятся твердыми, как камень. Сердце порождает гнев, а не ужас перед немецкими злодеяниями, гнев призывает к мщению.

В деревне Ляды Червеньского района Минской области немцы схватили 95-летнего старика и, жестоко избивая, потащили его к колодцу, в котором уже лежало много трупов расстрелянных и замученных жителей. Дряхлый старик не мог сопротивляться здоровенным фрицам. Когда он увидел, что ведут к месту казни, по его щекам потекли слезы. Старческая рука размазала их по лицу, и неожиданно дед запел слова песни о Родине, которая этому старому человеку делала возможность счастливо пожить:

— Молодым везде у нас дорога,
Старикам везде у нас почет...

Палачи настолько были изумлены, что даже остановились, а он продолжал петь. Только новый град побоев заглушил песню и заставил старика замолчать.

Немец — это твоя смерть! Фашист твой враг, и если ты будешь воевать плохо и не убьешь немца — сам станешь его жертвой. Убей врага, чтобы спасти свою жизнь! Горе тому малодушному русскому, сердце которого не кипит гневом, видя злодеяния фашиста. Он сам копает себе могилу, не подозревая этого.

Вследствие такого подхода Н-ский партизанский отряд в январе м-це 1943 года расстрелял родственников одного из командиров партизанского отряда, которые работали на пользу партизан, а не немцев.

Более того, установлены случаи, когда отдельные партизанские отряды ловят лиц, посланных в учреждения и организации противника партийными организациями по их заданию для работы в пользу партизан, считая их немецкими шпионами, и последних расстреливают.

Подобная практика может быть выгодна больше для немецкого фашизма и его гестапо. В целях изжития указанных и других серьезных недостатков, установления соответственного централизованного надзора в этом деле

Решаю:

1. Предложить подпольному Осиповичскому РК КП(б)Б в течение одного-двух дней утвердить кандидатуру на должность начальника районного отделения НКВД.

2. Установить, что в обязанности начальника РО НКВД входит:

а) Выдача санкций на привлечение к уголовной ответственности по закону военного времени, тем особоуполномоченным партизанских отрядов, которые расположены на территории Осиповичского района.

б) Начальник РО НКВД несет персональную ответственность перед РК КП(б)Б и вышестоящими партийными органами за правильность привлечения лиц к уголовной ответственности по закону военного времени.

3. Запретить всем командирам и комиссарам партизанских отрядов и бригад, находящихся на территории Осиповичского р-на, производить расстрелы граждан Осиповичского района без санкции нач. РО НКВД Осиповичского р-на. Предупреждаю командиров и комиссаров бригад и отрядов, находящихся на территории Осиповичского р-на, что они несут персональную ответственность за расстрелы лиц гражданского населения без санкции нач. РО НКВД.

4. Предлагаю начальнику РО НКВД представлять мне ежемесячно спецдонесение по этому вопросу.

Уполномоченный ЦК КП(б)Б Белоруссии по Могилевской области Кардович

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1350. Воп. 1. Спр. 150. Л. 34.

Падрыхтаваў У.І.Лемяшонак.

ДАКЛАД НА 1-й ПАДПОЛЬНАЙ ПАРТЫЙНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ АСІПОВІЦКАГА РАЁНА

20 красавіка 1943 г.

О РОЛИ И ЗАДАЧАХ ПАРТОРГАНИЗАЦИИ В ПАРТИЗАНСКОЙ БОРЬБЕ

Товарищи! Собравшись на нашу первую подпольную конференцию районной парторганизации, мы должны обсудить важнейший вопрос, стоящий перед нашей парторганизацией. Это вопрос о роли и задачах парторганизаций в партизанской борьбе...

...Наша конференция, собравшаяся в условиях подполья и жесткого фашистского террора над населением, должна со всей серьезностью, присущей большевикам, подойти к обсуждению поставленного вопроса с тем, чтобы указания товарища Сталина, в его приказе, и намеченные ЦК КП(б) Белоруссии на 5 Пленуме пути и методы для успешной борьбы с ненавистными фашистскими захватчиками, были бы полностью применены и осуществлены нашими партизанскими отрядами и парторганизациями в борьбе с ненавистным врагом.

Для того же чтобы более реально подойти к обсуждению этого вопроса, необходимо проанализировать положение в наших партизанских отрядах и сделать большевистские выводы из действительного положения, наметить необходимые мероприятия для устранения недочетов, для дальнейшей успешной работы в борьбе с фашистскими извергами и их пособниками-предателями разного рода.

§ 1. СОСТОЯНИЕ ПАРТИЗАНСКОГО ДВИЖЕНИЯ

Великое партизанское движение с каждым днем растет и укрепляется, несмотря ни на какие зверства фашистов, Наоборот — зверства фашистских извергов не уменьшают, а еще больше увеличивают ряды народных мстителей в оккупированных областях и районах, в том числе и нашем районе.

Ярким примером этого является то, что только за последние 9 месяцев отряды нашего района выросли на 690 чел., в том числе за 1943 год на 163 чел. Основная масса пришедших к нам в отряды местное население. Эти люди пришли к нам в отряды горя жгучей ненавистью к фашистским людоедам и готовые мстить гитлеровцам за поруганную честь и свободу, за свою любимую Родину, за грабеж, за издевательство над детьми, женами, братьями и сестрами. Но одной ненависти к врагу и готовности отдать все в борьбе с ним — еще недостаточно, чтобы успешно вести борьбу.

Для этого требуется еще и знание военного дела, соблюдение воинской дисциплины, организованность и порядок. Этого же как раз у большинства прибывающих в отряды и не хватает.

Слабое знание военного дела основной массы прибывающих в отряды и личные интересы, из-за которых некоторая часть пришла в отряды, не могли не отразиться на ослаблении дисциплины и организованности в отрядах.

Говоря о состоянии партизанского движения, необходимо отметить то, что за последнее время наблюдается переход к партизанам целых групп полицейских и изменников. Случаи перехода полицейских и изменников имеются и в нашем отряде. Но таких случаев еще мало. Это говорит за то, что мы еще мало вели работы по разложению гарнизонов полицейских и изменников и обязывает нас усилить работу в этих гарнизонах.

Наши партизанские отряды одновременно со своим ростом вели и боевые действия с врагом, воспитывая этим самым в духе непримиримой борьбы пришедшее к нам пополнение.

Боевыми действиями наших отрядов нанесены чувствительные потери против них. Враг испытал на своей спине силу удара партизанских отрядов всей оккупированной территории, в том числе и в нашем районе. Потери фашистов, нанесенные нашими отрядами, следующие:

№ п/о	Убито и ранено фашистов	Взорвано мостов	Спущено эшелонов	Сожжено разных складов	Разбито автомашин	Уничтожено полиции и изменников
210	11142/70	31/6	48/2	18/	16/	-
211	1444/9	27/4	11/3	3/	5/1	/11
212	8/	4/3	-	-	/1	/8
213	-	-	-	5/	-	-
309						
	12594/37	62/13	59/5	26/-	21/2	/19

Из указанных цифр видно, что наши отряды не сидели сложа руки, они действовали и наносили удары по врагу, несмотря на все предпринимаемые врагом противодействия.

Но надо прямо сказать, что нашим отрядам можно было сделать значительно больше. Проведенные отрядами боевые действия недостаточны.

Таково в общих чертах состояние в партизанских отрядах нашего района. Это состояние требует от всей парторганизации в целом и от каждого коммуниста в отдельности большой работы по улучшению существующего положения, по принятию мер для того, чтобы все наши отряды были вполне боеспособными.

Для этого необходимо, чтобы наши парторганизации каждодневно занимались внутри воспитательной и массовой работой в отрядах, вели бы неуклонную борьбу за быстрое и точное проведение в жизнь приказов и распоряжений командования. В этом основная задача парторганизаций отрядов.

§ 2. СОСТОЯНИЕ ПАРТОРГАНИЗАЦИЙ ОТРЯДОВ

Партийные организации отрядов нашего района росли вместе с ростом партизанских отрядов. Рост парторганизаций шел за счет лучших партизан, оправдавших себя в борьбе с немецкими оккупантами, являющихся примером в выполнении боевых заданий и укреплении боевой дисциплины.

Наши парторганизации выросли за второе полугодие 1942 года на 28 членов и 53 кандидата партии и за три месяца 1943 года на 13 членов и 27 кандидатов партии. За это же время в ряды партии принято 16 человек комсомольцев, из общего числа комсомольцев в отрядах в количестве 338 чел. Комсомольские организации занимают видное место в отрядах и находятся на неплохом счету по выполнению боевых заданий. Но несмотря на этот рост, наши парторганизации за счет комсомольцев все же недостаточны.

Комсомол — резерв нашей партии. Поэтому в своей работе парторганизации обязаны уделить больше внимания работе с комсомолом с тем, чтобы комсомольские организации наших отрядов давали для партии достаточное пополнение из своих рядов.

По отрядам этот рост шел следующим образом:

№ п/о	Рост за 2-е полуг. 1942 г.		За 3 месяца 1943 г.		Всего в отрядах	
	членов	кандидатов	членов	кандидатов	членов	кандидатов
210	16	23	3	14	42	43
211	5	3	8	6	14	9
212	-	4	-	2	1	7
213	3	-	2	2	5	3
309	4	3	-	3	4	6
	28	33	13	27	66	68

Из общего прироста коммунистов в количестве 41 член и 60 кандидатов парторганизациями отрядов принято членов — 8, кандидатов — 37, остальные 33 члена и 23 кандидата пришли в отряды вместе с общим пополнением отрядов, представляя различные группы населения.

Поэтому этим коммунистам парторганизации должны уделять наибольшее внимание. Характерным для нашей парторганизации является такой факт, что из общего числа коммунистов — 66 членов; 68 кандидатов, местных только 17 членов и 7 кандидатов, остальные из других областей и районов Союза.

Национальный состав парторганизации следующий:

Белорусов ..... 65 Поляков 2
Русских ..... 45 Армян 2
Украинцев ..... 13 Татар 1
Евреев ..... 5 Марийцев 1

Показанные данные о состоянии парторганизации говорят за то, что наша парторганизация, несмотря на малочисленность, имеет все возможности для того, чтобы полностью справиться с задачами сегодняшнего дня, связанными с борьбой против немецких оккупантов.

Доказательством этого является то, что коммунисты нашей парторганизации в своей основной массе показывают пример в выполнении боевых заданий, в борьбе за укрепление дисциплины отрядов, в работе среди партизан и населения. Такими товарищами, дающими пример в работе и борьбе, являются: Семкин, Стельмах, И.М.Свердликов, Орлов, Лашкевич, Прохоров, Добродумов, Бурмистров, Сатовский, Маркарьян и многие другие, показывающие своим примером, как должен вести себя коммунист.

Одновременно необходимо отметить и то, что в нашей парторганизации имеется еще немало коммунистов, не оправдывающих великого звания члена или кандидата Великой Партии Ленина – Сталина. Такие коммунисты часто не выполняют даваемых им боевых заданий, нарушают военную дисциплину, не заботятся о повышении знаний воинского дела. К числу таких коммунистов можно отнести т.т.Иванова Я., Солодовникова, Соловьева, Сельчук и др.

Для укрепления своих рядов, для улучшения боеспособности всех коммунистов парторганизациями проводится большая внутривоспитательная работа.

Путем постановки на партийных собраниях вопросов о повышении боевых качеств коммунистов, о поднятии идейно-политического уровня членов и кандидатов партии, показывая хорошие и плохие стороны членов и кандидатов партии, наши парторганизации этим самым воспитывают своих коммунистов в духе непримиримой борьбы с фашизмом, в духе горячей любви и преданности своей Родине, своему народу.

§3. ВЫПОЛНЕНИЕ ПРИКАЗА тов. СТАЛИНА от 23/11/43 г. В ОТРЯДАХ НАШЕГО РАЙОНА

В своем приказе тов. Сталин указывает на необходимость — «Неустанно совершенствовать боевую выучку и укреплять дисциплину, порядок и организованность во всей Красной Армии и Военно-Морском Флоте».

Указание тов. Сталина о неустанном совершенствовании боевой выучки и укреплении дисциплины, порядка и организованности, относится не в меньшей степени и к партизанским отрядам, чем к Красной Армии и Военно-Морскому Флоту. Более того, парторганизациям именно на это надо обратить особое внимание.

Далее в приказе тов. Сталина говорится о том, чтобы «Шире раздуть пламя партизанской борьбы в тылу врага, разрушать коммуникации врага, взрывать ж.-д. мосты, срывать переброску неприятельских войск, подвоз оружия и боеприпасов, взрывать и поджигать военные склады, нападать на неприятельские гарнизоны, не давать отступающему врагу сжи-

гать наши села и города, помогать всеми силами, всеми средствами наступающей Красной Армии. В этом залог победы».

Таковы конкретные задачи, поставленные тов. Сталиным перед нами. Выполнение этих задач требует активных боевых действий отрядов по всем указанным в приказе тов. Сталина направлениям.

Но боевые действия наших отрядов, особенно за 1943 год, активными назвать никак нельзя. Приказ тов. Сталина нашими отрядами выполняется крайне неудовлетворительно. Показателем этого являются проведенные боевые операции.

За 1943 год отрядами проведены следующие операции:

№№ п/о	спущ. эшел.	взорв. мост.	уничт. склад.	разб. а/м	убито фаш.	№№ п/о	спущ. эшел.	взорв. мост.	уничт. склад.	разб. а/м	убито фаш.
210	2	6	-	-	72	213	-	-	-	-	-
211	3	4	-	1	28	309	-	-	-	-	-
212	-	3	-	-	8	-	-	-	-	-	-

Из указанных данных видно, что наши отряды для выполнения приказа тов.Сталина сделали очень мало. Некоторые товарищи неудовлетворительное выполнение приказов тов. Сталина пытались оправдать тем, что в этот период нужно было благоустраиваться отрядам, пополнять отряды вооружением и т.д.

В действительности же причины невыполнения приказа тов.Сталина объясняются тем, что, во-первых, для выполнения приказа не было проявлено должной инициативы и настойчивости ни со стороны парторганизаций, ни со стороны своего командования. Показателем этого является не доведение плана боевых действий до подразделений отрядов. Во-вторых, отсутствовала проверка выполнения даваемых заданий тем или иным подразделениям. Например, на жел. дорогу высылалось 18 групп для взрыва пути — выполнили задание только 2. Кандидат партии Солодовников посылался 5 раз на задания и не разу не выполнил их. 3-го марта сего года 170 человек из отряда 210 вышли в засаду на полицию, которая должна была продвигаться по дороге Липень—Осиповичи. Данные о силах полиции были в пользу группы отряда, так как явный перевес сил их был на стороне партизан. Несмотря на это, группа просидела на поселке Воля, не решившись выступить против полицейских. В лагерь вернулись безрезультатно.

Вот факты безответственного отношения к выполнению даваемых заданий, к выполнению приказов командования. Между тем на такие безобразные факты не было должного реагирования ни со стороны парторганизации, ни со стороны командования. В-третьих, не было должного контакта между отрядами и внутри отрядов при подготовке к разрешению тех или иных боевых операций. В результате этого несогласованность действий, стремление захватить более удобные места для проведения операций, помеха друг другу в действиях, излишнее скопление людей в отдельных местах, приводящее к разоблачению в выполнении поставленных задач и к срыву полученного задания.

Все эти недостатки, снижающие боеспособность наших отрядов и подразделений в отрядах. На изжитие этих недостатков, мешающих выполнению приказа товарища Сталина, и должно быть обращено особое внимание наших парторганизаций и командования.

§ 4. ОСНОВНЫЕ ТРЕБОВАНИЯ ДЛЯ УКРЕПЛЕНИЯ ПАРТИЗАНСКОГО ДВИЖЕНИЯ

Из сказанного ранее видно, что имеющие место недостатки в партизанских отрядах, объясняются главным образом тем, что часто не выполнялись условия, на которых основано партизанское движение. Этими условиями, как известно, являются:

а) правильное взаимоотношение с населением и улучшение работы с нашим активом;

б) укрепление боевой дисциплины и боевой выучки в отрядах;

в) активизация боевых действий отрядов.

Вот те условия, на которых основано существование партизанских отрядов. Возьмем первое положение о правильном взаимоотношении с населением и улучшении работы с нашим активом. Ведь само существование, рост и даже вооружение отрядов возможно только благодаря непосредственной помощи населения. Снабжение наших отрядов продуктами питания, обувью и одеждой проходит также за счет населения. Рост отрядов, снабжение их вооружением проходит также при непосредственном участии населения.

Информационно-разведывательные данные о противнике и предателях мы в основном получаем также через население.

Все это показатель того, что партизанское движение искренне поддерживается народом, так как оно направлено на борьбу и уничтожение ненавистного врага человечества — германского фашизма. Каждодневная искренняя помощь населения партизанским отрядам, как своим защитникам от фашистского зверья и их слуг — предателей разного рода, свидетельствуют о том, что партизанское движение является не из вне принесенное, как об этом твердят фашистские брехуны, а истинно народное движение, тесно связанное всеми нитями с народом.

К сожалению, не редки случаи, когда некоторые наши партизаны в отношении населения допускают факты грубого отношения, мародерства и даже применения физического воздействия и расстрела. Например, партизаны из отряда 211 — Климович М.И. и Суровец К.Ф. в конце марта 1943 года, будучи в дер. Заельник, захотели меду. Для этого они сами полезли за медом, подожгли ульи. От подожженных ульев загорелась изба, а от нее еще 4 двора.

В этой же деревне эти «партизаны» девушку Миронович Надежду Ивановну убили только за то, что ее брат служит в полиции. За все это они были «наказаны» командованием отряда на 5 суток ареста. Такие действия отдельных партизан нарушают взаимоотношения с населением, подрывают авторитет партизанского движения как движения народного. Поэтому парторганизации и командование обязаны к людям, допускающим такие факты, применять самые суровые меры наказания.

Работа с активом имеет для нас очень важное значение. При правильной работе с активом мы получаем возможность выполнять свои задания непосредственно в объектах, находящихся в руках врага. При помощи наших активистов мы налаживаем связи с нужными нам людьми и проводим в жизнь необходимые нам мероприятия.

Но эта важнейшая работа во многих случаях многими нашими товарищами проводится без надлежащей серьезности. Часто в общениях с активистами не соблюдается в таких случаях осторожность и конспиративность. О встрече и связях с активистами знают обычно широкие круги партизанских отрядов. В результате чего бывают случаи, когда наши активисты становятся жертвой такой неосторожности и попадают в лапы гестапо.

Для пользы дела партизанского движения для улучшения работы с активом необходимо эту работу улучшить. Взяться за это должны в первую очередь наши партийные организации, принимая соответствующие меры к людям не ценящим эту работу и не умеющим соблюдать надлежащую конспиративность. Необходимо работу с активом поручить узкому кругу наиболее опытных людей, которые пользовались бы доверием нашего актива.

Базируясь на правильных взаимоотношениях с населением, для еще большего улучшения этих отношений и для укрепления своих рядов партизанским отрядам необходимо укрепление боевой дисциплины и боевой выучки в отрядах.

Но это не нашло еще должного внимания в наших отрядах. За это дело не взялись еще как следует ни командование отрядов, ни парторганизации. Это привело к тому, что имеется много случаев нарушения дисциплины, нарушения правил боевой службы, небрежного отношения к оружию и т.д.

Парторганизации и командный состав отрядов, не ведя надлежащей борьбы с этими недостатками, фактически попустительствовали этому. Такому отношению к укреплению дисциплины и повышению боевой выучки надо положить конец. Парторганизациям и каждому коммунисту в отдельности надо стать во главе борьбы за поднятие дисциплины и боевой учебы. Командование же обязано принимать решительные и быстрые меры к нарушающим дисциплину и уклоняющимся от боевой учебы.

Без правильных взаимоотношений с населением, без укрепления боевой дисциплины и повышения боевой учебы нельзя активизировать и боевые действия партизанских отрядов.

Поэтому нельзя отрывать постановку вопроса об активизации боевых действий партизанских отрядов от вопросов улучшения взаимоотношений с населением и укрепления боевой дисциплины. Если мы посмотрим на проведение отрядами боевых действий, то придем к выводу, что для всех отрядов надо пожелать много большего в деле их боевых действий. Всем отрядам нашего района надо значительно активизировать свои боевые действия.

Чем можно объяснить почти безнаказанные действия полицейских и изменников в районе, сжигающих деревни и уничтожающих население — как не слабостью боевых действий партизанских отрядов.

Только преувеличением сил врага на охране железной дороги и недостаточной решительностью в деле выполнения боевых заданий можно объяснить то, что эшелоны противника беспрепятственно передвигаются к фронту и от фронта. Парторганизации и командование отрядов должны обратить серьезное внимание на то, чтобы боевые задания тщательно подготавливались, на выполнение заданий необходимо посылать людей, способных выполнить задание, поставить дело так, чтобы коммунисты и комсомольцы были всегда застрельщиками в деле выполнения поставленных задач, проверять выполнение даваемых заданий и надлежащим образом реагировать в отношении не выполнивших боевые задания.

Таково в основных чертах положение в отрядах нашего района. Положение это требует большой напряженной работы со стороны парторганизаций отрядов с тем, чтобы на основе улучшения взаимоотношений с населением, укрепления боевой дисциплины и боевой выучки отрядов, на основе активизации боевых действий отрядов улучшить всю работу в отрядах и среди населения, этим самым приблизить дело освобождения нашей Родины от ненавистных фашистских захватчиков.

§ 5. ЗАДАЧИ И РОЛЬ ПАРТОРГАНИЗАЦИЙ

Перед парторганизациями партизанских отрядов нашего района, представляющими парторганизации всего района, стоят большие задачи.

Нашей партийной организации в лице парторганизаций отрядов необходимо в дальнейшей работе обратить главное внимание на воспитание коммунистов исходя из задач, поставленных товарищем Сталиным перед парторганизациями в тылу противника.

В своей повседневной работе парторганизации, посредством политмассовой работы, через стенные газеты и боевые листки, проведением групповых бесед с партизанами, личным примером коммунистов должны воспитывать каждого бойца отряда в духе беззаветной любви к своей Родине и непримиримой ненависти и лютой мести к фашистским захватчикам, предателям и изменникам советского народа.

Несмотря на то, что наши парторганизации являются парторганизациями отрядными, необходимо особое внимание обратить на усиление работы с населением, с тем, чтобы еще шире развернуть партизанское движение, еще больше разжечь ненависть к кровавому фашизму.

Ведя работу с населением, парторганизациям необходимо применять все меры для устранения недостатков во взаимоотношениях с населением. Для улучшения взаимоотношений с населением необходимо главным образом изжить моменты грубостей, мародерства и не чутких отношений к населению. Парторганизации должны стать во главе борьбы с этими недостатками.

Основным вопросом в повседневной работе наших парторганизаций должно быть наилучшее претворение в жизнь приказа товарища Сталина и вытекающих отсюда распоряжений командования отрядов, принимая строжайшие меры партийного взыскания к коммунистам, допускающим нарушение и невыполнение распоряжений командования, нарушающих воинскую дисциплину в подразделениях.

Для лучшего выполнения боевых заданий необходимо парторганизациям отрядов по примеру парторганизации первой роты 210 партизанского отряда развернуть предмайское соревнование между отдельными подразделениями и отрядами.

Парторганизациям отрядов для улучшения своей работы среди населения необходимо обратить серьезное внимание на работу с активом, выделив для этого наиболее опытных людей, способных завоевать доверие наших активистов. В работе с активом основным требованием должны быть дача конкретных заданий активистам и требование от каждого активиста точного выполнения даваемых поручений.

Таковы в основном задачи, стоящие перед нашей парторганизацией. Основная цель этих задач — увеличение боеспособности наших отрядов, лучшее выполнение боевых задач, вытекающих из приказа товарища Сталина и стоящих перед нами, усиление работы с населением, привлечение населения на активную борьбу с заклятым врагом нашего народа и всего человечества — гитлеровским фашизмом.

Задачи эти велики и почетны. Выполнение их требует от всей парторганизации в целом и от каждого коммуниста в отдельности большого напряжения сил и энергии, больших жертв. Выполнение этих задач будет проходить в еще более усложняющихся условиях глубокого тыла противника, и само собой понятно: трудности работы будут увеличиваться. Но мы — большевики, и никакие трудности нас страшить не должны. Чем больше трудностей, тем больше напористости и стремления быстрее их преодолеть.

Наша парторганизация по своему составу морально крепкая организация. Члены и кандидаты организации на своем счету имеют не мало боевых дел, справлялись со всякими трудностями. Поэтому задачи, стоящие перед нами и на данном этапе, мы с честью выполним. Эти задачи будут выполнены потому, что этого требует наш советский народ, изнемогающий под игом кровавого фашизма, этого требует от нас большевистская партия и наш вождь и учитель любимый Сталин.

Секретарь Осиповичского подпольного РК КП(б)Б Войтенков

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1350. Воп. 1. Спр. 153. Л. 8—14.

ПАСТАНОВА АСІПОВІЦКАГА ПАДПОЛЬНАГА РАЙКОМА КП(б)Б АБ ФАКТАХ НЕНАРМАЛЬНЫХ УЗАЕМААДНОСІН ПАРТЫЗАН З МІРНЫМІ ЖЫХАРАМІ

6 жніўня 1943 г.

Главной основой партизанского движения является правильное взаимоотношение с населением. Об этом указывалось в решениях ЦК КП(б)Б, обкома партии и неоднократно разъяснялось райкомом партии.

Несмотря на все эти указания об улучшении взаимоотношений с населением, многие и даже командиры допускают по отношению к населению всевозможные грубости, мародерства, самовольные обыски и изъятия. Не редки случаи когда у крестьян берут коров, лошадей не учитывая ни хозяйственного, ни семейного положения крестьянина, без учета политической благонадежности того или иного крестьянина. Означенные выше безобразия чаще всего допускают группы, посылаемые из отрядов на выполнение различных боевых и хозяйственных заданий. Пользуясь положением самостоятельности, во время данное им для выполнения задания, а также отсутствием контроля со стороны командования, эти группы во многих случаях допускают по отношению к населению всевозможные безобразия.

Недопустимо безобразно в некоторых отрядах подходят к вопросу роста отрядов. Вместо политико-воспитательной, кропотливой разъяснительной работы с каждым вступающим в отряд с тем, чтобы он был действительным патриотом нашей Родины, готовым на всякие жертвы и трудности партизанской жизни, стремящимся беспощадно мстить ненавистным фашистам, многие командиры и политработники партизанских отрядов санкционируют поголовный набор в партизанские отряды, не считаясь ни с желанием, ни с семейным положением, ни с физическим состоянием забираемого в отряд гражданина.

Санкционирование командирами и политработниками поголовного набора в партизанские отряды свидетельствует о непонимании ими указаний тов. Сталина и ЦК партии о развертывании партизанского движения как движения высоко патриотического, действительно народного.

В результате этого в некоторых партизанских отрядах вместо политически здорового роста наблюдается рост за счет людей совершенно недостаточно проверенных и неблагонадежных. В силу чего многих вновь прибывающих приходится в лучшем случае отпускать из отряда по многосемейности или по физическим недостаткам (210, 211 п/о), а в худшем случае часть из нового пополнения сами удирают из отрядов и идут уже не домой, а в полицию или в комендатуру, как это получилось в отрядах 210 — 3 чел., 211 — 2 чел., 215 — один чел. Уйдя из отряда, эти люди выдают месторасположение и состояние лагерей отрядов, физически ставят отряды в серьезную опасность.

Наличие фактов мародерства, пьянства, самовольных обысков и изъятий, поголовной «мобилизации» населения в отряды - являются серьезной угрозой нормальным взаимоотношениям партизан с населением, создают вражду против партизан со стороны населения, создают почву для наших врагов характеризовать партизанское движение как враждебное народу.

Исходя из вышеизложенного РК КП(б)Б постановляет:

1. Обязать командиров и комиссаров партизанских отрядов, партийные и комсомольские организации заняться безотлагательно расследованием актов, подрывающих правильное взаимоотношение партизан с населением. Виновных в нарушении взаимоотношений с населением привлечь к строжайшей ответственности.

2. Парторганизациям, командирам и комиссарам отрядов обратить особое внимание на расширение и улучшение воспитательной работы среди партизан и местного населения, ликвидируя этим недостатки во взаимоотношениях с населением, создавая лучшие возможности для роста партизанских отрядов.

3. Обязать командование отрядов строго придерживаться при проведении заготовок указанных им зон действия. Заготовку основных продуктов — хлеб, картофель, овощи, мясо - производить главным образом за счет полицейских и немецких хозяйств.

4. Разъяснить командованию отрядов, что заготовка продуктов должна проводиться каждым отрядом только в закрепленной за ним зоне населенных пунктов. Заготовка продуктов соседним партизанским отрядом в районе другого отряда может проводиться только с согласия командования последнего.

5. Обязать командиров и комиссаров партизанских отрядов обеспечивать высылаемые на задания группы продуктами первой необходимости. В случае невозможности этого сделать, снабжать эти группы соответствующими документами для согласования вопроса обеспечения их продуктами на месте выполнения группой данного ей командованием задания.

Командирам отрядов, при обнаружении в своих зонах партизан других отрядов, производивших заготовку продуктов без особого на то разрешения, или тем более занимающихся мародерством и незаконным изъятием имущества у населения, полностью применять приказ Военно-оперативной группы РК КП(б)Б по этому вопросу, т.е. разоружать лиц, допускающих безобразия, и направлять в Военно-оперативную группу на предмет принятия к виновным соответствующих мер взыскания.

6. Предупредить командиров и комиссаров партизанских отрядов, что они лично отвечают за допущение фактов мародерства, незаконного изъятия имущества и других безобразий по отношению к населению.

7. Воспретить поголовный набор в партизанские отряды людей не только не благонадежных, но также и не желающих по разным причинам идти в п/о. Считать метод поголовного набора в п/о политически вредным, противоречащим указанию партии о развертывании партизанского движения.

8. Предложить командирам и комиссарам отрядов, партийным и комсомольским организациям всю работу по росту партизанских отрядов строить исходя из указаний тов. Сталина и ЦК КП(б)Б о развертывании партизанского движения. Усиливая разъяснительно-воспитательную работу среди населения, привлекать его к партизанской жизни путем строго добровольным, организовывая группы самозащиты в населенных пунктах из местного населения, путем вовлечения населения в активную помощь партизанским отрядам в хозяйственных и боевых делах отрядов.

9. Обязать парторганизации и командование п/о при ведении воспитательной работы и в повседневной жизни личного состава отрядов особое внимание уделять вновь прибывшим в отряд.

10. Предупредить всех командиров и комиссаров п/о о недопустимости поголовного набора населения в отряды. Факт поголовного набора в отряды расценивать как политически вредный, антипартийный поступок и к допускающим такие факты применять самые суровые меры партийного и административного взыскания.

11. Военно-оперативной группе установить степень виновности командиров и комиссаров отрядов, допустивших случаи поголовного набора в отряды и принять соответствующие меры взыскания.

Секретарь Осиповичского подпольного РК КП(б)Б Войтенков

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1350. Воп. 1. Спр. 150. С. 94, 94 адв.

Падрыхтаваў У.І.Лемяшонак.

Падполле дзейнічае

У першыя дні вайны асіпаўчане працавалі, не лічачыся з часам. Усе гарэлі жаданнем спыніць і разбіць ворага. У райваенкамат стаяла чарга добраахвотнікаў, пачалося фарміраванне баявых груп па барацьбе з варожымі дэсантнікамі і дыверсантамі.

У Асіповічах быў заснаваны штаб абароны горада і раёна, кіраўніком якога стаў старшыня выканкома раённага Савета Мікалай Піліпавіч Каралёў. Штаб пачаў эвакуацыю з горада дзяцей, сем'яў рабочых і служачых, каштоўнасцей, гаспадарчага і вытворчага абсталявання і важных архіўных дакументаў.

У канцы дня 23 чэрвеня кіраўнік аддзялення Дзяржбанка Самуіл Каплан, пагрузіўшы каштоўнасці на грузавую машы-

ну, разам з касірам і ахоўнікам паехалі ў Бабруйск.

Назаўтра работнікі аддзялення Дзяржбанка прыйшлі на працу. Васіль Малевіч, Галіеўскі, Софія Махалівер, Галіна Іонус сышліся разам і задумаліся, што рабіць? Ні грошай, ні аховы аддзялення ўжо не было, але з магазінаў пачала паступаць выручка, прыходзілі касіры за грашыма на выплату зарплаты. Каб вырашыць, як паступіць з работай аддзялення, Малевіч адправіўся ў штаб абароны раёна, які размяшчаўся на рагу вуліц Чумакова і Чырвонаармейскай у хутка пабудаваным бліндажы. Калі Малевіч увайшоў у бліндаж, там знаходзіўся начальнік штаба абароны раёна М.П.Каралёў, другі і трэці сакратары райкома партыі і начальнік міліцыі Дзяменцьеў. Малевіч звярнуўся да дзяжурнага загадчыка райфа Старавойтава з пытаннем, як паступіць з работай аддзялення Дзяржбанка? Размову пачуў Каралёў і распарадзіўся:

— Працягвайце працаваць, прымайце і выдавайце грошы, наколькі гэта будзе магчыма!

Дзяменцьеў выдзеліў людзей для аховы аддзялення Дзяржбанка. Так яны працягвалі працаваць да 29 чэрвеня. Грошай у банку не засталося, так як выдача перавышала прыём. Вечарамі служачыя, баючыся бамбёжак, ішлі за горад, начавалі дзе прыдзецца. Раніцай 29 чэрвеня даведаліся, што Бабруйск ужо захапілі немцы. Штаб абароны раёна выбыў з горада. Малевіч з Галіеўскім сабралі ў аддзяленні карткі ўзору подпісаў, іншыя дакументы, спалілі іх, а затым адправіліся на вакзал з надзеяй выехаць у Магілёў. У гэты час з Брэста прыбыў браняпоезд. Чыгуначнікі дэпо па патрабаванні камандзіра далі пад яго паравоз і прычапілі тры пустыя платформы. Малевічу і Галіеўскаму ўдалося на платформе паехаць на Магілёў. Каля в. Гарожа гітлераўцы з гармат разбілі паравоз і пачалі расстрэльваць людзей на платформах. Тут Малевіч і Галіеўскі згубілі адзін аднаго. Малевіч дайшоў да в. Максімаўка, там сустрэўся з бацькам Казімірам Францавічам (які збег з Асіповіч), маці Антанінай Гіляраўнай, сястрой Софіяй і братам Барысам. У ліпені бацькі і сястра пайшлі ў Асіповічы, а Васіль з брагам засталіся ў Максімаўцы касіць сена і ўбіраць жыта.

М.С.Шведаў.

22 чэрвеня 1941 г. Марк Шведаў вёў пасажырскі цягнік да станцыі Цімкавічы — апошняй станцыі на старой граніцы СССР. Уязджаючы на станцыю Слуцк, Шведаў убачыў, як на пероне вакзала тоўпіліся занепакоеныя людзі з маёмасцю і дзецьмі на руках. Гэта былі першыя бежанцы.

Ад чыгуначнікаў машыніст даведаўся, што фашысцкая Германія напала на Савецкі Саюз. Вайна! Пасажыры, якія нрыехалі ў Слуцк, хутка пакідалі цягнік і беглі па дамах. Людзі, якія павінны былі ехаць да Цімкавіч, разгубіліся, не ведаючы, што ім рабіць: ехаць далей ці вярнуцца назад. Выконваючы графік, Шведаў са сваімі памочнікамі Софіяй Самец і Арсеніем Няхаем давялі цягнік да Цімкавіч і вярнуліся ў Асіповічы. Цягнік быў перагружаны эвакуіраванымі. У Асіповічах на пероне таксама тоўпілася шмат народу: пачалася эвакуацыя сем'яў рабочых і служачых гарадка і чыгуначнага вузла.

Праз двое сутак Шведаў, яго памочнік А.Няхай і практыкант У.Макарэвіч прынялі паравоз, прычапілі яго да саставу, гружанага хлебам, і адправіліся на Магілёў. Дарога была забіта саставамі. На станцыі Свіслач стварылася пробка: на чыгуначным мосце цераз Бярэзіну гітлераўцы абстралялі састаў і пашкодзілі паравоз. Шведаў і яго напарнікі вымушаны былі пакінуць лакаматыў і пешшу па пуцях ісці назад. Каля разбітага вагона са зброяй яны ўзброіліся пісталетамі «ТТ». На станцыі Брыцалавічы Шведаў даведаўся, што яго сям'я з Асіповіч пайшла ў в. Смык. Вырашылі ісці туды, а Арсенія Няхая паслалі ў Асіповічы ў разведку. У в.Смык да Шведава і Макарэвіча далучыўся электразваршчык паравознага дэпо Павел Антонавіч Гірыловіч. У размове з вяскоўцамі Шведаў

У.М.Макарэвіч.

А.Ф.Чайкоўскі.

У.М.Бандарэнка.

П.А.Гірыловіч.

даведаўся, што ў лесе, каля станцыі Дзераўцы, стаіць вайсковая часць Чырвонай арміі. Вырашылі ісці туды, для сувязі з ваеннымі паслалі мясцовую настаўніцу Марыю Філімонаўну Сянюк. Ноччу яна вярнулася ў суправаджэнні трох камандзіраў. Камандаванню палка тэрмінова патрабаваліся звесткі аб абстаноўцы ў Асіповічах і ваколіцах. Вайскоўцы папрасілі Шведава дапамагчы. Дамовіліся і аб спосабах сувязі. Выконваючы даручэнне, Шведаў пайшоў у Асіповічы на разведку. Вуліцы горада былі бязлюднымі. Толькі ў раёне клуба чыгуначнікаў на 2 грузавых аўтамашынах чырвонаармейцы вялі бой з уварваўшымся ў горад нямецкім танкам, якога ўдалося падбіць. У той жа дзень Шведаў вярнуўся ў Дзераўцы, а праз двое сутак са сваёй сям'ёй, Уладзімірам Макарэвічам і Паўлам Гірыловічам вярнуўся ў Асіповічы, дзе ўжо гаспадарылі акупанты.

Шведаў і намеснік начальніка станцыі Уладзімір Мікалаевіч Бандарэнка пачалі фарміраваць падпольную групу, у якую ўвайшлі Марыя Побыль, Фёдар Крыловіч, Міхаіл Няверка. У паравозным дэпо Шведаў сустрэўся з Арсеніем Няхаем і Аляксандрам Фёдаравічам Чайкоўскім. Дамовіліся дзейнічаць сумесна. Пачалі разбіраць станкі, хаваць дэталі, разносіць па дамах інструмент. (Пазней частка яго была перададзена ў партызанскую майстэрню.)

Бандарэнку перад самым прыходам акупантаў удалося па тэлефоне звязацца ў Гомелі з начальнікам Беларускай чыгункі Краснабаевым, які даў указанне разбурыць апаратуру цэнтральнага ўпраўлення вузла. Заданне паспяхова выканалі: дыспетчар Андрэй Андрэевіч Пазняк, стрэлачнікі Марыя Побаль, Аляксей Мікалаевіч Бандарэнка, дзяжурны па станцыі Міхаіл Мацвеевіч Няверка, яго жонка Серафіма Іванаўна, рабочыя Іван Дзмітрыевіч Лаўроў, Міхаіл Дзянісавіч Зінкевіч, вагаўшчык гандлёвай канторы Кірыл Фёдаравіч Брытвіч, хатняя гаспадыня Софія Андрэеўна Бандарэнка, рабочы вагоннага дэпо Аляксандр Фёдаравіч Купцоў. 29 ліпеня 1941 г. член падпольнай групы Марыя Побаль перад прыбыццём з Мінска дрызіны з гітлераўцамі перавяла стрэлкі ў тупік, у выніку чаго былі параненыя салдаты і афіцэры, якія ў ёй знаходзіліся. Восенню 1941 г. фашысты дазналіся, хто зрабіў гэту дыверсію, Марыя Побаль была арыштавана і расстраляна.

Стрэлачнік Міхаіл Няверка ў пачатку жніўня 1941 г. на пуцях Магілёўскага парка Асіповіч расшыў рэйкі і зрабіў крушэнне паравоза і 8 вагонаў.

Машыніст Аляксандр Сцяпанавіч Крот, калі фашысты пачалі бамбіць Мінск, вёў цягнік з боепрыпасамі на станцыю Калодзішчы. На станцыі Калядзічы састаў спынілі (Мінск цягнікоў не прымаў з-за бамбёжак). Пасля адбою паветранай трывогі састаў праследаваў на таварную станцыю. Яго паравоз прычапілі да эшалона з бежанцамі і адправілі ў Асіповічы. У Асіповічах Крот ужо не застаў кіраўніцтва станцыі, дэпо і іншых службаў вузла — яны эвакуіраваліся. Пасля невялікага адпачынку брыгаду Аляксандра Крата адправілі далей на Магілёў. Перасякаючы шашу Мінск — Бабруйск, паравозная брыгада ўбачыла на ёй нямецкія танкі. На станцыі Брыцалавічы даведаліся, што чыгунка на Магілёў ужо перарэзана акупантамі.

Каля станцыі Свіслач цягнік Крата быў абстраляны нямецкімі танкамі. Яны вярнуліся ў Брыцалавічы, дзе папалі пад бамбёжку, пакінулі там цягнік і пайшлі ў в. Малая Гарожа, а раніцай вярнуліся ў Асіповічы.

У Асіповічах ужо гаспадарылі акупанты. Жадання працаваць на чыгунцы людзі не праяўлялі і іх прымушалі гэта рабіць. Выклікалі ў камендатуру і машыністаў Крата, Чайкоўскага, начальніка аднаўленчага поезда Мікалая Шкатава, начальніка паштовага аддзялення Пазнякова. Папярэдзілі аб неабходнасці прыступіць да працы, у адваротным выпадку — расстрэл.

У ліпені 1941 г. у Асіповічах дзейнічалі ўжо дзве падпольныя групы.

Група ў паравозным дэпо пад кіраўніцтвам М.С.Шведава (машыністы Казімір Іосіфавіч Гіліцкі, Уладзімір Максімавіч Макарэвіч, Мікалай Іванавіч Патоцкі, электразваршчык дэпо Павел Антонавіч Гірыловіч, рабочы Пётр Фёдаравіч Дабрынеўскі, рэдактар раённай газеты «Калгасная праца» Яфім Цімафеевіч Свердлікаў, дастаўшчыца тэлеграм службы сувязі вузла Яўгенія Мікалаеўна Буднік, дырэктар сярэдняй школы Васіль Паўлавіч Сянюк, сакратар нямецкай гарадской управы Васіль Паўлавіч Ждановіч, жонка М.С.Шведава — Ніна Максімаўна Шведава, яго цесць пенсіянер Максім Сільвестравіч Макарэвіч, яго жонка хатняя гаспадыня Марфа Платонаўна, усяго 13 чалавек).

Група сярод рамонтнікаў паравознага дэпо пад кіраўніцтвам Аляксандра Фёдаравіча Чайкоўскага з 6 чалавек (Аляксандр Сцяпанавіч Крот, малады рабочы Мікалай Міхайлавіч Астаповіч, Аляксандр Віктаравіч Русаковіч, бацька А.Ф.Чайкоўскага — Фёдар Навумавіч Чайкоўскі, яго жонка хатняя гаспадыня Софія Васільеўна).

Дом № 4 на вуліцы Кароткай, дзе жылі Макарэвічы і Шведавы, стаў яўкай для сувязных падпольных груп і партызанскіх атрадаў. Сам Шведаў, працуючы машыністам, кіраваў падпольнымі групамі і асабіста здзяйсняў дыверсіі. За першыя месяцы акупацыі ён вывеў са строю 9 паравозаў.

На першых парах знаходжання на акупіраванай тэрыторыі ў падпольшчыкаў не было неабходнага вопыту. У многіх выпадках дыверсіі праводзіліся без папярэдняй падрыхтоўкі, без захоўвання канспірацыі.

М.М.Няверка.

А.С.Крот.

Я.М.Буднік.

В.П.Сянюк.

М.П.Макарэвіч.

М.С.Макарэвіч.

У канцы жніўня 1941 г. у Асіповічы да дырэктара сярэдняй школы № 1 Васіля Паўлавіча Сенюка прыйшла настаўніца Марыя Філімонаўна Сянюк, яго аднавяскоўка. У гутарцы яна паведаміла, што ў лесе каля Градзянкі размясцілася група савецкіх дэсантнікаў, а з імі партыйныя і савецкія работнікі раёна. У гэты ж дзень пазней да Сенюка завітаў дырэктар Градзянскай школы Васіль Іванавіч Іваноў і папрасіў Васіля Паўлавіча пазнаёміць з

В.І.Іваноў.

А.М.Іванова-Сакалова.

надзейным чыгуначнікам. Марыя Сянюк прысутнічала пры сустрэчы і прапанавала кандыдатуру машыніста Маркa Шведава. Неўзабаве Іваноў і Марыя Сянюк прыйшлі да Шведава на кватэру. Васіль Іванавіч паведаміў, што прыйшоў па даручэнні камандзіра дэсантнай групы Г.В.Пыжова. Яму патрэбны звесткі аб выніках дыверсіі (крушэнне поезда), учыненай іх групай у раёне станцыі Рудзенск. Шведаў згадзіўся дапамагчы і выканаў гэта заданне.

Аднойчы Шведаў сустрэўся з электрамеханікам службы сувязі вузла Пятром Куліковым, які паведаміў, што мае радыёпрыёмнік. Гэта паведамленне парадавала Шведава. Было вырашана выкарыстаць гэта для атрымання інфармацыі пра становішча на франтах і інфармавання насельніцтва.

У хуткім часе да Шведава прыйшла з Градзянкі жонка Васіля Іванова Аляксандра Мікалаеўна Іванова-Сакалова і перадала просьбу Пыжова прыйсці да яго на сустрэчу. Шведаў узяў з сабой Паўла Гірыловіча, Уладзіміра Макарэвіча і Аляксандра Крата і на фурманцы, у суправаджэнні Івановай-Сакаловай, паехаў на сустрэчу.

Падпольшчыкаў сустрэлі камандзір Асіповіцкай партызанскай групы старшыня райвыканкома Мікалай Піліпавіч Каралёў, камандзір дыверсійна-разведвальнай групы Пыжоў, другі сакратар Асіповіцкага РК КП(б)Б Рувім Голант, трэці сакратар Аляксей Шыёнак, начальнік Асіповіцкага міжрайаддзела НКДБ Мазур і начальнік Слонімскага гараддзела НКДБ Баранавіцкай вобласці Сцяпан Сумчанка. Шведаў паведаміў ім аб становішчы ў горадзе і аб тым, што ім арганізаваны дзве падпольныя групы: у паравозным дэпо і сярод рамонтнікаў.

На гэтай першай сустрэчы падпольшчыкі атрымалі падрабязны інструктаж і заданні, былі абмеркаваны спосабы, месцы і час сувязі. Павел Гірыловіч перайшоў у партызанскую групу, яго ваяўнічая нястрыманасць была несумяшчальна з падпольнай работай.

Васіль Паўлавіч Сянюк адзін з першых устанавіў сувязь з партызанамі, уліўся ў падпольную групу Марка Шведава і стаў яго намеснікам. Яго кватэра, што размяшчалася ў будынку школы, стала явачнай для партызанскіх сувязных. Сянюк падбіраў сярод навучэнцаў старшых класаў найбольш здольных, стойкіх і жадаючых дапамагаць у падпольнай рабоце. З ліку такіх быў Сяргей Важнік, які сабраў у насельніцтва грошай і аблігацый на суму 17 тыс. руб. Гэта праз 210-ы партызанскі атрад было перададзена ў фонд абароны СССР. Школьнікі ў ваколіцах горада збіралі і хавалі зброю і боепрыпасы.

У ліпені 1941 г. былы шафёр райвыканкома Махнач прывёз з Пухавіч Сенюку тол, складзены ў яшчыкі з-пад цвікоў. За толам прыехаў Васіль Іваноў. Узрыўчатку пагрузілі на фурманку, накрылі сенам і посцілкай, і Іваноў адвёз яе ў Градзянку.

У пачатку жніўня 1941 г. стварылася трэцяя падпольная група пад кіраўніцтвам Уладзіміра Бандарэнкі і яго намесніка Андрэя Андрэевіча Пазняка. У яе ўваходзілі 11 чалавек: стрэлачніца Марыя Іванаўна Побаль, дзяжурны па пуцях Міхаіл Мацвеевіч Няверка, яго жонка Серафіма Іванаўна, рабочы Іван Дзмітрыевіч Лаўроў, рабочы Міхаіл Дзянісавіч Зінкевіч, рабочы вагоннага дэпо Аляксандр Фёдаравіч Купцоў, стрэлачнік Аляксандр Мікалаевіч Бандарэнка (брат Уладзіміра), хатняя гаспадыня Софія Андрэеўна Бандарэнка і Кірыл Фёдаравіч Брытвіч.

У Асіповічах было створана кіруючае ядро падполля, у якое ўвайшлі М.Шведаў, В.Бандарэнка, А.Крот, А.Чайкоўскі, М.Няверка, А.Крыловіч.

Ядро было звязана з партызанскімі атрадамі, якія дзейнічалі не толькі ў Асіповіцкім, але і ў Чэрвеньскім, Бярэзінскім, Пухавіцкім і Старадарожскім раёнах Мінскай вобласці.

Падтрымліваць сувязь з партызанскімі атрадамі была справа цяжкая і

небяспечная. Ад кожнага сувязнога патрабаваліся не толькі смеласць, але і вынаходлівасць. Амаль кожны сувязны знаходзіўся на працы, яго адсутнасць маскіравалі, стваралі алібі. Сувязны Аляксандр Крот перад сустрэчай з партызанамі націраў руку едкім люцікам — атрымліваўся пухір, а падпольшчык урач П.С.Козак выдаваў вызваленне ад працы — гэта не выклікала падазрэння ў немцаў. Сувязныя забяспечваліся пасведчаннямі (аўсвайсамі), даведкамі.

У канцы 1941 г. тайная палявая паліцыя (ГФП) зрабіла вобыск на кватэры ў электрамеханіка чыгуначнага вузла сувязі Пятра Кулікова. Шукалі радыёпрыёмнік, але не знайшлі. Пасля гэтага вырашылі перанесці прыёмнік да Фёдара Крыловіча. Слухаць радыёперадачы па чарзе хадзілі толькі Марк Шведаў і Аляксандр Чайкоўскі. Па выніках перадач рыхтавалі лістоўкі, якія распаўсюджвалі сярод насельніцтва.

У 1942 г. барацьба падпольшчыкаў узмацнілася. У іх рады ўліліся новыя сілы чыгуначнікаў, медыцынскіх работнікаў, служачых лясной гаспадаркі, нямецкіх устаноў. Была арганізавана камсамольска-маладзёжная група пад кіраўніцтвам Фёдара Крыловіча, у якую ўвайшлі Сяргей Фаміч Важнік, Леанід Тарасавіч Верашчагін, Уладзімір Іванавіч Крукоўскі, Станіслаў Сямёнавіч Міхайлаўскі і Генадзь Баляслававіч Сакалоўскі (з канца ліпеня 1943 г. кіраўнік гэтай групы).

У раённай бальніцы стварылася група пад кіраўніцтвам урача Еўдакіі Піліпаўны Шамко і медсястры Веры Андрэеўны Гацко. У групу ўваходзілі таксама медсястра Ніна Яраславаўна Вельяоц, тэлефаністка канторы сувязі Зінаіда Францаўна Жданава і ўрач-стаматолаг Павел Аляксандравіч Мышкоўскі.

У чыгуначнай бальніцы спачатку дзейнічала падпольная група пад кіраўніцтвам урача Піліпа Сяргеевіча Козака, у яе ўвайшлі ўрачы Уладзімір Іванавіч Кіржыманаў, Марыя Пятроўна Свірыдава, фельчар Алена Фёдараўна Козак, медсястра Сусана Лукінічна Дубовік, хатнія гаспадыні Кацярына Мінаўна Арлова, Надзея Мікалаеўна Качкоўская.

У горадзе дзейнічала таксама падпольная група пад кіраўніцтвам Ганны Іванаўны Коваль, у якую ўваходзілі Іван Іванавіч Коваль, Сямён Лаўрэнцьевіч Чэхальскі, а таксама група пад кіраўніцтвам Іларыі Кліменцьеўны Радзівілавай, у якую ўвайшлі Зінаіда Міхайлаўна Астаповіч, Дзмітрый Якаўлевіч Кіпрычэнка, Ніна Мікалаеўна Санковіч.

У Асіповіцкім раёне стварыліся тры падпольныя дыверсійныя групы. У в. Градзянка пад кіраўніцтвам дырэктара сярэдняй школы сувязнога партызанскага атрада Васіля Іванавіча Іванова дзейнічала група, у якую ўвайшлі шэсць чалавек: ляснічы Пётр Назаравіч Гацко, інжынер Асіповіцкага ДЭУ-720 Аляксандр Назаравіч Гацко, хатняя гаспадыня Аляксандра Іванаўна Іванова-Сакалова, навучэнцы Венера Віктараўна Гурына, Ніна Піменаўна Мяжэнная.

Падпольная група ў в. Брыцалавічы складалася з 11 чалавек. У яе ўваходзілі ветфельчар Рыгор Нікіфаравіч Баразна, кіраўнік Іван Іванавіч Патапейка, брыгадзір калгаса «Чырвоная ніва» Арцём Іванавіч Патапейка, загадчык магазіна сельпо Фёдар Фаміч Патапейка, навучэнцы Зінаіда Пятроўна Сушко-Баразна, Марыя Вікенцьеўна Сташэўская-Крукава, Уладзімір Дзмітрыевіч Блінкоў, ляснік Вікенцій Іосіфавіч Сташэўскі, хатнія гаспадыні Сабіна Адамаўна Сташэўская, Ядвіга Іосіфаўна Сарока, служачы торфапрадпрыемства «Татарка» Андрэй Навумавіч Якавіцкі.

У в. Ліпень у падпольную дыверсійную групу з пяці чалавек пад кіраўніцтвам Марка Уладзіміравіча Кунько ўваходзілі Мікалай Паўлавіч Гоцін, землямер Аляксей Фёдаравіч Ганчаронак, ляснік Сцяпан Ільіч Хаткевіч і навучэнец Мікалай Дарафеевіч Ганчаронак.

Вясковыя падпольшчыкі вялі барацьбу з акупантамі да верасня 1943 г. Гітлераўцы напалі на след падпольшчыкаў, пачаліся пагромы і масавыя арышты. Былі расстраляны Венера Віктараўна Гурына, Ніна Піменаўна Мяжэнная, Уладзімір Дзмітрыевіч Блінкоў, Вікенцій Іосіфавіч Сташэўскі, Сабіна Адамаўна Сташэўская, Андрэй Навумавіч Якавіцкі. Быў павешаны Сцяпан Ільіч Хаткевіч. Астатнія падпольшчыкі ў складзе 15 чалавек пайшлі ў партызанскія атрады.

Да канца жніўня 1941 г. у раёне дзейнічала 10 самастойных партызанскіх груп. Іх баявая дзейнасць супраць нямецка-фа-

М.Ф.Лемеш.

шысцкіх акупантаў актывізавала прыток новых людзей.

Камандзір партызанскай групы М.П.Каралёў (атрады яшчэ не былі створаны) даручыў кіраўніку Асіповіцкага падполля Марку Шведаву звязацца з Міхаілам Фёдаравічам Лемешам, які працаваў у акупантаў загадчыкам аддзела Цэнтральнага гандлёвага таварыства (ЦГТ). У яго распараджэнні быў харчовы склад, якім кіраваў былы загадчык склада райспажыўсаюза Міхаіл Акімавіч Доўгаль.

У пачатку вайны Каралёў запрасіў да сябе Лемеша і прапанаваў яму падумаць аб супрацоўніцтве з партызанамі ва ўмовах акупацыі. Лемеш згадзіўся. Пасля строгага загаду акупантаў гараджанам вярнуцца і пачаць працаваць Міхаіл прыйшоў у Асіповічы і з дапамогай бургамістра Гараніна ўладкаваўся на працу загадчыкам рускага аддзела забеспячэння Цэнтральнага гандлёвага таварыства. Не паспеў Лемеш пазнаёміцца з людзьмі, як у жніўні 1941 г. быў арыштаваны тайнай палявой паліцыяй. Яго пасадзілі ў Бабруйскую крэпасць па падазрэнні ў прыналежнасці да каманднага складу Чырвонай арміі.

Пры дапамозе бургамістра Гараніна Лемешу ўдалося вырвацца з-пад арышту. Пасля вяртання дадому і аднаўлення на працы Лемеш пачаў весці падрыхтоўку па стварэнні падпольнай групы сярод работнікаў ЦГТ і харчовых складоў.

Фёдар Усцінавіч Верхаводка ў пачатку 1941 г. працаваў намеснікам дырэктара Збожжанарыхтоўкі. Пасля бамбёжак і пажараў у горадзе ён пакінуў сям'ю ў Асіповічах і падаўся на ўсход да лініі фронту. 25 чэрвеня 1941 г. Фёдар Усцінавіч і дырэктар Збожжанарыхтоўкі Канстанцін Максімавіч Вайцянкоў, брат першага сакратара Асіповіцкага РК КП(б)Б, вырашылі праз Градзянку і Бярэзінскі раён дабрацца да Магілёва. У Градзянцы яны сустрэлі другога сакратара Асіповіцкага райкома партыі Голанта і старшыню райвыканкома Каралёва.

Каралёў прапанаваў: «Па ўсёй верагоднасці, рабіць трэба так: Вайцянкоў застанецца з намі, а табе, Фёдар Усцінавіч, ехаць у Магілёў не трэба. Свой чалавек у горадзе нам вельмі неабходны. Вяртайся ў Асіповічы да сям'і. Уладкоўвайся на працу. За дапамогай у гэтай справе прапаную звярнуцца да Лемеша. Ён павінен дапамагчы табе ўладкавацца на працу».

Верхаводка вярнуўся ў Асіповічы. Трохі агледзеўшыся на жыццё ў новых умовах, праз некалькі дзён сустрэўся з Лемешам і расказаў яму аб сустрэчы з Кавалёвым і Голантам. Лемеш паведаміў, што загадчыкам рускага аддзела нарыхтовак ЦГТ, арганізаванага акупантамі, працуе Канстанцін Пармон, былы намеснік дырэктара леспрамгаса. Ён свой чалавек.

З дапамогай Пармона Ф.У.Верхаводка быў уладкаваны на пасаду загадчыка склада аддзела нарыхтовак. Так быў пакладзены пачатак арганізацыйнаму афармленню падпольнай групы Лемеша і Верхаводкі.

У цеснай сувязі з гэтай групай дзейнічалі і некаторыя іншыя патрыёты, у прыватнасці В.К.Малевіч, які да вайны працаваў крэдытным інспектарам Асіповіцкага аддзялення Дзяржбанка. Ён увайшоў у кантакт з партызанамі, і з іх дапамогай заняў пасаду загадчыка прыёмнага пункта па нарыхтоўцы збожжа і агародніны ў Градзянцы.

14 кастрычніка 1941 г. да Малевіча прыехаў старшыня калгаса з в. Палядкі Баранцэвіч і запрасіў у госці на Пакровы.

Малевіч прыняў запрашэнне і разам з Баранцэвічам на кані прыехаў у Палядкі, калі ўжо сцямнела. У пакоі знаходзілася 6—8 чалавек. Баранцэвіч пасадзіў Малевіча за стол, наліў стакан гарэлкі, а сам выйшаў з хаты. У хуткім часе ён вярнуўся, з ім быў старшыня райвыканкома Мікалай Піліпавіч Каралёў. Прысутныя ўсталі і павіталі госця. Ён падышоў да Малевіча, падаў яму руку і назваўся. Спачатку гутарка была стрыманай, не клеілася.

Каралёў пацікавіўся навінамі. Малевіч падрабязна расказаў аб тым, якія ўстано-

вы ў Асіповічах арганізаваны акупантамі, ахарактарызаваў асобных людзей, якія працавалі ў нямецкіх установах, паліцыі, аб праследаваннях савецкіх актывістаў, патрыятычна настроеных людзях. Адначасова спытаў: «Як можна пайсці ў партызаны, калі жыць тут стане немагчыма?» — «Зараз ісці ў партызаны заўчасна і марна. Працуючы ў акупантаў, можаш прынесці больш карысці».

Ю.І.Брытвіч да вайны працаваў фізруком сярэдняй школы, з пачаткам акупацыі — рахункаводам Градзянскай сельрады. Малевіч і Брытвіч добра ведалі адзін аднаго. Малевіч расказаў аб сустрэчы і размове з Каралёвым.

11 снежня 1941 г. Васіль Іваноў запрасіў Малевіча да сябе на кватэру, перадаў яму зводкі Саўінфармбюро, у якіх гаварылася аб разгроме немцаў пад Масквой, папрасіў размножыць і распаўсюдзіць сярод насельніцтва.

Па службовых справах Малевіч час ад часу ездзіў у Асіповічы, наведваў сваю сям'ю, знаёміўся з гарадскімі навінамі, а зводкі Саўінфармбюро, якія атрымліваў ад партызан, перадаваў К.Пармону, кіраўніку нямецкага банка Пятру Жуку, загадчыку склада аддзела нарыхтовак ЦГТ Фёдару Верхаводку і яго работніку Васілю Злобічу. Зводкі яны размнажалі, расклейвалі на платах, падкладвалі ў кішэні і паштовыя скрынкі.

У Градзянцы партызанамі былі разгромлены нафтабаза і паліцэйскі гарнізон. Для Малевіча аставацца ў Градзянцы стала небяспечна. Стрыечны брат Юльян Брытвіч пайшоў у партызаны і быў забіты ў баі. Яго жонку фашысты расстралялі. У маі прыёмны пункт у Градзянцы скасавалі. У гэты час да Малевіча прыйшоў былы старшыня калгаса з в. Асавок Астаповіч і перадаў партызанскае заданне: звязацца ў Асіповічах з загадчыкам склада былой Збожжанарыхтоўкі Верхаводкам і раздабыць соль для партызан.

У маі 1942 г. Малевіч з Градзянкі перабраўся жыць у Асіповічы. Пры дапамозе Верхаводкі і Злобіча, за хабар нямецкаму начальству, яго ўладкавалі на працу намеснікам загадчыка аддзела забеспячэння раённай управы, а ў ліпені перавялі на склад да Верхаводкі, на пасаду намесніка загадчыка рускага аддзела нарыхтовак.

Н.М.Шведава.

Соль для партызан даставалі праз рабочага-грузчыка Прахава. У прызначаны дзень цесць Шведава Максім Макарэвіч на сваім кані прыехаў на склад да Прахава, атрымаў ліпавыя дакументы, пагрузіў соль і адвёз яе па прызначэнні. Максім Сільвестравіч Макарэвіч, сталы чалавек, пенсіянер. Ён аказваў падпольшчыкам значную дапамогу, карыстаючыся сваім жыццёвым вопытам, даваў парады і рэкамендацыі аб спосабах дабычы інфармацыі ваеннага значэння і захоўвання канспірацыі. Жонка Максіма Сільвестравіча Марфа Платонаўна, была яго незаменнай памочніцай.

У чэрвені 1942 г., выконваючы даручэнне Каралёва аб сустрэчы з Лемешам, Шведаў паслаў да яго сваю жонку Ніну Максімаўну. Лемеш папрасіў перадаць Шведаву пра час і месца сустрэчы. Яна адбылася ў аддзеле забеспячэння ЦГТ. Лемеш і Шведаў дамовіліся карэкціраваць работу падпольных груп не толькі па справах вывазу прадуктаў, але і па пытаннях падрыўной работы. У хуткім часе пасля гэтай сустрэчы яны абодва былі на перамовах з Каралёвым. Пасля іх на інструкцыйнай гутарцы ў Каралёва пабываў і Васіль Малевіч.

За час, са жніўня 1941 г. па студзень 1943 г., на складах аддзелаў нарыхтовак, забеспячэння рускага аддзела ЦГТ арганізавалася падпольная група ў складзе 10 чалавек: Міхаіла Фёдаравіча Лемеша (кіраўнік), Фёдара Усцінавіча Верхаводкі, Міхаіла Акімавіча Доўгаля, Васіля Данілавіча Злобіча, Міхаіла Васільевіча Прахава, Васіля Казіміравіча Малевіча, Адама Ігнатавіча Каўрковіча, хатняй гаспадыні

І.Дз.Санковіч.

І.К.Патоцкі.

М.І.Патоцкі.

Софіі Фабіянаўны Шамінай, шафёра Фёдара Іларыёнавіча Горнага, Васіля Міхайлавіча Белаліпецкага.

У 1942 г. уключыўся ў барацьбу з ворагам дыспетчар паравознага дэпо Вітольд Вітольдавіч Шабуневіч, які меў доступ да нямецкіх дакументаў і забяспечваў падпольшчыкаў бланкамі пашпартоў, пропускаў, пасведчанняў (аўсвайсаў). Настаўнік нямецкай мовы Канстанцін Хрыстафоравіч Бабарыкін на атрыманых ад Шабуневіча бланках афармляў дакументы на нямецкай мове. Яны выкарыстоўваліся партызанскімі разведчыкамі для паездак у Мінск, Пухавічы, Бабруйск і перамяшчэння па раёне.

Уключыліся ў дыверсійную работу машыністы паравознага дэпо Іосіф Баніфацыевіч Ясевіч, Дзмітрый Мікалаевіч Сугака, Дзмітрый Піліпавіч Раманоўскі, касір станцыі Верайцы Марыя Севасцьянаўна Міхаіленка-Тарасік, рабочыя пякарні Алена Ігнатаўна Вайцянкова і Мікалай Данілавіч Бугор. Яны ўвайшлі ў групу паравознага дэпо пад кіраўніцтвам Шведава.

У гэты ж перыяд утварылася падпольная група ў банку пад кіраўніцтвам Пятра Жука. У яе ўвайшлі Сцяпан Станіслававіч Бабіцкі, Васіль Аляксандравіч Санковіч і нарыхтоўшчык з в. Лапічы Сяргей Віктаравіч Ломан. Пазней гэта група ўлілася ў склад групы ЦГТ пад кіраўніцтвам Лемеша, паколькі правядзенне фіктыўных аперацый па зняцці з рахункаў банка грошай без удзелу забеспячэнцаў было вельмі цяжкім, а часам немагчымым.

З ліку ўжо дзейнічаючых падпольшчыкаў былі ўтвораны падпольныя групы на вугальным складзе чыгункі пад кіраўніцтвам П.М.Насенкі і школьная пад кіраўніцтвам С.Ф.Важніка.

Адначасова ў горадзе дзейнічалі самастойна разведвальная група (рэзідэнтура) 1-га Беларускага фронту пад кіраўніцтвам памочніка ляснічага Івана Дзям'янавіча Санковіча, падпольная дыверсійная група Алены Вікенцьеўны Ліхадзіеўскай, якая выконвала заданні дэсантных спецгруп і партызанскіх атрадаў, што дзейнічалі ў паўднёвай частцы раёна.

Ядро кіраўніцтва Асіповіцкага падполля, што ўзначаліў Шведаў, кіруючыся загадамі камандавання 1-й Асіповіцкай партызанскай брыгады [пазней названай Ваенна-аператыўнай групай (ВАГ)] дапамагала ў баявой дзейнасці 161-й брыгадзе імя Р.І.Катоўскага Старадарожскага раёна, партызанскаму атраду «Полымя» Пухавіцкага раёна, спецгрупе НКУС СССР «Храбрацы» пад кіраўніцтвам А.М.Рабцэвіча, 752-му партызанскаму атраду пад камандаваннем В.І.Лівенцава. У канцы 1942 г., выконваючы ўказанне Каралёва, Шведаў у в. Камарына сустрэўся з камісарам 752-га атрада Дзмітрыем Аляксандравічам Ляпёшкіным і накіраваў яму для падтрымання пастаяннай сувязі з Асіповічамі Івана Кандратавіча Патоцкага і яго сына Мікалая. У 1943 г. пры пераходзе атрада Лівенцава ў Акцябрскі раён бацька з сынам пайшлі з атрадам Лівенцава. За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў барацьбе з гітлераўцамі, Іван Кандратавіч Патоцкі быў удастоены ордэнаў Чырвонага Сцяга і Айчыннай вайны І ступені. Яго сын Мікалай Іванавіч у адным з баёў з акупантамі быў паранены, трапіў у палон і загінуў у Бабруйскім канцлагеры.

У пачатку 1942 г. на вуліцы А.Крот сустрэў сакратара раённай управы Васіля Ждановіча. Крот і Ждановіч добра ведалі адзін аднаго. Працуючы сакратаром раённай управы, Ждановіч устанавіў сувязь з некаторымі супрацоўнікамі карных і адміністрацыйных органаў і перадаваў падпольшчыкам і партызанам інфармацыю аб іх дзейнасці.

У ліпені 1942 г. у дом № 4, на вуліцы Кароткай, да Шведавых і Макарэвічаў зянацку наляцелі жандары і паліцыя. У доме знаходзіліся Шведаў, Макарэвіч, Крот і Чайкоўскі. Іх арыштавалі і даставілі ў паліцыю.

Пратрымалі іх у камерах да раніцы. Па чарзе выклікалі на допыт, але, не маючы канкрэтных абвінавачанняў, урэшце адпусцілі. Выпадак з арыштам прымусіў падпольшчыкаў быць вельмі асцярожнымі і захоўваць канспірацыю.

Ад стрэлачнікаў Бандарэнкі і Няверкі Аляксандр Крот атрымліваў звесткі аб руху праз станцыю варожых эшалонаў, іх грузах, а таксама здзейсненых падпольшчыкамі ўзрывах, крушэннях, выведзеных са строю паравозах, вагонах і стрэлках і перадаваў іх у 210-ы партызанскі атрад, дзе яны ішлі ў Беларускі штаб партызанскага руху (БШПР). Ён жа перадаў партызанам план профілю чыгуначнага палатна на ўчастках Асіповічы — Мінск, Асіповічы — Слуцк, а таксама сабраныя машыністамі (у тым ліку Дзмітрыем Мікалаевічам Сугакам) звесткі аб размяшчэнні на гэтых участках дарогі нямецкіх дотаў і дзотаў.

М.Няверка ў жніўні 1941 г. ажыццявіў крушэнне ў Магілёўскім чыгуначным парку Асіповіч, вывеў са строю 8 вагонаў і паравоз, падарваў тры вагоны з гаручым. Па пяцьятыве і ўдзеле камсамольца М.Патоцкага была ўзарвана вышка механізаванай блакіроўкі, такім чынам надоўга быў паралізаваны рух паяздоў праз станцыю. Ён жа ўзарваў паравы кацёл і станкі ў вагонным дэпо. Стрэлачнік В.Бандарэнка 4 вагоны з нарабаванай гітлераўцамі маёмасцю накіраваў у тупік на вялікай хуткасці і разбіў іх. У студзені 1942 г. ён залажыў у крыжавіну стрэлкі чаравік, і 2 паравозы выйшлі са строю. Яго брат Аляксандр Бандарэнка паміж станцыямі Татарка і Ясень спаліў састаў з гаручым, які ішоў на фронт.

А.В.Ліхадзіеўская.

У канцы 1942 г. 210-м партызанскім атрадам пад камандаваннем Каралёва пры ўдзеле асіповіцкіх падпольшчыкаў на ўчастку чыгункі Пухавічы — Бабруйск было падарвана і пашкоджана звыш сотні вагонаў, выведзена са строю значная колькасць паравозаў.

Сяргей Важнік, працуючы па заданні падполля паліцэйскім, узарваў гармату на двары нямецкай камендатуры. У.Макарэвіч узарваў водаправод, які ішоў ад вадакачкі на рэчцы Свіслач да станцыі Асіповічы, чым на доўгі час паралізаваў запраўку паравозаў вадой.

Ф.Крыловіч прымаў зводкі Саўінфармбюро і перадаваў іх падпольшчыкам для распаўсюджвання. За час работы ў падполлі ён адправіў у партызанскі атрад больш за пяцьдзесят чалавек. Актыўнае распаўсюджванне лістовак праводзілі маладзёжныя групы падпольшчыкаў Іларыі Радзівілавай, Ганны Коваль, Фёдара Крыловіча, Мікалая Патоцкага, Сяргея Важніка і інш. Яны расклейвалі лістоўкі на сценах, платах, засылалі ў нямецкія ўстановы і закладвалі ў пісьмовыя сталы, падкладвалі ў кішэні гітлераўскім начальнікам і іх пасобнікам.

Барацьба падпольшчыкаў з акупантамі не праходзіла без страт. Першы ўдар па падполлі быў нанесены палявой паліцыяй і службай бяспекі (СД). У ліпені 1942 г. была арыштавана і расстраляна Ганна Коваль. Яе маладзёжная група распалася. У жніўні быў арыштаваны і расстраляны падпольшчык Кірыл Фёдаравіч Брытвіч з групы Бандарэнкі. У лістападзе арыштаваны і расстраляны Мікалай Міхайлавіч Астаповіч з групы Чайкоўскага, ліквідавана маладзёжная група Іларыі Радзівілавай. Яе члены Зінаіда Міхайлаўна Астаповіч,

Дзмітрый Якаўлевіч Кірпічэнка, Ніна Мікалаеўна Санковіч і сама Радзівілава былі арыштаваны і расстраляны.

Падпольная група Лемеша працягвала дзейнічаць. Харчы са складоў вывозілі толькі Прахаў з Макарэвічам. Фіктыўныя накладныя выпісвалі Лемеш і Малевіч. Па накладных тавары адпускаліся для крамаў ЦГТ у вёсках Зборск, Ліпень і інш. Падпольная група Лемеша падтрымлівала сувязь з партызанамі не толькі праз Максіма Макарэвіча. Адной з актыўных сувязных была Марыя Іванаўна Гацура з в. Восава. У 1941 г. пасля бою ў в. Восава яна дапамагала параненым чырвонаармейцам, хавала іх у хляве, разводзіла па дамах, перавязвала і лячыла як магла. Яна разам з сынам Косцем збірала і перадавала партызанам зброю.

Падпольная група Лемеша і Верхаводкі не замыкалася ў дапамозе толькі аднаму партызанскаму атраду. Яны мелі сувязь з 752-м партызанскім атрадам В.І.Лівенцава, 2-й Мінскай брыгадай «Полымя» Я.Ф.Філіпскіх, 161-й брыгадай імя Катоўскага.

Пастаяннымі сувязнымі падпольнай групы Лемеша і Верхаводкі з 1-й Асіповіцкай партызанскай брыгадай і 216-м атрадам, размешчаным у паўднёвай частцы Асіповіцкага раёна, акрамя Максіма Макарэвіча былі жыхары в. Цэль Васіль Рыгоравіч Злобіч, Іван Піліпавіч Злобіч, ляснік з в. Смык Сцяпан Ільіч Хаткевіч, жыхар в. Забалоцце Міхаіл Бабін і калгасніца з в. Свіханава Марыя Войцехаўна Кулікова.

У пачатку чэрвеня 1943 г., калі нямецкія войскі рыхтавалі наступленне на ўсходнім фронце, асіповіцкія падпольныя кіруючыя органы звярнуліся да моладзі чыгуначнага вузла актывізаваць падрыўную работу. Маладзёжныя групы – радыёвузла Леаніда Верашчагіна, гарадская Мікалая Патоцкага, школьная Сяргея Важніка, вугальнага склада Яфіма Свердлікава, паравознага дэпо Пятра Насенкі — актыўна распаўсюджвалі зводкі аб паспяховых дзеяннях Чырвонай арміі, прымалі ўдзел у вывадзе са строю варожых паравозаў, рухомага саставу і парушэнні сувязі.

Частыя дыверсіі ў Асіповічах вельмі турбавалі гітлераўцаў. У верасні 1943 г. карныя органы нанеслі ўдар па Асіповіцкім падполлі. Былі арыштаваны і расстраляны ўдзельнікі дыверсій з 29 па 30 ліпеня машыніст Казімір Іосіфавіч Гіліцкі, загадчык магазіна в. Лапічы Васіль Адамавіч Гоман, урач Уладзімір Іванавіч Кіржыманаў.

Тэрор акупантаў паставіў перад кіраўніцтвам падполля пытанне аб неабходнасці эвакуацыі з горада падпольшчыкаў. У атрад імя І.В.Сталіна пайшлі з сем'ямі М.Шведаў, М.Макарэвіч, М.Няверка, М.Прахаў, А.Бандарэнка. Асобна пайшлі П.Ф.Дабрынеўскі, Дз.М.Сугака,

Ф.Крыловіч з баявымі сябрамі (першы злева).

М.Дз.Зінкевіч, А.С.Крот, Н.Я.Вельяоц, В.А.Працко, Е.Ф.Шамко. У партызанскі атрад імя К.К.Ракасоўскага ў той жа час пайшлі С.І.Дубовік і А.І.Арлова. Пакінулі горад і ўліліся ў партызанскі атрад імя П.К.Панамарэнкі Я.Ц.Свердлікаў, Ф.І.Горны, М.А.Доўгаль. Усяго пакінулі горад 25 чалавек. Для падрыўной работы ў Асіповічах засталіся з групы Шведава — В.П.Сянюк, Д.П.Раманоўскі, І.Б.Ясевіч, В.В.Шабуневіч, К.Х.Бабарыкін, М.С.Міхаленка-Тарасік, С.В.Ломан; Бандарэнкі — А.Ф.Купцоў, А.А.Пазняк; Лемеша — Ф.У.Верхаводка, В.М.Белаліпецкі, А.І.Каўрковіч, П.К.Жук, В.Д.Злобіч, В.А.Санковіч, С.Б.Бабіцкі; Крыловіча — В.І.Крукоўскі, С.С.Міхайлаўскі, Г.Б.Сакалоўскі; Шамко — П.А.Мышкоўскі; Козака — Ф.С.Козак, Е.Ф.Козак, М.П.Свірыдава і група рамонтнікаў на чале з А.Ф.Чайкоўскім у складзе А.В.Русаковіча, Ф.Н.Чайкоўскага, С.В.Чайкоўскага. Усяго 27 чалавек.

Гітлераўскай контрразведцы і карным органам удалося навесці значны ўдар і дэзарганізаваць у Асіповічах падпольную барацьбу супраць акупантаў, але знішчыць яе зусім яны не змаглі.

У далейшым пад кіраўніцтвам Васіля Паўлавіча Сенюка Асіповіцкае падполле працягвала барацьбу. На працягу кастрычніка — лістапада 1943 г. у паравозным дэпо пры ўдзеле С.Важніка было выведзена са строю 3 паравозы, у ноч на 24 лістапада ў горадзе ўзарваны паравы млын. Пасля гэтай дыверсіі Важнік пайшоў да партызан.

Падпольшчыкі з групы Лемеша Ф.Верхаводка, В.Злобіч, В.Белаліпецкі і М.Клімовіч працягвалі аказваць матэрыяльную дапамогу партызанам.

У лютым 1944 г. зноў былі нанесены ўдары па Асіповіцкім падполлі. Карным атрадам Бішлера быў арыштаваны кіраўнік рускага акупацыйннага банка Пётр Жук. Падпольшчыкам Васілю Аляксандравічу Санковічу, Сцяпану Браніслававічу Бабіцкаму, Канстанціну Сцяпанавічу Пармону і яго сыну ўдалося пайсці ў партызанскі атрад (бацька і сын у адным з баёў з гітлераўцамі загінулі).

Асіповіцкія патрыёты, нягледзячы на панесеныя страты і цяжкія ўмовы дзейнасці ў тыле ворага, аказалі вялікую дапамогу партызанскім атрадам у барацьбе з ворагам, нанеслі значны матэрыяльны ўрон акупантам на станцыі Асіповічы, наблізілі перамогу савецкага народа над фашызмам.

У барацьбе з гітлераўскімі захопнікамі праявілі патрыятызм, выключную стойкасць і ненавісць да ворага падпольшчыкі В.М.Белаліпецкі, У.М.Бандарэнка, С.Ф.Важнік, Ф.У.Верхаводка, К.І.Гіліцкі, Ф.І.Горны, М.А.Доўгаль, Г.І.Коваль, А.С-.Крот, Ф.А.Крыловіч, У.І.Крукоўскі, П.Т.Казлоўская, М.Ф.Лемеш, А.В.Ліхадзіеўская, В.К.Малевіч, М.М.Няверка, М.І.Патоцкі, І.К.Радзівілава, М.С.Шведаў і інш.

Многія падпольшчыкі загінулі ў барацьбе з акупантамі. Іх імёны назаўсёды застануцца ў памяці ўдзячных нашчадкаў.

У.П.Зорын.

ЗВЕСТКІ АСІПОВІЦКАГА ПАДПОЛЬНАГА РАЙКОМА ЛКСМБ АБ ПАДПОЛЬНЫХ ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫХ КАМСАМОЛЬСКІХ АРГАНІЗАЦЫЯХ РАЁНА ПА СТАНЕ НА 15 СНЕЖНЯ 1943 г.

№ п/п	Место нахождения подпольной организации	К-во организаций, охвачено членов	Фамилия, имя, отчество секретаря организации	С какого времени работает организация	Кол-во подпольщиков-одиночек	Если организация прекратила работу, то по каким причинам
1	2	3	4	5	6	7
1	гор. Осиповичи	3 /12	Важников Сергей			
2	д. Каменичи	1 /2	Новик Мария	с ноября 42 г.		
3	д. Трактор	1 /6	Казаченок Николай	ноябрь 42 г.	1	С янв. 1943 г., часть членов погибла, часть ушла в партизаны

1	2	3	4	5	6	7
4.	д. Лочин	1 /3	Лапатка Елизавета Александровна	декабрь 42	—	Один член погиб
5.	д. Погорелое	1 /3	Кравченко Софья Ивановна	ноябрь 42	—	Ушли в партизаны в январе 1943 г.
6	д. Лозовое	1 /3	Кубарь Екатерина Ефремовна	февраль 43	—	Ушли в партизаны в мае — апреле 1943 г.
7.	д. Орча	2 /8	Гончаренок Алексей Федорович; Готин Николай Павлович	декабрь 42 май 43	-	Ушли в партизаны в мае и июле 1943 г.
8.	д. Химное	1 /2	Пилецкий Семен	декабрь 42	—	Ушли в партизаны
9.	м. Липень	1 /3	Пилецкая Зина	июнь 43	—	Ушли в партизаны в сентябре— октябре 1943 г.
10.	д. Татарковичи	1 /3	Пикула Константин Календович	январь 43	—	Ушли в партизаны в мае — июне 1943 г.
11.	пос. Лапицкого воен. городка	1 /3	Лукашевич Галина Иосифовна	август 43	1	
12.	д. Уборок	—	Чепулянец Мария Антоновна	ноябрь 43	1	
13.	д. Кобылянка	1 /4				

Секретарь Осиповичского подпольного РК ЛКСМБ В.Куликов

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4210. Воп. 1. Спр. 6. Л. 65.

Падрыхтаваў У.І.Лемяшонак.

Ясень змагаецца

З успамінаў І.А.Кавецкага, былога падпольшчыка в. Ясень

У жніўні 1941 г. нямецкая пяхота пры падтрымцы артылерыі пачала наступленне на вёскі Асяродак і Заельнік, дзе абарону трымалі кавалерысты дывізіі, якая рэйдавала па тылах ворага. Ішлі крова-пралітныя баі. Савецкія воіны мелі вялікую патрэбу ў харчаванні. Загадчык жывёлагадоўчай фермы нашага калгаса Канстанцін Антонавіч Станішэўскі забіў некалькі кабаноў, наліў бакі малака, і ўсё гэта камсамолец Лёва Сямашка даставіў чырвонаармейцам. Гэты смелы ўчынак юнага патрыёта быў яго першым баявым хрышчэннем.

Восенню 1941 г. я разам з радыстам Мікалаем Чарняўскім і Лёвам Сямашкам устанавілі радыёпрыёмнік «Піянер» і прымалі зводкі Саўінфармбюро, якія перапісвалі і распаўсюджвалі сярод жыхароў нашай і навакольных вёсках.

У лясах каля в. Ясень засталося шмат зброі і боепрыпасаў, якія былі пакінуты Чырвонай арміяй. Камсамольцы Л.К.Сямашка, І.І.Сідаровіч, У.А.Сідаровіч, У.В.Сідаровіч, Альшанік, А.Р.Карчэўскі, А.І.Ждановіч хадзілі па лесе і балоце і збіралі зброю і боепрыпасы. Потым усё схавалі на гарышчы школы пад мохам і пяском. Аўтаматныя і рэвальверныя патроны мы ссыпалі ў шкляныя бутэлькі і закапалі ў школьным хляве.

Міхаіл Луцкі перадаў мне дзесяць вінтовак і адну самазарадную, а А.А.Чарняўскі — кулямёт. Зброю і боепрыпасы мы выдавалі тым, хто ішоў у партызаны. Дарэчы, у партызаны прымалі толькі тых, хто прыходзіў са сваёй зброяй.

У 1941г. і 1942 г. шмат савецкіх воінаў выходзілі з акружэння і ўцякалі з фашысцкага палону. Жыхары в. Ясень давалі ім харчаванне, адзенне, начлег. У гэтай справе

асабліва вызначыліся сем'і П.Курыльчыка, К.А.Станішэўскага, І.А.Кавецкага, А.Р.Сідаровіча, С.Р.Сідаровіча, М.А.Сідаровіча, І.А.Курыльчыка, І.С.Альшаніка, І.Сідаровіча і інш. Гэтыя сем'і з'явіліся касцяком Ясенскага падполля.

У в. Ясень стварыліся добрыя ўмовы для падпольнай работы. Жыхары вёскі цалкам падтрымлівалі партызан і дапамагалі ім. У 1941 г. на калгасным полі быў добры ўраджай, які сабралі сумесна. Усей работай па ўборцы ўраджаю кіраваў Мікалай Сідаровіч. Ён зрабіў усё магчымае, каб хлеб і жывёла не дасталіся немцам.

У верасні 1941 г. Павел Сяліцкі праз Зелянеўскага перадаў мне газету «Правда», у якой была надрукавана пастанова ЦК ВКП(б) «Аб арганізацыі барацьбы ў тыле германскіх войскаў». Гэта пастанова натхніла падпольшчыкаў в. Ясень. Яны ўзяліся больш энергічна за справу развіцця барацьбы супраць фашысцкіх захопнікаў.

Летам 1942 г. у нашу вёску прыйшла група партызан з атрада В.І.Лівенцава пад камандаваннем баявога і рашучага Васіля Пяткова. Лёва Сямашка прывёў іх у школу, дзе я тады жыў. У складзе групы былі М.І.Семісалаў, сакратар Бабруйскага падпольнага райкома камсамола, ён хутка завяваў давер і павагу моладзі в. Ясень, Крысаў і І.Караленка. Семісалаў параіў мне падабраць групу моладзі для падпольнай работы і даў парады па яе правядзенні. Я паказаў яму спіс праверaных маладых патрыётаў з поўнай іх характарыстыкай у складзе: Лёва Сямашка, Кацярына Альшанік, Уладзімір Альшанік, Ганна Белая, Іван Сідаровіч, Зоя Станішэўская, Андрэй Ждановіч, Ганна Ждановіч (в. Ясень); Мікалай Давыдоўскі, Шышкевіч, Прыгоцкі, Уладзімір Васільевіч Сідаровіч, Міла Сідаровіч, Уладзімір Аляксандравіч Сідаровіч (саўгас імя Леніна); Валянціна Мірошнікава (г. Бабруйск).

Восенню 1942 г. у в. Ясень да Лізаветы Пракопаўны Станішэўскай прыбыў сакратар Бабруйскага падпольнага райкома КП(б)Б Д.М.Лемяшонак з мэтай арганізацыі камуністаў для барацьбы супраць захопнікаў. Л.П.Станішэўскай было даручана стварыць і кіраваць падпольнай групай у в. Ясень, а мне кіраваць работай сярод моладзі. У хуткім часе Станішэўскай была створана такая група, у склад якой увайшлі: Станішэўская, І.А.Кавецкі, М.Н.Кавецкая, П.Курыльчык, А.Сідаровіч, К.А.Станішэўскі.

Л.К.Сямашка.

Аляксандру Сідаровічу даручылі арганізаваць падпольную групу ў г. Бабруйск. У яе ўвайшлі Сяргей Шальпякоў, Матрона Шальпякова, П.Кладаў і Магамедава. Гэта група перадавала партызанам зброю, медыкаменты, перапраўляла людзей у партызанскія атрады, распаўсюджвала лістоўкі і падпольную літаратуру.

Л.П.Станішэўская стварыла ў г. Бабруйск яшчэ адну падпольную групу, куды ўвайшлі: Антаніна Баркоўская, Барыс Пятровіч Баркоўскі, Марыя Іванаўна Леановіч, Маліноўская. Разведданыя, якія атрымлівалі ад гэтай групы, перадаваліся праз Л.П.Станішэўскую Д.М.Лемяшонку ці М.І.Семісалаву.

Восенню 1942 г. мы адправілі ў партызанскі атрад добра ўзброеную групу моладзі ў складзе А.І.Ждановіча, Ніны Ждановіч, Івана Сідаровіча, Арсена Лёлі. Гэта былі першыя партызаны з в. Ясень. На жаль, Андрэй Ждановіч загінуў у 1943 г. пры мініраванні шашэйнай дарогі, а Ніна Ждановіч загінула ў час бою пры разгроме гарнізона ў в. Кассё.

Андрэй Ждановіч захаваў дакументы і пячатку Ясенскага сельсавета, якімі мы карысталіся з пачатку вайны для афармлення сваіх дакументаў. Потым пячатка была схавана і маці Андрэя перадала яе пасля вызвалення раёна ад акупантаў у сельсавет.

Зімой 1942 г. навісла пагроза над сем'ямі Івана Сідаровіча і Арсена Лёлі, і яны былі вывезены ў партызанскую зону. Пазней у час фашысцкай блакады былі забіты гітлераўцамі.

Добра працавалі групы нашых падпольшчыкаў на чыгунцы, у якую ўваходзілі У.І.Альшанік, Я.Альшанік, Н.М.Белая, П.Курыльчык; у саўгасе імя Леніна —

Шышкевіч, І.П.Давыдоўскі, М.В.Сідаровіч. Пад уплывам яе агітацыі дзве вялікія групы ўласаўцаў перайшлі са сваёй зброяй на бок партызан.

Мне ўдалося пазнаёміцца з настаўнікам літаратуры Ясенскай НСШ В.Д.Грышановічам і прыцягнуць яго да падпольнай работы. Грышановіч аказваў вялікую дапамогу групе моладзі на чале з Лёвам Сямашкам. Ён дастаўляў са склада станцыі Ясень соль для партызан, перадаваў разведданыя, распаўсюджваў лістоўкі і літаратуру.

Былі ў нас і правалы. У выніку здрадніцтва двух уласаўцаў, якія па дарозе ў партызаны збеглі, былі арыштаваны Шышкевіч і Прыгоцкі. Яны мужна перанеслі ўсе катаванні і не выдалі ніводнага з падпольшчыкаў. Зімой 1943 г. Шышкевіча расстралялі ў бабруйскай турме. Гэта быў першы правал у нашай арганізацыі. Ён шмат чаму нас навучыў, мы сталі больш асцярожнымі.

Летам 1942 г. у нашу вёску прыйшла група падрыўнікоў на чале з П.Кажушкам з партызанскага атрада Лівенцава. На чыгунку іх павёў наш падпольшчык К.А.Станішэўскі. Мы з нецярпеннем чакалі вынікаў. Вялікі выбух, які прагучаў нарэшце, абвясціў аб баявых дзеяннях партызан і падпольшчыкаў у ваколіцах в. Ясень. Эшалон гітлераўцаў паляцеў пад адхон. Падрыўныя групы партызан вадзілі на чыгунку акрамя К.А.Станішэўскага таксама А.Сідаровіч, П.Курыльчык, У.Альшанік. На чыгунцы каля в. Люлева 43 варожыя эшалоны былі скінуты пад адхон рознымі групамі партызан.

Вясной 1943 г. пры дастаўцы партызанам зброі, бінокляў, медыкаментаў, якія былі прывезены з Бабруйска на кватэру Мілы Сідаровіч, У.В.Сідаровіч і А.Р.Сідаровіч натрапілі на варожую засаду і былі схоплены гітлераўцамі. На допытах у бабруйскай турме У.В.Сідаровіч усю віну ўзяў на сябе і гэтым выратаваў ад смерці сваіх таварышаў. Ён і З.Шамаметава пасля катаванняў былі расстраляны. У З.Шамаметавай засталося трое малых дзяцей, якіх узялі да сябе і выхавалі сем'і падпольшчыкаў.

Гэта быў другі правал у нашай арганізацыі. Вельмі шкада Валодзю Сідаровіча, гэтага вельмі здольнага важака моладзі, бясстрашнага падпольшчыка. Пасмяротна ён быў узнагароджаны медалём «За адвагу».

Намі было вырашана адправіць у партызанскі атрад Лівенцава нашых падпольшчыкаў Лёву Сямашку і Аркадзія Карчэўскага, якіх мы добра ўзброілі з нашых запасаў. Да вясны 1943 г. у Ясені засталася невялікая па колькасці, але маналітная падпольная група.

Трагедыя в. Ясень разыгралася тады, калі партызаны кавалерыйскага атрада Флегантава разгромілі ахоўны пункт немцаў на чыгунцы. Разам з партызанамі ў гэтай акцыі ўдзельнічалі і жыхары вёскі. Было забіта некалькі салдат, але двум удалося ўцячы. Яны і нарабілі бяды. Назаўтра прыехалі ў вёску гітлераўцы, сагналі ўсіх жыхароў у клуб. 45 мужчын і працаздольных жанчын адправілі ў Бабруйскі лагер. На станцыі Ясень расстралялі У.Сідаровіча і С.Альшаніка. У фашысцкі лагер трапілі таксама нашы падпольшчыкі В.Н.Альшанік і К.А.Станішэўскі. Праз тры дні прыбыў карны атрад. Ім каля калгаснай пуні былі расстраляны жыхары в. Ясень С.Р.Сідаровіч, М.А.Краўчанка, Іван Хроп, Міхаіл Чарняўскі, арыштавалі К.Сёмку, Вольгу Сёмка і Марыю Чарняўскую.

У Сёмкаў было двое дзяцей. Гітлераўцы выкінулі іх на вуліцу. Дзяцей забралі і выхавалі мясцовыя жыхары Альшанік і Краўчанка.

К.Сёмка, В.Сёмка і Сасім былі павешаны гітлераўцамі ў Татарцы. Астатнія жыхары в. Ясень разбегліся хто ў лес, хто па іншых вёсках. Паліцэйскія са станцыі Ясень пачалі рабаваць маёмасць. Ноччу пад аховай партызан жыхары вывозілі ў партызанскую зону ўсё, што засталося ад рабавання. Вёску Ясень гітлераўцы знішчылі, засталіся цэлымі толькі бальніца і некалькі дамоў. Немцы вырашылі бальніцу абсталяваць пад свой шпіталь. Яны зрабілі рамонт, пачалі завозіць мэблю і абсталяванне. Аб гэтым мы паведамілі партызан, і ў адну з начэй яны яе спалілі.

1-я Бабруйская партызанская брыгада да таго часу з Асіповіцкага раёна перадыслацыравалася ў Акцябрскі. Я прыйшоў да сакратара Бабруйскага падпольнага райкома партыі Д.М.Лемяшонка і

папрасіў узяць мяне ў партызанскі атрад. Але ён даў мне ўказанне працягваць працаваць легальна і трымаць сувязь з 1-й Бабруйскай брыгадай разам з Л.П.Станішэўскай праз падпольшчыкаў Бабруйска. У гэты час П.А.Курыльчык прапанаваў усёй нашай групе перайсці ў спецатрад № 309, якім камандаваў прысланы з-за лініі фронту былы старшыня нашага калгаса М.П.Самсонік, што і было намі зроблена.

З успамінаў Лізаветы Пракопаўны Станішэўскай, жыхаркі в. Ясень, былой партызанскай сувязной

Добра жылі жыхары в. Ясень перад вайной. Калгас упэўнена ішоў наперад. Летам 1941 г. меўся быць добры ўраджай. 21 чэрвеня адбыўся спецыяльны калгасны сход па пытанні ўборкі збожжа. Пасля даклада старшыні калгаса М.П.Самсоніка настрой быў прыўзняты, яго ўпэўненасць перадалася вяскоўцам, і яны разышліся па хатах у добрым настроі, кожны ўяўляў сваё месца ў бітве за ўраджай, прыкідваў, як лепей арганізаваць пад час уборачнай свае хатнія справы.

Ніхто з нас і не меркаваў тады, што ўжо назаўтра пытанне аб бітве паўстане не ў пераносным, а ў прамым сэнсе...

Надышлі чорныя дні акупацыі, але з першага дня нас ні на хвіліну не пакідала вера ў перамогу савецкага народа над праклятым ворагам. У чэрвені калгаснікі Ясеня чым маглі аказвалі дапамогу адступаўшым воінам Чырвонай арміі і акружэнцам, што прабіваліся да лініі фронту.

У трывозе прайшла зіма 1942 г. Вясной дзеянні партызан актывізаваліся, варожыя эшалоны паляцелі пад адхон. Каб зрабіць рух больш бяспечным, акупанты пачалі зганяць мірнае насельніцтва (у т.л. і 13-гадовых дзяцей) на ахову чыгункі. На 2—3 метры палатна ставілі па 1 мясцоваму жыхару, а на кожны кіламетр — па 1—2 сваіх салдат. Той, хто заўважаў партызан, павінен быў падняць трывогу і папярэдзіць фашысцкіх ахоўнікаў. Канешне ж, гэта было камічна, бо, заўважыўшы партызан, ніхто іх не «здаваў», а, наадварот, забяспечваў народных мсціўцаў неабходнай інфармацыяй. Так пачалася сувязь калгаснікаў з партызанамі.

Л.П.Станішэўская.

Да нас у дом першыя партызаны прыйшлі ў кастрычніку 1942 г. Натуральна, што гэта былі бабруйчане, паколькі да Бабруйска рукой падаць. Кіраўніцтва дыверсійнай групы 1-й Бабруйскай брыгады (узначальваў П.Кажушка) прапанавалі майму мужу, Канстанціну Антонавічу Станішэўскаму, стаць правадніком дыверсійнай групы, а мне — сувязной, і з гэтага моманту пачаўся для нас новы адлік часу.

Зрэшты, уся вёска жыла ў гэты час двайкім жыццём. Днём, калі прыязджалі гітлераўцы ці паліцаі, насельніцтва хавалася па дамах і жыццё замірала, але ноччу, калі вёску займалі партызаны, пачыналася поўнае небяспекі і барацьбы: праводзіліся сходы, чыткі савецкіх газет і лістовак, партызанам перадаваліся звесткі аб размяшчэнні акупантаў.

У студзені 1943 г. да нас прыехалі сакратар Бабруйскага падпольнага райкома партыі Д.М.Лемяшонак і член райкома М.І.Семісалаў. Яны прапанавалі ўдзельнічаць у пашырэнні падпольнай сеткі ў Бабруйску. Заданне было выканана, і ў горадзе з'явіліся дзве новыя явачныя кватэры. Удзельнічалі ясеньцы зімой і ў іншых партызанскіх акцыях. Вось адзін эпізод.

Штодня некалькі чалавек з вёскі ішлі на работу на чыгунку да будкі каля в. Люлева. Гітлераўцы, што былі на гэтым участку, многіх з іх ведалі ў твар. Партызаны вырашылі гэта выкарыстаць. У сярэдзіне лютага байцы з кавалерыйскай групы брыгады Флегантава далучыліся да вяскоўцаў і спакойна дайшлі да будкі, дзе разам з жыхарамі вёскі П.І.Белым,

В.Я.Сёмкам, І.Ф.Сідаровічам і У.А.Сідаровічам сякерамі засеклі 17 фашыстаў.

Гітлераўцы паднялі трывогу, калі ў будцы ўсё было скончана. Пачалася пагоня і перастрэлка, у якой І.Сідаровіч загінуў, а астатнія ўдзельнікі акцыі, захапіўшы зброю, уцяклі. У.Сідаровічу і С.Альшаніку было даручана папярэдзіць вяскоўцаў. На вялікі жаль, зрабіць гэтага яны не паспелі. Гітлераўцы акружылі Ясень і захапілі ўсіх мужчын, нават тых, хто працаваў у лесе і нічога аб здарэнні не ведаў. Усяго набралася 40 чалавек. Іх адвялі на чыгуначную станцыю Ясень. Тут жа пасля катаванняў Альшанік і Сідаровіч былі расстраляны. Астатніх адправілі ў Асіповічы, а потым у Бабруйскі лагер.

Праз некалькі дзён вёску зноў акружылі карнікі. Я паспела схавацца ў яме ў хляве. Усе схопленыя мужчыны былі тут жа расстраляны на калгасным двары, а жанчынам было прапанавана выдаць сем'і ўдзельнікаў забойства ў чыгуначнай будцы. Натоўп маўчаў. Тады карнікі прыгразілі забіць усіх. Жонкі В.Я.Сёмкі і І.Ф.Сідаровіча з малымі дзецьмі мужна назвалі самі сябе. Іх вывелі, пасадзілі на машыну, адвезлі на торфазавод «Татарка», дзе павесілі, астатнім жа прапанавалі бегчы ў бок балота даўшы над галовамі чаргу з кулямёта.

Пасля гэтага выпадку я з сям'ёй пасялілася на падсобнай гаспадарцы ў нашага сувязнога Уладзіміра Сідаровіча. 5 сакавіка 1943 г. да нас наведаўся Д.М.Лемяшонак. Ён даў указанні па далейшай рабоце і прапанаваў Валодзю з'ездзіць у Бабруйск па медыкаменты, куды той неўзабаве і адправіўся. У гэты час гітлераўцы ўчынілі арышты ўсіх падазроных у сувязях з партызанамі. 8 сакавіка я знаходзілася ў Сычкаве, дзе займалася пошукам солі для атрада, як у Ясень зноў наляцелі карнікі. Яны схапілі маю маці, дачку і сястру Валодзі ў якасці заложнікаў да той пары, пакуль ён не вернецца. Папярэджаны Валодзя прыехаў надвячоркам. Здавалася, усё павінна было скончыцца добра, бо разам з сувязнымі А.Сідаровічам і П.Курыльчыкам ён тут жа вырашыў ісці ў атрад. Хлопцы рушылі з вёскі, аднак па дарозе, непадалёку ад дома, напароліся на карнікаў. Курыльчыку ўдалося збегчы, а абоіх Сідаровічаў схапілі. Валодзя ўзяў ўсю віну на сябе — арыштаваных адпусцілі, але яго самога пасля катаванняў расстралялі ў турме.

У чэрвені 1943 г. мяне выклікаў для перагавораў былы старшыня калгаса камандзір спецгрупы М.П.Самсонік. Ён прыбыў з-за лініі фронту для арганізацыі разведкі ў тыле ворага. Я ведала яго як выдатнага арганізатара і патрыёта і таму згадзілася стаць разведчыцай. Не раз я бывала ў Бабруйску, назірала за рухам на чыгунцы, па яго заданні падрыхтавала кватэру ў Бабруйску для размяшчэння рацыі, а ў канцы таго ж года дапамагла радыстцы перайсці на захад рэспублікі...

Успамінаючы гады змагання, магу сказаць, што мае землякі — ясеньцы — не засталіся ў баку ад барацьбы з акупантамі. Некаторым, праўда, актыўна змагацца не дазвалялі здароў'е, узрост, іншыя важкія абставіны, аднак тыя, хто мог, актыўна процістаялі фашысцкай навале. Многія ў барацьбе загінулі, і лепшым помнікам ім будзе наша ўдзячная людская памяць.

Удзельнік бельгійскага Супраціўлення

Канстанцін Антонавіч Станішэўскі нарадзіўся ў 1888 г. З 1941 г. па 1943 г. удзельнік патрыятычнага падполля в. Ясень, сувязны 1-й Бабруйскай партызанскай брыгады. У сакавіку 1943 г. быў схоплены гітлераўцамі і пасаджаны ў Бабруйскі лагер, потым вывезены на катаржныя работы ў Францыю, адтуль збег у Бельгію, дзе прыняў удзел у бельгійскім руху Супраціўлення. Знаходзіўся ў брыгадзе рускіх партызан пры Бельгійскай партызанскай арміі ў Паўночнай Францыі. Пра гэта сведчыць і даведка, выдадзеная ў кастрычніку 1944 г. (захоўваецца ў Бабруйскім краязнаўчым музеі). У жніўні 1945 г. вярнуўся на Радзіму. Узнагароджаны медалём «За адвагу». Памёр у 1970 г.

Разведчыца Аня

«Сярод беларускіх партызан было шмат дзяўчат і жанчын, якія, падобна Ціне Слёзінай і Ані Коваль, не шкадавалі сябе дзеля разгрому ворага і вызвалення свайго народа ад фашысцкага іга, ішлі на верную смерць, здзяйснялі бессмяротныя подзвігі». Гэтыя радкі ўзяты з кнігі «На акупіраванай зямлі» былога камандзіра 99-й партызанскай брыгады імя Гуляева У.К.Якавенкі.

Яскравым прыкладам самаадданай мужнасці ў суровыя дні нямецка-фашысцкай акупацыі можа служыць дзейнасць асіповіцкай падпольшчыцы і партызанскай разведчыцы Ганны Іванаўны Коваль.

Нарадзілася Ганна Іванаўна ў 1924 г. у Кіеве ў сям'і рабочага. У 1933 г. разам з бацькамі пераехала ў г. Асіповічы. Вучылася ў чыгуначнай школе № 36, перад вайной закончыла 9 класаў.

З жахам і гневам глядзела Аня на спалены горад, на дэспатызм фашысцкіх улад, якія насаджалі нечалавечы так званы «новы парадак». Яна часта хадзіла ў в. Кабылянка Градзянскага сельсавета, дзе ўжо ў 1941 г. дзейнічала невялікая партызанская група. Пачынаючы са жніўня ў кошыку з ягадамі і грыбамі яна дастаўляла зводкі Саўінфармбюро, лістоўкі.

Да канца 1941 г. з надзейных сяброў і родзічаў стварылася камсамольска-маладзёжная група, у якую ўваходзілі Аня Коваль, Іван Коваль, Лёня Урбановіч, урач Уладзімір Кіржаманаў, Іван Наркевіч, Ігар Чарэпка, лейтэнант Гоўсей і інш.

Падпольшчыкі сабралі радыёпрыёмнік і па вечарах слухалі паведамленні з Масквы, запісвалі іх, а раніцай у выглядзе лістовак распаўсюджвалі па горадзе, пераказвалі вусна сябрам і знаёмым, разам са сваімі сябрамі-падпольшчыкамі дапамагалі ваеннапалонным уцякаць з лагера, даставалі пропускі, збіралі медыкаменты, боепрыпасы.

К.А.Станішэўскі.

Г.І.Коваль.

У чэрвені 1942 г. Аня сустрэлася з партызанамі групы Аляксея Кудашова і стала разведчыцай — сувязной атрада. Дзякуючы ёй і яе таварышам у партызанскі атрад уступілі радыётэхнік Саша Батурлін (Батарын), Іван Коваль, Саша Колас, Георгій Цыганкоў і інш. Аня дастаўляла ў партызанскі атрад медыкаменты, якія перадаваў ёй урач У.І.Кіржаманаў, зброю, боепрыпасы, соль, разведданыя аб дыслакацыі нямецкіх войскаў у Асіповічах і ваколіцах горада, звесткі аб праходзячых праз горад эшалонах і г.д. З атрада дастаўляла ў Асіповічы зводкі Саўінфармбюро, лістоўкі і газеты.

Аня пасябравала з настаўніцай з в. Паршчыха Цінай Слёзінай, якая была развед-



Brigade de Partisans Russes, affiliee a l'[illegible] de [illegible]
actuellement a St Amand Thermal Nord France

Les Chefs de la Brigade de Partisans Russes, centre du recensement des citoyens soviétiques pour le departement du Nord, certifient que le citoyen soviétique Станишевский [illegible] s'est fait recenser auprès de la Brigade/en vue du repatriement

St Amand Thermal le octobre 1944

Pour le chef de la Brigade
LT-Colonel Schuschin

Chef de l'Etat Major
LT Lavrinenko

Копія даведкі, выдадзенай К.А.Станішэўскаму.

чыцай партызанскага атрада імя Варашылава.

У канцы ліпеня 1942 г. Аня і Ціна вырашылі вывезці з Асіповіч партызанам сабраныя падпольшчыкамі горада станковы кулямёт, гранаты, боепрыпасы, радыёпрыёмнік, медыкаменты. Усё гэта яны пагрузілі на падводу і пад вечар паехалі ў бок в. Карытнае. Пры выездзе з горада іх падводу спынілі немцы. Аня і Ціна аказалі супраціўленне, але сілы былі няроўныя, іх схапілі і перадалі тайнай палявой паліцыі.

Камандаваннем партызанскага атрада былі зроблены захады для выратавання Ані і Ціны. У г. Асіповічы быў пасланы на разведку партызан Васіль Гарачых. Аднак гітлераўцам праз свайго агента ўдалося даведацца пра намер партызан. Яны спрабавалі ўзяць Васіля Гарачых жывым, але мужны патрыёт аказаў супраціўленне, пры гэтым ён забіў чатырох фашыстаў і ўзарваў сябе і акружыўшых яго немцаў гранатай.

Два тыдні днём і ноччу вёўся допыт Ані і Ціны ў засценках тайнай палявой паліцыі. Гітлераўскія каты пускалі ў ход самыя вытанчаныя катаванні. Але мужныя патрыёткі вытрымалі ўсё і не выдалі сваіх сяброў. Не атрымаўшы ад Ані і Ціны ніякіх звестак, 13 жніўня 1942 г. іх расстралялі.

Не суджана было дажыць да перамогі і брату Ані Івану Ковалю. Разам з партызанамі групы разведкі пад камандаваннем С.С.Сумчанкі зімой 1944 г. ён быў акружаны гітлераўцамі ў леснічоўцы Сташэўскага і ў няроўным баі загінуў смерцю героя. Хутка памёр і бацька Ані, і толькі яе маці дажыла да дня перамогі.

У студзені 1943 г. гітлераўскія карнікі спалілі в. Паршчыха разам з усімі яе жыхарамі, дзе загінула і 5-гадовая дачка У.Слёзінай Надзея.

С.Л.Чахольскі.

Партызанскі фронт

Ідучы з усакінскіх лясоў у Асіповіцкі раён, група Каралёва 6 ліпеня 1941 г. на левым беразе Бярэзіны сустрэлася з камандаваннем 122-й стралковай дывізіі на чале з генерал-маёрам Нікіціным, дапамагла чырвонаармейцам папоўніць харчовыя запасы і рушыла ў свой Асіповіцкі раён.

У в. Гарожа зазірнулі да ляснічага, падсілкаваліся і скіраваліся да пасёлка Воля. Па дарозе, у Асаўку, сустрэлі Фёдара Казачэнку, прапанавалі яму стаць партызанскім сувязным. Да гэтай работы прыцягнулі і старшыню калгаса Антося Габрыельчыка з Пагарэлага, іншых патрыётаў. Адначасова арганізавалі збор зброі і боепрыпасаў, што засталіся пры адступленні часцей Чырвонай арміі.

Базу вырашылі размясціць у лесе паміж Дуброўскім раз'ездам і Яноўкай (пазней базу атрада перанеслі ва ўрочышча Расоха). У хуткім часе да групы далучыўся загадчык ваеннага аддзела Асіповіцкага РК КП(б)Б І.Б.Гнядзько, дырэктар шклозавода «Нёман» І.В.Крэнь, старшыня Ліпеньскага сельсавета Р.Ф.Рудзько. Пачалася работа па арганізацыі баяздольнага партызанскага атрада.

У жніўні пры дапамозе сувязнога Габрыельчыка ўстанавілі сувязь з групай з 17 чырвонаармейцаў пад камандаваннем Дзмітрыя Барысавіча Шрэйна, якая імкнулася перайсці лінію фронту. Дамовіліся, што байцы будуць самастойнай групай партызан, размешчанай у Пагарэльскім лесе, але падпарадкаванай Каралёву. Потым звязаліся з добра падрыхтаванай і ўзброенай дэсантнай групай капітана Р.В.Пыжова, закінутай у тыл ворага камандаваннем Заходняга фронту. Гэта група абрала месцам сваёй стаянкі ўрочышча Чорная града, акружанае балотамі, недалёка ад в. Макаўе.

Першая баявая аперацыя партызан была праведзена на чыгунцы. На перагоне Талька — Верайцы ўзарвалі пуць, цягнік сышоў з рэек. Затым трыма групамі пад кіраўніцтвам Сумчанкі, Мазура і Пыжова ўзарвалі мост цераз р. Свіслач.

Вырашылі наведаць Градзянку, дзе ўзначальваў паліцыю актыўны нямецкі служка Кубіц. Разведку ў пасёлку правялі Каралёў, Гнядзько і Шыёнак. Яны прайшлі каля казармы, зафіксавалі пасты і агнявыя кропкі, і толькі пры выхадзе з Градзянкі іх апазналі, але пагоня за партызанамі не ўдалася. Раніцай, калі выганялі скаціну на пашу, партызаны, прыкрытыя хмарай пылу, незаўважанымі падышлі да паліцэйскай казармы, знялі вартавога, узялі станковы

кулямёт, піраміду са зброяй, знішчылі абяззброены гарнізон, а потым вылілі газу на Градзянскай нафтабазе.

На пачатак 1942 г. у раёне дзейнічалі 10 партызанскіх груп. Узброеную барацьбу з ворагам вялі групы начальніка Гушасдора НКДБ БССР М.В.Баранава, Асіповіцкага райза Р.Н.Баразны (16 чалавек), калгасніка сельгасарцелі «Трактар» Казачэнкі, калгасніка А.С.Анісімчыка (17 чалавек), старшыні калгаса «Пралетарый» І.І.Воўчака (8 чалавек), землямера Бярэзінскага райза Шагойкі (17 чалавек), ваеннаслужачага Пачтарова (37 чалавек) і інш.

У лясах, размешчаных на поўдні раёна, дзейнічалі партызанскія групы Анісімава, Альхаўца, Крылова (Некрылова), якія перараслі ў атрады імя Кірава і імя Пархоменкі.

Прыйшла зіма 1941 — 1942 гг. Партызаны ўпарадкоўвалі зямлянкі, клапаціліся аб нарыхтоўцы прадуктаў. Адначасова былі створаны рэйдавыя групы, якія па раёне праводзілі разведку размяшчэння воінскіх часцей, паліцэйскіх гарнізонаў, падбіралі і вербавалі сувязных і разведчыкаў. У гэты ж час устанавілі пастаянную сувязь з клічаўскімі партызанамі.

У канцы 1941 г. прыйшлося партызанам зведаць першае нападзенне гітлераўцаў на лагер, які размяшчаўся на Чорнай градзе. Партызаны пад камандаваннем Галакціёнава з боем выйшлі праз балота. У перастрэлцы загінуў Марк Поўзнер — былы студэнт інстытута гісторыі. Немцы ж, баючыся акружэння, перасталі праследаваць. Галакціёнаў размясціў байцоў у летнім лагеры Дзмітрыя Шрэйна, дзе, на жаль, лёгкія збудаванні не ўкрывалі людзей ад марозу.

Зіма прывяла за сабой і іншыя цяжкасці. Сляды на снезе дакладна правяраліся гітлераўцамі. Насельніцтву строга забаранялася хадзіць у лес. Стала дрэнным забеспячэнне. Сувязныя з вялікай рызыкай, цаной жыцця падтрымлівалі кантакт з партызанамі.

У лік падазроных у сувязях з партызанамі трапіў жыхар Пагарэлага партызанскі сувязны Антось Паўлавіч Габрыельчык. Фашысты яго арыштавалі і пасля здзекаў утапілі ў палонцы на р. Свіслач.

Зімой 1941 — 1942 гг., каб больш паспяхова весці барацьбу з партызанамі, у в. Яноўка, па суседству з партызанскім лагерам, акупанты размясцілі гарнізон. Камандаванне партызан вырашыла яго ліквідаваць. Чакалі моманту. Урэшце сувязны паведаміў, што ўвесь гарнізон выехаў рабаваць насельніцтва. Партызаны на чале з Каралёвым і Сумчанкам на дарозе, па якой павінны былі вяртацца гітлераўцы, зрабілі засаду. Але нечанака ім паведамілі, што гарнізон вярнуўся ў Яноўку па іншай дарозе. Трэба было хутка мяняць тактыку. У гэты час на дарозе з'явіўся невялікі сялянскі абоз. На санях ляжалі мяхі з грузам, прызначаныя гітлераўцам. Каралёў смела выйшаў на дарогу і павітаўся з мужыкамі. Яны пазналі былога старшыню райвыканкома. Астатнія партызаны таксама выйшлі на дарогу. Схаваўшы зброю, яны расселіся па падводах і паехалі.

Гітлераўцы ў Яноўцы размясціліся ў доме сельсавета і старасты і ў гэты час пайшлі п'янстваваць, а варту даручылі вясковым падлеткам. Па сігнале С.Сумчанкі, партызаны напалі на хаты, дзе размясціліся гітлераўцы, і ў кароткі час разгромілі гарнізон.

29 сакавіка 1942 г. на базе груп Каралёва, Шрэйна і Пыжова быў афармлены 210-ы партызанскі атрад імя І.В.Сталіна. Камандзірам яго стаў Каралёў, начальнікам штаба Сумчанка, камісарам Мазур. Пазней у сувязі з выклікам Мазура ў Клічаўскі раён камісарам быў прызначаны Шыёнак. Атрад першапачаткова налічваў 48 партызан, у хуткім часе вырас да 176 чалавек.

Партызаны працягвалі весці актыўную барацьбу не толькі з рэгулярнымі нямецкімі часцямі, паліцэйскімі гарнізонамі, але з асобнымі пасобнікамі акупантаў і здраднікамі. Вось адзін прыклад.

Да вайны ў мястэчку Ліпень жыў немец Лютэр. У перыяд акупацыі ён узначальваў вялікі гарнізон, здзекаваўся над людзьмі, стараўся заслужыць хвалу акупантаў. Партызаны празвалі яго «Старой лісой» і вырашылі ліквідаваць. План аперацыі распрацаваў Сумчанка.

10 красавіка 1942 г. на ўскраіне Ліпеня з'явіліся конныя партызанскія разведчыкі і адкрылі беспарадкавую стральбу. Лютэр падняў гарнізон па трывозе, умацаваў яго гітлераўцамі з пагарэльскага гарнізона, пусціўся ў пагоню і натрапіў на засаду. У

час бою немцы і паліцаі панеслі вельмі вялікія страты, але Лютэра ў ліку забітых партызаны не знайшлі, яму ўдалося ўцячы.

Пасля вяртання ў лагер зноў пачалі думаць, як знішчыць здрадніка. Начальнік разведкі І.Стэльмах прапанаваў свой план. Заданне павінны былі выканаць Марк Кунько і Уладзімір Галакціёнаў. На досвітку, у лесе, далёка ад партызанскага лагера, Кунько і Галакціёнаў пераапранулiся ў жаночую вопратку, узялі кашы з прадуктамі і адправіліся ў Ліпень. Да вечара яны прабылі на базары, затым прайшліся каля камендатуры і падышлі да дома Лютэра. Толькі каля поўначы ў доме запалілі святло. Галакціёнаў кінуў у акно гранату. Паднялася трывога, але партызанам удалося знікнуць.

Праз некалькі дзён Зіна Сушко, якая працавала ва ўправе сувязной, паведаміла, што Лютэр цяжка паранены і адпраўлены ў шпіталь.

Пасля гэтага ў Ліпені была праведзена яшчэ адна дыверсія. У суправаджэнні Зіны Сушко Марк Кунько пранік у казарму і залажыў міну. Выбух прагрымеў вечарам, загінула больш як дваццаць фашыстаў, а Марк Кунько і Зіна Сушко захапілі ва ўправе неабходныя дакументы і грошы і прыйшлі ў атрад.

Пасля гэтага выбуху гітлераўцы ўчынілі ў мястэчку масавы расстрэл мясцовых жыхароў, у тым ліку яўрэйскай нацыянальнасці. Кіраўніцтва партызан вырашыла адпомсціць акупантам. У мястэчка Ліпень паслалі партызана Блінова з заданнем: уступіць у паліцэйскі атрад гарнізона і «сумленнай» службай заваяваць давер. Бліноў паспяхова спраўляўся з заданнем, перадаваў партызанам паведамленні аб намерах ворагаў.

У шасці кіламетрах ад Ліпеня, у густым лесе, размясцілася в. Бозак, у якую часта заходзілі партызаны на адпачынак. У пачатку ліпеня 1942 г. сюды завітаў С.Сумчанка з групай партызан. Бабулю, якая пачаставала яго абедам, ён папрасіў дапамагчы: «Раніцай пойдзеш у Ліпень на базар і будзеш расказваць, што шасцёра п'яных партызан спяць у тваім хляве». Жанчына не пагаджалася: «Баюся. Даведаюцца аб гэтым паліцэйскія і заб'юць вас». Сумчанка пераканаў, і яна пайшла. Навіна хутка трапіла да немцаў.

У хуткім часе калона паліцэйскіх і немцаў рушыла ў Бозак. Сумчанка да гэтага часу ўжо размясціў засаду. Як толькі калона перайшла мост, партызаны ўдарылі па ёй. Гітлераўцы разгубіліся і, не паспеўшы арганізаваць абарону, кінуліся бегчы, аднак уцячы ўдалося нямногім. У гэтым баі быў паранены і Бліноў. Яму давялося вярнуўся з партызанамі ў атрад.

Актыўнасць партызан не давала пакою акупантам. На досвітку яны акружылі партызанскі лагер. Часавыя перадавых пастоў завязалі з імі перастрэлку. Аднак М.Каралёў вырашыў лагер не здаваць, а заняць кругавую абарону, і фашысты, працягваючы наступаць, сустрэлі арганізаванае супраціўленне. Панёсшы вялікія страты, яны вярнуліся ў Асіповічы.

Але ненадоўга. У жніўні 1942 г. для барацьбы з партызанамі была кінута стралковая дывізія, якая накіроўвалася на фронт. У Градзянцы размясціўся штаб. Партызаны ўлічылі гэту акалічнасць, і калі праз тры дні праціўнік уварваўся ў партызанскі лагер, там былі толькі пустыя шалашы: народныя мсціўцы змянілі месца дыслакацыі. Раз'юшаныя фашысты ўзарвалі лагер, а на дошцы каля штаба ў Градзянцы напісалі брахлівае паведамленне: «Забіта 900 бандытаў і 300 захоплена ў палон». У час правядзення гэтай карнай аперацыі фашысты затрымалі ў лесе, а пасля павесілі некалькі нявінных калгаснікаў.

З ліпеня 1942 г. сумесна з 210-м атрадам імя І.В.Сталіна пачалі дзейнічаць у раёне партызанскія атрады В.А.Ціхаміра-ва і В.І.Лівенцава. Атрады з красавіка па жнівень пусцілі пад адхон 18 эшалонаў, ліквідавалі каля трох тысяч гітлераўскіх салдат і паліцэйскіх.

У ваенным гарадку Лапічы спынілася нямецкая вайсковая часць. Яна пастаянна арганізоўвала паборы, здзекавалася над мясцовым насельніцтвам. У гэтым дапамагаў ёй і паліцэйскі гарнізон. Партызаны вырашылі расквітацца з немцамі. У ноч на 10 жніўня 1942 г. яны пачалі наступленне на ваенны гарадок Лапічы. Першая група на чале з Каралёвым падходзіла з боку в. Азярышча па дарозе Асіповічы — Лапічы. Другая, якая ўключала атрад Ціхаміра-ва, наступала на Жорнаўку, і была абавязана ў абумоўлены час

1. Учитывая большие заслуги тов.Сумченко перед Родиной, народом и партией Ленина – Сталина, поставить вопрос перед командованием о посмертном представлении тов.Сумченко к присвоению звания Героя Советского Союза.

2. В каждом отряде и подразделении помимо общего боевого плана завести специальный боевой счет «Месть за смерть тов.Сумченко».

3. Отрядам и подразделениям, у которых этот специальный боевой счет «Месть за смерть тов.Сумченко» будет наибольшим — присваивать звание имени Сумченко.

4. Создать из лучших боевых партизан в отрядах и подразделениях охотничьи группы мстителей за смерть тов.Сумченко, в задачу которых должно входить уничтожение командного состава гитлеровцев.

5. Среди коммунистов и комсомольцев на партийно-комсомольских собраниях обсудить данное решение, широко осветить работу и деятельность тов.Сумченко в тылу врага как пример для каждого коммуниста и комсомольца и на основе этого еще более поднять боеспособность коммунистов и комсомольцев, а также всего личного состава отрядов и подразделений.

6. О ходе обсуждения данного решения и проводимых на основе этого мероприятий информируйте РК партии специальными донесениями и сообщением в политдонесении.

Секретарь Осиповичского подпольного РК КП(б)Б Войтенков

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1350. Воп. 1. Спр. 152. Л. 52.

З ПРАТАКОЛА № 1 ЗАКРЫТАГА ПАРТЫЙНАГА СХОДА 214-га ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА

16 студзеня 1944 г.

СЛУШАЛИ: Постановление бюро Осиповичского подпольного РК КП(б)Б от 12.1.44 года о смерти тов.Сумченко Степана Сергеевича.

Зачитал постановление и сделал информацию о смерти тов.Сумченко тов.Подгайнов.

Высказались тов.Пинчук М.С., Бакун М.Г., Оликевич А.Л., Тютюн И.Я., Гончаронок С.Н.

ПОСТАНОВИЛИ:

1. Постановление РК КП(б)Б принять к повседневному руководству и претворению в жизнь всех указаний, мобилизуя весь личный состав отряда на усиление ударов по немецко-фашистским мерзавцам.

2. Провести траурное собрание со всем личным составом отряда, на котором осветить весь боевой путь и заслуги перед Родиной т.Сумченко С.С. и трех разведчиков отряда — Борозны М.А., Коваля И. и Бородавки И.

3. Организовать в каждой роте по одной охотничьей группе по охоте за башкеровцами и их боевые дела заносить на специальный боевой счет «Месть за смерть тов.Сумченко».

4. Разведке отряда в связи с потерей лучших разведчиков... усилить работу в изучении противника и предоставлении полных сведений...

Председатель собрания Бакун
Секретарь Пинчук

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1350. Воп. 1. Спр. 152. Л. 61—64.

ПА СТАРОНКАХ РУКАПІСНАГА ЧАСОПІСА «ЗА РОДИНУ» 215-га ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА ІМЯ У.І.ЛЕНІНА

№ 1. 1943 г.

СЛАВА ПОГИБШИМ ЗА РОДИНУ

...Партизаны, погибшие на поле боя в жестоких схватках с врагом, останутся навеки прославленными героями. Родина-мать не забудет своих сыновей и дочерей, освободивших ее от фашистской нечисти, завоевавших честь и свободу в неравных боях, сложивших свои головы во славу отчизны нашей. Наши товарищи и друзья Змачинская Софья Васильевна, старая партизанка, бесстрашная дочь Родины, не щадила своих сил и умения, она помогала многим гражданам, лечила детей, стариков и старух, била фашистских извергов, подрывала вражеские эшелоны, автомашины, рвала рельсовые пути и жгла мосты. Такой была Софья Васильевна Змачинская в сердцах многих. Честь и слава героине, дочери любимой Родины партизанке Змачинской.

Подрывник партизан Гончеронок Михаил Дорофеевич, бесстрашный друг и товарищ семьи нашей, последний его эшелон, спущенный под откос, задушил несколько десятков негодяев.

Разведчик Стерлягин Василий Иванович героически погиб на боевом посту, он не сдался живым, бил до последнего патрона наседавших негодяев и геройски погиб.

Боец Васильев Николай Петрович, будучи раненным, не отставал от своих товарищей, в рельсовой войне, прикрывая их от вражеского дота, был сражен пулей врага.

Честь и слава Вам, дорогие наши товарищи. Ваши подвиги и дела навеки остались в сердцах наших. Мы мстим беспощадно за ваши жизни проклятым злодеям, фашистским холуям и приспешникам и будем мстить до полной победы. Презрение и смерть фашистским гадам.

Н.Баранов

НАШ БОЕВОЙ СЧЕТ

Ознаменование юбилея комсомола и 26-й годовщины Великого Октября партизаны нашего отряда встречают с хорошими показаниями. 24/X-43 г. комсомольская группа партизан под командованием тов. Сухоплюева пустила под откос вражеский бронепоезд. В этой диверсии отличились тт.Сурака В. и Петровский Ф.

17/X-43 г. группа под командованием тов.Яценко А.С. уничтожила паровоз и 4 вагона с техникой врага. Отличились тт.Луровской и Русакович.

25/X-43 г. группа под командованием ком. взвода тов. Шунько Н.Г. подорвала эшелон. В этой операции проявили себя тт.Лунин, Неверовский, Рябов, Ермольчик.

Партизаны и партизанки! Берите пример с этих товарищей.

Политрук 1-й роты Козловский В.Ф.

№ 2. 1944 г.

ВЕЧНАЯ СЛАВА ДОРОГОМУ ТОВАРИЩУ

13/XII-43 г., выполняя ответственное задание на вражеских коммуникациях, погиб героической смертью наш лучший товарищ и друг, бесстрашный командир Александр Герасимович Алешкевич. Вечная слава дорогому товарищу.

Многие эшелоны и автомашины не дошли к назначенному месту, несущие смерть и разорение нашему народу, от рук бесстрашного патриота, сына белорусского народа, полного ненависти и гнева к фашистским извергам.

Знаменателен счет Александра Герасимовича. Он, как и подобает сыну отчизны нашей, на славу поработал на благо нашего народа. Беларусь не забудет своего сына, и мы, партизаны, вдохновленные делами нашего друга, будем, как и он, мстить проклятым злодеям за тебя, наш Саша, за родную Беларусь нашу, и не пожалеем сил и жизни своей.

Лицевой счет Александра Герасимовича содержит: подорванных эшелонов 7, уничтожено паровозов 7, разбито вагонов 43, платформ 11, автомашин 8, убито при диверсиях и ранено солдат и офицеров противника 653, убито лошадей 102 шт.

Вечная слава герою!

Смерть и проклятие фашистским извергам.

Память герою.

Н.В.Баранов

№ 4 (5). 23 лютага 1944 г.

ПАМЯТИ ДРУГА

9 февраля 1944 года при выполнении задания пал смертью храбрых молодой патриот, комсомолец, белорусский партизан Варивончик Константин Михайлович. Косте только 19 лет. Свои молодые годы он посвятил борьбе за освобождение белорусского народа от фашистских извергов.

Уже с 1942 года 17-летним юношей он вступил в ряды партизан. В совершенстве изучив подрывное дело, Костя был одним из боевых диверсантов. Никакие препятствия не останавливали его в выполнении боевого долга. Много вражеских эшелонов нашли себе могилу на белорусской земле от руки отважного партизана.

Личный боевой счет Варивончика Константина в борьбе с фашизмом содержит прекрасные боевые подвиги. Пущено под откос 7 вражеских эшелонов с живой силой и техникой врага, подорвано 2 моста. Он участник засады по уничтожению полицаев-грабителей. Вражеская пуля оборвала цветущую жизнь нашего боевого товарища. Память о Косте мы навсегда сохраним в своих сердцах. За жизнь своего друга мы уничтожим сотни проклятых мерзавцев.

Ив. Ж.

№ 6. 1944 г.

МАСТЕРСКАЯ БОЕПИТАНИЯ

Каждый из наших партизан часто проходит мимо землянки, в которой слышны стук молотков, пение походного кузнечного горна, звуки пил по железу и плавные звуки рубанка. Это партизанская ремонтная мастерская оружия. Когда бы вы ни зашли, вы всегда увидите человека в военной рубашке с пилой или молоточком в руках возле своего заветного столика, на котором прикреплены двое тисков. Это начальник боепитания тов. Яценко... Он делает со своим помощником тов. Башмаковым такие виды оружия, как автоматы системы ППШ. Один уже готов, второй заканчивают. А сколько отремонтировано винтовок, изготовлено взрывателей. Тов. Яценко и тов. Башмаков любят свою работу... Недалеко от них работает столяр тов. Герасимчик А., он скромен, вежлив. Все знают его прекрасно сделанные ложи для винтовок, автоматов и пулеметов. Он их изготовил 44 шт. А сколько минных ящиков и другого вида столярной работы. В боепитание идут не только с ремонтом оружия, но и несут в ремонт посуду, точить ножи, делают зажигалки. А к тов. Яценко несут и часы. У них в коллективе нет отказа, всегда сделают и сделают качественно. Данный коллектив во главе с тов. Яценко заслуживает внимания со стороны командования.

ЗАБОТА О ЛЮДЯХ

...Работа наших медиков резко отличается от работы в мирных условиях. Здесь нет светлых палат, операционных, нет аптек и т.д. Все в лесу в землянке с минимальным количеством медикаментов, в них ощущается большой недостаток.

После проведения боевых операций поступают тяжело раненные бойцы. Несмотря на все эти трудные условия, мы видим, что коллектив наших медицинских работников успешно справляется с поставленной задачей. На глазах у нас прошло немало тяжело раненных товарищей через санчасть, которые выздоровели и снова вступили в строй. Это тов. Генделев, Быченок, Сучако Д., Бондарев, Журавлев, Путин. Накануне выздоровления тов. Петровский, Ф.Требушевский, Андриевич Г. Это благодаря заботе, опыту и знаниям наших врачей и их помощников.

Часто появляются инфекционные заболевания, гриш, чесотка. На все это быстро реагируют наши медработники, и мы видим, что инфекция не имеет массового распространения. Тщательный ежемесячный медицинский осмотр всех бойцов. Через 10 дней проводят осмотр работников кухни. Все это предупреждает распространение всех видов болезней. Благодаря

инициативе коллектива мы имеем свой лазарет, в наших условиях неплохой. Хорошее питание больных и ласковый материнский уход. Систематически проводятся беседы об оказании скорой помощи, об инфекционных заболеваниях и состоянии санитарии в палатках. Хорошо работает и баня, где нужно отметить хорошую работу нашего старичка тов. Кондратовича.

В окружающих нас селениях нет медицинских работников. Своей прямой обязанностью наши медработники считают оказание медпомощи мирным гражданам. Были случаи, когда они вырывали из рук смерти людей. В деревню Л. привезли женщину, у которой уже не было пульса. Выехали врачи. Женщина спасена... В местечке Г. умирал ребенок. Его спасли от смерти. У партизана Сучак Д. ребенок сломал ножку. Благодаря вмешательству врача он уже здоров. Десятки людей вылечили от чесотки, гриппа, воспаления легких. Проведена проверка санитарного состояния многих гражданских лагерей с целью предупреждения заболеваний. Теплота, любовь своего народа чувствуется в работе наших мед. работников. Не один боец благодарит врачей Коллонтая В.Г., Коллонтай В.А., медсестру Шкутко Анну. Начальник санслужбы Коллонтай В.Г. ходит на боевые задания, имея на боевом счету 3 вражеских подорванных эшелона, подорванные автомашины и много других боевых дел.

В.Мурашов.

№ 7. 1944 г.

ПЕРЕДОВЫЕ ЛЮДИ НАШЕГО ОТРЯДА

В день 1 Мая мы отмечаем лучших людей нашего партизанского отряда. Даем их боевой счет, который они заполнили в своей борьбе с фашистскими извергами:

РАДИМИНОВИЧ Павел Павлович, командир 3-го взвода 2-й роты имеет 12 эшелонов, 8 автомашин, участник засады, 3 взорванных моста, 1 взорванная повозка.

НЕВЕРОВСКИЙ Вячеслав, ком. отделения 2-го взвода 1-й роты имеет 6 эшелонов, 4 моста, участник 2 засад и рельсовой войны.

СТЕЖКО Владимир, партизан 2-й роты 2-го взвода, имеет 4 эшелона, участник 2 рельсовых войн, 1 автомашина, 1 засада.

ШУНЬКО Николай, ком. 2-го взвода 1-й роты имеет 5 эшелонов, 3 моста и участник рельсовой войны.

ГЛЕБОВ Николай, 4 эшелона, уничтожение связи.

ЛОГОВСКОЙ Николай, имеет 3 эшелона, 2 повозки с фрицами, 1 мост и живьем пойман изменник родины.

СУХОПЛЮЕВ Михаил имеет 4 эшелона, 1 бронепоезд, 1 засада, 1 мост, участник рельсовой войны.

ДОВГАЛЬ Ольга — 3 эшелона, 1 повозка с фрицами.

ДОВГАЛЬ Мария имеет 2 эшелона, один из них взорван днем.

ПЕТРОВСКИЙ Федор имеет 4 эшелона, 4 автомашины и одна повозка с фрицами.

ДОВГАЛЬ Федор: 3 эшелона, 4 автомашины, 1 повозка, 1 мост, 1 засада.

ЯЦЕНКО Александр, начальник боепитания, изготовил сам 2 автомата и отремонтировал все виды оружия отряда.

БУДАЙ Николай, участник 2 рельсовых войн, участник по уничтожению связи 2 км, подорвано 2 эшелона, участник рельсовой войны.

Партизаны и партизанки, равняйтесь по передовым товарищам нашего отряда! Беспощадно мстите кровавым фашистам, пробравшимся на нашу советскую землю. Смерть извергам кровавого фашизма!

ОН МСТИТ

Стояли сильные январские морозы 1943 года, когда несколько десятков тысяч гитлеровской своры решили блокировать северную часть Осиповичского района с целью уничтожения партизанских отрядов и ограбления населения. Каждую ночь то там, то там вспыхивало огненное пламя горевших мирных деревень, днем были видны клубы дыма. Это фашисты жгли мирный народ и их родные дома.

Кровавая банда прибыла в дер. Гомановка, где также сожгли дома и живыми бросали в огонь семьи партизан.

Наш юный партизан Владимир Моисеевич Стежко видел своими глазами всю трагедию, созданную гитлеровцами. Его брат ушел в 1942 году в отряд. Об этом узнали фрицы. Они со-

жгли мать, 99-летнюю бабушку, 6-летнего брата. Володя с младшим братом, сестрой и отцом скрылись в лесу от кровожадного зверя. Вернувшись из леса, Владимир нашел пепел своей любимой матери, бабушки и малютки брата. В то время тов. Стежко было только 15 лет. Огромная внутренняя сила ненависти к подлым садистам возросла в целую бурю. Молодой патриот дальше не мог находиться дома, он решил мстить подлым убийцам своей семьи.

20 января 1943 года он уже с винтовкой в руках в рядах партизан... Первый его боевой подвиг в дозоре. Он со своим товарищем заметил двигавшихся немцев. Молодые патриоты произвели обстрел. Убили 1 фрица и 2 ранили. Он рвался на железную дорогу. Сразу его не пускали, жалея его молодости. Но он сказал: «Я пришел мстить». В октябре с группой товарищей сбрасывают под откос 2 вражеских эшелона, где убито 675 фрицев.

В январе и феврале Владимир минирует сам жел.-дор. полотно, где уничтожает еще 2 вражеских эшелона. Он участник 2 рельсовых войн, взорвал автомашину. Много других боевых дел у этого юного народного мстителя...

Командир 2-й роты И.П.Попов.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1350. Воп. 1. Спр. 165. Л. 4—6; Спр. 168. Л. 3, 9, 12—13, 15—16; Спр. 169. Л. 18—19; Спр. 170. Л. 4, 5, 10.

ДЫРЭКТЫЎНАЕ ПІСЬМО АСІПОВІЦКАГА ПАДПОЛЬНАГА РАЙКОМА КП(б)Б КАМАНДЗІРАМ І САКРАТАРАМ ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ПАРТЫЗАНСКІХ АТРАДАЎ АБ ЗРЫВЕ МАБІЛІЗАЦЫІ Ў ПРАФАШЫСЦКУЮ ТАК ЗВАНУЮ БЕЛАРУСКУЮ КРАЁВУЮ АБАРОНУ

26 сакавіка 1944 г.

6 марта 1944 года гитлеровский холуй, шуточный президент так называемой центральной Белорусской рады прохвост Островский издал приказ о мобилизации всего мужского населения на территории Белоруссии рождения 1908—1924 гг. Офицерский состав, согласно приказу, мобилизуется в возрасте до 58 лет, унтер-офицерский состав до 55 лет.

Приказ марионеточной белорусской рады вызван тем, что гитлеровская разбойничья армия, несущая невиданные потери в людях на советско-германском фронте, израсходовала свои людские резервы.

В связи с этим Гитлер, надеясь пополнить людские потери своей армии за счет населения еще находящихся под его гнетом территорий, приказал своему холую в Белоруссии — Островскому издать приказ о мобилизации белорусского народа, чтобы бросить его на фронт против своих братьев, борющихся против немецких захватчиков.

Чтобы обмануть, запугать или ввести в заблуждение наш белорусский народ, фашистская пропаганда распространяет наглую ложь о якобы проводимых Красной Армией в освобождаемых районах расправах с мирным населением, о каких-то зверствах и т.д.

Гитлеровское командование ведет агитацию за выход населения из лесов в деревни, устраивает некоторые поблажки для населения, показывает видимость хорошего обращения с населением и другие провокационные действия с целью обмана населения. Поддавшееся на эти провокации, вышедшее из лесов и находящееся в деревнях, селах и городах мужское население схватывается гитлеровцами и направляется на фронт, чтобы заменить белорусами уничтожаемых Красной Армией гитлеровцев.

Для срыва мобилизации, объявленной фашистской и белорусской радой, для разоблачения фашистских провокаций, направленных на обман и запугивание нашего народа, мобилизуйте все лучшие агитационно-пропагандистские силы из числа коммунистов, комсомольцев и беспартийного актива. С выделенными товарищами проведите инструктивное совещание по этому вопросу и ведите непрестанную политико-разъяснительную работу среди населения о сущности этой мобилизации, принимая все меры для срыва ее.

Лучших агитаторов посылайте в населенные пункты, расположенные вблизи гарнизонов, обеспечивая их при необходимости надлежащей охраной.

Содержанием всей политико-разъяснительной работы среди населения по этому вопросу должно быть: призыв населения к уклонению от мобилизации, приобретение вооружения и уход в партизанские отряды.

При проведении работы нацеливайте население на то, что не смогшие уклониться от мобилизации принимают все меры к тому, чтобы совместно с другими нашими людьми с получением оружия переходить на сторону Красной Армии и партизан.

Подберите наиболее надежных и преданных советской власти и партии людей среди подлежащих мобилизации, проведите с ними соответствующую работу с тем, что в случае невозможности для них уклониться от мобилизации, они, находясь среди мобилизованных, должны вести среди них разлагательскую работу на предмет перехода с оружием в руках на сторону Красной Армии или партизан. Поставьте перед подобранными вами товарищами вытекающие отсюда задачи, обяжите их надлежащими документами. Для выполнения этого пункта привлекайте уполномоченных О.О. Списки на подобранных вами людей представляйте в райком партии к 5 апреля текущего года.

Секретарь Осиповичского подпольного РК КП(б)Б Войтенков.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1350. Воп. 1. Спр. 156. Л. 250.

З ДАКЛАДНОЙ ЗАПІСКІ АСІПОВІЦКАГА РАЙКОМА КП(б)Б МАГІЛЁЎСКАМУ АБКОМУ КП(б)Б

Не раней за ліпень 1944 г.

В районе разграблено и уничтожено 99 колхозов, 99 молочно-товарных ферм с поголовьем 8000 голов (крупного рогатого скота), 99 овцеводческих и 99 свиноводческих ферм с поголовьем 16 500 штук. Колхозные постройки (скотные дворы, конюшни, складские помещения) в большинстве своем уничтожены.

Немецкие изверги сожгли 27 селений, до 1500 домов колхозников, полностью сожжен большой рабочий поселок завода «Октябрь».

До войны в Осиповичском районе насчитывалось населения 62 тыс. человек. По предварительным подсчетам в районе осталось населения около 40 тысяч. Больше 20 тысяч человек зверски замучено немецкими фашистами, угнано на каторгу в Германию и вывезено при отступлении немецких войск.

Сожжено в д. Возок 600 человек, среди них большинство детей и стариков. В д. Брицаловичи 435 человек, в д. Горожа 350 человек, в д. Лочин 230, в д. Осовок 212, в д. Маковье 175, в д. Викторово — 90, в д. Полядки — 80 человек.

16 средних школ, 5 в городе — 5 уничтожено. Неполных средних школ 11, начальных 45, большинство уничтожено. Из 5 больниц сохранились 2.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4210. Воп. 1. Спр. 5. Л. 9.

Падрыхтаваў У.І.Лемяшонак.

Вызваленне

Беларуская наступальная аперацыя пад кодавай назвай «Багратіён», праведзеная войскамі 1, 2, 3-га Беларускіх і 1-га Прыбалтыйскага франтоў у перыяд з 23 чэрвеня па 29 жніўня 1944 г., была адной з буйнейшых ваенных аперацый Чырвонай арміі ў мінулай вайне. Пераадольваючы супраціўленне ворага, войскі Чырвонай арміі пры актыўнай падтрымцы беларускіх партызан з тылу акружылі і разгромілі віцебскую і бабруйскую групоўкі гітлераўскіх армій «Цэнтр» і з 25 па 29 чэрвеня 1944 г. вызвалілі гарады Віцебск, Оршу, Магілёў, Асіповічы, Бабруйск, а 3 ліпеня — горад Мінск.

24 чэрвеня 1944 г. у 4 гадзіны 50 хвілін залпы рэактыўных мінамётаў паведамілі аб пачатку бітвы за вызваленне Беларусі на ўчастку парыцкай і жлобінскай груповак.

27 чэрвеня да 11 гадзін раніцы 69-я дывізія ва ўзаемадзеянні з 37-й гвардзейскай стралковай дывізіяй авалодала населеным пунктам Глуша, размешчаным на захад ад Бабруйска. Камандзір 18-га стралковага корпуса генерал-лейтэнант І.І. Іваноў вырашыў сіламі двух перадавых атрадаў, сфарміраваных з воінаў 37-й і 69-й стралковых дывізій, да канца дня авалодаць горадам Асіповічы.

У сваю чаргу камандзір 69-й дывізіі генерал-маёр І.І.Санкоўскі загадаў падпалкоўніку Р.Ф.Люлькову і начальніку штаба палка палкоўніку П.І.Старавойтаву ўзначаліць перадавы атрад дывізіі. Атрад быў умацаваны агнявымі сродкамі. 120-му стралковаму палку былі прыдадзены полк лёгкіх САУ пад камандаваннем падпалкоўніка Ложкіна, батальён пад камандаваннем капітана А.Н. Цыбізава, рота аўтаматчыкаў

пад камандаваннем капітана С.В.Рубашкіна, сувязісты і сапёры. Баявы склад атрада быў размешчаны на машынах прыдадзеных часцей узмацнення і ў 15 гадзін фарсіраваным маршам рушыў на Асіповічы. Праехаўшы 2 км, ён абагнаў перадавы атрад 37-й гвардзейскай дывізіі, які выконваў марш пешым парадкам.

У 17 гадзін першым падышоў да Асіповіч перадавы атрад Люлькова. У горадзе было ціха: відаць, праціўнік не думаў адступаць.

Рота аўтаматчыкаў капітана Рубашкіна на самаходках, фарсіраваўшы раку Сінюю, рушыла да могілак на ўсходнюю ўскраіну горада. Першым уварваўся ў горад экіпаж самаходкі сяржанта Фёдара Дзідзенкі. Цераз 30 хвілін байцы далажылі, што імі захоплены тры немцы, якія паказалі, што ў горадзе войскаў няма, акрамя аховы складоў, чыгуначнай станцыі і дробных гаспадарчых груп.

Камандзір перадавога атрада падпалкоўнік Люлькоў вырашыў сходу авалодаць горадам. Ён загадаў першаму батальёну з самаходнай гарматай авалодаць складамі на паўднёва-заходняй ускраіне горада, другому батальёну наступаць у напрамку чыгуначнай станцыі і авалодаць ёю, трэцяму батальёну наступаць да цэнтра горада, ачысціць яго ад дробных груп праціўніка. Камандзірам батальёнаў было загадана аказаць дапамогу самаходным гарматам у фарсіраванні ракі Сіняй, артылерыстам і дывізіёну «кацюш» заняць агнявыя пазіцыі на правым беразе ракі Сіняй на ўскрайку лесу і быць гатовымі аказаць агнявую падтрымку наступаючым батальёнам па іх просьбе.

Наступленне савецкіх войскаў на Асіповічы.

Афіцэры 120-га стралковага палка — удзельнікі вызвалення г. Асіповічы (злева направа): І.Е.Ражкоў, начальнік штаба палка гв. палкоўнік П.І.Старавойтаў і камандзір палка гв.падпалкоўнік Р.Ф.Люлькоў.

Камандны пункт палка размясціўся на могілках на ўсходняй ускраіне горада.

Батальён маёра Н.А.Цыбізава і рота аўтаматчыкаў капітана С.В.Рубашкіна пры падтрымцы самаходнай артылерыі прарвалі абарону праціўніка на паўднёва-ўсходняй ускраіне Асіповіч і да семнаццаці гадзін занялі горад.

Вызваленню Асіповіч у многім садзейнічала 17-я танкавая брыгада 1-га гвардзейскага Данскога танкавага корпуса пад камандаваннем генерал-маёра М.Ф.Панова, які 27 чэрвеня абышоў горад Бабруйск з паўночнага захаду і перарэзаў шлях адступлення з Бабруйска ворагу.

У васемнаццаць гадзін праціўнік зрабіў спробу выгнаць са станцыі Асіповічы два гружаныя таварныя эшалоны, але артылерысты сваім агнём прымусілі паязды вярнуцца на станцыю. У горадзе гітлераўцаў амаль не засталося. Нешматлікая іх колькасць імкнулася ў Асіповічах выратаваць склады боепрыпасаў, абмундзіравання і харчавання 9-й нямецкай арміі. А палове восьмай вечара праціўнік імкнуўся з лесу падысці да складоў, але быў адкінуты артылерыстамі. У гэты час з боку Мінскай шашы група нямецкіх войскаў пачала наступленне на чыгуначную станцыю, аднак таксама была адкінута на зыходныя пазіцыі сіламі батальёна маёра І.Е.Ражкова пры падтрымцы артылерыі.

Начальнік штаба 120-га стралковага палка палкоўнік П.І.Старавойтаў у гэты час далажыў камандзіру 69-й стралковай дывізіі, што полк з прыдадзенымі яму сродкамі і сіламі поўнасцю авалодаў горадам Асіповічы, але працягвае адбіваць атакі дробных груп праціўніка, якія імкнуцца авалодаць станцыяй і складамі.

Каля дваццаці гадзін 27 чэрвеня ў горад увайшоў перадавы атрад 37-й гвардзейскай дывізіі. Палкоўнік П.І.Старавойтаў далажыў аб становішчы ў горадзе. Месца размяшчэння войскаў дывізіі вызначылі на ўсход ад складоў, а ахову складоў перадалі 237-му стралковаму палку 69-й стралковай дывізіі.

А палове дзевятай гадзіны вечара камандзір палка Р.Ф.Люлькоў аддаў загад: перайсці да абароны горада і аказаць дапамогу другому батальёну, які абараняў чыгуначную станцыю.

У дваццаць тры гадзіны гітлераўцы ўзмацнілі па ёй агонь, і Старавойтаў загадаў «кацюшам» абстраляць праціўніка. Пасля аднаго залпа той замаўчаў. Да гэтага часу было захоплена ў палон каля ста салдат і афіцэраў ворага.

Раніцай 28 чэрвеня фашысты зноў адкрылі агонь па станцыі, аднак ён быў хутка падаўлены артылерыстамі, якія абаранялі горад. Да васьмі гадзін сілы 37-й гвардзейскай дывізіі ўступілі ў барацьбу з праціўнікам, што адступаў па Мінскай шашы і навакольных лясах. Неўзабаве ў горадзе і яго ваколіцах не было чуваць выстралаў, толькі гулі і гулі маторы: увесь дзень па дарогах на Баранавічы і Мінск ішлі войскі 18-га стралковага корпуса і іншыя часці 65-й арміі.

Кулямётны разлік сяржанта П.Дзьячэнкі (120-ы стралковы полк 69-й стралковай дывізіі) на паўднёвай ускраіне Асіповіч. 26 ліпеня 1944 г.

Аднак хутка разведка данесла, што праціўнік назапашвае сілы ў лясах на ўсход ад Асіповіч.

Камандзір 69-й стралковай дывізіі паведаміў войскам, якія абаранялі Асіповічы, што з бабруйскага «катла» прарваліся каля трох тысяч нямецкіх салдат і рухаюцца яны па шашы ў бок Мінска. З мэтай падрыхтоўкі адпору ворагу войскі 69-й дывізіі і прыдадзеныя ёй часці ахапілі горад з усходняй ускраіны паўкальцом. Штаб 69-й стралковай дывізіі і штабы прыдадзеных сродкаў размясціліся на ўсходняй ускраіне Асіповіч на вуліцы Калгаснай.

У гэты час войскі 18-га стралковага корпуса пад камандаваннем генерал-лейтэнанта І.І.Іванова працягвалі рухацца і наступаць на Баранавічы.

Як і на парыцкім напрамку, так і на фронце 3-й і 48-й армій наступленне пачалося 24 чэрвеня. Маршал Г.К.Жукаў прызнаваў, што гэтым арміям быў дадзены вельмі цяжкі ўчастак наступлення. Прарыў абароны праціўніка адбываўся марудна. Камандуючы 1-м Беларускім фронтам прыняў прапанову камандуючага 3-й арміяй А.В.Гарбатава — нанесці ўдар 9-м танкавым корпусам пад камандаваннем генерал-маёра танкавых войскаў Б.С.Бахарава на поўнач з лясіста-балоцістага раёна. Аперацыя ўдалася. Праціўнік быў адкінуты. Танкісты рухаліся да Бабруйска, адразаючы шлях адступлення немцаў па адзіным мосце цераз раку Бярэзіну. 26 чэрвеня мост быў у руках танкістаў. 9-ы танкавы корпус акружыў паўночна-заходнюю ўскраіну Бабруйска, а 1-ы Данскі гвардзейскі танкавы корпус пад камандаваннем генерал-маёра М.Ф.Панова адрэзаў праціўніку шляхі адступлення на захад і быў перанацэлены на імклівае наступленне на Мінск.

27 чэрвеня ў Бабруйску ўтварыўся «кацёл», у якім апынулася каля 40 тысяч нямецкіх салдат. У гэты дзень 65-й арміі было загадана наступаць на Асіповічы — Баранавічы, а 3-й арміі — на Мінск.

У гэты ж дзень на правым флангу фронту да ракі Бярэзіны (усходняй мяжы Асіповіцкага раёна) падышлі войскі 3-й арміі. 82-я Ярцаўская Чырванасцяжная ордэна Суворава і Кутузава стралковая дывізія пад камандаваннем генерал-маёра І.В.Пісарава павінна была фарсіраваць раку ў раёне вёсак Чучча, Няччо, рабочага пасёлка Ялізава, шклозавода «Кастрычнік» і вёскі Свіслач. На гэтым участку фронту 210-му (пад камандаваннем падпалкоўніка К.В.Барычэўскага), 250-му, 601-му стралковым, 146-му знішчальнаму-процітанкаваму, 1359-му зенітна-артылерыйскаму палкам належала пераадолець упартае супраціўленне адступаючага праціўніка. 356-я стралковая дывізія пад камандаваннем генерал-маёра М.Г.Макарава наступала па фронце справа.

У гэты час частка сіл 35-га нямецкага корпуса пад камандаваннем генерал-лейтэнанта фон Лютцаў прарвалася з бабруйскага «катла» і з групай да 6 тысяч чалавек, што прыбілася да іх, ад вёскі Сычкава павярнула на паўночны захад да шашы Магілёў — Мінск. Вораг ішоў наперад, не лічачыся са стратамі. Войскі 3-й арміі праяўлялі гераізм, стрымліваючы націск фашыстаў, азвярэлых ад безвыходнасці.

Узвод разведкі 82-й стралковай дывізіі пад камандаваннем старшага сяржанта А.А.Матросава перад наступленнем атрымаў загад: пераправіцца цераз раку Бярэзіну, зайсці ў тыл ворага, захапіць мост цераз раку Свіслач, замацавацца і заняць абарону да прыходу асноўных сіл. У ноч з 26 на 27 чэрвеня разведчыкі на чале з Матросавым пераправіліся цераз Бярэзіну, з боем захапілі доты каля моста і арганізавалі кругавую абарону. Матросаў далажыў камандаванню аб выкананні загаду.

Неўзабаве адна за адной пайшлі атакі ворага. І хоць немцы неслі вялікія страты, але і ў разведчыкаў былі забітыя (загінуў радавы Міхаіл Кармалітаў). Старшы сяржант А.А.Матросаў, нягледзячы на цяжкасць становішча і страты, працягваў умела кіраваць боем. Байцы пад яго кіраўніцтвам мужна і стойка адбівалі атакі ля моста на працягу 18 гадзін. Разам з камандзірам гераізм пры гэтым праявілі радавыя байцы Павел Белікаў, Аляксандр Фадноў, Міхаіл Чардакоў, Валянцін Фралоў і іншыя.

Увечары прыйшла дапамога. Вораг быў разбіты і адкінуты.

За гэты бой Аляксандру Аляксандравічу Матросаву было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Намеснік камандзіра батальёна старшы лейтэнант Мікалай Іванавіч Кліменка са

сваім падраздзяленнем ішоў наперадзе 601-га стралковага палка. 28 чэрвеня ў вёсцы Зарэчча Бабруйскага раёна Кліменка атрымаў загад: прабрацца ў тыл ворага, выбраць выгадную пазіцыю каля моста цераз раку Свіслач, умацавацца і, адбіваючы атакі ворага, трымацца да прыходу падмацавання. Камандзір узяў 10 лепшых салдат, растлумачыў ім заданне і рушыў у дарогу.

У ноч на 30 чэрвеня група Кліменкі падышла да Бярэзіны насупраць вёскі Чучча, на падручных сродках пераправілася на правы бераг, углыбілася ў лес і пайшла направа. У вёсцы Свіслач, недалёка ад моста, выбрала пазіцыю і замацавалася. Ранкам з боку Бабруйска накіравалася да моста вялікая група немцаў. Пачаўся бой. Атакі фашыстаў працягваліся адна за адной, аднак разведчыкі стаялі насмерць. М.І.Кліменка быў забіты фашысцкай куляй за некалькі хвілін да падыходу падмогі. Гітлераўцы былі разбіты.

За стойкасць і мужнасць, праяўленыя пад час гэтага бою, Мікалаю Іванавічу Кліменку было пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Гітлераўцы, якія адступалі, спрабавалі захапіць чыгуначны мост цераз раку Бярэзіну ля станцыі Свіслач (Ялізава) і перайсці на правы бераг Бярэзіны.

29 чэрвеня рота дэсантнікаў 82-й стралковай дывізіі пад камандаваннем старшага лейтэнанта Дз.П.Грыгор'ева атрымала загад: фарсіраваць раку Бярэзіну па чыгуначным мосце каля станцыі Свіслач (Ялізава), захапіць яго і выратаваць ад знішчэння праціўніка. (Мост ужо быў падрыхтаваны праціўнікам для праходу колавай тэхнікі.)

Дэсантнікі на самаходных артылерыйскіх установах занялі мост і мужна адбівалі атакі ворага. Сваім агнём яны знішчылі каля 300 нямецкіх салдат і афіцэраў. Кровапралітны бой дэсантнікаў з гітлераўцамі працягваўся і на другі дзень.

За мужнасць і адвагу, праяўленыя пры захопе чыгуначнага моста і выратаванні яго ад падрыву, Дзмітрыю Пятровічу Грыгор'еву было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

30 чэрвеня 1359-му зенітна-артылерыйскаму палку быў дадзены загад: заняць абарону чыгуначнага моста цераз раку Бярэзіну, не даць праціўніку магчымасці выкарыстаць яго для пераправы і падрыву. Адзін батальён палка пад камандаваннем намесніка камандзіра палка маёра Мікалая Васільевіча Рамашкі абсталяваў агнявыя пазіцыі і стаў на абарону моста. Неўзабаве з бліжэйшага лесу выйшла калона войскаў праціўніка. Разлікі зенітных гармат і буйнакаліберных кулямётаў падрыхтаваліся сустрэць яе магутным агнём. Немцы тым часам разгарнуліся ў баявы парадак і пайшлі ў атаку, якая была адбіта. У час бою загінуў камандзір роты капітан Кончын. М.В.Рамашка камандаванне ротай узяў на сябе і перайшоў на НП загінуўшага камандзіра. Бой быў гарачы. Зенітчыкі стралялі амаль ва ўпор. Рамашка, даведаўшыся, што забіты кулямётчык, сам лёг за кулямёт і сустрэў агнём гітлераўцаў, якія падняліся ў атаку.

Вораг спыніўся, потым фашысты пачалі адыходзіць. У гэты час М.В.Рамашку далажылі, што заканчваюцца боепрыпасы. А бой ля моста між тым нарастаў. Разлікі буйнакаліберных кулямётаў радзелі, аднак параненыя не пакідалі поля бою. Яны групаваліся вакол камандзіра.

Калі даставілі боепрыпасы, байцы ўзмацнілі агонь. Вораг адкаціўся назад. Наступіла кароткая цішыня, у якой байцы ўжо не пачулі бадзёрага голасу свайго камандзіра. Ён ляжаў мёртвы, сціснуўшы ручкі кулямёта.

Камандаванне высока ацаніла гераізм маёра Мікалая Васільевіча Рамашкі. За гэты бой яму пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Камандуючы 3-й арміяй А.В.Гарбатаў пісаў: «На другі дзень, праязджаючы па чыгуначным мосце цераз Бярэзіну, прыстасаваным праціўнікам для аўтатранспарту, я быў уражаны ўбачанай карцінай: усё поле каля моста было ўсцелена целамі гітлераўцаў — не менш трох тысяч».

30 чэрвеня 1944 г. 210-ы стралковы полк пад камандаваннем падпалкоўніка К.В.Барычэўскага рыхтаваўся авалодаць Ялізавам і шклозаводам «Кастрычнік». Наперад выслалі групу разведкі. Яна пранікла ў пасёлак і завязала бой з гітлераўцамі, што адступалі з-пад Бабруйска.

У гэты час полк ужо фарсіраваў Бярэзіну і разгортваў сілы, каб адным ударам выбіць ворага з Ялізава і захапіць шклозавод. Пакуль не падышлі асноўныя сілы, разведчыкам давялося весці жорсткі бой.

У час яго адну групу байцоў спрабавалі акружыць немцы. Гэта ўбачыў яфрэйтар Сяргей Пяцялін. Спрабуючы выратаваць таварышаў, ён адкрыў агонь па фашыстах, але не заўважыў, як сам апынуўся ў акружэнні пяцідзесяці нямецкіх салдат. Пяцялін пачаў адстрэльвацца, але ў дыску яго аўтамата скончыліся патроны. Ворагі смела кінуліся да бяззбройнага байца, аднак яфрэйтар гранатай узарваў і іх, і сябе.

За гэты подзвіг Сяргею Васільевічу Пяцяліну было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Ішлі ўпартыя баі за авалоданне пасёлкам Ялізава і шклозаводам «Кастрычнік». Левы фланг першага батальёна палка нёс вялікія страты. Шклозавод пераходзіў з рук у рукі, і Барычэўскі загадаў свайму намесніку маёру А.Х.Заўялаву і камандзіру роты аўтаматчыкаў старшаму лейтэнанту І.А.Тарасенку выбіць немцаў са шклозавода, а затым падтрымліваць левы фланг палка. Паўсотні аўтаматчыкаў на чале з названымі афіцэрамі па цэнтральнай вуліцы пасёлка Ялізава пайшлі насустрач ворагу. Гітлераўцы пачалі разбягацца і падпальваць дамы.

Рашучыя дзеянні групы падтрымкі дапамаглі першаму батальёну палка пазбегнуць непатрэбных ахвяр і адысці ў глыб пасёлка. Ацаніўшы становішча, Заўялаў і Тарасенка перанеслі ўдар на правы фланг праціўніка. Яны абышлі шклозавод па беразе Бярэзіны і вырашылі ўварвацца ў яго ў цэнтры. Не паспеў першы ўзвод прайсці палову адлегласці да заводскіх варот, як яны адчыніліся і адтуль пачалі выбягаць групы нямецкіх салдат. Узвод А.Т.Аўдо-

Сустрэча жыхароў в. Старыя Тарасавічы з воінамі 86-га гвардзейскага артылерыйскага палка.

П.І.Батаў.

К.В.Барычэўскі.

С.І.Рудэнка.

М.Ф.Паноў.

ніна ўступіў з імі ў бой. Частка гітлераўцаў была знішчана, тыя, што ацалелі, схаваліся за варотамі, але аўтаматчыкі ўжо паспелі ўварвацца на тэрыторыю прадпрыемства.

Іван Тарасенка, убачыўшы, што першы ўзвод вядзе бой на тэрыторыі завода, пераскочыў праз яго высокую агароджу. За ім — аўтаматчыкі другога ўзвода. Нямецкія салдаты кінуліся ўрассыпную, хаваючыся за цагляными карпусамі цэхаў, у якіх завязаліся баявыя сутычкі.

Камандзір трэцяга ўзвода аўтаматчыкаў малодшы лейтэнант А.Ф.Лукаў, прабраўшыся з байцамі ўздоўж завода, пераадолеў дашчаную агароджу і ўдарыў у тыл гітлераўцам. Немцы, што згрудзіліся ў прахадной, падалі мёртвыя. Тыя, што засталіся жывымі, пачалі разбягацца, аднак былі знішчаны. У гэтым баі камандзір трэцяга ўзвода А.Ф.Лукаў загінуў. Аднак загад камандавання быў выкананы, шклозавод «Кастрычнік» быў у руках байцоў палка. Але перадыхнуць не было калі: сяржант Ф.Ф.Звераў паведаміў, што па пустэчы за варотамі завода ў бок пасёлка ідуць вялікія калоны немцаў. Гітлераўцы ішлі шчыльным строем, моўчкі, не зважаючы на разрывы снарадаў (быццам у псіхічную атаку).

— Адыходзім у яр! — крыкнуў Тарасенка байцам і паказаў на запасныя вароты. Ледзь толькі байцы павярнулі туды, як шлях ім перакрылі вінтовачныя залпы: па беразе ракі, уздоўж агароджы, ішла яшчэ адна вялікая група нямецкіх салдат. Аўтаматчыкі ўступілі з імі ў бой, пракладваючы сабе шлях да чыгуначнага моста (уздоўж высокага берага Бярэзіны) гранатамі і аўтаматамі.

Пад націскам перавышаючых сіл праціўніка рота І.Тарасенкі ў хуткім часе была вымушана пакінуць пасёлак Ялізава. Яна адступіла да чыгуначнага моста і высокага насыпу, за якім знаходзілася балоцістая нізіна, укрытая высокай травой, кустамі і дрэвамі.

Цяжкае становішча склалася і на ўчастку абароны другога стралковага батальёна. Байцы яго бесперапынна вялі жорсткія баі ў абароне. Поле вакол Ялізава было вытаптана акупантамі, усюды ляжалі трупы забітых салдат праціўніка, а калоны фашыстаў усё ішлі і ішлі. У роце Р.Д.Данчанкі быў цяжка паранены камандзір першага ўзвода лейтэнант Уладзімір Алфёраў, тры камандзіры аддзяленняў — забітыя. Трэцяя частка роты выйшла са строю, калі фашысты зноў пайшлі ў атаку. Пад прыкрыццём узвода лейтэнанта Валянціна Пігурова камандзір другога батальёна старшы лейтэнант Я.П.Бялоў падняў батальён у контратаку.

Загінулі салдаты Грыбянко, Ягор Арціменка, іншыя. Але і фашысцкія рады значна парадзелі, аслабеў іх націск. Калі раптоўна з лесу да месца бою рушыла яшчэ адна шарэнга гітлераўцаў, пачулася каманда старшага лейтэнанта Г.М.Чарнышова:

— Кулямёты, агонь!

З фланга па праціўніку застрачыла некалькі кулямётаў. Лейтэнант Генадзь Смірноў адкрыў агонь па наступаючых з «максіма». Агульнымі намаганнямі ўдалося адбіць і гэтую атаку. Вялікая колькасць немцаў была забіта, астатнія разбегліся па лесе і пазней былі пералоўлены.

У баях за вызваленне пасёлка Ялізава, шклозавода «Кастрычнік» і абарону чыгу-

начнага моста цераз раку Бярэзіну змагаліся храбра салдаты і афіцэры 210-га стралковага палка пад камандаваннем падпалкоўніка К.В.Барычэўскага, 1359-га зенітна-артылерыйскага, 601-га стралковага, 1900-га сапёрнага, 146-га процітанкавага і 795-га артылерыйскага палкоў.

Больш за 150 байцоў гэтых часцей пахаваны ў брацкіх магілах пасёлка Ялізава. Людзі шануюць гэтыя магілы, схіляюць галовы перад помнікамі герояў-вызваліцелям.

28 чэрвеня 1944 года горад Асіповічы быў цалкам вызвалены ад акупантаў. Насельніцтва радасна сустрэла сваіх вызваліцеляў. Ва ўрачыстай цішыні людзі слухалі паведамленне па радыё дыктара Левітана:

ПРИКАЗ

Верховного Главнокомандующего генералу армии Рокоссовскому

Войска первого Белорусского фронта, развивая стремительное наступление сегодня, 28 июня, в результате глубокого обходного маневра овладели городом и важным железнодорожным узлом Осиповичи, завершив тем самым окружение Бобруйской группировки немецких войск.

В боях за овладение Осиповичами отличились войска:

генерал-лейтенанта Батова
генерал-майора Иванова
генерал-майора Алексеева
генерал-майора Санковского
полковника Морозова
танкисты генерал-майора Панова
летчики генерал-полковника Руденко.

В ознаменование одержанной победы соединения и части, наиболее отличившиеся в боях за овладение Осиповичами, представить к награждению орденами.

Сегодня, 28 июня, в 23 часа столица нашей Родины Москва от имени Родины салютует доблестным войскам первого Белорусского фронта, овладевшим Осиповичами, 20 артиллерийскими залпами из 224 орудий.

За отличные боевые действия объявляю благодарность руководимым Вами войскам, участвующим в освобождении Осиповичей.

Вечная слава героям, павшим в боях за свободу и независимость нашей Родины! Смерть немецким оккупантам!

Верховный Главнокомандующий Маршал Советского Союза И.Сталин.

28 июня 1944 года.

У другой палове дня 28 чэрвеня ў Асіповічы на камандны пункт 69-й стралковай дывізіі прыбыў камандуючы 65-й арміяй генерал-лейтэнант П.І.Батаў. Ён павіншаваў войскі з паспяховым вызваленнем горада і дзяржаўнымі ўзнагародамі. Камандуючы ўручыў камандзіру 69-й стралковай дывізіі генерал-маёру Іосіфу Іўсцінавічу Санкоўскаму, камандзіру 120-га стралковага палка і перадавога атрада гвардыі падпалкоўніку Рыгору Фамічу Люлькову ордэны Леніна. Ён уручыў ордэны камандзірам палкоў, дывізій і паведаміў, што начальнікі штабоў палкоў узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга.

В.М.Гарэлаў, начальнік штаба 69-й стралковай дывізіі.

І.М.Сярэдзіч, камандзір 3-й гвардзейскай зенітна-артылерыйскай дывізіі.

Адначасова камандуючы арміяй П.І.Батаў загадаў: камандзіру 69-й стралковай дывізіі І.І.Санкоўскаму арганізаваць абарону горада на далёкіх подступах і ліквідаваць праціўніка, які вырваўся з бабруйскага «катла».

У гэты дзень на ўсходняй ускраіне Асіповіч былі размешчаны другая, трэцяя і чацвёртая зенітна-артылерыйскія батарэі 297-га зенітна-артылерыйскага палка пад камандаваннем палкоўніка М.П.Воінава, які ўваходзіў у трэцюю Рэчыцкую Чырванасцяжную ордэнаў Суворава і Кутузава дывізію Рэзерву Галоўнага Камандавання.

На досвітку 29 чэрвеня 120-ы стралковы полк быў зняты з абароны горада і размешчаны на загараджальную пазіцыю (ад Мінскай шашы да вёскі Цяплухі). Такім чынам сіламі 69-й, 37-й стралковых дывізій і прыдадзеных ім сродкаў быў арганізаваны заслон на ўсходняй ускраіне Асіповіч і на паўночным захадзе да вёскі Вяззе.

Раніцай пачаліся жорсткія баі з праціўнікам, што адступаў з бабруйскага «катла». Наступленне і атакі гітлераўцаў падтрымліваліся танкамі і артылерыяй. Салдаты і афіцэры дывізій, якія абаранялі горад, стойка змагаліся з акупантамі. Зенітчыкі 118-га і 297-га палкоў вялі агонь па ворагу прамой наводкай і наносілі яму значныя страты ў жывой сіле і тэхніцы. Атакі ворага не спыняліся. У час адной з іх варожы снарад трапіў у штаб 69-й стралковай дывізіі. Загінулі начальнік аператыўнага аддзела маёр Іван Ігнацьевіч Гармашаў і малодшы лейтэнант медыцынскай службы Гульсум Фатыхаўна Мустафіна (у 1975 годзе, па хадатайніцтву ветэранаў вайны, імем І.І.Гармашава ў Асіповічах названа вуліца Калгасная, на якой размяшчаўся штаб дывізіі).

У адбіцці атак фашыстаў ля рэчкі Сіняй вызначыўся з узводам памочнік камандзіра 99-га сапёрнага батальёна сяржант І.Я.Пісаркоў. Камандзір узвода гэтага батальёна малодшы сяржант Ткачэнка з групай байцоў, арганізаваўшы засаду ля палатна чыгункі, у кароткай сутычцы знішчыў 23 нямецкія салдаты. За адвагу ў гэтым баі ён пазней быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Начальнік палітаддзела 69-й стралковай дывізіі палкоўнік С.Я.Карпікаў (загінуў 11 кастрычніка 1944 года), які прыбыў да іх на дапамогу, узначаліў кіраўніцтва боем. Гітлераўцы былі адкінуты, 160 салдат і афіцэраў былі ўзяты ў палон.

У той жа дзень байцам Чырвонай арміі дапамагалі партызанскія атрады 211-ы імя К.К.Ракасоўскага (камандзір Р.Н.Баразна) і 214-ы імя Калініна (камандзір Д.Н.Падгайны). Атрады, якія дзейнічалі на паўночны ўсход ад Асіповіч у лясістай мясцовасці паміж вёскамі Брыцалавічы і Малая Гарожа, агнём сустрэлі войскі адступаючых акупантаў. У баі партызаны знішчылі вялікую колькасць жывой сілы праціўніка, узялі ў палон генерала і 178 салдат і афіцэраў.

Група партызан з 7 чалавек, сярод якіх была і Рыма Кунько, сутыкнулася з адступаючымі варожымі падраздзяленнямі, залягла і адкрыла агонь. У гэтым баі смелая партызанка Рыма Кунько загінула. Яна пахавана ў Асіповічах у брацкай магіле партызан. Яе імем у горадзе названа вуліца.

Яшчэ ішлі баі, войскі абаранялі Асіповічы, а начальнік палітаддзела 69-й стралковай дывізіі палкоўнік Сямён Якаўлевіч Карпікаў і яго намеснік Герой Савецкага Саюза палкоўнік Барыс Тарасавіч Пішчыкевіч дапамаглі членам Асіповіцкага падпольнага райкома партыі аднавіць у горадзе органы Савецкай улады. Часова выконваючым абавязкі старшыні выканаўчага камітэта Савета дэпутатаў працоўных быў назначаны партызан-падпольшчык Аляксандр Фёдаравіч Чайкоўскі.

Газета Асіповіцкага РК КП(б) Беларусі «За Советскую Родину» ў нумары за 29 чэрвеня 1944 года звярнулася да насельніцтва горада і раёна з прывітаннем: «Трудящиеся района! Подпольный РК КП(б) Белоруссии приветствует и поздравляет Вас с радостным днем нашего освобожде-

У вызваленыя Асіповічы прыйшла пошта.

Б.Т.Пішчыкевіч.

ния из-под ярма немецко-фашистских захватчиков!»

30 чэрвеня баі з адступаўшымі ад Бабруйска немцамі працягваліся. Гітлераўцы, што рухаліся па Мінскай шашы, падышлі да вёскі Малая Гарожа. Шлях ім перагарадзіў разлік процітанкавай гарматы 755-га артылерыйскага палка пад камандаваннем Б.Дз.Раманава. Інтэнсіўным і дакладным агнём ён падбіў 2 танкі, 4 бронемашыны, аўтамабіль, 2 павозкі з воінскай маёмасцю і ліквідаваў больш за 100 салдат і афіцэраў праціўніка. За смеласць, мужнасць і адвагу ў гэтым баі Барысу Дзмітрыевічу Раманаву было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Гітлераўцы, сустрэўшы на Мінскай шашы ўпартае супраціўленне, зразумелі, што па ёй не прабіцца, павярнулі і выйшлі на паўночна-ўсходнюю ўскраіну Асіповіч. Агульная колькасць калоны, як успамінаў Б.Т.Пішчыкевіч, налічвала каля 700 чалавек. Першымі адступаючых сустрэлі байцы 118-га артылерыйскага палка. Падпусціўшы варожы ланцуг на 100 метраў, артылерысты адкрылі агонь. У першыя ж хвіліны бою праціўнік панёс вялікія страты, аднак групе фашыстаў удалося прарвацца ў размяшчэнне адной з батарэй. Завязалася рукапашная схватка. Артылерысты змагаліся стойка і храбра, у выніку 25 салдат праціўніка былі знішчаны, 50 узяты ў палон.

У гэтым баі вызначыўся радавы 3-й батарэі Новікаў. Ён з аўтамата забіў 11 фашыстаў, якія акружылі яго. Старшына Лаўрушын знішчыў 8 салдат. Камандзір батарэі старшы лейтэнант Шубенка захапіў у палон 14 нямецкіх салдат. Узвод коннай разведкі 69-й дывізіі капітана І.А.Крамара знішчыў 30 салдат і афіцэраў і 80 захапіў у палон.

Адважна змагаліся з фашыстамі байцы сапёрнай роты старшага лейтэнанта Амарава. Яны захапілі ў палон 150 нямецкіх салдат. У рукапашнай сутычцы вызначыўся беларус, камандзір узвода старшы лейтэнант Грышын.

У баях з гэтай групоўкай было знішчана 300 салдат ворага, 400 захоплена ў палон. Камандаванне паслала траіх палонных салдат (па добраахвотнаму жаданню) назад да праціўніка з заданнем прывесці жадаючых здацца ў палон. Праз некаторы час «парламенцёры» вярнуліся і прывялі групу немцаў з 40 чалавек, сярод якіх было 14 унтэр-афіцэраў.

У той жа дзень, 30 чэрвеня, у баі вызначыліся байцы 2, 3 і 4-й батарэй 297-га гвардзейскага зенітна-артылерыйскага палка, які знаходзіўся на ўсходнім ускрайку Асіповіч (паміж мастамі чыгункі і шашэйнай дарогі цераз раку Сінюю). Значная па колькасці групоўка салдат і афіцэраў ворага, якія прарваліся з бабруйскага «катла», падышла да размяшчэння батарэі зенітчыкаў і пад прыкрыццём мінамётнага і кулямётнага агню паспрабавала прарваць іх абарону. Фашысты зрабілі некалькі атак, каб прарвацца на захад, але артылерыйскім і кулямётным агнём былі адкінуты. Калі праціўніку ўдалося прарвацца ў зону, якая не абстрэльвалася гарматамі, асабісты склад батарэі ўступіў у рукапашны бой,

Бой каля в. Малая Гарожа вядзе разлік сяржанта Б.Дз.Раманава.

знішчыўшы 250 салдат і афіцэраў праціўніка, а 322 захапіў у палон.

У гэтым цяжкім баі вызначыўся і здзейсніў подзвіг тэлефаніст 4-й батарэі яфрэйтар Міхаіл Раманавіч Абросімаў. Калі праціўнік наблізіўся да батарэй, Абросімаў з аўтаматам у руках выскачыў са свайго акопа і з крыкам «Бей гадов!» кінуўся на наступаўшых немцаў. Яго прыклад натхніў іншых. Гарматчыкі з карабінамі таксама кінуліся на ворага. Гітлераўцы падалі адзін за адным. Абросімаў быў паранены. Перавязаць рану падбег санінструктар. Яфрэйтар адмахнуўся: «Потым... пасля бою...» Нямецкі афіцэр, заўважыўшы яфрэйтара, ускінуў свой аўтамат. Рускі яфрэйтар і нямецкі афіцэр адначасова выстралілі і абодва ўпалі мёртвыя.

За мужнасць, гераізм, адвагу і самаахвярнасць у баі з ворагам Міхаілу Раманавічу Абросімаву было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Ішлі баі і побач з Асіповічамі. У адным з іх вызначыўся гвардыі старшы сяржант С.П.Уласенка. Камандуючы гарматамі 280-га гвардзейскага процітанкавага знішчальнага палка 3-й асобнай гвардзейскай знішчальнай процітанкавай ордэна Леніна брыгады Галоўнага Камандавання, ён за час вайны меў на сваім рахунку 6 падбітых танкаў, 5 гармат, 9 аўтамашын, 5 павозак з ваенным грузам, склад боепрыпасаў, 2 мінамёты, 7 станковых кулямётаў, 2 цягачы з кулямётамі і 225 забітых салдат і афіцэраў праціўніка. Ён адважна змагаўся з фашыстамі ў вёсцы Сычкава Бабруйскага раёна. 30 чэрвеня гарматны разлік Уласенкі вёў упарты бой за авалоданне плацдармам на левым беразе ракі Свіслач ля чыгуначнай станцыі Лапічы. Гітлераўцы зрабілі ўсё магчымае, каб утрымацца на гэтым рубяжы, не дапусціць прасоўвання часцей Чырвонай арміі да Мінска. Гармата Уласенкі падбіла танк і гармату немцаў. У самы напружаны момант бою з-за дамоў выйшла некалькі варожых танкаў. Яны накіраваліся на пазіцыю Уласенкі. Становішча складвалася не на карысць артылерыстаў. Сілы былі няроўныя, трэба было нешта рабіць. Артылерысты непрыкметна для ворага залезлі на дах дома і падрыхтаваліся. У кожнага байца было некалькі процітанкавых гранат. Гітлераўцы не бачылі і не чакалі, што гармата стаіць без байцоў. Калі танкі падышлі да дома, з даху на іх паляцелі гранаты. Варожы дэсант кінуўся бегчы. Танкі не прайшлі. Але па дому адкрыла агонь схаваная ворагам гармата. Уласенка быў цяжка паранены, але знайшоў у сабе сілы дабрацца да сваёй пазіцыі і трапным агнём знішчыў гітлераўскую агнявую кропку. Фашысты насядалі. Артылерысты адбілі ўжо пяць атак, не было часу перавязаць раны, а бой усё ішоў. Пасля восьмай атакі гітлераўцы змоўклі і адступілі. На полі бою засталіся два гітлераўскія танкі, гарматы і шматлікія трупы захопнікаў. Разлік гвардзейцаў выканаў сваю задачу.

Сяргею Платонавічу Уласенку за мужнасць, адвагу і кемлівасць у гэтым баі з гітлераўцамі было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У баях за вызваленне Бабруйска і Асіповіч паказалі незвычайную адвагу і мужнасць лётчыкі штурмавой авіяцыі 16-й паветранай арміі.

Камандзір звяна старшы лейтэнант Анатоль Сяргеевіч Багданаў рабіў па 3—4

Жыхары Асіповіцкага раёна вяртаюцца ў вызваленыя мясціны.

баявыя вылеты ў дзень на разведку і штурмоўку войскаў праціўніка ў Бабруйску і пад Асіповічамі. З пачатку Беларускай аперацыі па люты 1945 года ён здзейсніў 116 баявых вылетаў, вывеў са строю 7 варожых танкаў, 50 аўтамашын, знішчыў 15 гармат, паравоз, 10 вагонаў і стварыў 15 ачагоў пажару.

С поставленной задачей соединение справилось хорошо. Все попытки противника построить переправу на указанном участке реки успеха не имели. Огнем из минометов, ПТР и пулеметов партизаны помешали строить переправы. Диверсионные группы путем минирования произвели крушения жел. дор. эшелонов, подорвано на минах 3 танка, 6 автомашин с военным грузом. Разведка от соединения встретилась с разведкой Красной Армии на восточном берегу р. Березина, указав броды, содействовала продвижению частей Красной Армии.

Отряды соединения активно участвовали в боях за город и ж.-д. станцию Осиповичи, Свислочь, Липень. Особенно много боев вели отряды соединения с разрозненными группами противника из состава 4-й и 9-й немецких армий, окруженных в районе г. Бобруйска. В результате боев партизанами соединения убито 1322, взято в плен 2412 солдат и офицеров противника (захв. трофеи: пулеметов — 11, автоматов — 62, винтовок — 300, пистолетов — 31, лошадей — 40, патронов — 24 000).

В этих операциях отличились: и. д. командира соединения капитан Глотов В.В., начальник штаба соединения ст. лейтенант Лашкевич Ф.Д., командир отряда им.Рокоссовского Борозна Григорий Никифорович, комиссар отряда Шиенок А.В., командир отряда «За Советскую Беларусь» Шичко Федор Калинович.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 129. Л. 344, 350.

Падрыхтаваў У.І.Лемяшонак.

Па ваенных дарогах

К 11 часам утра 27 июня 69-я дивизия во взаимодействии с частями 37 гв. дивизии овладела поселком Глуша. Им же предстояло освободить Осиповичи... По данным разведки, боевых частей в городе не было. Командование корпуса решило освободить город силами двух передовых отрядов от 69-й и 37-й дивизии к исходу дня.

Командиром передового отряда от 69-й дивизии был назначен командир 120-го полка подполковник Люльков...

Задачу передовому отряду в присутствии командира корпуса поставил командир дивизии. Команда: «По машинам!», и личный состав рассаживается на двадцати самоходках и автомашинах. В 5 часов вечера передовой отряд остановился. Люльков решил выслать в город разведку. Капитан Рубашкин, взяв с собой отделение сержанта Н.Загидова и адъютанта командира полка ст. л-та П.Я.Новикова, скрытно достиг окраины города.

С наблюдательного пункта командира полка г. Осиповичи был виден как на ладони. За три года своего пребывания гитлеровцы превратили этот некогда веселый, жизнерадостный город в сплошной фашистский застенок.

С НП хорошо были видны дома и кварталы, обнесенные колючей проволокой. Город горел.

На его окраине разведчики Рубашкина захватили немецкого мотоциклиста и двух вооруженных власовцев.

Пленные дали ценные сведения о силах гарнизона города. Оценив обстановку, командир передового отряда решил остановиться в городе, выйти на западную окраину и держаться до подхода главных сил дивизии и корпуса.

После короткого артиллерийского налета передовой отряд перешел вброд речку Синяя и ворвался в город. На окраинах противник особого сопротивления не оказывал. Отряд успешно продвигался вперед. Но как только подразделения начали приближаться к ж.-д. станции, противник оказал сопротивление. Фашисты намеревались вывезти со станции пять составов с продовольствием, но меткий огонь советских самоходчиков сорвал их замыслы...

В городе были захвачены восемь складов с различным имуществом. Чего только в них не было: мука и сахар, французское и итальянское вино, сапоги и посылки для гитлеровских вояк. А на станции осталось пять эшелонов, состоящих из вагонов-холодильников, наполненных свиными тушами.

В разгар уличных боев к городу подошел подвижной отряд 37-й гвардейской дивизии. К утру 28 июня г. Осиповичи был полностью освобожден от противника. С огромным душевным волнением входил в город секретарь партийной комиссии дивизии майор А.Г.Куликов — бывший секретарь Минского горкома комсомола. Три года назад на ж.-д. станции Осиповичи простился он, уходя на фронт, с женой и двухлетней дочуркой.

Вот и знакомая улица. Но там, где когда-то стоял дом фельдшера Хохлова — его тестя, — осталась лишь зола и кирпичная пыль. В лабиринте разрушенных зданий, подвалов и землянок Куликову удалось все же отыскать стариков.

— А где Зина, где дочка Люся? Что с ними? — взволнованно спросил Куликов.

— Не успела эвакуироваться. Помогала партизанам, а потом как в воду канула. Фашисты увезли.

Полки пошли вперед, а с ними и майор Куликов, унося в душе боль и тревогу за судьбу любимой семьи. Глубокие следы оставила эта боль на сердце, переживания подтачивали здоровье.

Война окончилась. Но о жене и дочке известий не было. И лишь 20 июля 1945 года совершилось то, о чем мечтал Куликов все эти годы. Письмо. Знакомый почерк. Адрес — белорусский. Зинаида Ивановна писала: «Дорогой мой Сашенька! Поздравляю тебя с Победой над проклятой фашистской сворой, которая хотела сделать нас рабами...»

...Пришли немцы. Зинаида Ивановна не убереглась. Фашисты схватили ее, отправили в Германию, в лагерь. Отобрали дочь. Лишь после прихода Красной Армии-освободительницы Зинаида Ивановна с помощью советского командования смогла разыскать Люсю в одном из монастырей. Пятилетняя девочка была в мона-

шеском одеянии. «Родной мой, — писала Зинаида Ивановна, — мы смотрим на твое фото, и трудно тебя узнать. Как ты изменился. Но и моя голова седая, хотя мне только 28 лет».

А.Г.Куликов уволился из армии в 1948 г., а в марте 1956 г., в возрасте 46 лет, умер...

Друкуецца паводле кн.: Андреев А.А. По военным дорогам. М., 1971. С. 264.

Баі за Асіповічы

З успамінаў падпалкоўніка Р.Ф.Люлькова, камандзіра 120-га стралковага палка

ЛЮЛЬКОЎ Рыгор Фаміч. Нарадзіўся 14 лістапада 1916 г. на хутары Філонаўскім Валгаградскай вобласці. Закончыў Саратаўскі рабфак у 1937 г. У арміі з 1 мая 1939 г. У 1941 г. закончыў Уладзівастоцкае ваеннае пяхотнае вучылішча. У 1942 г. — курсы ўдасканалення каманднага саставу. Ваяваў на Заходнім і 1-м Беларускім франтах, камандзір батальёна, намеснік камандзіра і камандзір палка. У 1943—1944 гг. у званні гвардыі падпалкоўніка камандаваў 120-м стралковым палком 69-й Сеўскай ордэнаў Суворава і Кутузава стралковай дывізіі 65-й арміі.

27.6.1944 г. полк пад яго камандаваннем, узмоцнены гвардзейскімі мінамётамі, артылерыяй, сапёрамі, на падручных сродках з ходу фарсіраваў раку Сінюю і, пераадольваючы супраціўленне ворага, паспяхова ажыццявіў аперацыю па вызваленню г. Асіповічы. Перадавы атрад з прыдадзенымі яму падраздзяленнямі пад умелым кіраўніцтвам гвардыі падпалкоўніка Люлькова Рыгора Фаміча штурмам авалодаў г. Асіповічы і выратаваў яго ад знішчэння адступаючымі часцямі праціўніка. За паспяховае выкананне баявой аперацыі па авалоданні г. Асіповічы Р.Ф.Люлькоў быў узнагароджаны ордэнам Леніна.

З лістапада 1944 г. — выкладчык Саратаўскага ваенна-палітычнага вучылішча. Пасля заканчэння Ваеннай акадэміі тылу і транспарту (1950) — у Групе савецкіх войскаў у Германіі. З 1954 г. жыў у Валгаградзе. Імем Р.Ф.Люлькова названа вуліца ў г. Асіповічы. Рашэннем Асіповіцкага гарадскога Савета народных дэпутатаў ад 22 снежня 1978 г. Люлькову Рыгору Фамічу прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін г. Асіповічы».

П.С.Качановіч.

Р.Ф.Люлькоў.

Асіповічы — важны чыгуначны вузел, які звязваў Мінск, Бабруйск, Магілёў, Слуцк. Галоўнае і ў іншым: у Асіповічах размешчаны былі тылы 9-й арміі. Генерал Батаў усё ж вырашыў ісці на Асіповічы, тым больш што корпус выйшаў далёка ў тыл бабруйскай групоўкі пры адсутнасці суцэльнага фронту абароны.

...Полк, пакінуўшы ззаду сябе 20—25 кіламетраў пройдзенага з баямі шляху, размясціўся ў лесе каля Глушы на прыём харчу. Чакаць камдыва доўга не давялося. Вось паказаўся «віліс». Дакладваю генералу. Выслухаўшы даклад, Санкоўскі павёў мяне да машыны. Узяў карту, растлумачыў абстаноўку. Перайшоў да галоўнага:

— На ўсіх франтах абазначыўся поспех. Бабруйск акружаны, войскі пайшлі на Мінск, Глуск. Немцы нас сёння ў Асіповічах не чакаюць. Трэба сёння ж, да заканчэння дня, вызваліць ад немцаў Асіповічы.

Не любячы ўступаць у якія-небудзь разважанні, сказаў прама:

— Сілёнак малавата, таварыш генерал.

— Што трэба?

— Прашу прыдаць палку Ложкіна полк лёгкай брыгады, дывізіён «кацюш». Астатняе — на маім сумленні.

— Ну што ж, аўчынка вырабу варта. Чакайце. Праз паўтары-дзве гадзіны ўсё будзе ў вас. Рэкамендую на «ложкінскія» самаходкі пасадзіць усю пяхоту, па крайняй меры — па 15 байцоў на кожную і аднаму афіцэру.

Дзесьці ў Глушы брахалі сабакі. Зрэдку даносіліся стрэлы.

Да прыходу самаходак і артылерыі да мяне прыйшоў камандзір 521-га лёгкага самаходнага артпалка палкоўнік Ложкін.

Коратка абмеркавалі пытанні будучага бою. Асаблівая ўвага была звернута на ўзаемадзеянне з танкамі, артылерыяй і між сабою.

Да Асіповіч 28 кіламетраў. Часу мала. Сонца на захадзе. Начальнік штаба Старавойтаў далажыў аб гатоўнасці да руху. Разам з намеснікам па палітчастцы Зашголкіным правялі невялікую гутарку з салдатамі і афіцэрамі.

Пяць, тры, два... Паўкіламетра і вось — Асіповічы. Артылерысты і мінамётчыкі занялі загадзя ўстаноўленыя нашым планам агнявыя пазіцыі. Самаходныя артылерыйскія ўстаноўкі з калоны перастроіліся ў ланцуг.

Пры выхадзе з лесу (500—600 метраў ад Асіповіч) пяхота ланцугом пайшла ўброд за самаходкамі. На нашых вачах пакінутыя немцамі два салдаты ўзарвалі мост. У гэты момант «кацюшы» па прадугледжанаму плану білі па важнейшых аб'ектах ворага. Гэта ж рабілі і мінамётчыкі. Артылерысты перагароджвалі шляхі адыходу ворага з горада.

За ходам бою мы назіралі з узлеску супраць Асіповіч.

У 20.00 НП палка перамясціўся ў раён могілак. Праціўнік, заспеты знянацку, паспешліва адступіў. Дзесьці на ўскрайку горада чутны асобныя залпы «фердынандаў», артылерыі. Гэта нашы «ложкінцы» вядуць бой. Паступаюць данясенні ад камандзіраў падраздзяленняў: хто якога рубяжу дасягнуў, што робяць зараз падраздзяленні.

Дзесьці а дзевятай гадзіне вечара падказваю Старавойтаву:

— Перадайце ў штаб дывізіі, Пётр Іванавіч, што 120-ы стралковы полк у 20.00 вызваліў горад Асіповічы і вядзе бой па яго ўтрыманню да падыходу нашых часцей.

Баі яшчэ працягваліся. Падышлі іншыя падраздзяленні дывізіі, становішча ўмацавалася, і 28 чэрвеня ў гонар вызвалення горада Масква салютавала воінам 1-га Беларускага фронту...

...Пры фарсіраванні рачулкі перад Асіповічамі самаходныя ўстаноўкі Ложкіна не ўсе выбраліся на бераг. Частка забуксавала. Неўзабаве да мяне прыводзяць 15 палонных. Праз перакладчыка я загадаў аднаму з афіцэраў палка, каб палонныя разабралі драўляны хлеў і вызвалілі самаходкі для бою. Устанавіўшы час, прыстрашыў, чым пахне невыкананне загаду ў тэрмін. Абышлося ўсё добра. Праз гадзіну з невялікім усе СУ-76 былі ў баі за горад...

У кожнага франтавіка ёсць на яго ваенных дарогах кропка: ці то горад, ці то вёска, ці то курган, ці то безыменная вышыня, якую ён да канца сваіх дзён не можа забыць. Такой памятнай вехай для мяне і многіх маіх аднапалчан стаў горад Асіповічы.

І.І.Каваленка.

П.Я.Новікаў.

З успамінаў Івана Іванавіча Каваленкі, былога камандзіра батальёна 237-га стралковага палка 69-й стралковай дывізіі, удзельніка вызвалення г. Асіповічы

Мой батальён удзельнічаў у аперацыі па знішчэнні гітлераўцаў на перакрыжаванні дарог Бабруйск — Мінск — Асіповічы. Мне было даручана не даць немцам магчымасці вырвацца з Асіповіч, замкнуць кальцо акружэння і не дапусціць у Асіповічы групоўку гітлераўцаў, якая вырвалася з бабруйскага «катла».

Ні аднаму немцу вырвацца з акружэння не ўдалося, мы захапілі ў палон 250 салдат і афіцэраў.

За вызваленне Асіповіч мяне ўзнагародзілі ордэнам Чырвонага Сцяга. Потым удзельнічаў у вызваленні Варшавы і Берліна. За аперацыю «Баграціён» узнагароджаны таксама ордэнам Суворава III ступені.

З успамінаў Пятра Якаўлевіча Новікава, былога ўдзельніка вызвалення г. Асіповічы

У складзе 120-га стралковага палка 69-й стралковай дывізіі, камандаваў якім падпалкоўнік Р.Ф.Люлькоў, я прымаў непасрэдны ўдзел у баях за Асіповічы. Група разведчыкаў і аўтаматчыкаў, сярод якіх быў і я, першая ўвайшла ў горад з боку

З.С.Гарэлік.

С.М.Каданчык.

могілак. Завязаўся бой, у ходзе якога мы авалодалі Асіповічамі, захапілі вялікія трафеі, у прыватнасці, на чыгуначнай станцыі саставы з харчаваннем і абмундзіраваннем, а на ўсходняй ускраіне горада ангары, якія былі забіты нарабаваным харчаваннем, тэхнікай. Асабіста мною быў узяты ў палон матацыкліст — камендант складоў.

Потым былі спробы гітлераўцаў зноў вярнуць горад, але гэтага зрабіць ім не ўдалося. За вызваленне г. Асіповічы я быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

Землякі-героі

ГАРЭЛІК Зіновій Самуілавіч. Нарадзіўся 19.11.1904 г. у г. Асіповічы. Удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Скончыў Сімферопальскі камвуз (1924), курсы ўдасканалення камсаставу (1940), курсы «Выстрал» (1943). З чэрвеня 1941 г. на Паўднёвым, Сталінградскім, Цэнтральным франтах. Камандзір стралковай роты З.С.Гарэлік вызначыўся 16.10.1943 г. пры вызваленні Лоеўскага р-на Гомельскай вобл. Дэсантная група пад яго камандаваннем першая фарсіравала Дняпро, вызваліла в. Шчытцы, захапіла гармату, 2 кулямёты; да 18 кастрычніка заняла ўмацаваны рубеж, перарэзала важную магістраль праціўніка, падбіла 2 танкі. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 30.10.1943 г. Памёр 14.12.1968 г. Яго імем названа вуліца ў г. Асіповічы.

КАДАНЧЫК Сяргей Мікалаевіч. Нарадзіўся 12.9.1906 г. у в. Майсеевічы. У Чырвонай арміі з 1928 г. Скончыў Кіеўскія аб'яднаныя курсы падрыхтоўкі камандзіраў РСЧА (1932). Удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 г., савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг. З чэрвеня 1941 г. на Паўднёвым, Паўднёва-Заходнім, Закаўказскім, Паўночна-Каўказскім франтах. Вызначыўся ў верасні 1943 г. пры вызваленні Новарасійска. Полк, якім камандаваў падпалкоўнік С.М.Каданчык, штурмам авалодаў умацаваннямі праціўніка і ўтварыў пралом у яго абароне. Загінуў 15.9.1943 г. у баі. Пахаваны ў брацкай магіле на плошчы Герояў у Новарасійску. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 18.9.1943 г. Яго імем названы вуліца ў Новарасійску, рыбалоўны траўлер; у в. Майсеевічы на будынку школы, дзе ён вучыўся, мемарыяльная дошка.

Б.А.Майстрэнка.

КАРАЛЁЎ Мікалай Піліпавіч (глядзі ў раздзеле «1945—да нашых дзён» у артыкуле «Яны кіравалі раёнам»).

МАЙСТРЭНКА Барыс Аляксандравіч. Нарадзіўся 1.12.1924 г. у г. Асіповічы. Закончыў Харкаўскае танкавае вучылішча (1943). З ліпеня 1943 г. на Ленінградскім фронце. Камандзір танка лейтэнант Б.А.Майстрэнка вызначыўся ў чэрвені 1944 г. у час прарыву абароны праціўніка на Карэльскім перашыйку і вызвалення г. Выбарг. У баі прыняў на сябе камандаванне ротай. Экіпаж танка Б.А.Майстрэнкі знішчыў 3 доты, 8 дзотаў, 15 гармат, 20 кулямётаў, 10 мінамётаў і больш за 150 гітлераўцаў. Памёр 15.1.1945 г. ад ран. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 15.3.1945 г. Яго імем названы вуліца ў Асіповічах і сярэдняя школа № 1 у Ноўгарадзе-Северскім Чарнігаўскай вобл., дзе ён вучыўся.

Ён жыў на пярэднім краі

С.Л.Ахрэменка.

Свой баявы шлях Сяргей Лукіч Ахрэменка з в. Вяззе пачаў у бітве пад Масквой у складзе 12-й брыгады 5-га танкавага корпуса. Вызваляў Вязьму, Смаленск, удзельнічаў у Сталінградскай бітве. У раёне Кацельнікава пры ўзяцці ўмацаванага пункта Зімоўнікі іх корпус атрымаў назву «зімоўнікаўцы». За мужнасць і гераізм у тых баях Ахрэменка быў узнагароджаны першым ордэнам Чырвонай Зоркі.

...Было гэта ў час Курскай бітвы. Танкавая рота, у якой ваяваў сяржант Ахрэменка, спынілася, байцы папаўнялі баявы запас і падбіралі трафеі. Танкісты сабраліся каля нямецкай зеніткі. Усе разглядвалі гармату. Нечакана на брыючым палёце з'явіўся нямецкі знішчальнік і адкрыў агонь па салдатах. Усе кінуліся ўрассыпную. Але адзін з байцоў ірвануўся да зеніткі. Гэта быў Сяргей Ахрэменка. Сяржант страляў прыцэльна. Нямецкі знішчальнік ахапіла агнём, ён павярнуўся на бок і пачаў падаць, а потым з грукатам урэзаўся ў зямлю непадалёку...

За гэты подзвіг Ахрэменка атрымаў сваю трэцюю вялікую ўзнагароду — ордэн Чырвонай Зоркі.

Курская дуга... У многіх людзей яна пакінула горкую памяць. Памятнай засталася і для Сяргея Лукіча. У жорсткім баі каля вёскі Аўдзееўка іх танк загарэўся. Камандзір — забіты. На цяжкапараненым механіку-вадзіцелю тлела вопратка. Пад варожым агнём Сяргей вынес сваіх сяброў з палаючага танка. І за гэты бой атрымаў ордэн Славы III ступені.

Франтавы лёс кідаў яго на самыя адказныя ўчасткі вайны не толькі на тэрыторыі сваёй Радзімы, але і за яе межамі. Ён прымаў удзел у вызваленні Польшчы, у штурме Берліна і Прагі. Доўгачаканы час Перамогі сустрэў там жа.

Не верылася, што прыйшоў канец гэтай доўгай і праклятай вайне, што застаўся жывым... І не паспеў яшчэ добра ўсведаміць усё тое зробленае, як праз некалькі дзён чакала яго новая радасць. Выклікалі Сяргея Лукіча ў штаб брыгады і паведамілі, што як ардэнаносца, які найбольш вызначыўся, яго пасылаюць для ўдзелу ў Парадзе Перамогі.

Той дзень застаўся незабыўным. 24 чэрвеня 1945 г. у складзе зводнага палка 1-га Украінскага фронту прайшоў ён па Краснай плошчы.

Адгрымела вайна, і вярнуўся салдат дахаты, пайшоў працаваць туды, дзе 14-гадовым падлеткам пачынаў сваё працоўнае жыццё — у леспрамгас.

За ўдарную працу ў леспрамгасе ўзнагароджаны Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР і медалём «За доблесную працу».

Потым лёс звязаў франтавіка з сельскай гаспадаркай. Спачатку працаваў у калгасе «Авангард» брыгадзірам паляводчай брыгады, потым — загадчыкам жывёлагадоўчай фермы...

Амаль да канца свайго жыцця франтавік працаваў у родным калгасе цесляром і, як заўсёды, заставаўся на пярэднім краі. Яго фотаздымак пастаянна вісеў на Дошцы пашаны калгаса. А ён сам ахвотна дзяліўся з маладымі і сваім вопытам, і сваімі ведамі.

С.І.Лукашэвіч.

Некалькі біяграфій з тысячы

ТРЫБУШЭЎСКІ Уладзімір Сцяпанавіч (з успамінаў): — Нарадзіўся 24 лютага 1922 г. у в. Журавец. Тут мяне Айчынная і заспела, я тады сельскай гаспадаркай займаўся. З 1942 г. пачалі гнаць моладзь у Германію. Трапіў не па сваёй волі туды і сам — пад пагрозай расстрэлу. Жылі ў бараках, рабілі па 10 гадзін на шахтах. Кармілі дрэнна, часта білі, зневажалі. Некалькі разоў спрабаваў уцячы, але лавілі, жорстка каралі і зноў адпраўлялі на работу ў шахту.

У студзені сорак пятага, пасля 26 месяцаў жыцця ў пекле, з групай такіх жа сяб-

роў-небарак зноў уцёк. Прабіраліся па балотах і лясах, ішлі толькі ноччу і галоднымі, практычна знясіленымі. Усё ж сустрэліся з часцямі наступаючай Чырвонай арміі, так што ў лютым стаў салдатам-пехацінцам, на 3-м Беларускім фронце ваяваў. Прымаў удзел у знішчэнні варожай групоўкі на поўдзень ад Кёнігсберга. Запомніўся бой за адну з вёсак. Перад атакай пярэдні край пазіцыі ворага апрацавалі артылерыя і штурмавая авіяцыя, а пасля ўжо мы пад прыкрыццём танкаў пайшлі ў атаку. Пазіцыі фашыстаў былі добра ўмацаваныя, але мы іх знішчылі, нават некалькі ваяк у палон узялі. Тады мяне і медалём узнагародзілі.

Іншым разам, калі сышліся ў блізкім баі з гітлераўцамі, я быў цяжка паранены ў жывот і да 15 верасня 1945 г. лячыўся ў шпіталі, потым — дэмабілізаваны. Скончылася вайна — ажаніўся з медсястрой. Траіх дзяцей маем, унукаў. Працяглы час працаваў зубным урачом пры Ясенскай участковай бальніцы, зараз на пенсіі.

ЛЁЛЯ Павел Сцяпанавіч (з успамінаў): — Нарадзіўся 10 студзеня 1922 г. Да вайны працаваў у мясцовай гаспадарцы паляводам, а пазней прызначылі конюхам — гэта тады аўтарытэтная пасада была, адказная...

Як зараз памятаю страшэнныя дні пачатку Вялікай Айчыннай. Асіповіцкі ваенкамат не паспеў мабілізаваць прызыўнікоў на фронт, як прыйшлі немцы. Пайшлі размовы, што прымушаюць служыць у паліцыі — невялікія гарнізоны з немцаў і паліцаяў фарміравалі ў Грынёўцы, Кассі, на станцыі Ясень. Я вырашыў іначай, так што апынуўся ў жніўні сорак другога ў атрадзе Лівенцава, а з лютага 1943 г. разам з усімі быў уключаны ў склад 1-й Бабруйскай партызанскай брыгады.

У сакавіку 1943 г. прымаў удзел у разгроме клічаўскага гарнізона і абароне Клічаўскай партызанскай зоны, прарыве блакады. Запомнілася 29 лістапада, калі мы злучыліся з перадавой разведкай Чырвонай арміі, а потым уліліся ў 37 гвардзейскую стралковую дывізію 19-га стралковага корпуса 1-га Беларускага фронту. Прымаў удзел у вызваленні г. Асіповічы. У складзе дывізіі з баямі дайшоў да заходняй граніцы нашай рэспублікі. Ваяваў потым яшчэ ў Польшчы, Германіі. Я ўсю вайну быў мінамётчыкам у 172-м палку. Служыў да 1947 г. Атрымаў тры раненні, з іх два цяжкія. Дамоў вярнуўся старшым сяржантам.

Маю і ўрадавыя ўзнагароды: ордэны Чырвонай Зоркі — за баі пад Пілау, і Айчыннай вайны I ступені, а таксама медалі «За адвагу», два «За баявыя заслугі», «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» I ступені, «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне».

БАГДАНОВІЧ Аляксандр Паўлавіч. Нарадзіўся ў 1919 г. у в. Ясень. 4 красавіка 1940 г. быў прызваны ў Чырвоную армію. Скончыў вучылішча лётчыкаў — паскораны курс. З канца сорак першага пачалася ваенная біяграфія на Ленінградскім фронце, затым — на 1-м Беларускім. Скончыў вайну на Далёкім Усходзе ў званні лейтэнанта ў складзе 1-га Далёкаўсходняга фронту: мільённую квантунскую армію разгромілі даволі хутка, недзе за пару тыдняў.

Асабліва запомніліся паветраныя бітвы пры вызваленні Ліепаі, Таліна, Выбарга, Карэльскага перашыйка. Ён быў узнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі.

Ваенную службу скончыў на Далёкім Усходзе ў ліпені 1948 г. Пасля дэмабілізацыі працаваў старшынёй Восаўскага сельсавета, выкладчыкам у Бабруйскім аэраклубе, потым пераехаў у в. Ясень. Да выхаду на пенсію працаваў у мясцовым калгасе на розных работах. Памёр у 1993 г.

КАЗЛОЎ Захар Захаравіч. Нарадзіўся ў 1915 г. у в. Ясень. Удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі ў верасні 1939 г., савецка-фінляндскай вайны. На франтах Вялікай Айчыннай вайны ад яе пачатку да Вялікай Перамогі. Ваеннае званне — старшы сяржант, ваенфельчар. Адказваў за маёмасць палкавога шпіталя. Задача ставілася канкрэтная: забеспячэнне вывазу параненых у баях салдат і афіцэраў у медсанбат. Часта даводзілася і самім прымаць удзел у баях, браць у рукі аўтамат і пускаць яго ў справу. Асабліва запомніліся яму баі за гарады Вільнюс і Кёнігсберг. У адным з баёў яны ўзялі ў палон 5 салдат праціўніка — тады яго ўзнагародзілі медалём «За адвагу».

Пазней быў яшчэ ўзнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне». Пасля вайны працаваў фельчарам. Памёр у 1991 г.

СІДАРОВІЧ Канстанцін Адамавіч. Нарадзіўся ў 1917 г. у в. Ясень. За час пра-

ходжання службы пашкодзіў нагу і быў дэмабілізаваны. Вайну сустрэў дома. Не ўзялі і на фронт. Жыў у Ясені, быў сувязным у асобным партызанскім атрадзе № 309, які ўзначальваў Самсонік.

Пасля вызвалення Ясеня добраахвотнікам пайшоў на фронт. У складзе 3-га Беларускага фронту з баямі, як і на 1-м Беларускім фронце, дайшоў да Куршскай касы ва Усходняй Прусіі. Тут жа і скончыў вайну. У Эльбергу іх часць расфарміравалі. Добра запомніўся загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага аб сканчэнні вайны, якому ўсе вельмі радаваліся — і што жывымі засталіся, і што перамаглі фашызм, што можна вярнуцца дамоў і прыступіць да мірнага жыцця... Памёр К.А.Сідаровіч у 1993 г.

* * *

Гэта аб лёсе толькі асобных абаронцаў Радзімы, якія прайшлі ваеннае пекла. Яны не былі адзначаны вышэйшымі ўзнагародамі, гэта простыя салдаты, тыя, на плячах якіх і ляжаў увесь цяжар барацьбы з люты м ворагам.

Многія загінулі ў час Вялікай Айчыннай. Той жа, каму пашчасціла выжыць, вярнуўся да мірнай працы і пастараўся сумленна пражыць жыццё і за сябе, і за баявых сяброў, якія не вярнуліся з поля бою. Словам, гэта звычайныя лёсы нашых незвычайных людзей — абаронцаў Радзімы.

Э.М.Васіленка.

Яны вярнуліся пераможцамі

На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанах змагаліся з ворагам тысячы сыноў і дачок Асіповіцкай зямлі. Парознаму склаўся іх ваенны лёс: хтосьці прайшоў франтавымі дарогамі з першых дзён вайны да апошніх, для іншых фронт закончыўся праз месяц-другі з-за ранення ці па нейкіх іншых прычынах, шмат нашых землякоў навечна спачылі ў зямлі розных краін Еўропы. Але кожны з тых, хто дажыў і не дажыў да пераможнага мая 1945-га, унёс свой важкі ўклад у агульную справу Перамогі.

Раённая камісія па падрыхтоўцы кнігі «Памяць» імкнулася сабраць звесткі і назваць на старонках кнігі не толькі загінуўшых і прапаўшых без вестак воінаў-землякоў, але і тых, хто вярнуўся з вайны дадому. Спіс іх прыводзіцца ніжэй. На жаль, пра паўнату яго гаварыць цяжка: занадта позна стаў складацца такі спіс. З-за напластаванняў часу і іншых абставін далёка не ўсе нашы землякі-франтавікі трапілі сюды. Няхай за гэта выбачаюць нас ветэраны і іх родныя. Усім ім — хто дажыў да нашых дзён і каго ўжо няма сярод нас, хто названы і не названы тут, аднолькава шчырая ўдзячнасць і нізкі паклон ад нашчадкаў.

АБАКШОНАК Мікалай Мікалаевіч, маёр, Калінінскі, 1-ы Прыбалтыйскі, 3-і Беларускі франты, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеней, Чырвонай Зоркі (двойчы), медалямі «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй»*, «За перамогу над Японіяй».

АБРАМОВІЧ Віктар Сцяпанавіч, н. у 1921, сяржант, 1, 2 і 3-і Беларускія франты, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеней, медалямі «Партызану Айчыннай вайны» II ступені, «За адвагу», «За баявыя заслугі», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За вызваленне Варшавы», «За перамогу над Германіяй».

АБРАМЧЫК Міхаіл Іванавіч, н. у 1912, радавы, партызанскі атрад «Непераможны» 3-й Мінскай брыгады, 1-ы Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі «Партызану Айчыннай вайны» II ступені, «За адвагу», «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй».

АДАКІМЧЫК Аляксандр Іванавіч, н. у 1912, партызан атрада № 210 імя І.В.Сталіна Асіповіцкай брыгады, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, «Знак Пашаны», медалём «За перамогу над Германіяй».

АДЗІНЕЦ Васіль Барысавіч, н. у 1923, лейтэнант, Волхаўскі, 1-ы Украінскі франты, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, медалём «За перамогу над Германіяй».

АДЗІНЦОЎ Васіль Дзмітрыевіч, н. у 1919 у в. Хварасцянка Куркінскага р-на Тульскай вобл., партызан брыгады № 161 імя Р.І.Катоўскага, стар-

* Тут і далей назва медаля «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.» даецца скарочана.

шы сяржант, 2-і Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Славы III ступені, медалямі «Партызану Айчыннай вайны» I ступені, «За перамогу над Германіяй».

АКСЁНАЎ Васіль Іларыёнавіч, н. у 1926, малодшы сяржант, разведчык, 1-ы Украінскі фронт, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За баявыя заслугі», «За вызваленне Варшавы», «За вызваленне Прагі», «За перамогу над Германіяй».

АЛЕКСАНДРОЎ Мікалай Ціханавіч, н. у 1915, радавы, Заходні фронт, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеней, медалём «За перамогу над Германіяй».

АЛЬХАВЕЦ Сямён Міронавіч, камісар партызанскага атрада імя С.М.Кірава брыгады Р.І.Катоўскага, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі (двойчы), медалём «За перамогу над Германіяй».

АЛЬХОВІК Барыс Карпавіч, н. у 1924 у в. Брыцалавічы Асіповіцкага р-на, 1-ы Украінскі фронт, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

АЛЬХОВІК Канстанцін Ігнатавіч, н. у 1910 у в. Брыцалавічы Асіповіцкага р-на, радавы, 2-і Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

АЛЬХОВІК Павел Ігнатавіч, н. у 1923 у в. Брыцалавічы Асіповіцкага р-на, партызан атрада № 211 імя К.К.Ракасоўскага Асіповіцкага злучэння, малодшы сяржант, 2-і Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй».

АЛЬХОВІК Фёдар Піліпавіч, н. у 1923 у в. Брыцалавічы Асіповіцкага р-на, партызанскі атрад № 211 імя К.К.Ракасоўскага Асіповіцкага злучэння, радавы, 1-ы Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Славы III ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі «Партызану Айчыннай вайны» II ступені, «За перамогу над Германіяй».

АЛЬШАНІК Мацвей Сцяпанавіч, н. у 1913 у в. Ясень Асіповіцкага р-на, радавы, 1-ы Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

АЛЯКСЕЕНКА Міхаіл Іларыёнавіч, н. у 1920, старшы сяржант, 1-ы Украінскі фронт, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

АЛЯКСЕЙЧЫК Віктар Сямёнавіч, н. у 1915, камандзір дывізіёна, Заходні, Калінінскі, Бранскі, 2-і Прыбалтыйскі франты, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Аляксандра Неўскага, медалямі «За абарону Масквы», «За перамогу над Германіяй».

АЛЯКСЕЙЧЫКАЎ Ціт Максімавіч, н. у 1909, радавы, 2-і Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За вызваленне Варшавы», «За перамогу над Германіяй».

АМЯЛЬЧЭНЯ Сямён Якаўлевіч, н. у 1925, радавы, 1-ы Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны.

АНАНЬЕЎ Аляксандр Сідаравіч, н. у 1923, малодшы сяржант, 1-ы Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі», «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй».

АНДРЫЕВІЧ Георгій Іванавіч, н. у 1925, радавы, партызанскі атрад 1-й Бабруйскай брыгады, 1-ы Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу», «Партызану Айчыннай вайны» II ступені, «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй».

АРАХОЎСКАЯ Ніна Сцяпанаўна, н. у 1924, на ст. Верайцы Асіповіцкага р-на, партызанскі атрад імя В.М.Молатава 2-й Мінскай брыгады, узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «Партызану Айчыннай вайны» II ступені, «За перамогу над Германіяй».

АРЛОЎ Анатоль Іванавіч, н. у 1923 у Віцебску, маёр, Заходні, Калінінскі, Цэнтральны, 1-ы Украінскі франты, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, медалём «За перамогу над Германіяй».

АРЛОЎ Андрэй Іосіфавіч, н. у 1923 у г. Асіповічы, партызан атрада імя А.С.Шашуры 2-га Мінскага злучэння, радавы, 2-і Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі», «Партызану Айчыннай вайны» II ступені, «За вызваленне Варшавы», «За перамогу над Германіяй».

АРЦЫМОВІЧ Ганна Іосіфаўна, н. у 1921, старшына медслужбы, хірургічная сястра, Паўднёва-Заходні, Сталінградскі франты, узнагароджана ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, медалямі «За баявыя заслугі» (двойчы), «За абарону Сталінграда», «За абарону Кіева», «За вызваленне Прагі», «За перамогу над Германіяй».

АРЦЮШЧЫК Іван Андрэевіч, н. у 1926, радавы, партызанскі атрад № 211 імя К.К.Ракасоўскага Асіповіцкага злучэння, 1-ы Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу», «Партызану Айчыннай вайны» II ступені, «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй».

АСЕЦКІ Людвіг Браніслававіч, н. у 1912 у в. Затон Светлагорскага р-на Гомельскай вобл., Заходні, Паўночна-Заходні, 1-ы Украінскі франты, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырво-

най Зоркі, медалямі «За баявыя заслугі», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй».

АСОЎСКІ Кіяфаш Уладзіміравіч, н. у 1923, старшы сяржант, 1-ы і 2-і Беларускія франты, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, медалём «За перамогу над Германіяй».

АСТАПОВІЧ Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1924, радавы, 1-ы Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі «За адвагу», «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй».

АСТАШКІН Міхаіл Сцяпанавіч, н. у 1926, радавы, 1-ы Беларускі фронт, удзельнік Парада Перамогі ў Маскве ў 1945, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

АСТРОЎСКІ Іван Маркавіч, н. у 1925, радавы, 2-і Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй».

АЎСЯНІКАЎ Мікалай Акімавіч, н. у 1919, старшына, 1-ы Украінскі фронт, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу», «За ўзяцце Берліна», «За вызваленне Прагі», «За перамогу над Германіяй».

АХРЭМЕНКА Сяргей Лукіч, н. у 1919, радавы, Паўднёвы, Сцяпны, 2-і Украінскі франты, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі (двойчы), Славы III ступені, медалём «За перамогу над Германіяй».

БАБІЦКІ Сцяпан Браніслававіч, н. у 1912, сяржант, 134-я стралковая дывізія, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі «За адвагу», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй».

БАБКОЎ Аляксандр Сямёнавіч, н. у 1921, радавы, 1-ы Украінскі фронт, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, Славы III ступені, медалём «За перамогу над Германіяй».

БАГДАНАЎ Уладзімір Рыгоравіч, н. у 1915, радавы, Заходні, 2-і Украінскі франты, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалём «За перамогу над Германіяй».

БАГДАНОВІЧ Васіль Васільевіч, н. у 1923, сяржант, 1-ы і 2-і Беларускія франты, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі (тройчы), медалямі «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй».

БАГДАНОВІЧ Дзмітрый Мікітавіч, н. у 1924, старшына роты, 1 і 2, 3-і Беларускія франты, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі «За баявыя заслугі», «За ўзяцце Будапешта».

БАГДАНОВІЧ Іван Сямёнавіч, н. у 1926, радавы, партызанскі атрад № 213 «За Савецкую Беларусь», 1, 2, 3-і Беларускія франты, узнагароджаны

М.С.Асташкін.

І.С.Багдановіч.

ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі «За баявыя заслугі», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй».

БАГДАНОВІЧ Лізавета Раманаўна, н. у 1917, радавая, партызанка атрада № 211 імя К.К.Ракасоўскага Асіповіцкага злучэння, узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалём «Партызану Айчыннай вайны» II ступені.

БАГДАНОВІЧ Міхаіл Фёдаравіч, н. у 1924, радавы, 2-і Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеней, Чырвонай Зоркі, медалямі «За ўзяцце Кёнігсберга», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй».

БАГДАНОВІЧ Фелікс Раманавіч, н. у 1913, радавы, партызан атрада № 210 імя І.В.Сталіна Асіповіцкага злучэння, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалём «За адвагу».

БАДЗЮКОЎ Уладзімір Цімафеевіч, н. у 1922, Цэнтральны фронт, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалём «За адвагу».

БАЙКО Іван Лявонцьевіч, н. у 1920, радавы, 1-ы Украінскі фронт, узнагароджаны ордэнам Славы III ступені, медалём «За перамогу над Германіяй».

БАЛВАНОВІЧ Уладзімір Пятровіч, н. у 1924, радавы, 2-і Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

БАЛОЦЬКА Ілья Рыгоравіч, н. у 1922, сяржант, партызанскі атрад імя Ф.Э.Дзяржынскага, 1-ы Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі «За адвагу», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй».

БАЛТАК Генадзь Васільевіч, падпалкоўнік, Заходні, Цэнтральны, 1-ы Беларускі франты, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі.

БАНДАРЭНКА Уладзімір Мікалаевіч, кіраўнік падпольнай арганізацыі, узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонай Зоркі, Працоўнага Чырвонага Сцяга (двойчы).

БАРАЗНА Іван Нічыпаравіч, н. у 1911, камандзір аддзялення, 1-ы і 2-і Беларускія франты, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, «Знак Пашаны», медалямі «За баявыя заслугі», «За працоўную доблесць», «За перамогу над Германіяй».

БАРАЗНА Іван Яфімавіч, н. у 1925, сяржант, 1-ы Беларускі, 2-і Прыбалтыйскі франты, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеней, Славы III ступені, медалямі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

БАРАЗНА Павел Яфімавіч, н. у 1923, радавы, партызанскі атрад № 211 імя К.К.Ракасоўскага Асіповіцкага злучэння, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі «За адвагу», «Партызану Айчыннай вайны» II ступені, «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй».

БАРАЗНА Рыгор Нічыпаравіч, н. у 1915, камандзір партызанскага атрада № 211 імя К.К.Ракасоўскага Асіповіцкага злучэння, узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга (двойчы), Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

БАРАЗНА Уладзімір Аляксеевіч, н. у 1919, сяржант, 1-ы і 2-і Беларускія, 1-ы Украінскі франты, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалём «За баявыя заслугі», «За ўзяцце Берліна».

БАРАЗНА Уладзімір Міхайлавіч, н. у 1923, радавы, партызанскі атрад № 211 імя К.К.Ракасоўскага Асіповіцкага злучэння, 2-і Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Славы III ступені, медалём «За перамогу над Германіяй».

БАРАНАВА Ганна Дзмітрыеўна, н. у 1918, партызанскі атрад № 211 імя К.К.Ракасоўскага Асіповіцкага злучэння, узнагароджана ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, медалямі «Партызану Айчыннай вайны» II ступені, «За перамогу над Германіяй».

БАРАНАЎ Іосіф Барысавіч, н. у 1924, радавы, 1-ы Прыбалтыйскі фронт, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За баявыя заслугі», «За ўзяцце Кёнігсберга».

БАРАНОЎСКІ Альберт Паўлавіч, н. у 1926, старшына, партызанскі атрад № 212 імя С.С.Сумчанкі Асіповіцкага злучэння, 1-ы Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеней, Чырвонай Зоркі.

БАРДАЧОЎ Міхаіл Ягоравіч, н. у 1925, старшына, 1-ы Украінскі, 2-і Беларускі франты, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, Славы III ступені, медалямі «За адвагу», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй».

БАРОДЗІН Міхаіл Сцяпанавіч, н. у 1916, радавы, партызанскі атрад імя М.А.Шчорса 3-й Мінскай брыгады, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалём «Партызану Айчыннай вайны» II ступені.

БАРСУК Уладзімір Рыгоравіч, н. у 1922, лейтэнант медслужбы, партызанскі атрад імя Астроўскага брыгады Суворава, 2-і Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

БАРТАШЭВІЧ Сцяпан Ігнатавіч, н. у 1909, радавы, 1-ы Беларускі фронт, узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй».

БАРШЧЭЎСКІ Фёдар Іосіфавіч, н. у 1924, малодшы сяржант, Заходні, 2-і Беларускі франты, узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу» (двойчы), «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй».

БАРЫЧЭЎСКІ Канстанцін Васільевіч, н. у 1913, палкоўнік, Паўночна-Заходні, Заходні, 1-ы Беларускі, 1, 2, 3-і Прыбалтыйскія франты, узнагароджаны

А.А. і М.С.Басанавы.

ордэнамі Чырвонага Сцяга (двойчы), Чырвонай Зоркі (двойчы), медалём «За ўзяцце Берліна».

БАСАНАВА Марыя Станіславаўна, н. у 1919, сувязная Асіповіцкай ВАГ, узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені, 6 медалямі.

БАСАНАЎ Аляксандр Акімавіч, н. у 1915, капітан, 1-ы і 3-і Беларускія, 1, 3, 4-ы Украінскія, Бранскі франты, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонага Сцяга,Чырвонай Зоркі, медалямі «За баявыя заслугі» (двойчы), «За ўзяцце Кёнігсберга», «За ўзяцце Берліна».

БАТУРА Мікалай Іванавіч, н. у 1922, старшы сяржант, 1-ы і 2-і Беларускія франты, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За ўзяцце Прагі», «За перамогу над Германіяй».

БАТУРА Мікалай Паўлавіч, н. у 1926, радавы, 2-і Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

БЕЙМАНАЎ Піліп Фёдаравіч, н. у 1916, старшы сяржант, Заходні, 1-ы Украінскі франты, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалём «За баявыя заслугі».

БЕЛАЗЁР Кірыл Андрэевіч, н. у 1913, партызанскі атрад № 2 2-й Мінскай брыгады, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «Партызану Айчыннай вайны» II ступені, «За перамогу над Германіяй».

БЕЛАХВОСТ Міхаіл Цімафеевіч, н. у 1910, камандзір узвода партызанскага атрада № 309 імя С.М.Кірава, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «За перамогу над Германіяй».

БЕЛАХВОСТАЎ Дзмітрый Іванавіч, н. у 1920, Ленінградскі фронт, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі «За абарону Ленінграда», «За перамогу над Германіяй».

БЕЛАЯ Аляксандра Аляксандраўна, н. у 1923, сувязная партызанскага атрада № 211 імя К.К.Ракасоўскага Асіповіцкага злучэння, узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалём «За перамогу над Германіяй».

БЕЛЫ Павел Іосіфавіч, н. у 1910 у в. Ясень Асіповіцкага р-на, 1-я Асіповіцкая партызанская брыгада, узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «Партызану Айчыннай вайны» II ступені, «За перамогу над Германіяй», «20 гадоў перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне».

БЕЛЬЧЫКАЎ Віктар Фёдаравіч, н. у 1924, лейтэнант, 1-ы і 2-і Прыбалтыйскія франты, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

БЕРЗІНА Ірына Георгіеўна, н. у 1921, 1-ы Беларускі фронт, узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі «За баявыя заслугі», «За абарону Ленінграда», «За перамогу над Германіяй».

БІОХ Карл Ігнатавіч, н. у 1923, радавы, партызанскі атрад № 210 імя І.В.Сталіна Асіповіцкага злучэння, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Славы III ступені, медалямі «Партызану Айчыннай вайны» I ступені, «За перамогу над Германіяй».

БЛАЖЭВІЧ Фелікс Іванавіч, н. у 1913, начальнік аператыўнага аддзялення дывізіі, Ленінградскі фронт, у складзе Войска польскага, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, двума ордэнамі Польскай Рэспублікі, медалямі «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна».

БЛІЗНЕЦ Аляксандр Міхайлавіч, н. у 1925, сяржант, 1-ы Прыбалтыйскі фронт, узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, медалём «За перамогу над Германіяй».

БЛІЗНЕЦ Іван Тарасавіч, н. у 1927, малодшы сяржант, партызанскі атрад № 210 імя І.В.Сталіна Асіповіцкага злучэння, 1-ы Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «Партызану Айчыннай вайны» II ступені, «За перамогу над Германіяй».

БЛІЗНЕЦ Міхаіл Лявонавіч, радавы, узнагароджаны ордэнамі Славы III ступені (двойчы), Чырвонай Зоркі, медалём «За адвагу».

БЛІЗНЮК Аляксандр Аляксандравіч, н. у 1920, камандзір узвода партызанскага атрада № 756 12-й кавалерыйскай брыгады імя І.В.Сталіна, узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, медалямі «Партызану Айчыннай вайны» I ступені, «За перамогу над Германіяй».

БОНДАР Аркадзь Міхайлавіч, н. у 1915, радавы, партызанскі атрад № 309 імя С.М.Кірава, 2-і Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Славы III ступені.

БРУШКОЎ Мікалай Міронавіч, н. у 1925, радавы, 1-ы Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнам Славы III ступені, медалямі «За адвагу» (двойчы), «Партызану Айчыннай вайны» I ступені.

БРЫКА Пётр Дзям'янавіч, н. у 1926, радавы, 1353-ы зенітны артылерыйскі полк асобнай дывізіі процівапаветранай абароны, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

БРЫКАЛЬСКАЯ Станіслава Яўгенаўна, н. у 1925, радавая, партызанка атрада № 212 імя С.С.Сумчанкі Асіповіцкага злучэння, узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

БРЫЛЕЎСКІ Віктар Ігнатавіч, н. у 1926, старшы сяржант, 3-і Украінскі фронт, узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны II ступені.

БУГАР Іван Данілавіч, н. у 1910, яфрэйтар, Цэнтральны, 1-ы Беларускі франты, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй».

В.В.Буракоў.

БУДКОЎ Пётр Піліпавіч, н. у 1922, радавы, 1-ы Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі «За адвагу», «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна».

БУЗАК Васіль Васільевіч, радавы, Карэльскі, 2-і Беларускі франты, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Славы III ступені.

БУЛГАКАЎ Аляксандр Якаўлевіч, н. у 1914, капітан, Карэла-Фінскі, 3-і і1-ы Украінскія, 3-і Беларускі франты, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеней, Чырвонай Зоркі, медалямі «За баявыя заслугі», «За абарону Савецкага Запаляр'я», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За ўзяцце Берліна».

БУЛКА Фёдар Сцяпанавіч, н. у 1923, малодшы лейтэнант, партызанскі атрад імя М.А.Шчорса, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі», «Партызану Айчыннай вайны» I ступені, «За перамогу над Германіяй».

БУРАК Барыс Дзмітрыевіч, н. у 1921, Ленінградскі, Волхаўскі франты, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Славы II і III ступеней, медалямі «За адвагу», «За абарону Ленінграда», «За перамогу над Германіяй».

БУРАКОЎ Васіль Васільевіч, н. у 1923, палкоўнік, Варонежскі, Сталінградскі, 1, 2, 3-і Беларускія, 2-і Прыбалтыйскі, Ленінградскі франты, узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Аляксандра Неўскага, Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі (тройчы), «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» III ступені, медалямі «За баявыя заслугі», «За абарону Сталінграда», «За перамогу над Японіяй».

БУРАЧЭЎСКІ Уладзімір Уладзіміравіч, н. у 1924, малодшы сяржант, 3-і Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі «За адвагу», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй».

БУРЛЁЎ Пётр Гардзеевіч, н. у 1918, радавы, Бранскі, Паўночна-Каўказскі, 4-ы Украінскі, Варонежскі франты, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

БУСЕЛЬ Алена Пятроўна, н. у 1922, радавая, Сталінградскі, Данскі, Заходні, Бранскі, 2-і Беларускі франты, узнагароджана ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі «За баявыя заслугі», «За абарону Сталінграда», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй».

БЫКАНАЎ Сяргей Дзмітрыевіч, старшы лейтэнант медыцынскай службы, Калінінградскі фронт, узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі» (двойчы), «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй».

БЫКАЎ Афанасій Васільевіч, н. у 1914, 2-і Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

БЫКАЎ Вікенцій Абрамавіч, н. у 1921, капітан, 2-і Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

БЫЧАНОК Пётр Трафімавіч, н. у 1927, малодшы сяржант, партызанскі атрад імя С.М.Будзённага, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі «Партызану Айчыннай вайны» II ступені, «За перамогу над Германіяй».

БЯКМЕЦЬЕЎ Аляксандр Лявонцьевіч, н. у 1924, сяржант, 2-і Украінскі фронт, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі».

БЯЛЯЎСКІ Пётр Цімафеевіч, н. у 1920, сяржант, Ленінградскі, 2-і Беларускі франты, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі «За адвагу», «За абарону Ленінграда», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй».

ВАЛАНКОВІЧ Аляксандр Пятровіч, н. у 1927, радавы, партызанскі атрад № 214 імя М.І.Калініна Асіповіцкага злучэння, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

ВАЛАНКОВІЧ Іван Яфімавіч, н. у 1926, радавы, 2-і Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй».

ВАЛНУШКІН Леў Мікалаевіч, н. у 1926, старшына, Ленінградскі, 3-і Украінскі франты, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі», «За ўзяцце Вены», «За перамогу над Германіяй».

ВАНКЕВІЧ Іосіф Фларыянавіч, н. у 1923, радавы, партызанскі атрад № 210 імя І.В.Сталіна Асіповіцкага злучэння, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «Партызану Айчыннай вайны» II ступені, «За перамогу над Германіяй».

ВАРАБЕЙ Павел Васільевіч, н. у 1917, чырвонаармеец, Заходні, Паўднёва-Заходні, Сталінградскі,

3-і Украінскі франты, узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Славы III ступені, медалямі «За абарону Сталінграда», «За перамогу над Германіяй».

ВАРАБ'ЁЎ Васіль Маркавіч, н. у 1924, старшына, 1-ы Украінскі фронт, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеней, Славы III ступені, медалямі «За адвагу», «За ўзяцце Берліна», «За вызваленне Прагі», «За перамогу над Германіяй».

ВАРАКСА Іван Сцяпанавіч, н. у 1925, радавы, 2-і Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

ВАРАКСА Фёдар Піліпавіч, н. у 1914, радавы, 2-і Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

ВАСІЛЕНКА Пётр Пятровіч, н. у 1920, радавы, Заходні, Калінінскі, 2-і Беларускі франты, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, двума медалямі «За адвагу».

ВАСІЛЬЕЎ Сяргей Кірылавіч, н. у 1925, старшы сяржант, 1-ы Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеней, медалямі «За адвагу», «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй».

ВАСЬКО Аляксандр Емяльянавіч, н. у 1914, радавы, 2-і Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Славы II і III ступеней, медалямі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй».

ВАСЬКОВІЧ Міхаіл Васільевіч, н. у 1925, радавы, 1-ы Беларускі фронт, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй».

ВАСЮХНОЎ Сяргей Васільевіч, н. у 1920, маёр, Паўднёва-Заходні, Бранскі, Сталінградскі, 2-і і 4-ы Украінскія франты, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За баявыя заслугі», «За ўзяцце Вены», «За ўзяцце Будапешта», «За перамогу над Германіяй».

ВЕЙДЭ Вара Аляксееўна, н. у 1921, радавая, 3-і Беларускі фронт, узнагароджана ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй».

ВЕЛЬГІН Аляксандр Сцяпанавіч, Заходні, 1-ы Прыбалтыйскі франты, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі (двойчы), медалём «За перамогу над Германіяй».

Пасяўная плошча адноўлена на 98,4 працэнта.

У калгасах створана 336 жывёлагадоўчых ферм, з іх буйной рагатай жывёлы 98, аўцаферм 82, свінаферм 75, птушкаферм 81, пчолапасек 31.

Пагалоўе буйной рагатай жывёлы павялічылася ў параўнанні з 1944 годам у калгасах у 12,9 раза і ў калгаснікаў — у 4,5 раза.

Адноўлена і працуюць 20 прамысловых прадпрыемстваў і арцеляў.

Пабудавана дамоў для калгаснікаў 1818 і для рабочых і служачых 244.

Адпушчана крэдыту калгасам 1527 тысяч, калгаснікам 5930 тысяч і рабочым і служачым 1 398 500 рублёў.

Адпушчана лесу бясплатна 69 344 кубаметра.

За 4 гады ўкладзена дзяржавай у аднаўленне гаспадаркі раёна па бюджэту 24 975 100 рублёў.

За пасляваенныя гады выдана дапамогі і пенсій 12 565 328 рублёў.

Дапамогі адзінокім і многасямейным мацерам выдана 3 565 328 рублёў.

Бюджэт раёна на 1948 год зацверджаны па выдатках у суме 11 171 800 рублёў.

Калгасы «Перадавік» і «Большэвік» Верайцоўскага сельсавета, «Шлях волі» Зборскага, «Большэвік» і імя Молатава Лапіцкага сельсавета аднавілі жывёлагадоўчыя фермы з пагалоўем, якое налічвалася да Айчыннай вайны.

Калгасы «Усход» Свіслацкага сельсавета, «Селькор» Зборскага, імя Варашылава Ясенскага сельсавета цяпер знімаюць ураджай вышэй, чым да Айчыннай вайны.

Адраджэнне краю

Развіццё горада і раёна запавольвалася адсутнасцю належнай энергетычнай базы. У адпаведнасці з заданнямі 5-га пяцігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі БССР (1951—1955) у Асіповічах прадугледжвалася будаўніцтва гідраэлектрастанцыі на р. Свіслач, павелічэнне прамысловай вытворчасці на 70%. Задача была паспяхова выканана — восенню 1953 г. Асіповіцкая ГЭС дала ток. У горадзе была пабудавана падстанцыя, створаны сеткавы ўчастак. Гэта садзейнічала росту прамысловай вытворчасці, развіццю культуры і паляпшэнню бытавых умоў насельніцтва. На прамкамбінаце быў уведзены ў эксплуатацыю добра абсталяваны сталярны цэх, які выпускаў школьныя парты, мэблю, аконныя рамы, дзвярныя палотны і іншыя вырабы. У 1953 г. уступіў у строй хлебазавод, што дало магчымасць ліквідаваць цяжкасці ў забеспячэнні насельніцтва хлебам.

З 1950 г. пачалося аб'яднанне дробных калгасаў, кожны з якіх, як правіла, размяшчаўся ў адной вёсцы. Гэта садзейнічала канцэнтрацыі людскіх і матэрыяльных рэсурсаў, больш эфектыўнаму выкарыстанню зямлі, давала большыя магчымасці ў набыцці рознай сельскагаспадарчай тэхнікі.

Значных поспехаў у павышэнні хуткасці руху і вагі паяздоў, скарачэнні тэрмінаў рамонту рухомага саставу, павелічэнні часу міжрамонтных прабегаў дабіўся калектыў чыгуначнага вузла. Многія асіповіцкія чыгуначнікі былі ўдастоены высокіх урадавых узнагарод. Другім ордэнам Леніна і знакам «Ганаровы чыгуначнік» узнагароджаны машыніст Л.Ф.Байкачоў, ордэнам Леніна — машыніст А.К.Курчэўскі і брыгадзір комплекснай брыгады па рамонце паравозаў У.Е.Валько, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга — электрамеханік дыстанцыі сувязі Р.А.Елісееў.

Вялося будаўніцтва школ, дзіцячых дашкольных, культурна-асветных і медыцынскіх устаноў. У 1951 г. уведзены кінатэатр «Радзіма» на 250 месцаў. Пазней было адноўлена памяшканне васьмігадовай школы і расшыраны гарадскі дзіцячы сад, пабудаваны новыя памяшканні для раённай бальніцы, колькасць ложкаў у якой павялічылася ў 2 разы. Адкрыўся процітуберкулёзны дыспансер.

Развівалася сетка грамадскага харча-

вання. У 5-й пяцігодцы былі адкрыты прывакзальны рэстаран і сталовая для чыгуначнікаў.

У гады 6-й пяцігодкі (1956—1960) на прадпрыемствах горада і раёна, на чыгуначным вузле разгарнулася спаборніцтва за павышэнне прадукцыйнасці працы, лепшае выкарыстанне наяўных вытворчых магутнасцей, перавыкананне планавых заданняў і павышэнне якасці выпускаемай прадукцыі.

У леспрамгасе пачалі выкарыстоўвацца трактары, бензапілы «Дружба». Да 1956 г. работы па валцы і раскрыжоўцы лесу былі поўнасцю механізаваны. На вывазцы сталі працаваць магутныя лесавозы. Лесагандлёвы склад пабудаваў цэх шырспажыву.

У 1956 г. быў расшыраны хлебазавод, а харчовая арцель «Перадавік» аб'яднана з гархарчкамбінатам.

Узрасла колькасць прадпрыемстваў гандлю і грамадскага харчавання, адкрыліся добраўпарадкаваны гаспадарчы магазін, сталовая на калгасным рынку і прамтаварны магазін на вул. Інтэрнацыянальнай.

У гэтым жа годзе закончана будаўніцтва новага будынка чыгуначнага вакзала, што дазволіла палепшыць абслугоўванне транзітных і мясцовых пасажыраў. Уступіла ў строй вузлавая бальніца. Пачаў працаваць гарадскі Дом піянераў.

На працягу 1957 г. на вул. Сумчанкі быў узведзены будынак раённага камітэта партыі. У паўночнай частцы горада жыхары пасадзілі парк. Паўсюдна вяліся работы па добраўпарадкаванні.

У 1958 г. скончылася будаўніцтва шэрагу жылых і грамадскіх памяшканняў.

У 1959 — 1965 гг. на чыгуначным вузле была абсталявана паўаўтаматычная блакіроўка са святлафорамі і гучнагаварыцельная радыёсувязь. Цераз пуці ўзведзены пераходны мост, што аблегчыла маняўровую работу, скараціла час фарміравання грузавых цягнікоў. Аб'ём перавозак вырас на 35%. Сярэдняя вага грузавога поезда павялічылася на 6,3%, а прадукцыйнасць працы — на 24,1%. Ініцыятарамі ваджэння цяжкавагавых саставаў выступілі машыністы Э.М.Рудкоўскі і Г.А.Аўцюшэнка.

Поспехі асіповіцкіх чыгуначнікаў былі адзначаны ўрадавымі ўзнагародамі. Ордэнаў і медалёў удастоіліся начальнік паравознага дэпо Б.К.Васараўдзе, машыністы Г.С.Маёраў, І.Ф.Раманоўскі, памочнік машыніста І.В.Макаранка, слесар па рамонце паравозаў А.А.Абцэшка, дзяжурны па станцыі В.Н.Бандарэнка, майстар водазабеспячэння В.А.Лёлін, галоўны кандуктар В.М.Быліна.

Прадпрыемствы раёна ў 1965 г. значна павялічылі аб'ёмы выпуску прадукцыі.

Леспрамгас адным з першых у Беларусі ўкараніў буйнапакетную пагрузку хлыстоў на аўтамашыны метадам накатвання. Прамкамбінат адкрыў у горадзе новы цэх канцылярскіх і школьных прылад. Быў расшыраны маслазавод.

Прамысловасць горада папоўнілася ў 1963 г. цэхам тэхналагічнай аснасткі Мінскага аўтазавода, прызначаным для вырабу вузлоў і нестандартнага абсталявання. Паралельна на ім ішла падрыхтоўка да вытворчасці тавараў народнага ўжытку, і хутка быў пачаты выпуск металічных цацак. У 1965 г. асвоены выраб кабін са шклапластыку.

У гэтым жа годзе на базе хлебапрыёмнага пункта пачалося ўзвядзенне буйнога млынкамбіната.

З развіццём будаўнічых работ, павелічэннем вытворчасці прамысловай прадукцыі і ростам насельніцтва Асіповіч і раёна ўзраслі патрэбы ў аўтамабільных перавозках. У 1963 г. была створана аўтабаза № 19.

Палепшылася бытавое абслугоўванне жыхароў горада і раёна ў сувязі з арганізацыяй на аснове арцелей «Прагрэс» і «Сацпраца» камбіната бытавога абслугоўвання.

Павялічылася колькасць школ і дашкольных устаноў. У 1960 г. пабудавана сярэдняя школа № 3 на 640 вучняў, а ў 1963 г. — рэспубліканская школа-інтэрнат для дзяцей, якія перанеслі поліяміэліт. Адкрыты гарадскі № 2 і чыгуначны № 38 дзіцячыя сады. Пачала работу станцыя юных натуралістаў.

Узрасла колькасць урачоў і сярэдняга медыцынскага персаналу. Былі створаны дзіцячая кансультацыя, зубаўрачэбная амбулаторыя. У раённай бальніцы колькасць ложкаў павялічылася да 200. Пабудавана ў Асіповічах другая аптэка. У новы будынак пераехала санітарна-эпідэміялагічная станцыя.

Вялікая ўвага надавалася фізкультуры і спорту. У 1959 г. створана добраахвотнае сельскае спартыўнае таварыства «Ура-

джай», у 1960 г. — дзіцяча-юнацкая спартыўная школа.

Атрымала далейшае развіцце паштова-тэлеграфная сувязь: у 1959 г. зманціравана тэлефонная станцыя, пачаліся падрыхтоўчыя работы да ўзвядзення Асіповіцкай АТС.

За сямігодку (1959—1965) толькі ў райцэнтры было пабудавана 549 жылых дамоў. Узведзены новы будынак райвыканкома, гасцініца. У 1959 г. пачалася пракладка водаправода. Да канца сямігодкі гараджане атрымалі першыя 210 газавых установак. Было забрукавана і заасфальтавана 12 вуліц і 13 км тратуараў.

Адноўлены горад пашыраў свае межы, і вёска Асіповічы, якая дала калісьці назву чыгуначнай станцыі і вырасшаму каля яе пасёлку, злілася з раённым цэнтрам. Колькасць жыхароў у ім перавысіла даваенны ўзровень. Узрасла яго роля ў эканоміцы вобласці. 7 сакавіка 1963 г. Асіповічы былі аднесены да гарадоў абласнога падпарадкавання.

Гады 8-й пяцігодкі (1966—1970) сталі для Асіповіцкага раёна пачаткам новага этапу развіцця.

З 1966 г. у калгасах уводзіцца гарантаваная аплата працы. Для паспяховага развіцця вытворчасці і задавальнення патрэб калгаснікаў ствараюцца адпаведныя фонды. Грамадская гаспадарка калгасаў пачынае развівацца на навуковатэхнічнай аснове. Калгасы маюць свае машынна-трактарныя і аўтамабільныя паркі, электрагаспадарку, рамонтныя майстэрні. Праца калгаснікаў становіцца разнавіднасцю індустрыяльнай працы. Павялічваецца колькасць кваліфікаваных работнікаў і спецыялістаў. Дзяржава дапамагае калгасам набываць тэхніку, рамантаваць яе, забяспечвае электраэнергіяй, пастаўляе мінеральныя ўгнаенні.

Усе гэта прыносіць станоўчыя вынікі — развіваецца жывёлагадоўля, расце ўраджайнасць, паляпшаецца дабрабыт працаўнікоў вёскі. Так, за 1967—1970 гг. даход калгаса «Усход» вырас у 2 разы. Высокі ўзровень сельскагаспадарчай вытворчасці мае калгас «Чырвоны ўдарнік», некаторыя іншыя гаспадаркі раёна.

У сувязі з прыняццем рашэння аб прамысловым будаўніцтве пераважна ў сярэдніх і невялікіх гарадах краіны было вырашана размясціць у Асіповічах шэраг прадпрыемстваў саюзна-рэспубліканскага значэння. На развіццё гарадской гаспадаркі накіроўвалася сродкаў у 5 разоў больш, чым у папярэднія 5 гадоў. Інстытутам «Белдзяржпраект» быў распрацаваны і ў 1966 г. зацверджаны праект планіроўкі і забудовы горада да 1985 г.

У 1967 г. за дасягнутыя поспехі калектыў лакаматыўнага дэпо быў узнагароджаны Ганаровай граматай Міністэрства шляхоў зносін СССР, маслазавод — Ганаровай граматай Міністэрства малочнай прамысловасці СССР і ЦК прафсаюза работнікаў харчовай прамысловасці.

Важнай падзеяй у культурным жыцці райцэнтра стала завяршэнне будаўніцтва будынка раённага Дома культуры. Прыня-

Перадавікі жывёлагадоўлі, узнагароджаныя ордэнамі і медалямі за высокія паказчыкі ў працы. 1966 г.

ла першых навучэнцаў музычная школа сямігодка. Адкрылася станцыя юных тэхнікаў.

Самым буйным прадпрыемствам горада па аб'ёме выпускаемай прадукцыі стаў у 1970 г. млынкамбінат № 3, які ўступіў у строй у 1968 г. Яго калектыў датэрмінова асвоіў праектныя магутнасці. За высокія вытворчыя дасягненні дырэктар прадпрыемства Р.Н.Баразна быў узнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

За пяцігодку работнікі Асіповіцкага механазборачнага цэха Мінскага аўтазавода павялічылі выпуск прадукцыі ў 2 разы.

На чыгуначным вузле былі пераведзены на цеплавую цягу напрамкі на Мінск і Гомель. План перавозак чыгуначнікі выканалі датэрмінова — да 5 кастрычніка 1970 г.

Было шырока разгорнута будаўніцтва. Акрамя млынкамбіната ўзводзіліся кардонна-руберойдавы завод, завод жалезабетонных канструкцый, аўтарамонтныя майстэрні, прамысловая база БУ-89, аўтабаза. Уступілі ў строй сталярны цэх прамкамбіната, кансервавы цэх кансервава-харчовага камбіната. Гараджане атрымалі 12 343 м² жылой плошчы — 325 кватэр. Акрамя таго, штогод з дапамогай дзяржавы ўзводзілася 140—150 дамоў індывідуальнымі забудоўшчыкамі. Пабудаваны памяшканні гарвыканкома і аддзялення Дзяржбанка, процітуберкулёзнага дыспансера, дзіцячых садоў-ясляў. Пачала дзейнічаць АТС.

За высокія вытворчыя паказчыкі праца апаратчыцы маслазавода А.С.Шведавай была адзначана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, як і праца пекара-майстра хлебазавода Т.М.Шалай, чыгуначнікаў Я.Л.Гасцілы, Ф.В.Хаўрэнкі, А.А.Мірончыка, П.І.Карпікава. Ордэнам Леніна ўзнагароджаны начальнік дэпо Б.К.Васараўдзе, дарожны майстар Р.М.Толкач. Ордэны Працоўнага Чырвонага Сцяга атрымалі дарожны майстар А.П.Мардусевіч, старшы электрамеханік З.М.Старобінскі, майстар вагоннага дэпо Л.М.Чаропка, начальнік дыстанцыі пуці М.І.Гарадзіскі.

У гады 9-й пяцігодкі (1971—1975) у Асіповічах працягвалася хуткае развіццё прамысловасці. Прадугледжвалася павялічыць выпуск прадукцыі ў 2 разы. Намячалася расшырэнне жыллёвага і культурна-бытавога сектара. Агульны аб'ём капіталаўкладанняў у гарадскую гаспадарку павялічыўся ў параўнанні з папярэдняй пяцігодкай у 3 разы.

У 1972 г., калі адзначаўся 100-гадовы юбілей роднага горада, рабочыя прамысловых прадпрыемстваў выканалі план 10 месяцаў на 106%. Калектыў аўтабазы № 19 ужо 15 лістапада выканаў план грузавых перавозак. Чыгуначнікі за 10 месяцаў перавезлі звыш задання 768 т грузаў, зэканоміўшы пры гэтым 1755 т паліва. Датэрмінова была завершана электрыфікацыя ўчастка чыгункі ад станцыі Талька да станцыі Асіповічы, і 3 лістапада — на 1,5 месяца раней намечанага тэрміну — сюды прыбыў з Мінска першы электрапоезд. Асабліва вызначыліся млынкамбінат, кардонна-руберойдавы завод, які даў першую прадукцыю, і чыгуначны вузел.

За выкананне заданняў пяцігодкі член бюро райкома КПБ, дэпутат гарадскога Савета, кавалер ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга машыніст Я.Л.Гасціла быў удастоены ордэна Леніна. Калона лакаматываў, якую ён узначальваў, за 3 гады перавезла звыш плана каля 1,5 мільёна т народнагаспадарчых грузаў і зэканоміла амаль 2 тыс. т паліва. За гэты час ён навучыў перадавым метадам работы 15 машыністаў і 17 памочнікаў машыністаў.

Працоўныя дасягненні машыніста І.Ф.Раманоўскага адзначаны ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі. Электразваршчык вагоннага дэпо М.П.Палякоў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

У завяршальным годзе пяцігодкі калектыў кардонна-руберойдавага завода на 14 месяцаў раней тэрміну асвоіў праектныя магутнасці. Два гады завод утрымліваў пераходны Чырвоны сцяг ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ. Двум відам прадукцыі прадпрыемства ў 1975 г. быў прысвоены дзяржаўны Знак якасці. Праца 20 рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў адзначана ўрадавымі ўзнагародамі. Сярод іх машыніст карданаробчай машыны Г.С.Голубеў, удастоены ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга. Ён завяршыў асабістую пяцігодку на 5 месяцаў раней тэрміну, унёс 7 рацыяналізатарскіх прапаноў з экана-

мічным эфектам 9 тыс. рублёў. За пастаяннае перавыкананне нормаў выпрацоўкі і выпуск прадукцыі высокай якасці ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга машыніст карданаробчай машыны І.А.Клышка. Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга адзначана праца слесара-рамонтніка А.А.Баешкі і маляра рамонтна-будаўнічага цэха Н.У.Аксіневіч.

У чэрвені завяршыў пяцігадовы план і камбінат хлебапрадуктаў (да 1975 млын-камбінат № 3). Калектыў брыгады, якой кіравала майстар млына В.Н.Бараноўская, выйшаў пераможцам ва Усесаюзным спаборніцтве за паспяховае выкананне 9-й пяцігодкі і быў узнагароджаны Ганаровым дыпломам Міністэрства нарыхтовак СССР і ЦК прафсаюза рабочых і служачых сельскай гаспадаркі і нарыхтовак. Майстар В.Н.Бараноўская і рацыяналізатар токар В.С.Доўнар удастоены ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга.

У цэлым за 9-ю пяцігодку аб'ём валавой прадукцыі прамысловасці горада і раёна павялічыўся больш чым у 2 разы. Значна ўзрасла прадукцыйнасць працы.

У мэтах паляпшэння ўліку і аблягчэння кіраўніцтва прамысловасцю ў 1971 г. створана падлікова-вылічальная станцыя, якая ў 1974 г. аб'яднана з ЦСУ і стала называцца раённай інфармацыйна-вылічальнай станцыяй.

На чыгуначным вузле ў гады 9-й пяцігодкі вялася работа па павелічэнні прапускной і правознай здольнасці, удасканаленні тэхналагічных працэсаў. Увесь грузавы рух пераведзены на цеплавозную цягу. Звыш плана перавезена 4,5 млн. т народнагаспадарчых грузаў, пры гэтым зэканомлена 6,6 т паліва. Прадукцыйнасць працы на рамонтных работах узрасла на 25%.

Маставы майстар А.Е.Гатоўчык быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Калектыў яго брыгады ўтрымліваў ва ўзорным стане збудаванні і заданне пяці гадоў па ўсіх відах рамонту выконваў датэрмінова. Пры гэтым сам Гатоўчык распрацаваў і ўкараніў больш за 10 рацыяналізатарскіх прапаноў з эканамічным эфектам каля 18 тыс. рублёў.

У 2,6 раза ўзрос грузаабарот аўтабазы № 19. Паспяховай яе рабоце садзейнічала завяршэнне ў 1971 г. будаўніцтва новых вытворчых і адміністрацыйнага памяшканняў.

Значнае развіццё атрымаў гандаль. Рознічны тавараабарот вырас у 9-й пяцігодцы на 49,8%. Адчынілі дзверы 5 новых магазінаў, у тым ліку «Турыст», «1000 дробязей». З уводам у эксплуатацыю Дома быту палепшылася бытавое абслугоўванне насельніцтва.

Папоўніліся новым абсталяваннем медыцынскія ўстановы. Павялічылася ў 2 разы карысная плошча паліклінікі чыгуначнага вузла за кошт прыбудовы новага памяшкання.

Гараджане атрымалі 923 кватэры агульнай плошчай 34 314 м² — больш, чым за ўсе папярэднія пасляваенныя пяцігодкі разам узятыя. У новы будынак пераехала школа № 2, адкрыліся дзіцячыя сады-яслі кардонна-руберойдавага завода і чыгункі.

У сельскай гаспадарцы раёна за пяцігоддзе валавая вытворчасць зерня ўзрасла на 63,4%, мяса — на 37%, малака — на 19,7%, яек — у 2,1 раза.

У вытворчасці малака лепшых вынікаў дасягнулі калгасы «Камунар» (па 492 ц на 100 га сельскагаспадарчых угоддзяў) і імя Чарняхоўскага (454 ц). У гэтых гаспадарках атрыманы і самы высокі надой малака ад каровы — адпаведна па 2539 і 2536 кг. Даярка Г.А.Крэпская з саўгаса «Карытнае» надаіла ад каровы па 3940 кг малака.

10-я пяцігодка (1976—1980) для Асіповіцкага раёна стала перыядам далейшага росту. На развіццё гарадской гаспадаркі было накіравана больш за 33 млн. рублёў — у 1,5 раза больш, чым у 9-й пяцігодцы. Планам эканамічнага і сацыяльнага развіцця прадугледжвалася аб'ём вытворчасці да 1980 г. павялічыць у параўнанні з узроўнем 1975 г. на 34%. Пры гэтым асноўную частку прыросту прамысловай прадукцыі намячалася атрымаць за кошт паляпшэння якасці працы і росту яе прадукцыйнасці. Прадугледжвалася давесці ўдзельную вагу вырабаў з дзяржаўным Знакам якасці да 8—10%.

Работнікі прамысловых прадпрыемстваў горада выканалі заданне 1-га года пяцігодкі да 17 снежня і выпусцілі дадаткова прадукцыі больш чым на 2,5 млн. рублёў.

У строй дзеючых уступіў завод аўтамабільных агрэгатаў. Пачалося будаўніцтва новага памяшкання хлебазавода. Пасля рэканструкцыі ў 2 разы ўзрасла магутнасць камбікормавага цэха камбіната

хлебапрадуктаў. Пры гэтым палепшылася якасць прадукцыі, у 2 разы павялічыўся выпуск яе ў гранулах, што значна скараціла страты пры транспарціроўцы. За ўкараненне новай тэхнікі і рацыяналізатарскую работу слесар-электрык Баразна, токар Доўнар, майстар пагрузкі Краснічэнка і начальнік камбікормавага цэха Жыдовіч былі ўзнагароджаны бронзавымі медалямі ВДНГ СССР.

За высокія паказчыкі ў спаборніцтве пастановай Савета Міністраў БССР ад 21 мая 1976 г. кардонна-руберойдаваму заводу было прысвоена імя XXV з'езда КПСС. З 1 красавіка на прадпрыемстве пачала дзейнічаць комплексная сістэма кіравання якасцю прадукцыі. Па выніках работы за год калектыў завода зноў выйшаў пераможцам і ўтрымаў за сабой пераходны Чырвоны сцяг ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ. Па ініцыятыве Пастаяннай камісіі Савета Эканамічнай Узаемадапамогі па каардынацыі навукова-тэхнічных планаў тут, на адным з перадавых прадпрыемстваў галіны, адбылася аператыўная нарада спецыялістаў Балгарыі, Венгрыі, Румыніі, Чэхаславакіі і СССР па перспектывах развіцця вытворчасці рулонных і дахавых матэрыялаў.

Творча працавалі чыгуначнікі. Перавыканалі свае абавязацельствы калона імя XXV з'езда КПСС і створаная ў 1976 г. камсамольска-маладзёжная калона, якія перавезлі звыш плана 736 тыс. т народнагаспадарчых грузаў. Датэрмінова справіліся з заданнямі работнікі вагоннага дэпо і дыстанцыі пуці. А калектывы станцыі і дыстанцыі сігналізацыі і сувязі былі ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі Упраўлення Беларускай чыгункі і прэзідыума Беларускага прафсаюза чыгуначнікаў.

Працоўныя поспехі 24 рабочых і служачых Асіповіч адзначаны ў 1976 г. ордэнамі і медалямі.

У 1977 г. выканком гарадскога Савета прыняў рашэнне аб устанаўленні звання «Ганаровы грамадзянін горада Асіповічы». Першым яго атрымаў Р.Ф.Люлькоў — былы камандзір 120-га стралковага палка 69-й стралковай дывізіі.

У гэтым жа годзе прадпрыемствамі горада і раёна было выпушчана звыш плана вырабаў на 250 тыс. рублёў, а ў цэлым за год — на 777 тыс. рублёў.

Кардонна-руберойдавы завод вырабляў 15% прадукцыі з дзяржаўным Знакам якасці. За высокія паказчыкі Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў прадпрыемства Ганаровай граматай. Па выніках работы ў 1977 г. яго калектыў атрымаў пераходны Чырвоны сцяг ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ.

Завод стаў школай перадавога вопыту. Пры ім працавалі пастаянна дзеючыя курсы, на якіх спецыялісты роднасных прадпрыемстваў вывучалі практыку стварэння, укаранення і ўдасканалення комплекснай сістэмы кіравання якасцю прадукцыі. За яе ўкараненне кардонна-руберойдавы завод быў узнагароджаны дыпломам 1-й ступені ВДНГ СССР, а ўдзельнікі яе распрацоўкі — залатымі, сярэбранымі і бронзавымі медалямі. Для азнаямлення з вытворчасцю рулоннага руберойду сюды прыязджалі спецыялісты Дрэздэнскага завода мяккіх дахавых пакрыццяў і «Прамбудматэрыялы» ГДР.

Работнікі аўтабазы № 19 план грузавых перавозак выканалі на 114%, а пасажырскіх — на 120%.

У 1977 г. урадавых узнагарод удастоены 20 перадавых рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў прадпрыемстваў горада. Сярод іх наладчык зварачнага і газарэзальнага абсталявання завода аўтаагрэгатаў ветэран вайны К.Р.Жу-

Лакаматыўнае дэпо ў Асіповічах.

раўлёў. Ён адзначаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Высокіх вытворчых вынікаў дабіўся кавалер ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга машыніст А.А.Мірончык. Асабісты план перавозак ён выканаў на 121%, зэканоміў больш за 4 тыс. т дызельнага паліва. Узнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

У другім годзе 10-й пяцігодкі хлебаробы раёна атрымалі з гектара па 22 ц збожжавых і па 150 ц бульбы. Лепшых вынікаў па вытворчасці збожжа дабіліся земляробы калгасаў імя Чарняхоўскага, «Шлях Ільіча», «Чырвоны сцяг», імя Ульянава — атрымалі па 26—26,4 ц з гектара.

За год вытворчасць мяса ў разліку на 100 га сельгасугоддзяў павялічылася на 25%, малака — на 10%.

Гадавы план 1978 г. прамысловасць горада выканала на 103%. З высокімі вытворчымі паказчыкамі завяршылі год заводы аўтамабільных агрэгатаў, кардонна-руберойдавы, кансервавы, хлебазавод, камбінат хлебапрадуктаў, фабрыка канцтавараў (да 1978 — прамкамбінат). Даў першую прадукцыю камбінат малочных прадуктаў, які замяніў стары маслазавод. Перавыканалі гадавыя планавыя заданні таксама работнікі транспарту і сферы абслугоўвання. 20 перадавікоў вытворчасці былі ўдастоены ордэнаў і медалёў.

Ураджайнасць зерневых і зернебабовых склала 24,9 ц. У двух калгасах — «Камунар» і «Шлях Ільіча» — атрымана звыш 30 ц на круг. Валавы збор бульбы дасягнуў 46,2 тыс. т (ураджайнасць — 185 ц з гектара).

Паспяхова справіліся асіпаўчане з выкананнем народнагаспадарчага плана 1979 г. Поўнасцю быў здадзены ў эксплуатацыю камбінат малочных прадуктаў, завершана рэканструкцыя хлебазавода.

План завяршальнага года 10-й пяцігодкі прамысловасць горада выканала на 101%. Кардонна-руберойдавы завод першым у Асіповічах укараніў комплексную сістэму кіравання вытворчасцю, арганізацыі і аплаты працы па вопыту Волжскага аўтамабільнага завода. У выніку на 30% знізіліся страты рабочага часу, скарацілася цякучасць кадраў. Гэта дазволіла выпусціць дадаткова 1,5 млн. м^2 прадукцыі і атрымаць эканамічны эфект у суме 175 тыс. рублёў.

Да 15 снежня выканала гадавое заданне па аб'ёме перавозак і рамонце лакаматыўнае дэпо.

У цэлым за гады 10-й пяцігодкі аб'ём прамысловай прадукцыі павялічыўся на 53,9%. 75% прыросту атрымана за кошт павышэння прадукцыйнасці працы. На ўсіх прадпрыемствах укаранёна комплексная сістэма кіравання якасцю прадукцыі. Выпуск вырабаў з дзяржаўным Знакам якасці склаў у 1980 г. 13%.

Кардонна-руберойдавы завод дасягнуў запланаванага на канец пяцігодкі аб'ёму вытворчасці 21 лістапада 1980 г. Тэхнічнае пераўзбраенне, механізацыя і аўтаматызацыя вытворчых працэсаў, асваенне новай тэхналогіі, арганізацыйна-гаспадарчыя меры дазволілі вызваліць умоўна 356 чалавек, атрымаць увесь прырост прамысловай прадукцыі за кошт росту прадукцыйнасці працы і павысіць якасць прадукцыі. У 1980 г. 50% яе было выпушчана з дзяржаўным Знакам якасці.

Па выніках спаборніцтва калектыў прадпрыемства ўзнагароджаны пераходным Чырвоным сцягам ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ, а таксама памятным знакам ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ «За высокую эфектыўнасць і якасць работы ў 10-й пяцігодцы» з занясеннем на ўсесаюзную Дошку гонару на ВДНГ СССР. Дзесяць рабочых і служачых удастоены ордэнаў і медалёў.

Датэрмінова выканалі пяцігадовыя планы завод аўтаагрэгатаў, камбінат хлебапрадуктаў, фабрыка канцтавараў, хлебазавод. Сярод рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў гэтых прадпрыемстваў, узнагароджаных ордэнамі і медалямі, дырэктар завода аўтаагрэгатаў Г.В.Гардзейчык, праца якога адзначана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

На чыгуначным вузле ў 10-й пяцігодцы ажыццяўлялася замена паравозаў цеплавозамі на манеўровай рабоце. Усе прыгарадныя пасажырскія зносіны сталі абслугоўваць дызель-паязды. Праведзена работа па далейшым укараненні і ўдасканаленні аўтаматыкі, тэлемеханікі і сувязі. Узмоцнена рамонтная база. У выніку былі перавыкананы планы перавозак і рамонту рухомага саставу.

За выкананне планавых заданняў 10-й пяцігодкі 16 лепшых работнікаў вузла

ўдастоены высокіх урадавых узнагарод. Кавалеру ордэнаў Працоўнага Чырвонага Сцяга і Кастрычніцкай Рэвалюцыі, пераможцу спаборніцтва 1976—1980 гг. дарожнаму майстру акалодка А.А.Прановічу Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 2 красавіка 1981 г. прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

У сферы абслугоўвання насельніцтва аб'ём бытавых паслуг узрос на 38%. Адкрыта 7 новых магазінаў, 3 сталовыя.

За гады 10-й пяцігодкі горад упрыгожылі новыя адміністрацыйныя і грамадскія будынкі аддзялення Будбанка, аўташколы ДТСААФ, вузла сувязі і іншыя. Жыллёвыя ўмовы палепшыла больш за 500 сем'яў гараджан.

Праведзена добраўпарадкаванне гарадской тэрыторыі. Заасфальтавана 42 тыс. м² вуліц і плошчаў, пракладзена 4,6 тыс. м² тратуараў, павялічана працягласць водаправоднай і каналізацыйнай сеткі, вулічнага асвятлення, расшыраны зялёныя насаджэнні.

Змянілася спецыялізацыя горада. Калі раней ён быў вядомы толькі як транспартны вузел, то цяпер стаў і адным з найбольш значных прамысловых цэнтраў вобласці.

З 1975 г. у горадзе размяшчаецца доследная станцыя Беларускага НДІ лясной гаспадаркі (з 1992 — Інстытут лесу Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі), у 1979 г. для яе пабудаваны спецыяльны комплекс памяшканняў. З 1978 г. пачаў працаваць міжшкольны вучэбна-вытворчы камбінат. У студзені 1978 г. створана дзіцячая турыстычная база.

За мінулую пяцігодку сельская гаспадарка раёна атрымала 25,6 млн. рублёў капітальных укладанняў. Праведзена работа па павышэнні культуры земляробства, павялічыўся аб'ём унясення арганічных і мінеральных угнаенняў. Энергаўзброенасць працы ўзрасла ў 1,2 раза.

Усе гэта станоўча адбілася на павелічэнні аб'ёмаў вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. За гады 10-й пяцігодкі ў параўнанні з 9-й вытворчасць збожжа павялічылася на 14%, бульбы — на 6, мяса — на 4,5, малака — на 3, яек — на 48,2%. Сярэднегадавы аб'ём валавой прадукцыі ў калгасах і саўгасах раёна павялічыўся на 3,9 млн. рублёў.

У 1981 г. план па вытворчасці і рэалізацыі прамысловай прадукцыі быў выкананы да 29 снежня. Звыш плана выпушчана прадукцыі на 630 тыс., рэалізавана на 684 тыс. рублёў.

На прадпрыемствах горада і раёна ўстаноўлена 32 адзінкі высокапрадукцыйных станкоў і абсталявання, асвоена 5 новых паўаўтаматычных і паточна-механізаваных ліній, 6 прагрэсіўных тэхналагічных працэсаў, укаранёна 260 рацыяналізатарскіх прапаноў з агульным эканамічным эфектам больш за 300 тыс. рублёў. Гэта дазволіла аблегчыць працу многіх соцень рабочых, павысіць яе прадукцыйнасць супраць плана на 1,4%.

Хлебаробы калгаса «Чырвоны сцяг» атрымалі з кожнага гектара па 30,7 ц збожжавых і зернебабовых. У калгасе імя Ульянава атрыманы рэкордны ўраджай кукурузы — па 510 ц зялёнай масы з гектара. У калгасе «Камунар» на кожныя 100 га сельгасугоддзяў атрымана па 513 ц малака, у сярэднім ад каровы надоена па 1938 кг малака.

У цэлым за 11-ю пяцігодку (1981—1985) прырост прамысловай вытворчасці склаў 14,9%. Гадавое заданне па вытворчасці таварнай прадукцыі за 1985 г. выканана на 103,2%. Аб'ём вытворчасці ў параўнанні з 1984 г. вырас на 4,9%, прадукцыйнасць працы — на 7,2%. Перавыкананы заданні па звышпланавым выпуску важнейшых відаў вырабаў: руберойду і кардону, лесаматэрыялаў, шклопалатна, круп і гатунковай мукі, масла і сухога абястлушчанага малака і інш.

Ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі вялася работа па ўкараненні прагрэсіўных формаў арганізацыі і аплаты працы. Ахоп рабочых брыгаднай формай арганізацыі і аплаты працы ў прамысловасці склаў 74,9%. З пачатку пяцігодкі на прамысловых прадпрыемствах укаранёна 15 паточна-механізаваных ліній, 35 тэхналагічных працэсаў, устаноўлена 356 адзінак высокапрадукцыйнага абсталявання, комплексна механізавана 13 цэхаў і ўчасткаў, што дазволіла знізіць долю ручной працы на 4,6%.

Працягвалася дарожнае будаўніцтва. Даўжыня дарог з цвёрдым пакрыццём за гады пяцігодкі павялічылася на 135 кіламетраў.

Значная работа праведзена ў капітальным будаўніцтве. Забяспечана выкананне пяцігадовых планаў па асваенні капітальных укладанняў, уводу ў эксплуа-

тацыю жылля, школ і іншых аб'ектаў сацыяльнага прызначэння.

Справіліся з планамі і ўзятымі абавязацельствамі транспартныя арганізацыі. Працягвалася ўдасканаленне сферы абслугоўвання.

Па выніках спаборніцтва прадпрыемстваў прамысловасці, транспарту, сувязі, будаўніцтва, гандлю і бытавога абслугоўвання за 1985 г. пераможцамі прызнаны калектывы масларобнага камбіната, дыстанцыі сігналізацыі і сувязі, дарожнага рамонтна-будаўнічага ўпраўлення № 199, камбіната бытавога абслугоўвання.

Сельскія працаўнікі справіліся з выкананнем планаў пяці гадоў па продажы дзяржаве збожжа, бульбы, малака і яек. Умацавалася эканоміка гаспадарак. У цэлым па раёне атрымана 12,4 млн. рублёў прыбытку, рэнтабельнасць калгасна-саўгаснай вытворчасці склала 40%.

Гаспадаркі раёна ўкаранілі паточна-цыклавы метад выкарыстання тэхнікі, у 109 падраздзяленнях — брыгадную форму арганізацыі працы. У 11 калгасах і саўгасах для механізатараў абсталявалі гардэробныя, пакоі адпачынку, душавыя і лазні, у двух узводзіліся Дамы механізатараў, у калгасе «Чырвоны сцяг» — Дом жывёлаводаў. У калгасе «Бальшавік» для жывёлаводаў працавалі пральня самаабслугоўвання, комплексны прыёмны пункт, буфет, медпункт.

У 1986 г. — першым годзе 12-й пяцігодкі (1986—1990) — у прамысловасці заданне па вытворчасці таварнай прадукцыі выканана на 104%. Выпушчана звышпланавай прадукцыі на 5,5 млн. рублёў. Заданне па прадукцыйнасці працы выканана на 104,4%. Перавыкананы планы і абавязацельствы па перавозцы народнагаспадарчых грузаў, рознічнаму тавараабароту, рэалізацыі платных і бытавых паслуг.

З гектара сабрана па 22 ц збожжавых і зернебабовых, па 209 ц бульбы. На 100 га сельскагаспадарчых угоддзяў атрымана па 518 ц малака і 121 ц мяса.

Шэсць даярак надаілі ад кароў сваіх груп больш за 4000 кг малака на галаву — Н.С.Рэкіш і В.А.Атрашэўская (саўгас «Асіповіцкі»), В.С.Макарэвіч (калгас «Чырвоны сцяг»), Н.І.Трыбушэўская (калгас «Авангард»), Т.П.Жызнеўская (калгас «Чырвоны ўдарнік»), А.К.Кузьміч (саўгас «Каўгарскі»). Свінарка калгаса імя Леніна Б.А.Калеснікава забяспечыла на адкорме свіней сярэднясутачныя прыбаўкі ў вазе па 630 грамаў.

У 1987 г. на два месяцы раней тэрміну закрыў план па выпуску таварнай прадукцыі калектыў торфапрадпрыемства «Татарка». За перамогу ў спаборніцтве адзначаны Ганаровай граматай ЦК КПБ, Савета Міністраў БССР, Белсаўпрофа і ЦК ЛКСМБ камбінат хлебапрадуктаў. Выхадам на новыя рубяжы стаў гэты год для калектываў леспрамгаса, лясгаса, аўтапарка № 19, дыстанцыі сігналізацыі і сувязі, завода жалезабетонных канструкцый, ДРБУ-199.

Упершыню на асіповіцкіх землях быў атрыманы ўраджай збожжа звыш 35 ц з

Будынак Асіповіцкага райвыканкома.

гектара. Самыя высокія ўраджаі сабралі: збожжавых — калгас «Авангард» (46,7 ц); бульбы — калгас «Новы шлях» (343 ц); ільновалакна — «Новы шлях» (9,2 ц); кукурузы — «Авангард» (514 ц); каранеплодаў — калгас «Чырвоны ўдарнік» (588 ц).

Уся сельскагаспадарчая і 98% прамысловай прадукцыі ў 1988 г. атрымана ў гаспадарках і на прадпрыемствах, якія працавалі на поўным гаспадарчым разліку і самафінансаванні. Планавае заданне па вытворчасці таварнай прадукцыі выканана на 102,8%. Тэмп росту прадукцыйнасці працы да папярэдняга года склаў 107,8%. Прамысловымі прадпрыемствамі атрымана 2 млн. рублёў звышпланавых прыбыткаў. План перавозак народнагаспадарчых грузаў выкананы аўтамабільным транспартам на 118,1%, чыгуначным — на 106,7%.

Выкананне плана па агульным аб'ёме рознічнага тавараабароту склала 106,1%.

У сельскай гаспадарцы выкананы планы вытворчасці і продажу дзяржаве ўсіх відаў сельскагаспадарчай прадукцыі, за выключэннем агародніны і пладоў. Ураджайнасць сельгаскультур некалькі знізілася, а вытворчасць жывёлагадоўчай прадукцыі ўзрасла.

Увод у дзеянне асноўных фондаў за кошт дзяржаўных капітальных укладанняў склаў 54,8%. Дапушчаны зрыў уводу ў дзеянне жылля.

Складаныя працэсы, якія пачаліся ў савецкім грамадстве ў канцы 1980 — пачатку 1990-х гадоў (аслабленне сувязей паміж саюзнымі рэспублікамі СССР, развал фінансава-крэдытнай сістэмы, «старыя» падыходы да кіравання народнагаспадарчым комплексам і інш.), пачалі адбівацца на ўсіх галінах народнай гаспадаркі, культурна-бытавым і сацыяльным становішчы насельніцтва краіны. Не абышло гэта і Асіповіцкі раён.

Ужо ў 1993 г. выпуск прадукцыі на прадпрыемствах горада і раёна скараціўся ў параўнанні з папярэднім годам на 9,7%. Прамысловасць працавала нестабільна ў сувязі з недахопам сыравіны і матэрыялаў. Так, на былым прамысловым флагмане горада — кардонна-руберойдавым заводзе — выпуск прадукцыі знізіўся на 37,6%. Скарацілася вытворчасць тавараў народнага ўжытку.

Калі ў сельскай гаспадарцы ўраджайнасць яшчэ трымалася на добрым узроўні, то жывёлагадоўля стала даваць збой: пачала зніжацца вытворчасць прадукцыі, скарачацца пагалоўе.

Нестабільна працавала прамысловасць у 1994 г. Зніжэнне аб'ёмаў вытворчасці адбылося на 10 прадпрыемствах, што склала 60% ад агульнай іх колькасці. Пастаянныя змяненні цэн на сыравіну і паліўна-энергетычныя рэсурсы ў бок павелічэння адмоўна ўплывалі на нарошчванне аб'ёмаў вытворчасці.

Скарацілася колькасць прамысловавытворчага персаналу. За 1994 г. яна склала 6194 чалавекі, за 1993 г. — 6584.

Надзвычай складаным заставалася эканамічнае становішча горада і раёна і ў 1995 г. Працягвалася падзенне аб'ёмаў

Будынак Беларусбанка ў Асіповічах.

прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, сферы паслуг, росту запазычанасці па плацяжах, адчуваўся востры недахоп бюджэтных сродкаў. Яшчэ на 520 чалавек скарацілася сярэдняспісачная колькасць прамыслова-вытворчага персаналу.

Валавы надой малака знізіўся на 2316 т, а сярэдні надой ад каровы — на 185 кг. Працягвала скарачацца пагалоўе жывёлы і птушкі.

У параўнанні з 1994 г. увод жылых дамоў скараціўся на 72%.

На пяці прадпрыемствах з 17 працягваўся спад вытворчасці і ў 1996 г. Колькасць прамыслова-вытворчага персаналу скарацілася на 326 чалавек. Працягвала зніжацца вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі, пагалоўе жывёлы.

Сярэднямесячная заработная плата рабочых і служачых у снежні перавысіла заработную плату калгаснікаў у 1,5 раза.

У 1999 г. насельніцтва раёна налічвала 59 100 чалавек, у тым ліку гарадское — 40 600, сельскае — 18 500.

Прамысловасць раёна прадстаўлена 16 асноўнымі прадпрыемствамі. Найбольш буйныя: завод аўтамабільных агрэгатаў (звыш 2000 рабочых), СП ААТ «Дах» (больш за 1500), ААТ «Шклозавод «Кастрычнік» (755), ААТ «Асіповіцкі малочны камбінат» (290), камбінат хлебапрадуктаў (410), АП «Асіповіцкі завод «Каммаш» (195).

За 1999 г. прамысловасцю раёна выпушчана прадукцыі ў дзеючых цэнах на 13 603,3 млрд. рублёў, тавараў народнага ўжытку — на 3729,5 млрд. рублёў.

У раёне 16 калгасаў, калектыўна-долевая гаспадарка «Ліпень», аграгандлёвае прадпрыемства «Пратасевічы», 22 фермерскія гаспадаркі, 20 садаводчых таварыстваў.

Ураджайнасць збожжавых і зернебабовых у 1999 г. склала 12,1 ц з гектара, бульбы — 107 ц. Надоена малака ад каровы па 2038 кг.

Чыгуначны вузел аб'ядноўвае 10 прадпрыемстваў і арганізацый. Гэта лакаматыўнае дэпо, вагоннае дэпо, станцыя Асіповічы, дыстанцыя пуці, дыстанцыя сігналізацыі і сувязі, прарабскі пункт будаўніча-мантажнага поезда № 761 і інш.

За 1999 г. аб'ём перавозак у лакаматыўным дэпо павялічыўся на 2,3%. Высокія паказчыкі вынікаў па бальнай ацэнцы пуці і ўтрыманні ўстройстваў маюць дыстанцыя пуці і дыстанцыя сігналізацыі і сувязі.

Аўтапарк № 19 абслугоўвае пасажыраў на 14 гарадскіх, 29 прыгарадных і 1 міжгародным маршрутах. За 1999 г. транспартам аўтапарка перавезена 6,4 млн. чалавек, 143 тыс. т грузаў.

Асноўная будаўнічая арганізацыя — БУ-89. За 1999 г. за кошт усіх крыніц фінансавання ўведзена ў эксплуатацыю 284 кватэры агульнай жылой плошчай 18,6 тыс. м^2, у тым ліку ў сельскай мясцовасці — 63 кватэры агульнай плошчай 4,5 тыс. м^2.

Гандлёвым абслугоўваннем насельніцтва займаюцца ААТ «Гандаль», раённае спажывецкае таварыства, прадпрыемства

Члены прэзідыума раённага савета ветэранаў. 2001 г.

па абслугоўванні чыгуначнікаў і пасажыраў на станцыі Асіповічы, камбінат грамадскага харчавання, кафэ станцыі Асіповічы.

У раёне 51 прадуктовы, 35 непрадуктовых, 87 змешаных магазінаў, 44 прадпрыемствы грамадскага харчавання ўсіх формаў уласнасці.

Рознічны тавараабарот за 1999 г. склаў 3963,1 млрд. рублёў. Прадпрыемствамі грамадскага харчавання рэалізавана прадукцыі на 422,9 млрд. рублёў.

Платных паслуг насельніцтву аказана на 455,7 млрд. рублёў.

Значнае развіцце ў раёне атрымала сфера малога прадпрымальніцтва. У 1999 г. існавала 68 суб'ектаў недзяржаўнай формы ўласнасці. Усяго па стане на пачатак 2000 г. у раёне дзейнічаюць звыш 60 прадпрыемстваў малога бізнесу, каля 300 індывідуальных прадпрымальнікаў.

Тэлефонная сетка прадстаўлена 5 гарадскімі і 21 сельскай АТС з рабочай ёмістасцю адпаведна 11 506 і 2889 нумароў. Шчыльнасць кватэрных тэлефонаў складае 27 на 100 чалавек ці 86 на 100 сем'яў у горадзе, 17 на 100 чалавек ці 50 на 100 сем'яў у вёсках.

У горадзе функцыянуюць філіялы акцыянерных ашчадных банкаў Беларусбанка, «Прыёрбанка», аддзяленні Белаграпрамбанка і Прамбудбанка.

На базе гарадскога вытворчага аб'яднання жыллёва-камунальнай гаспадаркі створаны 3 новыя прадпрыемствы: Камунальнае унітарнае жыллёвае рамонтна-эксплуатацыйнае прадпрыемства, унітарнае камунальнае вытворчае прадпрыемства «Водаканал» і унітарнае камунальнае вытворчае прадпрыемства «Райсервіс». Абслугоўваннем кацельняў і цепласетак у раёне займаецца раённае вытворчае аб'яднанне жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

У 1999 г. прадпрыемствамі камунальнай гаспадаркі асвоена па капітальным рамонце каля 180 млрд. рублёў укладанняў, у тым ліку па добраўпарадкаванні — больш за 60 млрд. рублёў. Выканана асфальтавае і плітачнае пакрыццё 5,6 км вуліц горада, 5,7 км тратуараў.

Здадзены ў эксплуатацыю пуцепровод цераз чыгунку, які злучыў паўночную і паўднёвую часткі горада.

За год газіфікавана 600 кватэр, з іх 481 — прыродным газам.

У раёне пражываюць 13 420 дзяцей і падлеткаў, працуюць 35 школ, 32 дзіцячыя сады, у іх — 2558 дашкольнікаў (65%). Частка дзяцей шасцігадовага ўзросту (550 навучэнцаў) размешчаны ў дзіцячых садах. Ва ўстановах адукацыі працуюць 1754 настаўнікі і выхавальнікі, 750 чалавек абслуговага персаналу.

У 149 гуртках, клубах, секцыях Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі па 51 профілю займаецца 2180 дзяцей.

З устаноў культуры ў раёне дзейнічаюць раённыя цэнтры культуры і народных рамёстваў, 19 сельскіх дамоў культуры, 13 сельскіх клубаў, рабочы клуб чыгуначнікаў «Чырвоны кастрычнік», клуб СП ААТ «Дах», гарнізонны Дом афіцэраў, 36 бібліятэк, 2 дзіцячыя школы мастацтваў, 6 дзіцячых музычных школ і 2 іх філіялы, 30 кінавідэаўстановак. Пры клубных установах дзейнічаюць 195 гурткоў і калектываў мастацкай самадзейнасці, 90 аматарскіх аб'яднанняў. 11 калектываў удастоены звання народнага.

У раёне дзейнічаюць 3 стадыёны, 32 спартыўныя залы, 110 спортпляцовак, 26 залаў для заняткаў гімнастыкай і аэробікай, 2 міні-басейны, 7 ціраў. Працуюць 10 спартклубаў, у якіх займаюцца 533 чалавекі. Два прафесійныя клубы — баскетбольная каманда РТІ-АЗАА і футбольная каманда «Свіслач — Дах» — удзельнічаюць у чэмпіянатах Рэспублікі Беларусь у вышэйшай і першай лігах адпаведна.

На ўліку ў аддзеле сацыяльнай абароны стаяць 16 300 атрымальнікаў пенсій і дапамог, з якіх 7100 жыве ў горадзе, 9200 — у вёсках.

Усяго ў раёне 824 удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, з іх 316 інвалідаў вайны, 176 сем'яў загінуўшых, 674 былыя вязні канцлагераў, 100 удзельнікаў працоўнага фронту, 67 рэпрэсіраваных, 570 адзінокіх грамадзян.

На тэрыторыі раёна зарэгістраваны рэлігійныя арганізацыі 3 канфесій — праваслаўнай, рымска-каталіцкай і пратэстанцкай.

У раёне зарэгістравана 14 грамадскіх аб'яднанняў, дзейнічаюць 3 палітычныя партыі.

За газетным радком

Па старонках раённай газеты «Калгасная праца» («Запаветы Леніна»)*

1 студзеня 1952 г.

НАСЕЛЬНІЦТВА НАБЫВАЕ КУЛЬТТАВАРЫ

Яркім сведчаннем няўхільнага павышэння матэрыяльнага ўзроўню працоўных нашага раёна з'яўляецца рост іх попыту на прамысловыя тавары.

Сельмаг Свіслацкага сельпо толькі за апошнюю нядзелю прадаў 4 радыёпрыемнікі, 2 швейныя машыны, 6 шафаў. Магазін Верайцоўскага сельпо за той жа дзень прадаў 2 матацыклы, 2 швейныя машыны, 1 патэфон, 2 радыёпрыемнікі і 2 шафы.

У чацвёртым квартале 1951 года спажывецкай кааперацыяй раёна рэалізавана сярод насельніцтва культтавараў у сем разоў больш, чым за той жа перыяд папярэдняга года.

В.Прыбыльскі, старшыня праўлення райспажыўсаюза.

ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

Толькі за прайшоўшыя 3 гады пагалоўе жывёлы на калгасных фермах узрасло: буйной рагатай жывёлы на 208 працэнтаў, свіней — на 144 працэнты, авечак на 224, птушак на 499 і коней на 156 працэнтаў.

За гэты час пабудавана ўноў 226 жывёлагадоўчых і другіх грамадскіх будынкаў, у тым ліку 40 канюшань, 54 кароўнікі, 21 свінарнік, 5 аўчарнікаў, 7 птушнікаў і 99 іншых памяшканняў.

Нягледзячы на засуху, у 1951 годзе перадавыя калгасы раёна ўсе ж змаглі дабіцца нядрэнных паказчыкаў на ўздыме ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур. У калгасе «Усход» з асобных участкаў атрыман ураджай азімага жыта 15 цэнтнераў, яравой пшаніцы 14 цэнтнераў, азімай пшаніцы 15, ільносемя 4,3 цэнтнеры, кармавых буракоў 175 цэнтнераў. У калгасе «Авангард» з асобных участкаў атрыман ураджай ячменю 12 цэнтнераў з гектара. У калгасе «Большэвік» вырашчана на кожным гектары 2,4 цэнтнеры насення цімафееўкі на плошчы 10 гектараў. У калгасе «Перадавік» з асобных участкаў атрымана 45 цэнтнераў з гектара карэнняў кок-сагызу, а па збору насення каўчуканоса план выканан на 900 працэнтаў. У калгасе «Звязда» вырашчана 120 цэнтнераў з гектара кораньплодаў на плошчы 8 гектараў.

21 лютага 1952 г.

ЗАКОНЧАНА АДНАЎЛЕННЕ БОЛЬНІЦЫ

Самым прыгажэйшым у даваенны час у Асіповічах быў будынак гарадской бальніцы. У першыя дні вайны фашысцкія варвары некалькі разоў бамбілі яе. Бальніца была разбурана і разграблена. Прайшлі гады вайны. Наступілі дні мірнай працы. Пачалося аднаўленне гарадской бальніцы.

Днямі раённае будаўнічае ўпраўленне (начальнік тав. Шураеў) скончыла аддзелачныя работы і памяшканне бальніцы на 150 ложкаў здадзена ў эксплуатацыю.

У адноўленай бальніцы маюцца хірургічнае, акушэрска-гінекалагічнае, тэрапеўтычнае аддзяленні. Добра абсталяваны аперацыйны блок, лабараторыя, фізкабінет, сталовая і пакой адпачынку.

22 урачы, якія працуюць у бальніцы, маюць вышэйшую адукацыю. Многія з іх у мінулым годзе прайшлі курсы па ўдасканальванню ведаў. Калектыў бальніцы ўзначальвае заслужаны ўрач БССР А.А.Ушакевіч.

Л.Паршын.

29 студзеня 1953 г.

НОВЫ БУДЫНАК ВАКЗАЛА

Здалёк бачны на чыгуначнай станцыі Асіповічы прыгожы будынак, афарбаваны ў светла-жоўты колер. Гэта — новы вакзал, днямі здадзены ў эксплуатацыю...

Пры ўваходзе кідаюцца ў вочы добра выкананыя архітэктурныя работы. Тут усё прадугледжана і накіравана на лепшае абслугоўванне пасажыраў. У вакзале — дзве залы для пасажыраў, білетныя касы, цырульня і г.д. На вакзале ўстаноўлены электрычныя гадзіннікі.

*Захаваны тагачасны стыль і арфаграфія.

1 студзеня 1955 г.

ГЭТА ДАСЯГНУТА Ў 1954 ГОДЗЕ

Хлебаробы раёна ў цеснай садружнасці з механізатарамі працавалі над уздымам цалінных і абложных зямель. Пасяўныя плошчы ў калгасах раёна павялічыліся амаль на 600 гектараў.

Вялікае капітальнае будаўніцтва разгарнулася на торфазаводзе «Татарка». Тут зданы ў эксплуатацыю два 8-кватэрныя жылыя дамы для рабочых, добраабсталяваная сталовая. Закончана ўзвядзенне будынка механічнай майстэрні.

Дала першы прамысловы ток Асіповіцкая ГЭС. Танную электраэнергію атрымалі торфазавод «Татарка», райцэнтр, калгасы.

Пагалоўе буйной рагатай жывёлы калгасаў узрасло ў параўнанні з мінулым годам на 3000 галоў, свіней і авечак больш чым на 2 тысячы галоў.

16 сакавіка 1956 г.

ПРЫМАЮЦЬ ТЭЛЕВІЗІЙНЫЯ ПЕРАДАЧЫ

Мясцком эксплуатацыйнай канторы (начальнік тав. Герцовіч) набыў тэлевізар для калектыўнага прагляду тэлевізійных перадач Мінскага тэлевізійнага цэнтра. У хуткім часе знайшліся ініцыятыўныя і вынаходлівыя аматары. Яны пад кіраўніцтвам інжынера-электрыка тав. Шапіра ўстанавілі 18-метровую антэну і зрабілі другія неабходныя ўстройствы. Неўзабаве тэлевізар быў уключан. На экране з'явіліся выразныя ізабражэнні. Гук таксама быў добрым.

Зараз у дні тэлевізійных перадач наладжваецца калектыўны іх прагляд.

Н.Харчанка.

26 кастрычніка 1956 г.

НОВЫ СЕЛЬСКІ МАГАЗІН

У вёсцы Ясень пабудаван і здан у эксплуатацыю новы сельскі магазін. У ім размясціліся шэсць аддзелаў і закусачная. На пабудову яго выдаткавана каля 118 тысяч рублёў. У першыя дні работы выручка магазіна складае па 2,5—3 тысячы рублёў штодзенна, што ў 5—6 разоў перавышае выручку ларка, які да гэтага часу абслугоўваў жыхароў вёскі.

Зараз у Ясеньскім сельпо ёсць два сельмагі. Абслугоўванне сельскага насельніцтва значна палепшылася.

1 студзеня 1959 г.

З КОЖНЫМ ГОДАМ

З кожным годам расце і багацее наша Радзіма, паляпшаецца жыццё народа, мацнее і квітнее наша рэспубліка. Разам з тым з году ў год паляпшаецца медыцын-

Загадчыца тэрапеўтычнага аддзялення Н.М.Расалоўская (у цэнтры) за работай.

скае абслугоўванне насельніцтва. Гэта можна лёгка прасачыць хоць бы па нашаму раёну.

Толькі за апошнія 5 год у раёне значна ўзрасла сетка медыцынскіх устаноў. Адкрыты стацыянары раённага тубдыспансера, Татаркаўская бальніца на 10 ложкаў, павялічаны Лапіцкая і Акцябрская бальніцы да 25 ложкаў, адкрыты 4 ФАПы, здраўпункт, дзіцячыя яслі, калгасны радзільны дом, дзіцячы туберкулёзны санаторый на 50 ложкаў, абсталявана і здадзена ў эксплуатацыю бальніца ў горадзе на 100 ложкаў.

Большш чым у два разы павялічыліся асігнаванні на ахову здароўя. Калі ў 1955 годзе яны склалі каля 3 мільёнаў рублёў, то ў 1958 годзе — 6188 тысяч рублёў.

Зараз раён забяспечан здавальняючай сеткай медыцынскіх устаноў. Чыгуначная і гарадская бальніцы добра абсталяваны і забяспечаны ўрачамі ўсіх асноўных спецыяльнасцей.

У 1959 годзе ўвойдуць у строй новыя Ясенская і Карытненская бальніцы, а таксама Градзянская амбулаторыя.

Выдатна працуюць нашы супрацоўнікі. Многія з іх гэтымі днямі ўзнагароджаны Ганаровай граматай абкома партыі і аблвыканкома. Сярод іх урачы Ніна Міхайлаўна Расалоўская, Фёдар Мартынавіч Прыднікаў, Ганна Іванаўна Русаковіч, Вера Ільінічна Гордзіна і многія другія.

А.Ушакевіч, заслужаны ўрач Беларускай ССР, галоўны ўрач раёна.

21 студзеня 1960 г.

ГАНАРОВАЯ ЗАДАЧА КАМСАМОЛЬЦАЎ

Камсамольская арганізацыя раёна налічвае ў сваіх радах 3400 членаў ВЛКСМ, з якіх 980 чалавек — сельскіх камсамольцаў. У жывёлагадоўлі працуе толькі 161 чалавек.

...З ліку жывёлаводаў-камсамольцаў ёсць нямала перадавікоў. Сярод іх даярка сельгасарцелі імя Валадарскага Аліна Клімовіч, даяркі з калгаса «Рассвет» Ганна Пігулеўская, Ніна Санько, Надзежда Чаропка, калгаса імя Сталіна Валянціна Бобрык і многія другія, якія давялі надоі ад кожнай каровы да 1900—2000 кілаграмаў.

М.Ерашоў, сакратар РК ЛКСМБ.

1 чэрвеня 1965 г.

БАЛОТЫ АДСТУПАЮЦЬ

Да вясны мінулага года побач з вёскай Мязовічы знаходзіліся дрыгвяныя, непраходныя балоты. Але вось на тыя месцы, дзе акрамя лазы нічога не расло, прыбылі механізатары.

Да восені меліяратары асушылі 300 гектараў тарфянікаў. Затым калгасныя механізатары зааралі гэтую плошчу і на ўчастку ў 45 гектараў пасеялі азімае жыта гатунку «партызанка». Зараз пасевы гэтай культуры растуць добра.

Вясной на асушаных тарфяніках пасеялі яравыя культуры — ячмень, авёс, 10 гектараў заняла бульба. Будзем тут вырошчваць і кармавую моркву.

Р.Сакалоў, саўгас «Каўгарскі».

7 лістапада 1965 г.

ГОРАД НОВАБУДОЎЛЯЎ

Прыкметна мяняецца аблічча нашага горада. З кожным днём ён становіцца больш аздобленым, больш прыгожым.

Ля скрыжавання вуліц імя Сумчанкі і Ленінскай заканчваецца закладка фундамента Дома культуры. Гэта будзе сапраўдны ачаг культурнага адпачынку з глядзельнай залай на 400 месц, з лекцыйнай залай на 100 месц, з бібліятэкай і чытальным пакоем, а таксама з памяшканнямі для гуртковай работы. Тут будзе абсталявана шырокаэкранная кінаўстаноўка.

Непадалёку ад Дома культуры сёлета будзе заснаваны 48-кватэрны жылы дом. У стадыі завяршэння знаходзяцца два шматкватэрныя дамы па вуліцы Інтэрнацыянальнай і імя Дзяржынскага.

Выдатны падарунак атрымаюць у наступным годзе гарадскія школьнікі — сярэднюю школу на 964 месцы, будаўніцтва якой таксама хутка заканчваецца. Значна расшырыцца вучэбная база СШ-2. Тут неўзабаве будзе здадзены ў эксплуатацыю новы корпус на 640 вучнёўскіх месц.

А самыя юныя грамадзяне атрымаюць дзіцячы камбінат, будаўніцтва якога плануецца ў першым годзе пяцігодкі.

Поўным ходам ідуць аддзелачныя работы ў новым будынку універмага на 25 рабочых месц.

Прыводзяцца ў парадак і вуліцы райцэнтра. Сёлета замошчана 2000 квад-

ратных метраў тратуараў. Замошчана і ў наступным годзе будзе пакрыта асфальтам вуліца імя Рымы Кунько. Такімі ж стануць вуліцы імя Дзмітрыева, Першамайская і Шасейная.

У недалёкім будучым наш горад стане буйным прамысловым цэнтрам. Акрамя таго, што тут узводзіцца млынкамбінат, рыхтуецца праектная дакументацыя на будаўніцтва іншых прадпрыемстваў.

Вось яна, песня будаўніцтва, песня кастрычніцкага пераўтварэння роднага краю.

І.Гусараў.

21 красавіка 1966 г.

УРУЧЭННЕ ОРДЭНАЎ І МЕДАЛЁЎ

Па даручэнні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР сакратар абкома партыі Ф.М.Іваноў уручыў ордэны і медалі групе перадавікоў жывёлагадоўлі нашага раёна, узнагароджаных за поспехі, дасягнутыя ў развіцці жывёлагадоўлі, павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак мяса, малака, яек, воўны і іншай прадукцыі.

Ордэны Леніна ўручаны старшыні калгаса «Бальшавік» А.І.Лазараву і свінарцы саўгаса «Асіповіцкі» Ю.Ф.Стасевіч.

Ордэны Працоўнага Чырвонага Сцяга атрымалі старшыня калгаса імя Ульянава М.М.Каленік, свінарка калгаса «Бальшавік» І.М.Палазнік, заатэхнік калгаса «Бальшавік» У.І.Сімага, даярка калгаса «Авангард» Г.М.Солнышкіна.

Вялікай групе перадавікоў жывёлагадоўлі ўручаны ордэны «Знак пашаны» і медалі.

13 верасня 1966 г.

РАСЦЕ ТЭХНІЧНАЯ АСНАШЧАНАСЦЬ

З кожным годам папаўняецца аўтатрактарны парк калгасаў і саўгасаў раёна. Але сёлетні год асабліва прыкметны ў гэтых адносінах. Толькі адных камбайнаў калгасы і саўгасы атрымалі 21, 7 з іх — мадэрнізаванай канструкцыі «СКБ-4». Самыя найноўшыя трактары, выраблены мінскімі трактарабудаўнікамі, прыйшлі на палі сельгасарцелі «Шлях Ільіча». Добра зарэкамендавалі сябе і машыны харкаўскіх трактарабудаўнікоў. Пакуль што іх трактары «С-4», «Т-74» не маюць сабе роўных на палетках калгасаў імя Ульянава і імя Леніна. Магутныя «ЗІЛы-555» папоўнілі аўтамабільныя паркі сельгасарцелей «Авангард», «Шлях Ільіча», саўгасаў «Карытнае» і «Асіповіцкі». Самазвальныя машыны «ГАЗ-93» атрымалі нядаўна на гандлёвай базе «Сельгастэхнікі» сельгасарцелі «Новы шлях», «Авангард», «Чырвоны ўдарнік» і «Чырвоны сцяг».

Папаўняецца і парк раённага аб'яднання «Сельгастэхнікі». Атрыманы 2 трактары «Беларусь», дзве спецмашыны для перавозкі аміячнай вады, 2 бензавозы.

Усяго машын гэтых відаў з пачатку

Вуліца Сумчанкі ў Асіповічах.

года рэалізавана на суму больш 100 тысяч рублёў.

І.Кучагура, галоўны бухгалтар раённага аб'яднання «Сельгастэхнікі».

13 чэрвеня 1967 г.

СТВАРАЕЦЦА ЗАПАВЕДНІК

Хутка ў нашым раёне будзе свая «Белавежская пушча». На плошчы 90 тысяч гектараў ствараецца лесапаляўнічая гаспадарка. Ужо зараз разгорнуты вялікія падрыхтоўчыя работы на тэрыторыях Градзянскага, Вязскага, Лапіцкага, Каменіцкага і часткова Кастрычніцкага, Брыцалавіцкага, Цэльскага і Асіповіцкага лясніцтваў. На корм зімой ласям, дзікам, касулям і іншым звярам пасеяна 6 гектараў бульбы, 2 — аўса, 2 гектары лубіну.

Багацце гаспадаркі будзе немалое. Ужо зараз на тэрыторыі, дзе ствараецца запаведнік, налічваецца каля 200 ласёў і амаль такая ж колькасць дзікаў. Прадугледжваецца завесці ў нашы лясы 50 аленяў, а ў Лочынскае возера — андатру.

П.Краўчанка, дырэктар лясгаса.

12 верасня 1967 г.

УЗВОДЗЯЦЦА МАСТЫ

Два новых жалезабетонных масты праз рэкі Сіняя і Млынка ўзводзіць калектыў рабочых ДЭУ-720. Раней драўляныя масты часта ламаліся, іх затапляла паводкавымі водамі і г.д. Прыходзілася затрачваць шмат грошай на рамонт. Цяпер масты ўзняліся на 1,5 метра вышэй за драўляныя і рух тут не спыніцца ў самую паводкавую вясну. Па плану будаўніцтва мастоў павінна закончыцца ў чацвёртым квартале. Але будаўнікі, узначальваемыя майстрам Іванам Піліпавічам Касперам, рашылі здаць іх у 3-ім квартале.

І.Васільеў.

1 студзеня 1968 г.

У 1967 ГОДЗЕ Ў РАЁНЕ

Пачаўся рух цеплавозаў на Асіповіцкім участку дарогі. Першым перасеў з паравоза на цеплавоз машыніст Іван Шайкоўскі са сваім памочнікам Васілём Барсуковым. Яны правялі састаў вагой 4200 тон.

Па вуліцы Камуністычнай уступіў у строй магазін па продажу гародніны.

Завершана электрыфікацыя ўсіх населеных пунктаў раёна.

Закончан мантаж аўтаматычнай тэлефоннай станцыі ва ўсіх аддзяленнях сувязі раёна.

Кансервава-харчовы камбінат асвоіў новы від прадукцыі — штучны мёд.

На ўзвядзенне аб'ектаў аховы здароўя, адукацыі і культурна-бытавых было асігнавана 372,5 тысячы рублёў.

15 лютага 1968 г.

КЛОПАТЫ АБ ПРАЦАЎНІКАХ

У мінулым годзе і ў студзені 1968 года па пуцёўках прафсаюза ў санаторыях

Асіповіцкае вадасховішча.

краіны пабывала 90 працаўнікоў сельскай гаспадаркі раёна. У лепшых здраўніцах Крыма, Каўказа, рэспублікі адпачывалі і лячыліся П.Сімановіч з калгаса «Авангард», Р.Лапацін — з калгаса «Чырвоны сцяг», механізатары саўгаса «Асіповіцкі» С.Ерка і Туміловіч і другія.

Група жывёлаводаў калгасаў у колькасці 20 чалавек правяла свой адпачынак у турысцкай паездцы па гарадах краіны. 4 чалавекі пабывалі ў Балгарыі.

В.Прыбыльскі.

3 верасня 1968 г.

КРЫХУ СТАТЫСТЫКІ

У наступіўшым навучальным годзе ў раёне гасцінна расчыніліся дзверы 16 сярэдніх, 17 васьмігадовых і 53 пачатковых школ, чатырох школ-інтэрнатаў.

За парты селі каля 13 тысяч вучняў.

Звыш 900 настаўнікаў, большасць з якіх маюць вышэйшую або сярэднюю педагагічную адукацыю, працуюць у школах раёна.

Толькі сёлета ў наш раён прыбылі 29 маладых педагогаў з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй.

10 снежня 1968 г.

15 мая 1969 г.

БУДНІ ЖАЛЕЗАБЕТОННАГА

На ўскраіне горада, побач з вагонным дэпо, разгарнулася будаўніцтва жалезабетоннага завода, якое вядзе Магілёўскае БУ-2.

Зроблена ўжо нямала. Падведзены пад'язныя пуці, пракладзены водаправод. Заканчваецца мантаж адміністрацыйнага корпуса. Узводзіцца бетонарастворны вузел і вядзецца закладка фундамента вытворчага корпуса.

Стараннай працай сярод калектыву будаўнікоў вызначаюцца муляры Андрэй Ціманоўскі і Дзмітрый Казак, цесляры Фёдар Санковіч і Міхаіл Паркалаў, рабочыя Браніслава Рыдзеўская, Валянціна Хорашава, Марыя Пекар і іншыя.

К.Каралькоў.

12 снежня 1970 г.

МЕДАЛІ ВДНГ — БРЫГАДЗІРАМ

За высокія паказчыкі ў сацыялістычным спаборніцтве па павелічэнні ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур у 1969 годзе брыгадзір першай брыгады калгаса «Авангард» Сідар Іванавіч Жораў і брыгадзір другой брыгады калгаса «Чырвоны ўдарнік» Уладзімір Міхайлавіч Каток упраўленнем сельскай гаспадаркі райвыканкома прадстаўляліся на ВДНГ. Арганізацыйны камітэт выстаўкі прысудзіў ім малыя бронзавыя медалі.

С.Фёдараў.

28 снежня 1971 г.

АТРЫМАЛІ НОВЫЯ КАМБАЙНЫ

З кожным годам павялічваецца ўраджайнасць зерневых культур. Каб сабраць збожжа хутка і без страт, наяўнай у гаспадарках тэхнікі становіцца ўжо недастаткова. Вось нядаўна ў аб'яднанне «Сельгастэхнікі» прыбыло 18 новых камбайнаў «СК-4». Новыя камбайны ўжо атрымалі калгасы «Усход», імя Ульянава, «Шлях Ільіча», «Беларусь», «Чырвоны сцяг», саўгасы «Карытнае», «Каўгарскі», «Пратасевічы», «Асіповіцкі».

Л.Луцковіч, галоўны інжынер раённага аб'яднання «Сельгастэхнікі».

1 мая 1973 г.

ПЕРШЫ ПІРГАМІН

Апошнія перадмайскія дні на кардонна-руберойдавым заводзе былі напоўнены тым асаблівым радасным і трывожным хваляваннем, якое пануе заўсёды на

У хірургічным аддзяленні вузлавой бальніцы станцыі Асіповічы. Здымак 1960-х гадоў.

пускавых участках. У руберойдавым цэху, дзе адзін з шасці агрэгатаў рыхтаваўся да пуску, круглыя суткі было мнагалюдна. Начальнік цэха камуніст Анатоль Васільевіч Жданаў, яго намеснік Сабіра Каюмаўна Цяслёнак асабіста па некалькі разоў правяралі і адладжвалі вузлы агрэгата, звяралі з разлікамі, зноў і зноў апробвалі...

Нарэшце прынята рашэнне: «Можна пускаць!»

Шэрая лента кардону папаўзла праз ванны і сушыльныя агрэгаты ў свой першы шлях. У 2 гадзіны 40 мінут з 28 на 29 красавіка адна з лепшых намотчыц змены т. Раманенка Марыя Главінская зняла першы рулон пергаміну.

Радасныя воклічы «ура» суправаджалі гэту падзею. Першы пергамін (руберойд) атрыманы!

29 чэрвеня 1974 г.

БЕССМЯРОТНАСЦЬ ГЕРОЯ

26 чэрвеня на плошчы У.І.Леніна адбыўся мітынг, прысвечаны адкрыццю мемарыяльнай дошкі, якая ўвекавечвае памяць Героя Савецкага Саюза М.П.Каралёва.

Мітынг адкрыў старшыня гарвыканкома У.І.Кавалёў. Потым былы намеснік камандзіра Асіповіцкага партызанскага злучэння В.В.Глотаў расказаў аб баявой дзейнасці генерал-маёра Мікалая Піліпавіча Каралёва.

З успамінамі аб нашым праслаўленым земляку выступілі на мітынгу былы начальнік штаба партызанскага атрада № 211 І.І.Патапейка і былы камандзір камсамольскай роты гэтага атрада Р.І.Кавалёў.

Ад імя моладзі раёна сакратар-загадчык аддзела вучнёўскай моладзі і піянераў Л.С.Аляхновіч запэўніла старэйшых таварышаў у тым, што кожны камсамолец будзе свята ўшаноўваць памяць герояў рэвалюцыі і Вялікай Айчыннай вайны, працягваць лепшыя традыцыі сваіх бацькоў.

Гонар адкрыць мемарыяльную дошку быў прадастаўлены першаму сакратару райкома КПБ А.М.Сівакову і былому намесніку камандзіра Асіповіцкага партызанскага злучэння В.В.Глотаву. І вось пад гукі Гімна Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі адкрыліся залатыя літары, высечаныя на мармуры: «Вуліца носіць імя Мікалая Піліпавіча Каралёва, Героя Савецкага Саюза, камандзіра Асіповіцкага партызанскага злучэння ў гады Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг.».

Н.Крыўшына.

12 верасня 1974 г.

ЛАЎРЭАТЫ ВДНГ

З Масквы прыйшло паведамленне аб узнагароджанні медалямі і каштоўнымі падарункамі Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі СССР працаўнікоў нашага раёна. Залатым медалём узнагароджаны брыгадзір рыбаводнай брыгады калгаса «Авангард» Уладзімір Андрэевіч Петрашоў, бронзавымі медалямі — свінаркі калгаса «Чырвоны сцяг» Вера Раманаўна Лягуцкая і Галіна Іванаўна Калячка.

Шчыра віншуем удзельнікаў ВДНГ з высокай узнагародай.

13 верасня 1975 г.

ХУТКА ПОЙДУЦЬ ЦЕПЛАВОЗЫ

Згодна плану ўпраўлення Беларускай чыгункі, пачалася падрыхтоўка пуці на ўчастку Асіповічы — Магілёў да пуску цеплавозаў. Праводзіцца сярэдні рамонт з узмацненнем верхняй будовы пуці і падаўжэннем прамежкавых станцый. На некаторых адрэзках пуці драўляныя шпалы замяняюцца жалезабетоннымі. Пясчаны баласт замяняецца шчэбневым.

Работы вядуць тры пуцявыя машынныя станцыі.

Плануецца закончыць падрыхтоўку ўсяго ўчастка чыгункі Асіповічы — Магілёў да пераводу на цеплавозную цягу да канца 1975 года.

М.Бакіноўскі.

27 снежня 1975 г.

ПЕРШЫНЕЦ

Пазаўчора Дзяржаўная камісія падпісала акт аб прыёмцы ў эксплуатацыю доследна-прамысловага комплексу па прасаванню сфагнавага торфу на торфапрадпрыемстве «Татарка». Гэта — першае прадпрыемства такога роду ў рэспубліцы. Магутнасць яго — дзесяць тысяч тон прадукцыі ў год. Да яе прад'яўляюцца высокія патрабаванні: нізкі працэнт вільготнасці, зольнасці і многае іншае.

Прадпрыемства аснашчана навейшым абсталяваннем з высокай ступенню механізацыі і аўтаматызацыі. Прадукцыя фасуецца ў поліэтыленавыя мяхі вагой па 50 кілаграмаў. Прызначана яна, у асноўным, для экспарту.

У перыяд мантажу абсталявання і пусканаладачных работ (а яны ўсе рабіліся сіламі спецыялістаў торфапрадпрыемства) стараннем, кемлівасцю, уменнем вызначыліся былы начальнік транспартнага цэха Арнольд Сантоцкі, майстар Аляксандр Чаропка, электрык Нікіфар Задоля, прасаўшчык Леанід Клімянок і многія другія. У выніку незнаёмае абсталяванне, сама тэхналогія асвоены паспяхова. За час пусканаладачных работ выраблена 2600 тон прадукцыі, 2200 тон адпраўлена на экспарт.

Новы цэх пачаў працаваць на поўную магутнасць.

Т.Радзькоў.

4 снежня 1976 г.

УДАСТОЕНЫ ГАНАРОВЫХ ЗНАКАЎ

Месяцам ударнай працы стаў лістапад на хлебазаводзе. Калектыў яго за гэты час пры плане 780 тон выпусціў 817 тон хлебабулачных вырабаў. На 102 працэнты выкананы план рэалізацыі.

Нядаўна за старанную працу лепшым рабочым былі ўручаны ганаровыя знакі «Пераможца сацыялістычнага спаборніцтва 1976 года». Удастоены яго пекар В.К.Сучок, машыніст цестараздзелачнай машыны В.М.Бутта, тэхнолаг А.Г.Пупейка.

В.Каваленя, эканаміст хлебазавода.

29 лістапада 1977 г.

ЗВЫШПЛАНАВЫЯ ПЛІТЫ

З 9 лістапада ў лік трэцяга года пяцігодкі пачаў працаваць цэх торфаізаляцыйных пліт торфапрадпрыемства «Татарка».

Гадавое заданне — выпусціць 12 000 кубічных метраў прадукцыі — выканана датэрмінова. На сённяшні дзень выраблена 12 226 кубічных метраў торфаізапліт.

Значны ўклад у гэты поспех унеслі аператар Я.Ф.Давыдоўскі, прасаўшчык У.І.Булавацкі, сушыльшчыца Н.А.Жук.

Я.Букаўнёў.

18 мая 1978 г.

ЗНАК ГЛЫБОКАЙ ПАВАГІ

Упраўленне Беларускай чыгункі і Дарпрафсож для ўвекавечання памяці былога чыгуначніка Акіма Мацвеевіча Чумакова, у знак глыбокай павагі і ўдзячнасці за подзвіг, які ён здзейсніў у першыя гады мірнага стваральнага будаўніцтва Савецкай дзяржавы ва ўмовах жорсткай класавай барацьбы, прысвоілі аднаму з лакаматываў імя «Акім Чумакоў».

Здарылася гэта 27 жніўня 1922 года ў раёне чыгуначнага раз'езда Пасекі. Машыніст Акім Мацвеевіч Чумакоў, які вёў поезд з каштоўным грузам, трапіў пад абстрэл белабандытаў. Мужны патрыёт уступіў у няроўную сутычку з ворагам, быў цяжка паранены. Аднак сабраў апошнія сілы і даставіў састаў да месца прызначэння. Але сам памёр ад ран.

Вадзіць гэты лакаматыў даручана паважаным у калектыве дэпо машыністам У.П.Лазукову, В.М.Клісаву, В.У.Махначу.

М.Волкаў.

18 мая 1978 г.

ІМЕМ ПАДПОЛЬШЧЫКА

У гады Вялікай Айчыннай вайны ў нашых краях дзейнічалі партызанскія атрады, якія падтрымлівалі цесную сувязь з падпольшчыкамі. Сярод іх быў наш зямляк Фёдар Андрэевіч Крыловіч, які працаваў у паравозным дэпо станцыі Асіповічы. Па заданню кіраўніцтва атрада ноччу з 30 на 31 ліпеня 1943 года, у разгар жорсткіх баёў на Курскай дузе, Фёдар Андрэевіч здзейсніў на станцыі буйную дыверсію, якая нанесла гітлераўцам вялікі ўрон. У выніку выбуху і пажару згарэлі 4 варожыя эшалоны, у тым ліку 5 паравозаў, 67 вагонаў са снарадамі і авіябомбамі, 8 танкаў, 10 бронемашын, 28 цыстэрн з бензінам і аўтамаслам, 12 вагонаў з прадуктамі, вугальны склад, станцыйныя збудаванні. За гэту аперацыю Ф.А.Крыловіч быў узнагароджаны ордэнам Леніна.

Днямі выканком Асіповіцкага гарадскога Савета народных дэпутатаў рашыў увекавечыць памяць нашага земляка, партызана-падпольшчыка Ф.А.Крыловіча. Вуліца Нова-Праектная нашага горада перайменавана ў вуліцу імя Крыловіча. На

будынку вакзала вырашана ўстанавіць мемарыяльную дошку.

Б.Міхайлаў.

18 мая 1978 г.

УЗНАГАРОДЫ ВДНГ СССР

Сёлета група калгаснікаў калгаса «Чырвоны сцяг» была ўдзельніцай Усесаюзнай выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі СССР. За высокія працоўныя дасягненні бронзавых медалёў ВДНГ і каштоўных падарункаў удастоены Алена Мікалаеўна Прохарава, Вацлава Ігнатаўна Пракаповіч, Людміла Іосіфаўна Віткоўская, Лізавета Адамаўна Кісель і Уладзімір Іосіфавіч Сіняўскі.

Трэба дадаць, што ў У.І.Сіняўскага гэта ўжо трэцяя ўзнагарода галоўнай выстаўкі краіны.

4 студзеня 1983 г.

ДЗЯРЖАЎНАЯ ПРЭМІЯ — МАЙСТРУ ВАГОННАГА ДЭПО

Цэнтральны Камітэт Кампартыі Беларусі і Савет Міністраў Беларускай ССР, разгледзеўшы прадстаўленне Камітэта па Дзяржаўных прэміях Беларускай ССР у галіне навукі і тэхнікі і Белсаўпрофа, пастанавілі прысудзіць Дзяржаўныя прэміі Беларускай ССР 1982 года за выдатныя дасягненні ў працы перадавікам сацыялістычнага спаборніцтва. Прэмія прысуджана і майстру вагоннага дэпо Асіповічы Лідзіі Мікалаеўне Чаропка — за выдатныя поспехі ў працы, дасягнутыя на аснове ўдасканалення вытворчых працэсаў, укаранення перадавых метадаў працы і ініцыятыву ў развіцці сацыялістычнага спаборніцтва за павышэнне эфектыўнасці вытворчасці і якасці работы.

12 сакавіка 1983 г.

НОВАЯ ПАЛІКЛІНІКА

Тыдзень назад адчыніла перад наведвальнікамі свае дзверы міжраённая стаматалагічная паліклініка.

Штодзень яна можа прыняць 350—400 хворых. Дапамогу акажуць 15 кваліфікаваных спецыялістаў-стаматолагаў. Вялікая работа праводзіцца па выяўленню і прафілактыцы зубных захворванняў. Працуе дзіцячы кабінет. У прыгожа абсталяваных фае і рэкрэацыях утульна адчуваюць сябе наведвальнікі.

Здача новай паліклінікі — канкрэтнае праяўленне клопатаў партыі і ўрада аб здароўі чалавека.

І.Грамоўскі.

9 красавіка 1983 г.

НА ПАТОКУ — ЖЫЛЫЯ ДАМЫ

Вытворчасць зборных шчытавых дамоў для жылля распачне сёлета раённае аб'яднанне «Сельгастэхніка». Для гэтай мэты тут вядзецца мантаж абсталявання ў спецыялізаваным цэху, пуск якога намечаны на канец другога — пачатак трэцяга квартала.

Як паведаміў рэдакцыі галоўны інжынер аб'яднання М.Р.Бараноўскі, калектыў цэха будзе штогод выпускаць да 100 такіх дамоў. Гэта стане добрай падмогай для вырашэння жыллёвай праблемы, асабліва ў сельскай мясцовасці. Агульная плошча такога дома перавышае 56 квадратных метраў, а арыенціровачны кошт яго складзе каля дзвюх тысяч рублёў.

Апрача таго, у цэху будуць вырабляцца кармушкі для патрэб жывёлагадоўчых ферм і кузавы для аўтамабіляў усіх марак.

А.Цімінскі.

4 жніўня 1984 г.

ВУЛІЦА ІМЯ ЛЮЛЬКОВА

Улічваючы заслугі ганаровага грамадзяніна горада Рыгора Фаміча Люлькова ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны пры вызваленні горада Асіповічы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і з мэтай увекавечання яго памяці, выканком гарадскога Савета народных дэпутатаў вырашыў перайменаваць вуліцу Спартакаўскую ў вуліцу імя Люлькова Р.Ф.

Гарадскому вытворчаму аб'яднанню жыллёва-камунальнай гаспадаркі даручана вырабіць і ўстанавіць на доме № 1 вуліцы Люлькова мемарыяльную дошку з тэкстам: «Вуліца носіць імя Люлькова Рыгора Фаміча (нарадзіўся 14.2.1916 года — памёр 28.7.1983 года), ганаровага грамадзяніна горада Асіповічы, былога камандзіра 120-га стралковага палка, які прымаў удзел у вызваленні горада Асіповічы 28 чэрвеня 1944 года».

1 чэрвеня 1985 г.

ГЕРОІ ФІЛЬМА — НАШЫ ЧЫГУНАЧНІКІ

Фільм па заказу Міністэрства шляхоў зносін і ЦК прафсаюза работнікаў чыгуначнага транспарту скончыла здымаць група кінематаграфістаў студыі «Беларусьфільм».

Гэта тэхніка-прапагандысцкая стужка пад назваю «Кожнаму кіламетру пуці — выдатнае ўтрыманне» прысвечана вопыту работы Верайцоўскага акалодка дыстанцыі пуці, які ўзначальвае Герой Сацыялістычнай Працы Аляксандр Андрэевіч Прановіч.

Здымкі вяліся на станцыі Верайцы, Асіповічы, у калгасе «Камунар», на перагонах акалодка.

Аўтар сцэнарыя С.А.Няўзорава, рэжысер Э.І.Гайдук, аператар І.І.Каган.

В.Біцюцкіх, сакратар партарганізацыі дыстанцыі пуці.

8 лютага 1986 г.

НОВАЯ АПТЭКА

Сваіх першых наведвальнікаў прыняла на гэтым тыдні новая аптэка ў заводскім мікрараёне.

Сюды завезена на 12 тысяч тавараў. Як адзначыў загадчык цэнтральнай раённай аптэкі Б.І.Шэманскі, гэтая аптэка апошняя, якая была пабудавана ў вобласці ў адзінаццатай пяцігодцы. Ёй прысвоен нумар 169.

А.Малахава.

17 кастрычніка 1987 г.

У ПРАЕКЦЕ — НОВАЯ СТАНЦЫЯ

Міністэрства сувязі БССР прыняло рашэнне пабудаваць у горадзе Асіповічы радыё-тэлевізійную станцыю.

Нярэдкія яшчэ выпадкі дрэннага паказу перадач на экранах нашых тэлевізараў. І прычын тут шмат. Звязаны яны ў асноўным з іх няякасным прыёмам. Праектаваннем станцыі будзе займацца ў будучым годзе Кіеўскі дзяржаўны інстытут па пошуках і праектаванню збудаванняў сувязі № 3. Пасля гэтага пачнуцца работы па ўзвядзенню РТС.

У.Пчалінцаў, інспектар Дзяржкамітэта па ахове прыроды Асіповіцкага раёна.

21 мая 1988 г.

РАЁН — ПЕРАМОЖЦА СПАБОРНІЦТВАЎ

ЦК КПБ, Савет Міністраў БССР, Белсаўпроф і ЦК ЛКСМБ разгледзелі вынікі рэспубліканскага сацыялістычнага спаборніцтва абласцей і раёнаў за лепшыя паказчыкі вытворча-эканамічнай дзейнасці ў выкананні заданняў Харчовай праграмы ў 1987 годзе.

У ліку пераможцаў рэспубліканскага сацыялістычнага спаборніцтва сярод раёнаў названы і наш — Асіповіцкі раён.

Ён узнагароджваецца пераходным Чырвоным сцягам ЦК КПБ, Савета Міністраў БССР, Белсаўпрофа і ЦК ЛКСМБ з дыпломам і выдачай грашовай прэміі.

9 снежня 1989 г.

ПАДПІСАН КАНТРАКТ

Расшыраюцца сувязі калектыву завода аўтаагрэгатаў з італьянскай фірмай «Галіно». Паміж імі заключаны кантракт на пастаўку італьянскага абсталявання для вытворчасці камплекта дэталей з паўцвёрдага пенаполіўрэтану для аўтамабіля маркі МАЗ-64221 на суму 3 мільярды 664 мільёны італьянскіх лір.

Нядаўна вопытныя спецыялісты фірмы наведалі прадпрыемства, выказалі свае думкі і меркаванні адносна новай вытворчасці на сустрэчы з кіраўнікамі і спецыялістамі завода і перадалі ім праектную дакументацыю.

У бліжэйшы час пачнуцца пастаўкі тэхналагічнага абсталявання на прадпрыемства.

І.Сцяпура, рэдактар аўтазаводскай радыёгазеты.

7 лістапада 1990 г.

ЗАВОД ПЕРАХОДЗІЦЬ НА АРЭНДУ

Завод «Рамспецкамунмаш» — самае маладое прадпрыемства ў нашым горадзе. Але, нягледзячы на гэта, ён заявіў пра сябе самым найлепшым чынам у Міністэрстве жыллёва-камунальнай гаспадаркі БССР. Па выніках работы ў першым паўгоддзі адзначаны пераходным Чырвоным сцягам. Стабільна, рытмічна працуе ён і цяпер.

І вось яго калектыў на сваім агульным сходзе вырашыў выйсці з вытворчага

аб'яднання «Камунмаш» і перайсці на арэнду. Работнікі прадпрыемства прынялі свой статут, выбралі праўленне і старшыню арэнднага калектыву. Ім стаў дырэктар завода В.Ц.Русаковіч.

У бліжэйшы час будзе заключаны дагавор з Міністэрствам жыллёва-камунальнай гаспадаркі з мэтаю выкупу асноўных і абаротных сродкаў. Прадпрыемства будзе перайменавана ў «Камунмаш» і стане выпускаць сучасную тэхніку жыллёва-камунальнай сістэмы.

І.Сцяпанаў.

20 лістапада 1991 г.

ПЕРШЫЯ БЕСПРАЦОЎНЫЯ

У гарадскім цэнтры занятасці насельніцтва, ці як мы раней называлі бюро па працаўладкаванню, афіцыйна зарэгістравана 8 беспрацоўных.

У асноўным гэта інжынерна-тэхнічныя работнікі і служачыя з сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыяй. І яшчэ адна асаблівасць: сем з ліку беспрацоўных — жанчыны і адзін — мужчына. Усе яны атрымліваюць дапамогу па беспрацоўі.

Л.Пятрова.

7 лістапада 1992 г.

ПРЫВАТЫЗУЕЦЦА ЖЫЛЛЁ

Звыш ста кватэр — такі жыллёвы фонд быў у калгасе «Чырвоны ўдарнік». У пачатку сёлетняга года пачалася яго прыватызацыя. У асабістую маёмасць калгаснікі выкупілі ўжо 60 працэнтаў кватэр.

Згодна прынятаму агульным сходам калгаснікаў рашэнню, кошт жылля не высокі. Ранейшаму кватэранаймальніку дастаткова аплаціць палавіну кошту жылля ў цэнах на 1 студзеня 1991 года. Пасля гэтага ён становіцца паўнапраўным гаспадаром дома або кватэры.

Як адзначыў старшыня праўлення калгаса В.А.Рымар, да канца года калгаснікі выкупяць усе жылыя памяшканні.

Ф.Аляксандраў.

1 чэрвеня 1994 г.

УШАНАВАЛІ ВЕТЭРАНАЎ

У калектыве дыстанцыі пуці працуе 56 удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Іх фотаздымкі размешчаны на спецыяльным стэндзе «Яны змагаліся за Радзіму». А напярэдадні 49-й гадавіны Вялікай Перамогі іх цёпла і сардэчна павіншавалі са святам начальнік Беларускай чыгункі, дарожны камітэт прафсаюза рабочых чыгуначнага транспарту і савет ветэранаў чыгункі.

У гонар свята Перамогі кожнаму ўдзельніку вайны выплачана па 200 тысяч рублёў.

8 лютага 1995 г.

І АСІПАЎЧАНЕ «ВЫСТАЎЛЯЮЦЦА»

Сёння ў Мінску пачынае работу Міжнародная рэспубліканская выстаўка-кірмаш «1000 дробязей». Праходзіць яна ў былым будынку ВДНГ, а цяпер выставачнай зале.

Сотні прадпрыемстваў выстаўляюць тут сваю прадукцыю. Сярод іх дастойнае месца займае і наш завод аўтамабільных агрэгатаў, які дэманструе больш 10 найменняў розных тавараў народнага спажывання і дэталей. Праводзіцца выстаўка-кірмаш з мэтай стымулявання попыту на прадукцыю, якую выпускаюць прадпрыемствы рэспублікі і замежныя.

С.Янкоў.

5 сакавіка 1997 г.

ПАСЯЛІЛІСЯ ЗУБРЫ

14 волатаў беларускіх лясоў атрымалі прапіску на тэрыторыі нашага раёна.

Зубры прыехалі да нас са славутай Белавежскай пушчы. Новым месцам рассялення велічных жывёл абрана Вязьеўскае лясніцтва. Апошняя партыя унікальных асобін жывёльнага свету была завезена 26 лютага.

21 мая 1997 г.

ВЕКАВЫЯ ДУБЫ

У нашым раёне знаходзяцца 2 помнікі культуры рэспубліканскага значэння раслінага паходжання.

Волаты раслінага свету — дубы — маюць даволі значны ўзрост: аднаму з іх каля 400 гадоў, другому — звыш 200. Растуць унікальныя дрэвы ў Брыцалавіцкім і Акцябрскім лясніцтвах.

13 верасня 1997 г.

ДОЎГАЖЫХАРЫ ГОРАДА

У горадзе на сённяшні дзень пражываюць 52 чалавекі, якія пераўзышлі 90-гадовы рубеж.

Ёсць у наяўнасці і людзі, якія жывуць ужо больш за 100 гадоў: такіх трое. Самы ж старэйшы доўгажыхар Асіповіч мае ўзрост у 103 гады.

13 мая 1998 г.

СТАЛІ ДЫПЛАМАНТАМІ

5—7 мая праходзіў чацвёрты рэспубліканскі фестываль «Не старэюць душой ветэраны». Удзел у ім прыняў і наш народны хор ветэранаў вайны і працы.

Запамінальным і для гледачоў, і для членаў журы стала амаль 30-мінутнае выступленне асіпаўчан. З дыпломам і каштоўным падарункам вярнуліся ўдзельнікі хору дадому.

Дыпломамі адзначаны таксама салісты хору Леанід Чудаў, Людміла Герасіменка і Уладзімір Жлобіч.

А.Друцкі.

9 чэрвеня 1999 г.

НАШЫ ДАРОГІ

Пад наглядам асіповіцкіх дарожных арганізацый ДРБУ-199 і ДУ-73 знаходзяцца 542,4 кіламетра дарог.

На абслугоўванні ДРБУ-199 435,1 кіламетра дарог, з якіх 102,9 — рэспубліканскага значэння. ДУ-73 мае 56,5 кіламетра магістральных і 50,8 — рэспубліканскіх дарог.

28 ліпеня 1999 г.

З 1900 ГОДА

Самым старым водаправодам горада валодае Асіповіцкі ўчастак водазабеспячэння Магілёўскай дыстанцыі водазабеспячэння і санітарна-тэхнічных устройстваў Беларускай чыгункі.

Час закладкі водаправодных труб на ўчастку паміж лакаматыўным дэпо і тэрыторыяй базы названай арганізацыі датуецца 1900 годам. Адметным з'яўляецца тое, што і па сённяшні дзень стан амаль векавога водаправода не выклікае асаблівых клопатаў: працуе...

Падрыхтаваў А.У.Тамашэўскі.

Ахова здароўя

За гады вайны раённай сістэме аховы здароўя, як і ўсёй гаспадарцы раёна, былі нанесены значныя страты. Амаль усе медыцынскія ўстановы былі закрыты, разрабаваны або спалены. Медыцынскія работнікі пайшлі на фронт і ў партызанскія атрады, многія з іх загінулі ў барацьбе з ворагам.

Адраджэнне аховы здароўя ў краі пачалося адразу пасля вызвалення раёна.

У 1946 г. ужо працавалі раённая бальніца на 75 ложкаў, паліклініка, аптэка, санэпідэмстанцыя, Лапіцкая, Ясенская, Свіслацкая ўчастковыя бальніцы, 4 урачэбныя амбулаторыі, 3 пункты аховы здароўя на прадпрыемствах, 9 фельчарска-акушэрскіх пунктаў. Арганізаваны малярыйны пункт, які ў 1949 г. пераўтвораны ў малярыйную станцыю.

У 1950 г. адкрыты ўчастковыя бальніцы

Медыцынскія работнікі Асіповіцкай раённай бальніцы — пераможцы абласнога конкурсу 1973 г. Злева направа: Зінаіда Пацкевіч, Ганна Мартынчык, Валянціна Брук, Таццяна Кірэева, Таццяна Агароднікава, Мікалай Пракаповіч.

ў пасёлках Ялізава, Татарка і Градзянка, вёсках Карытнае і Ліпень.

У 1967 г. усе медыцынскія ўстановы былі выведзены з наёмных памяшканняў, пабудаваны туберкулёзная бальніца, памяшканне Татаркаўскай участковай бальніцы, 2 урачэбныя амбулаторыі, 12 ФАПаў.

У 1979 г. раённая бальніца расшырылася да 225 ложкаў.

У 1980 г. у г. Асіповічы ўзведзена тыпавая дзіцячая малочная кухня, у 1983 г. — стаматалагічная паліклініка на 200 наведванняў у змену, у 1985 г. — адкрыта аптэка № 169. Пабудавана і дзейнічае новая раённая паліклініка на 800 наведванняў у змену.

Сёння медыцынскае абслугоўванне ажыццяўляюць цэнтральная раённая бальніца на 250 ложкаў, лячэбна-прафілактычная ўстанова «Вузлавая бальніца ст. Асіповічы Беларускай чыгункі» на 100 ложкаў, чыгуначная паліклініка на 350 наведванняў у змену, 7 сельскіх участковых бальніц, 3 паліклінікі, у тым ліку стаматалагічная, 4 сельскія ўрачэбныя амбулаторыі, 14 аптэк, 18 фельчарска-акушэрскіх пунктаў. Вядзецца будаўніцтва новай раённай бальніцы.

З гісторыі адукацыі

Да 1917 г. на тэрыторыі Асіповіцкага раёна працавала 8 царкоўна-прыходскіх і 16 пачатковых школ, 6 з якіх не мелі сваіх памяшканняў і спецыяльна падрыхтаваных настаўнікаў. У школах навучаліся пераважна хлопчыкі. Агульная колькасць вучняў у раёне не перавышала 800 чалавек.

У пачатку 1940-х гадоў у раёне ужо працавала 89 школ: 14 сярэдніх, 12 сямігадовых, 60 пачатковых і 3 дзіцячыя дамы ў вёсках Свіслач, Дараганава, Карытнае.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны амаль усе школы былі адноўлены. У 1944—1945 гг. у раёне налічвалася 61 школа з агульнай колькасцю вучняў 9399 чалавек.

У 1956 г. раённы аддзел адукацыі атрымаў папаўненне настаўнікаў — 45 чалавек з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй. Уведзены ў эксплуатацыю новыя будынкі школ. У 1961 г. на базе дзіцячага дома г. Асіповічы была заснавана школа-інтэрнат. Побач са старымі будынкамі вырас прыгожы трохпавярховы вучэбны корпус. У маляўнічым Дараганаве, непадалёку ад празрыстай Пічы, — санаторная школа-інтэрнат, якая адкрыта на базе дзіцячага дома. Яго гісторыя пачынаецца з далёкага 1924 г., калі на былой летняй дачы памешчыка Дарагана былі размешчаны беспрытульныя дзеці. З 1961 г. дзіцячы дом набыў статус санаторнай школы-інтэрната, быў узведзены новы будынак для школы.

За паўтара стагоддзя існавання многае зведала школа ў в. Свіслач. Школа ўпамінаецца ў гістарычных крыніцах з 1849 г., адзначаюцца разнастайныя архітэктурныя формы яе будынка.

У пачатку 1960-х гадоў шмат увагі ўдзялялася адкрыццю школ рабочай моладзі, якіх у раёне налічвалася 8: у

Заняткі ў Асіповіцкай СШ № 3.

населеных пунктах Татарка, Ялізава, Градзянка, Ясень, Лапічы, Свіслач, Ліпень, Замошша. У гэтых школах навучаўся 431 чалавек. У раёне працавалі 7 сярэдніх, 10 сямігадовых і 47 пачатковых школ. Агульная колькасць вучняў складала 5453. Меліся 344 настаўнікі, з іх 97 з вышэйшай, 73 з незакончанай вышэйшай і 152 з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.

У пачатку 1970-х гадоў у раёне была 51 школа: 20 пачатковых, 15 васьмігадовых, 16 сярэдніх. Агульная колькасць вучняў складала 5773. Дзейнічалі дзіцячаюнацкая спартыўная школа, раённы Дом піянераў і школьнікаў, станцыя юных натуралістаў. У сярэдзіне 1980-х гадоў колькасць школ і вучняў паменшылася.

У 1971 г. пабудавана новае памяшканне Свіслацкай школы, у 1974 г. — Каменіцкай васьмігадовай, у 1979 г. — Вяззеўскай СШ, у 1981 г. — СШ № 1 г. Асіповічы і Пагарэльскай базавай школы, у 1989 г. СШ № 3 г. Асіповічы, у 1991 г. — Красненскай СШ, у 1994 г. — Дрычынскай СШ, Асіповіцкай беларускай гімназіі.

У 2000 г. у раёне працавалі 23 сярэднія і 6 базавых школ, 2 комплексы «Пачатковая школа — дзіцячы сад». У школах налічвалася 9637 вучняў і 1075 педагогаў.

У 1995 г. у раёне адкрыліся прышкольныя інтэрнаты — у вёсках Ліпень, Ясень, р.п. Градзянка — для дзяцей з малазабяспечаных сем'яў. У іх жывуць і вучацца 95 чалавек.

Адным з новых відаў навучальных устаноў з'яўляецца беларуская гімназія, гісторыя якой пачалася з некалькіх гімназічных класаў, створаных на базе СШ № 1 (дырэктар А.А.Ліхачова) паводле рашэння гарвыканкома ад 25.7.1990 г. У 1993 г. гімназія пачала працаваць як самастойная адукацыйная ўстанова (у 1994 г. перайшла ў новы будынак). У гімназіі працуюць 16 настаўнікаў вышэйшай і 17 — 1-й катэгорый. З 43 вучняў 1-га выпуску 29 паступілі ў ВНУ і З — у каледжы.

У 1995 г. пачаў сваю работу дзіцячаюнацкі клуб, дзе стварылі 2 аддзелы: спартыўна-аздараўленчы і турыстычна-краязнаўчы. Агульная колькасць гурткоў — 50, імі было ахоплена 969 вучняў. У 1999 г. рашэннем раённага выканаўчага камітэта дзіцяча-юнацкі клуб быў перайменаваны ў клуб дзіцячага і юнацкага турызму і краязнаўства. Колькасць гурткоў турыстычнакраязнаўчага кірунку павялічылася да 61, а спартыўна-аздараўленчыя гурткі былі перададзены дзіцячай спартыўнай школе.

У 1982 г. аддзел адукацыі падзелены на гарадскі і раённы, у 1999 г. у сувязі з рэарганізацыяй кіраўніцкай сістэмы зноў аб'яднаны ў адзін раённы аддзел адукацыі. Яго загадчыкамі ў розны час працавалі П.Я.Жук (1960-я гады), М.П.Казакоў (1962—1979), В.У.Чупахін (1980—1998 і 1999—2000), І.І.Пузына (1998—1999 і з 2000).

Гарадскі аддзел адукацыі ўзначальвалі Г.В.Тур (1982—1983), Л.І.Майсеенка (1983—1998).

Званне «Заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь» атрымалі М.П.Казакоў, Ф.С.Дубінчык, П.С.Патапейка, Л.М.Махнач, А.П.Церахаў, А.А.Цімошчанка, В.Г.Жываглод, Ю.М.Яшчак, З.І.Чарапкоў, Г.В.Зайцава, А.Б.Чарноў, Н.А.Юркавец, В.Е.Клімовіч, Дж.А.Курчэўскі.

Былы дырэктар СШ № 2 І.А.Чырун узнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі, настаўніца Н.В.Трон — ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, настаўнік Ялізаўскай школы А.Я.Быкаў — ордэнам Дружбы народаў. Былы дырэктар СШ № 1 А.І.Арлоў удастоены звання заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь.

Дзякуючы вялікай і карпатлівай рабоце настаўнікаў і вучняў былі створаны школьныя музеі ў Дараганаве, Свіслачы, Вязаўніцы, Градзянцы, Ліпені, Вяззі, СШ № 2, СШ № 1 і інш. Напрыклад, Дараганаўскі краязнаўчы музей створаны ў 1983 г. Яго заснавальніцай з'яўляецца З.Р.Верашчака. Фонд музея складаюць 2526 экспанатаў.

Сярэдняя школа № 2 — старэйшая ў Асіповічах. Адкрылася яна ў 1906 г. як чыгуначная школа 2-й ступені пры станцыі Асіповічы Лібава-Роменскай чыгункі. Першы выпуск адбыўся ў 1912 г. Школьнікі ганарацца подзвігам былога вучня А.Чумакова, імя якога школа насіла ў 1922—1931 гг. З 1994 г. пры школе працуе гістарычны музей, агульная колькасць экспанатаў якога налічвае больш за 500 экзэмпляраў.

У нашы дні педагагічныя калектывы школ горада і раёна шмат робяць для ўкаранення ў практыку вучэбна-выхаваўчага працэсу навейшых дасягненняў навукі і выкарыстання новых тэхналогій навучання.

Г.В.Кікаўская.

На спартыўнай арбіце

Адразу пасля вайны на Асіповіччыне аднавіла сваю дзейнасць спартыўнае таварыства «Лакаматыў», створанае яшчэ ў 1930 г. У 1959 г. з'явілася яшчэ адно добраахвотнае спартыўнае таварыства — «Ураджай». З 1960 г. вядзе сваю гісторыю спартыўная навучальная ўстанова — дзіцяча-юнацкая спартыўная школа (ДЮСШ; першы дырэктар Л.Дз.Соладаў). У цэлым гэта паслужыла дадатковым штуршком у развіцці фізкультуры і спорту, росту як колькасці тых, хто займаўся ў футбольных, валейбольных, баскетбольных, лёгкаатлетычных, лыжных і іншых гуртках і секцыях, так і больш якаснаму выступленню асіповіцкіх камандаў у розных абласных і рэспубліканскіх спаборніцтвах. Удзел у іх мясцовыя спартсмены прымаюць рэгулярна і дабіваюцца стабільна высокіх паказчыкаў.

Жаночая каманда Ялізаўскага шклозавода «Кастрычнік» неаднаразова станавілася прызёрам і выходзіла пераможцай абласнога валейбольнага першынства, абараняла гонар Магілёўшчыны ў 1993 г. на рэспубліканскай рабочай Спартакіядзе. У 1989 г. дзяўчаты нават прымалі ўдзел у 1-й міжнароднай Спартакіядзе ў Маскве.

У канцы 1960-х гадоў у раёне пачала развівацца стэндавая стральба, каля вытокаў якой стаяў Ю.П.Сталыпін. Менавіта па яго ініцыятыве з'явіліся круглы і траншэйны стэнды. З канца 1970-х гадоў асіповіцкая каманда пастаянна ўдзельнічае ў чэмпіянаце і Кубку рэспублікі па стральбе, абараняючы гонар Магілёўскай вобласці. У 1979 г. нашы стралкі Ігар Ціхун і Юрый Сталыпін (сын трэнера) упершыню выконваюць нарматывы майстра спорту, а Юрый уваходзіць у склад зборнай Беларусі і выступае за спартклуб арміі Беларускай ваеннай акругі. Ён пастаянна трапляе ў тройку прызёраў чэмпіянату Кубка рэспублікі, у 1985 г. становіцца майстрам спорту міжнароднага класа і далей працягвае паспяхова выступаць.

За час знаходжання на пасадзе трэнера па стэндавай стральбе Ю.П.Сталыпіным падрыхтавана 3 майстры спорту і 18 кандыдатаў.

Сёння ў мясцовай ДЮСШ, якая спецыялізуецца на такіх гульнёвых відах, як футбол і баскетбол, займаецца да 1000 юных спартсменаў. Выхаванцы трэнера С.І.Шайкоўскага, напрыклад, неаднаразова станавіліся чэмпіёнамі вобласці ў сваіх узроставых групах, а ў 1996 г. заваявалі рэспубліканскае першынство. Добра гуляюць яго выхаванцы, як і ігракі С.С.Варыводава, у прэстыжных спаборніцтвах дзіцячай баскетбольнай лігі.

Мэтанакіраваная праца баскетбольных трэнераў дазволіла вырасціць нямала цікавых спартсменаў, якія выступаюць за розныя клубы нават за мяжой. А гонарам Асіповіч з'яўляецца каманда АЗАА (галоўны спонсар — завод аўтамабільных агрэ-

Каманда клуба «Юны дэсантнік» г. Асіповічы на міжнародных спаборніцтвах па парашутным спорце. Венгрыя, 1998 г.

Футбольная каманда «Свіслач».

гатаў), якая двойчы — у 1998 г. і 1999 г. — станавілася сярэбраным прызёрам беларускага баскетбольнага чэмпіянату.

Шмат гадоў вялікай папулярнасцю на Асіповіччыне карыстаецца і футбол. Ужо ў 1970-я гады сур'ёзна заявіла аб сабе мясцовая каманда «Лакаматыў», якая ў 1971 г. стала прызёрам рэспубліканскага першынства. Эстафету футбалістаў-чыгуначнікаў падхапіў клуб «Свіслач». За лічаныя гады каманда з 2-й лігі прабілася ў 1-ю, а потым на працягу сезона выступала ў вышэйшым дывізіёне, цяпер у 1-й лізе.

Асіповіцкая зямля выгадавала шэраг знакамітых у рэспубліцы і спартсменаў, і трэнераў. У канцы 1950—пачатку 1960-х гадоў, напрыклад, А.Дз.Яноўскі з в. Свіслач стаў майстрам спорту па трох відах — веславанні, лыжах і біятлоне, а цяпер плённа працуе ў Бабруйскім вучылішчы алімпійскага рэзерву трэнерам па веславанні. В.А.Карчэўскі з р.п. Градзянка — майстар спорту па біятлоне, трэніруе нацыянальную зборную Беларусі па біятлоне. У 1996 г. Аляксандр Стальмакоў з Ялізаўскай СШ на чэмпіянаце свету па веславанні на каноэ сярод юніёраў заваяваў 2 бронзавыя ўзнагароды. Неаднаразовы пераможца міжнародных спаборніцтваў па кіданні молата Сяргей Марцям'янаў з Вяззя заняў 4-е месца на юніёрскім чэмпіянаце свету ў Сіднеі (Аўстралія). Чэмпіёнамі рэспублікі сярод школьнікаў у бегу на 3000 м з'яўляецца вучань Ясенскай СШ Аляксей Волкаў, а ў веславанні на каноэ — Уладзімір Строк са Свіслацкай

Баскетбольная каманда АЗАА 1998 г.

СШ. У свой час чэмпіёнкай Беларусі па шахматах станавілася Г.П.Невядомская, чэмпіёнам вобласці — С.С.Мельнікаў.

Традыцыйным стаў Асіповіцкі марафон, які, дзякуючы намаганням кіраўніка клуба аматараў бегу «Кентаўр» Дж.А.Курчэўскага, заваяваў папулярнасць нават у замежжы. Марафон стартаваў у Асіповічах ужо 19 разоў, збіраючы ўсе больш і больш удзельнікаў.

Дасягнутыя вынікі ў пэўных відах спорту, масавасць у фізкультурным руху не прыйшлі самі па сабе. Падставай для дасягненняў служыць як плённая работа трэнераў, так і нядрэнная матэрыяльна-тэхнічная спартыўная база. Яе стварэнню і падтрымцы шмат увагі аддаюць мясцовая ўлада, а таксама шэраг кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў — завода аўтамабільных агрэгатаў (Я.В.Шуранкоў), Асіповіцкі завод «Каммаш» (В.Ц.Русаковіч), СП ААТ «Дах» (былы дырэктар А.В.Бабанскі), Асіповіцкага ўпраўлення магістральных газаправодаў (В.І.Сухачоў), ААТ «Асіповіцкі малочны камбінат» (былы дырэктар У.М.Вараб'ёў).

У Асіповічах дзейнічаюць стадыёны «Юнацтва» і «Лакаматыў», фізкультурна-аздараўленчыя комплексы на АЗАА і Асіповіцкім заводзе «Каммаш». Папулярнасцю ў асіпаўчан карыстаюцца клубы «Юны дэсантнік», прыхільнікаў цяжкай атлетыкі «Мускул», аэробікі, валейболу «Бадзёрасць», мотавеласпорту, шахматна-шашачны «Дэбют», які нядаўна справіў навасельле у памяшканні, падараным гораду заводам аўтаагрэгатаў.

З лютага 1999 г. па 2000 г. выдаваўся адзіны ў рэспубліцы фізкультурна-спартыўны дадатак да раённай газеты «Асіповічы спартыўныя».

АСІПОВІЦКІ МІЖНАРОДНЫ МАРАФОН

Кожны год, пачынаючы з 1983 г., у 2-ю суботу красавіка ў Асіповічах адзначаецца спартыўнае свята — традыцыйны Асіповіцкі міжнародны марафон, які прысвячаецца гадавіне вызвалення Асіповіцкага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і памяці ўраджэнца раёна Героя Савецкага Саюза М.П.Каралёва.

У пачатку 1980-х гадоў аздараўленчы бег перажываў значны пад'ём. Бегуны Асіповіч, пазней аб'яднаныя ў клубе аматараў бегу «Кентаўр», якія перыядычна прымалі ўдзел у афіцыйных спаборніцтвах у Мінску, Бабруйску, Магілёве, Жодзіне і інш. гарадах, вырашылі арганізаваць такія спаборніцтвы ў родным горадзе.

У першым марафоне ўдзельнічала ўсяго 11 чалавек і толькі мужчыны. Яны былі падзелены на 3 узроставыя групы: да 25 гадоў, 25—45 гадоў, старэй за 45 гадоў. Лепшы вынік — 2 гадз 30 мін — паказаў прадстаўнік 1-й узроставай групы выпускнік Асіповіцкай школы-інтэрната Аляксандр Майлычка, у іншых узроставых групах пераможцамі былі Юрый Абмоін — настаўнік фізкультуры СШ № 1 г. Асіповічы, і Джан Курчэўскі — настаўнік гісторыі СШ № 5 г. Асіповічы.

Цяжкасцей у арганізатараў штогадовага марафона было шмат. Спачатку ён праводзіўся на энтузіязме яго арганізатараў і ўдзельнікаў, затым атрымаў падтрымку мясцовых улад і прадпрыемстваў, паступова набыў шырокую папулярнасць. Асіповіцкі марафон стаў традыцыйным, вядомым сярод аматараў бегу і спартсменаў высокага класа Беларусі, Расіі, Украіны, краін Прыбалтыкі, Малдовы.

Ён вытрымаў выпрабаванні эканамічнага і іншага кшталту. У горадзе склаўся невялікі калектыў энтузіястаў (Джан Курчэўскі, Юрый Абмоін, Аляксей Радзівонаў і інш.), якія самаахвярна, не шкадуючы свайго часу, удзельнічалі ў арганізацыі і правядзенні спаборніцтваў.

У 1995 г. Асіповіцкі марафон атрымаў статус міжнароднага. Паступова пашыралася геаграфія ўдзельнікаў. Нягледзячы на эканамічныя цяжкасці, раённыя арганізацыі і прадпрыемствы (у першую чаргу дырэкцыі і прафкомы завода аўтаагрэгатаў, ААТ «Дах», масларобчага камбіната, хлебазавода, завода камунальных машын, камандаванне мясцовай вайсковай часці) аказваюць неабходную мінімальную падтрымку ў арганізацыі і правядзенні традыцыйных марафонскіх прабегаў.

Адначасова са стартам класічнага марафона (42 км 195 м) стартуюць удзельнікі на 10-кіламетровую дыстанцыю. Яна прызначана пераважна для старэйшых школьнікаў і сталых бегуноў-аматараў, якія пакуль што не рашаюцца прабегчы марафонскую адлегласць. Для малодшых і сярэдніх школьнікаў горада і раёна арганізоўваецца прабег на 2 км.

За гады правядзення Асіповіцкага міжнароднага марафона яго дыстанцыю

пераадолела больш за 1000 спартсменаў і аматараў бегу з 50 гарадоў і пасёлкаў Беларусі і з 8 замежных краін — Расіі, Украіны, Літвы, Латвіі, Малдовы, Казахстана, Польшчы, ЗША. Самы старэйшы марафонец — Георгій Ціткін з Мінска. Ён нарадзіўся ў 1925 г., удзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне, захапіўся аздараўленчым бегам у сталым узросце, паспяхова ўдзельнічаў у 28 марафонскіх прабегах, у т.л. у 7 прабегах у Асіповічах. У 2001 г. ва ўзросце 76 гадоў ён пераадолеў марафон за 4 гадз 56 мін. Сярод жанчын старэйшай удзельніцай Асіповіцкага марафона з'яўляецца Святлана Меднікава з Гродна. Яна прабягала марафонскую трасу ў Асіповічах 7 разоў, у т.л. у 2001 г. ва ўзросце 60 гадоў з вынікам 3 гадз 37 мін. Самым малодшым удзельнікам марафона быў школьнік Ігар Кушнер з Асіповіч, які нарадзіўся ў 1969 г. Ён прабег марафонскую дыстанцыю ў 1984 г. ва ўзросце 15 гадоў з вынікам 3 гадз 30 мін. Сярод жанчын самай малодшай была студэнтка Беларускай акадэміі фізічнага выхавання і спорту Таццяна Саф'янава (1981 года нараджэння), якая прабегла трасу за 4 гадз 9 мін.

Пераможцы Асіповіцкага міжнароднага марафона паказваюць вынікі блізкія да вынікаў пераможцаў прэстыжных сусветна вядомых марафонаў, чэмпіёнаў і прызёраў Алімпійскіх гульняў. Так, найлепшы вынік Асіповіцкага міжнароднага марафона (рэкорд трасы) — 2 гадз 26 мін — толькі на 16 мін горшы за вынік пераможцы марафона на XXVII Алімпійскіх гульнях (2 гадз 10 мін) у 2001 г. у Сіднеі (Аўстралія). Гэты вынік у Асіповічах паказаў майстар спорту Сяргей Казлоў з Мінска ў 1996 г. Сярод жанчын рэкардсменкай трасы з'яўляецца майстар спорту Алена Цухло з Мінска, якая ў 1996 г. прабегла дыстанцыю ў Асіповічах за 2 гадз 42 мін, што толькі на 19 мін горш за пераможцу Алімпійскіх гульняў у Сіднеі (2 гадз 23 мін).

Сярод прадстаўнікоў Асіповіч і раёна, якія ўдзельнічалі ў марафоне, самым старэйшым з'яўляецца Джан Курчэўскі (нарадзіўся ў 1938), самым малодшым — Кушнер. Найлепшы вынік належыць выпускніку Асіповіцкай школы-інтэрната Аляксею Радзівонаву — 2 гадз 28 мін (1986). Што тычыцца членаў Асіповіцкага клуба аматараў бегу «Кентаўр», то яны не толькі актыўна ўдзельнічаюць у арганізацыі і правядзенні марафонскіх прабегаў у родным горадзе, але і паспяхова прабеглі вядомыя марафоны на Беларусі і за яе межамі. Так, многія члены «Кентаўра» неаднаразова ўдзельнічалі ў штогадовых Бабруйскім, Брэсцкім і Мінскім марафонах, у Маскоўскім міжнародным марафоне міру, у марафоне ў Санкт-Пецярбургу, былі адзначаны сярод удзельнікаў марафонаў у Рызе і Елгаве (Латвія), Тракаі (Літва). Асіповіцкія марафонцы паспяхова прадстаўлялі свой родны горад і рэспубліку ў Балгарыі (Габрава), Вялікабрытаніі (Уэльскі горны марафон) і ў Польшчы (Улацлавак). Сярод асіповіцкіх марафонцаў найбольш вызначыліся Джан Курчэўскі (удзельнік 34 марафонаў, у т.л. 9 у Асіповічах), Аляксей Радзівонаў (13 марафонаў, у т.л. 7 у Асіповічах), Віктар Курбатаў (12 марафонаў у Асіповічах), а таксама Юрый Абмоін, Лідзія Гальчэня, Сяргей Патапаў.

Многія аматары бегу і спартсмены ўдзельнічалі ў Асіповіцкім марафоне шмат

Старт 18-га Асіповіцкага міжнароднага марафона. 8.4.2000 г.

разоў. Чэмпіёнам па колькасці пераадоленых у Асіповічах марафонскіх дыстанцый з'яўляецца Аляксей Міхееў з Мінска (1936 года нараджэння). Ён паспяхова ўдзельнічаў у 11 прабегах. Сярод жанчын найбольшую колькасць марафонаў у Асіповічах пераадолела Святлана Меднікава.

Сярод удзельнікаў Асіповіцкага міжнароднага марафона адзначаны вядомыя спартсмены, удзельнікі прэстыжных міжнародных прабегаў, заслужаныя майстры спорту, у мужчын — Леанід Гісаў, Сяргей Казлоў, Валянцін Латышаў (чэмпіён Еўропы), Асланбек Салсанаў; у жанчын — Вера Гаўраніна, Святлана Меднікава, Алена Цухло. Кожны год на старт у старэйшых узроставых групах выходзяць удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны і ветэраны арміі, сярод якіх Анатоль Гогалеў (1925 г.н.), Эдуард Макарэвіч (1927 г.н.), Віталь Гарагляд (1927 г.н.), Павел Сірэнка (1922 г.н.), Георгій Ціткін з Мінска, Генрых Капітонаў (1928 г.н.) з Чарнігава, Валянцін Латышаў (1926 г.н.) з Рыгі, ветэран працы Аляксей Князеў (1928 г.н.) з Мінска і інш.

Стартуюць і паспяхова прабягаюць поўную марафонскую дыстанцыю і людзі моцнай волі, якія ў свой час атрымалі траўмы і інваліднасць, але не скарыліся і ў выніку перамаглі. Да іх ліку адносіцца Аляксандр Кізіл з Мінска (1944 года нараджэння), шматгадовы старшыня клуба аматараў бегу «Мінск», актыўны марафонец (у 1983—1995 гг. паспяхова ўдзельнічаў у 89 марафонскіх і звышмарафонскіх прабегах у рэспубліцы і за яе межамі). У 1995 г. ён атрымаў цяжкія вытворчыя траўмы са шматлікімі пераломамі пазваночніка, грудной клеткі, рук і ног. Амаль 2 гады праляжаў у бальніцы. Але дзякуючы моцнай сіле духу і таварыскай дапамозе сяброў па клубе змог паправіцца і прыступіць да працы і асцярожных трэніровак. А ў 2000 г. А.Кізіл пераадолеў трасу Асіповіцкага міжнароднага марафона. Паспяхова ўдзельнічалі ў марафоне інваліды па зроку (у т.л. інвалід 1-й групы Пётр Аўласенка з Бабруйска, удзельнік Нью-Йоркскага марафона ў 2000 г.).

Бывалыя марафонцы лічаць, што Асіповіцкі міжнародны марафон пераадолець круху лягчэй, чым іншыя. Гэта звязана з выдатнай арганізацыяй спаборніцтваў, рэльефам трасы, надвор'ем у час прабегу.

Стартуе марафон у 11 гадз з Цэнтральнай плошчы г. Асіповічы ад будынка райвыканкома. Траса прабегу пастаянная, ніколі не мяняецца. Пасля старту яна праходзіць па вул. Сумчанкі, далей па спакойнай шашы Асіповічы — в. Ліпень да павароту на в. Знаменка (21 км 97,5 м) і назад да месца старту. Траса марафона вельмі роўная, амаль без паваротаў, пад'ёмаў і спускаў, праходзіць па маляўнічай раўніннай мясцовасці. На дыстанцыі, як і патрабуецца правіламі марафонскіх прабегаў, знаходзяцца пункты харчавання (на 11 і 16 км, на павароце трасы назад, на 26, 31 і 37 км). Траса ахавана ад ветру невялікімі ляснымі масівамі і пасадкамі дрэў уздоўж шашы.

Судзейская брыгада фіксуе вынікі на працягу 5 гадз пасля старту. І ўдзельнікі могуць ставіць задачу — быць адным з лідэраў і прабегчы 42 км 195 м менш чым за 3 гадз або асцярожна, у раўнамерным тэмпе пераадолець дыстанцыю прыкладна за 4 гадз 30 мін.

Марафон праводзіцца ў мужчын у 10 узроставых групах (да 29, 30—39, 40—44, 45—49, 50—54, 55—59, 60—64, 65—69, 70—74, 75 гадоў і старэй) і 8 аналагічных групах у жанчын (апошняя — 65 гадоў і старэй). Аднак удзел жанчын не такі масавы, як мужчын, і яны прадстаўлены не ва ўсіх узроставых групах (звычайна ў 3—4).

22.4.2001 г. адбыўся 19-ы Асіповіцкі міжнародны марафон. Яго закончыў 71 бягун. Сярод мужчын перамог Валянцін Крычко з в. Цялуша Бабруйскага раёна (1970 года нараджэння) — 2 гадз 26 мін 42 с, сярод жанчын Святлана Меднікава.

Міжнародны марафон прыдаў Асіповічам новыя рысы індывідуальнасці і выключнасці, вылучыў горад з шэрагу раённых цэнтраў Беларусі, павысіў у жыхароў увагу да спорту, цягу да здаровага ладу жыцця, гордасць за свой родны горад. Ён стаў цікавым фактам багатай гісторыі раёна. Ва ўсім гэтым вялікая заслуга яго нястомных актывістаў, якія больш за 20 гадоў нясуць сваю нялёгкую добраахвотную грамадскую ношу.

І.Я.Афнагель,
пастаянны ўдзельнік марафона з 1988 г.

З гісторыі прадпрыемстваў раёна

Адкрытае акцыянернае таварыства «Асіповіцкі малочны камбінат». Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Асіповіцкі малочны камбінат, як і іншыя прадпрыемствы, прыступіў да работы. Размяшчаўся ў сялянскай хаце на вул. Дзмітрыева, 8. Меў 2 цэхі (масларобчы і сепаратарны) і лабараторыю. Механізмы прыводзіліся ў дзеянне конскім прыводам. З тэхналагічнага абсталявання меўся адзін сепаратар. Масла збівалася ў драўлянай бочцы. Уся работа па выпуску малочнай прадукцыі выконвалася ўручную. Да канца 1948 г. быў пабудаваны новы аднапавярховы драўляны маслазавод на вул. Чапаева. Тут работы былі ўжо механізаваны. Гэта дало магчымасць палепшыць якасць і павялічыць асартымент выпускаемай прадукцыі. Маслазавод стаў адным з найбольш значных прадпрыемстваў горада. У 1979 г. закончана будаўніцтва новага маслазавода на вул. Юбілейнай.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Асіповіцкі завод камунальнага машынабудавання». Уведзена ў эксплуатацыю 31.12.1986 г. З 1991 г. сучасная назва. За час існавання прадпрыемствам асвоена каля 50 відаў вырабаў. Асноўная прадукцыя (2001): смеццявозы МБ-15, МЗ-15 з бакавой і задняй загрузкай ушчыльнення, транспарціроўкі і разгрузкі цвёрдых бытавых адходаў; смеццявозы МБ-8 на базе аўтамабіля ГАЗ; смеццявозы з задняй і бакавой загрузкай на базе прычэпа трактара МТЗ; пескараскідальнікі на базе аўтамабіляў ЗІЛ, МАЗ, трактарнага прычэпа; мабільныя мінірэгенератары асфальту для ліквідацыі розных дэфектаў асфальтабетоннага пакрыцця вуліц і дарог з выкарыстаннем як звычайнага, так і літага асфальту; установкі для абясшкоджвання вады, дэзінфекцыі сетак і збудаванняў; паліфарна-мыйнае абсталяванне на базе аўтамабіля ЗІЛ; трактарныя снегаачышчальнікі; шчоткі дарожныя. У 2000 г. выраблены доследныя ўзоры новай тэхнікі: вакуумна-ўборачная машына, машына для ўкладкі асфальту на базе трактара МТЗ, смеццявоз ротарны. Асноўнымі спажыўцамі прадукцыі завода з'яўляюцца прадпрыемствы сістэмы жыллёва-камунальнай гаспадаркі і дарожна-эксплуатацыйныя арганізацыі Рэспублікі Беларусь. Прадпрыемства мае сталовую, магазін, медпункт са стаматалагічным кабінетам, гасцініцу, заправачную станцыю. У 1994 г. здадзены ў эксплуатацыю 32-кватэрны жылы дом з заводскай гасцініцай на 14 месцаў, у 1999 г. на долевым удзеле пабудавана 41 кватэра ў 124-кватэрным жылым доме.

Асіповіцкі леспрамгас адкрытага акцыянернага таварыства «ФанДОК». Арганізаваны ў 1930 г. на базе аб'яднання Лесбела. У яго склад уваходзілі Лапіцкі, Дуброўскі, Градзянскі, Ліпеньскі, Вяззеўскі, Брыцалавіцкі, Цэльскі лесапункты. У першыя гады работы план вывазкі лесу складаў 500 тыс. м^3 у год. Нарыхтоўка праводзілася ўручную, вывазка — на конях. Першыя аўтамашыны для вывазкі лесу леспрамгас атрымаў у 1934 г. У 1936 г. былі пабудаваны невялікія лесапільныя заводы. У 1937 г. упершыню прыменена механізаваная пагрузка драўніны кранам, які змантіравалі сваімі сіламі на базе аўтамабіля ЗІС-5. У пасляваенны перыяд калектыў пачаў сваю работу адразу пасля вызвалення Беларусі. Гэты перыяд адзначаны паскораным тэхнічным забеспячэннем машынамі і механізмамі. Так, ужо ў 1945 г. вывазка лесаматэрыялаў праводзілася машынамі, на валцы лесу пачалі выкарыстоўваць электрапілы. Да канца 1949 г. леспрамгас меў 7 перасоўных электрастанцый з электрапіламі для іх, 30 лесавозных аўтамабіляў, 2 аўтакраны. Пачалі працаваць тралёвачныя трактары, выкарыстоўваліся бензаматорныя пілы «Дружба». Да 1956 г. дасягнута поўная механізацыя на валцы і раскрыжоўцы драўніны. З паступленнем больш магутных спецыяльных механізмаў пачала мяняцца тэхналогія лесанарыхтовак. У 1975 г. у сувязі з удасканаленнем структуры прадпрыемстваў лясной і дрэваперапрацоўчай прамысловасці БССР леспрамгасу быў аддадзены Слуцкі вытворчы лесхімучастак. А ў наступным годзе леспрамгас увайшоў у аб'яднанне «Бабруйскдрэў». У 1991 г. аб'яднанне «Бабруйскдрэў» стала народным прадпрыемствам. У чэрвені 1994 г. на яго базе створана адкрытае акцыянернае таварыства «ФанДОК», акцыянерамі якога стала большасць

работнікаў Асіповіцкага леспрамгаса. З кастрычніка 1995 г. леспрамгас стаў даччыным прадпрыемствам ААТ «ФанДОК» з правам юрыдычнай самастойнасці. За працоўныя дасягненні многія члены калектыву адзначаны высокімі ўрадавымі ўзнагародамі. Ордэна Леніна ўдастоены А.Ф.Казлоў і І.Ф.Гоман. 11 чалавек узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і Дружбы народаў. 17 чалавекам прысвоена званне «Ганаровы майстар лесанарыхтовак і лесасплаву».

Рэспубліканскае даччынае унітарнае вытворчае прадпрыемства «Асіповіцкі хлебазавод». Пабудавана ў 1953 г. Першым дырэктарам быў М.І.Лагойка. Максімальны аб'ём выпуску хлебабулачных вырабаў складаў 30 т у суткі. У 1978 г. была праведзена рэканструкцыя хлебазавода з установкай пяці тэхналагічных ліній. Максімальны аб'ём выпуску прадукцыі дасягаў 45 т у суткі. За ўвесь час сваёй дзейнасці завод паспяхова спраўляўся з асноўнай задачай — задавальненне патрэб насельніцтва горада і раёна ў якасных хлебабулачных, кандытарскіх і макаронных вырабах. У нашы дні завод працуе стабільна, выпускае прадукцыю палепшанай якасці, пашырае асартымент вырабаў. За высокія паказчыкі ў працы працаўнікі хлебазавода адзначаліся высокімі ўрадавымі ўзнагародамі: Т.М.Шалай — ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, М.М.Нягоцкая і Б.М.Пляханава — ордэнам «Знак Пашаны».

Рэспубліканскае унітарнае даччынае Асіповіцкае аўтатранспартнае прадпрыемства «Аўтамабільны парк № 19». Арганізавана ў 1963 г. Спачатку мела невялікі парк — 14 аўтамашын, размяшчалася ў прымітыўных майстэрнях на вул. Дзмітрыева. У 1972 г. пабудаваны новыя вытворчыя карпусы на вул. Юбілейнай. Па праекце вытворчая магутнасць разлічана на 54 адзінкі тэхнікі. Аўтапарк абслугоўвае пасажыраў на 14 гарадскіх, 29 прыгарадных і 1 міжгародным маршрутах. Ён з'яўляецца адзіным аўтатранспартным прадпрыемствам агульнага карыстання ў Асіповіцкім раёне, уваходзіць у склад ВА «Магілёўаблаўтатранс» Міністэрства транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Асіповіцкі завод аўтамабільных агрэгатаў». Створана ў 1963 г. як філіял Мінскага аўтамабільнага завода. Уваходзіць у вытворчае аб'яднанне «БелаўтаМАЗ» і з'яўляецца буйнейшым вытворцам вырабаў са шклапластыку, пенаполіурэтану, ліцця з алюмініевага сплаву. Асноўнай прадукцыяй механазборачнага цэха № 5 былі шклапластыкавыя кабіны. Будаўніцтва ўласна завода аўтамабільных агрэгатаў пачата ў 1971 г. З уводам у эксплуатацыю ў 1976 г. цэха алюмініевага ліцця быў створаны завод, які ўвайшоў у склад вышэйназванага аб'яднання. Буйнымі спажыўцамі прадукцыі завода з'яўляюцца МАЗ, БелАЗ, Магілёўтрансмаш, Гомсельмаш, мінскія мотавелазавод і завод колавых цягачоў, а таксама іншыя прадпрыемствы, заводы, фірмы, прыватныя прадпрымальнікі з Беларусі, Расіі, Украіны. Асвоены выпуск 48 новых відаў дэталей для аўтамабіляў сямейства МАЗ, на участку пенаполіурэтану ўкаранёна сістэма кіравання якасцю ІСО-9000. З будаўніцтвам завода ў паўночнай частцы горада ўзнік новы жылы мікрараён, дзе знаходзяцца 2 школы, паліклініка, дзіцячыя дашкольныя ўстановы, стадыён «Юнацтва», фізкультурна-аздараўленчы комплекс, Дом абрадаў, развітая сетка гандлю і грамадскага харчавання. Баскетбольная каманда АЗАА выступае ў чэмпіянаце рэспублікі. На трасе завода праводзяцца міжнародныя спаборніцтвы па мотакросе. Завод мае падшэфны калгас «Бальшавік».

Адкрытае акцыянернае таварыства «Асіповіцкі камбінат бытавога абслугоўвання». Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1944 г. сталі арганізоўвацца прадпрыемствы прамкааперацыі на базе арцелей па шыцці адзення, абутку, галаўных убораў, будаўніцтве і рамонце жылых дамоў, аказанні фотапаслуг і іншых работ для паляпшэння жыццёвага ўзроўню насельніцтва. Ствараліся новыя рабочыя месцы для людзей, якія вярнуліся да мірнай працы. 1.10.1944 г. былі створаны арцель «Сацпраца» ў г. Асіповічы, арцель «Прагрэс» у р.п. Ялізава і в. Свіслач, арцель «Эканомія» ў м. Лапічы. У асноўным усе яны мелі майстэрні па пашыве адзення, абутку, галаўных убораў. Галаўное прадпрыемства — арцель «Сацпраца» — мела брыгады па будаўніцтве жылых дамоў, фотастудыю, аўталаўкі, якія абслугоўвалі людзей у горадзе і на раёне. 1.10.1960 г. прамкааперацыя была рэарганізавана і на базе ўсіх прадпрыемстваў

горада і раёна быў створаны Асіповіцкі камбінат бытавога абслугоўвання. У 1961 г. на вул. Інтэрнацыянальнай пабудаваны Дом быту, у 1964 г. на вул. Горкага — цэх масавага пашыву, у 1973 г. на вул. Сумчанкі — Дом быту, у 1990 г. у мікрараёне № 1 — Дом быту. У 1960—1970 гг. у раёне ўзведзена цэлая сетка сельскіх дамоў быту, швейных майстэрань, комплексных прыёмных пунктаў (КПП). Да 1975 г. камбінат узначальваў І.І.Цвырко. На працягу 1978—1988 гг. дырэктарам КБА працаваў М.Ф.Лявонаў, пры якім пабудавана шмат аб'ектаў, склады, кантора, майстэрня, адкрылася многа новых КПП. Закройшчыца Л.А.Жлобіч узнагароджана ордэнам Дружбы народаў.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Асіповіцкі камбінат хлебапрадуктаў». Будаўніцтва Асіповіцкага млынкамбіната № 3 пачалося ў сакавіку 1965 г. на базе хлебапрыёмнага пункта. Вялося яно ў 2 этапы: у жніўні 1967 г. уступіла ў строй 1-я чарга элеватара, рабочая башня і сіласны корпус, у верасні 1969 г. — гатунковы млын, 2-і і 3-і карпусы элеватара, а таксама камбікормавы цэх. У 1970 г. уведзена ў дзеянне 4-я чарга элеватара, у 1974 г. тарарамонтны цэх. У 1975—1976 гг. праведзена рэканструкцыя камбікормавага цэха. У 1977 г. закончана будаўніцтва і ўведзены ў эксплуатацыю цэх па вытворчасці пяцінумарных ячных круп. Будаўніцтва і рэканструкцыя вытворчых магутнасцей працягваліся і ў наступныя гады. Сёння структурныя падраздзяленні камбіната складаюць 6 вытворчых і 7 дапаможных цэхаў. У 1986 г. і 1988 г. калектыў узнагароджваўся пераходным Чырвоным сцягам Міністэрства хлебапрадуктаў, у 1987 г. — Ганаровай граматай ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР.

Гандлёва-вытворчае даччынае прадпрыемства «Аддзел рабочага забеспячэння станцыі Асіповічы» У 1936 г. на чыгунцы быў арганізаваны трансгандальхарч, які існаваў да 1942 г. Са студзеня 1942 г. трансгандальхарчы былі перайменаваны ў аддзелы рабочага забеспячэння дарог (АРЗ). На чыгуначным вузле ст. Асіповічы, пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1944 г., быў зноў арганізаваны АРЗ. Яму далі ў распараджэнне вагоны і драўляны будынак для арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання. У сувязі з тым, што для сталовых патрэбны былі прадукты, а ў краіне іх не хапала, АРЗ займеў падсобную гаспадарку, дзе ўтрымліваліся свінні і каровы, вырошчваліся бульба і агародніна. У 1948—1950 гг. былі пабудаваны 4 магазіны, устаноўлены вагон пад магазін у раёне вагоннага дэпо. На базе санпрапускніка абсталявана хлебапякарня. У 1950 г. у АРЗ працавалі 3 сталовыя, 6 магазінаў. У 1957 г. пабудавана існуючая цяпер база. На працягу 1960—1975 гг. былі знесены ўсе старыя і ўзведзены новыя тыпавыя магазіны, здадзены агародніна- і бульбасховішчы, гараж. 8 магазінаў пабудаваны ў 1975—1996 гг.

Сёння АРЗ уключае 17 магазінаў і 3 сталовыя.

Станцыя Асіповічы 1-я. З'яўляецца адным з буйнейшых вузлоў Магілёўскага аддзялення чыгункі. У склад станцыі ўваходзяць лінейныя аддзяленні Асіповічы 2-я і 3-я, Татарка, Дзераўцы, Дараганава, Градзянка, Лапічы. У пасляваенныя гады станцыя развівалася, уводзіліся новыя лініі, ствараліся новыя пасты. У наш час на станцыі Асіповічы прымяняюцца перадавыя метады і формы для павышэння прадукцыйнасці працы. На пастах уведзены машыны АРМ. У таварнай канторы, бухгалтэрыі, лінейна-камерцыйным цэнтры (арганізаваны ў 1996) уведзена камп'ютэрная сістэма выдачы паказчыкаў. Амаль 85% работ праводзіцца з дапамогай камп'ютэрных устройстваў і аўтаматычнага кіравання. Станцыя Асіповічы — вузлавая, якая забяспечвае перавозку грузаў у краіны Балтыі, Расію, на Украіну. Прапускная магутнасць станцыі — 100 пар цягнікоў у суткі. Найвышэйшых паказчыкаў у выкананні вытворчых планаў калектыў дасягнуў у 1980-я гады. Станцыя займала прызавыя месцы ва Усесаюзным спаборніцтве, узнагароджвалася Ганаровымі граматамі Міністэрства шляхоў зносін, Упраўленнем Беларускай чыгункі.

З ГІСТОРЫІ ЧЫГУНАЧНАЙ СТАНЦЫІ АСІПОВІЧЫ

У сувязі з будаўніцтвам Лібава-Роменскай чыгункі 17 лістапада 1872 г. за 2 км ад вёскі Асіповічы было пачата будаўніцтва чыгуначнай станцыі. У 1876 г. яна была пушчана ў эксплуатацыю. Адначасова былі пабудаваны і майстэрні

Асіповіцкі вакзал. Пачатак XX ст.

па рамонце паравозаў і вагонаў, а таксама 5 драўляных жылых дамоў. Паравозны парк складаўся з прымітыўных паравозаў.

У 1890 г. са станцыі было адгружана 296 987 пудоў лесаматэрыялаў і іншых грузаў. У 1893 г. пры станцыі адкрылася паштовае аддзяленне, якое карысталася тэлеграфам чыгункі. У 1896 г. была праведзена вузкакалейная чыгунка Асіповічы — Дараганава. У 1897 г. быў здадзены новы мураваны будынак чыгуначнай станцыі, у 1898 г. на станцыі быў пабудаваны лесашпалавы завод.

У 1900 г. упраўленне Лібава-Роменскай чыгункі пабудавала ў Асіповічах шпалапрапітны завод, што спрыяла прытоку рабочай сілы. У 1905 г. ветка Асіповічы — Дараганава была прадоўжана да Старых Дарог, у 1907 г. — да Урэчча. Гэта значна павялічыла грузаабарот станцыі Асіповічы, якая была вузлавой, і спрыяла росту пасёлка.

У 1912 г. з мэтай паскарэння дастаўкі паштовых грузаў сталі практыкаваць іх перавозку і абмен па чыгунцы. У Асіповічах стварылі абменны пункт. Гэта паскорыла рух пошты ва ўсе канцы Расіі.

У 1913 г. у дадатак да тэлеграфа, які ўжо быў, Асіповічы атрымалі лінію тэлефоннай сувязі з Мінскам, Жлобінам, Слуцкам.

У 1913 г. у параўнанні з 1900 г. паступленне грузаў на станцыю павялічылася ў 3 разы, а вываз у 1,2 раза. Але тэхнічнае абсталяванне Асіповіцкага вузла заставалася слабым, рамонтная база прымітыўнай. Царскі ўрад надаваў Лібава-Роменскай чыгунцы вялікае стратэгічнае

Будынак кандуктарскага рэзерву на чыгуначнай станцыі Асіповічы. Пачатак XX ст.

значэнне. У сувязі з гэтым участак чыгункі ад Асіповіч да Старых Дарог быў пераведзены на шырокую каляіну, а ў 1915 г. даведзены да Слуцка.

Вестка аб перамозе Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. у Петраградзе прыйшла ў Асіповічы па тэлеграфе ў той жа дзень. У лакаматыўным дэпо і на станцыі адбыліся мітынгі. Рэвалюцыйны камітэт, які ўтварыўся ў Асіповічах, прызначыў камісарам чыгуначнай станцыі Г.І.Скварцова, а паравознага дэпо — Д.А.Дзям'янава.

У час грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі, асабліва ў час польскай акупацыі, чыгуначнаму транспарту Асіповіч былі нанесены вялікія страты.

Станоўчую ролю для хутчэйшага аднаўлення чыгуначнага транспарту адыграў прыняты ў 1922 г. Дэкрэт СНК аб гаспадарчым разліку на чыгуначным транспарце. Быў адноўлены паравозны парк, на змену старым паравозам прыйшлі новыя, чатырохвосевыя. Палепшылася рамонтная база, быў пабудаваны вагонарамонтны пункт. У 1934 г. на станцыі было ўведзена механічнае кіраванне стрэлкамі, рэканструяваны лініі сувязі. У 1937 г. здадзены ў эксплуатацыю Дом сувязі. У напрамку Слуцк—Мінск—Жлобін устаноўлена паўаўтаматычная блакіроўка.

У час Вялікай Айчыннай вайны на Асіповіцкім чыгуначным вузле дзейнічала патрыятычнае падполле, у якім удзельнічала больш за 90 чалавек.

І.М.Кургуз.

За час акупацыі гітлераўцы нанеслі вялікія страты чыгуначнаму вузлу, было поўнасцю разбурана дэпо, узарвана воданапорная вежа. Адразу пасля вызвалення Асіповіч паўстала задача хутчэйшага аднаўлення работы чыгункі — вайна працягвалася, патрэбна было перавозіць войскі, забяспечваць фронт усім неабходным. Усімі работамі па аднаўленні чыгуначнага вузла займалася аператыўная група на чале з І.М.Кургузам. Літаральна за 5 дзён зноў уступіла ў строй станцыйная гаспадарка, пачалося будаўніцтва моста цераз раку Сінюю. І.М.Кургуз быў узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

У перыяд з 1959 г. па 1965 г. на чыгуначным вузле была ўстаноўлена паўаўтаматычная блакіроўка са святлафорам, радыёсувязь з гучнагаварыцелем. Паступова пераводзіліся на цеплавую цягу лініі на Мінск і Гомель.

Чыгуначны вакзал на станцыі Асіповічы.

За працоўныя поспехі высокімі ўзнагародамі былі адзначаны дзяжурны па станцыі У.М.Бандарэнка, галоўны кандуктар В.М.Быліна.

У 1972 г. у краіне было разгорнута спаборніцтва ў гонар 55-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, а сярод працаўнікоў Асіповіч — і ў гонар 100-годдзя горада. Чыгуначнікі за 10 месяцаў перавезлі звыш задання 768 тыс. т грузаў, зэканоміўшы пры гэтым 1755 т паліва, адрамантавалі дадаткова 215 кантэйнераў і 330 вагонаў. Датэрмінова была завершана электрыфікацыя ўчастка чыгункі ад станцыі Талька да станцыі Асіповічы, і 3 лістапада, на паўтара месяца раней намечанага тэрміну, сюды прыбыў з Мінска першы электрацягнік.

У гады 9-й пяцігодкі на чыгуначнай станцыі праведзена вялікая работа па павелічэнні прапускной здольнасці, удасканаленні тэхналагічных працэсаў. Увесь грузавы рух пераведзены на цеплавую цягу. Брыгада манеўровага дыспетчара станцыі Асіповічы І.С.Церзі стала пераможцай ва ўсесаюзным спаборніцтве.

На чыгуначным вузле ў апошнія гады далейшае развіццё атрымала вытворчая база дыстанцыі пуці, дыспетчарская цэнтралізацыя, аўтаматычная блакіроўка і дальняя аўтаматычная сувязь. Укаранёны індустрыяльны метад абслугоўвання і рамонту аўтаматычных прыстасаванняў, тэлемеханікі і сувязі. Грузавы рух на ўчастку ад Асіповіч да Маладзечна з 1983 г. пераведзены на электрычную цягу. Калектыў чыгуначнай станцыі Асіповічы, які налічвае больш за 375 чалавек, на чале з В.В.Ціхановічам паспяхова забяспечвае патрэбы эканомікі ў грузавых і пасажырскіх перавозках.

А.М.Літвіненка, Ф.В.Талканіца, В.В.Ціхановіч.

Асіповіцкая дыстанцыя пуці. Гісторыя Асіповіцкага ўчастка (дыстанцыі) чыгуначнага пуці пачынаецца з 1872 г., калі было распачата будаўніцтва Лібава-Роменскай чыгункі, якая прайшла праз Асіповічы. Адміністрацыя невялікага рабочага ўчастка пуці размясцілася ў адным з будынкаў майстэрань, які знаходзіўся побач з вакзалам.

У канцы XIX — пачатку XX ст. усе будаўнічыя і рамонтныя работы выконваліся толькі ўручную.

У сярэдзіне 1896 г. для вывазу лесу, спірту і сельскагаспадарчай прадукцыі памешчыкі Дараганы падвялі да сваіх маёнткаў вузкакалейку, збудавалі на ёй 2 станцыі — Дзераўцы і Дараганава. У 1905 г. яна была працягнута да Старых Дарог, а ў 1907 г. — да Урэчча. У 1911 г. памешчыкі Радзівіл і Завіша разам з лесапрамыслоўцам Карпавым для вывазу драўніны з аддаленых лясоў пралажылі 32 км дарогі ад станцыі Верайцы праз Уборак на Градзянку і ад станцыі Уборак да в. Завішын даўжынёй 17 км з невялікім паравозным дэпо і паваротным кругам.

Будаўнічыя работы прыцягвалі вялікую колькасць мясцовага насельніцтва — і па найме і ў выглядзе працоўнай павіннасці. Для будаўніцтва і эксплуатацыі чыгункі не хапала падрыхтаваных кадраў як ніжніх чыноў, так і кіраўнікоў вышэйшай кваліфікацыі. З цягам часу іх сталі рыхтаваць у Гомелі, Мінску, Баранавічах і Брэсце.

Вялікую ролю ў забеспячэнні бесперабойнага руху цягнікоў адыгрывалі пуцявыя служачыя, абходчыкі. У пачатку XX ст. яны пражывалі ўздоўж чыгункі ў так званых будках, якія пазней сталі называць казармамі. Сярод іх вядомы А.С.Кузьміч, Іван Агейчык, А.Я.Давідовіч, Ляшчынскі, І.А.Чаропка і іншыя.

Паступова набываліся сродкі механізацыі, удасканальвалася пуцявая гаспадарка. Уздоўж дарог высаджваліся дрэвы, якія ахоўвалі пуці ад снежных заносаў, на зіму ставіліся шчыты з дошак. Будаваліся пераезды і пуцеправоды.

Пасля 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў чыгуначная гаспадарка была ў заняпадзе — разбураны масты, пуці, майстэрні, пакгаузы, будынкі. Асабліва пацярпеў перагон Вярхуціна — Урэчча. У гады аднаўлення не толькі рамантавалі старое, але і будавалі шмат новага. У 1923 г. у дыстанцыі сталі працаваць новыя майстэрні. У 1931 г. завершана будаўніцтва лініі Рослаў — Магілёў — Асіповічы. У гэты час пачалася пракладка другога пуці на Слуцк.

У змрочныя гады сталінскіх рэпрэсій ахвярамі сталі многія работнікі дыстанцыі пуці. Сярод іх выдатны спецыяліст, кіраўнік і настаўнік, дарожны майстар Верайцоўскай веткі Назар Гацко, дарожны майстар 4-га акалотка М.А.Капыціч, І.І.Бондар і іншыя.

У час Вялікай Айчыннай вайна разам з усім савецкім народам перамогу над ворагам кавалі і пуцейцы. У час блакады Ленінграда медсястрой ваеннага шпіталя працавала Ірына Георгіеўна Берзіна, старшы інжынер дыстанцыі пуці (з 1976 г. на пенсіі), узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За абарону Ленінграда», «За баявыя заслугі». Дзень перамогі сустрэў на Эльбе мінамётчык Аляксандр Андрэевіч Прановіч, дарожны майстар, Герой Сацыялістычнай Працы. Дэсантнікам быў на вайне дарожны майстар Анатоль Пятровіч Мардусевіч, прайшоў з баямі праз шмат краін, перамогу сустрэў у Чэхаславакіі. Брыгадзір пуці Уладзімір Яфімавіч Губашын вызваляў Польшчу, удзельнічаў у Берлінскай аперацыі. На розных франтах вайны змагаліся з ворагам М.В.Вішнявецкі, І.І.Малінін, В.В.Бурачэўскі, І.П.Бабкоў, В.П.Балвановіч, А.С.Амяльчэня, К.М.Логвін. У партызанах змагаліся І.К.Злобіч, А.І.Злобіч, Зінкевіч і іншыя. І гэта, канешне, далёка не поўны пералік ветэранаў-пуцейцаў.

А потым зноў гады ўпартай працы, аднаўлення, адраджэння з руін. У 1958 г. пачалося будаўніцтва першага на Беларусі калійнага камбіната. А работы па пракладцы чыгуначнай веткі ад ужо існуючай станцыі Слуцк да будучага горада пачалося раней. 2 ліпеня 1959 г. будаўніцтва дарогі было скончана, і першы поезд адправіўся са Слуцка ў Салігорск.

Шэраг працаўнікоў дыстанцыі пуці вызначыліся самаадданай працай, адзначаны высокімі ўзнагародамі. Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга былі ўзнагароджаны А.П.Мардусевіч, А.А.Прановіч, механік-наладчык дэфектаскопаў У.Н.Печань, начальнік дыстанцыі пуці М.І.Гарадзіскі, ордэнам «Знак Пашаны» дзяжурная па пераездзе В.С.Матрунчык, пуцявы абходчык І.М.Уэльскі, памочнік начальніка дыстанцыі пуці А.К.Шведаў, брыгадзір пуці М.П.Шчур і майстар пуці А.Ф.Шчэрбіч, медалём «За працоўную адзнаку» А.М.Біцюцкі, дзяжурная па пераездзе А.Р.Курбатава, медалямі «За працоўную доблесць», «За працоўную адзнаку» Н.Н.Пацейка, А.Р.Манулік, М.І.Семчанка, многія працаўнікі атрымалі значкі «Ганаровы чыгуначнік». Дарожны майстар Р.М.Толкач узнагароджаны

І.Г.Берзіна.

ордэнам Леніна. Асіповіцкую дыстанцыю пуці ў розны час узначальвалі Пятровіч, Сапёлкін, В.Ф.Пятрунін, М.Дз.Гардзеенка, П.П.Саўчанка, І.В.Машура, М.І.Гарадзіскі, М.І.Хоміч, У.М.Жураўскі, з 1990 г. калектывам кіруе С.П.Несцярэнка.

У розны час многія працаўнікі дыстанцыі пуці былі ўзнагароджаны знакам «Ганаровы чыгуначнік». Сярод іх І.Дз.Мікуліч, М.Ц.Рослік, М.І.Гарадзіскі, А.В.Бізаноўскі, Дз.П.Асмалоўскі, Б.І.Міронаў, П.К.Галуза, В.У.Губановіч, А.А.Прановіч, А.Е.Гатоўчык, М.К.Міхадзюк. Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР былі ўзнагароджаны В.У.Губановіч, В.В.Ванцаў, М.І.Ляхавец, І.Г.Вярынскі, В.К.Курс.

Лакаматыўнае дэпо Асіповічы Магілёўскага аддзялення Беларускай чыгункі. У 1870-я гады адначасова з будаўніцтвам чыгуначнай станцыі за 2 км ад Асіповіч будаваліся майстэрні па рамонце паравозаў і вагонаў. Гэта быў драўляны невялікі будынак, які практычна не меў тэхнічнага абсталявання.

У 1897 г. быў здадзены новы мураваны будынак чыгуначнай станцыі і рамонтных майстэрань. Паравозны парк папоўніўся трохвосевымі паравозамі серыі «ТВ». Па чыгунцы вадзілі ў той час саставы з 20—25 двухвосевых вагонаў вагой 12 032 пуды з хуткасцю 15—20 вёрстаў у гадзіну.

У 1913 г. у параўнанні з 1900 г. павялічыўся грузаабарот на чыгуначнай станцыі, узрасла нагрузка на рамонтныя майстэрні. Тэхнічная абсталяванасць паравознага дэпо заставалася слабай — меўся невялікі парк трохвосевых паравозаў, а рамонтная база была прымітыўная.

У час грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі была спалена кантора паравознага дэпо, выведзена са строю амаль усё

рамонтнае абсталяванне і больш за палову паравозаў.

Паступова становішча паляпшалася. У дэпо былі ўстаноўлены новыя станкі. У 1925 г. была абсталявана электрастанцыя з дызельным рухавіком, што забяспечыла чыгуначны вузел і дэпо электраэнергіяй.

У сярэдзіне 1930-х гадоў вялікі размах сярод чыгуначнікаў краіны, у тым ліку і ў Асіповіцкім дэпо, атрымаў рух паслядоўнікаў П.Крываноса за лепшае выкарыстанне паравозаў.

У ліпені 1935 г. у Маскве адбылася Усесаюзная нарада чыгуначнікаў-ударнікаў і прыём іх у Крамлі кіраўнікамі краіны. Ад чыгуначнікаў Асіповіч там прысутнічалі машыніст Л.Ф.Байкачоў і начальнік вагонарамонтнага пункта М.А.Немагай. За высокія вытворчыя паказчыкі Л.Ф.Байкачоў быў узнагароджаны ордэнам Леніна, М.А.Немагай і машыніст А.К.Курчэўскі — знакам «Ганаровы чыгуначнік». Доблеснай працай вызначыліся і іншыя чыгуначнікі — машыніст А.А.Райкевіч і слесар-брыгадзір па рамонце паравозаў У.Е.Валько былі ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, машыніст І.Г.Селіванаў — медалём «За працоўную адзнаку». Брыгада У.Е.Валько 6 гадоў запар займала 1-е месца ў сацыялістычным спаборніцтве па Беларускай чыгунцы. Вялікая заслуга ў развіцці паравознага дэпо належыць яго кіраўнікам. У розныя гады дэпо ўзначальвалі Чаропка, Парыцкі, Ярмоленка, Пятышкін, Кімстач, Кудраўцаў.

У гады Вялікай Айчыннай вайны многія работнікі дэпо прымалі ўдзел у патрыятычным падполлі, 79 чалавек змагаліся з ворагам на розных франтах вайны. За праяўленыя мужнасць і гераізм былі ўзнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга 4 чалавекі, Чырвонай Зоркі — 6 чалавек, Айчыннай вайны I і II ступеней — 4 чалавекі, Славы — 4 чалавекі.

За гады акупацыі гітлераўцы поўнасцю разбурылі будынак дэпо. Перад работнікамі дэпо паўстала задача хутчэйшага аднаўлення гаспадаркі. Да канца 1947 г. рабочы парк цягнікоў складаўся з 38 паравозаў, 2 вуглепад'ёмных кранаў на чыгуначным хаду, 14 станкоў і інш.

У 1951 г. калектыў паравознага дэпо на працягу 9 месяцаў быў 1-м па паказчыках на Беларускай чыгунцы. Асабліва вызначаўся калектыў цягніка серыі «52» № 7479 пад кіраўніцтвам старшага машыніста Б.М.Каліванава. Адна з першых жанчын-машыністаў К.А.Задоля была ўзнагароджана знакам «Ганаровы чыгуначнік», а ў 1948 г. выбрана дэпутатам абласнога Савета.

Шэраг узнагарод атрымалі работнікі лакаматыўнага дэпо. Другім ордэнам Леніна і знакам «Ганаровы чыгуначнік» быў адзначаны машыніст Л.Ф.Байкачоў, ордэнам Леніна — А.К.Курчэўскі, А.А.Высоцкі, М.В.Санковіч, брыгадзір У.Е.Валько, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга майстар І.П.Мацвееў, медалём «За працоўную адзнаку» машыніст А.Дз.Кучын, І.Г.Селіванаў, П.К.Гайсенка, К.І.Гаткевіч, знакам «Ганаровы чыгуначнік» — начальнік дэпо Г.К.Фішаровіч, машыністы Я.Л.Гасціла, П.А.Крыцук, І.В.Дудчанка, майстар прамывачнага рамонту І.П.Мацвееў.

За гады 2 пасляваенных пяцігодак паравознымі брыгадамі было перавезена цяжкавагавым цягніком 6141 т грузаў звыш нормы. За гады 6-й пяцігодкі было зэканомлена 15 тыс. т паліва, праведзена больш як 25 тыс. цяжкавагавых паяздоў, у якіх перавезена 7 млн. т грузаў звыш нормы. У 1959 г. сярэдняя вага поезда дасягнула 1837 т.

Паспяхова справіліся чыгуначнікі з заданнямі 7-й пяцігодкі. За 1961—1965 гг. у лакаматыўным дэпо было атрымана 540,9 тыс. руб. звышпланавага прыбытку. Прадукцыйнасць працы за гады пяцігодкі вырасла на 24%. Многія брыгады дасягнулі значнага павелічэння сярэднясутачнага прабегу паравоза. Па выніках працы ў 7-й пяцігодцы многія работнікі дэпо былі адзначаны высокімі ўзнагародамі: ордэнам Леніна — начальнік дэпо Б.К.Васараўдзе, ордэнам «Знак Пашаны» — машыніст Г.С.Маёраў, І.Ф.Раманоўскі, І.В.Макаранка, ён жа быў узнагароджаны знакам «Ганаровы чыгуначнік». Машыністы Э.М.Рудкоўскі і Б.М.Каліванаў былі абраны дэпутатамі Вярхоўнага Савета БССР.

У гады 8-й пяцігодкі ішло далейшае ўкараненне новых відаў цягі, асвойваліся новыя мадыфікацыі цеплавозаў. З 1980 г. сталі выкарыстоўвацца цеплавозы серыі М-62, якія эксплуатуюцца і цяпер. Пераважную колькасць перавозак ажыццявілі на ўчастку Асіповічы—Градзянка—Асіповічы машыністы Х.А.Фрыд,

С.М.Леўчакоў, С.М.Зуй, А.І.Яршоў, І.Р.Ашэйчык, І.П.Дзяргач і інш.

Усё больш актыўна выкарыстоўвалася электрычная цяга. З 1983 г. на яе пераведзены ўвесь грузавы рух на ўчастку ад Асіповіч да Маладзечна.

З 1988 г. лакаматыўнае дэпо ўзначальвае В.У.Лайшаў.

За апошнія дзесяцігоддзі былі пабудаваны новыя адміністрацыйныя, складскія, жылыя і іншыя аб'екты, у дэпо арганізаваны пункт тэхнічнага абслугоўвання лакаматываў, пачалася і працягваецца рэканструкцыя кацельнай дэпо. Укаранёны шэраг рацыяналізатарскіх прапаноў.

За апошняе дзесяцігоддзе знакам «Ганаровы чыгуначнік» узнагароджаны А.К.Шпак, В.В.Вараб'ёў, М.І.Лагун.

В.У.Лайшаў.

Сумеснае прадпрыемства адкрытае акцыянернае таварыства «Дах». Асіповіцкі кардонна-руберойдавы завод, а з 12.3.1999 г. — сумеснае беларуска-брытанскае прадпрыемства ААТ «Дах» займае адно з вядучых месцаў у народнагаспадарчым комплексе раёна. Будаўніцтва завода пачалося ў лістападзе 1967 г. і скончылася 28.4.1973 г. У 1974 г. завод атрымаў усесаюзнае прызнанне і стаў пераможцам спаборніцтва з уручэннем Чырвонага сцяга ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ. Праектная магутнасць завода — 125 млн. м² мяккага крыцця. Прадукцыя пастаўляецца ў краіны СНД, Балтыі, Балгарыю, Польшчу, прадпрыемствам і арганізацыям Беларусі, яна канкурэнтназдольная на знешнім рынку. На прадпрыемстве наладжана вытворчасць дахавых і гідраізаляцыйных матэрыялаў «Паліглас» (Італія). Для рабочых завода працуюць сталовая, буфет, пункт выдачы малака, здраўпункт. Пабудаваны Дом культуры з кіназалай на 400 месцаў, інтэрнат на 216 месцаў, прадуктовы магазін, дзіцячы камбінат з басейнам на 420 месцаў, 6 жылых дамоў, 4 — кааператыўныя, Дом абрадаў. З 1988 г. дзеці работнікаў прадпрыемства адпачываюць у аздараўленчым лагеры «Пціч». Пры Доме культуры завода дзейнічаюць ансамбль народнай песні і музыкі «Дзівакі», вакальна-інструментальны ансамбль, дзіцячыя аркестр народных інструментаў і клуб выхаднога дня. Перспектывай далейшай

І.Р.Ашэйчык.

работы СП ААТ «Дах» з'яўляецца павелічэнне аб'ёмаў выпуску сучасных дахавых матэрыялаў, расшырэнне абутковых кардонаў, выпуск новых відаў кардону.

Асіповіцкае ўпраўленне магістральных газаправодаў (УМГ) прадпрыемства «Белтрансгаз». Уведзена ў эксплуатацыю ў 1976 г. Гэта адзінае ў Беларусі прадпрыемства падобнага тыпу. Яно забяспечвае падачу газу ў 18 гарадоў і многія буйныя населеныя пункты Магілёўскай, Мінскай і Гомельскай абласцей, мае аўтамабільныя газанапаўняльныя станцыі ў Бабруйску і Асіповічах, абслугоўвае 400 км магістральнага газаправоду Мінск — Гомель. У склад Асіповіцкага УМГ уваходзяць: падземнае сховішча газу, якое ўключае кампрэсарную станцыю, геалагічную службу; аператыўна-прамысловы цэх, які забяспечвае здабычу і закачку газу; комплекс дапаможных службаў, у тым ліку энерга- і водазабеспячэння, спецыяльнай сувязі, аўтатранспартны цэх. Прадпрыемства мае падсобную гаспадарку: свінаферму на 180 галоў, цяпліцу плошчай 0,5 га. Асіповіцкім УМГ вядуцца работы па развіцці сеткі газазабеспячэння гарадоў і пасёлкаў рэспублікі ў адпаведнасці з праграмай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. Умацоўваецца ўласная вытворчая база — пачата будаўніцтва новай кампрэсарнай станцыі і аўтатранспартнага цэха. УМГ мае дзіцячы сад на 75 месцаў, лазню на 50 месцаў, фізкультурна-аздараўленчы комплекс, жыллёвы фонд у 200 кватэр, гандлёвы цэнтр. Спартыўныя каманды ўпраўлення актыўна ўдзельнічаюць у раённых спартакіядах, абласных і рэспубліканскіх спаборніцтвах па розных відах спорту. Аказваецца дапамога калгасам «Бальшавік» і «Чырвоны ўдарнік»,

школам, медыцынскім і іншым установам Лапіцкага сельскага Савета.

Унітарнае камунальнае сельскагаспадарчае прадпрыемства «Пратасевічы». У 1932 г. у в. Пратасевічы створаны калгас «Перадавік». Першы старшыня — В.І.Горацкі, першыя калгаснікі — П.Т.Чыкілеўская, П.Т.Казлоўская, С.Ю.Русаковіч, Л.А.Доўгаль, Я.В.Еўдакімовіч, І.В.Доўгаль. У 1950 г. «Перадавік» аб'яднаўся з калгасам «Чырвоная слабада». У сакавіку 1960 г. у выніку рэарганізацыі калгасаў створаны адзін саўгас «Асіповіцкі». У сакавіку 1967 г. ён рэарганізаваны ў саўгас «Пратасевічы». З сакавіка 1988 г. саўгас «Пратасевічы» становіцца аграгандлёвым прадпрыемствам «Пратасевічы» на базе аднайменнага саўгаса, Асіповіцкага кансервавага завода, Каўгарскага спіртзавода, магазінаў Асіповіцкага ГРАПП (агароднінных). У 1989 г. стаў самастойным Каўгарскі спіртзавод, у 1990 г. — кансервавы завод. З 1.6.2001 г. называецца унітарнае камунальнае сельскагаспадарчае прадпрыемства «Пратасевічы».

З гісторыі калгасаў раёна

Калгас «Авангард». У перыяд калектывізацыі сяляне Зборскага сельсавета пачалі ствараць гаспадаркі: у в. Вяззе — калгас «Авангард» (1-ы старшыня А.Ф.Ляшчук), у в. Цяплухі — «Селькор», у в. Орча (Ворча) — «Дуброва», у в. Смык — «Шлях волі», у в. Зборск — «Сноп», у в. Вярэйцы — «Звязда». Гэтыя дробныя гаспадаркі існавалі да студзеня 1951 г., пасля чаго сталі 2 калгасы — «Авангард» (старшыня В.Т.Клімовіч) і «Звязда» (старшыня І.І.Патапейка). У 1958 г. адбылося ўзбуйненне: 2 калгасы зліліся ў адзін — «Авангард». На працягу 30 гадоў яго ўзначальваў В.Т.Клімовіч. Асаблівага развіцця гаспадарка дасягнула ў 1970—1980-я гады, калі ёй кіраваў М.Дз.Варабей, удастоены звання Героя Сацыялістычнай Працы, ордэнаў Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга. За добрасумленную працу 30 калгаснікаў атрымалі ўрадавыя ўзнагароды. У 1997 г. у калгас «Авангард» уліўся калгас «Перамога».

Калгас «Асіповіцкі». На тэрыторыі сучаснага калгаса «Асіповіцкі» ў 1929—1930 гг. былі арганізаваны калектыўныя гаспадаркі: імя Чапаева, «Рассвет», «Новая зара». У 1931 г. створаны калгас «17 год Кастрычніка», старшынёй якога да пачатку Вялікай Айчыннай вайны працаваў А.Л.Снігір. Старшынёй калгаса «Рассвет» да вайны быў П.Я.Чаропка. У 1950 г. у калгас «Рассвет» увайшлі калгасы імя Чапаева і «Новая зара». У 1952 г. «Рассвет» уліўся ў калгас «17 год Кастрычніка». 8.3.1960 г. гаспадарка была рэарганізавана ў саўгас «Асіповіцкі». У яго склад увайшлі землі і асноўныя сродкі калгасаў «Перадавік» Верайцоўскага сельсавета, «Рассвет» Замошскага сельсавета, «Шлях Леніна» Карытненскага сельсавета. Пры арганізацыі саўгаса былі прыняты ў яго склад таксама калгас імя Андрэева і імя Дзяржынскага Карытненскага сельсавета, «Першае мая» Дзераўцоўскага сельсавета. У 1961 г. на падставе загаду па Магілёўскаму абласному трэсту саўгасаў праведзена раздрабненне саўгаса — з яго вылучыўся саўгас «Карытнае». У сакавіку 1967 г. са складу саўгаса вылучыліся Пратасевіцкае аддзяленне і брыгада в. Паплавы, на базе якіх створаны саўгас «Пратасевічы». Першым дырэктарам саўгаса з 1960 г. да 1965 г. працаваў І.Л.Доўгаль. У 1990 г. адбылася рэарганізацыя саўгаса, у выніку якой узніклі 2 калгасы — «Першае мая» і «Асіповіцкі». Механізатару шырокага профілю І.У.Кірыновічу ў 1966 г. прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Трактарыст М.В.Суравец у 1971 г. узнагароджаны ордэнам Леніна. У 2001 г. калгас расфарміраваны.

Калгас «Бальшавік». У час калектывізацыі на тэрыторыі сучаснага калгаса «Бальшавік» былі створаны калгасы «Працаўнік», «Новы свет» (абодва ў 1929), «Усход», «Камунар» (абодва ў 1930), імя Варашылава, «Чырвоны баец» (абодва ў 1931). Аб'яднанне дробных калгасаў пачалося з 1935 г., аднак яно было перарвана вайной. У 1950 г. на базе калгасаў «Новы свет», імя Сталіна, «Бальшавік», імя Молатава, імя Дзяржынскага, імя Варашылава створаны ўзбуйнены калгас імя Молатава, які ў 1957 г. перайменаваны ў імя М.І.Калініна, а ў 1963 г. — у калгас «Бальшавік». Старшынёй аб'яднанага калгаса стаў Ф.І.Грыцэнка. У 1955 — 1971 гг.

гаспадаркай кіраваў А.І.Лазараў, узнагароджаны ордэнам Леніна. Высокімі дзяржаўнымі ўзнагародамі адзначаны калгаснікі: ордэнамі Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга — М.П.Канонік; ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга — І.М.Палазнік, В.А.Корбут і У.І.Сімага; ордэнам Працоўнай славы — І.М.Сугака; ордэнам Дружбы народаў — І.Ф.Сафонаў.

Калгас «Беларусь». Заснаваны ў 1950 г. У яго склад увайшлі калгасы «Рассвет», імя Кірава, імя XVIII з'езда КПСС, імя Леніна, імя Молатава, створаныя ў 1933 — 1934 гг. У 1961 г. да калгаса «Беларусь» былі далучаны калгасы «Шлях да сацыялізму», імя Энгельса і «Светлы шлях». Старшынямі аб'яднанага калгаса «Беларусь» у розны час былі П.Ф.Багамолаў (1950—1954), М.К.Кандрацьеў (1954—1956), В.В.Татур (1956—1963), Р.І.Сакун (1963—1983), В.В.Новак (1983—1988), А.Ю.Германчук (1988—1995).

Калгас імя Леніна. Сваю гісторыю пачынае з камуны «Новае жыццё», створанай у 1930 г. У 1933 г. яна аб'ядналася з калгасам «Энергія». Першым старшынёй быў Аляксей Сідаровіч. Калгас насіў імя Сталіна, імя Варашылава, імя Леніна. Па выніках працы 1937—1939 гг. калгас імя Варашылава быў удзельнікам ВДНГ СССР, сярод іншых у выстаўцы ўдзельнічала Ф.М.Бобрык. У 1952 г. калгас узбуйнены, да яго далучаны суседнія вёскі Грынёўка, Вайнілава, Ясяноўка, Ражнетава, Аляксандраўка, Залессе. Са жніўня 1998 г. старшынёй калгаса працуе П.М.Сашчэка. За гады існавання калгаса было шмат перадавікоў, сярод іх В.П.Краўчанка, Д.Д.Ганчароў, М.І.Шпіль, І.І.Хроп, Ф.Ф.Тарбееў і інш. Свінарка Б.А.Калеснікава ўзнагароджана ордэнам «Знак Пашаны», медалём «За працоўную доблесць», жывёлавод У.М.Клімовіч адзначаны Ганаровай граматай ВДНГ і каштоўным падарункам — аўтамабілем «Масквіч», галоўны інжынер калгаса А.Ф.Стэльмах узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Калгас імя Ульянава. Створаны ў 1932 г. Першым старшынёй быў А.Т.Кірдун, першымі калгаснікамі — Купрыянчык, Шаманскі, Ерка, Цыганок, Сафронаў і інш. У 1951 г. да гэтай гаспадаркі далучаны калгасы «Камінтэрн», «За Радзіму», «Шлях Леніна», «Новая Каменка», «7 з'езд Саветаў». Калгас на працягу 1979—1990 гг. неаднойчы прызнаваўся пераможцам спаборніцтва за высокаэфектыўнае выкарыстанне тэхнікі, атрыманне высокіх ураджаяў кукурузы, бульбы і грэчкі, атрымліваў званне «Гаспадарка высокай культуры земляробства». Загадчык свінатаварнай фермы калгаса С.Ф.Картун узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны»; трактарыст-машыніст М.С.Паходаў — ордэнамі Леніна (1965) і Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1973), мае званне «Заслужаны механізатар сельскай гаспадаркі Беларусі» (1980); трактарыст-машыніст М.Б.Ерка — ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1972); механізатар М.Я.Паланейчык — ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1976); брыгадзір паляводчай брыгады А.Р.Дзяцел — ордэнам Працоўнай славы III ступені (1977).

Калгас імя Чарняхоўскага. Створаны ў 1950 г. шляхам аб'яднання разрозненых гаспадарак вёсак Вялікі Бор, Жыцін, Дворышча, Пясчанка, Заняцечча. Спачатку калгас імя Чарняхоўскага адносіўся да Старадарожскага р-на, з 1962 г. — да Слуцкага, з 1965 г. — да Асіповіцкага. У 1962—1965 гг. калгас меў ужо сваю тэхніку — камбайны, трактары. Першым старшынёй быў У.В.Пінчук, механізатарам — Ф.Калянькоў, камбайнерамі — І.Кузей і І.Капейка. У 1974—1992 гг. гаспадарку ўзначальваў А.М.Дзенісевіч. За гэты час былі пабудаваны кароўнікі ў вёсках Вялікі Бор, Заняцечча і Дворышча, гаражы, склады, зернесушылка, бібліятэка, шмат жылля для калгаснікаў.

Калгас «Камунар». Створаны ў 1931 г. Першы старшыня — Р.А.Блізнец, першыя калгаснікі — Д.І.Кірыновіч, С.С.Кароль, В.І.Кошаль, К.С.Кароль, Ф.П.Крэмез, У.М.Пацкевіч. На тэрыторыі Пагарэльскага сельсавета былі яшчэ калгасы: імя Леніна, імя Варашылава, «Чырвоныя Палядкі», «Пралетарый», «Чырвоны партызан» і «Рэкорд». У 1950 г. калгасы імя Варашылава, імя Леніна, «Чырвоныя Палядкі» і «Чырвоны партызан» аб'ядналіся ў калгас імя Леніна, «Камунар» і «Рэкорд» — у калгас «Камунар». У 1952 г. адбылося аб'яднанне дзвюх гэтых гаспадарак. Аб'яднаны калгас у розны час узначальвалі М.А.Гурскі (першы старшыня), І.Б.Герчык, І.Ф.Дуброўскі, Л.А.Ерашэвіч, С.Ф.Семяненка. У 1975 г. брыгада

№ 2 паляводаў в. Амінавічы за высокія паказчыкі ў сельскагаспадарчай вытворчасці была ўдзельнікам ВДНГ СССР.

Калгас «Карытнае». Для сучаснага калгаса «Карытнае» суцэльнай калектывізацыяй сталі 1929—1932 гг. Адным з першых быў створаны калгас «КІМ», заснавальнікамі якога сталі камсамольцы-актывісты вёсак Карытнае і Мяжное. Існавалі таксама калгасы «Беларуская вясна», імя Варашылава, «Шлях Леніна». У 1960 г. створаны саўгас «Карытнае», які меў 3 аддзяленні — Карытненскае, Дземенскае і Коханаўскае. Першым старшынёй саўгаса (1960—1972) працаваў М.А.Мічукоў. У 1992 г. саўгас пераўтвораны ў калгас «Карытнае».

Калгас «Каўгарскі». Першы калгас быў створаны ў 1933 г. пад назвай «Чырвоны працаўнік». Старшыня — Датотчанка. У 1933—1950 гг. на тэрыторыі сучаснага калгаса было 7 гаспадарак («Новае Свіханава», «8 сакавіка», «Чырвоная Крынка», «Новыя Птушычы», «Чырвоны Сялец», «Чырвоны Край», «Чырвоны працаўнік»), у 1953 г. — 3 (імя Свярдлова, імя Кагановіча, «8 сакавіка»). У 1955 г. дзве першыя гаспадаркі аб'ядналіся ў калгас «19 партз'езд», а ў 1961 г. у яго склад увайшоў і калгас «8 сакавіка». Паводле рашэння райвыканкома ў 1965 г. калгас рэарганізаваны ў саўгас «Каўгарскі», у 1992 г. — у калгас «Каўгарскі».

Калгас «Новы шлях». Створаны ў 1929 г. Тады ж на тэрыторыі сучаснай гаспадаркі пачыналася арганізацыя і іншых дробных калгасаў. У 1944—1952 гг. было 6 гаспадарак: «Дзяржынск», «Камінтэрн», імя Сталіна, «Чырвоны сцяг», «Трактар», імя Кагановіча. У 1952 г. усе гэтыя калгасы аб'ядналіся ў адзін — імя Кагановіча. Яго ўзначаліў Б.А.Рубенштэйн. У 1957 г. калгас імя Кагановіча перайменаваны ў калгас «Новы шлях».

Калгас «Першае мая». У 1951 г. у выніку ўзбуйнення калгасаў «Першае мая», «Другая пяцігодка», «Чырвоны ўсход», «Селянін», «Чырвоная ніва», «Новы шлях», «Пераможца» і «Чырвоны араты» калгас стаў называцца «Першае мая». Старшынёй калгаса быў выбраны Ф.К.Касьянаў. Ён узначальваў гаспадарку да сакавіка 1960 г., калі адбылася рэарганізацыя яе ў саўгас «Асіповіцкі». Кіраўніком саўгаса стаў І.Л.Доўгаль. У лістападзе 1989 г. у выніку рэарганізацыі саўгаса «Асіповіцкі» ён падзелены на 2 калгасы — «Асіповіцкі» і «Першае мая».

Калгас «Усход». Створаны 30.10.1929 г. Арганізатар і першы старшыня — М.В.Назаровіч. Першымі сярод актывістаў запісаліся ў сельгасарцель П.Р.Яноўскі, М.С.Руды, Д.І.Лапко, А.І.Дайнека. На ўвесь калгас спачатку было 12 кароў, 4 кані, некалькі плугоў і барон. У 1937 г. быў неабгрунтавана рэпрэсіраваны старшыня калгаса М.В.Назаровіч. Змяніў яго П.І.Руды. Перад Вялікай Айчыннай вайной тут атрымлівалі па 14—16 ц збожжа з гектара, па 200 ц бульбы. У 1940 г. калгас быў занесены ў Ганаровую кнігу Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў Маскве. У 1945 г. у калгас паступіла старэнькая «палутарка», шафёрам на якой працаваў Ф.Р.Янкоўскі. Пасля вайны калгас узначальвалі М.І.Забаўскі, П.І.Заяц, І.І.Хічэўскі. У пачатку 1950-х гадоў навакольныя калгасы далучыліся да «Усходу». Неўзабаве гаспадарка стала адной з лепшых у раёне. Старшынямі ў той час працавалі У.П.Сычоў, П.К.Кароль, І.Л.Доўгаль. Пры апошнім (1967—1970) даход калгаса павялічыўся ў 2 разы. У 1975—1999 гг. калгас узначальваў В.В.Пінчук.

Калгас «Чырвоны сцяг». 30.6.1950 г. з 6 дробных гаспадарак («Чырвоны сцяг», «Другая пяцігодка», імя Будзённага, імя Варашылава, «Камунар», «Чырвоны барацьбіт») створаны калгас «Чырвоны сцяг» з цэнтрам у в. Вязаўніца. Першым старшынёй аб'яднанага калгаса стаў К.Я.Клімко. Гаспадарка мела 600 га ворнай зямлі і 300 га сенажаці, больш за 100 коней, 400 кароў, 200 свіней. Калгас быў эканамічна слабы. Працаўнікі яго атрымлівалі на працадзень па 500—600 грамаў зерня. Жалі сярпамі, касілі косамі. Атрымлівалі па 6—7 ц збожжа з гектара. Пасля сакавіцкага (1958) Пленума ЦК КПСС калгас стаў павялічваць тэмпы вытворчасці. Яго ўзначальвалі вопытныя кіраўнікі М.У.Кунько, Дз.А.Сікілінда. Значных вынікаў калгас дасягнуў пры старшыні У.І.Роўбелю, які ўзначаліў гаспадарку ў маі 1975 г. За поспехі ў вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі калгас неаднаразова ўзнагароджваўся пераходным Чырвоным сцягам ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ЦК ВЛКСМ і ВЦСПС.

Калгас «Чырвоны ўдарнік». Створаны 6.5.1931 г. у в. Жорнаўка. Першы старшыня — М.П.Стэльмах. У 1932 г. да яго далучаны калгас «Чырвоны партызан» па ініцыятыве старшыні А.М.Стэльмаха, які і кіраваў у 1932—1950 гг. аб'яднаным калгасам «Чырвоны ўдарнік». У 1950 г. пры ўзбуйненні калгасаў да «Чырвонага ўдарніка» далучаны «Зара камуны», «18 партз'езд», «Першае мая», «III Інтэрнацыянал», імя Калініна, «За ўраджай», у 1955 г. — імя Кірава. У 1961 г. калгас прыняў І.І.Хічэўскі, пры якім гаспадарка стала адной з лепшых у раёне. І.І.Хічэўскі двойчы ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Знакамітыя людзі калгаса: А.С.Грышановіч — працавала чабаном, удзельніца ВДНГ СССР у 1940 г.; М.С.Заяц — звеннявая па вырошчванні бульбы, удзельніца ВДНГ СССР у 1940 г.; А.Т.Задоля — свінарка, удзельніца ВДНГ СССР у 1940 г., узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга; Г.А.Ласкавец — трактарыст, кавалер ордэнаў Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга; В.Л.Загароўскі — трактарыст-машыніст, камбайнер, узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і «Знак Пашаны»; Л.І.Жук — палявод, трактарыст, узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў; М.П.Раманоўская — палявод, цялятніца, даярка, узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, удзельніца ВДНГ СССР у 1976 г.; П.М.Бярнат — палявод, даярка, узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны»; М.У.Збанок — трактарыст, узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

Калгас «Шлях Ільіча». Створаны ў 1929 г. у в. Крамок. Складаўся спачатку з 7 аднаасобных гаспадарак. Першы старшыня — Ф.В.Чорны. Праз месяц далучылася яшчэ 11 аднаасобных гаспадарак. У навакольных вёсках таксама ўзніклі калгасы. У 1930 г. у калгасе «Шлях Ільіча» з'явіўся першы трактар «Фардзон». Першы трактарыст — С.Кашыцкі. Была адкрыта хата-чытальня. Многія непісьменныя калгаснікі сталі наведваць лікбез. У 1937 г. калгасы «Шлях Ільіча» і «Новы Крамок» аб'ядналіся (старшыня — Ф.В.Чорны). У 1939 г. медалём «За працоўную доблесць» узнагароджаны калгаснікі І.Ф.Кутынка і М.Н.Парахня. У тым жа годзе праходзіў Усесаюзны злёт ударнікаў, на якім ад калгаса прысутнічалі звеннявая па вырошчванні кок-сагызу Я.Ц.Кутынка і калгаснік П.Чэпік. Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны да калгаса далучылася в. Дрычын. У 1971 г. сюды ж увайшлі вёскі Канцы і Майсеевічы (калгас імя Чапаева).

Калектыўна-долевая гаспадарка «Ліпень». На тэрыторыі гаспадаркі размешчана 6 вёсак, якія да 1950 г. з'яўляліся шасцю калгасамі. У чэрвені 1950 г. калгасы «III Інтэрнацыянал», «Чырвоны ўсход», імя Валадарскага, імя Леніна, «Чырвоная ніва», «7 партз'езд» аб'ядналіся ў адзін калгас імя Валадарскага. Агульная зямельная плошча склала 3932 га, у тым ліку ворнай зямлі — 1668, сенажаці — 820, пашы — 188 га. Пагалоўе жывёлы складала: кароў — 395, свіней — 477, коней — 152. Мелася 85 пчоласем'яў. Першым старшынёй калгаса імя Валадарскага быў І.Н.Баразна (1950—1972). Потым гаспадарку ўзначальвалі Б.Я.Жураўлёў, М.Р.Ціхун, М.У.Дражын, М.У.Асмалоўскі, В.А.Міхадзюк. У кастрычніку 1992 г. калгас імя Валадарскага перайменаваны ў калектыўна-долевую гаспадарку «Ліпень» паводле рашэння агульнага сходу членаў калгаса і Асіповіцкага райвыканкома.

Вызначыліся працай

ГЕРОІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАЦЫ

ВАРАБЕЙ Міхаіл Дзмітрыевіч. Нарадзіўся 24.4.1930 г. у в. Канцы Асіповіцкага р-на. Герой Сацыялістычнай Працы (1988).

З 1948 г. працаваў калгаснікам, брыгадзірам, аграномам у калгасах «Пераможац» і імя Чапаева. Завочна вучыўся ў Мар'інагорскім сельскагаспадарчым тэхнікуме. У 1963 г. выбраны старшынёй Дрычынскага сельсавета, у 1965 г. — старшынёй калгаса «Шлях Ільіча». У 1971 г. закончыў Мінскую ВПШ. З сакавіка 1979 г. да апошніх дзён жыцця ўзначальваў калгас «Авангард». Талент умелага кіраўніка і клапатлівага гаспадара зямлі дазволіў вывесці калгас у лік перадавых гаспадарак. Калгас пастаянна нарошчваў

М.Дз.Варабей.

А.М.Гарбацэвіч.

І.У.Кірыновіч.

І.І.Паўловіч.

А.А.Прановіч.

вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі, за што неаднаразова прызнаваўся пераможцам Усесаюзнага і рэспубліканскага сацспаборніцтваў. М.Дз.Варабей выбіраўся дэпутатам сельскага, раённага і абласнога Саветаў, членам Саюзнага савета калгаснікаў. Узнагароджаны ордэнамі Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі, граматамі. У 1986 г. яму прысвоена званне «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь». Памёр 6.1.1994 г.

ГАРБАЦЭВІЧ Антон Маркавіч. Нарадзіўся 13.2.1912 г. у в. Залессе Асіповіцкага р-на. Герой Сацыялістычнай Працы (1966). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1926—1929 гг. рабочы гуты «Кастрычнік» Асіповіцкага р-на. З 1930 г. працаваў на торфапрадпрыемстве «Татарка» (да 1953 торфапрадпрыемства «Свабода») Асіповіцкага р-на прасаўшчыком, машыністам лакамабіля, з сярэдзіны 1950-х гадоў — слесарам па рамонце тэхналагічнага абсталявання. Званне Героя прысвоена за поспехі ў выкананні планавых заданняў развіцця тарфяной прамысловасці. Узнагароджаны ордэнам Леніна. Памёр у 1981 г.

КІРЫНОВІЧ Іван Уладзіміравіч. Нарадзіўся 12.1.1937 г. у в. Ягаднае Асіповіцкага р-на. Герой Сацыялістычнай Працы (1966).

У 1952—1954 гг. вучыўся ў рамесным вучылішчы металістаў, потым працаваў на заводзе імя Леніна ў Ленінградзе. Пасля заканчэння ў 1955 г. Выбаргскага вучылішча механізацыі сельскай гаспадаркі ўдзельнічаў у асваенні цалінных і абложных зямель у Казахстане. З 1956 г. трактарыст Асіповіцкай МТС, калгаса «Першае мая», саўгаса «Асіповіцкі», з 1970 г. майстар-наладчык саўгаса «Асіповіцкі». Званне Героя прысвоена за поспехі ў павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак збожжавых і кармавых культур. Узнагароджаны ордэнам Леніна, Граматай Вярхоўнага Савета БССР. З 1986 г. на пенсіі.

ПАЎЛОВІЧ Іван Іванавіч. Нарадзіўся 24.7.1930 г. на ст. Талька Пухавіцкага р-на. Герой Сацыялістычнай Працы (1974).

З 14 гадоў працаваў на Беларускай чыгунцы: пуцявы абходчык, рабочы-пуцявік у Рудзенску, пазней брыгадзір акалодка на ст. Талька. З 1976 г. дыспетчар дыстанцыі пуці, з 1979 г. рэгуліроўшчык хуткасці руху вагонаў на чыгуначнай ст. Асіповічы, потым — слесар вагоннага дэпо. Узнагароджаны ордэнамі Леніна (1974), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1971), медалямі.

ПРАНОВІЧ Аляксандр Андрэевіч. Нарадзіўся 3.3.1926 г. у в. Бабы Пухавіцкага р-на. Герой Сацыялістычнай Працы (1981). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

Пасля дэмабілізацыі з 1948 г. працаваў на чыгунцы манцёрам, потым брыгадзірам пуці. З 1955 г. дарожны майстар Асіповіцкай дыстанцыі пуці Беларускай чыгункі.

І.П.Аўцюшэнка.

Л.Ф.Байкачоў.

У.Е.Валько.

Б.К.Васараўдзе.

А.А.Высоцкі.

Я.Л.Гасціла.

Р.А.Дубскі.

В.К.Каспяровіч.

Званне Героя прысвоена за поспехі ў выкананні заданняў 10-й пяцігодкі. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі, дзвюма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, знакам «Ганаровы чыгуначнік». Памёр 12.1.1999 г.

АРДЭНАНОСЦЫ

Узнагароджаны ордэнам Леніна

АЎЦЮШЭНКА Іван Парфёнавіч, машыніст лакаматыўнага дэпо.

БАЙКАЧОЎ Лявонцій Фоціевіч, машыніст.

ВАЛЬКО Уладзімір Еўдакімавіч, майстар цэха паравознага дэпо, а таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

ВАРАБЕЙ Міхаіл Дзмітрыевіч, старшыня калгаса «Авангард», а таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

ВАСАРАЎДЗЕ Браніслаў Ксавер'евіч, начальнік лакаматыўнага дэпо, а таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

ВЫСОЦКІ Антон Антонавіч, машыніст паравоза лакаматыўнага дэпо.

ГАРБАЦЭВІЧ Антон Маркавіч, слесар торфапрадпрыемства «Татарка».

ГАСЦІЛА Яўген Лявонавіч, машыніст-інструктар лакаматыўнага дэпо, а таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

ГЕРАСІМЧЫК Яфрэм Ільіч, трактарыст калгаса «Авангард».

ГОМАН Іван Фёдаравіч, начальнік Градзянскага лесапункта.

ДУБСКІ Рыгор Антонавіч, дзяжурны па лакаматыўнаму дэпо.

ІЗОТАЎ Віктар Мікалаевіч, выдзімальшчык шклозавода «Кастрычнік».

КАЖАНЕЦ Мікалай Аляксандравіч, брыгадзір будаўнікоў БУ-89, а таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

КАЗЛОЎ Аляксандр Фаміч, лесаруб Градзянскага лесапункта.

КАНОНІК Міхаіл Пятровіч, трактарыст калгаса «Бальшавік», а таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

КАРАЛЁЎ Мікалай Піліпавіч, старшыня Асіповіцкага райвыканкома, а таксама двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга.

КАСПЯРОВІЧ Віктар Казіміравіч, машыніст лакаматыўнага дэпо.

П.А.Крыцук.

А.К.Курчэўскі.

В.Р.Лягуцкая.

М.І.Міхейчык.

С.М.Патапейка.

В.С.Прохарчык.

П.А.Рудкоўскі.

М.С.Тамкоў.

КІРЫНОВІЧ Іван Уладзіміравіч, трактарыст саўгаса «Асіповіцкі».

КЛІМОВІЧ Васіль Трафімавіч, старшыня калгаса «Авангард», а таксама ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі і Працоўнага Чырвонага Сцяга.

КРЫЦУК Пётр Антонавіч, машыніст.

КУРЧЭЎСКІ Аляксандр Карпавіч, машыніст паравоза лакаматыўнага дэпо.

ЛАЗАРАЎ Андрэй Іванавіч, старшыня калгаса «Бальшавік».

ЛАСКАВЕЦ Георгій Антонавіч, трактарыст калгаса «Чырвоны ўдарнік», а таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

ЛАТУШКІН Барыс Іванавіч, за высокія паказчыкі ў рабоце па асваенні цалінных зямель.

ЛЯВІЦКІ Пётр Адамавіч, партыйны і дзяржаўны дзеяч БССР.

ЛЯГУЦКАЯ Вера Раманаўна, свінарка калгаса «Чырвоны сцяг».

МІХЕЙЧЫК Мікалай Іванавіч, электрык-машыніст турбін Асіповіцкай ГЭС.

ПАЛЯКОЎ Мікалай Пятровіч, электразваршчык вагоннага дэпо, а таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

ПАТАПЕЙКА Сцяпан Міхайлавіч, машыніст паравоза лакаматыўнага дэпо.

ПАЎЛОВІЧ Іван Іванавіч, брыгадзір дыстанцыі пуці, а таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

ПАХОДАЎ Міхаіл Сяргеевіч, трактарыст калгаса імя Ульянава.

ПРАНОВІЧ Аляксандр Андрэевіч, майстар дыстанцыі пуці, а таксама ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі і Працоўнага Чырвонага Сцяга.

ПРОХАРЧЫК Віктар Сямёнавіч, дырэктар камбіната «Маяк».

РОЎБЕЛЬ Уладзімір Іванавіч, старшыня калгаса «Чырвоны сцяг», а таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

РУДЗЬКО Іван Усцінавіч, шафёр калгаса «Камунар».

РУДКОЎСКІ Пётр Антонавіч, машыніст-інструктар лакаматыўнага дэпо.

САНКОВІЧ Мікалай Васільевіч, машыніст.

СТАСЕВІЧ Юзэфа Тамашаўна, свінарка саўгаса «Асіповіцкі».

СУГАКА Марыя Парфёнаўна, начальнік аддзялення сувязі р.п. Татарка.

СУРАВЕЦ Мікалай Восіпавіч, трактарыст саўгаса «Асіповіцкі».

ТАМКОЎ Міхаіл Сысоевіч, машыніст паравоза лакаматыўнага дэпо.

ТОЛКАЧ Рыгор Мікалаевіч, дарожны майстар Асіповіцкай дыстанцыі пуці.

ЧАРОПКА Лідзія Мікалаеўна, майстар бягучага рамонту вагоннага дэпо, а таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

ШАКУРА Іван Пятровіч, машыніст паравоза лакаматыўнага дэпо.

ЮЎШЧЫК Захар Фаміч, машыніст паравоза лакаматыўнага дэпо.

ЯНУШЭЎСКІ Павел Антонавіч, машыніст паравоза лакаматыўнага дэпо.

І.П.Шакура.

З.Ф.Юўшчык.

Узнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі

АРЦЫМОВІЧ Ганна Іосіфаўна, медыцынская сястра Асіповіцкай раённай бальніцы.

БАРАЗНА Рыгор Нічыпаравіч, дырэктар Асіповіцкага млынкамбіната № 3.

ЕЎДАКІМОВІЧ Канстанцін Піліпавіч, начальнік вытворчага ўчастка саўгаса «Пратасевічы», а таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

ЗАБАЎСКІ Уладзімір Фёдаравіч, трактарыст калгаса «Усход», а таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

КАЛЕНІК Мікалай Міхайлавіч, начальнік раённага ўпраўлення сельскай гаспадаркі.

ЛАЗАРАЎ Андрэй Іванавіч, старшыня калгаса «Бальшавік».

МІРОНЧЫК Аляксандр Аляксандравіч, машыніст паравоза лакаматыўнага дэпо, а таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

ПАХОДАЎ Міхаіл Сяргеевіч, механізатар калгаса імя Ульянава.

РАМАНОЎСКІ Іван Фёдаравіч, машыніст паравоза лакаматыўнага дэпо.

САСНОЎСКІ Арыстарх Аляксеевіч, галоўны механік торфапрадпрыемства «Татарка».

ЧЫРУН Іван Адамавіч, дырэктар сярэдняй школы № 2 г. Асіповічы.

ШАЎЧЭНКА Сяргей Цітавіч, звеннявы калгаса «Новы шлях».

Г.І.Арцымовіч.

А.А.Мірончык.

Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга

АКСІНЕВІЧ Ніна Уладзіміраўна, маляр кардонна-руберойдавага завода.

І.А.Чырун.

С.Ц.Шаўчэнка.

АЛЯШКЕВІЧ Васіль Паўлавіч, звеннявы калгаса «Новы шлях».

АЛЯШКЕВІЧ Пётр Навумавіч, трактарыст калгаса «Новы шлях».

АНДРЫЕВІЧ Зоя Сцяпанаўна, апаратар фермы калгаса «Авангард».

АНТАНОВІЧ Віктар Іванавіч, шафёр Асіповіцкага гархарчпрамгандлю.

АСТАПЁНАК Марыя Аляксандраўна, даярка калгаса імя Леніна.

БАЕШКА Аляксандр Антонавіч, слесар кардонна-руберойдавага завода.

А.П.Дубінчык.

БАРАНОЎСКАЯ В.Н., майстар млына камбіната хлебапрадуктаў.

БАРЫСЕВІЧ Разалія Мікалаеўна, аператар шклофармовачных машын шклозавода «Кастрычнік».

БАТУКОЎ Трафім Іванавіч, дырэктар шклозавода «Кастрычнік».

БЛІЗНЕЦ Іван Рыгоравіч, вадзіцель калгаса «Камунар».

БУРНОС Анатоль Міхайлавіч, трактарыст саўгаса «Карытнае».

ВАЙЦЯХОЎСКАЯ Ганна Васільеўна, аператар шклофармовачных машын шклозавода «Кастрычнік».

ВАРАБЕЙ Рыгор Фёдаравіч, брыгадзір калгаса «Шлях Ільіча».

ВІКТОРЧЫК Сямён Кірылавіч, вадзіцель лесавоза Асіповіцкага леспрамгаса.

ВЯРЫГА Іосіф Антонавіч, слесар Ліпеньскага лесапункта Асіповіцкага леспрамгаса.

ГАЛІЕЎСКАЯ Ларыса Адамаўна, кінамеханік.

ГАРАВАЦКІ Уладзімір Іванавіч, брыгадзір слесараў торфапрадпрыемства «Татарка».

ГАРАДЗІСКІ Мікалай Іванавіч, начальнік 15-й дыстанцыі пуці.

ГАРДЗЕЙЧЫК Г.В., дырэктар завода аўтаагрэгатаў.

ГАТОЎЧЫК А.Е., маставы майстар чыгуначнага вузла.

ГЕРАСІМЧЫК Пётр Паўлавіч, слесар кардонна-руберойдавага завода.

ГЕРШОНЧЫК Вольга Мікалаеўна, рабочая саўгаса «Каўгарскі».

ГОЛУБЕЎ Георгій Сяргеевіч, машыніст карданаробчай машыны кардонна-руберойдавага завода.

ГРЫЦЭНКА Фёдар Іванавіч, старшыня выканкома Лапіцкага сельсавета.

ГУЛЯЕЎ Канстанцін Сцяпанавіч, калгас «Авангард».

ДАНЕЙКА Генадзь Вячаслававіч, майстар лесанарыхтовак Градзянскага лесапункта Асіповіцкага леспрамгаса.

ДЗЕМІДОВІЧ Міхаіл Іванавіч, звеннявы калгаса імя Чарняхоўскага.

ДЗІВАК Анатоль Іванавіч, галоўны механік шклозавода «Кастрычнік».

ДЗЯМІШКЕВІЧ Уладзімір Іванавіч, цэхавы наладчык шкляных аўтаматаў шклозавода «Кастрычнік».

ДОЎНАР В.С., токар камбіната хлебапрадуктаў.

ДРОЗД Мікалай Канстанцінавіч, трактарыст калгаса «Шлях Ільіча».

ДУБІНЧЫК Альберт Пятровіч, машыніст паравоза лакаматыўнага дэпо.

ЕЛІСЕЕЎ Расціслаў Аляксандравіч, старшы электраманцёр 4-й дыстанцыі сігналізацыі і сувязі.

ЕРКА М.Б., механізатар калгаса імя Ульянава.

ЕЎДАКІМОВІЧ Рыгор Фёдаравіч, брыгадзір калгаса «Бальшавік».

ЖУРАЎЛЁЎ Канстанцін Рыгоравіч, наладчык механазборачнага цэха завода аўтамабільных агрэгатаў.

ЗАГАРОЎСКІ Васіль Лук'янавіч, трактарыст калгаса «Чырвоны ўдарнік».

ЗАДОЛЯ Антаніна Трафімаўна, свінарка калгаса «Чырвоны ўдарнік».

ЗАЙКО Анатоль Іванавіч, муляр міжкалгаснай будаўнічай арганізацыі.

ЗЕЛЯНКОЎ Мікалай Данілавіч, старшыня Асіповіцкага райвыканкома.

ЗІНОЎСКІ Уладзімір Васільевіч, лесаруб Ліпеньскага лесапункта Асіповіцкага леспрамгаса.

ІВАШКЕВІЧ Зоя Іванаўна, фармаўшчыца механазборачнага цэха № 5.

ІВЕНДЗІКАЎ Фёдар Мікалаевіч, дырэктар Асіповіцкага леспрамгаса.

КАВАЛЬСКАЯ Лідзія Аляксееўна, аператар шклофармовачных машын шклозавода «Кастрычнік».

КАЗЛОЎ Мікалай Рыгоравіч, слесар Градзянскага лесапункта Асіповіцкага леспрамгаса.

КАЗЮК Уладзімір Самуілавіч, старшы электрамеханік 4-й дыстанцыі сігналізацыі і сувязі.

КАЛЕНІК Мікалай Міхайлавіч, старшыня калгаса імя Ульянава.

КАЛЯЧКА Галіна Іванаўна, свінарка калгаса «Чырвоны сцяг».

КАРАЎКА Аляксандр Макаравіч, старшы аглядчык вагонаў.

КАРТУН Зінаіда Мікалаеўна, свінарка калгаса імя Ульянава.

КАРПІКАЎ Пётр Іосіфавіч, машыніст лакаматыўнага дэпо.

КАСПЯРОВІЧ Віктар Казіміравіч, машыніст паравоза лакаматыўнага дэпо.

КЛІМОВІЧ Уладзімір Мартынавіч, аператар па адкорме буйной рагатай жывёлы калгаса імя Леніна.

КЛОНІН Яўген Пятровіч, токар шклозавода «Кастрычнік».

КЛЫШКА Іван Аляксандравіч, машыніст карданаробчай машыны кардонна-руберойдавага завода.

КОРБУТ Валянцін Аляксандравіч, калгаснік калгаса «Балышавік».

КРАЎЧАНКА Міхаіл Сямёнавіч, майстар лесанарыхтовак Ліпеньскага лесапункта Асіповіцкага леспрамгаса.

КРАЎЧАНКА Пётр Іванавіч, дырэктар Асіповіцкага лясгаса.

КРОТ Аляксандр Сцяпанавіч, машыніст паравоза лакаматыўнага дэпо.

ЛАЗОЎСКІ Міхаіл Антонавіч, старшы машыніст Асіповіцкага будаўніча-мантажнага ўпраўлення аблмеліятрэста.

ЛЕВІН Зяма Майсеевіч, намеснік начальніка лакаматыўнага дэпо.

ЛЕЎЧАНКА Захар Міхайлавіч, машыніст паравоза лакаматыўнага дэпо.

ЛІСІЦА Лізавета Барысаўна, даярка калгаса «Камунар».

ЛІТВІНАЎ Якаў Ісакавіч, слесар лакаматыўнага дэпо.

ЛОГВІН Міхаіл Іванавіч, аператар шклофармовачных машын шклозавода «Кастрычнік».

МАРДУСЕВІЧ Анатоль Пятровіч, дарожны майстар 15-й дыстанцыі пуці.

МАЦВЕЕВА Марыя Ільінічна, нарміроўшчыца лакаматыўнага дэпо.

МАЦВЕЕЎ Іван Пятровіч, майстар лакаматыўнага дэпо.

МІЛАШЭВІЧ Іван Станіслававіч, галоўны аграном калгаса «Бальшавік».

МІХАДЗЮК Мікалай Кузьміч, дарожны майстар 15-й дыстанцыі пуці.

МЯЦЕЛЬСКІ Іван Францавіч, трактарыст калгаса «Чырвоны сцяг».

НАВІЦКІ Мікалай Лук'янавіч, лесаруб Ліпеньскага лесапункта Асіповіцкага леспрамгаса.

П.І.Карпікаў.

Я.І.Літвінаў.

М.І.Мацвеева.

І.П.Мацвееў.

НЕСЦЯРУК Віктар Данілавіч, брыгадзір калгаса «Чырвоны ўдарнік».

НЯМЦОВА Раіса Аляксандраўна, рубшчыца кардонна-руберойдавага завода.

ОКРУТ Яўген Паўлавіч, дэфібратаршчык карданаробчай машыны кардонна-руберойдавага завода.

ПАЛАЗНІК Ірына Міхайлаўна, свінарка калгаса «Бальшавік».

ПАЛАНЕВІЧ Ірына Іванаўна, даярка калгаса «Карытнае».

ПАЛАНЕЙЧЫК Мікалай Якаўлевіч, трактарыст калгаса імя Ульянава.

ПАПОЎ Вадзім Аляксандравіч, 1-ы сакратар Асіповіцкага гаркома КПБ.

ПАРХОМЧЫК Яўген Іванавіч, машыніст паравоза лакаматыўнага дэпо.

ПАТАПЕЙКА Міхаіл Міхайлавіч, машыніст паравоза лакаматыўнага дэпо.

ПУШ Яўген Сігізмундавіч, галоўны канструктар шклозавода «Кастрычнік».

ПЯЧЭНЯ Уладзімір Ніканоравіч, механік-наладчык 15-й дыстанцыі пуці.

РАЗМЫСЛОВІЧ Сямён Іванавіч, начальнік дарожна-эксплуатацыйнага ўчастка № 720.

Я.І.Пархомчык.

А.А.Райкевіч.

Ф.А.Сікорскі.

Ф.В.Хаўрэнка.

І.Ф.Шчэцька.

РАЙКЕВІЧ Аляксей Аляксандравіч, інструктар па цеплатэхніцы лакаматыўнага дэпо.

РАМАНОЎСКАЯ Марыя Пятроўна, жывёлавод калгаса «Чырвоны ўдарнік».

РАНЦАЎ Аляксей Фёдаравіч, апаратчык сківічнага пагрузчыка Асіповіцкага леспрамгаса.

РУДЗЬКО Міхаіл Несцеравіч, шафёр раённага аб'яднання «Сельгастэхніка».

РУДЭНКА Іван Сямёнавіч, старшыня Асіповіцкага райвыканкома.

РУСАКОВІЧ Аляксей Ягоравіч, машыніст паравоза лакаматыўнага дэпо.

СІВАКОЎ Аляксандр Міхайлавіч, 1-ы сакратар Асіповіцкага райкома КПБ.

СІКОРСКІ Фёдар Андрэевіч, машыніст паравоза лакаматыўнага дэпо.

СІМАГА Уладзімір Іванавіч, заатэхнік калгаса «Бальшавік».

СІМАНАЎ Леанід Якаўлевіч, старшыня Асіповіцкага райвыканкома.

СКРЫГАН Канстанцін Раманавіч, начальнік аддзела кадраў шклозавода «Кастрычнік».

СМІРНОЎ Барыс Аляксеевіч, вадзіцель аўтакалоны № 1242.

СОЛНЫШКІНА Г.М., даярка калгаса «Авангард».

СТАЛЬМАШОНАК Іван Майсеевіч, беларускі вучоны ў галіне хірургіі.

СТАРОБІНСКІ Залман Майсеевіч, старшы электрамеханік 4-й дыстанцыі сігналізацыі і сувязі.

СТЭЛЬМАХ Афанасій Фёдаравіч, інжынер калгаса імя Леніна.

СУШКО Аляксандр Пятровіч, брыгадзір лесанарыхтоўчай брыгады Ліпеньскага лясніцтва Асіповіцкага лясгаса.

СЫЧОЎ Рыгор Парфёнавіч, даглядчык жывёлы-пастух калгаса «Усход».

ТОМЧЫК Ганна Іосіфаўна, цялятніца саўгаса «Карытнае».

ТРОН Нона Васільеўна, настаўніца сярэдняй школы № 4 г. Асіповічы.

ХАЎРЭНКА Фёдар Васільевіч, машыніст-інструктар лакаматыўнага дэпо.

ХІЧЭЎСКІ Іван Іосіфавіч, старшыня калгаса «Чырвоны ўдарнік».

ХЛУС Пётр Іванавіч, начальнік Ліпеньскага лесапункта Асіповіцкага леспрамгаса.

ЦЯСЛЁНАК Мацвей Сямёнавіч, брыгадзір калгаса імя Валадарскага.

ЦЯСЛЁНАК Мікалай Сцяпанавіч, трактарыст калгаса «Авангард».

ШАЛАЙ Таццяна Мікалаеўна, пекармайстар Асіповіцкага хлебазавода.

ШВЕДАВА Аляксандра Севасцьянаўна, апаратчыца Асіповіцкага маслазавода.

ШЧЭЦЬКА Іван Фёдаравіч, брыгадзір калгаса «Авангард».

ЮРКАВЕЦ Іван Міронавіч, наладчык шклозавода «Кастрычнік».

ЮРКАВЕЦ Рыгор Антонавіч, вадзіцель Ліпеньскага лесапункта Асіповіцкага леспрамгаса.

ЮСУПБАЕЎ Ядкар Абдулавіч, старшы электрамеханік 4-й дыстанцыі сігналізацыі і сувязі.

ЗАСЛУЖАНЫЯ РАБОТНІКІ БЕЛАРУСІ

АРЛОЎ Анатоль Іванавіч, дырэктар сярэдняй школы № 1 г. Асіповічы. Заслужаны работнік культуры Беларусі (1980).

АРЦЫМОВІЧ Ганна Іосіфаўна, аперацыйная сястра раённай бальніцы. Заслужаны работнік аховы здароўя Беларусі (1974).

АСВЯЦІНСКІ Геральд Баляслававіч, дырэктар Беларускага тэатра «Лялька». Заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1968).

БУРАК Іван Сцяпанавіч, ляснічы Вязскага лясніцтва Асіповіцкага лясгаса. Заслужаны лесавод Беларусі (1981).

ВАРАБЕЙ Міхаіл Дзмітрыевіч, старшыня калгаса «Авангард». Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі (1986).

ГАРНАСТАЕЎ Барыс Пятровіч, дырэктар дзіцячай музычнай школы. Заслужаны работнік культуры Беларусі (1984).

ГЛАДЫШАВА Ніна Аляксееўна, аператар па адкорме буйной рагатай жывёлы калгаса імя Ульянава. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі (1988).

ГОЛУБЕВА Вольга Віктараўна, настаўнік біялогіі Вяззеўскай сярэдняй школы. Заслужаны настаўнік Беларусі (1974).

ГРЫШАНОВІЧ Уладзімір Дзмітрыевіч, дырэктар Свіслацкага дзіцячага дома. Заслужаны настаўнік Беларусі (1959).

ДУБІНЧЫК Фёдар Сямёнавіч, заслужаны настаўнік Беларусі (1968).

ЖЫВАГЛОД Вольга Гаўрылаўна. Заслужаны настаўнік Беларусі (1966).

ЗАЙЦАВА Ганна Васільеўна, завуч сярэдняй школы № 1 г. Асіповічы. Заслужаны настаўнік Беларусі (1957).

КАЗАК Іван Мікітавіч, завуч сярэдняй школы № 11 ст. Асіповічы. Заслужаны настаўнік Беларусі (1957).

КАЗАКОЎ Мікалай Прохаравіч, дырэктар сярэдняй школы № 4 г. Асіповічы. Заслужаны настаўнік Беларусі (1966).

КАЛЯДКА Васіль Сямёнавіч, галоўны ўрач Татаркавіцкай участковай бальніцы. Заслужаны ўрач Беларусі (1968).

КАМЕНСКАЯ Ніна Васільеўна, беларускі гісторык. Заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1981).

В.Г.Жываглод.

Г.В.Зайцава.

М.П.Казакоў.

В.С.Калядка.

В.Е.Клімовіч.

КАМКОЎ Уладзімір Цярэнцьевіч, беларускі артыст балета. Заслужаны артыст Беларусі (1980).

КЛІМОВІЧ Вольга Емяльянаўна, настаўніца пачатковых класаў сярэдняй школы № 3 г. Асіповічы. Заслужаны настаўнік Беларусі (1964).

КЛІМОВІЧ Уладзімір Мартынавіч, аператар па адкорме буйной рагатай жывёлы калгаса імя Леніна. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі (1985).

А.У.Тамашэўскі.

А.А.Ушакевіч.

З.І.Чарапкоў.

А.Б.Чарноў.

І.А.Шуба.

Н.А.Юркавец.

КУРЧЭЎСКІ Джан Аляксеевіч, настаўнік гісторыі школы-інтэрната г. Асіповічы. Заслужаны настаўнік Беларусі (1987).

ЛАМАНОВІЧ Ніна Іосіфаўна, беларускі харавы дырыжор. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1999).

ЛІЎШЫЦ Гілер Маркавіч, беларускі гісторык і філосаф. Заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1979).

МАХНАЧ Любоў Міхайлаўна, настаўніца сярэдняй школы № 2 г. Асіповічы. Заслужаны настаўнік Беларусі (1975).

НОВІКАЎ Мікалай Іосіфавіч, дырэктар лясгаса. Заслужаны лесавод Беларусі (1991).

ПАТАПЕЙКА Павел Сцяпанавіч, настаўнік школы-інтэрната г. Асіповічы. Заслужаны настаўнік Беларусі (1967).

ПАЎЛОВІЧ Надзея Андрэеўна, акушэрка раённай бальніцы. Заслужаны работнік аховы здароўя Беларусі (1972).

ПАХОДАЎ Міхаіл Сяргеевіч, механізатар калгаса імя Ульянава. Заслужаны механізатар сельскай гаспадаркі Беларусі (1980).

РАЕЎСКАЯ Тамара Рыгораўна, беларуская эстрадная спявачка. Заслужаная артыстка Беларусі (1974).

РАСАЛОЎСКАЯ Ніна Міхайлаўна, загадчыца тэрапеўтычнага аддзялення раённай бальніцы. Заслужаны ўрач Беларусі (1970).

РУДЗЬКО Іван Усцінавіч, шафёр калгаса «Камунар». Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі (1975).

СТАЛЬМАШОНАК Іван Майсеевіч, беларускі вучоны ў галіне хірургіі. Заслужаны ўрач Беларусі (1948).

ТАМАШЭЎСКІ Анатоль Уладзіміравіч, рэдактар газеты «Асіповіцкі край». Заслужаны работнік культуры Беларусі (1992).

УСАЎ Іван Несцеравіч, беларускі вучоны ў галіне педыятрыі. Заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1981) і заслужаны работнік аховы здароўя Беларусі (1991).

УШАКЕВІЧ Аляксандр Ануфрыевіч, хірург раённай бальніцы. Заслужаны ўрач Беларусі (1941).

ХЛУС Антаніна Іванаўна, прыёмшчыца заказаў Асіповіцкага раённага камбіната бытавога абслугоўвання. Заслужаны работнік сферы абслугоўвання Беларусі (1983).

ЦЕРАХАЎ Аляксей Пятровіч, настаўнік фізікі Ліпеньскай сярэдняй школы. Заслужаны настаўнік Беларусі (1970).

ЦІМОШЧАНКА Аляксандр Ануфрыевіч, дырэктар Свіслацкай сярэдняй школы. Заслужаны настаўнік Беларусі (1978).

ЦЯЦЕРЫН Адольф Міхайлавіч, загадчык аддзела культуры Асіповіцкага райвыканкома. Заслужаны работнік культуры Беларусі (1975).

ЧАРАПКОЎ З.І. Заслужаны настаўнік Беларусі (1965).

ЧАРНОЎ Аляксандр Барысавіч, дырэк-

тар сярэдняй школы № 2 г. Асіповічы. Заслужаны настаўнік Беларусі (1945).

ШУБА Іван Адамавіч, шафёр Асіповіцкага леспрамгаса. Заслужаны шафёр Беларусі (1970).

ЮРКАВЕЦ Ніна Антонаўна, заслужаны настаўнік Беларусі (1964).

ЯШЧАК Юрый Міхайлавіч, дырэктар Дараганаўскай санаторна-лясной школы. Заслужаны настаўнік Беларусі (1967).

* * *

Многія ўраджэнцы Асіповіцкага раёна пасля заканчэння сярэдніх школ пакінулі родныя мясціны — некаторыя паступілі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы былога СССР і потым раз'ехаліся працаваць у розныя мясціны неабсяжнай краіны. Іншыя паехалі працаваць за межы Беларусі па накіраванні. Многія з іх за сумленную і кваліфікаваную працу адзначаны высокімі ўзнагародамі Савецкага Саюза і саюзных рэспублік. Сярод іх **Іван Іванавіч АБРАМОВІЧ**, які закончыў СШ № 2 г. Асіповічы; працаваў на шэрагу адказных аб'ектаў, у тым ліку кіраваў работамі па ўзвядзенні Астанкінскай тэлевежы ў Маскве, заслужаны будаўнік СССР.

І.К.Станішэўскі.

Ігар Канстанцінавіч СТАНІШЭЎСКІ нарадзіўся ў 1931 г. на хутары Вайнілава Асіповіцкага р-на. У 1951 г. закончыў Бабруйскі лесатэхнічны тэхнікум і ў гэтым жа годзе паступіў у Ленінградскую лесатэхнічную акадэмію, якую закончыў у 1956 г. Па размеркаванні быў накіраваны на работу ў г. Вільнюс, дзе працаваў на розных пасадах, а з 1964 г. па 1989 г. дырэктарам завода валакністага пласціка. У 1979 г. яму прысвоена званне «Заслужаны інжынер Літвы». Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і медалём «За працоўную доблесць».

Родам з Асіповіччыны

ВУЧОНЫЯ

ВОЎК-ЛЕВАНОВІЧ Іосіф Васільевіч. Беларускі мовазнавец. Нарадзіўся 6.11.1891 г. на былым хутары Лявонаўка Асіповіцкага р-на ў сялянскай сям'і. У 1911 г. закончыў Бабруйскую гімназію і паступіў на гісторыка-філалагічны факультэт Пецярбургскага універсітэта. Калі пачалася Першая сусветная вайна, добраахвотна пайшоў у армію. У баях быў паранены, потым цяжка захварэў. У лютым 1918 г. звольніўся з арміі і прыехаў да бацькоў. Там яго заспелі нямецкая, потым польская акупацыі. Пад час іх выкладаў рускую і лацінскую мовы ў Бабруйскай прыватнай і Клецкай грамадскай гімназіях. У жніўні 1920 г. прызваны ў Чырвоную армію. Праз 2 гады дэмабілізаваўся і вярнуўся на вучобу ў Петраградскі універсітэт. Закончыўшы яго ў 1923 г., прыехаў у Мінск, выкладаў беларускую мову ў польскім і яўрэйскім педтэхнікумах. З лютага 1924 г. працаваў у БДУ на кафедры гісторыі беларускай мовы, а з 1927 г. адначасова і ў Інбелкульце навуковым сакратаром Камісіі па ўкладанні гістарычнага слоўніка беларускай мовы. У верасні 1930 г. вымушаны быў пераехаць у Саратаў. Там загадваў кафедрай агульнага мовазнаўства ва універсітэце, праз год — кафедрай агульнага мовазнаўства і рускай мовы ў педінстытуце. З верасня 1934 г. працаваў загадчыкам кафедры рускай мовы і літаратуры ў Арэнбургскім педінстытуце. Там 17.9.1937 г. быў беспадстаўна арыштаваны і засуджаны.

Галоўнымі аб'ектамі навуковых даследаванняў І.В.Ваўка-Левановіча былі гісторыя беларускай мовы і беларуская дыялекталогія. Па гэтых галінах мовазнаўства апублікаваў шэраг артыкулаў, а ў 1927 г. выдаў вучэбны дапаможнік «Лекцыі па гісторыі беларускай мовы». У «Лекцыях» выкладзена першая частка (уступ і фанетыка) праграмнага універсітэцкага курса, які ён чытаў на працягу 1925—1927 гг. студэнтам этналінгвіс-

тычнага аддзялення педагагічнага факультэта БДУ. Пачынаюцца «Лекцыі» ўводзінамі, у якіх раскрыты такія пытанні, як месца беларускай мовы сярод іншых славянскіх, яе дыялектнае чляненне, крыніцы вывучэння гісторыі беларускай мовы, погляды на беларускую мову і яе паходжанне ў спецыяльнай навуковай літаратуры, крытычна прааналізаваны розныя тэорыі славянскай прабацькаўшчыны і ўсходнеславянскай прамовы. Падрабязна апісваецца фанетычная сістэма старажытнай беларускай мовы і разглядаюцца розныя пазнейшыя змены ў ёй. Асноўная ўвага засяроджана на ўзнікненні і развіцці найбольш тыповых фанетычных з'яў, выказаны арыгінальныя думкі аб паходжанні беларускага акання, дзекання і цекання. З'яўляецца таксама аўтарам артыкулаў «Гістарычнае вывучэнне беларускай мовы ў славянскай філалогіі» (1925), «Мова выданняў Францішка Скарыны» (1926), «Важнейшыя рысы гаворкі вёскі Татаркавічы і гаворак вакольчных вёсак» (1928), «Аб прынцыпах і метадах укладання гістарычнага слоўніка беларускай мовы» (1929), «Яшчэ да пытання аб «ляшскіх» рысах у беларускай фанетыцы» (1930), «Да пытання аб пабудове граматыкі рускай мовы» (1934) і інш. Рукапісы некаторых завершаных І.В.Ваўком-Левановічам навуковых прац (2-й часткі «Лекцый па гісторыі беларускай мовы», «Хрэстаматыі па гісторыі беларускай мовы», «Кароткага дапаможніка па агульным мовазнаўстве») пасля арышту аўтара былі страчаны.

Памёр 19.8.1943 г. у адным з лагераў на Поўначы Расіі.

І.К.Германовіч.

ГРАМАДЧАНКА Таіса Канстанцінаўна. Беларускі крытык і літаратуразнавец. Кандыдат філалагічных навук (1980). Нарадзілася 1.12.1951 г. у р.п. Градзянка Асіповіцкага р-на. Закончыла філалагічны факультэт БДУ (1976). У 1979—1992 гг. навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры АН Беларусі, з 1992 г. выкладчык Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М.Танка. З першымі артыкуламі Т.Грамадчанка выступіла ў рэспубліканскім перыядычным друку ў 1979 г. Даследуе творчасць пісьменнікаў 1920—1930-х гадоў В.Каваля, Б.Мікуліча, сучасных беларускіх празаікаў І.Чыгрынава, А.Асіпенкі, А.Кудраўцава, В.Карамазава, Л.Дайнекі, В.Гігевіча, М.Савіцкага, В.Мысліўца, У.Ягоўдзіка і інш. Піша крытычныя і праблемныя артыкулы, рэцэнзіі, гадавыя агляды прозы, выступае перад самай рознай аўдыторыяй з лекцыямі, дакладамі аб стане развіцця сучаснай беларускай літаратуры. Аўтар манаграфіі «Жывая памяць народа» (1984) пра І.Чыгрынава, кнігі «Перад праўдай высокай і вечнай: Беларуская проза сёння» (1991), сааўтар даследавання «Праблемы сучаснай беларускай крытыкі» (1996). Жыве ў Мінску.

І.У.Саламевіч.

КАМЕНСКАЯ Ніна Васільеўна. Беларускі гісторык. Член-карэспандэнт Акадэміі навук Беларусі (1959). Доктар гістарычных навук (1959), прафесар (1961). Заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1981). Нарадзілася 10.1.1914 г. у г. Асіповічы. Закончыла Магілёўскі педагагічны інстытут (1937). У 1944—1962 гг. старшы навуковы супрацоўнік, загадчык сектара, намеснік дырэктара, у 1962—1964 гг. дырэктар Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ, у 1965—1969 гг. дырэктар Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі. У 1969—1974 гг. прарэктар, загадчык кафедры гісторыі БССР Мінскага педагагічнага інстытута. Даследавала праблемы гісторыі Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны ў Беларусі, утварэння БССР. Аўтар прац «Утварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі» (1946), «Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя і ўтварэнне БССР» (1954), «Першыя сацыялістычныя пераўтварэнні ў Беларусі» (1957), «Беларускі народ у барацьбе за Савецкую ўладу (1919—1920 гг.)» (1963), «Станаўленне народнай адукацыі ў Беларусі (1917—1920 гг.)» (1980). Памерла 22.3.1986 г.

КУНЦЭВІЧ Анатоль Дзям'янавіч. Расійскі фізікахімік. Акадэмік Расійскай АН (1987, член-карэспандэнт з 1981). Генерал-лейтэнант (1987), Герой Сацыялістычнай Працы (1981). Нарадзіўся 6.8.1934 г. у в. Свіслач Асіповіцкага р-на. Закончыў Ваенную акадэмію хімічнай аховы (1958), дзе і працаваў (з 1977 прафесар). У 1986—1989 гг. галоўны спецыяліст аператыўнай групы па дэзак-

тывацыі ў Чарнобылі, потым дырэктар Цэнтра экатаксіметрыі пры Інстытуце хімічнай фізікі Расійскай АН. Аўтар навуковых прац па арганічнай і прыкладной хіміі, даследаваннях новых рэчываў і іх рэакцыйнай здольнасці ў монамалекулярных слаях, на мяжы падзелу фаз у мнагафазных сістэмах. Распрацаваў тэарэтычныя асновы стварэння высокарэакцыйных сарбентаў. Абгрунтаваў канцэпцыю «каардынацыйнага эфекту» ў рэакцыях нуклеафільнага змяшчэння. Аўтар кніг «Не, бінарнай зброі!» (1986), «Хімічную зброю пад поўную забарону» (1987). Жыве ў Маскве.

ЛІЎШЫЦ Гілер Маркавіч (Мордухавіч). Беларускі гісторык і філосаф. Доктар гістарычных (1961) і філасофскіх (1977) навук, прафесар (1962). Заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1979). Нарадзіўся 8.7.1909 г. у в. Дараганава Асіповіцкага р-на. Закончыў Мінскі педагагічны інстытут (1934) і выкладаў у ім. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З восені 1941 г. у Кзыл-Ардзінскім педагагічным інстытуце (Казахстан). З 1944 г. выкладаў у БДУ. Вывучаў сацыяльна-эканамічнае, палітычнае становішча і ідэалогію старажытнага свету (пераважна Іудзеі і Рыма) і сярэдневяковай Еўропы, пытанні навуковага атэізму і гісторыі філасофіі. Адзін з буйнейшых даследчыкаў Кумранскіх рукапісаў. Аўтар прац «Класавая барацьба ў Іудзеі і паўстанні супраць Рыма» (1957), «Кумранскія рукапісы і іх гістарычнае значэнне» (1959), «Сацыяльна-палітычная барацьба ў Рыме 60-х гг. I ст. да н.э. і змова Каціліны» (1960), «Паходжанне хрысціянства ў святле рукапісаў Мёртвага мора» (1967), «Нарысы гістарыяграфіі Бібліі і ранняга хрысціянства» (1970), «Вальнадумства і матэрыялістычная філасофія ў Заходняй Еўропе (другая палова XVII ст.)» (1975), «Французскія асветнікі XVIII ст. аб рэлігіі і царкве» (1976), «Рэфармацыйны рух у Чэхіі і Германіі» (1978), «Атэізм рускіх рэвалюцыйных дэмакратаў» (1979), «Крытыка ідэалізму і рэлігіі ў працах Г.В.Пляханава» (1981). Памёр 27.6.1983 г.

М.Б.Батвіннік.

МАКСІМЕНКА Мікалай Васільевіч. Беларускі фізік-тэарэтык. Доктар фізіка-матэматычных навук (1993), прафесар

Н.В.Каменская.

А.Дз.Кунцэвіч.

Г.М.Ліўшыц.

Г.А.Мятлюк.

(1994). Нарадзіўся 15.9.1942 г. у в. Ліпень Асіповіцкага р-на. Закончыў Гомельскі педагагічны інстытут (1965). З 1974 г. працуе ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце. Навуковыя працы па фізіцы электрамагнітных узаемадзеянняў адронаў у састаўных мадэлях рэлятывісцкай квантавай тэорыі поля. Распрацаваў падыход да апісання палярызавальнасці адронаў, атрымаў ураўненні для звязаных сістэм зараджаных часціц у электрамагнітным полі.

МЯТЛЮК (дзявочае Аляшкевіч) Ганна Антонаўна. Беларускі моваznавец. Доктар філалагічных навук (1989), прафесар (1990). Нарадзілася 14.10.1936 г. у г. Асіповічы. Закончыла Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моў (1959). Працавала ў тым жа інстытуце асістэнтам, старшым выкладчыкам, у 1978—1995 гг. — загадчыкам кафедры тэарэтычнай і эксперыментальнай фанетыкі. З 1995 г. прафесар Варшаўскага (пазней Беластоцкага) універсітэта, з 1999 г. кіраўнік кафедры неафілалогіі. Даследуе фанетычныя сістэмы англійскай, бела-

А.Г.Слука.

рускай, рускай і польскай моў: іх прасодыю і інтанацыю, фанетычную інтэрферэнцыю ў іншамоўным маўленні, фанетычныя рысы мовы асоб з парушэннем слыху і прымяненне вынікаў фанетычных даследаванняў у навучанні гэтых асоб вуснаму маўленню. Аўтар больш за 120 навуковых прац, у тым ліку манаграфій «Прасодыя беларускай мовы ва ўмовах двухмоўя» (1982), «Узаемадзеянне прасадычных сістэм у маўленні білінгва» (1986), «Англійская мова для тых, хто слаба чуе, і глухіх» (1994, усе на рускай мове). Сааўтар кніг «Тэарэтычная фанетыка англійскай мовы» (1976), «Вучэбна-метадычны дапаможнік па аўдзіраванні англійскай мовы» (1984), «Прасадычная інтэрферэнцыя ў іншамоўным маўленні» (1985, усе на рускай мове), «Тэарэтычная фанетыка» (1980), «Курс тэарэтычнай фанетыкі» (2000, абедзве на англійскай мове). Заснавальнік новага напрамку фанетычных даследаванняў «Голасамоўная камунікацыя як аснова сацыяльнай рэабілітацыі асоб з дэфектамі слыху».

РАМАНОВІЧ Яўгенія Міхайлаўна. Беларускі мовазнавец. Кандыдат філалагічных навук (1954). Нарадзілася 6.7.1922 г. у в. Дараганава Асіповіцкага р-на. У час Вялікай Айчыннай вайны працавала на ваенным заводзе ў Чэлябінску (Расія). У 1948 г. закончыла БДУ. З 1952 г. навуковы супрацоўнік Інстытута мовазнаўства АН Беларусі.

Я.М.Рамановіч аўтар прац па беларускай дыялекталогіі, гісторыі беларускай мовы, сучаснай беларускай літаратурнай мове, бібліяграфіі беларускага мовазнаўства. За сааўтарства ў працах па беларускай лінгвагеаграфіі «Дыялекталагічны атлас беларускай мовы» (1963), «Нарысы па беларускай дыялекталогіі» (1964), «Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак» (1968—1969) атрымала Дзяржаўную прэмію СССР (1971). Шэраг артыкулаў і кандыдацкую дысертацыю Я.М.Рамановіч прысвяціла аналізу гаворак Уздзенскага р-на Мінскай вобл. У некаторых працах даследчыцы даецца акцэнталагічная характарыстыка розных катэгорый назоўнікаў у беларускіх гаворках: артыкулы «Асаблівасці націску ў назоўніках жаночага роду на -к(а) у беларускай мове» (1972), «Некаторыя акцэнталагічныя адрозненні ў сучасных беларускіх гаворках» (разам з А.І.Чабярук, 1966), «Пытанне акцэнтуацыі назоўнікаў жаночага роду з асновай на -а ў беларускіх гаворках» (1970).

Рамановіч — член рэдакцыйнай калегіі і сааўтар «Слоўніка беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча» (т. 1—5, 1979—1986), які ўключае 38 тыс. слоў. Яна адрэдагавала і выдала «Слоўнік народных гаворак Заходняй Браншчыны» П.А.Растаргуева (1973) і напісала ўступны нарыс пра яго складальніка (разам з Н.Д.Растаргуевай). З'яўляецца таксама адным з аўтараў прац «Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Марфалогія» (1957), «Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы» (ч. 1—2, 1961—1962), «Беларускае мовазнаўства: Бібліяграфічны паказальнік (1825 — 1965)» (1967, 1969), «Мікратапанімія Беларусі» (1974), «Беларускае мовазнаўства: Бібліяграфічны паказальнік (1966—1975)» (1980) і інш. Дзяржаўная прэмія Беларусі (2000) за сааўтарства ў цыкле прац «Лексічны атлас беларускіх народных гаворак» (т. 1—5, 1993—1998).

М.Н.Крыўко.

СЛУКА Алег Георгіевіч. Беларускі журналіст, дзяржаўны дзеяч. Доктар гістарычных навук (1986), прафесар (1989). Нарадзіўся 12.7.1941 г. у в. Лабковіца Асіповіцкага р-на. Закончыў БДУ (1968), дзе і працаваў з 1971 г. (з 1986 — дэкан факультэта журналістыкі). З 1995 г. памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у 1997—2001 гг. намеснік міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь. Даследуе пытанні гісторыі, тэорыі і практыкі сродкаў інфармацыі, тэорыі ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці. Аўтар прац «Голас рэвалю-

цыйнай моладзі» (1978), «Слова ў камсамольскім страі» (1980), «Камсамольскі радок» (1984), «Мадэль устойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь» (1999, у сааўтарстве), вучэбнага дапаможніка «Беларуская журналістыка» (ч. 1, 2000), манаграфіі «Нацыянальная ідэя» (2001). Лаўрэат прэмій Ленінскага камсамола Беларусі (1980) і Саюза журналістаў Рэспублікі Беларусь (1994). Узнагароджаны Граматай Вярхоўнага Савета БССР. Жыве ў Мінску.

СТАЛЬМАШОНАК Іван Майсеевіч. Беларускі вучоны ў галіне хірургіі. Кандыдат медыцынскіх навук (1937), дацэнт (1938). Заслужаны ўрач Беларусі (1948). Нарадзіўся 30.4.1902 г. у в. Хімное Асіповіцкага р-на. Закончыў медыцынскі факультэт БДУ (1927). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1927—1941 гг. працаваў у Мінску. З 1944 г. на кафедры шпітальнай хірургіі (у 1950—1968 загадчык кафедры) Мінскага медыцынскага інстытута, адначасова дырэктар НДІ гематалогіі і пераліванне крыві (1944—1951), Мінскага медыцынскага інстытута (1951—1961). Асноўныя працы па пытаннях пераліванне крыві, брушной хірургіі, гісторыі хірургіі. Распрацаваў спосабы аперацый стварэння штучнага стрававода, рэзекцыі страўніка пры пухлінах. Укараніў у практыку астэасінтэзу пры адкрытых і закрытых пераломах трубчастых касцей касцяны шпянёк. Аўтар 110 навуковых прац, у тым ліку 6 манаграфій. Узнагароджаны двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнамі «Знак Пашаны», Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр 12.1.1976 г.

СТАЛЬМАШОНАК Ілья Майсеевіч. Кандыдат тэхнічных навук (1952). Нарадзіўся 19.7.1918 г. у в. Хімное Асіповіцкага р-на. Закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1940). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1948—1985 гг. працаваў у Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі, з 1954 г. дэкан землеўпарадкавальнага факультэта, у 1963—1973 гг. загадчык кафедры. Даследаваў гісторыю землеўпарадкавання і землеўпарадкавальнай адукацыі, Вялікай Айчыннай вайны, г. Горкі і Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. Пад кіраўніцтвам І.М.Стальмашонка праведзены навуковыя даследаванні ў галіне планіроўкі сельскіх населеных пунктаў Беларусі. Ганаровы грамадзянін г. Горкі Магілёўскай вобл. і г.п. Навапскоў Луганскай вобл. (Украіна).

І.М.Стальмашонак.

В.М.Сурын.

СУРЫН Віталь Міхайлавіч. Доктар тэхнічных навук (1993), прафесар (1994). Нарадзіўся 17.1.1940 г. у в. Ясень Асіповіцкага р-на. Закончыў Беларускі політэхнічны інстытут (1961). Працаваў інжынерам на прадпрыемствах Мінска. З 1972 г. у Мінскім радыётэхнічным інстытуце (з 1993 Беларускі дзяржаўны універсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі): асістэнт, старшы выкладчык, з 1985 г. загадчык кафедры тэхнічнай механікі. Асноўныя кірункі даследаванняў — надзейнасць вырабаў электроннай тэхнікі пры механічных (вібрацыйных, ударных) уздзеяннях, паскораныя метады ацэнкі паказчыкаў надзейнасці, прагназіраванне надзейнасці пры зададзеных узроўнях уздзеяння. Аўтар прац «Разлік прыстасаванняў для механічных выпрабаванняў ІЭТ СВІ з павышанымі ўзроўнямі ўздзеяння» (1987), «Метады паскораных выпрабаванняў вырабаў электроннай тэхнікі на вібрацыйныя і ўдарныя ўздзеянні» (1991) і інш. Апублікаваў звыш 170 навуковых артыкулаў. Узнагароджаны залатым (1987) і сярэбраным (1989) медалямі ВДНГ СССР, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Жыве ў Мінску.

СЦЕПАНЧУК Уладзімір Піліпавіч. Беларускі вучоны ў галіне цеплаэнергетыкі. Доктар тэхнічных навук (1969), прафесар (1971). Нарадзіўся 17.1.1928 г. у р.п. Ялізава Асіповіцкага р-на. Закончыў Беларускі політэхнічны інстытут (1951). З 1955 г. працаваў у гэтым інстытуце асістэнтам, дацэнтам, потым старшым навуковым супрацоўнікам. У 1964—1966 гг.

Г.М.Тамковіч.

І.Н.Усаў.

М.К.Ананьеў.

эксперт ЮНЕСКА пры тэхналагічным інстытуце ў Бамбеі (Індыя). З 1970 г. у Беларускім політэхнічным інстытуце (з 1991 Беларуская політэхнічная акадэмія), адначасова (з 1971) рэдактар часопіса «Известия высших учебных заведений. Энергетика». Аўтар прац па даследаванні работы эжэктара, па эксперыментальным і тэарэтычным даследаванні звышгукавых двухфазных патокаў і па іншых пытаннях тэарэтычных асноў цеплатэхнікі.

ТАМКОВІЧ Генадзь Міхайлавіч. Кандыдат тэхнічных навук (1967). Генерал-маёр (1980). Нарадзіўся ў г. Асіповічы. Закончыў Кіеўскія артылерыйскае падрыхтоўчае і вышэйшае інжынернае (1957) вучылішчы. З 1957 г. інжынер-выпрабавальнік, старшы навуковы супрацоўнік, начальнік лабараторыі, з 1968 г. камандзір выпрабавальнай часткі, навукова-выпрабавальнага ўпраўлення. Працаваў намеснікам начальніка камандна-вымяральнага комплексу, дырэктара Інстытута касмічных даследаванняў Акадэміі навук СССР. Узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1980).

УСАЎ Іван Несцеравіч. Беларускі вучоны ў галіне педыятрыі. Доктар медыцынскіх навук (1965), прафесар (1967). Заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1981), заслужаны работнік аховы здароўя Беларусі (1991). Нарадзіўся 13.10.1921 г. у в. Асяродак Асіповіцкага р-на. Закончыў Бабруйскую фельчарскую школу (1940), Мінскі медыцынскі інстытут (1951). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1951 г. на кафедры педыятрыі (у 1967—1989 загадчык кафедры) Мінскага медінстытута. Некаторы час працаваў у Міністэрстве аховы здароўя Беларусі. Даследаваў мікраэлементы ў крыві нованароджаных, механізм развіцця хвароб нырак і іх лячэнне, спадчынную схільнасць і рэзістэнтнасць да хвароб у дзяцей. Аўтар больш за 300 навуковых прац па розных раздзелах педыятрыі, у тым ліку шэрагу падручнікаў і манаграфій. Пад яго кіраўніцтвам падрыхтаваны 4 дактары і звыш 30 кандыдатаў навук. Узначальваў праўленне навуковага таварыства дзіцячых урачоў Беларусі (з 1970), быў членам праўлення Усесаюзнага таварыства педыятраў. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеней, Чырвонай Зоркі, медалямі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Памёр 19.1.1994 г.

ДЗЯРЖАЎНЫЯ ДЗЕЯЧЫ

АНАНЬЕЎ Мікалай Канстанцінавіч. Дзяржаўны дзеяч Рэспублікі Беларусь. Нарадзіўся 12.4.1949 г. у г. Асіповічы. Закончыў Беларускі дзяржаўны інстытут фізічнай культуры (1975), Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1986). Працоўную дзейнасць пачаў у 1965 г. рабочым вагоннага дэпо станцыі Асіповічы, у 1968—1970 гг. служыў у арміі. У 1970—1971 гг. працаваў старшынёй камітэта па фізкультуры і спорце пры Асіповіцкім райвыканкоме, у 1971—1979 гг. завучам, старшым трэнерам па баскетболе Асіповіцкай ДЮСШ. У 1979—1987 гг. працаваў на розных пасадах у Асіповіцкім гаркоме КПБ і райвыканкоме. У 1987—1997 гг. начальнік Магілёўскага абласнога ўпраўлення па фізічнай культуры, спорце і турызме. У маі 1997 г. выбраны віцэ-прэзідэнтам Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь (паўторна абраны на гэту пасаду ў лістападзе 2001), з чэрвеня 1997 г. памочнік Прэзідэнта

Рэспублікі Беларусь па пытаннях фізічнай культуры, спорту і развіцця турызму, з сакавіка 1998 г. міністр спорту і турызму Рэспублікі Беларусь. З 2000 г. намеснік начальніка Апарату Прадстаўніцтва Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі. З кастрычніка 2001 г. памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па пытаннях фізічнай культуры, спорту і развіцця турызму. Заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь.

ЗІНОЎСКІ Уладзімір Іванавіч, дзяржаўны дзеяч Рэспублікі Беларусь. Эканаміст. Нарадзіўся ў 1955 г. у р.п. Ялізава Асіповіцкага р-на. Закончыў Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі і Акадэмію кіравання пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь (1993).

У 1981—1986 гг. старшы інжынер Галоўнага ўпраўлення вылічальных работ ЦСУ БССР, старшы, затым вядучы спецыяліст упраўлення статыстыкі прамысловасці ЦСУ БССР, памочнік начальніка ЦСУ БССР. У 1986—1989 гг. намеснік начальніка Мінскага абласнога ўпраўлення статыстыкі. З 1989 г. у Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь — старшы рэферэнт, вядучы, потым галоўны спецыяліст упраўлення эканомікі. У 1992 — 1998 гг. першы намеснік старшыні Дзяржкамстата, першы намеснік міністра статыстыкі Рэспублікі Беларусь. З 1998 г. міністр статыстыкі Рэспублікі Беларусь. З 2001 г. міністр статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусь.

КЕДЗІЧ Юрый Канстанцінавіч. Нарадзіўся 15.3.1933 г. у в. Лочын Асіповіцкага р-на. Закончыў Мінскае вучылішча паліграфістаў (1950), Маскоўскі завочны паліграфічны інстытут (1965). Працаваў друкаром, майстрам, начальнікам цэха ў друкарні выдавецтва «Беларускі Дом друку». З 1974 г. інструктар ЦК КПБ, у 1982—1994 гг. намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта БССР па друку, потым — міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь. З яго ўдзелам распрацавана праграма пераходу на фотанабор і афсетны друк, пабудаваны газетныя выдавецтвы ў Віцебску, Гродне, Брэсце, Мінская фабрыка каляровага друку, Наваполацкая, Чэрвеньская, Жлобінская друкарні, рэканструяваны Мінская фабрыка «Чырвоная зорка», Аршанская і Гродзенская друкарні. Узначальваў навуковае таварыства выдаўцоў і паліграфістаў Беларусі, выбіраўся членам прэзідыума Беларускага рэспубліканскага прафсаюза работнікаў культуры.

У.І.Зіноўскі.

Ю.К.Кедзіч.

П.А.Лявіцкі.

ЛЯВІЦКІ Пётр Адамавіч. Партыйны і дзяржаўны дзеяч БССР. Нарадзіўся 26.8.1906 г. у в. Лазовае Асіповіцкага р-на. Закончыў Маскоўскую сельскагаспадарчую акадэмію (1935). З 1925 г. на савецкай рабоце ў Асіповіцкім р-не. У 1928—1931 гг. служыў у дывізіі Асобага прызначэння імя Дзяржынскага пры калегіі АДПУ. З 1936 г. дырэктар Мар'інагорскага сельскагаспадарчага тэхнікума. З 1939 г. загадчык аддзела, сакратар Мінскага, са студзеня 1941 г. 1-ы сакратар Палескага абкомаў КП(б)Б. У пачатку Айчыннай вайны адзін з арганізатараў партызанскага руху на Палессі. З кастрычніка 1941 г. сакратар Алтайскага крайкома ВКП(б). З лістапада 1942 г. у апараце ЦК ВКП(б). Са жніўня 1943 г. 1-ы сакратар Палескага абкома КП(б)Б, адначасова член ваеннага савета 61-й арміі. У 1944—1947 гг. 1-ы намеснік старшыні Савета Міністраў БССР. З 1947 г. начальнік Баранавіцкага абласнога ўпраўлення сельскай гаспадаркі, 1-ы намеснік

І.М.Стэльмах.

А.А.Чванкін.

У.А.Чоршы.

міністра сельскай гаспадаркі БССР. З 1956 г. 1-ы намеснік старшыні Савета Міністраў Літоўскай ССР. З 1959 г. намеснік старшыні, старшыня Магілёўскага аблвыканкома. У 1964—1966 гг. начальнік Галоўнага ўпраўлення меліярацыі і воднай гаспадаркі пры Савеце Міністраў БССР. Член ЦК КПБ у 1940—1949, 1960—1966 гг., член Бюро ЦК КП(б)Б у 1945—1947 гг., Бюро ЦК Кампартыі Літвы ў 1955—1959 гг. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР і намеснік старшыні Савета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Савета СССР у 1946—1950 гг., дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1947—1951, 1955—1963 гг. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 4 іншымі ордэнамі, медалямі. Памёр 24.11.1977 г.

СТЭЛЬМАХ Іван Макаравіч. Нарадзіўся ў 1912 г. у в. Лазовае Асіповіцкага р-на. Закончыў Свіслацкую сямігадовую школу. Працаваў у мясцовым калгасе, пасля службы ў Чырвонай арміі і вучобы ў Харкаўскай школе ўнутраных спраў — у органах дзяржбяспекі. Адзін з арганізатараў партызанскага руху на тэрыторыі Асіповіцкага раёна ў Вялікую Айчынную вайну. Пасля вайны працаваў у савецкіх органах рэспублікі. Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (тройчы), Магілёўскага і Гомельскага абласных Саветаў народных дэпутатаў. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга (двойчы), Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі (двойчы), медалямі. У 1982 г. прысвоена званне ганаровага грамадзяніна горада Асіповічы.

ЧВАНКІН Аркадзь Аркадзьевіч. Генерал-маёр унутранай службы. Нарадзіўся 18.3.1948 г. у г. Асіповічы. Закончыў Беларускі політэхнічны інстытут (1973). Працоўную дзейнасць пачаў у Асіповіцкім лакаматыўным дэпо Беларускай чыгункі. У 1975—1985 гг. галоўны інжынер Смалявіцкага міжсаўгасбуда, старшыня калоны № 99, намеснік старшыні праўлення Мінскага аблміжкалгасбуда. З 1985 г. на розных пасадах у органах унутраных спраў Беларусі. З 1996 г. выконваючы абавязкі намесніка міністра, з 1997 г. намеснік міністра ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны медалямі.

ЧОРНЫ Уладзімір Аляксеевіч. Нарадзіўся 24.2.1951 г. у в. Крамок Асіповіцкага р-на. Закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1978), БДУ (1992). У 1982—1990 гг. сакратар парткома саўгаса «Асіповіцкі», інструктар Асіповіцкага гаркома, Магілёўскага абкома, 2-і сакратар Клімавіцкага райкома КПБ. З 1990 г. на гаспадарчай рабоце ў Мінску. У 1995—1998 гг. саветнік-пасланнік Пасольства Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Малдова. З 1998 г. генеральны дырэктар Рэспубліканскага міжгаліновага навукова-вытворчага аб'яднання па эканамічнай і інвестыцыйнай дзейнасці «Белзнешгандальінвест».

СПАРТСМЕНЫ

БАРКОЎСКАЯ Ірына Ульянаўна. Беларуская спартсменка (планёрны спорт). Нарадзілася ў 1951 г. на ст. Ясень Асіповіцкага р-на. Чэмпіёнка БССР па планёрным спорце (1976), сярэбраны прызёр чэмпіянатаў СССР (1979) і Еўропы (1980), пераможца і прызёр шэрагу ўсесаюзных і міжнародных спаборніцтваў (1980—1990). Майстар спорту міжнароднага класа. Працуе лётчыкам-інструктарам аэраклуба г. Арол (Расія).

КУРЧЭЎСКІ Джан Аляксеевіч. Беларускі спартсмен (вольная барацьба, лёгкая

атлетыка, марафон). Заслужаны настаўнік Беларусі (1987). Нарадзіўся 12.4.1938 г. у г. Асіповічы. Закончыў Беларускі дзяржаўны інстытут фізічнай культуры (1960), Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут (1965). У 1960—1961 гг. працаваў у аддзеле фізкультуры і спорту Віцебскага абкома ЛКСМБ. З 1961 г. настаўнік гісторыі комплексу «Дзіцячы дом — СШ № 5» г. Асіповічы. Суддзя нацыянальнай катэгорыі па масавых відах спорту, старшыня клубаў аматараў бегу і скаўтаў «Кентаўр». Пераможца першынства БССР 1957 г. сярод студэнтаў і каманднага першынства БССР па вольнай барацьбе ў складзе каманды Мінска сярод юніёраў. Удзельнік міжнародных марафонаў у Англіі, Польшчы, Балгарыі, Маскве, Рызе, Мінску, Елгаве і інш. Узнагароджаны медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. Жыве ў Асіповічах.

СТАЛЬМАКОЎ Аляксандр Мікалаевіч. Беларускі спартсмен (веславанне на байдарках і каноэ). Нарадзіўся 18.7.1978 г. у р.п. Ялізава Асіповіцкага раёна. Закончыў Бабруйскае вучылішча алімпійскага рэзерву. Чэмпіён Рэспублікі Беларусь, двухразовы бронзавы прызёр Кубка свету; заняў 5-е месца на чэмпіянаце Еўропы. Член нацыянальнай каманды Беларусі. Майстар спорту. Жыве ў р.п. Ялізава.

СТАЛЫПІН Юрый Юр'евіч. Майстар спорту міжнароднага класа па стэндавай стральбе. Нарадзіўся 2.1.1961 г. у Асіповічах. У 1978 г. закончыў сярэднюю школу, у 1979 г. прызваны на службу ў армію, дзе праслужыў да 1995 г. у званні прапаршчыка. Быў членам зборных каманд Магілёўскай вобласці, Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі, БССР, Узброеных Сіл СССР, Савецкага Саюза. Сярэбраны прызёр чэмпіянату Еўропы 1996 г., чэмпіён Балтыйскіх гульняў 1997 г., 2-е месца ў розыгрышы Вялікага прыза Берліна і інш. У 2000 г. удзельнічаў у чэмпіянаце Еўропы ў Італіі, у спаборніцтвах Кубка свету ў Індыі і Егіпце, дзе заняў 5-е месца. Апошнія гады з'яўляецца пастаянным членам Нацыянальнай зборнай Рэспублікі Беларусь.

СУГАКА (ДАЦЭНКА) Надзея Уладзіміраўна. Беларуская спартсменка (акадэмічнае веславанне). Нарадзілася 9.2.1964 г. у в. Вярэйцы Асіповіцкага р-на. Вучылася ў школе алімпійскага рэзерву ў Магілёве.

І.У.Баркоўская.

Ю.Ю.Сталыпін.

Н.У.Сугака.

Закончыла Магілёўскі педагагічны інстытут (1990). З 1982 г. у зборнай камандзе Беларусі, з 1985 г. — Савецкага Саюза. Тройчы (1986, 1987, 1988) удзельнічала ў чэмпіянаце СССР. На чэмпіянаце свету ў Англіі (1986) заняла 4-е месца, у Данії (1987) стала бронзавым прызёрам, на Алімпійскіх гульнях у Сеуле (1988) заняла 4-е месца. Пераможца гульняў Добрай волі ў Маскве (1986). Майстар спорту міжнароднага класа. Жыве ў Кіеве.

ШПАКОЎСКІ Канстанцін Станіслававіч. Беларускі спартсмен (баскетбол). Нарадзіўся 22.7.1980 г. у г. Асіповічы. Ігрок баскетбольнага клуба «5х5» Асіповіцкага завода аўтаагрэгатаў. Чатырохразовы чэмпіён першынстваў Рэспублікі Беларусь сярод юнакоў, прызёр міжнародных турніраў у Францыі, Польшчы, Расіі, Украіне, Літве, удзельнік чэмпіянату Еўропы 1997 г. у Славеніі. Жыве ў Асіповічах.

ШЫРОКІ Дзяніс Ігаравіч. Беларускі спартсмен (баскетбол). Нарадзіўся 26.1.1980 г. у г. Асіповічы. Ігрок баскетбольнага клуба «5х5» Асіповіцкага завода аўтаагрэгатаў, член юнацкай зборнай

Рэспублікі Беларусь. Пераможца першынстваў Рэспублікі Беларусь 1993—1995 гг., неаднаразовы прызёр рэспубліканскіх першынстваў. Бронзавы прызёр міжнароднага турніру ў Францыі, удзельнік юнацкага чэмпіянату Еўропы 1997 г. Жыве ў Асіповічах.

ЭЛЕ Неаніла Іванаўна. Беларуская спартсменка (веславанне). Нарадзілася 21.1.1936 г. у г. Асіповічы. Заслужаны трэнер Беларусі. Суддзя нацыянальнай катэгорыі.

ЯНОЎСКІ Пётр Фёдаравіч. Беларускі спартсмен (веславанне на байдарках і каноэ, біятлон, лыжы). Нарадзіўся 20.1.1933 г. у в. Свіслач Асіповіцкага р-на. Закончыў Беларускі дзяржаўны інстытут фізічнай культуры (1967). Працаваў слесарам арцелі «Чырвоны металіст». З 1967 г. трэнер бабруйскай ДЮСШ № 1, у 1970—1986 гг. трэнер, старшыня гарсавета Добраахвотнага спартыўнага таварыства «Спартак». З 1986 г. старшы выкладчык па веславанні Бабруйскага вучылішча алімпійскага рэзерву. Майстар спорту міжнароднага класа па веславанні на байдарках і каноэ, майстар спорту СССР па лыжных гонках. Заслужаны трэнер Беларусі, суддзя рэспубліканскай катэгорыі. Быў старшынёй абласной федэрацыі па веславанні на байдарках і каноэ, членам прэзідыума Асацыяцыі каноэ Рэспублікі Беларусь. У 1975—1980 гг. выбіраўся дэпутатам гарадскога Савета. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі, знакам «Выдатнік народнай адукацыі БССР». Жыве ў Бабруйску.

ТВОРЦЫ

АСВЯЦІНСКІ Геральд Баляслававіч. Заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1968). Нарадзіўся 23.1.1932 г. у р.п. Ялізава Асіповіцкага р-на. Закончыў БДУ (1955), Дзяржаўны інстытут тэатральнага мастацтва імя Луначарскага ў Маскве (1965). Працаваў у Маладзечанскім абкоме камсамола (з 1955), Глыбоцкім райкоме камсамола (1-ы сакратар у 1957—1959), Гродзенскім аблвыканкоме (з 1960 намеснік начальніка ўпраўлення, начальнік аддзела культасветустаноў і мастацтва, з 1963 г. начальнік абласнога ўпраўлення культуры). У 1965—1993 гг. дырэктар Беларускага тэатра імя Я.Коласа, з 1994 г. — Беларускага тэатра «Лялька» (Віцебск).

А.І.Калядэнка.

ДАРАШКЕВІЧ Юрый Альфрэдавіч. Беларускі жывапісец. Нарадзіўся 11.1.1962 г. у г. Асіповічы. Вучыўся ў Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце. Працуе пераважна ў жанры станковага жывапісу. Аўтар размалёвак і вітражоў для мінскіх радыётэхнічнага каледжа і Суворaўскага вучылішча. У творах асобныя пластычныя вобразы ўключае ў вялікую паліграфічную прастору, выкарыстоўвае эфекты колераптычныя, унутранага свячэння, піктаграмы, геаметрызм. У 1988 г. афарміў спектакль «Цудоўная дудка» ў Гродзенскім тэатры лялек. Творы мастака знаходзяцца ў калекцыях і зборах у Іспаніі, Германіі, Расіі, краінах Балтыі, Польшчы, Англіі, Фінляндыі, Францыі.

КАМКОЎ Уладзімір Цярэнцьевіч. Беларускі артыст балета, педагог. Заслужаны артыст Беларусі (1980), народны артыст Беларусі (1984). Нарадзіўся 5.9.1950 г. у г. Асіповічы. Закончыў Беларускае харэаграфічнае вучылішча (1968). Працаваў у тэатрах оперы і балета Вільнюса і Харкава. У 1973—1995 гг. саліст Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі, адначасова ў 1981—1991 гг. выкладаў у харэаграфічным вучылішчы. Танец Камкова вызначаецца мужнасцю, энергіяй, пластычнай выразнасцю, яго індывідуальнасці найбольш блізкія партыі героіка-патрыятычнага плана. Майстэрства Камкова выявілася ў балетах, пастаўленых В.Елізар'евым. Сярод лепшых партый: Тыль і Інквізітар, Машэка і Князь («Тыль Уленшпігель» і «Курган» Я.Глебава), Спартак («Спартак» А.Хачатурана), Тыбальд («Рамэо і Джульета» С.Пракоф'ева), Хазэ («Кармэн-сюіта» Ж.Бізэ — Р.Шчадрына), Адам («Стварэнне свету» А.Пятрова); з іншых партый — Прынц, Ротбарт («Шчаўкунок», «Лебядзінае возера» П.Чайкоўскага), Альберт, Конрад («Жызэль», «Карсар» А.Адана), Кален («Ліза і Кален» Ф.Герольда), а таксама галоўныя партыі ў аднаактовых балетах «Фестываль кветак у Чэнзана» Э.Хельстэда, «Прывал кавалерыі» Г.Армсгеймера, «Адажыета» на музыку Г.Малера, «Камерная сюіта» на музыку Р.Шчадрына, «Вальпургіева ноч» Ш.Гуно, «Вясна свяшчэнная» І.Стравінскага.

КРУКОЎСКІ Уладзімір Якаўлевіч. Беларускі мастак-плакатыст. Член Бела-

рускага саюза мастакоў (1975) і Беларускага саюза журналістаў (1994). Нарадзіўся 6.3.1937 г. у г. Асіповічы. Закончыў Віцебскі педагагічны інстытут (1972). Удзельнік мастацкіх выставак з 1972 г. З 1979 г. мастацкі рэдактар часопіса «Маладосць», у 1982—1984 гг. — «Мастацтва Беларусі», бюлетэня «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі», у 1989—1998 гг. часопіса «Спадчына». Аўтар плакатаў: «Помнікі архітэктуры — нацыянальны скарб», «Памятай! Кожны чацвёрты загінуў!», «Назаўсёды ў памяці народа», «Раззбраенне!», «Сівая легенда», «Музей рамёстваў і народных промыслаў», «У бітвах за волю, у бітвах за долю!..», «120 гадоў «Мужыцкай праўдзе», «Максім Багдановіч. 1891—1981», «Што ж мы за людзі?», «Грунвальд»; трыпціхаў: «Дзень Ікс», «Міцкевіч. Колеры часу» і інш. Многія плакаты прысвечаны славутым дзеячам Беларусі: М.Гусоўскаму, Ф.Скарыну, В.Цяпінскаму, К.Каліноўскаму, Цётцы (А.Пашкевіч), Я.Купалу, Я.Коласу, І.Луцкевічу, Я.Драздовічу. З'яўляецца аўтарам (разам з Я.Куліком) эталона былога герба Рэспублікі Беларусь «Пагоня» (1991), публікацый па гісторыі беларускага мастацтва, грамадска-палітычнай тэматыкі (часопісы «Спадчына», «Наша вера», газеты «Наша ніва», «Літаратура і мастацтва»). Жыве ў Мінску.

ЛАМАНОВІЧ Ніна Іосіфаўна. Беларускі харавы дырыжор. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1999). Нарадзілася 27.8.1951 г. у в. Лапічы Асіповіцкага р-на. Закончыла Беларускую кансерваторыю (1977, клас А.Кагадзеева). З 1976 г. хормайстар, з 1991 г. галоўны хормайстар Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы Беларусі. Спектаклі, пастаўленыя з яе ўдзелам, вызначаюцца высокай якасцю харавога гучання: «Новая зямля» Ю.Семянякі, «Дзікае паляванне караля Стаха» У.Солтана, «Майстар і Маргарыта» Я.Глебава, «Князь Навагрудскі» А.Бандарэнкі, «Візіт дамы» С.Картэса, «Лэдзі Макбет Мцэнскага павета» Дз.Шастаковіча, «Князь Ігар» А.Барадзіна, «Барыс Гадуноў» М.Мусаргскага, «Рыгалета», «Набука», «Дон Карлас» Дж.Вердзі, «Паяцы» Р.Леанкавала, «Сельскі гонар» П.Масканьі, «Лючыя ды Ламермур» Г.Даніцэці, «Турандот» Дж.Пучыні, вакальна-харэаграфічнае прадстаўленне «Карміна Бурана» на музыку К.Орфа, балет «Страсці» А.Мдывані (харавы фінал). У рэпертуары Ламановіч таксама буйныя творы харавой класікі, у тым ліку Рэквіем Дж.Вердзі. Адна з арганізатараў (1990) Дзіцячага музычнага тэатра-студыі пры Нацыянальным тэатры оперы. Лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне» (1998).

У.Я.Крукоўскі.

Н.І.Ламановіч.

Плакат У.Я.Крукоўскага «Сівая легенда».

Т.Р.Раеўская.

А.І.Тоўкач.

ПАЎЛІКАВА (дзявочае ХЕЙДАРАВА) Людміла Фёдараўна. Беларуская паэтэса. Нарадзілася 11.2.1952 г. у р.п. Ялізава Асіповіцкага р-на ў сям'і рабочага. Л.Паўлікава ў 1969 г. закончыла Ялізаўскую СШ і паступіла ў БДУ на факультэт прыкладной матэматыкі. Закончыла універсітэт у 1974 г. Працавала старшым інжынерам Навукова-даследчага інстытута электронна-вылічальных машын у Мінску (з 1974), вядучым канструктарам Беларускага навукова-даследчага і праектна-тэхналагічнага інстытута арганізацыі і кіравання будаўніцтвам пры Дзяржбудзе БССР (з 1980), вядучым інжынерам Мінскага навукова-даследчага праектнага інстытута (з 1985). З 1988 г. рэдактар, з 1991 г. намеснік галоўнага рэдактара творчага аб'яднання літаратурна-мастацкіх і пастановачных праграм Беларускага тэлебачання. Першая публікацыя Л.Паўлікавай (падборка вершаў) з'явілася ў часопісе «Маладосць» у 1980 г., за якую ёй была прысуджана прэмія года. З таго часу вершы паэтэсы змяшчаюцца ў зборніку «Дзень паэзіі», часопісах «Полымя», «Вожык», «Работніца і сялянка», у рэспубліканскіх газетах. Аўтар кніг «Адведзіны рамонкавай паляны» (1985), «Тваё святло» (1988), «Купанне ў росах» (1992), драматычнай паэмы «Можна і нельга» (зборнік «І засталася каса ў пракосе», 1988). У часопісе «Маладосць» друкаваліся і яе апавяданні. Для вершаў паэтэсы характэрны роздум над праблемамі сучаснасці; у іх пераважаюць урбаністычныя матывы, тэма гарадскога жыцця. Ёй уласцівы творчая актыўнасць, своеасаблівасць паэтычнага голасу, канкрэтнасць вобразнага мыслення, шчырасць, традыцыйная манера пісьма. Жыве ў Мінску.

Л.М.Гарэлік.

РАЕЎСКАЯ Тамара Рыгораўна. Беларуская эстрадная спявачка. Заслужаная артыстка Беларусі (1974). Нарадзілася 27.5.1940 г. у г. Асіповічы. Закончыла Мінскае музычнае вучылішча (1971). З 1963 г. салістка Дзяржтэлерадыё Беларусі. Аснову рэпертуару Т.Р.Раеўскай, у якім больш за 200 песень, складаюць творы беларускіх кампазітараў. Першая выканаўца многіх песень Я.Глебава, І.Лучанка, Ю.Семянякі, В.Войціка, Э.Ханка, У.Будніка, Л.Абеліёвіча, Г.Вагнера, У.Дарохіна, Э.Зарыцкага, Л.Захлеўнага, У.Прохарава. Выканальніцкай манеры спявачкі ўласцівы лірычная задушэўнасць, мяккасць, цеплыня, пранікнёнасць. Т.Р.Раеўская — вядучая перадачы рэспубліканскага радыё «Матчына песня».

ТОЎКАЧ Анатоль Іларыёнавіч. Беларускі жывапісец. Член Беларускага саюза мастакоў (1964). Нарадзіўся 10.6.1929 г. у

Блакітны край. А.Тоўкач.

в. Засялечча Асіповіцкага р-на. Закончыў Кастрамское мастацкае вучылішча (1956). У мастацкіх выстаўках удзельнічае з 1957 г. Працуе ў станковым жывапісе ў жанрах пейзажу і карціны, а таксама ў акварэлі і гуашы. Лепшым творам уласцівы выразная дынамічная кампазіцыя, лаканізм, цэласнасць каларыту. Аўтар пейзажаў «Віцебская суднаверф» (1960), «Родны край» (1961), «Горад жыве» (1962), «Лес — новабудоўлям» (1963), «Дуброўна» (1979), «Гарадскі пасёлак Коханава» (1982), «Ходцы», «Талачын» (1985), трыпціха «Віцебск. Лета» (1978) і інш., цыкла твораў на ваенную тэму — «Ракетадром», «Начны дазор» і «Дэсантнікі» (1965), «Трывога» (1968; усе гуаш, тэмпера), сюжэтных карцін «Першы агітпоезд» (1964), «Гэтых дзён не змоўкне слава» (1967), «Салдаты» (1975), «Першы трактар» (1981), «Подзвіг» (1983), «Год 1945» (1985) і інш. Творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, фондах Беларускага саюза мастакоў, Віцебскім абласным краязнаўчым музеі. Жыве ў Віцебску.

М.А.Гугнін.

ШЫШКАВЕЦ Віктар Іванавіч. Самадзейны кампазітар, арганізатар народнай музычнай творчасці. Нарадзіўся 24.8.1945 г. у г. Асіповічы. Пасля заканчэння ў 1960 г. сярэдняй школы № 1 працаваў акампаніятарам у клубе чыгуначнай станцыі Асіповічы. Скончыў Магілёўскае музычнае вучылішча. З 1971 г. працаваў кіраўніком музычных і харавых калектываў Асіповіцкага раёна. У 1968 г. у складзе народнага цымбальнага аркестра стаў лаўрэатам ВДНГ СССР.

За дзесяцігоддзі кампазітарскай дзейнасці Шышкаўцом створана шмат песень, каля 50 з іх выконваюцца раённымі мастацкімі калектывамі і спевакамі-салістамі. А самае галоўнае — творы кампазітара заўсёды знаходзяць водгук у сэрцах людзей. Поспех у творчасці не прыйшоў сам па сабе. Ствараць песні, сапраўды патрэбныя чалавеку, справа цяжкая.

В.І.Шышкавец.

За гады працы Віктар Іванавіч напісаў нямала песень на вершы вядомых паэтаў — Анатоля Дзеружынскага, Алеся Бачылы, Канстанціна Жукава, Ігара Шаферана, выкарыстоўваў і творчасць аматараў вершаванага радка. Сустрэча з асіповіцкай паэтэсай Святланай Грыцко парадзіла адну з лепшых песень кампазітара «Мой родны край». Найбольш удалым Шышкавец лічыць супрацоўніцтва з Анатолем Тамашэўскім — рэдактарам асіповіцкай раённай газеты.

Віктар Шышкавец вядомы ў культурным асяроддзі Асіповіччыны як выдатны арганізатар народнай музычнай творчасці. Менавіта з яго дапамогай як канцэртмайстра дасягаюць творчых поспехаў хор ветэранаў і народны ансамбль «Вечарынка» — самабытныя музычныя калектывы раёна. І, зразумела, Віктар Іванавіч працягвае працаваць над новымі песнямі, бо музыка для яго — гэта само жыццё.

Дз.В.Саўрыцкі.

Адмірал з Лапіч

«Ён бязмежна любіў флот і аддаў яму ўсё жыццё» — так напісаў пра нашага земляка контр-адмірала Мікалая Піліпавіча Зайца галоўнакамандуючы ВМФ, адмірал флоту СССР М.Г.Кузняцоў у сваёй кнізе ўспамінаў «Напярэдадні» (1969).

Мікалай Піліпавіч Заяц нарадзіўся ў снежні 1885 г. у в. Лапічы Асіповіцкага раёна. З 1908 г. ён матрос Балтыйскага флоту. Удзельнічаў у 1-й сусветнай вайне ў якасці артылерыйскага старшыны, кананіра на крэйсеры «Асілак» (1914—1917). Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. камандаваў канонерскай лодкай «Чырвоны Сцяг». У гады Грамадзянскай вайны, у лютым — маі 1918 г., удзельнічаў у Ля-

довым паходзе па перабазіраванні караблёў Балтыйскага флоту з Рэвеля (Таліна) і Гельсінгфорса (Хельсінкі) у Кранштат, потым камандаваў батарэяй форта «Чырванафлоцкі» ў Шлісельбургскай крэпасці. У 1925 г. М.П.Заяц закончыў Вышэйшыя камандныя курсы. Ён быў камандзірам «пераходнага перыяду», калі старых афіцэраў, якія валодалі дастатковымі ведамі, на флоце было мала, а новых, выхадцаў з народу, якія атрымалі добрую ваенна-марскую адукацыю, яшчэ не хапала. Заяц камандаваў крэйсерам «Вароўскі», эсмінцам «Ленін». З Балтыкі быў пераведзены ў 1932 г. на пасаду камандзіра крэйсера «Чырвоны Каўказ» на Чорнае мора.

Мікалай Піліпавіч поўнасцю апраўдаў гэты давер. У 1932—1935 гг. карабель быў лепшым на Чарнаморскім флоце. Да нашага часу з пакалення ў пакаленне маракоў перадаюцца простыя і мудрыя парады нашага земляка: «Ад лішняга даклада бяды не будзе, а ад позняга можа здарыцца непрыемнасць», «Лепш сыграць тры памылковыя трывогі, чым праваронiць адну сапраўдную», «Вось выйдзем у мора, тады ўсё стане на сваё месца» і інш.

Старшым памочнікам камандзіра крэйсера «Чырвоны Каўказ» быў будучы нарком ВМФ СССР М.Г.Кузняцоў. Успамінаючы тыя гады, ён пісаў: «Арганізацыю і баявую падрыхтоўку Заяц цалкам даручыў мне, свайму старшаму памочніку. Камандзір даў мне большую самастойнасць. Сам ён... не ўмешваўся ў дробязі паўсядзённага жыцця».

У 1933 г. крэйсер наведаў Турцыю, Грэцыю, Італію. У 1939 г. «Чырвоны Каўказ» быў прызнаны лепшым караблём Ваенна-марскога флоту СССР.

У 1940 г. у ліку першых звання «контр-адмірал» быў удастоены і Мікалай Піліпавіч Заяц. Ён камандаваў брыгадай крэйсераў.

Вялікую Айчынную вайну наш зямляк сустрэў на пасадзе намесніка камандуючага Чарнаморскім флотам па тыле. З 1941 г. ён старшыня камітэта па абароне Севастопаля. Адэскі і Севастопальскі абарончыя раёны забяспечваў усім неабходным тыл Чарнаморскага флоту пад кіраўніцтвам М.П.Зайца (боепрыпасамі і прадуктамі харчавання, гаруча-змазачнымі і рамонтнымі матэрыяламі). Кіраўніцтва тылам ажыццяўлялася з г. Туапсэ, дзе знаходзіўся штаб флоту.

З красавіка 1942 г. у ліку першых на флоце крэйсер «Чырвоны Каўказ» стаў гвардзейскім. У гэтым была і заслуга былога камандзіра.

Са жніўня 1942 г. і да канца вайны М.П.Заяц працаваў старшынёй пастаяннай прыёмнай камісіі караблёў пры Наркамаце Ваенна-марскога флоту СССР.

Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, трыма ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Нахімава I ступені, многімі медалямі. Памёр М.П.Заяц 16.12.1949 г.

Б.Дз.Далгатовіч.

«Шпак — фамилия генеральская»

З нарыса В.Перзашкевіча, надрукаванага ў газеце «Рэспубліка» 23 і 27 снежня 2000 г.

Их три брата. Старший, Георгий, генерал-полковник, командующий Воздушно-десантными войсками России. Без его бойцов не обходится ни одна «горячая» точка. Зачастую и за пределами страны. Но, несмотря на самое высокое среди братьев воинское звание и старшинство по возрасту, Георгий Иванович считает главным из троих среднего брата, Николая. Он, дескать, у них несомненный лидер, центр притяжения, его мнение в семейных делах наиболее весомо. Разделяет эту точку зрения и самый младший, Валерий, генерал-майор, военный комиссар Ростовской области. Все они очень дружны, очень гордятся и дорожат друг другом.

Вообще-то все трое должны были стать железнодорожниками. И не только потому, что их дед еще в двадцатые годы работал составителем поездов, а у отца вся трудовая жизнь прошла в локомотивном депо на станции Осиповичи. Здесь он был машинистом паровоза, диспетчером, работал на других должностях. В Осиповичах родились все его сыновья.

У первых двух — Георгия и Николая — разница в возрасте в один год и четыре месяца. Учились с разницей в один класс,

да и в своих играх, интересах, увлечениях не очень расходились.

В те годы послевоенной разрухи всем жилось тяжело. Семья Шпаков не была исключением. Был у них маленький домик, а при нем 20 соток земли. Вот с этого огорода и жили.

— В детстве, — вспоминает Николай Иванович, — хоть и крутились тогда мать и отец как белка в колесе с утра до вечера и дома, и на работе, а жили все равно бедно, вечно недоедали. Время было такое...

Едва Георгий закончил восемь классов, а Николай — семь, отец повез сразу обоих в Минск, в железнодорожное училище. Ребята не возражали. Оба очень хотели стать железнодорожниками. И страшно завидовали отцу, когда он поднимался на паровоз.

Но приняли тогда на учебу только старшего, Георгия. Того самого, который сейчас генерал-полковник. Дело все в том, что учиться нужно было два года. Старшему в момент поступления уже было больше 16 лет, и, стало быть, после окончания училища он мог работать на железной дороге. А вот младшему — только 15 с половиной, и значит, ему ничего не светило. В общем, пришлось Николаю вернуться домой и пойти в восьмой класс. Но на следующий год его мечта все-таки сбылась.

Вскоре после войны в Осиповичах появился большой военный гарнизон. Так местные жители поближе познакомились с новой для них социальной «прослойкой», бытом, укладом, поведением людей в военной форме. А после войны, после победы над фашизмом, как мы знаем, авторитет армии был очень высок.

С большим уважением относился к ним и Иван Антонович Шпак, сам бывший фронтовик. И когда подрос третий, самый младший сын Валерий, решил, что неплохо бы стать ему офицером. Поэтому, когда сын закончил четвертый класс, отдал его в Минское суворовское училище. Так самый младший из братьев Шпаков, будущих генералов, первым встал на военную стезю.

Еще через год старший, Георгий, заканчивает железнодорожное училище, получает направление в локомотивное депо Полоцк и становится там слесарем по ремонту паровозов. Но едва поработал два месяца, его пригласили как призывника в военкомат и предложили поступать в Рязанское военное воздушно-десантное училище.

Г.И.Шпак.

Сказал об этом отцу. А тот даже несколько неожиданно для Георгия вдруг заявил:

— Соглашайся. Ты же видел, как достойно себя ведут офицеры, как гордятся своей службой.

Сын последовал совету отца. Сдал все вступительные экзамены на «отлично» и стал курсантом. Кстати, где бы потом ни учился Георгий Иванович, он везде сдавал все экзамены только так и не иначе.

А еще через год закончил железнодорожное училище Николай. И с тех пор каждый из трех братьев пошел дальше своей дорогой. Впрочем, дальнейшая судьба каждого из них — это отдельный рассказ.

Рязанское училище ВДВ Георгий Шпак закончил с отличием. И остался там сначала командиром взвода курсантов, а потом стал преподавателем на кафедре тактики. Но вскоре подал рапорт с просьбой направить в войска.

Прослужил два года командиром батальона, поступил в Военную академию имени М.Фрунзе. Здесь он получил очередную свою золотую медаль и назначение командиром полка в родную Беларусь, в 103-ю Витебскую дивизию ВДВ. А через полтора года началась заваруха в Афганистане, и Георгий Шпак оказался в числе самых первых воинов-интернационалистов.

Воевал в Афгане почти два года. Не раз во время многочисленных рейдов по горам и долинам попадал со своими бойцами и в засады, и под жесточайшие обстрелы. В его полку погибло 65 человек. Но сам он не был ни разу даже легко ранен. Что это? Судьба, невероятное везение или все-таки умение воевать?

Прежде чем ответить на этот вопрос, Георгий Иванович глубоко задумался. А потом сказал:

— Наверное, тут есть все. Конечно, родился в рубашке. С другой стороны, командир полка ведь не бегал впереди всех. Например, в горах моя ячейка управления находилась в середине колонны. А значит, вероятность погибнуть у меня была меньше. Но в то же время почти всегда находившийся недалеко от меня начальник штаба полка майор Иванов погиб. И естественно, больше всего мы потеряли своих ребят ранеными и убитыми в первые дни и месяцы той войны. Не было опыта, все постигали за счет крови солдат и офицеров. А когда кое-чему научились, потери резко пошли на убыль. Помню, как-то попали под кинжальный огонь противника. Но не растерялись, все как один прыгнули в ледяную воду горной речки, чтобы выйти из-под обстрела. Тогда только один человек был легко ранен.

А вообще, в Афганистане выживали только физически сильные люди. У таких обычно и моральный дух выше. Так, впрочем, и везде, но в афганской войне особенно. Мы ведь совершали рейды в горах в страшную жару, порой надолго оставались без воды. Ноги в сапогах сбиты в кровь. Некоторые падали, теряли сознание. Те, у кого оставались силы, несли на руках обессилевших воинов, а также их амуницию и оружие. И это при том, что отбор в наш род войск всегда был особый. Вот почему физической подготовке мы уделяли главное внимание. Бывало, если уходим в рейд на 20—30 дней, обязательно берем с собой перекладину, или, говоря попросту, турник. А если становились лагерем, даже кроссы бегали в горах.

Генерал-полковнику Шпаку 57 лет. Но у него по-прежнему строгий солдатский режим. Подъем в шесть утра. Затем до семи зарядка на открытом воздухе с хорошими пробежками и непременным купанием в Москва-реке. Круглый год. А если в командировке, то, как он говорит, в «любой луже». А по словам брата Николая, Георгий и сейчас может выделывать на турнике такое, что не под силу многим молодым лейтенантам.

Но тот же Николай Иванович свидетельствует, что из Афганистана старший брат вернулся совсем седым. «Стал каким-то замкнутым, угрюмым, нервным. Два года не хотел нам ничего рассказывать. Да и запрещали ведь тогда. И только потом понемногу начал отходить. Но всякий раз, когда говорил о гибели своих товарищей, в глазах у него стояли слезы».

В Афганистане Георгий Иванович был удостоен ордена Красного Знамени, других наград.

А закончив здесь службу, Георгий Шпак был два года начальником штаба дивизии в Каунасе, затем четыре года комдивом в Пскове. Потом снова учеба, теперь уже в Академии Генштаба. Затем заместитель командующего небезызвестной 14-й Тираспольской армии и командарм в Петрозаводске. Следующий этап — начальник штаба Туркестанского военного округа (вот она — судьба военного!). Здесь Георгий Иванович подписывает документ о ликвидации округа в связи с распадом СССР, а сам переезжает в Самару и занимает такую же должность в Приволжском военном округе. Там он и служил до назначения в Москву командующим ВДВ России.

Впрочем, туркестанский и самарский периоды жизни Георгия Ивановича — тоже особая веха в его судьбе. Здесь у него появилось, как он сам выразился, «маленькое хобби». Вот как он рассказывает об этом.

— В 1992 году я познакомился с ребятами, которые служили и работали в Казани, где очень сильный педагогический университет. Все они увлеклись педагогической наукой. И так интересно и упоенно об этом рассказывали, так уговаривали последовать их примеру, что я не удержался. Начал собирать литературу, ездить на консультации и потихоньку писать кандидатскую диссертацию. Рабочий день заканчивался в 19 часов, а я сидел до 21—22 и клепал свою научную работу. Выходные дни тоже прихватывал. В общем, в апреле 1994 года диссертация была подготовлена, успешно защищена, и я стал кандидатом педагогических наук. Потом мои научные руководители и коллеги уговорили взяться и за докторскую: дескать, сказал «а», надо говорить и «б».

За время подготовки обеих диссертаций и уже после их защиты, конечно же, я перевернул горы литературы по военной педагогике, вел переписку со многими учеными, сам написал более 10 книг, сотни статей. Вместе с коллегами-учеными мы

сделали две учебные программы по подготовке офицеров для наших десантных училищ...

...Сын Георгия Ивановича тоже пошел по отцовской стезе.

После окончания училища он служил в Ульяновске. В том самом Приволжском округе, где начальником штаба был его отец. И в том самом, откуда, по очереди сменяя друг друга, на три или шесть месяцев отправлялись десантники в 1995 году воевать в Чечню. Вскоре подошел черед и старшего лейтенанта Олега Шпака. Он тогда был командиром взвода. А в последний день своего пребывания получил задание отправиться в рейд, во время которого его БМД (боевая машина десанта) подорвалась на мине и Олег погиб.

Буквально за несколько дней до того прилетел в Чечню в командировку Георгий Иванович. Конечно, встретился с сыном, поговорили о доме, о службе и о многом другом. А улетая, увидел с вертолета, как машет ему рукой Олег, и почему-то екнуло у генерала сердце, подумал вдруг, что видит его в последний раз...

Страшное это было горе для всех Шпаков. У братьев Георгия Ивановича тоже ведь уже были свои дети. Но действительно ли не мог тогдашний начальник штаба округа Георгий Шпак уберечь своего сына-лейтенанта, предотвратить его отправку в Чечню? Конечно же, мог. Его высокая должность позволяла это сделать. Но ведь есть еще такие понятия, как долг, честь, совесть...

— Вопрос так никогда не стоял, — говорит Георгий Иванович. — Сын меня даже предупреждал: «Не вздумай звонить кому-то и отменять мою поездку». Да я и сам на это никогда бы не пошел. Во-первых, меня бы сослуживцы не поняли. А во-вторых, и ему бы нигде в войсках жизни не было. Вы только представьте себе: весь полк побывал в том пекле, не все оттуда вернулись живыми, а сын начальника штаба округа отсидится в тихом безопасном месте. Да это просто немыслимо! Вот почему, когда подошла его очередь и мне его комдив позвонил и спросил, отправлять или нет, я без колебаний дал утвердительный ответ.

Олега похоронили в Самаре, где служил тогда отец и куда он твердо намерен вернуться из Москвы после окончания военной службы...

Средний из братьев Шпаков, Николай, не стал военным. Тем не менее он тоже генерал. И форма у него по железнодорожным меркам генеральская. В подчинении у Николая Ивановича до последнего места работы была 21 тысяча человек, 60 крупных станций и 28 предприятий. Это когда он был начальником Барановичского отделения Белорусской железной дороги, в состав которого территориально входит часть Брестской и Минской областей, а также почти вся Гродненская. Сейчас Николай Иванович — член комитета международной организации сотрудничества железных дорог, в которую входят представители стальных магистралей 25 государств, включая все страны СНГ и Балтии, некоторые государства Восточной Европы, а также Китай, Вьетнам, КНДР, Монголию и Иран. Николай Иванович является здесь полномочным представителем Белорусской, а по совместительству выполняет аналогичную функцию при администрации Польских железных дорог. Местом его работы вот уже седьмой год является Варшава.

Самый младший из братьев, Валерий, считает, что Николай тоже обязательно стал бы кадровым военным, если бы во время учебы в железнодорожном училище с ним не случилось ЧП.

В свое время его левая рука попала под зубья пилорамы, которая покорежила сразу три пальца. Естественно, о службе в армии уже не могло быть и речи. Но самое ужасное заключалось в том, что с таким увечьем не только в машинисты, но даже в кочегары на паровоз брать было запрещено. А ведь он бредил этой профессией с самых малых лет.

— Я все время завидовал отцу, когда он находился на паровозе, — вспоминает Николай Иванович. — А когда брал меня в кабину, у меня аж дух захватывало. И после того, как я сам стал машинистом, очень нравилось ездить. Люблю скорость...

Полученная травма не помешала Николаю осуществить свою мечту. Он сумел так натренировать свою покалеченную кисть, что мог делать ею абсолютно все то же, что и здоровой рукой. Например, открутить и закрутить любую гайку в самом труднодоступном и неудобном месте. А еще ловко научился не демонстрировать свой дефект врачам во время прохождения медкомиссий.

Объективные же показатели, например

при испытании силомером, у него были даже выше, чем у других, на обеих руках.

За годы работы машинистом бывало, конечно, всякое. Приходилось и доказывать свою физическую и профессиональную полноценность в ответ на кляузы разного рода «доброжелателей», попадать во время рейсов в сложные ситуации, осваивать скоростное движение, новые виды локомотивов, водить и грузовые, и пассажирские поезда. Есть, конечно, и особенно приятные воспоминания.

Например, когда и он, и отец одновременно работали машинистами. И даже несколько раз встречались в пути. Из Осиповичей в сторону Минска сначала идет шестикилометровый трехпутный участок. Потом одна колея уходит на север, на Гродзянку. Так вот на нее и сворачивал отец на своем паровозе. Но до этого, если сын ехал в то же время из Минска в Осиповичи (вел дизель-поезд), на той трехпутке они встречались. Естественно, приветствовали друг друга гудками, махали рукой. Случалось это, правда, редко, но обоим были особенно приятны такие встречи в пути.

Николай женился, заочно окончил в Гомеле институт инженеров железнодорожного транспорта, хотя давалось это очень нелегко, получил первый класс.

Огромный опыт машиниста, инженерная подготовка, как и следовало ожидать, принесли свои плоды.

Его направили на три года в Монголию машинистом-инструктором. Здесь получил звание «Почетный железнодорожник».

После возвращения домой еще недолго поработал машинистом, а затем его позвали сначала в аппарат столичного отделения дороги заместителем начальника локомотивного отдела, а потом уже в управление всей магистрали старшим ревизором локомотивной службы.

Однако через три с лишним года Николай Иванович снова вернулся в родной деповский коллектив. Но уже в совершенно ином качестве.

Было это в 1988 году, в самый разгар перестройки. Одним из проявлений той поры были выборы руководителей предприятий непосредственно трудовыми коллективами, а не назначение их сверху. Кто-то из управления дороги посоветовал Николаю Ивановичу выставить и свою кандидатуру. Как-никак, его там знали еще пацаном. И, судя по всему, память о нем осталась добрая. Иначе бы из пяти претендентов на «престол» ему бы не отдали предпочтение 806 человек из 960 голосовавших.

Депо это островного типа, находится далеко от городских магазинов, предприятий службы быта. Новый руководитель депо сначала присмотрел подходящее место в бывшем доме отдыха локомотивных бригад, потом посоветовался с начальником отделения, и оборудовали там «стол заказов» (тогда это было модно) и магазин на 210 квадратных метров.

Потом появились своя химчистка и прачечная. А следом и обувная мастерская. В итоге железнодорожники, приходя на работу, стали сдавать свои вещи в стирку или в химчистку, а обувь — в ремонт, а вечером по пути домой забирать. И у них отпала необходимость мотаться по магазинам, домам быта после работы, стоять там в длинных очередях и появилась возможность использовать это время гораздо интереснее и полезнее для себя и для семьи. Удалось тогда решить и другие социально-бытовые проблемы и тем самым облегчить жизнь работников депо.

«За кадром» остались бесконечные сомнения и тревоги, стычки с различного рода перестраховщиками, инспекторами сверху, конфликты с лодырями и пьяницами, которые есть в любом производственном коллективе. Но все-таки начальство, видимо, заметило в нем главное: хозяйскую хватку, смелость и расчетливость в принятии решений и доверило ему «генеральскую» должность — начальника Барановичского отделения Белорусской железной дороги.

А еще ему было поручено вести строительство самого современного и крупного на дороге санатория-профилактория. На этих объектах, как водится у нас, он набил немало шишек, заплатил немало штрафов, в том числе и из собственного кармана. Закончить стройку он не успел, хотя дело при нем продвигалось неплохо и претензий к нему руководство магистрали особых не предъявляло. Как, впрочем, и за выполнение отделением своих главных железнодорожных задач.

Случилось так, что на втором году работы на этом посту тогдашний начальник дороги Степан Шкапич, зная, что Николай

Шпак бывал в Монголии, предложил ему поехать туда вместе с ним на созываемую там очередную конференцию глав железнодорожных администраций стран ОСЖД. Там, кстати, состоялось тогда официальное вступление Беларуси в эту компанию.

А через два с лишним года должность члена комитета этой международной организации от нашей страны оказалась вакантной. Николаю Шпаку предложили занять освободившееся место. С тех пор Николай Иванович и работает в Варшаве, ...в комиссии по маркетингу и тарифной политике. А есть еще правовая, эксплуатационная, техническая и другие. В каждой из них состоит по нескольку человек из разных стран. И выполняют они задания своих железнодорожных администраций. Все работают в тесном контакте, постоянно обмениваются мнениями, вместе готовят проекты документов к очередному совещанию руководителей или конференции генеральных директоров. Одна из главных задач — разработка оптимальных железнодорожных коридоров из Азии в Европу, а также всемерное содействие развитию скоростного движения поездов.

— Николай Иванович, вы в Варшаве «отбываете» уже второй срок. Это означает, что руководство Белорусской дороги удовлетворяет ваша работа. Но сами вы как себя здесь чувствуете? Не скучаете по родным местам, близким людям? У вас ведь только дочка Таня живет здесь с вами и учится в школе, а двое сыновей — в Минске. Им, наверное, сложно приехать сюда?

— Вот тут у меня как раз проблем нет. Каждую неделю в выходные дни я при желании могу съездить к себе домой в Барановичи, где у меня свой домик с приусадебным участком. В теплое время года мы с женой и дочкой так и делаем. И даже выращиваем там кое-что на огороде. Благо проезд по железной дороге у меня бесплатный. Да и времени на дорогу уходит всего 4—5 часов.

В Варшаву сыновья добираются также просто. Даже электрички ходят. Но у каждого свои дела, свои заботы. Старший сын, Сергей, служит в спецподразделении госавтоинспекции МВД «Стрела». Оно предназначено для сопровождения главы государства. Он заместитель командира, старший лейтенант. Младший, Юрий, работает в республиканской прокуратуре. Сыновья решили идти своим путем. Ну что ж, это их собственный выбор.

Нет-нет да наезжают в Барановичи и братья. Им, конечно, намного сложней. Но все-таки как минимум раз в год во время отпуска, а то и два, если подворачивается какая-то оказия.

Приходится встречаться и по печальным поводам. Сначала умер отец. С войны он принес туберкулез, но мать его вроде выходила. А потом новая напасть — рак. И сгорел.

Потом умерла и мать. Похоронили сыновья ее, погоревали и опять разъехались.

...Младший из братьев Шпаков после окончания Минского суворовского училища, а затем Московского общевойскового только пять лет прослужил в Группе советских войск в Германии. А все остальное время — на Урале, на Дальнем Востоке и на Севере. Из них четыре года на Чукотке, в районе Анадыря, где восемь месяцев зима, один месяц весны и один осени. И только два — лета. Да еще и дивизия его стояла не в самом городе, а в ущелье, среди сопок, где снег не успевал таять даже летом и дети катались на санках круглый год. А один полк находился вообще в 500 километрах, на берегу бухты Провидения.

Когда Валерий Иванович был еще командиром полка, перед ним была поставлена задача погрузить два батальона вместе с техникой в эшелон и «у самой дальней гавани Союза», в порту Ванино, переправиться на пароме на Сахалин. А там тем же эшелоном добраться до центра острова, оттуда опять же вместе с техникой совершить 52-километровый марш-бросок через горный перевал, где только мощные лесовозы могут проползти, выйти на западную окраину Сахалина и «занять там оборону». До того в военной практике никто не совершал в этих местах подобного рейда. (Чем не переход Суворова через Альпы?) Не случайно этот поход контролировало командование не только из Хабаровска, но и из Москвы. Километраж, скорость движения, продолжительность привалов — все тщательно хронометрировалось.

Тяжелый и опасный это был поход и для солдат, и для офицеров, и для самого командира полка. В один момент у него, что называется, сердце оборвалось. Это когда не очень опытный водитель боевой машины пехоты вдруг почему-то нажал на газ в самом неподходящем месте и машина

полетела вместе с десятью бойцами в полуторакилометровую пропасть. Но, как говорит Валерий Иванович, он сам и те десять парней родились, видно, под счастливой звездой. Через несколько секунд после начала падения БМП на ее пути оказалась сосна диаметром в 70 сантиметров. Она и спасла людей. Ну а дальше все прошло благополучно.

День нашей встречи с Валерием Ивановичем в Волгограде, где он тогда командовал мотострелковой дивизией и был начальником местного военного гарнизона, оказался его последним рабочим днем перед уходом в отпуск. В тот же вечер он с женой и 13-летней дочерью Ларисой улетал в Биробиджан на свадьбу сына Сергея, который остался там, где служил раньше отец.

— Вообще-то, я им доволен, — рассказывал Валерий Иванович. — Полтора года назад сын закончил в Хабаровске высшую школу милиции и стал работать районным инспектором уголовного розыска. А вот четыре дня назад сообщил, что его назначили заместителем начальника УГРО города. На мой-то взгляд, ему еще рановато на такую должность, но его начальству, наверное, виднее. Да и насколько я знаю, он в своем районе действительно кое-чего добился. Раскрываемость преступлений довел до 83 процентов, а это очень хороший показатель. Словом, своим горбом заработал повышение. Мне это, конечно, приятно. И у Николая сыновья не ноют, не скулят, не клянчат у отца ничего, а трудятся в поте лица, потому уже и на ответственных должностях. А дочку Георгия как любят и уважают в части, где она служит!

Последний перед отпуском рабочий день был расписан у Валерия Ивановича буквально по минутам. Даже поговорить с ним удалось в основном в кабине «газика» по дороге на учебный полигон. С гордостью он показывал здесь новые, построенные уже под его руководством солдатские казармы и учебный центр. Велел разбить вокруг цветники и хорошенько ухаживать за ними, чтобы приятно было солдатам здесь находиться. Не преминул показать, когда проезжали мимо одной из его воинских частей, не совсем обычные вышки для часовых. И при этом пояснил, что они высотой не четыре метра, как положено по уставу, а двенадцать. В них часовой и видит все лучше, и ничего не боится. А позаимствовал он их у железнодорожников. «Даром, что ли, я родился на станции?»

О многом мы успели тогда поговорить. И о проблемах старения боевой техники в армии, и о причинах «дедовщины», и об отношении государства к своим Вооруженным силам (а оно известно какое!), и о бытовых неурядицах военнослужащих, о нехватке хороших офицерских кадров. А когда уже расставались в его служебном кабинете, я напомнил ему слова известной веселой песенки, в которой поется о том, «как хорошо быть генералом». И спросил, согласен ли он с таким утверждением. Валерий Иванович ответил так:

— Генералом быть, конечно, приятно, что греха таить. Приятно и в форме появиться на людях — на тебя смотрят тогда совсем по-другому. И это нормально — человек же должен к чему-то стремиться. А уважение людей — это прежде всего признание и понимание того, что ты сам своим упорством и трудом добился такого звания и положения в обществе. Но поверьте, очень нелегко стать генералом. Наш отец всегда говорил: «Работайте, трудитесь, выполняйте как следует свои обязанности, и вас обязательно заметят, продвинут по службе». Так мы с братьями и поступаем.

Яны кіравалі горадам і раёнам

СТАРШЫНІ ГАРВЫКАНКОМА

ЗОРЫН Уладзімір Паўлавіч. Нарадзіўся 24.2.1909 г. у с. Шурма Уржумскага р-на Кіраўскай вобл., Расія. Закончыў курсы пры Вышэйшай школе МДБ СССР (1948). Падпалкоўнік дзяржбяспекі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1944—1958 гг. начальнік раённых аддзелаў дзяржбяспекі Брагіна, Глуска, Слуцка, Асіповіч, Быхава. У 1959—1963 гг. старшыня Асіповіцкага гарвыканкома раённага падпарадкавання. З 1963 г. начальнік штаба грамадзянскай абароны г. Асіповічы, у 1969—1976 гг. старшыня райкома прафсаюзаў работнікаў дзяржаўных устаноў Асіповіцкага р-на. Узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

КАВАЛЁЎ Уладзімір Іванавіч. Нарадзіўся 10.12.1933 г. у в. Залатва Быхаўскага р-на. Закончыў Беларускі політэхнічны інстытут (1958). Працоўную дзейнасць пачаў на торфапрадпрыемстве «Дняпроўскае» начальнікам поля па здабычы фрэзернага торфу. З 1963 г. галоўны інжынер, з 1968 г. дырэктар торфапрадпрыемства «Татарка» Асіповіцкага р-на. У 1972—1987 гг. старшыня Асіповіцкіх гарадскога Савета дэпутатаў і гарвыканкома. У 1987—1994 гг. намеснік дырэктара, начальнік цэха ААТ «Дах». Узнагароджаны двума ордэнамі «Знак Пашаны», медалямі.

КЛЕВАНЕЦ Мікалай Іванавіч. Нарадзіўся ў 1924 г. у с. Ермакоўка Урыцкага р-на Кустанайскай вобл., Казахстан. Закончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КПБ (1955). З 1950 г. інструктар, загадчык аддзела Бабруйскага абкома ЛКСМБ, з 1955 г. інструктар Магілёўскага абкома, сакратар Бабруйскіх райкома, 2-і сакратар абкома КПБ. У 1959—1960 гг. працаваў старшынёй калгаса імя Калініна Бабруйскага р-на. З 1961 г. намеснік старшыні Асіповіцкіх райвыканкома, у 1963—1972 гг. старшыня гарвыканкома. Выбіраўся дэпутатам Магілёўскага абласнога Савета. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі.

КЛІМОВІЧ Васіль Трафімавіч. Нарадзіўся 10.7.1918 г. у в. Заельнік Асіповіцкага р-на. З 1939 г. у Чырвонай арміі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля дэмабілізацыі (1946) інструктар Асіповіцкага райкома КП(б)Б, старшыня Асіповіцкага гарвыканкома. У 1950—1979 гг. старшыня калгаса «Авангард» Асіповіцкага р-на. Удзельнік Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі (1957—1958). Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны», медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета СССР. Памёр 12.10.1982 г. Яго імем названа вуліца ў в. Вяззе Асіповіцкага р-на; на доме, дзе ён жыў, устаноўлена мемарыяльная дошка.

МАЛЬЦАЎ Іван Маркавіч. Нарадзіўся ў 1905 г. у Ліпецкай вобл., Расія. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля дэмабілізацыі (1946) працаваў сакратаром, потым старшынёй Асіповіцкага гарадскога Савета дэпутатаў. На працягу некалькіх гадоў

У.П.Зорын.

У.І.Кавалёў.

М.І.Клеванец.

В.Т.Клімовіч.

І.М.Мальцаў.

І.І.Патапейка.

кіраваў гарадской камунальнай гаспадаркай. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр у 1968 г.

ПАТАПЕЙКА Іван Іванавіч. Нарадзіўся ў 1918 г. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вызвалення раёна працаваў дырэктарам райгаза Асіповіцкага райспажыўсаюза, старшынёй Асіповіцкага гарвыканкома. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, медалямі.

Г.В.Тур.

Ф.С.Дубінчык.

М.Д.Зелянкоў.

ТУР Ганна Валянцінаўна. Нарадзілася 3.2.1952 г. у г. Асіповічы. Закончыла Мінскі педагагічны інстытут замежных моў (1974), Мінскую ВПШ (1987). З 1974 г. працавала настаўніцай замежнай мовы ў Свіслацкай СШ Асіповіцкага р-на, СШ № 4 г. Асіповічы. З 1982 г. загадчык аддзела народнай адукацыі Асіповіцкага гарвыканкома, у 1983 — 1987 гг. сакратар Асіповіцкага гаркома КПБ. У 1987 — 1991 і 1993 — 1999 г. старшыня Асіповіцкіх гарвыканкома, у 1991 — 1993 гг. — гарадскога Савета дэпутатаў. У сувязі з аб'яднаннем горада і раёна ў 1999 г. прызначана намеснікам старшыні райвыканкома. Выбіралася дэпутатам Асіповіцкага гарадскога і Магілёўскага абласнога Саветаў. Узнагароджана граматамі Магілёўскіх абласнога аддзела адукацыі і аблвыканкома, знакам «Ганаровы чыгуначнік» (1995).

СТАРШЫНІ РАЙВЫКАНКОМА

ВІЛЯНТ Уладзімір Сцяпанавіч. Нарадзіўся ў 1903 г. у Аршанскім р-не Віцебскай вобл. Закончыў Мінскі педагагічны інстытут (1940). Працаваў загадчыкам Кантакузаўскай пачатковай школы на Гомельшчыне, завучам і дырэктарам сярэдняй школы № 2 Гомеля (да 1941). З 1944 г. загадчык аддзела народнай адукацыі Асіповіцкага райвыканкома, дырэктар Асіповіцкай сямейнай школы. У 1953 — 1957 гг. старшыня Асіповіцкага райвыканкома. Выбіраўся дэпутатам Асіповіцкага гарадскога Савета. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.

ГНЯДЗЬКО Іван Барысавіч. Нарадзіўся ў 1905 г. у в. Слабада Мазырскага р-на Гомельскай вобл. Закончыў Гомельскую саўпартшколу (1932), Вышэйшую камуністычную сельскагаспадарчую школу Беларусі (1936). Працаваў інструктарам раённай газеты ў Лепелі, у 1932 — 1934 гг. — загадчыкам аддзела Брагінскага, з 1939 г. — сакратаром Асіповіцкага райкомаў ЛКСМБ. З 1939 г. загадчык аддзела Асіповіцкага райкома КП(б)Б. Пасля Вялікай Айчыннай вайны да 1947 г. старшыня Асіповіцкага райвыканкома.

ДУБІНЧЫК Фёдар Сямёнавіч. Нарадзіўся 21.2.1910 г. у в. Карытнае Асіповіцкага р-на. Закончыў Мінскі педагагічны інстытут (1940). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1932 — 1941 гг. працаваў настаўнікам Карытненскай, дырэктарам Пасецкай няпоўных сярэдніх і Ясенскай сярэдняй школ. З 1946 г. дырэктар Ялізаўскай СШ, загадчык Асіповіцкага райана. У 1948 — 1953 гг. старшыня Асіповіцкага райвыканкома, потым дырэктар сярэдніх школ № 2 і № 3 г. Асіповічы. Заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь (1968). Выбіраўся дэпутатам Асіповіцкага гарадскога Савета і членам Асіповіцкага гарвыканкома. Узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, ордэнамі Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны», медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

ЗЕЛЯНКОЎ Мікалай Данілавіч. Нарадзіўся 3.5.1927 г. у в. Баянава Глускага р-на. Закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1961). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1951 — 1952 гг. працаваў загадчыкам Глускага раённага дзяржархіва. З 1952 г. на партыйнай рабоце: загадчык сектара, аддзела, 2-і сакратар Глускага, Магілёўскага, у 1965 - 1966 гг. — Асіповіцкага райкомаў КПБ. У 1966 - 1970 гг. старшыня Асіповіцкага райвыканкома. У 1970 — 1977 гг. 1-ы сакратар Чавускага райкома КПБ. З 1978 г. да 1988 г. дырэктар

вылічальнага цэнтра Магілёўскага абласнога статыстычнага ўпраўлення, намеснік старшыні абласнога камітэта народнага кантролю, дырэктар выдавецтва Магілёўскага абкома КПБ. Выбіраўся дэпутатам Магілёўскага абласнога Савета. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», Айчыннай вайны II ступені, медалямі, дзвюма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

КАРАЛЁЎ Мікалай Піліпавіч. Нарадзіўся 1.7.1906 г. у в. Амінавічы Асіповіцкага р-на. Генерал-маёр (1943), Герой Савецкага Саюза (1944). Закончыў ВПШ пры ЦК КПСС (1956). З 1930 г. рабочы, старшыня калгаса, сельсавета. З 1937 г. намеснік старшыні, старшыня Асіповіцкага райвыканкома. У Вялікую Айчынную вайну адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў Магілёўскай вобл. З ліпеня 1941 г. у партызанах: камандзір групы, 210-га партызанскага атрада імя Сталіна, у студзені — ліпені 1943 г. — 1-й Асіповіцкай партызанскай брыгады, у ліпені 1943 г. — сакавіку 1944 г. — Асіповіцкай ваенна-аператыўнай групы. Член Магілёўскага падпольнага абкома КП(б)Б у красавіку — верасні 1943 г. Са жніўня 1944 г. старшыня Магілёўскага гарвыканкома; з 1953 г. сакратар Хоцімскага райкома КПБ, з 1958 г. — у Магілёве. Кандыдат у члены ЦК КПБ у 1949—1952 гг. і 1954—1960 гг. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1947—1959 гг. Член Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР у 1947—1955 гг. Ганаровы грамадзянін г. Магілёў. Аўтар кнігі «Сыны народа» (1955). Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. Памёр 9.4.1972 г. Яго імем названы вуліцы ў Магілёве, Асіповічах, Хоцімску, у вёсках Масток Магілёўскага і Вярхі Асіповіцкага р-наў; у Магілёве на доме, дзе ён жыў, установлена мемарыяльная дошка, у в. Амінавічы — помнік.

КРАМІНКІН Леанід Антонавіч. Нарадзіўся ў жніўні 1938 г. у в. Горы Горацкага р-на. Закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1961). Працаваў механікам, галоўным інжынерам, у 1971—1977 гг. — дырэктарам саўгаса «Асіповіцкі». З 1977 г. намеснік старшыні, начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі, у 1980—1995 гг. старшыня Асіповіцкага райвыканкома. Выбіраўся дэпутатам Магілёўскага аб-

М.П.Каралёў.

Л.А.Крамінкін.

В.Р.Непачаловіч.

М.І.Роўбель.

ласнога і Асіповіцкага раённага Саветаў, членам бюро Асіповіцкага гаркома КПБ. Узнагароджаны двума ордэнамі «Знак Пашаны», медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

НЕПАЧАЛОВІЧ Васіль Рыгоравіч. Нарадзіўся ў снежні 1912 г. у в. Паставічы Старадарожскага р-на Мінскай вобл. Закончыў Мінскі педагагічны інстытут (1939), Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КПБ (1949). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1931 г. працаваў настаўнікам, загадчыкам вучэбнай часткі, дырэктарам школы. У 1942—1944 гг. намеснік старшыні арцелі «Перамога» ў г. Арджанікідзеабад (Таджыкістан). З 1945 г. інструктар, потым загадчык аддзела Старадарожскага райкома КПБ. У 1949—1957 гг. 2-і сакратар, сакратар Асіповіцкага райкома КПБ. У 1957—1959 гг. старшыня Асіповіцкага райвыканкома. Выбіраўся дэпутатам Асіповіцкага раённага Савета. Узнагароджаны медалямі.

РОЎБЕЛЬ Мікалай Іванавіч. Нарадзіўся 1.1.1956 г. у в. Рафалін Асіповіцкага р-на. Закончыў Беларускую сельска-

Л.Я.Сіманаў.

А.А.Тоўсцік.

В.У.Шчэцька.

гаспадарчую акадэмію (1988). Працаваў брыгадзірам, аграномам, з 1984 г. — намеснікам старшыні праўлення калгаса «Чырвоны сцяг» Асіповіцкага р-на. У 1995—1999 гг. старшыня Асіповіцкага райвыканкома. З 1999 г. дырэктар Асіповіцкага лясгаса. Узнагароджаны медалём.

РУДЭНКА Іван Сямёнавіч. Нарадзіўся ў верасні 1914 г. у с. Казьмінскае Краснадарскага краю, Расія. Закончыў Магілёўскі педагагічны інстытут (1952). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1932 г. працаваў дырэктарам школы ў Чачэна-Інгушскай АССР. З 1935 г. на педагагічнай працы ў Атрадненскім р-не Краснадарскага краю: дырэктар школ у станіцы Атрадная, с. Пятроўскае, інспектар, загадчык Атрадненскага райана. У 1945—1952 гг. 2-і сакратар Круглянскага, Бялыніцкага, 1-ы сакратар Горацкага райкомаў КПБ. З 1957 г. старшыня Магілёўскага, у 1959—1963 гг. — Асіповіцкага, потым Быхаўскага райвыканкомаў. Выбіраўся дэпутатам Магілёўскага абласнога і раённых Саветаў. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

СІМАНАЎ Леанід Якаўлевіч. Нарадзіўся 5.8.1924 г. у в. Сіманы Белахалуніцкага р-на Кіраўскай вобл., Расія. Закончыў Мінскую ВПШ (1960). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1947 г. на камсамольскай рабоце, у органах дзяржбяспекі. З 1954 г. інструктар Магілёўскага абкома, 2-і сакратар Слаўгарадскага райкома КПБ. У 1963—1965 гг. намеснік сакратара, сакратар Асіповіцкага прамысловага парткома КПБ, у 1965—1966 гг. старшыня Асіповіцкага райвыканкома. З 1966 г. 1-ы сакратар Глускага райкома КПБ, у 1978—1985 гг. загадчык аддзела Магілёўскага аблвыканкома. Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Узнагароджаны двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

ТОЎСЦІК Андрэй Апанасавіч. Нарадзіўся 25.8.1934 г. у в. Чыкілі Глускага р-на. Закончыў Бабруйскі лесатэхнічны тэхнікум (1957), Беларускі інстытут народнай гаспадаркі (1964). Кандыдат эканамічных навук (1980). У 1957—1965 гг. інструктар, намеснік загадчыка аддзела Магілёўскіх абкомаў ЛКСМБ і КПБ. З 1965 г. намеснік старшыні, у 1970—1980 гг. старшыня Асіповіцкага райвыканкома. У 1980—1990 гг. працаваў дырэктарам вылічальнага цэнтра Магілёўскага аблстатупраўлення. Выбіраўся дэпутатам Магілёўскага абласнога Савета. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», медалямі. Памёр у 1990 г.

ШЧЭЦЬКА Віктар Уладзіміравіч. Нарадзіўся 18.9.1955 г. у в. Растаў Акцябрскага р-на Гомельскай вобл. Закончыў Бабруйскі сельскагаспадарчы тэхнікум (1974), Беларускі інстытут народнай гаспадаркі (1982). Працоўную дзейнасць пачаў у саўгасе «Парэчча» Акцябрскага р-на. З 1977 г. галоўны эканаміст калгаса імя Кірава, намеснік старшыні калгаса «Дружба», з 1983 г. старшыня калгаса імя Чапаева Глускага р-на. У 1987 — 1999 гг. старшыня Глускага райвыканкома. З 1999 г. працуе старшынёй Асіповіцкага райвыканкома. Ганаровы грамадзянін г. Глуск (1999).

САКРАТАРЫ ГК КП(б)Б

АНІКЕЕЎ Міхаіл Міхайлавіч. Нарадзіўся 23.5.1949 г. у в. Мікольск Горацкага р-на. Закончыў сельскагаспадарчы тэхнікум (1973), Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1979). Кандыдат сельскагаспадарчых навук (1989). Працоўную дзейнасць пачаў у 1966 г. рабочым. З 1970 г. брыгадзір саўгаса «Дрыбінскі», з 1977 г.

галоўны аграном саўгаса «Капцеўскі», з 1980 г. дырэктар саўгаса «Горацкі». У 1986—1987 гг. старшыня Горацкага райвыканкома. З 1987 г. 1-ы сакратар Асіповіцкага гаркома КПБ. З 1991 г. дацэнт Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. З 2000 г. дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Выбіраўся дэпутатам сельскага і раённага Саветаў, Вярхоўнага Савета БССР. Быў членам Кантрольнай камісіі КПБ. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» (1982), медалямі, Ганаровай граматай абкома КПБ.

ВАЙЦЯНКОЎ Рыгор Максімавіч. Нарадзіўся 1.12.1900 г. у в. Лужок Кармянскага р-на Гомельскай вобл. Закончыў Магілёўскую саўпартшколу (1927), Вышэйшую камуністычную сельскагаспадарчую школу Беларусі (1935). У 1919—1924 гг. у Чырвонай арміі, удзельнік баёў супраць войск Юдзеніча. З 1936 г. прапагандыст ЦК КП(б)Б у г. Асіповічы, з 1938 г. 2-і, з 1939 г. 1-ы сакратар Асіповіцкага райкома КП(б)Б. У Вялікую Айчынную вайну адзін з кіраўнікоў патрыятычнага падполля і партызанскага руху ў Магілёўскай вобл. З лютага 1942 г. камандзір дыверсійнай групы. У красавіку 1943 г. — ліпені 1944 г. 1-ы сакратар Асіповіцкага падпольнага райкома КП(б)Б, адначасова з ліпеня 1943 г. кіраўнік Асіповіцкай ваенна-аператыўнай групы. З кастрычніка 1944 г. 1-ы сакратар Асіповіцкага райкома КП(б)Б, потым на партыйнай рабоце ў Магілёве, Брагіне, Жлобіне. У 1948—1954 гг. працаваў у друку. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, медалём. Памёр 9.5.1979 г.

ГРЫНЁЎ Мікалай Фёдаравіч. Нарадзіўся 18.5.1946 г. у в. Высокае Касцюковіцкага р-на. Закончыў Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут (1968). Працаваў інжынерам-механікам дарожна-будаўнічага раёна № 5 Мінска. З 1969 г. на камсамольскай рабоце ў Магілёве. З 1971 г. загадчык аддзела, сакратар, 1-ы сакратар Магілёўскага гаркома, з 1975 г. 2-і, 1-ы сакратар Магілёўскага абкома ЛКСМБ. З 1980 г. 1-ы сакратар Першамайскага райкома КПБ Бабруйска, у 1982—1987 гг. — Асіповіцкага гаркома КПБ, у 1987—1989 гг. 2-і сакратар Магілёўскага абкома КПБ. З 1989 г. старшыня Магілёўскіх аблвыканкома, з 1991 г. — абласнога Савета дэпутатаў. У 1995—1999 гг. надзвычайны і

М.М.Анікееў.

М.Ф.Грынёў.

С.М.Дзікавіцкі.

паўнамоцны пасол Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Малдова. З 1999 г. саветнік старшыні Магілёўскага аблвыканкома. Выбіраўся дэпутатам Магілёўскага абласнога Савета, Вярхоўнага Савета БССР. Узнагароджаны ордэнамі Дружбы народаў, «Знак Пашаны», медалём, Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

ГУСЕЎ Гурый Сяргеевіч. Нарадзіўся ў 1913 г. у в. Ізвекава Клепікаўскага р-на Разанскай вобл., Расія. Закончыў Курскі пладова-ягадны тэхнікум (1932), курсы па перападрыхтоўцы сакратароў гаркомаў і райкомаў пры ЦК ВКП(б) у Маскве (1952). У 1932—1944 гг. працаваў участковым аграномам, дырэктарам Тумскай МТС, галоўным аграномам Тумскага зямельнага аддзела, загадчыкам Тумскага райза. З 1944 г. намеснік загадчыка сельгасаддзела Разанскага абкома, у 1947—1951 гг. 1-ы сакратар Чучкаўскага райкома ВКП(б) Разанскай вобл. У 1952—1959 гг. 1-ы сакратар Асіповіцкага райкома КПБ. Узнагароджаны двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга.

ДЗІКАВІЦКІ Сяргей Мікалаевіч. Нарадзіўся 10.1.1940 г. у в. Баяры Пінска-

В.А.Папоў.

А.М.Сівакоў.

І.А.Чырун.

га р-на Брэсцкай вобл. Закончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі (1960). З 1960 г. майстар, інжынер-тэхнолаг, з 1963 г. галоўны інжынер, у 1966—1970 гг. дырэктар Пінскага экскаватарарамонтнага завода. З 1970 г. інструктар, з 1976 г. загадчык сектара сельскагаспадарчага аддзела ЦК КПБ. З 1977 г. 1-ы сакратар Асіповіцкіх райкома, у 1978—1979 гг. — гаркома КПБ. Выбіраўся дэпутатам Пінскага гарадскога Савета, членам Пінскага гаркома КПБ. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» (1971).

ПАПОЎ Вадзім Аляксандравіч. Нарадзіўся 5.7.1940 г. у г. Дзямідаў Смаленскай вобл., Расія. Дзяржаўны дзеяч Беларусі. Закончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі (1971), Мінскую ВПШ (1984). Працоўную дзейнасць пачаў у 1961 г. механікам саўгаса ў Алтайскім краі. З 1964 г. выкладчык Крычаўскага СПТВ-38, інструктар, загадчык аддзела, 2-і сакратар Крычаўскага, 1-ы сакратар Краснапольскага райкомаў, інструктар Магілёўскага абкома ЛКСМБ. У 1972—1976 і 1992—1993 гг. дырэктар саўгаса ў Краснапольскім, намеснік старшыні калгаса ў Магілёўскім р-нах. З 1977 г. інструктар сельскагаспадарчага аддзела ЦК КПБ, 1-ы сакратар Асіповіцкага гаркома, загадчык сельскагаспадарчага аддзела, 2-і, 1-ы сакратар Магілёўскага абкома КПБ. З 1993 г. намеснік генеральнага дырэктара ВА «Магілёўаблаграснаб», з 1995 г. генеральны дырэктар холдзінга «Аграмашсэрвіс». У 1999—2000 гг. 1-ы намеснік міністра, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь. З лістапада 2000 г. старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

СІВАКОЎ Аляксандр Міхайлавіч. Нарадзіўся 5.5.1922 г. у в. Праточнае Быхаўскага р-на. Закончыў Магілёўскі педагагічны інстытут (1953). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля дэмабілізацыі ў 1947 г. працаваў настаўнікам, з 1949 г. — загадчыкам Кіраўскага райана. З 1953 г. намеснік старшыні, з 1957 г. старшыня Кіраўскага, у 1963—1965 гг. — Бабруйскага райвыканкомаў. У 1961—1963, 1965—1977 гг. 1-ы сакратар Асіповіцкага райкома КПБ. У 1977—1984 гг. старшыня Магілёўскага абласнога савета прафсаюзаў. Выбіраўся дэпутатам Магілёўскага абласнога Савета, Вярхоўнага Савета БССР, членам бюро Магілёўскага абкома КПБ. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

ЧЫРУН Іван Адамавіч. Нарадзіўся ў 1919 г. у в. Забурэвічы Глускага р-на. Вучыўся ў БДУ (1935—1937). Закончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КПБ (1950). У 1930-я гады працаваў настаўнікам у школах Глускага р-на. У 1942 г. упаўнаважаны Асобага аддзела раёна авіябаз. З 1947 г. загадчык ваеннага аддзела Глускага райкома КП(б)Б. З 1950 г. сакратар, 2-і сакратар Клічаўскага райкома, з 1952 г. намеснік загадчыка аддзела Бабруйскага абкома КПБ. У 1956—1959 гг. загадчык аддзела Магілёўскіх абкома, 2-і сакратар гаркома КПБ. У 1959 — 1961 гг. 1-ы сакратар Асіповіцкага райкома КПБ. Выбіраўся дэпутатам Асіповіцкага раённага Савета. Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, «Знак Пашаны», Айчыннай вайны I ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі.

Лёсам звязаныя з краем

АРЛОЎ Анатоль Іванавіч. Кандыдат педагагічных навук (1978). Заслужаны работнік культуры Беларусі (1980). Нарадзіўся ў 1923 г. у Віцебску. Вучыўся ў Цюменскім ваенна-пяхотным вучылішчы (1941—1942), закончыў Маскоўскі юрыдычны (1948) і Мінскі педагагічны (1964) інстытуты. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1945 г. старшы выкладчык Мінскага юрыдычнага інстытута, з 1947 г. дырэктар Асіповіцкай вячэрняй сярэдняй школы рабочай моладзі. У 1971—1992 гг. дырэктар, потым настаўнік сярэдняй школы № 1 г. Асіповічы. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I ступені, медалямі, знакамі «Выдатнік народнай асветы» і «Выдатнік адукацыі СССР».

КАПІТУЛА Пётр Андрэевіч. Беларускі вучоны-эканаміст. Доктар эканамічных навук (1988), прафесар (1989). Нарадзіўся 4.7.1936 г. у в. Вялікі Бор Старадарожскага раёна. Скончыў Дараганаўскую сярэднюю школу (1954), Беларускі інстытут народнай гаспадаркі (1958), Мінскую ВПШ (1965). З 1960 г. працаваў на заводзе, у Цэнтральным НДІ арганізацыі і тэхнікі кіравання, з 1966 г. у Інстытуце эканомікі АН Беларусі. З 1994 г. начальнік аналітычнага цэнтра Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У 1996—2000 гг. памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Даследуе праблемы тэорыі, метадалогіі ацэнкі і планавання эфектыўнасці грамадскай вытворчасці, капітальных укладанняў і новай тэхнікі. Аўтар прац «Эфектыўнасць капітальных укладанняў і асноўных вытворчых фондаў» (1974), «Эфектыўнасць грамадскай вытворчасці» (1985), сааўтар кніг «Змест і ацэнка эканамічнай эфектыўнасці вытворчасці» (1982), «Эфектыўнасць эканамічнага рэгіёну» (1987) і інш. Жыве ў Мінску.

НЕМЦАЎ (НЯМЦОЎ) Аляксандр Гаўрылавіч. Беларускі краязнавец, археолаг, этнограф. Нарадзіўся 29.8.1898 г. у Гомелі. Закончыў настаўніцкую семінарыю ў г. Яраслаўль (1917), Маскоўскі педагагічны інстытут (1933). У 1917—1938 гг. настаўнік, завуч школы ў Асіповічах. Зарэгістраваў і апісаў больш за 20 курганных груп і шэраг гарадзішчаў у басейне ніжняй Свіслачы (у асноўным Асіповіцкі р-н) эпохі каменнага, бронзавага, жалезнага вякоў і Кіеўскай Русі. У 1926 г. разам з С.С.Шутавым і М.М.Улашчыкам сабраў пад'ёмны матэрыял з археалагічных помнікаў Жужлянка, Вяззе, Орча, Усціж і інш. З 1929 г. карэспандэнт Цэнтральнага бюро краязнаўства (ЦБК). Вывучаў этнаграфію і фальклор Асіповіцкага р-на. Друкаваўся ў часопісе «Савецкая краіна», газеце «Савецкая Беларусь» і інш. Аўтар навуковых публікацый «Праца па абследаванні Асіповіцкага раёна ў летні перыяд 1926 г.» (1926), «Вяселле: Запісана ў в. Смык-Слабада Зборскага сельсавета і в. Заручэўе Дзераўцоўскага сельсавета ў студзені—лютым 1927 г. — Асіповіцкага раёна» (1927), «Спосабы лову жывёл і птушак у Асіповіцкім раёне» (1928) і інш. Рэпрэсіраваны ў 1938 г., рэабілітаваны ў 1957 г. Памёр у сакавіку 1938 г.

НЕПАЧАЛОВІЧ Янка (Іван Данілавіч). Беларускі паэт. Нарадзіўся 25.5.1917 г. у в. Мінкавічы Старадарожскага р-на Мінскай вобл. у сялянскай сям'і. Пасля заканчэння сярэдняй школы працаваў загадчыкам хаты-чытальні ў в. Крываносава Старадарожскага р-на (1934). У 1935 г. паступіў на літаратурны факультэт Мінскага педінстытута. З трэцяга курса накіраваны Наркаматам асветы БССР настаўнікам у Дзяржынскую СШ Мінскай вобл., дзе працаваў у 1937—1939 гг., потым у Мар'інагорскай СШ (1939—1941). У 1940 г. завочна закончыў педінстытут. У час вайны жыў у родных мясцінах (в. Мінкавічы). З 1942 г. быў сувязным партызанскай брыгады імя Кірава, выконваў яе заданні. Пасля вайны працаваў настаўнікам у

А.І.Арлоў.

А.Г.Немцаў.

С.У.Багдасараў.

І.В.Жураўлевіч.

А.П.Захаранка.

С.І.Лаўшук.

І.Дз.Чыкал.

Дзяржынску (1944—1947), інспектарам школ Старадарожскага р-на (1947—1948). З 1948 г. настаўнік у в. Дараганава Асіповіцкага р-на. У 1967 г. пераехаў у Мінск, працаваў у выдавецтве «Народная асвета». Узнагароджаны медалём.

Першыя вершы Я.Непачаловіча надрукаваны ў 1936 г. у часопісе «Полымя рэвалюцыі». Першая кніга паэта «Мера любві» выйшла ў свет у 1958 г., калі яе аўтар быў ужо далёка не пачаткоўцам. Бласлявіўшы рукапіс у друк, А.Вялюгін адзначаў жыццёвую канкрэтыку твораў паэта, задушэўнасць інтанацый, адсутнасць «таннай траскатні». Другая прыжыццёвая кніга паэзіі, «Позні паром», выйшла ў 1967 г. Сярод яе асноўных матываў — любоў да роднай зямлі і прыроды, разуменне жыццёвых клопатаў чалавека-працаўніка, адчуванне сваёй крэўнай сувязі з ім. Характэрная рыса вершаў Я.Непачаловіча — прыглушанае выяўленне свайго лірычнага «я», якое раскрываецца часцей у адносінах да героя верша, у суперажыванні яму. Паводле жанру такія вершы маюць пераважна баладны характар. На словы Я.Непачаловіча Ю.Семяняка напісаў папулярную песню «Табе маё прызнанне». Трагічна загінуў 3.7.1969 г. у в. Дараганава. Пахаваны на радзіме ў в. Мінкавічы. У 1977 г. выдадзены зборнік вершаў паэта «Перад захадам сонца».

Э.І.Багдановіч.

* * *

АЛІНОЎСКАЯ Ліна Аляксандраўна. Закончыла Свіслацкую СШ. Кандыдат хімічных навук, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў НАН Рэспублікі Беларусь.

ГАЙШУН Іван Аляксандравіч. Закончыў Ясенскую СШ. Загадваў кафедрай механізацыі сельскай гаспадаркі Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі, прафесар.

ДАНІЛОВІЧ Валянцін Іванавіч. Закончыў СШ № 2 г. Асіповічы. Інжынер-выпрабавальнік у галіне касманаўтыкі. Загінуў у 1970 г. пры выпрабаванні новай катапульты.

ДАНЮК Пётр Паўлавіч. Закончыў Татаркавіцкую СШ. Галоўны спецыяліст аддзела прыватызацыі Мінскага гарвыканкома.

ДАШАНКОЎ Віталь Міхайлавіч. Закончыў СШ № 2 г. Асіповічы. Прафесар Беларускага дзяржаўнага універсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі.

ЕРАШЭВІЧ Антон Піліпавіч. Закончыў Дараганаўскую СШ. Працуе ва Упраўленні крымінальнага вышуку Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

КАВАЛЕНЯ Аляксандр Міхайлавіч. Закончыў Татаркавіцкую СШ. Выкладчык Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь.

КАПЧАН Мікалай Міхайлавіч. Закончыў Ясенскую СШ. Працаваў намеснікам старшыні праўлення Белкаапсаюза.

КЕРНАЖЫЦКІ Аляксандр Валянцінавіч. Закончыў Свіслацкую СШ. Начальнік

фінансавага ўпраўлення Мінскага гарвыканкома.

КЕРНАЖЫЦКІ Мікалай Валянцінавіч. Закончыў Свіслацкую СШ. Першы сакратар Пасольства Рэспублікі Беларусь у Швецыі.

ЛАЗАРЭВІЧ Святаслаў Усеваладавіч. Закончыў Ялізаўскую СШ. Кандыдат біялагічных навук. Дацэнт кафедры батанікі і фізіялогіі раслін Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі.

МАРДУСЕВІЧ Вера Анатольеўна. Закончыла Татаркавіцкую СШ. Кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт Інстытута ўдасканалення ўрачоў.

МІХАЛАП Уладзімір Пятровіч. Закончыў Свіслацкую СШ. Капітан супертанкера ў Эстоніі.

ЛЯШЭНКА Васіль Дзмітрыевіч. Закончыў Татаркавіцкую СШ. Кандыдат тэхнічных навук.

РУБАН Аркадзь Мікалаевіч. Закончыў Свіслацкую СШ. Кандыдат фізіка-матэматычных навук, прафесар. Памёр у час блакады Ленінграда ў Вялікую Айчынную вайну.

САРОКА Мікалай Кандратавіч. Закончыў Свіслацкую СШ. Доктар медыцынскіх навук, прафесар. У час Вялікай Айчыннай вайны начальнік медыцынскай службы Варонежскага фронту.

САСНОЎСКІ Аляксандр Уладзіміравіч. Нарадзіўся ў в. Шышчыцы Слуцкага р-на. У 1966 г. закончыў Вяззеўскую СШ. Працаваў міністрам культуры Рэспублікі Беларусь у 1996—2000 гг.

СМЕРЦІН Канстанцін Васільевіч. Нарадзіўся ў г. Асіповічы. Карэспандэнт радыёстанцыі «Маяк».

* * *

У Асіповічах дыслацыруецца 51-я гвардзейская артылерыйская дывізія. У розны час ёю камандавалі Сяргей Уладзіміравіч Багдасараў, Іван Васільевіч Жураўлевіч, Аляксандр Паўлавіч Захаранка. У 51-й дывізіі на розных пасадах праходзіў службу Сяргей Іванавіч Лаўшук (у 1978—1982 гг. камандзір дывізіёна, у 1982 г. прызначаны начальнікам штаба 51-й дывізіі). Пазней працаваў на розных адказных пасадах, з 1996 г. узначаліў аддзел ваеннай адукацыі Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь. З 1967 г. па 1972 г. у Асіповічах у 121-й гвардзейскай артылерыйскай брыгадзе служыў (камандзірам агнявога ўзвода дывізіёна, намеснікам камандзіра батарэі, камандзірам батарэі) Іван Дзмітрыевіч Чыкал, намеснік міністра абароны па тыле — начальнік тылу Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь.

У Асіповічах пахаваны Герой Савецкага Саюза Пётр Іванавіч Марозаў, які служыў тут (званне Героя прысвоена 27.6.1945). Памёр 26.1.1952 г.

Ваеннаслужачыя, якія загінулі пры выкананні службовых абавязкаў

АЎДЗЕЕЎ Уладзімір Мікалаевіч, н. у 1956 у г. Асіповічы, прапаршчык в/ч 52511, загінуў 9.6.1978 у г. Капусцін Яр Архангельскай вобл., пахаваны ў в. Прудок Асіповіцкага р-на.

БАРАНОЎСКІ Уладзімір Іосіфавіч, н. у 1932 у г. Асіповічы, малодшы сяржант в/ч 2877, загінуў 19.1.1953, пахаваны ў г. Асіповічы.

БЕЛАВУШКА Валерый Фларыянавіч, н. у 1948 у г. Асіповічы, курсант ваенна-марскога вучылішча, загінуў 30.8.1974 у г. Севастопаль Крымскай вобл., там і пахаваны.

БУЗАНОЎСКІ Віктар Антонавіч, н. у 1953 у в. Дражня Асіповіцкага р-на, прапаршчык, начальнік склада в/ч 25757, загінуў 28.9.1993 у Бабушкінскім р-не Валагодскай вобл., пахаваны ў в. Дражня.

ВОЗНІК Сяргей Міхайлавіч, н. у 1951 у г. Асіповічы, капітан, загінуў 28.4.1986 у г. Архангельск, пахаваны ў в. Прудок Асіповіцкага р-на.

ГАБРЫЙЧУК Віктар Мікалаевіч, н. у 1956 у г. Асіповічы, палкоўнік, камандзір в/ч 92616, загінуў 14.12.1995 у г. Брэст, пахаваны ў в. Прудок Асіповіцкага р-на.

ГАНЧАР Барыс Барысавіч, н. у 1965 у г. Асіповічы, старшы лейтэнант, камандзір роты, п/п 84881, загінуў 9.1.1991 у г. Улан-Удэ, Бурацыя, пахаваны ў в. Прудок Асіповіцкага р-на.

ГПРЫЧ Віктар Фёдаравіч, н. у 1970 у в. Убалацце Асіповіцкага р-на, яфрэйтар,

механік-вадзіцель в/ч 04592, загінуў 7.7.1990 у г. Баку, пахаваны ў в. Убалацце.

ГУБАРЭВІЧ Ігар Міхайлавіч, н. у 1957 у г. Асіповічы, старшы лейтэнант, загінуў 25.6.1985 у г. Краснадар, пахаваны ў в. Прудок Асіповіцкага р-на.

ДАМАРАД Леанід Пятровіч, н. у 1945 у в. Замошша Асіповіцкага р-на, радавы, в/ч 45829, загінуў 22.11.1966 у г. Карталы Чэлябінскай вобл., там і пахаваны.

ДЗЕРАВЯНКА Юрый Іванавіч, н. у 1966 у в. Свіслач Асіповіцкага р-на, радавы в/ч 5102, загінуў 15.12.1984 у г. Рэутаў Маскоўскай вобл., пахаваны ў в. Свіслач.

ДЗЯГЧЭНЯ Генадзь Уладзіміравіч, н. у 1962 у в. Вуглата Асіповіцкага р-на, малодшы сяржант, санітар-інструктар, п/п 93992, загінуў 23.4.1983, пахаваны ў в. Вуглата.

ЖУК Аляксандр Уладзіміравіч, н. у 1965 у в. Лапічы Асіповіцкага р-на, лейтэнант, начальнік групы в/ч 06886, загінуў 12.7.1987 у г. Белагорск, пахаваны ў в. Лапічы.

ЗАБАЎСКІ Віктар Уладзіміравіч, н. у 1950 у г. Асіповічы, лейтэнант, загінуў 3.1.1976, пахаваны ў в. Прудок Асіповіцкага р-на.

ЗАХАРАЎ Іван Міхайлавіч, н. у 1913 у г. Асіповічы, капітан, загінуў 28.7.1957, пахаваны ў в. Прудок Асіповіцкага р-на.

КАБУШКА Віктар Аляксандравіч, н. у 1951 у г. Асіповічы, падпалкоўнік, памёр 8.9.1989 у шпіталі г. Масква, пахаваны ў г. Сумы, Украіна.

КАЛАШНІКАЎ Ігар Леанідавіч, н. у 1966 у г. Асіповічы, радавы в/ч 01453, загінуў 6.4.1986 у Казахстане, пахаваны ў в. Прудок Асіповіцкага р-на.

КАРАПАНАЎ Алег Віктаравіч, н. у 1945 у г. Асіповічы, маёр, старшы інструктар па культурна-асветніцкай рабоце в/ч 41604, загінуў 10.5.1990 у г. Асіповічы, пахаваны ў в. Прудок Асіповіцкага р-на.

КРЫНКА Уладзімір Рыгоравіч, н. у 1937 у г. Асіповічы, капітан, загінуў 29.4.1969, пахаваны ў г. Асіповічы.

ЛАЗОЎСКІ Анатоль Уладзіміравіч, н. у 1954 у г. Асіповічы, маёр, аператыўны работнік в/ч 7480, загінуў 24.10.1985, пахаваны ў в. Птушычы Асіповіцкага р-на.

ЛІСКАВЕЦ Аляксандр Станіслававіч, н. у 1961 у г. Асіповічы, малодшы сяржант, п/п 83105, загінуў 19.11.1980 у Германіі, пахаваны ў г. Асіповічы.

ЛОГВІН Віктар Міхайлавіч, н. у 1961 у в. Крынка Асіповіцкага р-на, сяржант, камандзір аддзялення, п/п 65753, загінуў 23.7.1981, пахаваны ў в. Крынка.

ЛЫЗО Валерый Аляксеевіч, н. у 1971 у в. Вяззе Асіповіцкага р-на, сяржант, камандзір аддзялення в/ч 14359, загінуў 19.4.1997 у г. Асіповічы, пахаваны ў в. Вяззе.

ЛЯХАВЕЦ Леанід Міхайлавіч, н. у 1959 у г. Асіповічы, яфрэйтар, в/ч 25006, загінуў 6.2.1979 у г. Неман Калінінградскай вобл., пахаваны ў в. Прудок Асіповіцкага р-на.

МАКШАНАЎ Андрэй Мікалаевіч, н. у 1965 у р.п. Ялізава Асіповіцкага р-на, матрос, в/ч 62717, загінуў 5.12.1984 у г. Феадосія Крымскай вобл., пахаваны ў р.п. Ялізава.

МОШЧЫН Анатоль Уладзіміравіч, н. у 1964 у в. Заняцечча Асіповіцкага р-на, радавы, стралок, п/п 71176, загінуў 7.9.1982, пахаваны ў в. Жыцін Асіповіцкага р-на.

НАЛІВАЙКА Мікалай Барысавіч, н. у в. Смык Асіповіцкага р-на, радавы, загінуў 12.3.1957, пахаваны ў в. Смык.

ПАТАПЕЙКА Міхаіл Георгіевіч, н. у 1961 у в. Кастрычнік Асіповіцкага р-на, радавы в/ч 61558, загінуў 28.5.1982, пахаваны ў в. Лучыцы Асіповіцкага р-на.

ПАШКОЎСКІ Яўген Уладзіміравіч, н. у 1927 у г. Асіповічы, маёр, загінуў 5.4.1969, пахаваны ў в. Прудок Асіповіцкага р-на.

ПІГУЛЕЎСКІ Мікалай Іванавіч, н. у в. Старыя Тарасавічы Асіповіцкага р-на, радавы, загінуў 24.5.1954, пахаваны ў в. Старыя Тарасавічы.

ПЯСТОЎ Анатоль Рыгоравіч, н. у 1940 у г. Асіповічы, падпалкоўнік, намеснік камандзіра палка 12142, загінуў 12.5.1981 у г. Асіповічы, пахаваны ў в. Прудок Асіповіцкага р-на.

ПЯТРЫКІН Аляксандр Уладзіміравіч, н. у 1951 у г. Асіповічы, радавы в/ч 77761, загінуў 1.2.1970 на ст. Громава Ленінградскай вобл., пахаваны ў в. Прудок Асіповіцкага р-на.

РЫЧАГОЎ Уладзімір Іванавіч, н. у 1936 у г. Асіповічы, палкоўнік, камандзір в/ч 63303, загінуў 23.8.1987 у г. Асіповічы, пахаваны ў в. Прудок Асіповіцкага р-на.

СУГЛОБА Анатоль Міхайлавіч, н. у 1940 у г. Асіповічы, маёр, начальнік армейскага прадуктовага склада, п/п 81824, загінуў 9.10.1982, пахаваны ў в. Прудок Асіповіцкага р-на.

СЯДЗІНКІН Аляксандр Дзмітрыевіч, н. у 1949 у г. Асіповічы, маёр, намеснік камандзіра па тэхнічнай частцы в/ч 12147, загінуў 15.5.1992, пахаваны ў в. Прудок Асіповіцкага р-на.

СЯДЫХ Юрый Мікалаевіч, н. у 1963 у г. Асіповічы, лейтэнант, камандзір узвода, п/п 89933, загінуў 30.11.1985, пахаваны ў в. Прудок Асіповіцкага р-на.

ТРЫКІША Павел Васільевіч, н. у 1950 у г. Асіповічы, прапаршчык, начальнік сховішча в/ч 54663, загінуў 14.5.1991, пахаваны ў в. Прудок Асіповіцкага р-на.

ТУРАЎ Юрый Мікалаевіч, н. у 1963 у г. Асіповічы, радавы в/ч 55135, загінуў 15.10.1982 у Смаленскай вобл., пахаваны ў в. Прудок Асіповіцкага р-на.

ХАНДОГА Сяргей Міхайлавіч, н. у 1955 у г. Асіповічы, прапаршчык, старшы тэхнік, п/п 22630, загінуў 15.2.1983, пахаваны ў в. Прудок Асіповіцкага р-на.

ХАЦЬКО Васіль Міхайлавіч, н. у 1967 у п. Градзянка Асіповіцкага р-на, малодшы сяржант, камандзір аддзялення, п/п 37466, загінуў 12.7.1987, пахаваны ў р.п. Градзянка.

ФЁДАРАЎ Алег Уладзіміравіч, н. у 1951 у в. Лапічы Асіповіцкага р-на, лейтэнант в/ч 12180, загінуў 18.3.1976 у г. Асіповічы, пахаваны ў г. Каломна Маскоўскай вобл.

ЧЫГІЛЕЙЧЫК Пётр Аляксеевіч, н. у 1937 у г. Асіповічы, радавы в/ч 90450, загінуў 27.9.1960, пахаваны ў г. Ліепая, Латвія.

ШПАК Віктар Мікалаевіч, н. у 1965 у в. Хімное Асіповіцкага р-на, радавы, стралок, п/п 53701, загінуў 22.7.1984, пахаваны ў в. Хімное.

ШЫЦЬКО Аляксандр Васільевіч, н. у Лапіцкім сельсавеце Асіповіцкага р-на, матрос, загінуў у ліпені 1955, пахаваны ў в. Гоманаўка Асіповіцкага р-на.

ЮШКЕВІЧ Алег Іванавіч, н. у 1953 у г. Асіповічы, прапаршчык в/ч 61777, загінуў 25.3.1985, пахаваны ў в. Прудок Асіповіцкага р-на.

ЗАГІНУЎ У КАРЭІ

СТЭЛЬМАХ Яўтен Міхайлавіч. Нарадзіўся 11.5.1923 г. у в. Вязаўніца Асіповіцкага р-на. Герой Савецкага Саюза (1951). Закончыў Мінскі аэраклуб (1941), Чарнігаўскую ваенна-авіяцыйную школу лётчыкаў (1943). У Чырвонай арміі з 1941 г. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

Я.М.Стэльмах.

Г.У.Дзягчэня.

Служыў у ВПС. У час карэйскай вайны 1950—1953 гг. камандзір звяна старшы лейтэнант Стэльмах у складзе савецкага 64-га знішчальна-авіяцыйнага корпуса ўдзельнічаў у паветраных баях. 1.6.1951 г. Стэльмах збіў бамбардзіроўшчык праціўніка В-29 і падбіў другі, аднак сам быў збіты варожым знішчальнікам. Прызямліўшыся на парашуце, уступіў у бой з дыверсійнай групай праціўніка і, каб не трапіць у палон, застрэліўся. Пахаваны на Рускіх вайсковых могілках у Порт-Артуры (цяпер г. Люйшунь, Кітай). Яго імем названа вуліца ў Асіповічах.

Ю.В.Бажэнаў.

ЗАГІНУЛІ Ў АФГАНІСТАНЕ

ДЗЯГЧЭНЯ Генадзь Уладзіміравіч. Нарадзіўся 20.8.1962 г. у в. Свіслач Асіповіцкага р-на. Беларус. У 1979 г. закончыў Свіслацкую сярэднюю школу, у 1980 г. — Бабруйскае ПТВ № 95. Працаваў у вытворчым аб'яднанні «Бабруйскшына». У сакавіку 1981 г. прызваны ў Савецкую армію Бабруйскім гарваенкаматам. Служыў у Афганістане. Санінструктар, малодшы сяржант Г.У.Дзягчэня загінуў 23.4.1983 г. у час абстрэлу душманамі тэрыторыі часці. Пахаваны ў в. Вуглата Асіповіцкага р-на. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

ЛАЗОЎСКІ Анатоль Уладзіміравіч. Нарадзіўся 19.9.1954 г. у в. Біхтуліна Зыранскага р-на Томскай вобл. (Расія). Беларус. У 1972 г. закончыў Дараганаўскую сярэднюю школу Асіповіцкага р-на, у 1972 г. паступіў у Арджанікідзеўскае ваеннае вучылішча імя С.М.Кірава. У 1984 г. закончыў завочна Магілёўскі

А.У.Лазоўскі.

В.М.Логвін.

А.У.Мошчын.

А.М.Суглоба.

пединстытут. Служыў у Афганістане. Аператыўны работнік, маёр А.У.Лазоўскі загінуў 24.10.1985 г. пры выкананні баявога задання. Пахаваны ў в. Птушычы Асіповіцкага р-на. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

ЛОГВІН Віктар Міхайлавіч. Нарадзіўся 12.7.1961 г. у в. Крынка Асіповіцкага р-на. Беларус. У 1976 г. закончыў 8 класаў Крынкаўскай сярэдняй школы. У 1976 г. паступіў у Мінскае тэхнічнае вучылішча № 133. Працаваў на Мінскім маторным заводзе. У лістападзе 1980 г. прызваны ў Савецкую армію Партызанскім РВК г. Мінск. З сакавіка 1981 г. служыў у Афганістане. Камандзір аддзялення, сяржант В.М.Логвін загінуў 23.7.1981 г. пры выкананні баявога задання. Пахаваны ў в. Крынка. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

МОШЧЫН Анатоль Уладзіміравіч. Нарадзіўся 6.1.1964 г. у в. Заняцечча Асіповіцкага р-на. Беларус. У 1981 г. закончыў Крамоцкую сярэднюю школу. Працаваў камбайнерам у калгасе. У 1981 г. паступіў у Мінскі аўтатэхнікум. У сакавіку 1982 г. прызваны ў Савецкую армію Савецкім РВК г. Мінск. Служыў у Афганістане. 7.9.1982 г. у час следавання праз населены пункт Махаджары калона савецкіх войскаў была абстраляна. Узважыўшы абстаноўку, стралок, радавы А.У.Мошчын агнём з кулямёта прыкрыў таварышаў, але быў паранены. Ён не пакінуў поле бою, знішчыў 6 душманаў. А.У.Мошчын памёр ад атрыманага ранення. Пахаваны ў в. Жыцін Асіповіцкага р-на. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

СУГЛОБА Анатоль Міхайлавіч. Нарадзіўся 23.9.1940 г. у с. Іўкаўцы Прылуцкага р-на Чарнігаўскай вобл. (Украіна). Украінец. У 1958 г. закончыў Прылуцкую сярэднюю школу. У 1958 — 1959 гг. працаваў на камсамольскай будоўлі ў г. Крывы Рог Днепрапятроўскай вобл. (Украіна). У кастрычніку 1959 г. прызваны ў Савецкую армію Жоўтневым РВК г. Днепрапятроўск. З кастрычніка 1962 г. на звыштэрміновай службе. Са снежня 1960 г. да кастрычніка 1967 г. служыў у Групе савецкіх войскаў у Германіі. У 1967 г. здаў экстэрнам экзамен за поўны курс Вольскага вышэйшага ваеннага вучылішча імя Ленінскага камсамола. З мая 1981 г. служыў у Афганістане. Начальнік армейскага харчовага склада, маёр А.М.Суглоба цяжка захварэў пры выкананні баявога задання. Памёр 9.10.1982 г. Пахаваны ў г. Асіповічы на могілках Прудок. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

СЯДЫХ Юрый Мікалаевіч. Нарадзіўся 15.9.1963 г. у п. Ліствінічнае Аніўскага р-на Сахалінскай вобл. (Расія). Рускі. У 1980 г. закончыў сярэднюю школу № 2 г. Асіповічы, у 1984 г. — Тбіліскае вышэйшае артылерыйскае камандное вучылішча. Служыў у г. Ахалцыха (Грузія). З 1984 г. у Афганістане. Камандзір агнявога ўзвода мінамётнай батарэі, лейтэнант Ю.М.Сядых прымаў удзел у 8 рэалізацыях разведданых і ў 16 засадных дзеяннях па ліквідацыі груповак душманаў. 4.8.1985 г. удзельнічаў у баявой аперацыі ў раёне населенага пункта Фармураг. Узначальваў групу карэкціроўшчыкаў артылерыйскага агню. Дакладнай карэкціроўкай спрыяў хуткаму падаўленню агню праціўніка. Памёр Ю.М.Сядых 30.11.1985 г. ад цяжкай хваробы. Пахаваны ў г. Асіповічы. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «За адвагу».

ХАНДОГА Сяргей Міхайлавіч. Нарадзіўся 9.4.1955 г. у г. Асіповічы. Беларус. У 1972 г. закончыў Пружанскую сярэднюю школу і школу ДТСААФ. У маі 1973 г. прызваны ў Савецкую армію Брэсцкім гарваенкаматам. Пасля службы ў арміі вучыўся ў Пружанскім машынабудаўнічым тэхнікуме. Пасля заканчэння тэхнікума вырашыў звязаць свой лёс з арміяй. З 1982 г. служыў у Афганістане. 15.2.1983 г. пры дастаўцы ваеннага грузу за 40 км ад г. Джэлалабад самалёт, у складзе экіпажа якога знаходзіўся старшы авіяцыйны тэхнік, прапаршчык С.М.Хандога, быў збіты праціўнікам. Экіпаж загінуў. Пахаваны ў г. Асіповічы на могілках Прудок. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

ХАЦЬКО Васіль Міхайлавіч. Нарадзіўся 17.4.1967 г. у р.п. Градзянка Асіповіцкага р-на. Беларус. У 1984 г. закончыў Градзянскую сярэднюю школу. У красавіку 1985 г. прызваны ў Савецкую армію Асіповіцкім аб'яднаным гарваенкаматам. З ліпеня 1985 г. служыў у Афганістане. Камандзір аддзялення пажарнай каманды, малодшы сяржант В.М.Хацько 12.7.1987 г. знаходзіўся ў складзе дзяжурных сіл на аэрадроме Хандагор. Не звяртаючы ўвагі на небяспеку, удзельнічаў у тушэнні гарэўшага самалета Ан-12 з боепрыпасамі. Загінуў у выніку выбуху боепрыпасаў. Пахаваны ў р.п. Градзянка. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «За баявыя заслугі».

ШПАК Віктар Мікалаевіч. Нарадзіўся 21.8.1965 г. у в. Хімное Асіповіцкага р-на. Беларус. У 1980 г. закончыў 8 класаў Ліпеньскай сярэдняй школы, у 1983 г. — Кіраўскае СПТВ № 66. У кастрычніку 1983 г. прызваны ў Савецкую армію Асіповіцкім аб'яднаным гарваенкаматам. Служыў у Афганістане. Стралок-гранатамётчык, радавы В.М.Шпак загінуў 22.7.1984 г. Пахаваны ў в. Хімное. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Ю.М.Сядых.

С.М.Хандога.

В.М.Хацько.

В.М.Шпак.

З МАТЭРЫЯЛЬНАЙ І ДУХОЎНАЙ СПАДЧЫНЫ

Развіццё культуры

У час вайны амаль усе ўстановы культуры раёна былі знішчаны, акрамя клуба чыгуначнікаў. Увесь кніжны фонд спалены. Пасля вызвалення адначасова з аднаўленнем разбураных вайной сельскай гаспадаркі і прамысловасці вялося будаўніцтва і аб'ектаў культуры.

Ужо да канца 1940-х гадоў агульная колькасць устаноў культуры дасягала 30, у тым ліку клуб чыгуначнікаў, 9 калгасных, 6 прафсаюзных. Працавалі 1 раённая, 2 сельскія і 3 прафсаюзныя бібліятэкі, 6 бібліятэк мелася пры хатах-чытальнях.

У 1950-я гады працягвалася будаўніцтва і адкрыццё клубных устаноў і бібліятэк, ствараліся першыя калектывы мастацкай самадзейнасці. У 1951 г. пры раённым Доме культуры быў арганізаваны цымбальны аркестр (першы кіраўнік — Г.А.Мароз). У 1952 г. пабудаваны кінатэатр «Радзіма». У 1952 г. адкрылася раённая дзіцячая бібліятэка, а ў 1956 г. — дзіцячая музычная школа.

У 1960-я гады умацоўвалася матэрыяльная база культуры. У раёне налічвалася 38 дамоў культуры і клубаў, 130 чырвоных куткоў, 51 бібліятэка з кніжным фондам 461 тысяча экзэмпляраў літаратуры. Паслугамі бібліятэк карысталіся 32 тысячы чытачоў. У 1961 г. было закончана будаўніцтва новага будынка раённага Дома культуры.

У 1970—1980-я гады ў жыццё людзей трывала ўваходзіць кіно. У раёне было 64 кінаўстаноўкі, з іх 58 стацыянарных. Штогод кінасеансы наведвала каля 1 млн. гледачоў. Развіваліся гурткі мастацкай самадзейнасці і народнай творчасці. У 1986 г. пры раённым Доме культуры створаны хор ветэранаў вайны і працы. Першым кіраўніком хора стаў М.С.Сідоранка.

Будуюцца тыпавыя дамы культуры ў вёсках Жорнаўка, Ясень, Вяззе, Краснае.

У гэты перыяд вялікі ўклад у развіццё культуры ў раёне ўнеслі загадчык аддзела культуры райвыканкома А.М.Цяцерын, заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь, кінамеханік Л.А.Галіеўская, якая ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, дырэктар Свіслацкага СДК Л.М.Сарока, загадчыца раённай бібліятэкі А.В.Наканечнікава, загадчыца раённай дзіцячай бібліятэкі Н.А.Вядзерка, якія былі ўдастоены знака Міністэрства культуры СССР «За выдатную працу».

У 1990-я гады, нягледзячы на складанасць таго часу, у раёне былі ўзведзены новыя будынкі сельскіх клубаў у вёсках Пагарэлае і Дражня, тыпавая бібліятэка ў г. Асіповічы, пачалася рэканструкцыя будынка пад гісторыка-краязнаўчы музей, адкрыліся дзіцячыя музычныя школы ў вёсках Пратасевічы, Жорнаўка, Дараганава, другая дзіцячая музычная школа ў г. Асіповічы.

Адбылося рэфармаванне сеткі ўстаноў культуры, адкрыліся новыя тыпы ўстаноў: раённы Цэнтр народных рамёстваў, 2 дзіцячыя школы мастацтваў.

Папулярнымі ў раёне сталі фестывалі «Веснавыя колеры», «Асіповіцкая зорка». У 1996 г. у раёне быў праведзены першы

ў рэспубліцы фестываль аўтэнтычнага фальклору Беларускага Падняпроўя.

У 1999 г. на Асіповіччыне працавала 36 бібліятэк цэнтралізаванай сістэмы і 2 прафсаюзныя бібліятэкі. Для забеспячэння больш паўнацэннага абслугоўвання жыхароў у г. Асіповічы ў 1999 г. была адкрыта яшчэ адна публічная бібліятэка. Усяго паслугамі бібліятэк цэнтралізаванай сістэмы карыстаецца амаль 26 тысяч чытачоў, што складае 44 працэнты ад агульнай колькасці насельніцтва горада і раёна.

У рабоце бібліятэк вядучае месца трывала займае краязнаўчая тэма. У рэспубліканскім конкурсе дзіцячых бібліятэк «Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры» раённая дзіцячая бібліятэка стала пераможцам. Ва ўсіх бібліятэках вядзецца збор паданняў, звестак аб сваёй мясцовасці, ствараюцца летапісы вёсак.

Сапраўднымі цэнтрамі культуры горада і раёна сталі раённая і гарадская дзіцячая бібліятэкі, гарадскія бібліятэкі № 1 і № 2, Вяззеўская, Савецкая, Замошская сельскія бібліятэкі.

Пры бібліятэках раёна працуюць 30 аматарскіх аб'яднанняў самай рознай накіраванасці, работа якіх садзейнічае ўсебаковаму развіццю талентаў і здольнасцей асобы.

На працягу многіх гадоў раённая дзіцячая бібліятэка вядзе мэтанакіраваную работу з дзецьмі-інвалідамі. Паспяхова працуе тут клуб «Чулае сэрца». Заслугоўваюць увагі такія аматарскія аб'яднанні, як дзіцячыя лялечныя тэатры Савецкай сельскай і гарадской дзіцячай бібліятэк.

У 2000 г. клубная сістэма раёна стала пераможцам рэспубліканскага конкурсу ў намінацыі «Развіццё жанраў самадзейнай творчасці і культурнага абслугоўвання насельніцтва сельскіх рэгіёнаў». Значны ўклад у развіццё культуры раёна ўнеслі загадчык аддзела культуры райвыканкома В.Ф.Налівайка (узнагароджаны Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і ганаровым знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За значны асабісты ўклад у развіццё беларускай культуры»), дырэктар цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы І.А.Тоўсцік, загадчыца раённай дзіцячай бібліятэкі В.Л.Логвін, дырэктар Вязаўніцкага сельскага Дома культуры В.А.Ліхадзіеўская, дырэктар Вяззеўскага сельскага Дома культуры М.Г.Забаўскі, дырэктар Асіповіцкай дзіцячай школы мастацтваў С.М.Цвырко, выкладчык дзіцячай школы мастацтваў Дж.У.Рабава.

Аддзелам культуры ўстаноўлены культурныя сувязі з рознымі рэгіёнамі Расіі, Украіны, Польшчы, Малдовы.

ДЗІЦЯЧАЯ ШКОЛА МАСТАЦТВАЎ

Асіповіцкая дзіцячая школа мастацтваў была адкрыта ў 1956 г. і існавала спачатку як музычная школа. Навучанне вялося па

Прызёры абласнога конкурсу навучэнцаў дзіцячых музычных школ Ірына Арцюшэўская, Ірына Рабцава, Яўген Еўдакімчык і педагог Л.М.Шумілава.

класу баяна, акардэона, фартэпіяна, цымбал. Нешматлікі, але таленавіты калектыў зрабіў вельмі многае для станаўлення музычнай адукацыі ў горадзе. Першым дырэктарам школы была А.Р.Леаненка.

У 1960-я гады школу ўзначаліў Б.П.Гарнастаеў, які кіраваў школай 25 гадоў. За гэты час кантынгент школы вырас да 200 чалавек. Адкрыліся аддзяленні скрыпкі, духавых інструментаў. У 1992 г. адкрыта харэаграфічнае аддзяленне.

Навучэнцы школы сталі ўпэўнена займаць першыя месцы ў абласных конкурсах, прадстаўляць вобласць на рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах. У 1994 г. вучаніца Аня Сітнік стала пераможцай I рэспубліканскага конкурсу «Усе мы родам з дзяцінства». Хор старшых класаў стаў лаўрэатам рэспубліканскага фестывалю імя Р.Шырмы.

У 2001 г. кантынгент школы складаў 500 чалавек. Навучанне вядзецца на ўсіх інструментах, а таксама па класу харэаграфіі. Калектыў выкладчыкаў, які складаецца на 3/4 з выпускнікоў школы, забяспечвае высокапрафесійны ўзровень выкладання. У школе дзейнічаюць хор старшых класаў, хор малодшых класаў, духавы і цымбальны аркестры, аркестр баянаў і акардэонаў, 2 ансамблі скрыпачоў (старэйшы і малодшы), танцавальны ансамбль. Створана школьная студыя гуказапісу.

За 40 гадоў існавання школу закончыла больш за 1500 чалавек.

НАРОДНЫЯ КАЛЕКТЫВЫ АСІПОВІЦКАГА РАЁНА

Ансамбль беларускай песні «Вязанка» Вяззеўскага сельскага Дома культуры. Створаны ў 1986 г., званне народнага прысвоена ў 2000 г. Кіраўнік М.Г.Забаўскі. Больш за 100 аўтэнтычных узораў беларускіх народных песень, што бытуюць у вёсках Асіповіцкага і суседняга Клічаўскага раёнаў, запісана ўдзельнікамі ансамбля. Паступова яны ўключаюцца ў рэпертуар калектыву, аснову якога складаюць творы на 3—4 галасы з элементамі харэаграфіі, а таксама народныя абрады «Радзіны», «Заручыны», тэатралізаваныя народна-святочныя прадстаўленні «Каляды», «Гуканне вясны», «Сёмуха», «Купалле», «Зажынкі». Калектыў неаднойчы ўдзельнічаў у фестывалях і конкурсах, іншых культурных мерапрыемствах; толькі за 1999 г. ім дадзена 46 канцэртаў для жыхароў Асіповіцкага раёна.

Народны аматарскі тэатр Асіповіцкага раённага цэнтра культуры. Створаны ў 1989 г. на базе драматычнага гуртка, які існаваў з пачатку 1970-х гадоў. Званне народнага прысвоена ў 1995 г. Кіраўнік Н.А.Дрозд (з 1989). У 1990 г. створана аматарскае тэатральнае аб'яднанне. У рэпертуары п'есы «Прымакі» і «Паўлінка» Я.Купалы, «Лявоніха на арбіце» А.Макаёнка, «А зоры тут ціхія» Б.Васільева, «Печка на коле» Н.Сямёнавай, «Збянтэжаны Саўка» Л.Родзевіча, «Ветрагоны» У.Галубка і інш.

Народны ансамбль беларускай народнай песні і музыкі «Люлечка». Створаны ў 1988 г.; званне народнага прысвоена ў 1991 г. Кіраўнік В.І.Давідовіч. У рэпертуары беларускія народныя песні і інструментальныя творы беларускіх народных песень і найгрышаў. Ансамбль — лаўрэат II фестывалю беларускай музыкі і песні, прысвечанага 500-годдзю з дня нараджэння Ф.Скарыны, удзельнік рэспубліканскага фестывалю «Гучаць цымбалы і гармонік» у г. Паставы, Міжнароднага фальклорнага фестывалю ў Рэспубліцы Малдова.

Народны ансамбль сучаснага эстраднага танца «Капрыз» Асіповіцкага раённага цэнтра культуры. Створаны ў 1994 г., званне народнага прысвоена ў 1999 г. Кіраўнік Д.У.Шатанава. Аб'ядноўвае 30 юнакоў і дзяўчат ва ўзросце да 18 гадоў. Ставіць сабе за мэту прапаганду сучаснай эстраднай творчасці. У рэпертуары 34 нацыянальныя беларускія танцы. «Капрыз» — лаўрэат гарадскіх конкурсаў эстраднага танца, раённых фестываляў народнага мастацтва. У жніўні 1998 г. стаў фіналістам рэспубліканскага тэлефестывалю «Залатыя ключы». Гастралюе па гарадах Беларусі. Пры ансамблі працуе дзіцячая студыя эстраднага танца «Асарці».

Народны духавы аркестр аддзела культуры Асіповіцкага райвыканкома. Створаны ў 1982 г., званне народнага прысвоена ў 1998 г. Кіраўнік С.І.Ашэйчык. Аб'ядноўвае 22 музыканты. Аркестр — пастаянны ўдзельнік свят, афіцыйных і культурна-масавых мерапрыемстваў. Выступае на раённых і абласных фестывалях, конкурсах і аглядах мастацкай самадзейнасці, вядзе актыўную канцэртную дзейнасць. У 1997 г. стаў дыпламантам

Народны ансамбль беларускай народнай песні і музыкі «Люлечка».

абласнога агляду духавых аркестраў, а ў 1998 г. лаўрэатам першага рэспубліканскага фестывалю народнага мастацтва «Беларусь — мая песня».

Народны хор ветэранаў вайны і працы Асіповіцкага раённага цэнтра культуры. Створаны ў 1985 г., званне народнага прысвоена ў 1986 г. Кіраўнік Л.У.Грынько. Арганізатары хору — ветэраны вайны П.С.Санковіч і М.С.Сідоранка, першыя ўдзельнікі — Ф.І.Давыдаў, М.М.Касічкін, І.І.Хічэўскі, Н.Н.Хічэўская, Р.І.Іваноў, І.І.Цвырко, А.Ф.Жывоў, І.Л.Доўгаль, В.М.Ермакова, А.М.Цяцерын. Хор часта выступае на канцэртных пляцоўках, у дамах культуры і клубах раёна, а таксама

Народны хор ветэранаў вайны і працы. 1985 г.

Народны майстар Л.М.Андрыевіч.

ў Бабруйску, Мінску, Магілёве, суседніх раёнах. З'яўляецца лаўрэатам 2-га і 3-га рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці «Не старэюць душой ветэраны».

Народны цымбальны аркестр Асіповіцкага раённага цэнтра культуры. Створаны ў 1951 г., званне народнага прысвоена ў 1965 г. Кіраўнік А.А.Яршоў. Ініцыятарам стварэння аркестра на базе інструментальнага квартэта сям'і Барадаўка быў дырэктар РДК А.М.Цяцерын. У 1960 г. аркестр стаў удзельнікам заключнага канцэрта рэспубліканскага агляду мастацкай самадзейнасці ў Мінску. Калектыў бярэ ўдзел ва ўсіх раённых і абласных аглядах, фестывалях і конкурсах. У 1965 і 1974 гг. выступаў у Маскве на ВДНГ СССР, дзе кіраўнік аркестра М.С.Філатаў быў удастоены сярэбранага медаля.

Студыя лозапляцення калектыву дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва раённага Цэнтра рамёстваў. Узнікла ў 1995 г. як гурток лозапляцення (заснаваў Л.М.Андрыевіч, з 2001 г. кіраўнік У.І.Слабоднік), у 1998 г. пераўтвораны ў студыю пры Красненскім СДК. Калектыў студыі ўдзельнік першага рэспубліканскага свята лозапляцення, абласной выстаўкі «Традыцыйныя ўзоры» і інш. Званне народнага прысвоена ў 1997 г.

Фальклорны ансамбль «Вечарынка» Ялізаўскага сельскага Дома культуры. Створаны ў 1974 г., званне народнага прысвоена ў 1995 г. Кіраўнік Д.У.Рабава. Аб'ядноўвае рабочых, служачых, пенсіянераў (21 чалавек) р.п. Ялізава. У рэпертуары — беларускія народныя абрадавыя і святочныя песні. Ансамбль з'яўляецца

Фальклорны ансамбль «Вяселле» Каўгарскага сельскага Дома культуры.

лаўрэатам і дыпламантам II Усесаюзнага фестывалю народнай творчасці, удзельнічае ва ўсіх аглядах мастацкай самадзейнасці.

Фальклорны ансамбль «Вяселле» Каўгарскага сельскага Дома культуры. Створаны ў 1978 г., званне народнага прысвоена ў 1991 г. Кіраўнік А.Ф.Цімашэнка. Аб'ядноўвае рабочых і служачых калгаса «Каўгарскі» (20 чалавек). Ансамбль ставіць сабе за мэту прапаганду лепшых узораў народнай творчасці. У рэпертуары старадаўнія беларускія песні (карагодныя, вясельныя, жартаўлівыя), а таксама праграма «Запрашаем на вячоркі». Калектыў з'яўляецца пастаянным удзельнікам раённых і сельскіх культурна-масавых мерапрыемстваў, розных свят, выступае ў Старых Дарогах, Глуску, Бабруйску, Пухавічах і іншых населеных пунктах.

Хор народнай песні Вязаўніцкага сельскага Дома культуры. Створаны ў 1985 г., званне народнага прысвоена ў 1994 г. Кіраўнік Ю.І.Камісараў. Аб'ядноўвае больш за 30 чалавек. У рэпертуары каля 50 беларускіх народных песень, якія неаднаразова запісваліся на Беларускім радыё, гучалі ў абласной перадачы «Спадчына». Калектыў выступае не толькі ў Асіповіцкім раёне, але і ў розных кутках Магілёўскай вобл., суседніх раёнах Мінскай вобл.

Радок у біяграфію паэта

Ці трэба паўтараць, якім нялітасцівым да Максіма Багдановіча быў яго лёс? Невылечная хвароба, заняткі юрыспрудэнцыяй, да якой не ляжалі ні сэрца, ні розум, бытавая неўладкаванасць з яе абыякава-паўсядзённым настроем нешта змяніць, палепшыць, бо, усё роўна, лепш не будзе... Але, бадай, самым балючым і пакутлівым для Багдановіча было растанне з радзімай, бацькаўшчынай. Той, хто быў беларусам, не проста па паходжанні, але па самасвядомасці, самавыяўленні, мусіў трызніць аб ёй, як аб збавенні. Найдаражэйшае і наймілейшае ў яго жыцці існавала па-за часам і па-за прасторай.

І зусім не дзіўна, што сёння кожная мясціна на Беларусі, так ці інакш звязаная з імем Багдановіча, спавіта з пачуццём высокага смутку і асаблівай замілаванасці. Іх у нас небагата. Гэта Мінск з яго Траецкім прадмесцем, вуліцай Талстога і былой Захар'еўскай (цяпер Савецкая), прывакзальныя мясціны Гародні і, нарэшце, Ракуцёўшчына, дзе чэрпаў паэт поўнымі жменямі «з глыбінь жыватворных народнага духу». Прычым свядомага, асэнсаванага часу «беларускага быцця» было толькі 6 месяцаў: 2 на Маладзечаншчыне і 4 у Мінску пасля пераезду з Яраслаўля.

Колькі часу таму пералік багдановічаўскіх мясцін на Беларусі быў бы поўны. Сёння ў ім не хапае ўжо адной назвы: вёскі Вяззе Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці.

Сенсацыя? Не. Усяго толькі ўдакладненне біяграфічных звестак.

Іронія лёсу. Некалі бацька Максіма — Адам Ягоравіч — пісаў, што па злой недарэчнасці не сыну выпала пісаць успаміны пра бацьку, а яму — пра сына.

Тое ж самае і з архівам бацькі і сына. Як вядома, архіў Максіма Багдановіча без следу знік у гады Вялікай Айчыннай вайны. Паперы ж Адама Ягоравіча захаваліся і знаходзяцца ў Інстытуце літаратуры імя Я.Купалы Нацыянальнай АН Беларусі. Якраз яны і навялі на нязначны дагэтуль след Максіма.

Сярод іншых матэрыялаў архіва А.Я.Багдановіча — 12 лістоў Марыі Апанасаўны Багдановіч (маці Максіма) да мужа ў Гародню, якія пазначаны наступным зваротным адрасам: Лібава-Роменская чыгунка, станцыя Асіповічы, маёнтак Вяззе, Секяржыцкаму Францу Антонавічу (для М.А.Б)». Першы ліст датуецца 31 сакавіка 1895 года, апошні — 29 ліпеня таго ж года. Малавядомае прозвішча Секяржыцкага, відаць, і ўвяло ў падман даследчыкаў жыццёвага шляху Максіма Багдановіча, бо да гэтага часу лісты гэтыя былі па-за іх увагай. Хоць, на першы погляд, яны маюць як быццам бы вельмі прыватны характар, але вартыя самага дэталёвага прачытання.

І вось чаму. Родная сястра маці Максіма Багдановіча — Сцепаніда Апанасаўна — была замужам за Ф.А.Секяржыцкім. Свайму швагру А.Я.Багдановіч памог атрымаць месца аб'ездчыка ў Вяззеўскім лясніцтве, якое належала Мікалаю Радзівілу.

І вось вясной 1895 года сюды, у Вяззе, разам са сваімі трыма сынамі прыязджае Марыя Апанасаўна Багдановіч. Большаму, Вадзіму, было 5 гадоў, Максіму ішоў чацвёрты, а Лёву не было яшчэ і 1 года. Калі меркаваць па пісьмах, усе чацвёра пражылі тут каля чатырох месяцаў.

Жыццё ў Вяззі было цікавае і разнастайнае. Побач рэчка, лес, поле, непадалёку маёнтак пана Янкоўскага, які арандаваў зямлю ў Мікалая Радзівіла. «Вчера водила детей на мельницу», — піша мужу ў адным з лістоў Марыя Апанасаўна. А млыноў у Вяззі было аж 2: адзін — «панскі», для гаспадарчых патрэб маёнтка, другі — працаваў на вёску.

Лісты Марыі Апанасаўны данеслі да нас яшчэ адну надзвычай каштоўную інфармацыю пра знаходжанне будучага паэта ў Вяззі. Без гэтага факта сувязь «Максім Багдановіч — Вяззе» не была б сёння такой глыбіннай і значнай.

Як вядома, моўная стыхія, у якой выхоўваўся Максім Багдановіч, была ў аснове сваёй рускай. Нягледзячы на тое, што бацькі паэта былі беларусамі і на той час людзьмі адукаванымі і высокакультурнымі, родная мова так і не стала для іх размоўнай. Прычынай гэтаму паслужылі, відаць, і тэндэнцыйныя адносіны да беларускай мовы, і асяроддзе (лекары, вайскоўцы, настаўнікі), у якім знаходзіліся Багдановічы. Таму зусім не дзіўна, што ў лісце ад 29 мая 1895 года Марыя Апанасаўна з занепакоенасцю піша пра сваіх дзяцей: «Вот только плохо, что стали говорить по-белорусски и иногда такое словечко выпалят, что хоть сквозь землю провались».

Калі раней у Гародні і яе ваколіцах маленькі Максім мог чуць беларускую мову выпадкова, час ад часу, то тут, у Вяззі, ён поўнасцю акунуўся ў стыхію роднай мовы.

Думаецца, што якраз тут, у Вяззі, самнасам з прыродай, у акружэнні простага люду і запала ў сэрца Максіма Багдановіча беларускае слова. Хай сабе неўсвядомлена, паміж іншым. Але праз колькі год яно прарасце ў ім, прарасце магутным коласам сапраўднай паэзіі. Чатыры месяцы быццё ў чароўным палоне матчынай мовы, калі бачылася шматфарбна, чулася востра, а думалася лёгка і вольна, бясследна не знікнуць: яны назаўсёды адкладуцца ў памяці.

Так, неміласэрным быў лёс да Максіма Багдановіча. Але таму, відаць, і сплаціў яму Час сваёй поўнай мерай, аддаў належнае яго таленту.

Мясцовыя доўгажыхары — Герасімчык Алена Барысаўна, Андрыевіч Пётр Дзмітрыевіч, Трыбушэўскі Піліп Барысавіч (жыве ў Мінску) — добра памятаюць, як у Вяззі задоўга да рэвалюцыі жыў пан Секяржыцкі, што служыў у Радзівілаў аб'ездчыкам. (Зразумела, ніякі гэта быў не пан, але для вясковага жыхара тых часоў «пан» і «аб'ездчык» паняцці амаль што ідэнтычныя). Паказвалі яны і дом, у якім

Дом у в. Вяззе, у якім у 1895 г. жыла М.А.Багдановіч з дзецьмі.

жыў Секяржыцкі са сваёй сям'ёй. Будынак гэты добра захаваўся, бо недзе ў 1940-я гады яго перасыпалі, каб размясціць у ім школу (старая, што месцілася ў панскім маёнтку, згарэла ў час вайны). Перабудавалі на тым самым месцы, з тых самых бярвенняў. Толькі ўваход зрабілі з другога боку. А як напамінак аб старым — дзве ліпы, якія раслі абапал ганка. Зараз ім гадоў пад 120, калі не больш, а трэцяй (яна крышку ўбаку) — дык і ўсе 200.

Мяркуючы па ўсім, якраз у гэтым доме і спынялася Марыя Апанасаўна з дзецьмі, бо іншых будынкаў, акрамя гаспадарчых, Секяржыцкія не мелі.

Вядома ж, такой «падзеі», як прыезд сястры да жонкі аб'ездчыка Секяржыцкага, ніхто з доўгажыхароў не помніць. У віры летніх клопатаў селяніна пра гаспадарку, хай сабе і ў такім невялікім маёнтку, як Вяззе, факт гэты забыўся. Затое амаль кожны з больш-менш сталых жыхароў вёскі можа паказаць сёння безгалосых сведак знаходжання будучага паэта ў Вяззі. Гэта дрэвы, якія помняць маленькага Максіма, — пара клёнаў, што засталіся ад панскай алеі, а таксама тры яблыні на ўскрайку калгаснага саду.

П.С.Качановіч.

З архітэктурнай спадчыны

ПРАВАСЛАЎНЫЯ ХРАМЫ

Царква ў в. Казімірава. Пабудавана ў XVIII ст. з дрэва як уніяцкая на месцы храма, фундаванага ў канцы XVII ст. Юдзіцкімі. Вядома па малюнку 1928 г. Не існуе.

Твор народнага дойлідства з рысамі барока. Была вырашана паводле канона 3-нефавай 2-вежавай базілікі. Плоскасны франтальны фасад карнізнымі паясамі чляніўся на 2 ярусы, быў завершаны па цэнтры трохвугольным франтонам і фланкіраваны 2-яруснымі чацверыковымі вежамі, завершанымі плыстычнымі барочнымі купалкамі. Вертыкальна ашаляваныя фасады чляніліся лучковымі аконнымі праёмамі. Уваход адзначаў 4-слуповы ганак пад 2-схільным дашкам. Царкоўны цвінтар абкружала агароджа з бярвення, сярод якой на восі храма стаяла 2-ярусная (васьмярык на чацверыку) паштовая званіца-брама.

А.М.Кулагін.

Друкуецца па кн.: К у л а г і н А.М. Праваслаўныя храмы на Беларусі. Мн., 2001. С. 252.

Пакроўская царква ў в. Галынка. Пабудавана ў 1802 г. Не існуе.

Царква крыжападобная ў плане, з адным адкрытым жалезным купалам і звонам у франтальнай частцы. Дах гонтавы, пафарбаваны ў чырвоны колер. Сцены звонку жоўтыя, знутры пабеленыя. Іканастас блакітнага колеру, з пазалочанай рамай і карнізамі. На ім мелася 12 абразоў, з якіх вылучаўся абраз Божай Маці памерамі 2х1,5 аршына.

Свята-Пакроўская царква ў в. Пагарэлае. Пабудавана ў 1806 г. з дрэва на сродкі мясцовага памешчыка Завішы. Не існуе.

Царква крыжападобная ў плане, з двума глухімі купаламі, гонтавым дахам, адным радам вокнаў і трыма дзвярамі. Плошча 34 квадратныя сажні. Падлога цагляная, столь з дошак, сцены непафарбаваныя. Царква не ацяплялася. Іканастас чырвонага колеру, на ім 9 абразоў. Званіца месцілася асобна, на ёй было 3 званы ў 6, 4 і 1 пуд. Да храма была прыпісана царква Троіцы ў в. Ляды.

Свята-Пакроўская царква ў в. Кабылянка. Пабудавана ў 1814 г. з дрэва. У 1900 г. недалёка ад храма пабудавана царкоўнаприходская школа. Не існуе.

Твор народнага дойлідства. Была вырашана прамавугольным зрубам пад гонтавым дахам, які завяршаўся купалам. З франтальнага боку выступала 1-ярусная званіца аднолькавай вышыні з храмам. Абшытыя цёсам фасады чляніліся 8 вялікімі і 2 малымі аконнымі праёмамі.

А.М.Кулагін.

Друкуецца па кн.: К у л а г і н А.М. Праваслаўныя храмы на Беларусі. Мн., 2001. С. 252.

Свята-Казьма-Дзям'янаўская царква ў в. Зборск. Знаходзілася непадалёку ад вёскі. Пабудавана ў 1826 г. з дрэва як прыходская на сродкі мясцовага памешчыка Завішы. Была абкружана драўлянай агароджай са званіцай. Вядома мясцовашанаваным абразом «Маці Божая». Храм не існуе.

Твор народнага дойлідства. Царква была вырашана квадратным у плане

Царква ў в. Зборск. Здымак 1950-х гадоў.

зрубам з купалам на светлавым барабане над шатровым гонтавым дахам. Плошча 49 квадратных сажняў. Падлога цагляная, столь з дошак, сцены пафарбаваныя толькі вакол алтара. Царква не ацяплялася. Званіца ў франтоннай частцы завяршалася макаўкай. Мелася 3 званы ў 5, 2,5 і 1,5 пуда. Ашаляваныя фасады члянілісь радам аконых праёмаў.

Унутры апсіду вылучаў дашчаны 1-ярусны іканастас на 9 абразоў: на цёмна-блакітным фоне чырвонай афарбоўкай выдзяляліся карнізы і рамы абразоў. Да храма была прыпісана могільнікавая Пакроўская царква ў в. Вяззе.

Мікалаеўская царква ў в. Жыцін. Пабудавана ў 1827 г. з дрэва на сродкі прыхаджан і пана. «Жыцінскі поп» упамінаецца ў дакументах XVI ст. Не існуе.

Царква крыжападобная ў плане, з адкрытым купалам і званіцай у франтальнай частцы. Дах гонтавы, дзверы адны, вокны ў 3 рады. Плошча 20 квадратных сажняў. Столь з дошак, купал падтрымліваўся чатырма слупамі. Царква не ацяплялася. Іканастас белага колеру, на ім 10 абразоў. На званіцы мелася 4 званы ў 35, 20, 16 і 10 фунтаў. Метрычная кніга вялася з 1803 г.

Узвіжанская царква ў в. Ясень. Дзейнічала з 1829 г. Не існуе.

Царква Архангела Міхаіла ў в. Крынкі. Пабудавана ў 1841 г. з дрэва на сродкі князя Вітгенштэйна. Размяшчалася за 2 вярсты ад вёскі. Не існуе.

Царква прамавугольная ў плане, з адкрытым купалам пасярэдзіне, радам вакон і дзвярамі. Плошча 20 квадратных сажняў. Столь над алтаром з дошак, у самой царкве — купалападобная. Сцены непафарбаваныя. Іканастас сіняга колеру, на ім 4 абразы. Званіца месцілася асобна ад царквы, на ёй былі званы ў 20, 15, 10 фунтаў і ў 1 пуд. Метрычная кніга вялася з 1801 г. Да храма была прыпісана Мікалаеўская царква ў в. Пратасевічы.

Успенская царква ў в. Свіслач. Перабудавана ў 1864 г. на сродкі дзяржавы. Не існуе.

Царква драўляная прамавугольная ў плане, з адным глухім купалам і званіцай у франтальнай частцы. Дах гонтавы, адзін рад акон і адны дзверы. Плошча 45 квадратных сажняў. Столь і падлога з дошак, сцены пабеленыя, ацяпленне адсутнічала. Алтар на ўзвышэнні, іканастас белага колеру. Мелася 2 званы ў 2,5 і 1,5 пуда. Да храма былі прыпісаны цэрквы Варварынская ў в. Шэйпічы і Міхайлаўская ў в. Гарожа.

Мікалаеўская царква ў в. Свіслач. Перабудавана ў 1864 г. на сродкі дзяржавы (у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі захоўваецца перапіска наконт рамонту гэтай царквы паміж губернскімі ўладамі і панамі Незабытоўскімі). Не існуе.

Царква драўляная на каменным падмурку. Крыжападобная ў плане, з адным купалам і званіцай у франтальнай частцы.

Дах на купале жалезны, на храме – гонтавы. Вокны ў 3 рады, дзверы адны, вонкавыя сцены жоўтага, дах — зялёнага колеру. Плошча 40 квадратных сажняў. Столь і падлога з дошак, сцены ўнутры блакітныя. Іканастас белага колеру з пазалочанымі карнізамі. У царкве былі абраз «Маці Божая», пісаны на залатым фоне, і прастольны крыж у 3 фунты серабра. На абразе меўся надпіс: «Снимок сей чудотворной иконы офяровал Ермон с женою своею Еленою Бюрец до церкви Святого Миколы на честь и хвалу Господу Богу. 1654 год»; на крыжы – «Тен криж офяровал Святого Миколы Демян, сшедши о полудня 1614 года майя 26 дня». Да храма былі прыпісаны цэрквы Раства Багародзіцы ў в. Кассе, Пакроўская ў в. Татаркавічы, Праабражэнская ў в. Брыцалавічы, Георгіеўская ў в. Каменічы.

Свята-Георгіеўская царква ў в. Лапічы. Знаходзілася побач з вёскай. Пабудавана ў 1868 г. з дрэва на ўрадавыя сродкі (3000 руб.) на месцы храма, адзначанага ў 1795 г. Не існуе.

Твор рэтраспектыўна-рускага стылю. Была вырашана падоўжаным у плане крыжам са званіцай у франтоннай частцы і двума глухімі купаламі над гонтавым дахам. Пафарбаваныя знутры і звонку сцены чляніліся радам аконных праёмаў. Плошча 25 квадратных сажняў. Падлога і столь дашчаныя, ацяпленне адсутнічала. Мела 3 уваходы. Унутры апсіду вылучаў 1-ярусны драўляны іканастас на 4 абразы. Метрычная кніга вялася з 1822 г.

Ю.В.Клеванец.

Царква Раства Хрыстова ў рабочым пасёлку Ялізава.

Свята-Раства-Багародзіцкая царква ў в. Халуі (з 1920 г. называецца **в. Ліпень).** Знаходзілася ў цэнтры вёскі. Пабудавана з дрэва на сродкі мясцовага памешчыка Завішы і прыхаджан. На 1897 г. адзначана ў трухлявым стане. Не існуе.

Твор народнага дойлідства. Была вырашана прамавугольным зрубам, накрытым гонтавым дахам з трыма

Касцёл у в. Казімірава.

глухімі купаламі. Сцены чляніліся радам аконных праёмаў. Плошча 30 квадратных сажняў. Падлога і столь з дошак. Мела 2 уваходы. Унутры апсіду вылучаў 1-ярусны цёмна-зялёны іканастас на 13 абразоў. Званіца стаяла асобна, меліся званы ў 12, 2,5, 2 і 1,5 пуда. Метрычная кніга вялася з 1800 г. Да храма былі прыпісаны цэрквы Мікалаеўская ў в. Бозак, Троіцкая ў в. Халуі (цяпер урочышча Стараселле), Міхайлаўская ў в. Каменічы, Пакроўская ў в. Хімное.

Крыжа-Узвіжанская царква ў г. Асіповічы. Перанесена з в. Замошша. Асвячона ў 1949 г. Дзейнічае.

Царква абраза «Маці Божая» ў в. Коханаўка. Асвячона ў 1992 г. Дзейнічае.

Свята-Міхайлаўская царква ў в. Крамок. Асвячона ў 1994 г. Дзейнічае.

Царква Раства Хрыстова ў р.п. Ялізава. Асвячона ў 1997 г. Дзейнічае.

Свята-Мікольская царква ў в. Свіслач. Асвячона ў 1998 г. Дзейнічае.

Свята-Увядзенская царква ў г. Асіповічы. Асвячона ў 2000 г. Дзейнічае.

КАТАЛІЦКІЯ ХРАМЫ

Капліца ў г. Асіповічы. Дзейнічае.

Касцёл Святога Юзафа ў в. Казімірава. Дзейнічае.

Асіповіцкая вёска вачыма этнографа*

У 1920-я гады Асіповіцкае краязнаўчае таварыства правяло падрабязнае вывучэнне своеасаблівасцей сучаснага жыцця розных частак Асіповіцкага раёна.

Апрацаваныя старшынёй таварыства А.Г.Немцавым матэрыялы гэтых даследаванняў утрымліваюць каштоўныя звесткі пра розныя бакі традыцыйнага побыту нашых землякоў.

Гаспадарка

Асноўным заняткам насельніцтва Асіповіцкага раёна з'яўляецца сельская гаспадарка. Спосаб земляробства — трохпалёўка пры церазпалосным карыстанні. Змена раслін такая:

	1 поле	2 поле	3 поле
1-ы год	жыта	ярына	папар
2-і год	ярына	папар	жыта
3-і год	папар	жыта	ярына

Ураджаі залежаць ад якасці глебаў. У сярэднім бываюць наступныя:

	Зборскі с/с, пудоў/дзесяціна	Ясеньскі с/с, пудоў/дзесяціна
жыта	40—45	100
авёс	40	—
проса	—	100
ячмень	45—50	70—80
грэчка	30	—
бульба	450—500	800—1000
шаніца	35—40	80—100
лён (насенне)	30	30

Штучнага ўгнойвання глебы сялянства не ўжывае — адзіным угнаеннем з'яўляецца гной.

З сельскагаспадарчых прылад ёсць у кожнай гаспадарцы плуг, барана, калёсы, сані. Больш складаныя прылады — малатарні, саламарэзкі, арфы сустракаюцца радзей, іх колькасць у вёсках залежыць ад заможнасці гаспадарак.

Гародніцтва не носіць прамысловага характару і служыць для задавальнення толькі патрэб гаспадаркі і сям'і і вельмі мала ідзе на продаж. Звычайная гародніна — капуста, морква, гуркі.

Таксама спажывецкі характар мае і садоўніцтва.

Пчалярства шырока распаўсюджана — амаль у кожнай вёсцы ёсць пчаляры. Мёд у большасці ідзе на свае патрэбы, але ж іншыя гаспадары яго і прадаюць.

Жывёлагадоўля

На адну гаспадарку прыходзілася ў сярэднім па 1 каню, 2—3 галавы буйной рагатай жывёлы, 4—5 свіней, 3—4 авечкі.

Пароды жывёлы мясцовыя; з заводскага быдла (па стат. даных) сустракаюцца каровы і быкі швіцкай пароды.

Каровы гадуюцца з іншым быдлам у агульных хлявах. Хлявы звычайна даўжынёй 10—20 аршын, шырынёй 8—10 аршын, звычайна падзяляюцца на часткі для коней, кароў, свіней, авец.

Хлеў на зіму ўцяпляецца такім чынам: замест столі кладуць жэрдкі, на іх кладуць салому. Святла ў хляве няма, бо няма вакон. Падлога земляная, вельмі брудная. Улетку большасць насельніцтва кароў не корміць — яны задавальняюцца толькі пашай; там

*Захаваны тагачасны стыль і арфаграфія.

Земляробчыя прылады селяніна, в. Жыцін, 1915 г. Здымак І.А.Сербава.

яны і п'юць. Падкармліваюць толькі дойных — бульбай, сенам, сечкай.

Узімку, трымаючы жывёлу ў пунях, кормяць яе па 2—3 разы ў дзень, зранку і ўвечары даюць салому з сенам — «трушанку»; удзень пояць чыстаю вадой. Правільнага кармлення не назіраецца.

Дояць карову 2 разы ў дзень — з ранку і ў вечары; удоі кожны раз у сярэднім чатыры кварты. Даенне кароў спыняюць за 2—3 месяцы да ацёлу (бывае 2 тыдні — залежыць, як сяляне кажуць, ад «статку»). Пастухом наймаюць свайго чалавека ці з другой вёскі; яму за 100 галоў у сярэднім плацяць 70—80 пудоў хлеба; снедае ён па чарзе ў хатах; па чарзе таксама яго і апранаюць. У дапамогу яму даецца па 2—3 падпасвічы.

Коней кормяць узімку сенам, аціpай, падмешваюць мякіну, бульбу — 2—4 разы ў дзень — калі на ім не ездзяць працаваць; а хто ездзіць у заробкі — падсыпае і аўсу.

Жарабе першы год з маткай; з 2—3 гадоў на ім спрабуюць скародзіць.

Улетку пасуць, — дома амаль што не кормяць з таго часу, як з'явілася трава. Валасы з хваста кожны год падразаюць і прадаюць «караўнікам» (тряпичникам) за кавалак мыла.

Запрагаюць каня праз 2—4 гады ад нараджэння. Жыве конь гадоў 20—25; самым працаздольным ліцыцца ў 10—15 год. У ранейшыя часы працоўнай цяглавай сілай былі валы; яны пачалі знікаць (як працоўная сіла) у пачатку бягучага стагоддзя.

Жыхары в. Жыцін Васіль і Пелагея Жыцянкі з дзецьмі. 1915 г. Здымак І.А.Сербава.

З сенакосу, в. Жыцін, 1915 г. Здымак І.А.Сербава.

Для авечак адгароджваюць месца ў агульным хляве: пастуха наймаюць асобнага ад іншых жывёл; трымаюць дзеля скуры і воўны. Стрыгуць два разы ў год, кожны раз атрымліваючы па 1—1,5 фунта воўны.

Свінні ўтрымліваюцца паасобку ў прырубе да хлява. Адкормліваць іх пачынаюць са жніўня да каляд (або з каляд да вялікадня) бульбай, або аўсянай ці жытняй мукой. Агульная вага свінні ў сярэднім 3—4 пуды мяса, прадаюць вельмі рэдка — сала і мяса спажываюць самі.

Птуства складае невялікае падспор'е ў гаспадарцы. Трымаюць курэй дзеля яек; узімку куры ў хаце пад печчу, гусей узімку трымаюць у хляве.

У вёсках, размешчаных уздоўж рэк, насельніцтва займаецца рыбалоўствам.

Рака Свіслач раней была вельмі рыбная — колькасць рыбы цяпер значна зменшылася. Вадзіліся ў рацэ самы вагой 3—4 пуды, — іх лавілі сецямі — шастом з зуб'ямі, «волакамі» — ільнянымі сяцямі.

Вадзіўся «веліразуб», якога лавілі на рака — белае салодкае мяса — вагой у паўпуда, даўжынёй у 1/2—4 метра; «марона» — круглая жоўтая рыба, лыч востры, 4 вусіка — «губатая», нераст ля Міколы вясенняга.

Многа было ракаў (яны і цяпер ёсць); іх лавілі «крыгаі», калі цвіце боб, З чалавекі: два па баках, адзін ззаду — «за дзеда».

Арцелей не было — лавіў кожны сам па сабе на продаж, улоў у сярэднім быў 3—5 пудоў за ноч; цана 2 кап. за фунт.

Вадзіліся тут раней у вялікай колькасці бабры, але гадоў 25—30 таму назад іх знішчылі канчаткова.

Лавілі іх кошыкамі — шырынёю ў 0,5 м, зробленымі з дроту. Уваходная дзірка прыходзілася паміж рагаткамі, канцы іх утыкаліся ў зямлю. Да ніжняй часткі каша прымацоўвалася вяроўка — калі цягнуць яе, дык кош зачыняўся.

Ставілі яго на глыбокім месцы, ля стромага берагу там, дзе які-небудзь корч, ці пень. Адзін чалавек стаяў на беразе і шостам тыкаў у ваду пад пнём ці паваленым дрэвам; другі ў гэты час стаяў у чаўне і сачыў, калі бабёр прыходзіў у кош; як толькі адчуваўся ўдар — ён адразу цягнуў за вяроўку, якая адразу і захлопвала кош. Бабра выцягвалі і забівалі.

Цяпер водзяцца ляшчы, галаўні (6—8, 10 фунтаў), падуста (у глеістай зямлі), ліні, шчупакі (23—27 фунт.), вокуні, карасі. Ловяць іх сецямі, пераметамі; рыба ў большасці ідзе на патрэбы сям'і лаўца, а іншы раз і на продаж.

Паляваннем займаюцца выпадкова і паляўнічых прамыслоўцаў няма.

Сярод рамеснікаў больш за ўсё ганчароў, кіжамяроў, сталяроў і рымароў. Для вырабу валенцаў прыходзяць «валюшнікі» — калускія, магілёўскія, чэрвеньскія.

З падсобных промыслаў маюць значэнне для мясцовага насельніцтва рубка і вываз лесу. Раней вялікія бярвенні вывозілі на адных «карах» такім чынам: адзін канец цягнуўся па зямлі, што вельмі высяляла коней; у кары запрагалі 2—3 кані.

Сродкамі руху з'яўляюцца калёсы, кашэль, абшыванні (з лубу); зімой санівазок з сядзеннем.

Расклад гаспадарчых заняткаў мужчын, жанчын па месяцах у працягу года:

Месяц	Мужчыны	Жанчыны
Студзень	Возяць дровы, ездзяць у заработкі і працуюць дома па гаспадарцы.	Прадуць, працуюць па гаспадарцы.
Люты	Працяг той жа работы.	Працяг той жа работы.
Сакавік	Рэжуць дровы, складаюць іх, збіраюць у двары гной.	Ткуць, працуюць па гаспадарцы.
Красавік	Праца па гаспадарцы, робяць калёсы, раму на барану, рыхтуюцца да сяўбы.	Ткуць. Беляць палатно. У канцы месяца высяваюць расаду.
Май	Возяць гной пад пшаніцу, бульбу, ячмень, на гарод. Сяўба.	Робяць грады, скародзяць: разбіваюць гной. Сеюць мак, фасолю, капусту.
Чэрвень	Ездзяць у заработкі, капаюць карчы, возяць каменні, смалу, сеюць грэчку.	Полюць грады, праца па гаспадарцы.
Ліпень	Сенакос.	Грабуць. Абіваюць бульбу. Полюць лён.
Жнівень	Працяг той жа работы, уборка жыта.	Жнуць, рвуць лён.
Верасень	У канцы — уборка бульбы, аруць на зіму, некаторыя малоцяць.	Уборка бульбы, абіваюць лён, сцелюць лён.
Кастрычнік	Аруць на зіму, малоцяць.	Падбіраюць лён, труць, трэплюць, чэшуць, абдзіраюць.
Лістапад	Ездзяць у млын, праца па гаспадарцы.	Прадуць.
Снежань	Ездзяць у заработкі.	Прадуць.

Быт насельніцтва

Звычайным тыпам паселішча з'яўляюцца вёскі і прысёлкі. Тыпы хат — чатырохсценкі з сенцамі: адзін пакой з печчу направа ці налева пры ўваходзе ў хату; пяцісценкі — хаты з двух палоў з сенцамі пасярэдзіне. Дах гонтавы або з дошак, саламяных дахаў на жылых хатах сустракаецца мала. Але ж усе гумны і сараі маюць саламяныя стрэхі.

У сярэдзіне хаты ў красным куце стол, уздоўж сценак пад вокнамі лавы, ля печы — ложкі (ад печы да сцяны), падлога сустракаецца рэдка. Сцены голыя, толькі ў чырвоным куце вісяць абразы, абвешаныя рушнікамі з узорамі ды сцены тут абклеены абоямі. У іншых хатах вісяць на сценах фотаздымкі («карточкі»). Хата асвятляецца ў вечары газай, лучынай — вельмі рэдка, вакон звычайна 4 — у двух сценах па 2 вакны, у сценах змяшчаюцца кублы, кубры, скрыні і некаторыя гаспадарчыя прылады. У сенцах вакон няма — свет праходзіць праз адчыненыя выхадныя дзверы, ад іх на двор будуецца невялічкі і невысокі ганак у 1—2 прыступкі.

Усе хаты цягнуцца ўздоўж вуліцы, вокнамі на вуліцу. Агульны выгляд вёскі шэры. Двор звычайна невялікі. Сядзіба яго выцягнутая, вузкая. Будынкі размяшчаюцца па рознаму — у адных яны замыкаюць двор з усіх бакоў, у другіх цягнуцца ўздоўж мяжы. На сядзібе звычайна ёсць будынкі:

1. Хата з сенцамі, 2. Хлеў для быдла, 3. Стопка для бульбы, буракоў, капусты, 4. Паветка — падкаціць калёсы, скласці дровы, 5. Гумно для саломы, сена. Да гумна іншы раз прыбудоўваецца спецыяльна для сена «трысцян». Двор звычайна даволі брудны. Чысты двор, дзе не ходзіць быдла, сустракаецца рэдка, у некаторых гаспадароў сустракаецца «доражнік» — агароджаная дарога ў хлеў для быдла, калі яно ідзе з поля. Плуг і барана звычайна ляжаць там, дзе іх кінуць. Перад хатай ставяць браму альбо вароты.

Сялянскія хаты ніколі знадворку не аббіваюцца дошкамі і не афарбоўваюцца. Зашчыту ваканіцы і казыркі вакон селянін аздабляе рознымі ўзорамі, якія ў большасці складаюцца з круглых ліній.

Узімку ад холаду некаторыя сяляне падвешваюць да вакон зробленыя з саломы маты, насыпаюць вышэй прызбу, іншыя пад самае вакно падсыпаюць апілак.

Санітарнае становішча вёсак далёка незадавальняючае. Вуліца ва ўсіх вёсках увосень настолькі гразкая, што, напрыклад, каб склікаць сялян на сход, зборшчыку трэба конна ездзіць па хатах — пехатой ён не пройдзе. Жывёлы размешваюць гразь, угнойваюць вуліцу — і чалавек угрузае па калена. Увосень часта амаль спыняюцца зносіны аднаго канца з другім.

Лік студняў у вёсцы залежыць ад матэрыяльнага дабрабыту насельніцтва і прысутнасці прыродных вадаёмаў — у вёсках уздоўж Свіслачы іх наогул няма — бяруць ваду з ракі.

Капаюцца і будуюцца студні і на двары і на вуліцы. Зрубы драўляныя, ваду дастаюць жураўлём. Зрубы старыя, пры некаторых з іх — выдзяўбанае бервяно (камяга) для жывёл. На почапках бывае ў іншых месцах падвешана вядро, а ў некаторых няма — кожны бярэ ваду сваім вядром і ля студняў брудна.

Нялепшая справа з лазнямі. Звычайна іх 2—3 на вёску.

Лазня прадстаўляе з сябе невялічкую хатку, зложаную з бярвенняў; згары дах з дошак, зашчытаў няма; уваход праз нізкія дзверы; свет праходзіць праз дзірку ў сценцы, якая ў халодны час затыкаецца анучай. У курце груды камянёў, якія раскаляюцца і кідаюцца ў цэбар з вадою, чаму і награецца вада; студзёная вада стаіць тут жа недалёка. У некаторых лазнях перад дзвярыма прыбудоўваецца з двух бакоў плот — гэта лазня з «раздзявалкай».

Будуюць лазні звычайна недалёка ад ракі ці канавы — адтуль бліжэй насіць ваду. Мыюцца ў сярэднім 1 раз у 2 тыдні з мылам і без яго.

Прасаванне бялізны адбываецца гэткім чынам. Збіраюць брудную бялізну і кладуць яе ў цэбар, у якім наліта вада з лугам (залою) — на 4—5 вядзёр вады адзін гарнец (5 кварт) лугу — і пакідаюць на ноч.

Зранку бялізну вымаюць і перамываюць у ночвах у чыстай цёплай вадзе, потым кладуць у траножку або ў «жлукт», прысыпаюць зверху (на трапку) залы вяршкі на 1—1/2, а на яе льюць вар вядры 2 і кідаюць гарачыя каменні — гэта робяць 2—3 разы (вада ўходзіць праз дзірку ў дне жлукта). Пасля гэтага бялізну палошчуць у рэчцы і сушаць.

Усе члены сем'яў, лік якіх у сярэднім каля 5, спяць разам, пры гэтым на ложку спяць гаспадар з гаспадыняй, а ўсе іншыя — на палацях ці на падлозе, падаслаўшы пад сябе кажушкі, пад галаву сяннічок; пакрываюцца посцілкай.

У хатнім быце гаспадар — галава ўсёй сям'і. Жанчына вельмі заклапочана і занята дзецьмі, кухняй і ўсімі галінамі гаспадаркі, ды яшчэ без канца маруднай працай, каб апрануць усю сям'ю.

Уся сям'я прачынаецца рана: мыюцца на дварэ з кружкі або з рогу, пасля снядання ідуць працаваць. Абед бывае на 10—11 гадзін. Полудзень на 2—3 гадзіны, вячэра ў 8—9 гадзін.

Страва селяніна не адзначаецца разнастайнасцю і складаецца з трох галоўных частак — чорнага хлеба, сала і бульбы; да іх яшчэ дадаецца малако.

У тыдзень сям'я з 6 душ патрабляе прыкладна: гарбаты — 25 гр., цукру — 400 гр., бульбы — 65 кіл., мяса свін. —2,4 кіл., сала — 1,2 кіл., масла кар. — 25 гр., малака — 50 квартаў, хлеба чор. — 15,5 кіл., хлеба бел. — 410 гр., гародніны — 6,9 кіл.

Сняданне звычайна складаецца з малака і сыру. У абед ядуць: 1. «Падкалотку» (пшанічная мука з малаком ці вадою); 2. Сала падсмажанае, або 1. Бульбянку ці «боршч» і 2. Крупеню малочную (грэчневая ці ячменная крупа на малацэ). Полудзень — «боршч» або смажанка — рэжуць бульбу, кладуць разам з нутраным салам у гаршчок і тушаць з цыбуляй і перцам. Вячэраюць прыблізна таксама, як і снедаюць — малаком. Гарбату ўлетку зусім не п'юць, ды і ў зімку рэдка. Гарбата замяняецца сурагатам ліпавым цветам, малінай. З напояў выраблюць хлебны квас, піва, гоняць самагон. У святы дзень страва прыблізна тая ж: іншы раз раніцай ядуць аладкі ці яешню. Ядуць з агульнай глінянай міскі дзеравяннымі лыжкамі свайго вырабу.

Насельніцтва гасціннае: госцю даецца ўсё, што ў хаце ёсць лепшага.

Выхаванне дзяцей праводзіцца такім

чынам: да 7 гадоў хлопцы ганяюць свіней, пасля 7—8 гадоў водзяць коней і іншае быдла. Каля зямлі яны пачынаюць працаваць з 12—13 год, у гэты ж час знаёмяцца з касьбой. З 15—16 год хлопец амаль што самастойны гаспадар.

Дзяўчаты да 8 год пасьвяць свіней, займаюцца сваімі гульнямі, пасля 8 год вучацца прасці, жаць, рабіць «каронкі», вучацца і вышываць.

У школу ходзяць не ўсе — галоўнымі прычынамі з'яўляюцца гаспадарчыя ўмовы. Да і тыя, што лічацца вучнямі, пачынаюць хадзіць у школу, калі выпадзе снег, і кідаюць школу, калі пацяплее і снег сойдзе.

У адносінах аховы здароўя ўвесь раён абслугоўваецца адной Асіповіцкай гарадской бальніцай. Насельніцтва разумее карысць медыцыны, але вялікая адлегласць да доктара ды і няўпэўнасць у тым, што застанеш дома і ён паедзе, прымушае звяртацца да ўласных хатніх лекаў і шаптух з шаптунамі. З хвароб пашыраны паносы, шкарлятына ў дзяцей, адзёр, звычайная трасца. Каўтун амаль не сустракаецца.

Па рэлігіі ў пераважнай большасці жыхары праваслаўнага вызнання, у святкаванні рэлігійных свят сяляне трымаюцца старога стылю.

Апрача нядзель святкуюцца 24 святы (35 непрацоўных дзён у год) [гл. табліцу 1].

Пералічаныя дні народ святкуе, г.зн. не працуе, чысцей апранаецца і часта праводзіць час у гасцях. Апрача гэтага ёсць дні, якія адзначаюцца, але не святкуюцца: у гэтыя дні некаторая праца робіцца, а некаторая не. Гэта наступныя дні [гл. табліцу 2].

У пералічаныя дні пераважная колькасць насельніцтва працуе, больш асцерагаецца працаваць толькі ў калядныя дні, на Барыса і градавую сераду.

Табліца 1

Назва свята	Дата святкавання	Колькасць непрацоўных дзён
1. Каляды	25 снежня	3
2. Новы год	1—2 студзеня	2
3. Вадохрышча	6—7 студзеня	2
4. Грымніцы (стрэчанне)	2 лютага	1
5. Благавешчанне	25 сакавіка	1
6. Вялікдзень	...	5
7. Радуніца	пасля вялік. праз тыдзень	1
8. Юрай (Юры)	23 красавіка, праз 40 дзён пасля вялікадня	1
9. Сёмуха	У 50 дзень пасля вялікадня	3
10. Івана	27 чэрвеня	1
11. Пятрок	29 чэрвеня	1
12. Кузьма (кірмаш у Зборску)	1—2 ліпеня	2
14. Ілля (Іллюк)	20 ліпеня	1
15. Спас	6 жніўня	1
16. Прачыстая	15 жніўня	1
17. Галавасек	29 жніўня	1
18. Багач	8 верасня	1
19. Узвіжанне	14 верасня	1
20. Пакровы	1 кастрычніка	1
21. Кузьма	1 лістапада	1
22. Уведзянне	21 лістапада	1
23. Мікола	1 снежня	1
24. Мікола	9 мая	1

Усяго непрацоўных дзён 35.

Пасты, як так строга выконваліся ў дарэвалюцыйны час, цяпер забываюцца. Вялікі пост, што цягнуўся 7 тыдняў перад Вялікаднём, цяпер выпаўняецца толькі два тыдні — першы і апошні; піліпаўку перад калядамі цяпер рэдка хто наглядае, таксама пятроўку і двухтыднёвую спасаўку. Серады ў кожным тыдні не пасцяцца, а пятніцы — рэдка кім.

Табліца 2

Назва	Час святкавання	Лік дзён	Што можна рабіць і чаго нельга
1. Калядныя дні	Пасля першых трох дзён каляд і вадохрышча	7	Можна: у лес ездзіць, секчы дровы, прасці. Не можна: круціць, віць, вязоў гнуць, інш., бо жывёла будзе нар. калекаю; таксама на калеку і кабета, каб. цяжарна ў гэты час. Вечары лічацца святымі і ніякая работа не робіцца.
2. Грамнічкі	За тыдзень да грамніц	1	

Назва	Час святкавання	Лік дзён	Што можна рабіць і чаго нельга
3. Яўдокі	1 сакавіка	1	«Яўдокі — вялікія прарокі», трэба пачынаць усякую веснавую работу, будзе поспех.
4. Саракі	9 сакавіка	1	
5. Аляксея	17 сакавіка	1	
6. Барыс	2 мая	1	
7. Градавая серада	Першая пасля сёмухі	1	Трэба асцярагацца працы — можа гразу наслаць, громам забіць, маланка спаліць. Асцерагацца працаваць, каб градам збожжа не пабіла.
	24 ліпеня	1	
10. Барыс	11 жніўня	1	
11. Макаўе			
12. Ал-ндра Неўскага	30 жніўня	1	
13. Пакроўкі	26 верасня	1	
14. Зміцер	26 кастрычніка		
15. Барбара	4 снежня	1	
16. Саўка	5 снежня	1	
17. Ганна	9 снежня	1	

Усяго 22 дні.

Наведванне царквы слабае, — рэлігійнасць трымаецца толькі на традыцыйных абрадах.

Шырока распаўсюджаны павер'і, якія звязаны амаль з усімі бакамі сялянскага жыцця.

Калі першы раз выганяюць карову ў поле, дык бяруць грамнічную свечку, яйка, вярбу, замыкаюць замок, бяруць тапор і з гэтым абыдуць двор: 3 разы, потым кладуць усе прылады ля брамы, бяруць вярбу і гоняць карову, — калі яна растопча яйка, дык прападзе карова ўлетку; калі не — дык будзе цэла.

Пры гэтым прыгаварваюць:

«Прашу госпада бога, каб пас нашыя караўкі на юраўскіх травах, божых атавах, — пасі і ў хлеў прыгані! Ваўчыца-хіма, абходзь скаціну міма! Воўк-бірук, не бяры скаціны з рук! Благімі вачыма не экрануць твайго ўдою!»

Багата павер'яў звязана з будоўляй. Для новабудоўлі выбіраюць месца такім чынам: наліваюць поўны кубак вады і ставяць яго на абранае месца, назаўтра раніцой — да ўсходу сонца гаспадары з суседзямі ідуць глядзець — калі вада ў кубку пяройдзе цераз краі — значыць абранае месца шчаслівае.

Пры закладцы хаты ў тым месцы, дзе павінен быць чырвоны кут, ставяць стол, пакрыты чыстым абрусам, на ім непачаты хлеб, соль, закуска і бутэлька гарэлкі; перад сталом ставяць лавы, на якія садзяцца суседзі. Гаспадар садзіцца на патрубе і разам з суседзямі прымаўляе, каб заўсёды ў гэтай хаце было поўна, і рубіць бервяно 3 разы. У сподняй падрубе выдзёўбвае ямінку, у якую кладзе скарынку хлеба і манету (кап. 20) з замовай, каб не пераводзіліся грошы.

Калі будуюць сарай, выкопваюць ямы для шулаў і пакідаюць іх на ноч. Калі заўтра ў ямах знойдуцца мурашкі, мышы або лягушкі — будзе прыбытак.

Лічаць, што калі ў хаце трашчыць на куце — памрэ гаспадар, ля печкі — памрэ баба ці будзе якая непрыемнасць.

Са смерцю ў сялян таксама звязана многа павер'яў. Напрыклад, калі ў хаце ёсць нябожчык і да яго прыйдуць знаёмыя, а ў яго адчыніцца вока — кажуць, што памрэ той, хто ў гэты час зайшоў; калі крумкачы паляцяць з вёскі на могілкі — нехта памрэ; калі курыца запяе пеўнем — мераюць ёю ад парога да кута, дзе абразы — калі прыйдзецца ў астачы галава, дык адсякаюць галаву, калі хвост — дык яго: тады ў хаце не будзе няшчасця (нябожчыка).

Могілкі заўсёды бываюць адразу за вёскай, ці дзе-нібудзь збоку яе, сярод дрэў, абкопваюцца канавай, на крыжы звычайна

прывешваецца кавалак белай матэрыі — чысты, або з чырвонымі ўзорамі.

Звычайнай формай забаў з'яўляецца вечарынка, наладжаная якім-небудзь хлопцам з музыкай — гармонь, цымбалы, скрыпка, бубен. Гэтыя вечарынкі ў большасці адбываюцца ўзімку. Закускі на вечарынках не бывае, бойкі здараюцца вельмі рэдка — калі нап'юцца самагону.

Некаторыя абрады

Узімку моладзь з вялікай ахвотай удзельнічае ў калядах — якія завуцца хадня з казою і мядзведзем.

Збіраецца гурток хлопцаў чалавек 15, прыбіраюць аднаго за «казу», другога за «мядзведзя» і да іх прыстаўляюць павадыроў. Ёсць у гуртку начальнік спеваў, запрашаецца і музыка са скрыпкай ці дудкай і бубнам, наогул падбіраецца «цэлая кампанія» з вясёлых жартлівых і здольных на ўсялякія жарты хлопцаў. Ёсць у гуртку і «механоша» з кошыкам і мяшком для збору падарункаў за спевы і скокі: каўбас, сала, пірагоў, а часам і грошай.

Ходзіць гурток з казою і мядзведзем на першы дзень каляд і ўсю ноч прабавіцца на вёсках. На другі дзень робіцца ўжо сваё ігрышча (вечарынка) з частаваннем на сабраныя сродкі.

«Казу» прыбіраюць так: хлопцу, прызначанаму за «казу», прывязваюць з перадуу звычайную, але ж больш тонкую і лёгкую дугу так, каб яна ўвагнутасцю прыходзілася да грудзей і жывата і праходзіла паміж ног; адзін канец дугі, прайшоўшы паміж ног, павінен вытыркацца трохі ззаду для прывязвання «хваста», а другі — трохі высоўваецца над ілбом для прымацоўвання рагоў; паверх надзяюць два вывернутых поўсцю наверх кажухі, прычым адзін з іх рукавамі на рукі, другі рукавамі на ногі, кажухі завязваюць, прышпільваюць; дуга з'яўляецца жыватом «казы», рогі і «хвост» робяць з скруткаў саломы, сплеценых у тры столкі, накшталт дзявочае касы.

Прыбор «мядзведзя» гэткі. Робяць доўгі скрутак з гарохвін, вядома, ужо абмалочаных і сухіх. Скруткамі гэтымі, спіралявіднымі, блізкімі адзін да другога, ходамі абвіваюць па руках, нагах і ўсім тулаве хлопца, на галаву надзяваюць кашлатую шапку, шыю і твар закрываюць аўчынкамі поўсцю наверх, для вачэй пакідаюць невялікую шчыліну. «Мядзведзь» выходзіць смешны, пры нязначных рухах шамаціць сваёй «поўсцю» — гарохвінамі.

Гэтак падрыхтаваўшыся, хлопцы абходзяць па хатах гаспадароў вёскі.

Перш заходзіць у хату кіраўнік гуртка з такім прывітаннем: «Добры вечар, пане гаспадару, дазвольце зайсці ў хату маёй кампаніі з «казою» і «мядзведзем» павіншаваць са святам і развесяліць гаспадарскую сям'ю!» А ў гэты час гурток на дварэ сваім вясёлым смехам, гукамі скрыпкі, дудкі ці бубна падбухторвае хатніх, каб паклікалі.

Гаспадар запрашае. Моладзь шумна і весела з жартамі ўвальваецца са сваім звяр'ём у хату, нарыхтоўваецца да спеваў, а «каза» да скокаў. Гурток пяе, а «каза» скача пад наступную песню:

Добры вечар добрым людзям,
А ці дома сам пан гаспадар?
А хоць ён дома, ды ня кажацца!

Жыхары в. Жыцін, 1915 г. Здымак І.А.Сербава.

Го-го-го каза, го-го шэрая;
(прыпеў пасля кожнага радку).
Да ў каморацы прыбіраецца,
У чырвоны боты абуваецца.
Пане гаспадарку, адчыні вакно,
Адчыні вакно, ды зірні ў гумно —
Што ў тваім гумне шуміць ды гудзе?
Пчаляная матка раечкі вядзе.
Ой вядзе, вядзе, дый навучае:
«Садзецеся, дзеткі, па новым вуллям,
А я, стара маць, у старым вуллі
Сыту сыціці, — сыны жаніціці,
Свечкі шукаці — дочцы даваці».
Гаспадар ідзе, каляду нясе —
Рэшата аўса, наверх каўбаса («кіўбаса»),
Паўбочкі грэчкі на перапечкі
І кусок сала, каб каза ўстала.
(«Каза», што ўпала, у гэты момант устае.)
А ты, козачка, ды не ляніся —
Пану гаспадару ды пакланіся.
(Каза кланяецца.)
Гаспадынечка-журавіначка,
Вазьмі свечачку, пайдзі ў клетачку,
Вазьмі мачачку (маку) на талерачку,
Нашаму казлу на гарэлачку.
Нашаму казлу нямножка трэба:
Паўбочкі грэчкі на перапечкі.
А ты, козачка, ды не ляніся —
Пану гаспадару ды пакланіся.
(Каза кланяецца.)
Пану гаспадару ды з гаспадынею.

Пасля казы на сцэну выступае павадыр з «мядзведзем». Павадыр кідае мядзведзю ў лапы высокі кій і загадвае перш паскакаць, той скача. Потым даюцца іншыя загады, напрыклад, як бабы на паншчыну шлі, як з паншчыны; як дзеці ў гарох лазяць, як з гароху ўцякаюць; як хлапец дзяўчыну абдымае і як дзяўчына саромеецца; як ішлі ў карчму і як з карчмы і г.д.

Па сканчэнні спеваў, скокаў і жартаў ад гаспадара ці гаспадыні ў кошык «механошы» пападае падарунак салам, каўбасамі ці іншымі рэчамі, а павадыры загадваюць сваім жывёлам пакланіцца гаспадарам і ўвесь гурток з вясёлым развітаннем выходзіць з гэтае хаты ды ідзе ў другую.

Багаты абрадамі важныя зьявы з жыцця чалавека: вяселле, радзіны, хрэзьбіны, смерць.

На хрэзьбіны, якія бываюць праз 2 тыдні пасля нараджэння, сваякі і суседзі прыносяць падарунак — палатно, пячэнне або крамніну. Да хрэзьбін звычайна прыходзяць на «отведы» — прыносяць каўбасы, яечню, булку.

Калі нарадзілася дзіце, дык прыгаварваюць ад уроку: «На сінім моры ляжыць камень, на ім сядзіць панашка (панна), дванаццаць ключоў трымае. Нам тымі ключамі не адмыкаць, так майго младзенца вачамі благімі не ўракаць».

На хрэзьбіны склікаюць усіх сваякоў, за сталом спяваюць:

«Ой цяжка мне, цяжка,
Што няпоўная пляжка.
Галоўка баліць.
А нечым тужыць».

Асабліва багата вяселле — самы ўрачысты абрад у жыцці селяніна.

Друкуецца са скарачэннямі паводле выдання: Н е м ц а ў А.Г. Асіповіцкі раён Бабруйскай акругі. Краязнаўчае апісанне. Вып. 2. Мн., 1928.

Падрыхтаваў Дз.В.Саўрыцкі.

Народныя рамёствы

Рамёствы і промыслы з'яўляліся для селяніна патрыярхальнай вёскі падмуркам уласнага дабрабыту. Амаль усе неабходныя для побыту і гаспадаркі рэчы сялянская сям'я стварала самастойна, шырока выкарыстоўваючы пры гэтым разнастайныя падручныя матэрыялы, вопыт апрацоўкі якіх перадаваўся з пакалення ў пакаленне і шліфаваўся стагоддзямі. Добрае валоданне тэхналогіяй і веданне адметных асаблівасцей «сыравіны» дазваляла сялянам забяспечваць сябе не толькі функцыянальнымі, але і прыгожымі рэчамі.

Сярод хатніх сялянскіх заняткаў галоўнае і найбольш пачэснае месца займала ткацтва. Пра значэнне ўмення ткаць красамоўна сведчыць народная традыцыя, згодна з якой дзяўчына павінна была самастойна выткаць свой шлюбны пасаг. Памеры і якасць яго ў значнай ступені стваралі ёй рэпутацыю як будучай жонцы і хатняй гаспадыні.

Выраб тканіны быў заняткам вельмі працаёмкім, таму з позняй восені і да вясны кожная жанчына штодзень прала, сукала ніткі, ткала, шыла, вышывала...

Гэта марудная праца звычайна сумяшчалася з забавамі — у доўгія зімовыя вечары дзяўчаты і маладзіцы збіраліся ў адной хаце разам і ладзілі вячоркі, дзе пад

спевы і размовы працавалася весялей, а танцы давалі адпачынак ад манатонных рухаў.

Апрацоўка валокнаў патрабавала адпаведнага абсталявання, поўны камплект якога ў XIX — пачатку XX ст. складаўся з прыстасаванняў для ачысткі валокнаў (трапла, церніцы, ільнамялкі), механізмаў для сукання нітак (самапрадкі — «стаяка» ці «калаўрота» і маталкі — «сукалкі») і ткацтва (матавіла — «моташкі» і кроснаў).

У Асіповіцкім раёне былі распаўсюджаны кросны гарызантальнага тыпу. Яны мелі прыблізна аднолькавую канструкцыю і дазвалялі ткаць палатно шырынёй прыкладна 60 см.

У працэсе падрыхтоўкі да прадзення ў сценах хаты па іх даўжыні забівалі драўляныя колікі. Даўжыня сцяны называлася «губкай». Ніткі асновы дзяліліся на пасмы, у кожнай пасме было па 12 пар нітак. Па колькасці пасмаў вызначалася шырыня палатна: на ручнік ішло 5 пасмаў, на іншае — 10—12 пасмаў. «Губкі» ў кожнай хаце былі сваёй даўжыні — таксама як і хаты. За дзень гаспадыня звычайна ткала «губку» — 4—6 пагонных метраў палатна.

Тканіна рабілася з ільну (палатно), воўны (сукно) і камбінаваная: лён — аснова, воўна — уток (паўсукно). Гатовая тканіна мела шэры ці белы колер і пры неабходнасці фарбавалася. На Асіповічыне існаваў цікавы спосаб фарбавання: тканіну пэўны час трымалі ў кіпячым адвары кветак мучана (багуну), пасля чаго клалі ў балотную руду — іржу. У выніку тканіна фарбавалася ў трывалы чорны колер.

Звычайна самаробнай тканіны хапала толькі на ўласныя патрэбы сям'і. З яе шылі адзенне, прадметы хатняга і рытуальнага ўжытку — абрусы, ручнікі, дываны, посцілкі, коўдры і інш.

Гатовыя рэчы, асабліва святочныя, кожная гаспадыня старалася аздобіць адметнай вышыўкай, карункамі, аплікацыяй.

Хатнімі заняткамі мужчын былі: віццё вяровак, выраб прадметаў дамашняга ўжытку, пляценне. Матэрыялы для гэтых спраў выкарыстоўваліся самыя розныя.

Найбольш шырока прымяняліся луб і лыка. З іх рабілі абутак — лапці, ёмістасці для збору грыбоў і ягад (набіркі), карабы для сыпучых прадуктаў, карпусы сітаў.

Святочны ручнік канца XIX ст. З фондаў краязнаўчага музея Дараганаўскай СШ.

Ручнік работы А.Г.Філяёнчык, в. Каўгары, 1980-я гады.

Шмат рэчаў плялі з лазы — у першую чаргу разнастайныя кашы і рыбалоўныя прылады. З лазы рабілі таксама прыстасаванні для асвятлення, так званыя лучніцы: конусападобны каркас, сплецены з лазовых прутоў, абмазваўся глінай, знізу да яго мацавалася жароўня, на якой распальвалася невялікае вогнішча. Лучніцу прывязвалі вяроўкамі да столі.

Павагай карысталася бяроста — матэрыял амаль універсальны. З яе рабілі музычныя інструменты (пастуховыя трубы, якія давалі вельмі чысты і моцны гук), плялі непрамакальныя шротніцы, у якіх паляўнічыя трымалі порах. Да таго ж з бяросты рабілі вельмі карыснае для



Плецены кораб. Пачатак XX ст. З фондаў краязнаўчага музея Дараганаўскай СШ.

селяніна рэчыва — дзёгаць. Ім і колы мазалі, і лячыліся, і скуры выраблялі.

З саломы пляліся капелюшы, дзіцячыя цацкі, жаночыя ўпрыгожанні і рэчы, якія мелі магічнае значэнне, у прыватнасці «павукі». Саламяны «павук» вісеў амаль у кожнай хаце. Лічылася, што ён забірае на сябе грахі. Раз-пораз стары «павук» спальваўся (разам з грахамі), а на яго месца чапляўся новы — чысты. З саломы рабілі і стрэхі. Добра зробленая саламяная страха не працякала некалькі гадоў. Уздоўж Пцічы для пакрыцця стрэх ужываўся таксама і чарот.

Багатая лясістаць Асіповіцкага раёна спрыяла развіццю разнастайных лясных рамёстваў і промыслаў.

У лесе сяляне развешвалі борці — прымітыўныя пчаліныя вуллі-калоды, збіралі ягады, грыбы, бярозавы сок, лекавыя расліны, палявалі.

Лес да таго ж быў надзейнай крыніцай грашовага прыбытку. Усе адыходныя промыслы асіповіцкага селяніна так ці інакш былі звязаны з лесараспрацоўкай. Высечка, перавозка, распілоўка, выраб драўнянага вугалю, паташу, выганка дзёгцю, сплаў плытоў — вось традыцыйны набор адыходных сялянскіх промыслаў на працягу стагоддзяў.

Развіццё адыходнай дзейнасці на Асіповіччыне мела адметныя лакальныя асаблівасці. Калі на поўначы яна існавала здаўна (ва ўсякім разе ўжо ў XVII ст. мясцовыя сяляне наймаліся на лесараспрацоўку ў басейне р. Свіслач), то на поўдні, у паселішчах уздоўж Пцічы, амаль да канца XIX ст. лічылася вялікім сорамам прадаваць сваю працу.

Росквіт адыходных промыслаў прыйшоўся на пачатак XIX ст. У гэты час ішло актыўнае будаўніцтва Чарнаморскага флоту, што патрабавала вялікага прытоку драўніны.

У гэты перыяд лесараспрацоўкі на Асіповіччыне вяліся хуткімі тэмпамі. Падрыхтаваная драўніна сплаўлялася па рэках у Дняпро і далей — аж да верфяў на Чарнаморскім узбярэжжы.

Сплаў плытоў быў справай адказнай і складанай. Далёкі шлях да мора, а потым пешшу назад патрабаваў асаблівых якасцей — у плытагоны ішлі самыя дужыя, спрытныя і кемлівыя сяляне. Падарожжа, безумоўна, пашырала іх кругагляд, дазваляла пазнаёміцца з жыццём у іншых мясцінах і, магчыма, пераняць нешта карыснае. Таму не дзіўна, што плытагонаў вельмі паважалі аднавяскоўцы.

Яшчэ адзін узлёт у адыходных промыслах меў месца ў час будаўніцтва чыгунак. Сяляне ахвотна наймаліся працаваць землякопамі, цеслярамі, возчыкамі, паколькі праца на пракладцы чыгуначнага палатна добра аплачвалася.

Вядзенне паўнатуральнай гаспадаркі патрабавала ад кожнага селяніна пэўнага універсалізму — умення выконваць большасць рамесніцкіх спраў самастойна. Кожны селянін быў добрым цесляром. Мог скласці з бярвенняў зруб, зрабіць большасць патрэбных у гаспадарцы прыстасаванняў (літаральна ад сахі да мышалоўкі), трымаць у «сапраўдным» стане металічныя рэчы, пры неабходнасці адрамантаваць конскую вупраж ці скураны абутак...

І ўсё ж без паслуг больш спрактыкаваных рамеснікаў, якія мелі спецыяльны інструмент, селяніну абысціся было складана. Развіццё сялянскай гаспадаркі стварала ўсё большую патрэбу ў рамесніцкіх вырабах. Таму колькасць саматужных спецыялістаў увесь час узрастала. Традыцыя ж перадачы ведаў і вопыту ад бацькоў дзецям вяла да канцэнтрацыі рамеснікаў у буйных вёсках.

У мястэчку Свіслач, напрыклад, майстравалі лодкі, у Пагарэлым, Вязычыне, Ясені шылі конскую вупраж. Калёсны промысел існаваў у Карытным, Ясені, Пагарэлым і іншых вёсках. Мясцовыя майстры рабілі ўсе сродкі гужавога транспарту (калёсы, сані, павозкі) і найбольш складаныя іх часткі (колы, палазы, дугі, ярмы).

Шырока былі распаўсюджаны дрэваапрацоўчыя рамёствы. Найбольш складаным сярод іх было, безумоўна, бондарства: выраб герметычных ёмістасцей з набору асобных клёпак патрабаваў высокай кваліфікацыі. Попыт на бандарныя вырабы быў заўсёды вялікі. Нават у пачатку XX ст. яны з'яўляліся асноўным відам тары для сыпучых і вадкіх прадуктаў у сялянскай гаспадарцы. Бондары рабілі розныя па памерах і прызначэнні бочкі, у тым ліку і вялікія, аб'ёмам да 2 м^3, а таксама «сыпнікі» — зручныя сховішчы для збожжа, вёдры, цэбры, маслабойкі, біклагі, дзежы і іншае. Асаблівага ўмельства ад бондара патрабаваў выраб посуду для захоўвання мёду. Далёка не ўсе майстры маглі так шчыльна падагнаць клёпкі, каб больш цякучы, чым вада, мёд не прасочваўся праз стыкі.

Рабілі бондары і дзяўбаныя ёмістасці — ступы, ночвы, каўшы, талеркі, невялікія бочачкі — ліпаўкі і сальніцы (у першых захоўвалі мёд, у другіх — соль і цукар).

У многіх вёсках развівалася сталярства. Звычайна сталяры рабілі рэчы неабходныя для сялянскага ўжытку: куфэркі, лыжкі, канапы, калыскі («зыбкі»), сталярку, калаўроты, кросны. Добры сталяр мог справіцца і з больш далікатнай справай — зрабіць, напрыклад, цымбалы ці балалайку. Мясцовыя памешчыкі таксама ахвотна карысталіся паслугамі вясковых рамеснікаў-саматужнікаў і заказвалі ім упрыгожаныя адмысловай разьбой шафы, крэслы, сталы і іншую мэблю.

Паважанай асобай у вёсцы быў каваль. Ён, без перабольшання, забяспечваў працаздольнасць усіх навакольных сялянскіх гаспадарак: падкоўваў коней, акоўваў колы і палазы саней, выкарбляў металічны інструмент — сярпы, сякеры, пілы, нажы, лапаты, косы, нажніцы і шмат іншых патрэбных рэчаў.

Звычайна кавалі меліся ў вёсках, каля якіх знаходзілася дастаткова кавальскай сыравіны — балотнай руды. Засталася памяць аб кавалях у вёсках Ясень, Крамок, Вязаўніца, Краі і мястэчку Халуі (цяпер в. Ліпень) і інш.

З іншых рамёстваў атрымала развіццё ў першую чаргу гарбарства. Ім займаліся рамеснікі амаль ва ўсіх буйных вёсках.

Традыцыйны выраб скур складаўся з некалькіх аперацый. Спачатку скуры размочваліся, адмываліся ад бруду і мяздрыліся (ачышчаліся ад часцінак мяса і тлушчу) спецыяльным нажом-мездраком на выпуклай лаве-аполку. На ёй гарбар сядзеў верхам, нібы на кані, адсюль і трапная назва гэтай прылады — «кабыла». Далей скура нацягвалася на драўляную раму і абястлушчвалася — некалькі разоў

Бандарныя вырабы. Краязнаўчы музей Дараганаўскай СШ.

Кавальскія вырабы. Краязнаўчы музей Дараганаўскай СШ.

абмазвалася глінай і ставілася на сонца. Гліна высыхала і ўбірала ў сябе растоплены скураны тлушч.

Калі трэба было зняць валасяное покрыва, скуры «залілі», трымалі некалькі дзён у канцэнтраваным растворы попелу, пасля чаго валасы лёгка здымаліся.

Абястлушчаныя скуры змазвалі дзёгцем і разміналі да мяккасці. «Лёгкія» скуры (аўчынныя і казловыя) мяліся рукамі, «цяжкія» (валовыя, бычыныя, конскія) на круку — моцнай металічнай скабе, замацаванай на бэльцы ў століе.

На крук чапляліся папярэдне парэзаныя на палосы і звязаныя ўнізе паміж сабой скуры, а потым моцна скручваліся драўлянымі рычагамі — «мяламі». Звычайна «мялы» круцілі 4 чалавекі. Гэта была вельмі цяжкая праца.

На гэтым выраб скуры лічыўся завершаным. Атрымлівалася так званая сырамяць. Яна звычайна не фарбавалася і мела белы колер.

Пачынаючы з XIX ст. скуры пачалі дубіць — вымочваць некалькі тыдняў у адвары дубовай кары. Дубленне вялося ў вялікіх бочках аб'ёмам у 1—2 м^3, якія для зручнасці ўкопваліся ў зямлю.

Дубленыя скуры, у адрозненне ад сырамятных, не баяліся вільгаці, былі больш трывалыя і мелі прыемны рудаватажоўты колер. З сырамяці на Асіповіччыне звычайна шылі кажухі, шапкі-аблавухі і вушанкі, плялі бізуны.

Дубленыя скуры ішлі на конскую вупраж і абутак — боты і скураныя лапці-хадакі.

Наогул якасць вырабу скур была не высокая і магла задаволіць толькі не вельмі заможных мясцовых сялян.

Ганчарства, звычайнае для ўсіх рэгіёнаў Беларусі рамяство, на Асіповіччыне не набыло шырокага размаху па прычыне адсутнасці якаснай гліны. Ганчары, як правіла, працавалі ў буйных паселішчах — Халуі (Ліпень), Ясень, Цэль, Свіслач. Недалёка ад Жорнаўкі, дзе паблізу мелася радовішча якаснай гліны, у XVIII—XIX ст. існаваў невялікі завод па вырабе цэглы.

Галоўнай задачай кожнага рамесніка быў, відавочна, прыбытковы збыт уласнай прадукцыі. Таму кавалі, сталяры і калеснікі працавалі звычайна па папярэдняй дамове. Шаўцы, краўцы, валюшнікі, часам гарбары хадзілі па вёсках і прапаноўвалі свае паслугі. Але галоўным месцам тавараабароту быў кірмаш. У XIX ст. існавала некалькі кірмашоў, галоўнымі з якіх былі Свіслацкі, Зборскі, Пагарэльскі, Каменіцкі і Тарасавіцкі.

З адкрыццём чыгункі кірмаш пачаў праводзіцца і ў Асіповічах. Паступова роля Асіповіцкага кірмашу ўзрастала. У 1920-я гады ён стаў галоўным месцам збыту рамесніцкіх вырабаў.

Рост заможнасці сялянства, развіццё прамысловасці і транспарту з 2-й паловы XIX ст. садзейнічалі ўваходу ў сялянскі побыт адносна больш якасных і зручных фабрычных вырабаў і паступоваму адміранню працаёмкіх рамёстваў. Тым не менш, нават у 1920—1930-я гады значная частка патрэб сялянства задавальнялася рэчамі ўласнай ці саматужна-рамесніцкай вытворчасці. У тыя часы сярод рамеснікаў сустракаліся сапраўдныя самародкі, накшталт жорнаўскага цесляра Пятра Лянёўскага, які рабіў драўляныя малатарні, шматрадныя сеялкі, удасканаліў канструкцыю маслабойкі, сякача і іншых сельскагаспадарчых прылад.

У наш час існаванне рамёстваў хоць і не спынілася поўнасцю, але ў большасці выпадкаў мае аматарскі характар.

Паводле звестак Асіповіцкага цэнтра народных рамёстваў, традыцыйнымі народнымі рамёствамі ў 2000 г. у раёне займаліся 106 чалавек, у тым ліку бондарствам — 1, ганчарствам і керамікай — 2, разьбой па дрэве — 18, пляценнем з лазы — 15, вязаннем карунак — 5, саломапляценнем — 5, вышыўкай — 47, ткацтвам — 13.

Некаторыя народныя ўмельцы дасягнулі ў сваёй творчасці выдатных вынікаў і сталі сапраўднымі майстрамі. Паспяхова працягваюць справу дзядоў і прадзедаў ткачыхі З.Я.Пінчук (в. Дараганава), М.А.Бурак (в. Прудзішча), М.Каданчык (в. Майсеевічы), вяжа карункі В.М.Кароткая (в. Ліпень). Цудоўныя ўзоры рэжуць па дрэве Ю.Ф.Чарноў (в. Лапічы), В.Б.Ліхадзіеўскі (в. Дараганава). Е.У.Касцян з р.п. Татарка не толькі сама займаецца пляценнем з жытняй саломы, але і перадае свой вопыт удзельнікам студыі саломапляцення, кіраўніком якой яна з'яўляецца. У в. Краснае існуе студыя лозапляцення, якую доўгі час узначальваў сапраўдны майстар — залатыя рукі А.Н.Андрыевіч. Зробленыя ў студыі рэчы

— посуд, кашы, мэбля і іншае — славяцца па ўсёй Магілёўшчыне.

За поспехі ў захаванні і развіцці нацыянальных традыцый лозапляцення студыя атрымала ганаровае званне народнай.

Мясцовыя ўлады, установы культуры і адукацыі не пакідаюць без увагі развіццё народных талентаў. Увайшло ў практыку правядзенне раённых выставак і кірмашоў, на якіх прадстаўлены творы вопытных майстроў і тых, хто толькі пачынае свой творчы шлях. Метадычную дапамогу майстрам аказвае раённы Цэнтр народных рамёстваў, у створаных пры вясковых дамах культуры студыях праводзіцца мэтанакіраваная работа па захаванні і развіцці традыцый народнага ўмельства. У школах раёна створана сетка гурткоў, у якіх моладзь знаёміцца з прыёмамі разьбы па дрэве, пляценнем з лазы і саломы, вышыўкай.

Шмат увагі захаванню народнага вопыту аддае краязнаўчы музей Дараганаўскай СШ. У яго экспазіцыі сабрана вялікая колькасць прадметаў, зробленых умелымі рукамі нашых землякоў — продкаў і сучаснікаў.

Дз. В. Саўрыцкі.

Адзенне

Прыналежнасць асіповіцкага народнага касцюма да таго ці іншага традыцыйнага строю, што бытавалі здаўна на Беларусі, вывучана слаба. На тэрыторыі раёна меліся лакальныя адрозненні ў стылях адзення. Так, на поўначы (раён Свіслачы) народны касцюм меў шэраг агульных рыс з магілёўскім строем, а на поўдні (асабліва на паўднёвым захадзе) прасочваліся рысы слуцкага строю.

Тым не менш гэтыя адрозненні моцна не выяўляліся, што, верагодна, тлумачыцца цеснай сувяззю развіцця народнага адзення з адзіным характарам мастацкіх і утылітарных патрабаванняў у гэтай мясцовасці.

Згодна з традыцыяй, адзенне селяніна падзялялася на святочнае і паўсядзённае. Маючы практычна аднолькавы крой і склад, яно істотна адрознівалася якасцю тканіны і багаццем аздаблення.

Паўсядзённы касцюм жанчын і мужчын меў аднатонны, звычайна шэры колер. І шыўся з горшай, больш грубай тканіны. У якасці аздаблення (яно рабілася не заўсёды) выкарыстоўвалі вузкія палосы тканага геаметрычнага арнаменту чырвонага колеру па каўняры і манжэтах (каўнерцах), падолах спадніц. Верагодна, арнамент на паўсядзённым адзенні меў магічнае значэнне — ён традыцыйна выконваў ролю засцерагальніка.

Святочнае адзенне рабілася з адбеленай ці пафарбаванай тканіны вышэйшай якасці і багата аздаблялася. Колеравая гама фарбавання і ўпрыгожвання была звычайна абмежавана чорнымі і чырвонымі тонамі.

У аздабленні адзення пераважалі геаметрычныя ўзоры — ромб, крыж, зорка. У вышыўцы сустракаліся выявы раслін (кветкі і дрэвы).

Жаночы святочны летні гарнітур складаўся з кашулі, спадніцы, фартуха і безрукаўкі — кабата.

Ільняная белая кашуля даўжынёй да калена са зборкамі па каўняры мела тунікападобны крой і доўгія рукавы з «полікамі» на плячах, «цвіліхамі» пад пахай і каўнерцамі каля далоні. Каўнер невысокі стаячы ці шырокі адкладны, зашпільваўся металічнай спражкай (кальцом) ці зацягваўся на стужку.

Ролю аздаблення выконваў тканы ці вышываны арнамент згрупаваны ў палосы на плячах, каўняры і каўнерцах.

Спадніцы жанчыны насілі двух відаў — ільняныя белыя і каляровыя суконныя андаракі (звычайна чорныя). Падол ільняных спадніц упрыгожваўся палосамі арнаменту.

Белы фартух шыўся з дзвюх полаў, меў расшыты арнаментам ніз і звычайна карункавую ўстаўку.

Безрукаўка-кабат з белай ці чорнай тканіны мела прыталены сілуэт, яе даўжыня вагалася ад лініі таліі да сярэдзіны клубоў. Кабат аздабляўся аплікацыяй у выглядзе чырвонай тасьмы. Кароткі кабат, здаралася, прышываўся да андарака.

Абавязковай часткай жаночага гарнітура з'яўляліся галаўныя ўборы. Замужняя жанчына прыкрывала валасы вязаным чапцом — каптуром. Паверх яго мацавалася намітка — доўгі (да 3 м) і шырокі (каля 60 см) ручнік з кужэльнага палатна, які ўкладваўся ў выглядзе турбана.

Галаўныя ўборы дзяўчат былі даволі

Сяляне ў традыцыйным адзенні, в. Жыцін, 1915 г. Здымак І.А.Сербава.

Сяляне ў світках, в. Жыцін, 1915 г. Здымак І.А.Сербава.

разнастайныя. Сустракаліся вянкі з кветак, саламяныя абручы, але найбольш распаўсюджаным дзявочым галаўным уборам былі шырынкі — палатняныя павязкі даўжынёй каля 1 м і шырынёй 30 см. Шырынка складвалася ўдоўж удвая і завязвалася вузлом на патыліцы, пакідаючы верх галавы адкрытым. Валасы дзяўчаты заплятáлі ў 1 ці 2 касы. Своеасаблівы галаўны ўбор надзявала маладая на вяселлі. Гэта быў вянок з рознакаляровых ласкутоў, да якога мацавалася 12 доўгіх стужак рознага колеру.

З 2-й паловы XIX ст. у сялянскі ўжытак пачалі ўваходзіць даматканыя хусткі, якія паступова выцеснілі наміткі і шырынкі. У пачатку XX ст. наміткі насілі ўжо толькі старыя жанчыны. Каптуры бытавалі яшчэ ў 1920-я гады, але і яны былі заменены тонкай хустачкай, якая шчыльна абвязвалася вакол галавы, і паверх якой павязвалі хустку большых памераў.

Мужчынскае летняе адзенне складалася з прамога пакрою доўгай кашулі з вышытым каўняром (стойкай), які зашпільваўся з левага боку.

У кашулі аздабляліся вышыўкай ці тканым арнаментам рукавы і ніз, насілася яна навыпуск і падпяразвалася тканым ці вязаным дэкаратыўным поясам. Ён меў шырыню да 5 см, даўжыню да 2 м. На поясе звычайна насілі нож, капшук і шабету — скураны мех, у якім трымалі красала і трут.

Паверх кашулі надзявалася суконная белая камізэлька.

Мужчыны насілі белыя нагавіцы, пашытыя з тоўстай ільняной матэрыі. Яны былі вузкія, амаль аблягалі ногі і мелі своеасаблівы крой — «з сядлом» — клінападобнымі ўстаўкамі ў пахвіне.

З галаўных убораў часцей за ўсё сустракаліся саламяныя ці лямцавыя брылі і магеркі — невялікія суконныя круглыя капелюшы з загнутымі ўверх і прыгладжанымі палямі («крысамі»).

Зімовае адзенне сялян мела практычна аднолькавы крой для мужчын і жанчын.

Звычайным верхнім адзеннем з'яўлялася кароткая суконная белая ці шэрая світка. Яна шчыльна ахоплівала паясніцу і разыходзілася ніжэй двума клінамі, у якія былі ўшыты кішэні. Нізкі стаячы каўнер, канцы рукавоў, кліны па швах і пала, якая захіналася, абшываліся чорным шнуром. У выніку па клінах атрымлівалася нешта накшталт вусоў, таму і сам пакрой світкі называўся «з вусамі». Насілі зімой таксама і кажухі з сырамятных аўчын. Па пакроі яны былі вельмі падобныя на світкі, але шнуром не абшываліся.

Абавязковай часткай зімовага адзення былі рукавіцы, шытыя з сукна і аўчыны ці вязаныя з воўны.

Мужчыны ўзімку насілі магерку ці шапку-аблавуху — аўчынную круглую папаху з суконным верхам.

Немаўляг апраналі ў «мятлушак» — ільняную кужэльную пялёнку з адгулінай для галавы і «прыгалоўчык» — кужэльную хустачку. Пасля гэтага спавівалі ў пялёнкі вузкай папругай такім чынам, каб на грудзях дзіцяці з гэтай папругі атрымаўся крыж. Да пяцігадовага ўзросту хлопчыкі і дзяўчынкі апраналіся аднолькава — у доўгую да пят белую кашулю.

Пасля пяці гадоў хлопчыкі атрымлівалі гарнітур, практычна аднолькавы з адзеннем дарослых, а дзяўчынкі апраналіся ў сукенку чорнага ці белага колеру.

Своеасаблівым было і пахавальнае адзенне. На яго ішло кужэльнае палатно, якое не рэзалі, а рвалі рукамі. Вузлоў на нітках пры шыцці не завязвалі.

Звычайным сялянскім абуткам з'яўляліся лыкавыя лапці — «лычніцы» ці «маршчакі». Больш заможныя сяляне мелі скураныя лапці — «хадакі», формай падобныя на сучасныя галошы. Святочныя хадакі ўпрыгожваліся вышыўкай.

Боты з'явіліся ў сялянскім ужытку даволі позна — у XIX ст., што тлумачыцца беднасцю жыхароў краю і значным коштам гэтага абутку. Рэдка хто з сялян мог у той час дазволіць сабе мець больш за адну пару ботаў за ўсё жыццё. Да ботаў сяляне адносіліся з вялікай павагай. Гэта быў свайго роду сімвал заможнасці, якую магчыма было паказваць толькі ў асаблівых выпадках — на свята ці калі адпраўляліся на кірмаш. Звычайна боты абувалі ў апошні момант, на ваколіцы таго населенага пункта, у які ішлі. Таксама здымаліся яны адразу пасля выхаду, прыкладна на тым жа месцы.

Дзявочае святочнае адзенне. 1915 г. Здымак І.А.Сербава.

Гэты звычай існаваў даволі доўга і нават знайшоў адлюстраванне ў мясцовай тапаніміцы. Так, каля в. Караны ёсць невялікая рачулка з незвычайнай назвай. Паходжанне яе мясцовыя жыхары тлумачаць так: у Каранах здаўна існавала царква, у якую збіраліся жыхары з усіх навакольных вёсак. Каля рачулкі ім было зручна абувацца і разувацца. Вось і пайшла з таго часу трапная яе назва — Разуваеўка.

Дз.В.Саўрыцкі.

Вяселле ў Асіповіцкім раёне

Шлюбны працэс складаецца з чатырох галоўных момантаў: 1) барыш, 2) запоіны, 3) змовіны, 4) вяселле. Самы вялікі з іх — вяселле, якое распадаецца на некалькі частак: а) благаславенства, б) вянец, в) «госцікі» — сваты ў маладой, г) каравай у маладой, д) прыданыя (пасаг), е) каравай у маладога.

За 2—3 месяцы да вяселля сваты з маладым ідуць для перамоў да бацькоў маладой і ў выпадку згоды заядаюць і п'юць гарэлку, якую прыносіць з сабою малады. Гэта можа быць і за паўгода да вяселля. Утвораны акт называюць «запілі барышы» — высваталі дзеўку. Гутарка паміж гасцямі і гаспадарамі носіць жартоўна-дзелавы характар; песень звычайна тутака не спяваюць.

«Заповіны» бываюць не раней, чымся за два тыдні да вяселля. Гэта ўжо ёсць больш складаны акт. Малады разам з сватам прыходзіць да маладой і, калі ў іх ідзе ўсё згодна, склікае (на гэтую справу) сваякоў, а часам добра знаёмых суседзяў і суседак. Гарэлка іграе і тут значную ролю, і наогул без яе не абыходзіцца ніводнае больш-менш важнае з'явішча.

«Змовіны» бываюць за тры дні да вяселля. Разам са сватам малады прыходзіць да маладой пагутарыць. Гутарка носіць больш дзелавы характар, чымся раней.

Напярэдадні вяселля ўвечары па просьбе маладой да яе прыходзяць яе таварышкі, якія дапамагаюць у падрыхтоўцы да вяселля. Увечары прыязджаюць музыкі адкуль-небудзь з бліжэйшых вёсак, іх павінен наймаць малады. У большасці музык бывае два: гарманіст і цымбаліст. Часам да іх далучаецца скрыпка і барабан — гэта ўжо ў багацейшых, бо музыкі бяруць дорага: за вяселле 8—10 рублёў.

Увечары ў маладой адбываецца маленькая вечарынка — «паненскі вечар», на якой закускі не бывае; яна (вечарынка) абмяжоўваецца толькі скокамі. Старых скокаў ужо не назіраецца; у вёску прапаўзлі ўжо з горада новыя танцы, назва якіх тутака абрабляецца па-свойму: «ду-стэп», «вянгерка», «сыбота» і інш. Праўда, калі ідуць у скокі старыя падвыпіўшыя бабкі, то яны звычайна скачуць «лявоніху».

У дзень вяселля ў маладога зранку зборы. Ужо ў 9—10 гадзін збіраецца народ; сярод гасцей — «шафяры». У іх ідзе гутарка з сваякамі маладога; народу збіраецца ўсё больш і больш, у хаце цесна; спяваюць песні:

Вой, на дварэ ельнік-бярэзнік паслаўся,
Малады Гараська ў дарогу сабраўся.
Яго татачка у варот стаіць, не вяліць:
— Не едзь, не едзь, мой сыночак, — шляхота!
Ды ты свае конікі патопіш,
Ды ты свае дарагія шубы памочыш!
— Вой, што ж табе, татачка, да мяне?
У майго цёсця зялён явар на дварэ:
Пад яварам дарагія коні напасу,
На явары дарагія шубы пасушу!
— Едзь, едзь, Гараська, не станавіся,
Пад вішанькай спаць не лажыся.
Ужэ ж твая патрава да пылам прыпала?
Ужэ ж твая Марылька да другому стала?
— Я сваю патраву да панакрываю,
Я сваю Марыльку між дзевак пазнаю:
У мае Марылькі па плечках коскі,
Па плечках коскі, пад вачыма слёзкі.
Па плечках коскі да парасціланіся,
Пад вачыма слёзкі да паразліваліся,
Па плечках коскі, як лён-бяленькі,
Пад вачыма слёзкі, як мак драбненькі.

— Едзь, Гараська, не стой, не стой, —
У цябе конічак не свой, не свой,
Дарога караністая, Марылька ганарыстая!
— Я дарогу раўніць буду,
Марыльку наравіць буду.
Дарога параўнілася —
Марылька знаравілася.

Развіўся раёчак
Па край новых да вароцічак,
Хоча ён да паляцеці
У шчырыя бары,
На салодкія мяды,
На жоўтыя саты.

Сабраўся Гараська,
Са сваею да радзінаю
Хоча ён паехаці,
Цесця звааваці,
Сабе Марыльку ўзяці.

Яго татачка ходзіць
Да Гараську просіць:
— Гараська, сыночак,
Не ваюйся вайною,
Прасі цесця просьбаю,
Просьбаю — не грозьбаю,
Ціхімі да паходамі,
Нізкімі да паклонамі.

На стале стаіць закуска: каўбасы, сала, блінчыкі, пячэнне свайго вырабу і гарэлка. Пасля закускі — скокі; на прасторы 16—20 кв. арш. кружацца 8—10 пар; увесь час размовы гасцей. У гэты час малады запрагае каня, каб ехаць да маладой, а адтуль — у царкву.

У маладой — чаканне маладога; пры ёй «шафярыцы» — яны вараць, пякуць. Гэта ж самае рабілася і напярэдадні; гучаць песні:

Гаварыла бочачка,
У піўніцы стоячы:
— Калі вы мяне
Да не вып'еце —
Я і сама разальюся,
Па дварэ пакачуся,
На дварэ расіцаю,
За вароты крыніцаю.
Гаварыла дзевачка:
— Татачка мой родненькі,
Калі мяне да й не выдасі —
Я і сама ад вас пайду —
На двор дзявіцаю,
За вароты маладзіцаю.

Плавала вутка па моры хутка
Са сваімі вуцянятамі;
За ею, ею сівы селязень —
На крылцы наплывае:
— Пастой, вутачка, пастой, шэрая!
Што я табе за весць скажу:
«Быў я на моры, чуў я тры ўловы —
Таргуюць сеці на твае дзеці
І на цябе, шэрую вутку;
Зловяць цябе, шэрую вутку,
Маладыя рыбаловы
Да звараць цябе, шэрую вутку,
У паліваным гаршчочку.
Будуць цябе есці, шэрую вутку,
Панянята, князянята!»
Ходзіць дзевачка па сваім двары
З сваімі дружачкамі;
За ею, ею малады хлопчык
На ножкі наступае:
— Пастой, Марылька, пастой, душачка,
Што я табе за весць скажу:
«Праз цябе, маладую,
Таргуюць чэпчык і намётачку
На тваю галовачку!»
— Я чэпчык сарву, намётачку згарну
І з дзеўкамі ў танец пайду!
Ці мяне ў таночак, ці мяне ў вяночак?
Ці мяне да дзевачак?
Дзевачкі ідуць, красачкі нясуць —
Яны мяне не прымаюць.
Малодкі ідуць, намёткі нясуць —
Яны мяне прыжыдаюць!
Абуяла канапелечка
У агародзе стоячы,
Да не даў ёй ветрычку
Шчэ ж болей пабуяці,
Лісцікамі памахаці.
Да адбіў жа лісточак
Да на жоўты пясочак.
Да й гуляла Марылечка
У свайго роднага таткі,
Да не даў ёй Гараська
Шчэ ж болей пагуляці —
Да расплёў ёй коскі,
Да разліў ёй слёзкі.

Хадзілі стральцы па полю
Да злавілі сівага лася ў гаросе.
Як зачула тая ласіца, што ў лузе,
Пакідала крутыя рогі пад ногі;
— Няхай мае крутыя рогі прападуць,
Куды майго сівага лася павядуць?
Як зазвінелі галасныя званы ў полі,
Як зачула маладая Марылька ў каморы —
Сама пала сваёй мамачцы на ногі:
— Няхай мае залатыя ключы прападуць,
Куды мяне ад роднай мамачкі павязуць?

Што табе, дзевачка,
У мамкі надаела,
Што ты, маладая,
Замуж захацела?
У твайго таткі
Пірагі да й сладкі,
А ў твайго свёкаркі
Хлеба недахваткі.
Поўныя засекі,
Да кіёў насекі,
Да мякіну таўкуць,
Да аладкі пякуць,
Цыбульку смажуць
Да аладкі мажуць.

Сядзіць дзевачка за сталом,
Паклала ручачкі на стале.
— Белы мае ручачкі ў мамачкі,
А ці будуць белы ў свякрухі?
Ячную мякіну таўкучы,
Сырую пшаніцу мелючы?
— Не тужы, дзевачка, не тужы —
Ячную мякіну сам стаўку,
Сырую пшаніцу сам змялю!

Бярыце, дзевачкі, венічкі,
Мяціце вулачку з канца ў канец —
Будзе ехаць дзевачка пад вянец!
Забылася хустачкі, грабянца!
Вярніся, хлопчык, па хустачку, грабянец!

— Я ж табе, дзевачка, не пасланец!
Е ў цябе дружачкі-служачкі —
Яны табе пададуць хустачку, грабянец,
Яны цябе падвяжуць пад вянец!

Ці я табе, мамачка, не люба,
Што ты мяне пасылаеш да шлюба?
Ці я табе кашулькі не мыла,
Ці я цябе мамкаю не звала,
Ці я табе пасцелькі не слала?
Не слала пасцелькі — буду слаць,
Не звала мамкаю — буду званць,
Не мыла кашулькі — буду мыць!
Памыю кашульку беленька,
Пасцялю пасцельку мякенька,
Назаву мамачкай харашэнька!

Калі маладая — сірата, пяюць песні наступнага зместу:

Пазнаць Марыльку па вяселлечку,
Што Марылька — сіраціна.
Яе двор вялік, а збор невялік —
Не ўся яе радзіначка.
Паслаў бы я салавеечку
На Украіну па радзіну.
Салавей ляціць — не далятае;
А кукулечка на магілачцы
З мамкай размаўляе:
— Рада б я устаці к свайму дзіцяці,
Парадачак паказаці,
Калі мая душачка пад трыма замкамі:
Першы замок — зялёны дзярночак;
Другі замочак — жоўты пясочак;
Трэці замочак — цясовыя дошкі.

Нешта ў лесе памалюсеньку гукае —
Там Марылька свайго татачку шукае.
Хоць ты шукай, хоць ты не шукай — не знойдзеш:
Твой татачка на Украінцы — далёка,
У сырой зямлі, у жоўтым пясочку — глыбока!
Павей, павей, буян-вецер, з даліны,
Узвей, узвей жоўты пясочак з магілы,
Пабі, Божа, цясовыя дошкі на крошкі,
Пастаў, Божа, майго татачку на ножкі.
Хоць ты стаўляй, хоць не стаўляй — не стане!

Увесь час ідзе ў яе падрыхтоўка — пякуць, вараць. Калі месяць цеста на каравай, пяюць:

Каравайніцы з места
Да пакралі ўсё цеста —
Хто ў мех, хто ў карманы —
Ды дзевачкам на падманы,
Хто ў мех, хто ў кішэні —
Сваім дзецям на вячоры.

Сабраўся малады. З ім увесь час яго родная сястра (або дзве). Сястра маладога павінна быць абавязкова. Калі ў маладога няма з радні сясцёр, іх (або яе) замяняе чужая дзяўчына. Перад ад'ездам усе ўстаюць з-за стала, апошні адцягваюць ад сценак. Сват (звычайна хросны бацька) абводзіць за руку ўсіх навокал стала тры разы; за рукі бяруцца праз хусткі. За апошнім разам малады цалуе абраз. Сват, зварочваючыся да сваякоў, кажа:

— Благаславі, айцец, маці і добрыя людзі!

На што яму адказваюць:

— Бог благаславіць!

Гэты зварот паўтараецца тры разы — пасля кожнага абходу. Далей сват бярэ маладога за руку і выводзіць яго на двор. Ля дзвярэй два сваякі, узяўшы хлябы ў рукі і падняўшы іх угору, прапускаюць маладога і шафераў. Як толькі апошнія пройдуць такім чынам праз першыя і другія дзверы — хлябы здымаюць.

Раней перад вянцом у хаце маладога ставілі пустую дзяжу, якую засцілалі абрусам або новым палатном, садзілі маладога на дзяжу, ставілі каля яго тры звязаныя свечкі (чырвонай стужкай) і запальвалі іх; потым абводзілі навокал маладога свечкі і трошкі падпальвалі яго валасы. Пасля гэтага яго адпраўлялі да маладой (кажуць, што ў Пратасевічах — вымаўляюць таксама «Прадасэвічы», «Праташэвічы» — гэтак і цяпер робяць).

Малады садзіцца ў павозку, з ім побач сястра і шаферы; на другім кані — музыкі. Едуць да маладой. Туды ж накіроўваецца і ўвесь народ з яго хаты.

Як толькі прыедзе малады — маладую пачынаюць адзяваць. Малады адразу ідзе ў хату. Там яго садзяць за стол, на якім ёсць закуска і гарэлка. На самым куце садзяць яго сястру, па яе левую руку — малады, па правую — сваты. Ад яго ўлева — шаферы. Супроць маладога — цераз стол — пакідаюць месца для маладой.

Пачынаюць есці. Першы п'е старшы сват маладога. На сватах ляжыць увесь час абавязак распарадку — яны з'яўляюцца галоўнымі кіраўнікамі вяселля.

Астачу з чаркі, якая бывае адна і абыходзіць усіх, сват выліває за плячо і кажа: «Хай нашы маладыя так жывуць і падскакваюць». Пасля старшага свата чарка ідзе ўлева да сястры маладога, да яго самога і г.д. Выпіць трэба абавязкова і ў крайнім выпадку — прыгубіць. За сталом

сядзяць усе яе сваякі; з боку маладога нікога няма.

У бедных сялян ядуць звычайна рукамі — няма відэльцаў, лыжак. З закускі ставяць каўбасы, сала, мяса варанае, свініну. Хлеб бывае зверху з узорамі (зробленымі шклянкамі і чаркамі).

П'юць і ядуць да таго часу, пакуль не прыйдзе маладая. Яе прыводзіць за руку «заводніца». Заводніцай бывае «дзядзіна» (жонка дзядзі) або кума.

Калі «бяседа» ўселася за сталом, маладая з заводніцай ідзе ў другое памяшканне, дзе адзяюць маладую. Тутака заводніца рэжа ручнікі не нажнічкамі, а нажом — свату (хроснаму бацьку), бацьку маладога, рыхтуе пояс з воўны і хустачку (якую мае — кашаміравую або паркалёвую). Заводніца, трымаючы на далоні левай рукі хлеб, пояс і хустку (маладому), правай рукою вядзе маладую ў пакой, дзе знаходзіцца «бяседа». Звычайна яна нясе падарункі і музыкам — кожнаму па ручніку.

Маладую садзяць за стол са словамі заводніцы: «Благаславіце, айцец, маці і добрыя людзі!» На што сват адказвае: «Бог благаславіць!»

Старшая шаферыца прышывае кветкі — спачатку маладой, а потым маладому. Кожная малодшая шаферыца робіць тое самае з сваім шаферам. Пасля гэтага маладой даюць піць і есці (бывае, што даюць і раней).

Калі з вяселлем паспяшаюць, дык за сталом доўга не сядзяць. Маладая абходзіць стол тры разы, таксама як і малады ў сваёй хаце, з тым жа зваротам да бяседы; пасля гэтага кланяецца сваёй матцы, бацьку, усім родным — у гэты час яе хрысцяць.

Калі адзяюць маладой вянок, пяюць:

Бедавала Марылька, бедавала,
Што зарання зімачка напала,
Сняжком рутачка прыпала —
Не з чага маладзе вянка звіць.
Як зачуў яе Гараська:
— Не бядуй, Марылька, не бядуй,
Я ўчара на торгу пабываў,
Я табе вяночак старгаваў,
Хоць не руцьмяны — папяровы,
На тваю галоўку гатовы!

Маладыя садзяцца на коней. Праз увесь двор каня маладога вядзе сват, які ў руцэ трымае «пірог» (хлеб) на «веку» (крышка ад дзяжы.) Века зверху пакрыта надзежнікам. (Бывае, што першая выязджае маладая.) Калі выязджаюць з двара, дык маладая (або яе матка) сыпле жыта.

Па дарозе ў царкву маладая стараецца абагнаць маладога. Кажуць, што хто абгоне — таго ў жыцці «будзе верх». Але ж конь у маладога добры. У лепшым выпадку маладая застаецца ззаду, у горшым — вывернецца.

На зваротным з царквы шляху маладых у кожнай вёсцы, праз якую яны праязджаюць, спыняюць у «вешніцы» — ставяць стол, аздоблены кветкамі, на стале — хлеб, пасыпаны соллю, і шклянка, поўная вады, — «каб жыццё іх было поўнае». Малады павінен даць выкуп — «гасцінец»: цукеркі, калі няма, дык грошы; грошы даюць таму, хто прымушае, — звычайна моладзі.

У сваёй вёсцы маладога таксама затрымліваюць — ён павінен плаціць выкуп. Бывае так, што, пакуль ён даедзе да сваёй вёскі, яму ўжо няма чым плаціць. Звычайна малады выкупаецца цукеркамі. Пасля выкупу ў сваёй вёсцы маладыя пад'язджаюць да ганка маладой.

Раней маладых спынялі каля варот хаты маладой, і ён павінен даць бутэльку гарэлкі таму, хто зачыняе вароты. Пакуль маладая аправіцца, маладога затрымлівалі каля ганка. Маладую ж у хаце садзілі на лаўку перад сталом, а стол ставілі перад печчу. Лаўку пакрывалі кажухом, а галаву маладухі — белай паркалёвай хусткай. У гэты час госці стаяць на ганку; дзяўчаты спяваюць:

Не плача, не плача
Наша Марылька —
От даць ёй памачу —
Горкае цыбулі пад вочы.

Малады з павозкі павінен адразу стаць на дзяжу; калі ён перашагне — гэта адзнака яго нячэснасці.

Усіх гасцей пускаюць у хату. Сват нясе падарунак — намётку або на вопратку (гэта падарунак маладога) і кладзе перад маладой са словамі: «Добры вечар». Пры гэтых словах маладая павінна адкрыцца. Пасля гэтага бацька маладога зазывае: «Прашу, госцікі, за стол!»

Усе садзяцца за стол, і пачынаецца баляванне. За сталом шаферкі (або чужыя) пяюць:

Дай, свацця, пірага,
Бо вазьмём вала за рага,
Сівую кабылку за грыўку.

Або:

Сядзіць свацця на елі,
Распусціла калені.
Сядзіць свацця на вуллі –
Пад ёй пчолкі.

Або:

Сядзіць свацця – моршчыцца,
З кішэні пірог тошчыцца.

Урэшце, свацця дае пірага таму, хто спяваў. Ля ганка ўжо падрыхтаваны стол, аздоблены кветкамі (улетку жывымі, узімку са стужак або паперы). На стале — хлеб, соль, гарэлка і мёд (або цукар). Маладыя адразу злязаюць на падушку перад сталом; падушка пакрыта абрусам.

Раней маладая павінна была стаць на дзяжу (значэнне тое самае, што і для маладога). Усяго яна павінна была праходзіць цераз дзяжу 3 разы: 1) перад вянцом, 2) пасля прыезду з-пад вянца і 3) калі пераязджае ў хату маладога.

Калі маці маладога ўдава альбо за ўдаўцом, яна не павінна сустракаць маладых; гэтую ролю выконвае «хросная» альбо яшчэ якая-небудзь жанчына, не ўдава. Матка (альбо намесніца) дае маладым мёду па маленькай лыжачцы: спачатку дачцы, потым яму — па тры разы кожнаму; потым налівае сабе чарку гарэлкі і са словамі: «Будзьце здаровы», на што маладыя адказваюць: «Пійце на здароўе!» — выпівае, зноў налівае дачцы, потым сабе, яму — сабе — ёй — сабе і г.д., кожнаму тры разы. Кожны з іх, не дапіўшы, вылівае астачу праз плячо назад. Пры ўваходзе ў хату дзяўчаты ўлетку абсыпаюць маладых кветкамі; узімку — парэзанай афарбаванай паперай. Маладыя садзяцца за стол, і пачынаецца баляванне, пасля — скокі. Тут прысутнічаюць толькі сваякі маладой і яе госці.

У гэты час у хаце маладога збіраюцца яго госці. З хаты маладой сюды накіроўваецца пасланец па сваякоў і гасцей маладога; калі госці не ідуць, малады сам ідзе па іх. Усе пераходзяць у хату маладой, у гэты час яе сваякі і госці выходзяць. Новая змена садзіцца за стол; кіруе ўсім сват яго. Паміж сватам і бацькам маладога адбываецца пікіроўка, напрыклад, сват: «Глядзі, госці галадаюць!» Або: «Ты не маеш права са мной разгаварваць!» На што бацька маладой адказвае: «Прашу, госцікі, пійце і прабачайце на большае!» Калі гаспадар у дастатку — ён усё дае; калі скупы — замоўкне. Паеўшы і выпіўшы, уся змена ідзе ў хату маладога; зноў прыходзяць госці маладой, і зноў цягнуцца размовы, выпіўка, скокі...

НА ДРУГІ ДЗЕНЬ

У першую ноч маладым у яе хаце ложка не рыхтуюць; маладыя спяць дзе прыдзецца (як і госці): на падлозе, на возе і г.д. Часта разыходзяцца па блізкіх хатах, дзе і праводзяць астачу ночы.

Зранку ўсіх гасцей зазывае да маладой сват яе. У гэты ж час у хату да маладой прыходзяць сваты за некаторымі гасцямі маладога; іх сустракаюць клікамі: «Гэта ж хто прышоў? Гэта ж зладзеі! Яны што-небудзь украдуць!» На гэта сват маладога адказвае: «Цяпер мая сіла — усё возьмем!» — «Ну што ж — здадомся ў палон!»

У двары ў некаторых месцах у гэты час робяць з саломы каня, на якім павязуць свата, калі маладыя будуць пераязджаць да яго. Каня стараюцца ўкрасці госці з дома маладога. Тут бывае многа схватак, жартаў і смеху. У хаце ў час прыходу сватоў маладога спяваюць песні:

Мы думалі, што сватоў мала,
Аж іх поўная лава.
Як селі – свінню з'елі
З семярымі парасятамі,
Ды кабылу з жарабятамі.
На стале – ні крошачкі,
Пад сталом – ні костачкі!
Нашы сваткі немы,
Грэцкую муку елі,
Мукою папыліліся,
Лускою падавіліся.

Перад адправаў у яго дом у маладой бывае «каравай». Гэта — белы хлеб, аздоблены зверху маленькімі булачкамі, формы чатырохкутнай. Калі прыносяць каравай, сват маладога ўстае з-за стала і мые рукі, потым просіць, каб далі ручнік выцерці рукі.

Гэтым ручніком яго звязваюць праз правае плячо пад левую руку. Бывае і так, што тут яму дораць пояс або паркалёвай матэрыі, якой таксама звязваюць.

Спачатку сват выразае вярхушку каравая і дае маладым; потым рэжа яго на часткі і заклікае гасцей «купіць каравай». Першымі каравай закупаюць яе бацькі — кладуць грошы і хлеб, за імі ідуць сваякі. Пры гэтым кожны гаворыць якое-небудзь пажаданне, напрыклад: «Дару вам медзі, каб былі дзеці, як мядзведзі!»; «Дару шчасцем і доляй, як і людзей добрых, хлебам і соллю!»; «Дару шчасця, долі і белага сыру і да году сына!»; «Дару вам шчасця, долю і дубовы пень, каб любіліся ноч і дзень!»; «Дару вам шчасце, долю, жыта мерку і дачку-піянерку!» (З новых.)

Звычайна кладуць на талерку грошы, а іншыя — палатно. Атрымаўшы кавалак каравая, кожны павінен выпіць чарку гарэлкі. Пры раздачы каравая заўважаецца такі выпадак. Звычайна грашыма даруюць маладую ўсе прысутныя, у тым ліку і дзеці.

Каравай скончыўся; трэба рыхтавацца да ад'езду к маладому. Госці падымаюць свата «на ўра», качаюць яго, пытаючыся «мокра ці суха». Калі сват адказвае «суха», дык яго зноў качаюць, пакуль не скажа «мокра!». Тады ён павінен паставіць бутэльку гарэлкі тым, хто яго качаў.

Маладая бярэ з сабой пасцель, якую павінен спачатку выкупіць малады. Маці садзіцца на ложак, і паміж ёю і зяцем пачынаецца торг; у канцы малады плаціць грошы і гарэлку. Усе пасцельныя прылады — падушкі, посцілкі, коўдру — забіраюць на воз, на які малады садзіцца з маладой; апошняя бярэ вобраз і падарунак свякрусе, і накіроўваюцца ў хату маладога. Сваты і дружкі маладога стараюцца ўкрасці і ўвезці з сабою нажы, відэльцы і лыжкі.

Упарадзе паехалі музыканты.

Ля варот спыняюць каня маладога — зноў трэба плаціць выкуп. Тут пастаўлена бочка без дна і крышкі — у сярэдзіне салома, якую запальваюць. Калі пад'язджаюць да варот, дык малады кідае хлеб праз каня. Гэты хлеб падбірае публіка. Побач з бочкай ставяць стол, на якім ляжаць розныя рэчы: малаток, стары бот і інш. Некаторыя ўбіраюцца паляўнічымі і, прычапіўшы з боку курыцу, злоўленую ў двары маладога, сустракаюць абоз стрэламі. Пачынаецца торг. Калі не старгуюцца, напіраюць на вароты, якія трашчаць, ляцяць — і ўся ватага з маладымі на возе ўрываецца ў двор і аказваецца перад сталом, на якім ляжыць хлеб, соль і цукар.

Музыкі іграюць вітанне. Першую чарку выпівае маці «да свайго сына», потым дае маладой гарэлку, закусваюць цукрам. Бяседа спявае:

Пайду я замуж
Ды даведаюся —
Калі добра будзе,
Дык я нажывуся;
А калі пагана,
Дык назад вярнуся.
Я ў свайго татачкі
Служыць наймуся:
Прымі мяне, татачка,
Да хаця і з хлебам.
— Ты ж мяне, дзіцятка,
Цяпер не трэба.

Маладых вядуць у хату. Тутака маладая дорыць падарункі маці — палатна «на стан» (бялізну), намётку (раней), сёстрам маладога (хусткі), братам (паясы).

Праз некаторы час вязуць яе прыданае ў куфры; наперадзе — калі вяселле бывае ў адной вёсцы — едзе на саламяным кані сват. Ля ганка куфар затрымліваюць, і пачынаецца выкуп пасагу: з аднаго боку — малады, з другога — брат маладой, які сядзіць на возе, а з ім садзіцца на воз многа людзей. У гэты час бяседа спявае песню такога зместу:

Як у нашага свата
Да ні клеці, ні павеці —
Недзе куфра дзеці.
Ды паставім пад страхою
Ды накрыем бараною —
Тут яму векаваць,
А Гараську пільнаваць!

Калі не паладзяць, дык куфар вязуць назад; тады ўжо за ім едзе малады. Урэшце, малады плаціць выкуп — грошы, якія ідуць на карысць брата маладухі. У гэты час спяваюць у двары:

Падзякуйма свату,
Што просіць у хату
На мёд, на гарэлку,
На салодкае піва,
На харошае дзіва.

Куфар цягнуць у сенцы, усе накіроўваюцца ў хату. У хаце сваха засцілае сталы сваімі абрусамі, на вобразы — новыя ручнікі. Свахі спяваюць:

Прымайце пяньковіцы —
Засцелем бялевіцы;
Прымайце бялевіцы —
Засцелем шаўкавіцы.

Наступае апошняе дзеянне: каравай у маладога. Дзеляць яго перад ад'ездам сваякоў маладой: адбываецца ён таксама, як і ў маладой. Госці гуляюць увесь вечар; музыка грыміць то польку, то вальс.

Спяць дзе прыйдзецца; назаўтра апахмяляюцца... Пры ад'ездзе сваякоў маладой спяваюць:

Ох вы, свашачкі, ох вы, пташачкі,
Просім вас,
Каб не было нашаму дзіцяці
Ганьбы ў вас,
Каб не стаяла цёмныя ночы
Пад вакном,
Каб не ўцірала горкіх слёзак
Рукавом,
Каб не была паветачка
Хатачкай,
Каб не была суседачка
Мамачкай.
Паветачка — не цёплая хатачка,
Суседачка — не родная мамачка!

Маладыя ўступаюць у новае жыццё.

Запісаў А.Немцаў.

Друкуецца па кн.: Вяселле: Абрад. Мн., 1978. С. 438—450.

Музеі Асіповіччыны

Доўгі час у Асіповіцкім раёне не існавала раённага краязнаўчага музея. Асноўная работа па захаванні гістарычнай спадчыны вялася сіламі шматлікіх грамадскіх музеяў, створаных на прадпрыемствах (лакаматыўнае і вагоннае дэпо), у калгасе «Авангард», сярэдніх школах № 1, 2, 4 г. Асіповічы, школах вёсак Свіслач, Вязаўніца, Ліпень, р.п. Градзянка.

Сярод існуючых сёння грамадскіх музеяў асобае месца займае краязнаўчы музей Дараганаўскай СШ.

Ён быў створаны ў 1983 г. намаганнямі былой настаўніцы і першага дырэктара музея З.Р.Верашчака. Энергія і адданасць любімай справе гэтай жанчыны змаглі стварыць цуд — звычайны школьны краязнаўчы куток ператварыўся ў лепшы школьны музей у Беларусі. Станаўленне музея адбывалася ў канцы 1980 — пачатку 1990-х гадоў — адзін з найбольш складаных перыядаў эканамічнага жыцця нашай краіны, што вымагала ад яго стваральніцы шукаць новыя падыходы для вырашэння існуючых праблем. Напрыклад, каб знайсці матэрыялы для заканчэння будаўніцтва музея, Зінаідзе Рыгораўне прыйшлося звяртацца за дапамогай да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. А потым, калі экспазіцыя размясцілася ў прыгожым, прасторным і зручным двухпавярховым будынку, пачаліся пастаянныя пошукі

Экспазіцыя «Прырода роднага краю» ў краязнаўчым музеі Дараганаўскай СШ.

Экспазіцыя, прысвечаная Вялікай Айчыннай вайне, у музеі СШ № 2 г. Асіповічы.

сродкаў на пашырэнне фондаў, афармленне залаў...

Музей быў нібыта часткай душы яго няўрымслівай гаспадыні. А ці бывае цяжкай праца, калі яна для душы?

На жаль, З.Р.Верашчака ўжо няма з намі. Але яе справа працягваецца. Створаны яе рукамі музей доўгі час выконваў ролю раённага краязнаўчага музея. Яго экспазіцыя мае 6 тэматычных раздзелаў: «Наша мінулае», «Прырода роднага краю», «Яны змагаліся за Радзіму», «Знакамітыя землякі», «Творчасць народных майстроў», «Яны вучыліся ў нашай школе».

Сёння фонд музея налічвае 2887 экспанатаў. Сярод іх — прадметы сялянскага

Прадметы сялянскага побыту ў школьным музеі в. Вязаўніца.

побыту, нумізматыкі, дакументы і матэрыялы, якія адлюстроўваюць лёс знакамітага асіповіцкага роду Дараганаў, барацьбу жыхароў краю ў Вялікую Айчынную вайну, творчасць народных майстроў, жывёльны і раслінны свет раёна і інш.

Музей наведваюць экскурсійныя групы з Беларусі, а таксама з замежных краін.

У 1999 г. было прынята рашэнне аб стварэнні Асіповіцкага раённага гісторыка-краязнаўчага музея.

За кароткі час была афармлена зала, прысвечаная вызваленчай барацьбе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Супрацоўнікі музея праводзяць работу па прапагандзе гістарычных ведаў сярод моладзі, ствараюць умовы для таго, каб музей стаў сапраўдным клубам па інтарэсах, аб'яднаў усіх, хто неабыякава ставіцца да гісторыі роднага краю, клапоціцца пра захаванне духоўнай спадчыны народа.

Вялікую дапамогу ў станаўленні раённага гісторыка-краязнаўчага музея аказваюць мясцовыя краязнаўцы Ю.В.Клеванец і У.П.Зорын.

В.П.Шчаглоў.

З гісторыі населеных пунктаў

АСІПОВІЧЫ, горад, цэнтр раёна. За 3 км ад аўтамабільнай дарогі Мінск — Гомель, чыгуначны вузел чатырох напрамкаў: на Мінск, Магілёў, Бабруйск, Баранавічы, 35,7 тыс. жыхароў (на 1.1.2001 г.).

На месцы сучаснага горада ў XVIII ст. існавала в. Асіповічы. Паводле гістарычных крыніц, вёска ў 1797 г. уваходзіла ў Бабруйскі павет Мінскай губерні і з'яўлялася ўласнасцю Радзівілаў, 83 жыхары мужчынскага полу. У 1834 г. 26 двароў.

У 1872 г. заснавана чыгуначная станцыя Асіповічы Лібава-Роменскай чыгункі, тут на момант адкрыцця станцыі былі 4 драўляныя дамы і 20 жыхароў. У 1880-я — 1-й палове 1890-х гадоў пабудаваны 2 лесапільныя заводы, млын, адкрыта паштовае аддзяленне, створаны заезны двор. Чыгунка спрыяла хуткаму росту лесараспрацовак, развіццю рамёстваў і промыслаў, росту насельніцтва. У 1890 г. ад станцыі Асіповічы было адпраўлена каля 297 тыс. пудоў драўніны і іншых мясцовых грузаў. У 1896 г. была пракладзена чыгуначная лінія Асіповічы — Старыя Дарогі, што садзейнічала павелічэнню грузаабароту і далейшаму росту паселішча. Паводле перапісу 1897 г., на месцы сучаснага горада існавалі 3 самастойныя паселішчы з назвай Асіповічы: вёска (78 двароў, 526 жыхароў), чыгуначная станцыя (11 двароў, 100 жыхароў); пасёлак (38 двароў, 200 жыхароў, заезны двор, 4 крамы), якія пазней зліліся ў адзін населены пункт. Усе населеныя пункты ўваходзілі ў Замошскую воласць Бабруйскага павета.

У пачатку XX ст. у Асіповічах больш за 300 двароў, 41 вуліца і завулак (агульнай працягласцю 31,3 вярсты), 4 плошчы, 7 пажарных бочак, працавала 13 майстэрань (47 рамеснікаў), паравы млын, заезны двор, паштовае аддзяленне, хлебапякарня, 2 лесапільныя і шпалапрапітны заводы (пабудаваны ў 1900 г.), смалакурня, шмат крам, тэлеграф, прыёмны пакой (фельчар і акушэрка), 2 пачатковыя школы. Дзейнічалі майстэрні па вырабе і рамонце вокнаў, дзвярэй, колаў, саней, сельскагаспадарчых прылад працы і іншых рэчаў.

У 1905 г. чыгуначная лінія Асіповічы — Старыя Дарогі была прадоўжана да станцыі Урэчча, што істотна павялічыла грузаабарот станцыі Асіповічы (штогод адгружалася звыш 1 мільёна пудоў лясных грузаў). Аднак эканамічнае развіццё суправаджалася ўзмацненнем эксплуатацыі пралетарыяту. У снежні 1905 г. у Асіповічах адбылося выступленне рабочых, якія патрабавалі павелічэння заробку, паляпшэння ўмоў працы і быту. З 17 па 22 сакавіка 1908 г. рабочыя шпалапрапітнага завода правялі эканамічную забастоўку, якая была падаўлена паліцыяй і салдатамі.

У 1913 г. працавалі паравознае дэпо, 2 паравыя млыны, 2 лесапільныя, шпалапрапітны і піваварны заводы, шэраг рамесных майстэрань і лавак. З пачаткам 1-й сусветнай вайны Асіповічы апынуліся ў прыфрантавой паласе, што адмоўна паўплывала на эканоміку: закрываліся прадпрыемствы, павялічваліся цэны на харчовыя і прамысловыя тавары, раслі беспрацоўе і незадаволенасць насельніцтва. Летам 1915 г. адбыліся хваляванні салдат Асіповіцкага гарнізона (былі падаўлены).

У 1917 г. існавалі 3 населеныя пункты з назвай Асіповічы: вёска (112 двароў, 601 жыхар); чыгуначная станцыя (20 двароў, 224 жыхары); прыстанцыйнае мястэчка (354 двары, 4178 жыхароў).

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. У снежні 1917 г. у Асіповічах быў сфарміраваны чырвонагвардзейскі атрад колькасцю 1000 чалавек, які ў пачатку 1918 г. удзельнічаў у разгроме контррэвалюцыйнага корпуса Доўбар-Мусніцкага.

З лютага па май 1918 г. і са жніўня 1919 г. па ліпень 1920 г. Асіповічы былі акупіраваны польскімі, з мая па снежань 1918 г. — германскімі войскамі. У 1919—1920 гг. у ваколіцах Асіповіч дзейнічалі чыгуначны рэўком і партызанскія атрады Я.Багдановіча, А.Каралька, Дз.Пінчука, Трубачова.

З 1922 г. Асіповічы — цэнтр воласці. У 1920-я гады дзейнічалі паравознае дэпо, 2 лесапільныя, смалакурны, шпалапрапітны заводы, шэраг саматужных майстэрань, клуб чыгуначнікаў «Чырвоны Кастрычнік», бібліятэка, 2 школы, бальніца, электрастанцыя, смалакурная арцель «Чырвоны хімік», 2 амбулаторыі, тэлеграф. З ліпеня 1924 г. Асіповічы — цэнтр Бабруйскай акругі (да 1930 г.). У 1925 г. праведзена радыёфікацыя. У 1926 г. заснавана метэаралагічная станцыя.

Паводле перапісу 1926 г., існавалі 3 населеныя пункты з назвай Асіповічы: вёска (132 двары, 616 жыхароў); мястэчка (450 двароў, 3504 жыхары); чыгуначная станцыя (141 жыхар). З 1932 г., пасля здачы ў эксплуатацыю лініі Асіповічы—Рослаўль, станцыя стала буйным чыгуначным вузлом і злілася з мястэчкам. У 1935 г. Асіповічы атрымалі статус горада. З 1938 г. горад раённага падпарадкавання, цэнтр раёна. У пачатку 1941 г. у горадзе працавала 12 прамысловых прадпрыемстваў (каля 2 тыс. рабочых і служачых), у т.л. паравознае дэпо, вагонарамонтны пункт, арцелі «Перадавік», «Прагрэс», «Чырвоны хімік», леспрамгас, прамкамбінат, машынна-трактарная станцыя (заснавана ў 1931 г.), маслазавод, сярэдняя школа, бальніца, паліклініка, чыгуначная амбулаторыя, процітуберкулёзны дыспансер, радзільны дом і інш.

У Вялікую Айчынную вайну, з 30 чэрвеня 1941 г. па 28 чэрвеня 1944 г., акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Дзейнічала падпольная арганізацыя.

У гады вайны горад быў разбураны, загінула каля 1,5 тыс. чалавек. З верасня 1944 г. у складзе Бабруйскай, са студзеня 1954 г. Магілёўскай абласцей.

У пасляваенны час гаспадарка была адноўлена, рэканструяваны старыя, пабудаваны новыя прадпрыемствы, горад пашырыў межы, уключыўшы ў сябе в. Перамога (1973). У 1953 г. за 6 км на паўночны ўсход ад горада на рацэ Свіслач пабудавана Асіповіцкая гідраэлектрастанцыя, каля яе ўтварылася маляўнічае вадасховішча — месца адпачынку гараджан. У 1959 г. у горадзе 15,8 тыс. жыхароў. Са снежня 1962 г. у складзе Бабруйскага раёна, са студзеня 1965 г. зноў цэнтр раёна. З 7.3.1963 г. па 2001 г. горад абласнога падпарадкавання. У 2001 г. у Асіповічах 12 буйных прамысловых прадпрыемстваў, у

Чыгуначная станцыя Асіповічы.

т.л. рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Асіповіцкі завод аўтамабільных агрэгатаў», сумеснае беларуска-брытанскае прадпрыемства ААТ «Дах», адкрытыя акцыянерныя таварыствы «Асіповіцкі камбінат хлебапрадуктаў» і «Асіповіцкі малочны камбінат», рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Асіповіцкі завод камунальнага машынабудавання».

Чыгуначны вузел аб'ядноўвае 6 прадпрыемстваў рознага профілю. Аўтамабільны парк абслугоўвае пасажыраў на 13 маршрутах. Гандлёвым абслугоўваннем насельніцтва займаюцца адкрытае акцыянернае таварыства «Гандаль», раённае спажывецкае таварыства, прадпрыемства па абслугоўванні чыгуначнікаў і пасажыраў на станцыі Асіповічы, філіял ваенгандлю № 64, рынак, камбінат грамадскага харчавання, кафэ станцыі Асіповічы. Функцыянуюць 2 лазні, ёсць гасцініца.

Дзейнічаюць 2 аўтаматычныя тэлефонныя станцыі, 4 аддзяленні паштовай сувязі, філіялы Беларусбанка, «Прыёрбанка», аддзяленні Белагрmaпрамбанка і Прамбудбанка.

Пабудаваны пуцепровод цераз чыгунку, які звязаў паўночную і паўднёвую часткі горада.

Працуюць 5 агульнаадукацыйных школ, у т. л. комплекс «Дзіцячы дом — сярэдняя школа № 5», гімназія, спецшкола-інтэрнат, 13 дзіцячых дашкольных устаноў, дзіцячая школа мастацтваў, дзіцячая музычная школа, раённы Цэнтр культуры, гарнізонны Дом афіцэраў, 4 бібліятэкі, клубы: чыгуначнікаў «Чырвоны Кастрычнік», прадпрыемства «Дах», кінатэатр «Радзіма», Цэнтр народных рамёстваў і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, Цэнтр выхаваўчай работы дзяцей і юнацтва.

Медыцынскае абслугоўванне гараджан ажыццяўляюць 2 бальніцы, 3 паліклінікі (у т.л. стаматалагічная), 4 аптэкі.

Ёсць 3 стадыёны, 10 спартыўных залаў, 23 спартыўныя пляцоўкі. Каманды па баскетболе Асіповіцкага завода аўтамабільных агрэгатаў і па футболе «Свіслач» выступаюць на спаборніцтвах у 1-й лізе Рэспублікі Беларусь.

Дзенічаюць афіцыйна зарэгістраваныя рэлігійныя арганізацыі 3 асноўных канфесій: праваслаўнай, каталіцкай і пратэстанцкай.

Выдаецца газета «Асіповіцкі край».

У Асіповічах знаходзіцца шэраг гістарычных помнікаў: помнікі на брацкіх магілах партызан грамадзянскай вайны, расстраляных палякамі ў 1920 г.; савецкіх воінаў і партызан, ахвяр фашызму, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

На Рабоча-Сялянскай вуліцы ў 1984 г. пастаўлены помнік-гармата ў гонар вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх акупантаў 28 чэрвеня 1944 г. часцямі 18-га стралковага корпуса 65-й арміі і партызанамі Асіповіцкай ваенна-аператыўнай групы. У брацкай магіле на вуліцы Абросімава, у парку, пахаваны партызан Герой Савецкага Саюза Б.М.Дзмітрыеў і адзін з арганізатараў партызанскага руху на Асіповіччыне (яго імя носіць галоўная вуліца Асіповіч) С.С.Сумчанка. На мясцовых могілках пахаваны патрыёты А.Я.Сташкевіч і А.М.Чумакоў, якія загінулі

У цэнтры горада.



Вытворчыя карпусы СП ААТ «Дах».

ў барацьбе з бандытамі ў 1920—1922 гг., і Герой Савецкага Саюза П.І.Мароз, які вызначыўся ў Вялікую Айчынную вайну (памёр у 1952 г.). Ёсць мемарыяльныя дошкі: у гонар выступлення рабочых шпалапрапітнага завода ў 1908 г. (на будынку клуба чыгуначнікаў «Чырвоны Кастрычнік»), на ўшанаванне памяці актыўнага ўдзельніка Асіповіцкага падполля ў Вялікую Айчынную вайну Ф.А.Крыловіча (на сцяне жылога дома на вуліцы Крыловіча), Героя Савецкага Саюза С.М.Каданчыка (на сцяне жылога дома на вуліцы Каданчыка).

Асіповічы — радзіма Герояў Савецкага Саюза З.С.Гарэліка і Б.А.Майстрэнкі, члена-карэспандэнта Акадэміі навук Беларусі Н.В.Каменскай.

ГРАДЗЯНКА, рабочы пасёлак, цэнтр пасялковага Савета, чыгуначная станцыя на лініі Верайцы—Градзянка, за 30 км ад Асіповіч.

У канцы XIX ст., у сувязі з разгорнутымі ў навакольных лясах лесараспрацоўкамі, было заснавана паселішча Градзянка. У пачатку XX ст. гэты населены пункт быў вядомы як урочышча Градзянка Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 1 двор, 7 жыхароў. У 1905 г. тут заснаваны лесапільны завод. У гэты час уладальнікам вялікіх лясных масіваў паўночнай часткі сучаснага Асіповіцкага раёна з'яўляўся генерал Антоній Радзівіл, які займаўся тут лесараспрацоўкамі і гандлем лесаматэрыяламі. Ён арганізаваў акцыянернае таварыства для будаўніцтва чыгуначнай лініі Верайцы—Градзянка. У склад таварыства ўвайшлі таксама тутэйшы памешчык Іван Завіша, лесапрамысловец Карпаў і некаторыя іншыя зацікаўленыя ў гэтай справе людзі. На сродкі таварыства ў 1911 г. была пабудавана чыгуначная лінія са станцыямі Верайцы, Лапічы, Уборак, Градзянка. Чыгунка спрыяла хуткаму росту апошняй. Паводле перапісу 1917 г., на месцы сучаснага паселішча былі 2 населеныя пункты: пасёлак Градзянка (67 двароў, 359 жыхароў) і чыгуначная станцыя Градзянка (10 двароў, 35 жыхароў).

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў пасёлку адкрыта пачатковая школа і гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1925 г. у школе вучыліся 94 хлопчыкі і дзяўчынкі. Да пасёлка быў далучаны вялікі ўчастак былой памешчыцкай зямлі, на якім пабудавалі сядзібы колішнія парабкі і беднякі. З 15.7.1935 г. рабочы пасёлак.

У Вялікую Айчынную вайну ў пасёлку дзейнічала падпольная антыфашысцкая група, якую ўзначальваў В.І.Іваноў, а ў

Помнік на брацкай магіле партызан Вялікай Айчыннай вайны на вул. Абросімава ў Асіповічах.

навакольных лясах базіравалася 1-я Асіповіцкая партызанская брыгада. 29 сакавіка 1942 г. партызаны разгромілі нямецка-фашысцкі гарнізон, які знаходзіўся ў Градзянцы. Гітлераўцы спалілі пасёлак і знішчылі 350 яго мірных жыхароў.

У 2001 г. 416 двароў, 615 жыхароў, лесапункт, лясніцтва, аўтаматычная тэлефонная станцыя, аддзяленне сувязі, філіял Беларусбанка, грамадская лазня, аптэка, бальніца, Дом культуры, сярэдняя школа, бібліятэка, 3 магазіны.

У 1975 г. на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць гітлераўцаў у 1941—1944 гг., пастаўлены помнік—скульптура воіна. Там жа ў агульнай магіле пахаваны жыхары пасёлка, расстраляныя акупантамі. У 1974 г. пастаўлена стэла. За 1 км на поўдзень ад Градзянкі знаходзіцца магіла 11 жыхароў пасёлка і вёскі Яноўка, якіх знішчылі нямецка-фашысцкія захопнікі ў 1943 г. На магіле ў 1980 г. пастаўлена стэла.

ТАТАРКА, рабочы пасёлак, цэнтр пасялковага Савета і чыгуначная станцыя на лініі Асіповічы—Бабруйск, за 12 км ад Асіповіч.

У 2-й палове XIX ст. на месцы сучаснай Татаркі ўзнік хутар Барысавы Ляскі, 35 жыхароў (у т.л. сям'я Татураў, адсюль і назва). Годам заснавання хутара лічаць 1872 г., калі тут была пракладзена Лібава-Роменская чыгунка. Паводле перапісу 1897 г., чыгуначная станцыя Татарка Замошскай воласці Бабруйскага павета, 3 двары, 40 жыхароў. У пачатку XX ст. 3 двары, 25 жыхароў. Чыгуначная станцыя Татарка штогод адгружала больш за 50 тыс. пудоў лясных грузаў. У 1917 г. пасёлак пры станцыі Татарка, 7 двароў, 36 жыхароў. У сувязі з будаўніцтвам у 1930 г. торфапрадпрыемства «Татарка» пасёлак значна пашырыў свае межы. У 1940 г. на торфазаводзе працавала 414 рабочых. У 2001 г. у пасёлку 1029 чалавек. У межах Татаркі размешчаны торфапрадпрыемства, лясніцтва, Дом культуры, комплексны прыёмны пункт, сярэдняя і дзіцячая музычная школы, дзіцячы сад, бальніца, паліклініка, аптэка, бібліятэка, аддзяленне сувязі, філіял Беларусбанка, аўтаматычная тэлефонная станцыя, лазня, 3 магазіны.

У 1974 г. на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, адкрыты мемарыяльны комплекс.

ЯЛІЗАВА, рабочы пасёлак, цэнтр пасялковага Савета і чыгуначная станцыя на лініі Асіповічы—Магілёў, за 28 км ад Асіповіч, на шашы Градзянка—Сычкава, на правым беразе ракі Бярэзіна.

Назва дадзена ў гонар былой тутэйшай памешчыцы князёўны Лізаветы Велікапольскай. У пачатку XIX ст. за 4 км ад мястэчка Свіслач, уніз па цячэнні ракі Бярэзіна ўтварыўся круты абрыў. Плытагоны назвалі яго «абрубель». Гэта месца знаходзілася ў маёнтку князёўны Лізаветы Велікапольскай. Суседні памешчык Незабытоўскі, фаварыт князёўны, у падарунак ёй пабудаваў каля ўрочышча Абрубель палац і назваў яго Ялізава ў гонар гаспадыні. У 1900 г. тут пабудаваны лесапільны завод «Ялізава», пачаў складвацца пасёлак, які таксама атрымаў назву Ялізава. Паселішча ўваходзіла ў склад Свіслацкай воласці Бабруйскага павета Мінскай губерні. У пачатку XX ст. у пасёлку 9 двароў, 56 жыхароў, пачатковая школа. У 1912 г. пабудаваны шклозавод «Ялізава», на якім каля 60 рабочых самаручным спосабам выраблялі аконнае і лямпавае шкло, бутэлькі. Рабочы дзень працягваўся 12—15 гадзін. У чэрвені і верасні 1914 г. на заводзе адбыліся забастоўкі рабочых, якія патрабавалі скарачэння рабочага дня, павышэння заробку, паляпшэння ўмоў працы і быту. Паводле перапісу 1917 г., 50 двароў, 247 жыхароў. У грамадзянскую вайну шклозавод быў разбураны і адноўлены ў 1921 г. У 1922 г. шклозаводу было прысвоена імя Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Ялізаве былі створаны працоўная школа 1-й ступені (адкрыта ў 1918 г., у 1926 г. 106 вучняў), фельчарскі пункт і дзіцячыя яслі (1923). У 1926 г. 347 жыхароў. У 1927 г. на шклозаводзе працавала каля 500 рабочых. У 1930 г. выходзіла шматтыражная газета «Чырвоны гутнік». У 1931 г. праз Ялізава пракладзена чыгунка Асіповічы—Магілёў, тут заснавана чыгуначная станцыя Свіслач (з 1955 г. чыгуначная станцыя Ялізава). У 1935 г. Ялізава атрымала статус рабочага пасёлка, на шклозаводзе пачала дзейнічаць электрастанцыя, якая давала святло заводу і пасёлку. У 1939 г. 4,5 тыс. жыхароў, на

шклозаводзе — 750 рабочых. У час Вялікай Айчыннай вайны ў пасёлку дзейнічала падпольная група, якую ўзначальваў У.Панцэвіч. Гітлераўцы знішчылі каля 300 жыхароў Ялізава. 325 пасялкоўцаў загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 2001 г. 1460 двароў, 3302 жыхары. На тэрыторыі пасёлка размешчаны: адкрытае акцыянернае таварыства шклозавод «Кастрычнік», лясніцтва, хлебапякарня, сярэдняя і дзіцячая музычная школы, дзіцячы сад, 2 бібліятэкі, аддзяленне сувязі, філіял Беларусбанка, Дом культуры, Дом быту, бальніца, аптэка, чыгуначная станцыя, аўтаматычная тэлефонная станцыя, 7 магазінаў, мінірынак.

У 1967 г. на брацкіх магілах і на магіле ахвяр фашызму пастаўлены помнікі. Адна з вуліц пасёлка носіць імя Героя Савецкага Саюза М.В.Рамашкі, які загінуў пры вызваленні Ялізава. На ўскраіне пасёлка, на беразе ракі Бярэзіна, знаходзіцца археалагічны помнік — гарадзішча. Адносіцца да ранняга жалезнага веку і да эпохі Кіеўскай Русі.

Ялізава — радзіма беларускага вучонага, доктара тэхнічных навук У.П.Сцепанчука.

АСІПОВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

АГУЛА, вёска, у калгасе «Авангард», за 5 км ад Асіповіч, за 1,5 км ад чыгуначнай станцыі Асіповічы 2-я.

Вядома з пачатку XX ст. як засценак Агулы Замошскай воласці Бабруйскага павета. У 1917 г. 9 двароў, 54 жыхары. У 2001 г. 8 двароў, 16 жыхароў.

АСІПОВІЧЫ 2-я, чыгуначная станцыя на лініі Асіповічы—Магілёў, за 4 км ад Асіповіч.

Узнікла ў пачатку XX ст. У 1940 г. 17 двароў, 57 жыхароў. У 2001 г. 26 двароў, 83 жыхары.

АСІПОВІЧЫ 3-я, чыгуначная станцыя на лініі Асіповічы—Бабруйск, за 5 км ад Асіповіч.

Станцыя і прыстанцыйны пасёлак узніклі ў XIX ст. у 1940 г. 7 двароў, 31 жыхар. У 2001 г. 6 двароў, 8 жыхароў.

БРАДЗІШЧА, вёска, у калгасе «Авангард», за 9 км ад Асіповіч, за 5 км ад станцыі Татарка.

У 1897 г. у Замошскай воласці Бабруйскага павета, 3 двары, 26 жыхароў. У 1909 г. 11 двароў, 67 жыхароў. У 1917 г. 15 двароў, 96 жыхароў. У 1926 г. 20 двароў, 89 жыхароў. У 2001 г. 9 двароў, 14 жыхароў.

БУЛГАРЫ, вёска, у калгасе «Авангард», за 6 км ад Асіповіч, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Асіповічы 2-я. Вядома з XIX ст. У 1897 г. фальварак Замошскай воласці Бабруйскага павета, 1 двор, 16 жыхароў. У 1917 г. вёска, 16 двароў, 82 жыхары. У 1926 г. 17 двароў, 96 жыхароў. У 2001 г. 16 двароў, 30 жыхароў.

ВЯЛІКАЯ ГАРОЖА, вёска, у калгасе «Авангард», за 10 км ад Асіповіч, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Асіповічы 2-я.

Па пісьмовых крыніцах вядома з XVI ст. У 1560 г. дзяржаўнае сяло Гарожа Свіслацкай воласці Мінскага ваяводства ВКЛ. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі. У 1795 г. вёска Гарожа ў Бабруйскім павеце Мінскай губерні, уваходзіла ў казённы (дзяржаўны) маёнтак Брыцалавічы. У 1897 г. у Замошскай воласці, 31 двор, 202 жыхары, працавалі заезны двор, смалярна-шкіпінарны завод. У 1917 г. 73 двары, 427 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі адкрыта працоўная школа 1-й ступені (у 1926 г. 37 вучняў). У матэрыялах перапісу 1926 г. вёска ўпамінаецца пад назвай Вялікая Гарожа, 99 двароў, 393 жыхары. У 1940 г. 118 двароў, 380 жыхароў. У 2001 г. 29 двароў, 54 жыхары, крама.

У 1974 г. на магіле ахвяр фашызму пастаўлены абеліск.

ДЗЕРАЎЦЫ, вёска, у калгасе «1 Мая», за 8 км ад Асіповіч, за 1 км ад чыгуначнай станцыі Дзераўцы.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVI ст. У 1524 г. шляхецкае сяло Дзераўцы Мінскага павета ВКЛ. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі. З 1795 г. у Бабруйскім павеце Мінскай губерні. У 1838 г. уласнасць князя Л.П.Вітгенштэйна. У 1844 г. арандаваў памешчык Бокша. У 1909 г. вёска Замошскай воласці, 8 двароў, 48 жыхароў. Паводле перапісу 1917 г., 29 двароў, 172 жыхары. Дзейнічала народнае вучылішча, у якім працавала настаўніцай Вольга Неліповіч. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі народнае вучылішча пераўтворана ў працоўную школу 1-й ступені (у 1926 г. 109 вучняў). У 1924 г. створана меліярацыйнае таварыства. Паводле перапісу 1926 г., 34 двары, 180 жыхароў. У 1967 г. з вёскай зліўся пасёлак Казарма. У 2001 г. 19 двароў, 51 жыхар, фельчарска-акушэрскі пункт, крама, клуб.

ДЗЕРАЎЦЫ, пасёлак і чыгуначная станцыя на лініі Асіповічы — Старыя Дарогі, за 7,5 км ад Асіповіч.

Станцыя ўзнікла ў 1896 г. у сувязі з будаўніцтвам чыгункі Асіповічы — Дараганава — Старыя Дарогі. Паводле перапісу 1897 г., станцыя Дзераўцы Замошскай воласці Бабруйскага павета, 1 двор, 7 жыхароў. Побач са станцыяй знаходзіўся зямельны ўчастак (5 дзесяцін), які належаў чыгуначнаму інжынеру-тэхнолагу А.Шоманскаму. У 1905 г. лесапрамыслоўцы Аруплер і Альперын пабудавалі на станцыі лесапільны завод (згарэў у 1920 г. у час савецка-польскай вайны). У 1926 г. прыстанцыйны пасёлак, 18 двароў, 69 жыхароў. У 2001 г. 10 двароў, 37 жыхароў, аддзяленне сувязі.

ДУБРАЛЕВА, вёска, у калгасе «1 Мая», за 12 км ад Асіповіч, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Дзераўцы.

У 1909 г. засценак Жыцінскай воласці Бабруйскага павета, 11 двароў, 145 жыхароў. Паводле перапісу 1917 г., вёска, 20 двароў, 133 жыхары. У 1926 г. 30 двароў, 150 жыхароў. У 1940 г. 38 двароў, 170 жыхароў. У 2001 г. 10 двароў, 12 жыхароў.

ЗАДНЯЯ ГРАДА, вёска, у калгасе «1 Мая», за 12 км ад Асіповіч, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Дзераўцы.

У 1917 г. у Замошскай воласці Бабруйскага павета, 20 двароў, 137 жыхароў. У 1920 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені (у 1922 г. 24 вучні). Паводле перапісу 1926 г., 27 двароў, 149 жыхароў. У 2001 г. 8 двароў, 12 жыхароў.

ЗАМОШША, вёска, у калгасе «Авангард», за 1 км ад чыгуначнай станцыі Асіповічы 2-я.

Вядома з 1560 г. як прыватнае сяло Мінскага ваяводства ВКЛ. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, з 1795 г. у Бабруйскім павеце Мінскай губерні. У сярэдзіне XIX ст. належала роду Шышкаў. У 1845 г. 15 двароў, 74 жыхары. У 1866 г. адкрыта школа царкоўнай граматы (у 1891 г. 36 вучняў, у тым ліку 5 дзяўчынак). У 1886 г. цэнтр воласці, 15 двароў, 218 жыхароў, працавалі валасное праўленне, праваслаўная царква. У 1893 г. дзейнічала народнае вучылішча (настаўнікі А.Корбут і К.Надзейка). У 1897 г. 57 двароў, 340 жыхароў, дзейнічалі праваслаўная царква, народнае вучылішча, млын, хлебазапасны магазін, заезны двор, лаўка. Побач з сялом знаходзіўся памешчыцкі маёнтак Замошша, 3 двары, 18 жыхароў. У пачатку XX ст. пачало працаваць паштовае аддзяленне.

У 1917 г. 99 двароў, 578 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе народнага вучылішча створана працоўная школа 1-й ступені (у 1922 г. 55 вучняў), адкрыта хата-чытальня. З 1925 г. па 1989 г. цэнтр сельсавета. У 1926 г. 33 двары, 130 жыхароў. У 1940 г. 96 двароў, 271 жыхар. У 1943 г. вёска была спалена нямецка-фашысцкімі карнікамі, 50 жыхароў забіты. У 2001 г. 106 двароў, 244 жыхары, крама, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, фельчарска-акушэрскі пункт, няпоўная сярэдняя школа, бібліятэка, клуб.

У 1974 г. на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў у 1941 — 1944 гг., пастаўлены помнік — скульптурная кампазіцыя (воін і партызан са сцягам).

ЗАРУЧЭЎЕ, вёска, у калгасе «1 Мая», за 9 км ад Асіповіч, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Дзераўцы.

Вядома з пачатку XX ст. як вёска Замошскай воласці Бабруйскага павета, 6 двароў, 49 жыхароў. У 1917 г. 17 двароў, 95 жыхароў. У 1922 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені, дзе навучалася 15 дзяцей. У 1926 г. 18 двароў, 108 жыхароў. У 2001 г. 17 двароў, 33 жыхары.

ЗАСЯЛЕЧЧА, вёска, у калгасе «Авангард», за 11 км ад Асіповіч, за 2 км ад чыгуначнай станцыі Татарка.

Паводле перапісу 1897 г., засценак Засялечча Замошскай воласці Бабруйскага павета, 12 двароў, 91 жыхар. У 1922 г. адкрыта пачатковая школа (21 вучань), у 1925 г. створана меліярацыйнае таварыства. У 1926 г. 42 двары, 183 жыхары. У 2001 г. 20 двароў, 31 жыхар.

КАСТРЫЧНІК, вёска, у калгасе «Авангард», за 8 км ад Асіповіч, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Асіповічы 3-я.

Заснавана ў 1925 г. на былых панскіх землях. У 1940 г. 35 двароў, 111 жыхароў. У 2001 г. 20 двароў, 30 жыхароў.

КЛЯПЧАНЫ МОСТ, вёска, у калгасе «1 Мая», за 5 км ад Асіповіч, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Дзераўцы.

Заснавана ў 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях. У 1940 г. 36 двароў, 170 жыхароў. У 2001 г. 8 двароў, 17 жыхароў.

У 1967 г. на брацкай магіле савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях у 1941—1944 гг., пастаўлены абеліск.

ЛІЦВІНАВА, вёска, у калгасе «Авангард», за 2 км ад чыгуначнай станцыі Асіповічы 3-я.

У 1917 г. пасёлак Ліцвінава, 18 двароў, 99 жыхароў. У 1926 г. вёска, 18 двароў, 82 жыхары. У 2001 г. 21 двор, 48 жыхароў.

ЛУЧЫЦЫ, вёска, у калгасе «Авангард», за 6 км ад Асіповіч, за 2 км ад чыгуначнай станцыі Асіповічы 3-я.

У сярэдзіне XIX ст. пад такой назвай існавалі маёнтак і вёска. Паводле перапісу 1897 г., вёска ў Замошскай воласці Бабруйскага павета, 58 двароў, 343 жыхары. Побач з вёскай існавала аднайменная сядзіба, 1 двор, 3 жыхары. У 1917 г. у вёсцы 91 двор, 538 жыхароў. У 1926 г. хутары Лучыцы, 93 двары, 447 жыхароў. У 1940 г. вёска, 96 двароў, 270 жыхароў. У студзені 1943 г. вёска была спалена гітлераўскімі карнікамі, забіта 8 жыхароў. У 2001 г. 56 двароў, 136 жыхароў, крама, клуб.

МАЛАЯ ГАРОЖА, вёска, у калгасе «Авангард», за 7 км ад Асіповіч, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Асіповічы 2-я. Пасяленне ўзнікла на рэштках старажытнай сядзібы з агарожай, таму першапачатковая назва была Гарожка. У сярэдзіне XIX ст. у складзе казённага маёнтка Брыцалавічы. У 1897 г. у Замошскай воласці Бабруйскага павета, 30 двароў, 196 жыхароў. У 1909 г. 43 двары, 284 жыхары. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі адкрыта працоўная школа 1-й ступені. З сярэдзіны 1920-х гадоў Малая Гарожа. У 1926 г. 92 двары, 449 жыхароў. У 1940 г. 82 двары, 310 жыхароў. У студзені 1943 г. вёска была спалена гітлераўскімі карнікамі, якія загубілі 3 яе жыхароў. У 2001 г. 77 двароў, 206 жыхароў, фельчарска-акушэрскі пункт, аўтаматычная тэлефонная станцыя, магазін, дзіцячы сад, бібліятэка, клуб. На тэрыторыі вёскі знаходзіцца Брыцалавіцкае лясніцтва.

Паблізу вёскі, на правым беразе р. Свіслач, знаходзіцца археалагічны помнік — курганны могільнік (належаў дрыгавічам, датуецца X—XIII ст.).

МАЛОЦІНА, вёска, у калгасе «1 Мая», за 5 км ад чыгуначнай станцыі Асіповічы.

На пачатку XX ст. у Замошскай воласці Бабруйскага павета, 12 двароў, 75 жыхароў. У 1926 г. 18 двароў, 87 жыхароў. У 2001 г. 8 двароў, 21 жыхар.

ОСАВА, вёска, цэнтр калгаса «1 Мая», за 5 км ад Асіповіч, за 2 км ад чыгуначнай станцыі Дзераўцы. У 1909 г. у Замошскай воласці Бабруйскага павета, 10 двароў, 100 жыхароў. У 1917 г. 7 двароў, 53 жыхары. У 1926 г. 34 двары, 160 жыхароў. У 2001 г. 69 двароў, 201 жыхар, крама, базавая школа, бібліятэка, клуб, дзіцячы сад, грамадская лазня, аўтаматычная тэлефонная станцыя.

ПРУДОК, вёска, у калгасе «1 Мая», за 3 км ад чыгуначнай станцыі Асіповічы.

У 1874 г. з пачаткам будаўніцтва паравознага дэпо чыгуначнай станцыі Асіповічы на рацэ Сіняй былі пабудаваны грэбля, сажалка і вадакачка для запраўкі паравозаў вадой. На правым беразе сажалкі ўзнікла паселішча, названае па месцы размяшчэння Прудок.

Паводле перапісу 1897 г., засценак Прудок Замошскай воласці Бабруйскага павета, 14 двароў, 75 жыхароў. У пачатку XX ст. вёска, 9 двароў, 66 жыхароў, а таксама аднайменны хутар, 1 двор, 18 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі далучаны вялікі ўчастак былой панскай зямлі, на якой былі пабудаваны сядзібы. У 1926 г. 23 двары, 103 жыхары. У 2001 г. 50 двароў, 86 жыхароў.

СТАВІШЧА, вёска, у калгасе «1 Мая», за 9 км ад Асіповіч, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Дзераўцы.

У 1909 г. у Замошскай воласці Бабруйскага павета, 15 двароў, 113 жыхароў. У 1917 г. вядома пад назвай Стаішча, 33 двары, 234 жыхары. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі адкрыта працоўная школа 1-й ступені (у 1926 г. 57 вучняў). У 1926 г. 45 двароў, 241 жыхар. У 1940 г. вёска Ставішча, 55 двароў, 240 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну часткова спалена нямецка-фашысцкімі акупантамі. У 2001 г. 31 двор, 62 жыхары.

ЯГАДНАЕ, вёска, у калгасе «1 Мая», за 11 км ад Асіповіч, за 4,5 км ад чыгуначнай станцыі Дзераўцы.

Першапачатковая назва Драчова, з 1964 г. Ягаднае. Вядома з пачатку XX ст. У 1917 г. вёска Драчова ў Замошскай воласці Бабруйскага павета, 30 двароў, 191 жыхар. У 2001 г. 24 двары, 33 жыхары.

ЯСЯНЕЦ, вёска, у калгасе «Авангард», за 7 км ад Асіповіч, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Асіповічы 3-я.

Вядома з сярэдзіны XVII ст. Паводле перапісу 1897 г., на месцы сучаснай вёскі існавалі 2 хутары — Ясянец 1-ы (2 двары,

25 жыхароў); Ясянец 2-і (1 двор, 10 жыхароў). У пачатку XX ст. вёска Замошскай воласці Бабруйскага павета, 7 двароў, 42 жыхары. У 1926 г. 12 двароў, 71 жыхар. У 1940 г. 15 двароў, 51 жыхар. У Вялікую Айчынную вайну вёска была часткова спалена. У 2001 г. 6 двароў, 10 жыхароў.

ВЯЗЗЕЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЯЗЗЕ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Авангард», за 6 км ад Асіповіч, на левым беразе Асіповіцкага вадасховішча.

Вядома з XVI ст. як дзяржаўнае сяло Свіслацкай воласці Мінскага павета Вялікага княства Літоўскага. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, з 1795 г. у Ігуменскім павеце Мінскай губерні. У 1897 г. вёска Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 38 двароў, 341 жыхар, працавалі 2 млыны, хлебазапасны магазін, карчма, царква, царкоўна-прыходская школа. Была наладжана паромная пераправа цераз млынавы стаў. У 1895 г. у сваякоў — сям'і лесніка Ф.А.Секяржыцкага — некаторы час жыў з маці будучы беларускі паэт М.Багдановіч. У 1917 г. 77 двароў, 469 жыхароў. Побач былі маёнтак, 60 жыхароў, і сядзіба, 13 жыхароў, млын. З 1931 г. цэнтр сельсавета. У 1940 г. у Вяззе пераселены жыхары хутара Лянёўка. У 1967 г. з Вяззем аб'ядналася суседняя в. Каменка. У 2001 г. 257 двароў, 695 жыхароў, сельсавет, калгасная сядзіба, рамонтная майстэрня, лясніцтва, рыбгас «Свіслач», Асіповіцкая ГЭС, аддзяленне сувязі, фельчарска-акушэрскі пункт, аўтаматычная тэлефонная станцыя, 2 крамы, сярэдняя школа, дзіцячы сад, Дом культуры, бібліятэка, музей працоўнай славы.

У 1984 г. на былой хаце Секяржыцкіх устаноўлена мемарыяльная дошка, прысвечаная М.Багдановічу. У 1987 г. адкрыты мемарыяльны комплекс у гонар землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

ВЯРЭЙЦЫ, вёска, у калгасе «Авангард», за 9 км ад Асіповіч, на левым беразе Асіповіцкага вадасховішча.

Вядомы з XVI ст. як дзяржаўнае сяло Свіслацкай воласці Мінскага павета Вялікага княства Літоўскага. У 1560 г. 21 двор. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі. З 1795 г. у Ігуменскім павеце Мінскай губерні. У 1897 г. вёска Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 37 двароў, 244 жыхары. Дзейнічала царква (згарэла ў 1968 г.). У 1926 г. 53 двары, 252 жыхары. У 2001 г. 13 двароў, 18 жыхароў.

ЗБОРСК, вёска, у калгасе «Авангард», за 9 км ад Асіповіч, на левым беразе Асіповіцкага вадасховішча.

Вядомы з XVI ст. У 1560 г. упамінаецца як дзяржаўнае сяло Зборск (яно ж Ізборск) Свіслацкай воласці Мінскага павета Вялікага княства Літоўскага. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, з 1795 г. у Ігуменскім павеце Мінскай губерні. У 1828 г. на месцы старажытнай царквы пабудавана новая. У 1886 г. 12 двароў, 108 жыхароў, дзейнічалі царква і народнае вучылішча (адкрыта ў 1882 г., у 1891 г. 20 вучняў). У 1897 г. у Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 23 двары, 153 жыхары, народнае вучылішча, крама, карчма, 2 разы на год праводзіліся кірмашы. У 1917 г. 37 двароў, 209 жыхароў. З 1924 г. па 1931 г. цэнтр сельсавета. У 1940 г. 64 двары, 305 жыхароў. У 2001 г. 43 двары, 91 жыхар, магазін.

Недалёка ад вёскі знаходзяцца 4 археалагічныя помнікі — 2 курганныя могільнікі і 2 гарадзішчы.

КАМАРЫНА, вёска, у калгасе «Авангард», за 5 км ад Асіповіч, на левым беразе ракі Сіняя.

Вядома з 1926 г. як пасёлак Камарына, 24 двары, 109 жыхароў. У 2001 г. 6 двароў, 8 жыхароў, аўтазаправачная станцыя.

Паблізу вёскі знаходзяцца 3 археалагічныя помнікі — селішча ранняга жалезнага веку (IV ст. да н.э. — IV—V ст. н.э.) і 3 курганы.

ЛЕНІНА, вёска, у калгасе «Авангард», за 9 км ад Асіповіч, на левым беразе Асіповіцкага вадасховішча.

Заснавана ў 1923 г. на былых панскіх землях колішнімі парабкамі. У 1940 г. 26 двароў, 131 жыхар. У 1967 г. з в. Леніна аб'яднана суседняя в. Зялёная Дуброва. У 2001 г. 41 двор, 74 жыхары.

ОРЧА, вёска, у калгасе «Авангард», за 10 км ад Асіповіч, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Брыцалавічы, на шашы Асіповічы—Свіслач.

Вядома з XIX ст. У 1827 г. прыватная вёска, 7 рэвізскіх душ. У 1884 г. адкрыта школа царкоўнай граматы (у 1890 г. 17 вучняў). У 1897 г. у Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 48 двароў, 109 жыхароў. У 1917 г. 58 двароў, 446 жыхароў. У 2001 г. 48 двароў, 108 жыхароў, крама.

Каля вёскі археалагічны помнік — курганны могільнік.

ПАТАШНЯ, вёска, у калгасе «Авангард», за 11 км ад Асіповіч, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Брыцалавічы, на шашы Асіповічы — Свіслач.

У 1897 г. фальварак Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 1 двор, 29 жыхароў. У 1926 г. упамінаецца ў дакументах як пасёлак, 7 двароў, 38 жыхароў. У 1940 г. 18 двароў, 83 жыхары. У 2001 г. 17 двароў, 27 жыхароў.

СМЫК, вёска, у калгасе «Авангард», за 9 км ад Асіповіч, на правым беразе Асіповіцкага вадасховішча.

Вядома з XIX ст. пад назвай Смык-Слабада (вёска ці маёнтак). У 1844 г. маёнтак Л.П.Вітгенштэйна. У 1897 г. вёска Смык-Слабада Замошскай воласці Бабруйскага павета, 43 двары, 299 жыхароў, працаваў хлебазапасны магазін. У пачатку XX ст. 66 двароў, 393 жыхары. У 2001 г. 50 двароў, 104 жыхары, фельчарска-акушэрскі пункт, крама.

Недалёка ад вёскі знаходзяцца археалагічныя помнікі — гарадзішча і 2 селішчы.

ЦЯПЛУХІ, вёска, у калгасе «Авангард», за 5 км ад Асіповіч, на шашы Мінск — Бабруйск.

Вядома з XVI ст. як дзяржаўнае сяло Свіслацкай воласці Мінскага павета Вялікага княства Літоўскага. У 1560 г. 13 двароў. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, з 1795 г. у Ігуменскім павеце Мінскай губерні. У 1897 г. у Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 27 двароў, 219 жыхароў. У пачатку XX ст. 35 двароў, 344 жыхары, царква. У 1926 г. 61 двор, 291 жыхар, дзейнічала працоўная школа 1-й ступені (50 вучняў). У Вялікую Айчынную вайну карнікі спалілі 18 падвор'яў разам з жыхарамі. З Цяплухамі аб'ядналіся пасёлак ГЭС (1967) і в. Селішча (1976). У 2001 г. 113 двароў, 235 жыхароў, 2 магазіны, клуб.

Паблізу вёскі, у лесе і на беразе Асіповіцкага вадасховішча, археалагічны помнік — курганны могільнік, які мае 19 насыпаў.

ДАРАГАНАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВОСТРАЎ, вёска, у калгасе «Каўгарскі», за 25 км ад Асіповіч, за 9 км ад чыгуначнай станцыі Дараганава.

Вядома з XIX ст. У 1897 г. урочышча Новадарожскай воласці Бабруйскага павета, 4 двары, 27 жыхароў. У 1940 г. 27 двароў, 102 жыхары. У 2001 г. 4 двары, 4 жыхары.

ДАРАГАНАВА, вёска, цэнтр сельсавета, чыгуначная станцыя на лініі Асіповічы — Старыя Дарогі, за 17 км ад Асіповіч, на левым беразе р. Пціч.

Заснавана як чыгуначная станцыя ў 1896 г. памешчыкам Дараганам і названа ў яго гонар. У пачатку XX ст. тут з назвай Дараганава былі 4 населеныя пункты: пасёлак (36 двароў, 223 жыхары), чыгуначная станцыя (1 двор, 33 жыхары), фальварак (4 двары, 32 жыхары), лесапільны завод (65 жыхароў). Усе адносіліся да Новадарожскай воласці Бабруйскага павета. У 1917 г. 76 двароў, 605 жыхароў, 11 крам, паравы млын, народнае вучылішча. У 1923 г. адкрыты фельчарскі пункт. З 1924 г. цэнтр сельсавета. У 1926 г. пачалі працаваць хата-чытальня і школа-сямігодка (183 вучні). У пачатку 1930-х гадоў дзейнічала сукнавальня. У 1940 г. 213 двароў, 852 жыхары. У час акупацыі пасёлак быў часткова спалены. У 2001 г. 215 двароў, 411 жыхароў, лясніцтва, аўтаматычная тэлефонная станцыя, участковая бальніца, аптэка, аддзяленне сувязі, філіял Беларусбанка, сярэдняя і санаторна-лясная школы, дзіцячы сад, краязнаўчы музей, Дом культуры, бібліятэка, 3 магазіны.

У 1976 г. пастаўлены помнікі на брацкіх магілах савецкіх воінаў і партызан і брацкіх магілах ахвяр фашызму. Каля вёскі, на левым беразе р. Пціч, знаходзіцца археалагічны помнік — стаянка бронзавага веку.

КАМАРЫНА, вёска, у калгасе «Каўгарскі», за 18 км ад Асіповіч, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Дараганава.

У 1917 г. засценак Жыцінскай воласці Бабруйскага павета, 3 двары, 25 жыхароў. У 1921 г. хутар, 1 двор, 11 жыхароў. У 2001 г. 17 двароў, 23 жыхары.

КАЎГАРЫ, вёска, цэнтр калгаса «Каўгарскі», за 19 км ад Асіповіч, за 2 км ад чыгуначнай станцыі Дараганава.

У сярэдзіне XIX ст. фальварак Л.П.Вітгенштэйна. У 1897 г. у Новадарожскай воласці Бабруйскага павета, 17 жыхароў. У 1901 г. памешчык Дараган пабудаваў вінакурны завод. У 1909 г. 28 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі фальварак пераўтвораны ў вёску. У 1940 г. 70 двароў, 300 жыхароў. У 1976 г. да в. Каў-

гары далучана суседняя в. Халькі. У 2001 г. 191 двор, 448 жыхароў, калгасная сядзіба, рамонтная майстэрня, спіртзавод «Каўгарскі», аўтаматычная тэлефонная станцыя, ветэрынарная лячэбніца, магазін, лазня, бібліятэка, клуб.

У 1976 г. пастаўлены помнікі на 2 брацкіх магілах савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Каля вёскі, на правым беразе р. Пціч, знаходзіцца археалагічны помнік — курганны могільнік.

КРАІ, вёска, у калгасе «Каўгарскі», за 21 км ад Асіповіч, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Дараганава.

Вядома з XIX ст., уласнасць магнатаў Вітгенштэйнаў. У 1897 г. у Новадарожскай воласці Бабруйскага павета, 38 двароў, 288 жыхароў. У 1917 г. 75 двароў, 464 жыхары. У 1940 г. 124 двары, 513 жыхароў. У 2001 г. 85 двароў, 144 жыхары, магазін, фельчарска-акушэрскі пункт.

КРЫНКА, вёска, у калгасе «Каўгарскі», за 19 км ад Асіповіч, за 8 км ад чыгуначнай станцыі Дараганава.

Вядома з XVII ст. У 1651 г. фальварак Крынка Мінскага павета Вялікага княства Літоўскага. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, з 1795 г. у Бабруйскім павеце Мінскай губерні. У 1840 г. упамінаецца як вёска, 33 двары, 142 рэвізскія душы. У 1841 г. пабудавана драўляная царква. У 1847 г. уваходзіла ў маёнтак Л.П.Вітгенштэйна Майсеевічы. У 1897 г. сяло ў Жыцінскай воласці Бабруйскага павета, 110 двароў, 672 жыхары. Дзейнічалі смалакурна-шкіпінарны завод (заснаваны ў 1886 г.), вадзяныя млыны, карчма, хлебазапасны магазін, ваўначоска, царква. У 1905 г. адкрыта народнае вучылішча, якое мела ўласны будынак. Побач знаходзіліся аднайменныя маёнтак, 14 двароў, пасёлак, 4 двары, 36 жыхароў, заезны двор, царкоўная сядзіба. У 1922 г. на базе народнага вучылішча створана працоўная школа 1-й ступені (у 1923 г. 43 вучні), пачала дзейнічаць хатачытальня. У 1927 г. стала працаваць метэастанцыя. У 1940 г. 171 двор, 684 жыхары. У былым маёнтку Крынка перад вайной дзейнічаў дзіцячы санаторый «Крынка». У 2001 г. 79 двароў, 104 жыхары. Працуе дзіцячы лагер адпачынку «Пціч», магазін.

У 1975 г. пастаўлены абеліск на магіле расстраляных гітлераўцамі 82 дзяцей санаторыя, якія не паспелі эвакуіравацца. У 1976 г. пастаўлены помнікі на брацкай магіле савецкіх воінаў і на магіле Д.Т.Кірдуна, які загінуў у баі у 1941 г. Непадалёку ад вёскі, у лесе, знаходзіцца археалагічны помнік-курган.

ЛУКА, вёска, у калгасе імя Ульянава, за 19 км ад Асіповіч, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Дараганава, на правым беразе ракі Пціч.

Вядома ў 1639 г. як урочышча Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства Рэчы Паспалітай. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, з 1795 г. у Бабруйскім павеце. У 1897 г. урочышча Новадарожскай воласці, 1 двор, 10 жыхароў. У пачатку XX ст. засценак, 15 двароў, 102 жыхары. У 1940 г. вёска, 65 двароў, 262 жыхары. У снежні 1943 г. вёска спалена гітлераўскімі карнікамі. У 2001 г. 45 двароў, 75 жыхароў.

Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў 1944 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. Каля вёскі археалагічны помнік — курганны могільнік, які мае 3 насыпы.

МЯЖНОЕ, былая вёска, зараз не існуе. Знаходзілася за 24 км ад Асіповіч, за 12 км ад чыгуначнай станцыі Дараганава.

Заснавана на мяжы розных зямельных уладанняў, таму так і названа. У 1897 г. пасёлак Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета, 8 двароў, 46 жыхароў. У 1926 г. засценак, 20 двароў, 102 жыхары. У 1940 г. вёска, 60 двароў, 250 жыхароў. У 1971 г. жыхары пераселены ў іншыя месцы.

У 1983 г. пастаўлены помнік на магіле 86 жыхароў вёскі, загубленых гітлераўцамі 20.1.1943 г.

МЯЗОВІЧЫ, вёска, у калгасе «Каўгарскі», за 16 км ад Асіповіч, за 8 км ад чыгуначнай станцыі Дараганава, на шашы Асіповічы — Шышчыцы.

Вядомы з XVI ст. У 1517 г. сяло ў Глускай воласці Мінскага павета Вялікага княства Літоўскага, шляхецкая ўласнасць. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, з 1795 г. у Бабруйскім павеце Мінскай губерні. У сярэдзіне XIX ст. вёска ў складзе маёнтка Л.П.Вітгенштэйна Майсеевічы. У 1897 г. у Жыцінскай воласці Бабруйскага павета, 44 гаспадаркі, 286 жыхароў, карчма. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі адкрылася працоўная школа 1-й ступені (у 1926 г. 45 вучняў). У 1940 г. 106 двароў, 424 жыхары. У 2001 г. 63 двары, 94 жыхары, магазін.

У 1975 г. і 1976 г. пастаўлены помнікі на 2 брацкіх магілах савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях у 1941—1944 гг.

ПТУШЫЧЫ, вёска, у калгасе «Каўгарскі», за 18 км ад Асіповіч, за 1 км ад чыгуначнай станцыі Дараганава, на левым беразе ракі Пціч.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. У 1797 г. вёска, належала Дамініку Радзівілу, 21 жыхар мужчынскага полу. У 1838 г. уласнасць Л.П.Вітгенштэйна, частка яго маёнтка Каўгары, 22 рэвізскія душы. У 1897 г. вёска ў Новадарожскай воласці Бабруйскага павета, 18 двароў, 128 жыхароў. У 1917 г. 27 двароў, 184 жыхары. У 1940 г. 28 двароў, 83 жыхары. У 2001 г. 34 двары, 56 жыхароў.

РАДУЦІЧЫ, вёска, цэнтр калгаса імя Ульянава, за 16 км ад Асіповіч, за 2 км ад чыгуначнай станцыі Дараганава, на правым беразе ракі Пціч.

Вядома з сярэдзіны XVI ст. У 1549 г. дзяржаўнае сяло ў Глускай воласці Мінскага павета Вялікага княства Літоўскага. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, з 1795 г. у Бабруйскім павеце Мінскай губерні. У 1797 г. 64 душы мужчынскага полу, уласнасць Дамініка Радзівіла. У 1844 г. цэнтр маёнтка Радуцічы, сумеснага ўладання памешчыкаў Бокшаў і Вітгенштэйнаў. У 1897 г. вёска ў Новадарожскай воласці Бабруйскага павета, 55 двароў, 374 жыхары. Дзейнічалі заезны двор, хлебазапасны магазін. Побач знаходзіліся аднайменныя панская сядзіба, 2 двары, 20 жыхароў, фальварак, 3 двары, 25 жыхароў, і лесапільны завод, 4 двары, 67 жыхароў. У 1908 г. адкрылася народнае вучылішча. У 1917 г. вёска (109 двароў, 613 жыхароў) і маёнтак (1 двор, 46 жыхароў). Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе народнага вучылішча створана працоўная школа 1-й ступені (у 1923 г. 84 вучні), працавала хата-чытальня. У 1967 г. з Радуцічамі аб'яднана в. Каменка. У 2001 г. 140 двароў, 338 жыхароў, праўленне калгаса, магазін, комплекс «Школа — дзіцячы сад», бібліятэка, Дом культуры.

Помнікі на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны; на магіле ахвяр фашызму; на магіле ўдзельніка грамадзянскай вайны А.К.Паланейчыка; у памяць землякоў, якія загінулі ў 1941—1945 гг.

СВІХАНАВА, вёска, у калгасе «Каўгарскі», за 14 км ад Асіповіч, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Дараганава.

Заснавана на былых памешчыцкіх землях колішнімі парабкамі ў 1920-я гады. У 1940 г. 16 двароў, 52 жыхары. У 2001 г. 8 двароў, 12 жыхароў.

СЛОПШЧА, вёска, у калгасе імя Ульянава, за 16 км ад Асіповіч, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Дараганава.

Вядома з XVII ст., упамінаецца ў 1630 г. як урочышча Бабруйскага староства Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства Рэчы Паспалітай. У сярэдзіне XIX ст. вёска ўваходзіла ў склад маёнтка Л.П.Вітгенштэйна Радуцічы. У 1845 г. 7 двароў, 58 жыхароў. У 1897 г. у Новадарожскай воласці Бабруйскага павета, 22 двары, 165 жыхароў. У 1917 г. 42 двары, 255 жыхароў. У 2001 г. 43 двары, 69 жыхароў.

Каля вёскі знаходзіцца археалагічны помнік — стаянка бронзавага веку.

СЯЛЕЦ, вёска, у калгасе «Каўгарскі». За 20 км ад Асіповіч, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Дараганава.

У 1897 г. у Новадарожскай воласці Бабруйскага павета, 21 двор, 152 жыхары. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі тут створана працоўная школа 1-й ступені (у 1926 г. 46 вучняў), у 1929 г. працавала кузня. Перад Вялікай Айчыннай вайной 75 двароў, 342 жыхары. На 1.1.2001 г. 80 двароў, 85 жыхароў, магазін.

УЛЬЯНАЎКА, вёска, у калгасе «Каўгарскі», за 20 км ад Асіповіч, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Дараганава.

Заснавана ў 1926 г. на былых панскіх землях колішнімі парабкамі і беднякамі. У 2001 г. 7 двароў, 9 жыхароў.

ДРЫЧЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АСТРОЎКІ, вёска, у калгасе «Шлях Ільіча», за 27 км ад Асіповіч, за 13 км ад чыгуначнай станцыі Фалічы, на левым беразе ракі Пціч.

Заснавана ў 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях колішнімі парабкамі і беднякамі. У 1940 г. 41 двор, 122 жыхары. У 2001 г. 15 двароў, 18 жыхароў.

ВЯЛІКІ БОР, вёска, цэнтр калгаса імя Чарняхоўскага, за 34 км ад Асіповіч, за 15 км ад чыгуначнай станцыі Фалічы, на шашы Асіповічы — Шышчыцы.

У 2001 г. 81 двор, 236 жыхароў, калгасная сядзіба, магазін, фельчарска-акушэрскі пункт, млын, аўтаматычная тэлефонная станцыя, бібліятэка.

На ўскраіне вёскі помнікі на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан, якія

загінулі ў баях з гітлераўскімі захопнікамі ў 1941—1944 гг.

ДВОРЫШЧА, вёска, у калгасе імя Чарняхоўскага, за 34 км ад Асіповіч, за 18 км ад чыгуначнай станцыі Фалічы. Заснавана ў 1920-я гады на месцы колішняй сядзібы (Дворышча). У 2001 г. 24 двары, 33 жыхары.

ДРЫЧЫН, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Шлях Ільіча», за 29 км ад Асіповіч, за 12 км ад чыгуначнай станцыі Фалічы, на шашы Асіповічы — Шышчыцы.

У пачатку XX ст. пасёлак Дрычын Жыцінскай воласці Бабруйскага павета, 20 двароў, 98 жыхароў. Дзейнічалі царква і хлебазапасны магазін. У 1917 г. засценак Дрычын, 12 двароў, 65 жыхароў. З 1957 г. цэнтр сельсавета. У 2001 г. 98 двароў, 248 жыхароў, філіял Беларусбанка, праўленне калгаса, лясніцтва, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, магазін, сярэдняя школа, дзіцячы сад, бібліятэка.

ЖЫЦІН, вёска, у калгасе імя Чарняхоўскага, за 31 км ад Асіповіч, за 16 км ад чыгуначнай станцыі Фалічы, на правым беразе ракі Пціч.

Вядома з XVI ст. як сяло Жыцін, цэнтр аднайменнага маёнтка Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага. З 1793 г. ў складзе Расійскай імперыі, з 1795 г. у Бабруйскім павеце Мінскай губерні. Спачатку з'яўлялася ўласнасцю Радзівілаў, а потым Вітгенштэйнаў. У 1872 г. пабудавана драўляная царква. У 1838 г. 70 двароў, 234 жыхары, царква, крама, карчма. У 1866 г. адкрыта народнае вучылішча. З пачатку 1880-х гадоў цэнтр аднайменнай воласці, 76 двароў, 602 жыхары. У 1891 г. у народным вучылішчы вучыўся 41 хлопчык, настаўнікам быў К.Сыцько. У 1897 г. 151 двор, 1030 жыхароў, праваслаўная царква, народнае вучылішча, хлебазапасны магазін, крама, заезны двор, карчма. Побач знаходзіўся аднайменны маёнтак В.Ф.Дарагана, 2 двары, 57 жыхароў. У 1917 г. 232 двары, 1331 жыхар. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі народнае вучылішча пераўтворана ў працоўную школу 1-й ступені (у 1922 г. 55 вучняў), адкрыты хата-чытальня, урачэбны ўчастак. З 1924 г. да 1957 г. цэнтр сельсавета. У 1927 г. адкрыта метэастанцыя. У 1940 г. 110 двароў, 489 жыхароў. У 2001 г. 56 двароў, 108 жыхароў, аддзяленне сувязі, магазін, Дом культуры.

ЗАНЯЦЕЧЧА, вёска, у калгасе імя Чарняхоўскага, за 32 км ад Асіповіч, за 12 км ад чыгуначнай станцыі Фалічы. Вядома з XIX ст. Паводле перапісу 1897 г., хутар Жыцінскай воласці Бабруйскага павета, 4 двары, 31 жыхар. У 1940 г. вёска, 63 двары, 235 жыхароў. У 2001 г. 22 двары, 31 жыхар.

КАНЦЫ, вёска, у калгасе «Шлях Ільіча», за 24 км ад Асіповіч, за 12 км ад чыгуначнай станцыі Дараганава, на шашы Асіповічы — Шышчыцы.

Вядома з XIX ст. У 1897 г. у Жыцінскай воласці Бабруйскага павета, 21 двор, 173 жыхары. У 1917 г. 43 двары, 280 жыхароў. У 2001 г. 41 двор, 64 жыхары.

На ўскраіне вёскі археалагічны помнік — курганны могільнік (2 курганы).

КРАМОК, вёска, цэнтр калгаса «Шлях Ільіча», за 30 км ад Асіповіч, за 14 км ад чыгуначнай станцыі Фалічы, на левым беразе ракі Пціч.

Вядомы з XVIII ст. У 1797 г. вёска Бабруйскага павета, уласнасць Дамініка Радзівіла. У сярэдзіне XIX ст. належала князю Л.П.Вітгенштэйну, уваходзіла ў маёнтак Жыцін. У 1897 г. у Жыцінскай воласці, 100 двароў, 645 жыхароў, хлебазапасны магазін, карчма. У 1917 г. 159 двароў, 892 жыхары, народнае вучылішча, у якім настаўнікам працаваў Мікалай Рымашэўскі. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе народнага вучылішча створана працоўная школа 1-й ступені (у 1923 г. 47 вучняў). У 1967 г. з Крамком аб'яднана в. Юравічы. У 2001 г. 99 двароў, 164 жыхары, калгасная сядзіба, рамонтныя механічныя майстэрні, магазін, праваслаўная царква, Дом культуры, млын.

Помнікі на мясцовых могілках на 3 брацкіх і 1 адзіночнай магілах савецкіх воінаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

МАЙСЕЕВІЧЫ, вёска, у калгасе «Шлях Ільіча», за 26 км ад Асіповіч, за 11 км ад чыгуначнай станцыі Фалічы, на правым беразе ракі Пціч.

Вядома з XIX ст. як вёска Бабруйскага павета. У 1838 г. 151 рэвізская душа, памешчыцкая ўласнасць. У 1844 г. цэнтр аднайменнага маёнтка, уласнасць князя Л.П.Вітгенштэйна. У 1897 г. у Жыцінскай воласці Бабруйскага павета, 71 двор, 467 жыхароў, працавалі карчма, хлебазапасны магазін. Побач знаходзіўся маёнтак Майсеевічы, 1 двор, 15 жыхароў. У 1908 г.

адкрыта народнае вучылішча, настаўнікам працаваў Мікалай Плышэўскі. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі народнае вучылішча пераўтворана ў працоўную школу 1-й ступені (у 1926 г. 50 вучняў). У 1940 г. 160 двароў, 753 жыхары. У 2001 г. 102 двары, 172 жыхары, магазін, млын.

У 1975 г. на брацкай магіле савецкіх воінаў (у лесе, каля вёскі), якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941, 1944 гг., пастаўлены абеліск. Недалёка ад вёскі, на беразе р. Пціч, знаходзіцца археалагічны помнік — стаянка бронзавага века. Радзіма Героя Савецкага Саюза С.М.Каданчыка.

ПЯСЧАНКА, вёска, у калгасе імя Чарняхоўскага, за 35 км ад Асіповіч, за 18 км ад чыгуначнай станцыі Фалічы, на правым беразе ракі Пціч.

Узнікла ў 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях. У 1940 г. 32 двары, 161 жыхар. У 2001 г. 24 двары, 38 жыхароў.

КАМЕНІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

АСАВОК, вёска, у калгасе «Новы шлях», за 28 км ад Асіповіч, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Градзянка.

Вядомы з XIX стагоддзя. У 1897 г. засценак Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 7 двароў, 54 жыхары. У 1917 г. упамінаецца як фальварак, 6 двароў, 52 жыхары. У 1924 г. 11 двароў, 50 жыхароў. У 1940 г. 53 двары, 240 жыхароў. У снежні 1943 г. гітлераўскі карны атрад знішчыў 141 жыхара і часткова спаліў вёску. У 2001 г. 29 двароў, 59 жыхароў, магазін.

У 1974 г. на магіле ахвяр фашызму і на магіле М.А.Казачонка пастаўлены помнікі.

КАЗІМІРАВА, вёска, у калгасе «Новы шлях», за 25 км ад Асіповіч, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Градзянка.

Вядома з сярэдзіны XIX ст. як маёнтак памешчыкаў Нямчынавічаў. У 1897 г. фальварак Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 11 двароў, 62 жыхары. У пачатку XX ст. засценак, 10 двароў, 37 жыхароў. У 1917 г. на месцы сучаснай вёскі з назвай Казімірава былі 3 населеныя пункты: ваколіца (18 двароў, 116 жыхароў); хутары Казімірава 1-е (5 двароў, 27 жыхароў) і Казімірава 2-е (4 двары, 28 жыхароў). У 1926 г. вёска, 21 двор, 122 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну вёска часткова спалена гітлераўцамі. У 2001 г. 4 двары, 4 жыхары. Дзейнічае касцёл (пабудаваны ў 1904 г.).

КАМЕНІЧЫ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Новы шлях», за 28 км ад Асіповіч, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Градзянка.

Вядомы з XVI ст. У 1513 г. дзяржаўнае сяло Каменічы Свіслацкай воласці Мінскага ваяводства ВКЛ. У 1560 г. 14 двароў. У 1561 г. уваходзіла ў маёнтак «Свіслач», якім валодаў М.Гарабурда. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, з 1795 г. у Ігуменскім павеце Мінскай губерні. У сярэдзіне XIX ст. уласнасць памешчыкаў Пятроўскіх. У 1880-я гады 30 двароў, 545 жыхароў. Працаваў млын. Раз у год, у красавіку, праводзіўся кірмаш. Паводле перапісу 1897 г., тут існавалі вёскі Вялікія Каменічы (68 двароў, 449 жыхароў, млын, царква, школа царкоўнай граматы, хлебазапасны магазін), і Малыя Каменічы (19 двароў, 113 жыхароў), яны адносіліся да Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета. У 1917 г. існавалі в. Вялікія Каменічы (92 двары, 512 жыхароў, працавала народнае вучылішча, настаўнік В.Восіпаў), в. Малыя Каменічы (30 двароў, 192 жыхары) і маёнтак Каменічы (2 двары, 21 жыхар). У 1926 г. у Вялікіх Каменічах 99 двароў, 505 жыхароў, у Малых Каменічах 35 двароў, 180 жыхароў. У 1929 г. адкрыта хата-чытальня, працавалі кузня і ваўначоска. У Вялікую Айчынную вайну гітлераўцы тройчы палілі Каменічы (у студзені 1943 г., лютым і маі 1944 г.), загубілі 25 мірных жыхароў. 23.2.1944 г. недалёка ад вёскі загінуў у баі з гітлераўцамі партызан Б.Дзмітрыеў, якому пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. З 1954 г. цэнтр сельсавета. У 1967 г. Вялікія і Малыя Каменічы аб'яднаны ў адну в. Каменічы.

У 2001 г. 133 двары, 384 жыхары, лясніцтва, фельчарска-акушэрскі пункт, аўтаматычная тэлефонная станцыя, ветэрынарны пункт, аддзяленні сувязі і ашчаднага банка, комплекс «Сярэдняя школа — дзіцячы сад», млын, Дом культуры, бібліятэка.

Паблізу вёскі размешчаны 3 археалагічныя помнікі — курганныя могільнікі (усяго 119 насыпаў). У 1985 г. пастаўлены помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ПРЫЦЕРПА, вёска, у калгасе «Новы шлях», за 36 км ад чыгуначнай станцыі

Асіповічы, на правым беразе ракі Бярэзіна.

Вядома з XIX ст. У 1897 г. засценак Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 12 двароў, 92 жыхары. У 1926 г. вёска, 26 двароў, 135 жыхароў. У 1940 г. 33 двары, 105 жыхароў. У 2001 г. 10 двароў, 12 жыхароў.

У 1966 г. каля вёскі пастаўлены помнік на магіле партызана, які загінуў 19.9.1942 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

ЦЭЗАРАВА, вёска, у калгасе «Новы шлях», за 28 км ад Асіповіч, за 8 км ад чыгуначнай станцыі Градзянка, на шашы Градзянка — Свіслач.

Вядома з пачатку XX ст. Паводле перапісу 1917 г., тут знаходзіліся аднайменныя ўрочышча (3 двары, 21 жыхар) і лясная старожка (1 двор, 5 жыхароў). У 1926 г. пасёлак, 4 двары, 18 жыхароў. У 2001 г. 30 двароў, 61 жыхар, магазін.

ЯНОЎКА, вёска, у калгасе «Новы шлях», за 27 км ад Асіповіч, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Градзянка.

Вядома з XIX ст. У 1897 г. засценак Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 12 двароў, 101 жыхар. У 1917 г. тут існавалі пад назвай Яноўка 2 паселішчы: вёска (8 двароў, 41 жыхар) і засценак (11 двароў, 50 жыхароў). У 1926 г. вёска, 31 двор, 129 жыхароў, працоўная школа 1-й ступені (70 вучняў), хата-чытальня. З 1926 г. да 1954 г. цэнтр сельсавета. Зімой 1941 г. партызаны знішчылі размешчаны ў вёсцы паліцэйскі гарнізон, у адказ гітлераўцы расстралялі 22 яе мірных жыхароў. У 2001 г. 28 двароў, 66 жыхароў, магазін.

У 1974 г. на магіле партызана У.А.Богуша, які загінуў у 1942 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, пастаўлены помнік.

КАРЫТНЕНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

БОРТНАЕ, былая вёска. Размяшчалася за 13 км ад чыгуначнай станцыі Ясень.

Перад Вялікай Айчыннай вайной тут было 18 двароў, 100 жыхароў. У студзені 1943 г. нямецка-фашысцкія карнікі спалілі вёску і загубілі 98 яе жыхароў. Вёска не адрадзілася.

У 1967 г. на месцы вёскі пастаўлены абеліск. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».

ДЗЕМЕНКА, вёска, у калгасе «Карытнае», за 19 км ад Асіповіч, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Ясень.

Вядома з XVII ст. У 1639 г. упамінаецца як урочышча Бабруйскага старостава Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства ВКЛ. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, з 1795 г. у Бабруйскім павеце Мінскай губерні. У 1897 г. вёска Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета, 12 двароў, 76 жыхароў. У пачатку XX ст. засценак, 7 двароў, 46 жыхароў. У 1926 г. вёска, 22 двары, 112 жыхароў. У 1940 г. 18 двароў, 147 жыхароў. У 2001 г. 28 двароў, 71 жыхар.

У 1967 г. на магіле савецкага воіна, які загінуў у 1941 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, пастаўлены помнік.

КАРАНЫ, вёска, у калгасе «Карытнае», за 7 км ад чыгуначнай станцыі Асіповічы, на шашы Асіповічы — Глуша.

У сярэдзіне XIX ст. казённая (дзяржаўная) вёска, потым належала памешчыкам Шашкам. У 1890 г. працавала школа царкоўнай граматы (вучылася 10 хлопчыкаў і 5 дзяўчынак). У 1897 г. вёска ў Замошскай воласці Бабруйскага павета, 42 двары, 267 жыхароў. У 1917 г. хутары Караны, 66 двароў, 397 жыхароў. У 1921 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені (у 1926 г. 59 вучняў). У 1940 г. 102 двары, 407 жыхароў. У 2001 г. 62 двары, 113 жыхароў, лясніцтва, магазін, клуб, бібліятэка.

У 1968 г. на брацкай магіле савецкіх воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, пастаўлены помнік.

КАРЫТНАЕ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Карытнае», за 16 км ад Асіповіч, за 12 км ад чыгуначнай станцыі Ясень, на шашы Асіповічы — Глуша.

Вядома з XVII ст. Паводле юрыдычных актаў 1639 г., адносілася да Бабруйскага староства Мінскага ваяводства Рэчы Паспалітай. З 1793 г. сяло ў Расійскай імперыі, з 1795 г. у Бабруйскім павеце. У сярэдзіне XIX ст. уласнасць памешчыкаў Узлоўскіх. У 1868 г. у Карытненскай сядзібе памешчыка К.Вайніловіча гасціў знакаміты беларускі драматург і паэт В.Дунін-Марцінкевіч. У 1897 г. тут існавалі сяло Карытна (4 двары, 23 жыхары, працавала царква і заезны двор); сяло Задарожжа-Карытна (50 двароў, 273 жыхары, карчма, хлебазапасны магазін, лаўка) і маёнтак Карытна (62 жыхары), усе паселішчы адносіліся да Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета. У 1900 г. у сяле Задарожжа-Карытна была адкрыта царкоўна-прыходская школа. У 1917 г. у

сяле Карытна 63 двары, 393 жыхары, царква, у маёнтку Карытна 120 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі адкрыта працоўная школа 1-й ступені (у 1923 г. 50 вучняў). У 1923 г. створаны фельчарскі пункт. З 1924 г. цэнтр сельсавета. У 1925 г. адкрыта хата-чытальня і сельскагаспадарчая школа з трохгадовым тэрмінам навучання (у 1926 г. 74 вучні). У 1926 г. існавалі з назвай Карытнае пасёлак (17 двароў, 82 жыхары) і вёска (73 двары, 293 жыхары). У Вялікую Айчынную вайну гітлераўцы разрабавалі вёску, спалілі 15 двароў, загубілі 8 мірных жыхароў, у т.л. першага старшыню калгаса П.Л.Доўгага. У 1967 г. да вёскі далучаны пасёлак Карытнае. У 2001 г. 195 двароў, 496 жыхароў, рамонтна-механічныя майстэрні, магазін, аддзяленне сувязі, філіял Беларусбанка, аўтаматычная тэлефонная станцыя, амбулаторыя, аптэка, сярэдняя школа, дзіцячы сад, Дом культуры, дзіцячая музычная школа, ветэрынарны пункт, бібліятэка, грамадская лазня.

У 1975 г. на брацкай магіле савецкіх воінаў, якія загінулі у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, пастаўлены помнік. Захавалася частка памешчыцкай сядзібы Вайніловічаў — парк пейзажнага тыпу.

КОХАНАЎКА, вёска, у калгасе «Карытнае», за 15 км ад Асіповіч, за 12 км ад чыгуначнай станцыі Татарка.

Вядома з XIX ст. Паводле перапісу 1897 г., урочышча Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета, 1 двор, 8 жыхароў. У пачатку XX ст. засценак. У 1917 г. існавалі 2 паселішчы з назвай Коханаўка: фальварак (1 двор, 15 жыхароў) і хутар (4 двары, 30 жыхароў). У 1967 г. да вёскі далучаны пасёлак Білоб. У 2001 г. 28 двароў, 46 жыхароў.

КРАСНІК, былая вёска ў Карытненскім сельсавеце, за 17 км ад Асіповіч, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Ясень.

У 1897 г. пасёлак Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета, 8 двароў, 62 жыхары. У 1940 г. вёска, 25 двароў, 126 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну (чэрвень 1944 г.) гітлераўцы спалілі 21 двор. У 1999 г. 1 двор, 1 жыхар.

СТАРОЕ СЯЛО, вёска, у калгасе «Карытнае», за 13 км ад Асіповіч, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Татарка, на шашы Асіповічы — Глуша.

У пачатку XX ст. засценак у Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета, 19 двароў, 93 жыхары. У 1917 г. таксама вядома як засценак, 18 двароў, 93 жыхары. У 1926 г. вёска, 18 двароў, 83 жыхары. У 2001 г. 14 двароў, 21 жыхар.

СТАРОНКА, былая вёска ў Карытненскім сельсавеце, за 17 км ад Асіповіч, за 8 км ад чыгуначнай станцыі Татарка.

У 1926 г. 24 двары, 114 жыхароў. У 1940 г. 36 двароў, 168 жыхароў. У 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 101 жыхара. Пасля вайны вёска не адрадзілася. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».

СУХЛАВА, вёска, у калгасе «Карытнае». У 2001 г. 12 двароў, 13 жыхароў.

ТАРАСАВІЧЫ, вёска, у калгасе «Карытнае», за 18 км ад Асіповіч, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Ясень, на шашы Асіповічы — Глуша.

Вядома з XVIII ст. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, з 1795 г. у Бабруйскім павеце Мінскай губерні. У 1797 г. належала Дамініку Радзівілу. У 1818 г. пабудавана праваслаўная царква. У 1847 г. 21 двор, 147 жыхароў, памешчыцкая ўласнасць. У 1897 г. вёска ў Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета, 49 двароў, 351 жыхар. Працаваў хлебазапасны магазін. Побач знаходзілася сядзіба Тарасавічы (2 двары, 48 жыхароў). Дзейнічаў паравы млын.

У 1917 г. існавалі побач вёскі Тарасавічы (72 двары, 443 жыхары) і Новыя Тарасавічы (66 двароў, 383 жыхары). Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі адкрыта працоўная школа 1-й ступені (у 1925 г. 50 вучняў) і хата-чытальня. У 1926 г. існавалі побач вёскі Старыя Тарасавічы (83 двары, 355 жыхароў) і Новыя Тарасавічы (58 двароў, 298 жыхароў). У 1929 г. адкрыта хата-чытальня. У Вялікую Айчынную вайну гітлераўцы абрабавалі вёску, спалілі 42 двары і знішчылі 136 мірных жыхароў. У 1967 г. Старыя і Новыя Тарасавічы аб'яднаны ў вёску Тарасавічы. У 2001 г. 53 двары, 82 жыхары.

У 1967 г. на брацкай магіле савецкіх ваеннапалонных, расстраляных нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1942 г., пастаўлены помнік.

УБАЛАЦЦЕ, вёска, у калгасе «Карытнае», за 18 км ад Асіповіч, за 9 км ад чыгуначнай станцыі Ясень, каля вытокаў ракі Ваўчанкі.

Вядома з XVIII ст. У 1797 г. вёска, уласнасць Дамініка Радзівіла. У 1818 г. пабудавана праваслаўная царква. У 1847 г. 21 двор, 147 жыхароў. У 1897 г. у Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета, 29 двароў, 293 жыхары. У пачатку XX ст. 51 двор, 456 жыхароў. У 1917 г. 58 двароў, 373 жыхары. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі створана працоўная школа 1-й ступені (у 1926 г. 50 вучняў). У 1926 г. побач існавалі з назвай Убалацце вёска (63 двары, 352 жыхары) і пасёлак (8 двароў, 39 жыхароў). У 2001 г. 25 двароў, 46 жыхароў.

ШЫПЫ, былая вёска ў Карытненскім сельсавеце, за 20 км ад Асіповіч, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Ясень.

Вядома з XIX ст. У пачатку XX ст. пасёлак у Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета, 13 двароў, 120 жыхароў. У 1917 г. вядомы як засценак, 12 двароў, 89 жыхароў. У 1926 г. вёска, 21 двор, 111 жыхароў.

У 2001 г. 1 двор, 2 жыхары.

ЛАПІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

АЗЯРЫШЧА, вёска, у калгасе «Чырвоны ўдарнік», за 13 км ад Асіповіч, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Лапічы.

Вядома з XIX ст. У 1897 г. вёска ў Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета Мінскай губерні, 25 двароў, 156 жыхароў. У 1917 г. 37 двароў, 189 жыхароў. У 1926 г. 44 двары, 234 жыхары.

У 2001 г. 27 двароў, 40 жыхароў. Каля вёскі, у лесе, на левым беразе Асіповіцкага вадасховішча, ёсць археалагічны помнік — курганны могільнік (130 насыпаў).

БРАДОК, вёска, у калгасе «Бальшавік», за 18 км ад Асіповіч, за 2 км ад чыгуначнай станцыі Лапічы.

Узнікла ў 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях. У 1940 г. 10 гаспадарак, 43 жыхары. У 2001 г. 5 двароў, 7 жыхароў.

ВЕСЯЛОВА, былая вёска ў Лапіцкім сельсавеце. Размяшчалася за 30 км ад Асіповіч, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Уборак.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ў вёсцы было 15 двароў, 72 жыхары. У маі 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 60 яе жыхароў. Пасля вайны не адрадзілася. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе Хатынь.

ВЯЛІКАЯ ГРАВА, вёска, у калгасе «Чырвоны ўдарнік», за 16 км ад Асіповіч, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Лапічы, на рацэ Граўка.

Вядома з 1560 г. як сяло Грава Свіслацкай воласці Мінскіх павета і ваяводства ВКЛ, 28 гаспадарак, з'яўлялася дзяржаўнай уласнасцю. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, вёска, з 1795 г. у Ігуменскім павеце Мінскай губерні. У 1897 г. у Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 91 двор, 542 жыхары. Дзейнічала царква. Побач знаходзілася аднайменная сядзіба з вадзяным млынам, 4 жыхары. У пачатку XX ст. 109 двароў, 693 жыхары. У 1917 г. упамінаецца пад назвай Вялікая Грава, 120 двароў, 691 жыхар. У 1926 г. 135 двароў, 684 жыхары, дзейнічала працоўная школа 1-й ступені (63 вучні). У 2001 г. 77 двароў, 142 жыхары, магазін.

ВЯРБІЛАВА, вёска, у калгасе «Бальшавік», за 18 км ад Асіповіч, за 1 км ад чыгуначнай станцыі Лапічы.

Заснавана ў 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях. У 1940 г. 18 двароў, 90 жыхароў. У студзені 1943 г. гітлераўцы спалілі вёску і знішчылі 45 яе жыхароў. У 2001 г. 16 двароў, 30 жыхароў.

ГОМАНАЎКА, вёска, у калгасе «Бальшавік», за 23 км ад Асіповіч, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Лапічы.

Вядома з XVIII ст. У 1760 г. засценак Гоманаўка ўваходзіў у склад дзяржаўнага маёнтка Лапічы. У 1793 г. вёска, далучана да Расійскай імперыі, з 1795 г. у Ігуменскім павеце. У 1884 г. адкрыта школа царкоўнай граматы. У 1897 г. у Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 24 двары, 165 жыхароў. У 1917 г. 40 двароў, 240 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі адкрыта працоўная школа 1-й ступені (37 вучняў у 1926 г.). У 1926 г. 37 двароў, 187 жыхароў. У студзені 1943 г. гітлераўцы спалілі вёску і знішчылі 19 мірных жыхароў. У 2001 г. 2 двары, 2 жыхары.

ДУБРАЎКА, вёска, у калгасе «Бальшавік», за 20 км ад Асіповіч, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Лапічы.

Вядома з пачатку XX ст. У 1917 г. хутар Дубраўка Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 1 двор, 5 жыхароў. У 1967 г. з Дубраўкай аб'яднана сумежная вёска Восава. У 2001 г. 12 двароў, 21 жыхар.

ДУБРОВА, вёска, у калгасе «Чырвоны ўдарнік», за 17 км ад Асіповіч, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Уборак, на левым беразе ракі Граўка.

У пачатку XX ст. вядома як фальварак Дуброва Пагарэльскай воласці Ігуменскага

павета, 1 двор, 15 жыхароў, уласнасць А.Радзівіла. У 1917 г. фальварак, 1 двор, 20 жыхароў. Побач знаходзіліся лясніцтва і пейзажны парк плошчай 1,5 га (закладзены ў 1909 г.). На тэрыторыі парка расло больш за 100 відаў парод дрэў і кустоў, прывезеных з розных краін і кантынентаў свету. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі парк быў нацыяналізаваны і пераўтвораны ў Жорнаўскую лясную вопытную станцыю. У 1967 г. да Дубровы далучаны сумежны пасёлак Жорнаўка і вёска Восава. У 2001 г. 37 двароў, 101 жыхар, магазін, дзяржаўная лесагаспадарчая ўстанова «Жорнаўская эксперыментальная лясная база Інстытута лесу НАН Беларусі».

ЖОРНАЎКА, вёска, цэнтр калгаса «Чырвоны ўдарнік», за 18 км ад Асіповіч, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Уборак, на шашы Лапічы — Градзянка.

Старажытнае паселішча. Па пісьмовых крыніцах вядома з 1560 г. як прыватнае сяло Жорнаўка Свіслацкай воласці Мінскіх павета і ваяводства ВКЛ. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, з 1795 г. у Ігуменскім павеце Мінскай губерні. У 1827 г. сяло, памешчыцкая ўласнасць. У 1884 г. адкрыта школа граматы (у 1890 г. 15 вучняў). У 1897 г. сяло Жорнаўка Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 34 двары, 247 жыхароў. Дзейнічала царква. Побач знаходзіўся маёнтак Жорнаўка, 1 двор, 57 жыхароў. У пачатку XX ст. вёска, 42 двары, 278 жыхароў, працавалі царква і земскае народнае вучылішча (з 1907 г.); фальварак Жорнаўка (1 двор, 82 жыхары). У 1917 г. вёска, 49 двароў, 347 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа 1-й ступені (у 1923 г. 41 вучань). У 1926 г. 60 двароў, 336 жыхароў, адкрыта лесатэхнічная школа-трохгодка, у якую прымаліся навучэнцы з сямігадовай адукацыяй. З 1927 г. працуе метэаралагічная станцыя. У 1967 г. да Жорнаўкі далучаны вёскі Чырвоная Ніва, Падбор'е, Падбярэззе і Заброддзе.

У 2001 г. 135 двароў, 438 жыхароў, лясніцтва, рамонтныя майстэрні, магазін, аўтаматычная тэлэфонная станцыя, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, дзіцячы сад, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка.

У 1973 г. у гонар дружбы народаў СССР пастаўлены помнік.

ЖУКАЎКА, вёска, у калгасе «Бальшавік», за 20 км ад Асіповіч, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Уборак.

Па пісьмовых крыніцах вядома з XVIII ст. У 1760 г. упамінаецца як засценак у складзе маёнтка Лапічы Рэчы Паспалітай, 4 двары. З 1793 г. у Расійскай імперыі. З 1795 г. у Ігуменскім павеце Мінскай губерні. У 1897 г. засценак Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 14 двароў, 51 жыхар. У пачатку XX ст. вёска, 13 двароў, 78 жыхароў. У 1926 г. 27 двароў, 166 жыхароў. У 2001 г. 9 двароў, 10 жыхароў.

ЗОРКА, вёска, у калгасе «Чырвоны ўдарнік», за 19 км ад Асіповіч, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Уборак, на шашы Лапічы — Градзянка.

Узнікла ў 1922 г. на землях былога памешчыцкага маёнтка «Жорнаўка». У 1940 г. 18 двароў, 82 жыхары. У 2001 г. 6 двароў, 10 жыхароў.

КРЫЧАВЕЦ, вёска, у калгасе «Чырвоны ўдарнік», за 21 км ад Асіповіч, за 2 км ад чыгуначнай станцыі Уборак.

У старажытных дакументах упамінаецца як засценак. У пачатку XX ст. засценак Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 5 двароў, 58 жыхароў. У 1917 г. 11 двароў, 62 жыхары. У 2001 г. 11 двароў, 18 жыхароў.

ЛАПІЧЫ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Бальшавік», за 17 км ад Асіповіч, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Лапічы, на беразе Асіповіцкага вадасховішча.

Па пісьмовых крыніцах Лапічы вядомы з 1560 г. як дзяржаўнае сяло Свіслацкай воласці Мінскіх павета і ваяводства ВКЛ, 39 гаспадарак. У 1717 г. памешчыцкая ўласнасць. У 1768 г. цэнтр маёнтка Лапічы, 31 двор. У 1841 г. упамінаецца як вёска, уласнасць памешчыка Незабытоўскага. У 1856 г. адкрыта народнае вучылішча. У 1861 г. мястэчка Лапічы, 60 гаспадарак, 396 жыхароў. У 1868 г. пабудавана драўляная царква. У пачатку 1880-х гадоў 62 двары, 254 жыхары. Дзейнічалі заезны двор, 3 лаўкі, раз у год праводзіўся кірмаш. У 1891 г. у народным вучылішчы вучылася 6 дзяўчынак і 35 хлопчыкаў. У 1893 г. заснавана мукамольна-крупяное прадпрыемства з паравым рухавіком.

У 1897 г. мястэчка Лапічы Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 114 двароў, 20 дробных лавак, 4 піцейныя дамы, віннагарэлачны склад. Побач з мястэчкам

знаходзілася сяло Лапічы, 108 двароў, 672 жыхары, народнае вучылішча, царква, хлебазапасны магазін. Непадалёку знаходзіліся аднайменныя вадзяны млын (6 жыхароў), маёнтак (15 жыхароў) і выселак (8 жыхароў).

У пачатку XX ст. дзейнічалі народнае вучылішча (настаўніца — Алена Баркоўская), царкоўна-прыходская школа і лясніцтва. У 1913 г. адкрыта паштова-тэлеграфнае аддзяленне. У 1917 г. з назвай Лапічы побач існавалі мястэчка (113 двароў, 809 жыхароў, з іх 743 яўрэі, 63 беларусы, 3 палякі) і сяло (120 двароў, 854 жыхары, усе беларусы).

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе народнага вучылішча створана працоўная школа 1-й ступені (для яе ў 1927 г. пабудаваны новы будынак), 2 хаты-чытальні. У 1925 г. пачаў працаваць гонтавы завод. У 1926 г. у мястэчку Лапічы 107 двароў, 824 жыхары, у сяле Лапічы 160 двароў, 807 жыхароў. У 1927—1928 г. заснавана шавецкая майстэрня, пачалі працаваць радзільны дом і грамадская лазня.

У 1942 г. партызаны разграмілі размешчаны ў Лапічах нямецка-фашысцкі гарнізон. Акупанты разрабавалі вёску і загубілі 819 мірных жыхароў. Пры вызваленні вёскі 30 чэрвеня 1944 г. вызначыўся камандзір гарматы старшы сяржант С.П.Уласенка, які пасмяротна атрымаў званне Героя Савецкага Саюза. Пасля вайны ў Лапічах існаваў дзіцячы дом. У 1967 г. з вёскай аб'яднаны суседнія вёскі Зарэчча і Прытыка, пасёлкі Лапічы 1-я, Лапічы 2-я.

У 2001 г. 364 двары, 968 жыхароў, рамонтна-механічныя майстэрні, лесапільня, станцыя падземнага захавання прыроднага газу, лясніцтва, бальніца, аптэка, дзіцячы сад, аддзяленні сувязі і Беларусбанка, аўтаматычная тэлефонная станцыя, 3 магазіны, Дом быту, Дом культуры, бібліятэка, дзіцячы санаторый «Лапічы».

На паўднёвай ускраіне вёскі размешчаны археалагічны помнік — гарадзішча ранняга жалезнага веку.

У 1975 г. на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан, на магіле ахвяр фашызму, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, пастаўлены помнікі.

ЛАПІЧЫ, чыгуначная станцыя на лініі Верайцы — Градзянка, за 18 км ад Асіповіч.

Заснавана ў 1911 г. на тэрыторыі дзяржаўнай лясной дачы ў сувязі з будаўніцтвам чыгуначнай веткі Верайцы — Градзянка. Першым начальнікам станцыі быў Яўген Златавярхоўнікаў. У 1921 г. 20 двароў, 81 жыхар. У 1940 г. 20 двароў, 90 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну станцыя была спалена гітлераўскімі карнікамі. У 2001 г. 44 двары, 104 жыхары, магазін.

ЛОЧЫН, вёска, у калгасе «Чырвоны ўдарнік», за 27 км ад Асіповіч, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Уборак на лініі Верайцы—Градзянка, на беразе Лочынскага возера.

Вядомы з пачатку XIX ст. як вёска і маёнтак Лочын Ігуменскага павета. У 1820 г. Лочын і Сёмкава Слабада былі прададзены харунжым Бабруйскага павета Ігнасем Есьманам барону Якубу фон Офенбергу. У 1887 г. адкрыта школа царкоўнай граматы. У 1897 г. вёска Лочын Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 30 двароў, 205 жыхароў. Дзейнічалі хлебазапасны магазін і царква. Побач знаходзіўся аднайменны памешчыцкі маёнтак, 30 жыхароў. У 1899 г. заснаваны лесапільнае, мукамольнае і крухмальнае прадпрыемствы. У пачатку XX ст. у вёсцы 38 двароў, 364 жыхары, у маёнтку 38 жыхароў. У 1917 г. у вёсцы 39 двароў, 242 жыхары, у маёнтку Лочын 64 жыхары. У 1926 г. 41 двор, 191 жыхар. У 1924 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені (у 1926 г. 100 вучняў). У 1940 г. 77 двароў, 436 жыхароў. У маі 1943 г. вёска была спалена гітлераўцамі, знішчана больш за 200 мірных жыхароў. У 1967 г. да Лочына далучана вёска Віктараўка. У 2001 г. 19 двароў, 37 жыхароў. У 1976 г. на брацкай магіле ахвяр фашызму пастаўлены помнік.

МАЛАЯ ГРАВА, вёска, у калгасе «Чырвоны ўдарнік», за 16 км ад Асіповіч, за 3,5 км ад чыгуначнай станцыі Лапічы, на рацэ Граўка.

Вядома з XIX ст. У 1897 г. вёска Малаграўка Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета Мінскай губерні, 53 двары, 341 жыхар. Дзейнічала царква. У пачатку XX ст. в. Малая Грава, 68 двароў, 460 жыхароў. У 1917 г. 59 двароў, 360 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі створана працоўная школа 1-й ступені. У 1940 г. 106 двароў, 424 жыхары. У 2001 г. 57 двароў, 127 жыхароў, магазін.

ПАЛЯДДЗЁ, вёска, у калгасе «Бальшавік», за 19 км ад Асіповіч, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Лапічы.

Заснавана ў 1920-я гады як пасёлак. У 1940 г. вёска, 18 двароў, 59 жыхароў. У 2001 г. 3 двары, 3 жыхары.

РАЖЫШЧА, вёска, у калгасе «Чырвоны ўдарнік», за 25 км ад Асіповіч, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Лапічы.

Вядома з XIX ст. У 1897 г. вёска Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 8 гаспадарак, 64 жыхары. Побач знаходзіўся аднайменны маёнтак, 1 двор, 7 жыхароў. У 1917 г. побач размяшчаліся з назвай Ражышча вёска (8 двароў, 44 жыхары), хутар Ражышча 1-е (3 двары, 27 жыхароў), Ражышча 2-е (1 двор, 5 жыхароў). У 1940 г. вёска, 30 двароў, 130 жыхароў. У студзені 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі вёску і загубілі 50 мірных жыхароў. У 2001 г. 6 двароў, 6 жыхароў.

РУЧАЙ, вёска, у калгасе «Бальшавік», за 18 км ад Асіповіч, за 1 км ад чыгуначнай станцыі Лапічы.

Заснавана ў 1920-я гады на колішняй памешчыцкай зямлі. У 1940 г. 66 двароў, 324 жыхары. У 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі часткова спалілі вёску і знішчылі 63 мірныя жыхары. У 1967 г. да Ручая далучаны вёскі Папоўка, Цалянка, Цалянская Слабада. Непадалёку ад вёскі знаходзіцца радовішча пяскоў. У 2001 г. 103 жыхары, 221 жыхар. Лапіцкая сярэдняя школа.

САСНОВЫ, пасёлак, за 17 км ад Асіповіч, за 1 км ад чыгуначнай станцыі Лапічы, на шашы Мінск — Бабруйск.

Заснаваны ў 1966 г. У 1967 г. да Сасновага далучаны пасёлак лесазавода і раз'езд 9 км. У 2001 г. 135 двароў, 277 жыхароў, аўтаматычная тэлефонная станцыя, аддзяленне сувязі, магазін, дзіцячы сад, аптэка, клуб, бібліятэка.

У 1967 г. на магіле ахвяр фашызму, у 1968 г. на брацкай магіле савецкіх воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, пастаўлены помнікі.

СЛАБОДКА, вёска, у калгасе «Чырвоны ўдарнік», за 3 км ад чыгуначнай станцыі Уборак.

Першапачаткова называлася Сёмкава (Сямёнава) Слабада, магчыма таму, што першым яе ўладальнікам быў памешчык Сямён Шышчын (пазней валодалі Валовічы, Завішы і Офербергі). У 1897 г. ваколіца Сёмкава Слабада Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета Мінскай губерні, 25 двароў, 197 жыхароў. У пачатку XX ст. таксама ваколіца, 25 двароў, 310 жыхароў, у 1917 г. 45 двароў, 218 жыхароў. У 1920 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені (у 1926 г. 56 вучняў). У 2001 г. 17 двароў, 42 жыхары.

ТРОІЦКАЯ, вёска, у калгасе «Бальшавік», за 17 км ад Асіповіч, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Лапічы.

Вядома з пачатку XX ст. У 1917 г. вёска вядома пад назвай Троіцкая Слабада, 39 двароў, 205 жыхароў. У 1926 г. 37 двароў, 250 жыхароў. У 2001 г. 28 двароў, 54 жыхары.

УБОРАК, вёска, у калгасе «Чырвоны ўдарнік», за 2 км ад чыгуначнай станцыі Уборак.

Вядома з XIX ст. У 1836 г. ваколіца Уборак належала памешчыкам Гараўскім. Да адмены прыгоннага права ў ваколіцы жыла сям'я Карпуся Крыўцова. У 1897 г. сядзіба Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 1 двор, 10 жыхароў, працаваў ветраны млын. У пачатку XX ст. упамінаецца як ваколіца, 32 двары, 318 жыхароў. У 1926 г. таксама мела статус ваколіцы, 52 двары, 243 жыхары. У 1940 г. 46 двароў, 165 жыхароў. У 2001 г. 16 двароў, 23 жыхары.

У 1957 г. на брацкай магіле савецкіх воінаў і ахвяр фашызму пастаўлены помнік.

УБОРАК, чыгуначная станцыя на лініі Верайцы — Градзянка, за 22 км ад Асіповіч.

Заснаваны ў 1911 г. як рабочы пасёлак перапрацоўшчыкаў і пагрузчыкаў лесу і рабочых па абслугоўванні станцыі. Першым начальнікам станцыі быў Уладзімір Музычэнка-Цыбульскі. У 1917 г. у Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета Мінскай губерні, 3 двары, 16 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі адкрыта працоўная школа 1-й ступені (у 1926 г. 46 вучняў). У 1926 г. 29 двароў, 130 жыхароў. У 2001 г. 9 двароў, 13 жыхароў.

ЯЛЦОЎКА, вёска, у калгасе «Бальшавік», за 17 км ад Асіповіч, за 2 км ад чыгуначнай станцыі Лапічы.

Заснавана ў 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях. У 1940 г. 36 двароў, 215 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну нямецка-фашысцкія захопнікі часткова

спалілі вёску. У 1967 г. да Ялцоўкі далучана вёска Курган. У 2001 г. 43 двары, 90 жыхароў.

ЯМПАЛЬ, вёска, у калгасе «Чырвоны ўдарнік», за 28 км ад Асіповіч, за 4 км на паўднёвы захад ад чыгуначнай станцыі Уборак.

Вядома з XX ст. У 1897 г. засценак Ямпаль Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 1 двор, 16 жыхароў. У 1917 г. 7 двароў, 46 жыхароў. У 1926 г. вёска, 12 двароў, 51 жыхар. У 2001 г. 1 двор, 1 жыхар.

ЛІПЕНЬСКІ СЕЛЬСАВЕТ

БОЗАК, вёска, у калгасе «Чырвоны сцяг», за 22 км ад Асіповіч, за 8 км ад чыгуначнай станцыі Градзянка.

Вядома з XIX ст. У 1884 г. адкрыта школа царкоўнай граматы. У 1897 г. вёска Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 53 двары, 324 жыхары, царква, вадзяны млын. Побач знаходзіліся аднайменны засценак (4 двары, 30 жыхароў); лясная старожка (1 двор, 5 жыхароў); карчма (1 двор, 7 жыхароў). У 1917 г. у вёсцы 83 двары, 459 жыхароў, у старожцы 2 двары, 19 жыхароў, засценак пераўтварыўся ў ваколіцу, 4 двары, 24 жыхары. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі адкрыта працоўная школа 1-й ступені, для якой у 1927 г. быў зроблены спецыяльны будынак. У 1925 г. у школе вучылася 47 дзяцей. У 1940 г. 103 двары, 521 жыхар. 9.5.1944 г. гітлераўцы спалілі вёску і знішчылі 496 яе жыхароў. У 2001 г. 28 двароў, 57 жыхароў.

У 1980 г. на магіле ахвяр фашызму пастаўлены помнік, адна з устаноўленых пліт прысвечана памяці землякоў — воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

БРЫЦАЛАВІЧЫ, вёска, у калектыўна-долевай гаспадарцы «Ліпень». За 3 км ад чыгуначнай станцыі Брыцалавічы.

Вядома з 1513 г. як дзяржаўнае сяло Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага. У 1560 г. 24 двары. У 1689 г. уваходзіла ў склад маёнтка Свіслач Мінскага павета. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі. З 1795 г. у Бабруйскім павеце Мінскай губерні. У сярэдзіне XIX ст. вёска, цэнтр аднайменнага маёнтка. У 1897 г. 57 дамоў, 343 жыхары. Працавалі лесапільны завод, царква, хлебазапасны магазін. Побач знаходзілася сядзіба Брыцалавічы. У 1908 г. адкрыта царкоўна-прыходская школа. У 1917 г. у вёсцы 55 двароў, 349 жыхароў. У 1918 г. тут адкрыта працоўная школа 1-й ступені, у 1922 г. створаны бібліятэка і сельскагаспадарчае таварыства «Сноп». У 1923 г. да вёскі быў прырэзаны вялікі ўчастак з дзяржаўнага фонду, на якім пабудавалі сядзібы колішнія парабкі і беднякі. У 1924 г. пачала працаваць хата-чытальня. У 1940 г. 144 двары, 753 жыхары. 13.1.1943 г. гітлераўскія карнікі спалілі вёску і знішчылі 676 яе жыхароў. У 2001 г. 24 двары, 35 жыхароў.

У 1971 г. узведзены мемарыяльны комплекс на ўшанаванне памяці 676 жыхароў вёскі, загубленых акупантамі, і 44 савецкіх воінаў і партызан, што загінулі ў баях у 1943—1944 гг. На ўсходняй ускраіне вёскі, на правым беразе р. Свіслач, ёсць курганны могільнік дрыгавічоў (XI—XII ст).

ВЯЗАЎНІЦА, вёска, цэнтр калгаса «Чырвоны сцяг», за 21 км ад Асіповіч, за 11 км ад чыгуначнай станцыі Брыцалавічы на правым беразе р. Ботча.

Вядома з XVI ст. як сяло ў Мінскім ваяводстве Вялікага княства Літоўскага. У 1594 г. уваходзіла ў склад памешчыцкага маёнтка Жыцін, 28 жыхароў мужчынскага полу. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, з 1795 г. у Ігуменскім павеце Мінскай губерні. У 1897 г. сяло Вязаўніца Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 75 двароў, 423 жыхары, пачатковая школа (з 1884), сукнавальня, вадзяны млын, хлебазапасны магазін. У 1917 г. адначасова існавалі вёска Вязаўніца (96 двароў, 57 жыхароў); маёнтак Вязаўніца (57 жыхароў); калонія Вязаўніца (6 двароў, 20 жыхароў). У 1922 г. створана працоўная школа 1-й ступені (у 1924 г. 40 вучняў).

У 2001 г. 144 двары, 373 жыхары. На тэрыторыі вёскі знаходзяцца калгасная сядзіба, гаспадарчы двор, рамонтна-механічныя майстэрні, млын, няпоўная сярэдняя школа, комплексна-прыёмны пункт бытавога абслугоўвання, дзіцячы сад, бібліятэка, Дом культуры, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін. Радзіма Героя Савецкага Саюза Я.М.Стэльмаха.

ЗНАМЕНКА (да 1964 г. Кабылянка), вёска, у калектыўна-долевай гаспадарцы «Ліпень», за 19 км ад Асіповіч, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Брыцалавічы, на шашы Асіповічы — Свіслач.

Вядома з XIX ст. як вёска Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета. У 1814 г. пабудавана праваслаўная царква. У сярэдзіне XIX ст. вёска належала памешчыкам Есманам. У 1879 г. тут працавалі царква і царкоўна-прыходская школа. У 1897 г. 38 двароў, 292 жыхары. У 1917 г. 54 двары, 328 жыхароў, дзейнічала народнае вучылішча. У час акупацыі вёска была часткова спалена гітлераўцамі. У 2001 г. 32 двары, 65 жыхароў.

ІГНАТОЎКА, вёска, у калектыўна-долевай гаспадарцы «Ліпень», за 15 км ад Асіповіч, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Брыцалавічы.

Паводле юрыдычных актаў 1639 г. з назвай Ігнатоўка тут былі ўрочышча і засценак, якія ўваходзілі ў Бабруйскае староства Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, з 1795 г. у Ігуменскім павеце Мінскай губерні. У 1808 г. вядома як сяло, памешчыцкая ўласнасць, 15 двароў, 51 жыхар. У 1889 г. адкрыта школа царкоўнай граматы (у 1890 г. 15 вучняў). У 1897 г. сяло Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 39 двароў, 283 жыхары. У пачатку XX ст. 48 двароў, 361 жыхар. У 1925 г. да вёскі далучаны вялікі ўчастак былой памешчыцкай зямлі, на якім пабудавалі сядзібы колішнія парабкі і беднякі. У 1926 г. 56 двароў, 392 жыхары. У канцы 1930-х гадоў у Ігнатоўку перасяліліся жыхары хутароў Барок, Каменка, Красналенск, Калінінск. У Вялікую Айчынную вайну ў баях за Радзіму загінулі 52 вяскоўцы. У вёсцы дзейнічала антыфашысцкая падпольная група. У 2001 г. 34 двары, 50 жыхароў.

ЛАПКОВІЦА, вёска, у калгасе «Чырвоны сцяг», за 22 км ад Асіповіч, за 12 км ад чыгуначнай станцыі Ялізава.

Заснавана ў 1923 г. як пасёлак на былых памешчыцкіх землях. У 1940 г. 18 двароў, 76 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну акупанты часткова спалілі вёску (7 двароў), абрабавалі яе жыхароў. У 2001 г. 12 двароў, 27 жыхароў.

ЛІПЕНЬ, вёска, цэнтр сельсавета і калектыўна-долевай гаспадаркі «Ліпень», за 16 км ад Асіповіч, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Брыцалавічы, на шашы Асіповічы – Свіслач.

Першапачатковая назва Халуі (Халуй). З ліпеня 1920 г. у гонар вызвалення ад польскіх інтэрвентаў перайменавана ў Ліпень.

Вядома з сярэдзіны XVII ст. У 1637 г. упамінаецца як прыватнае сяло Мінскіх павета і ваяводства Вялікага княства Літоўскага. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, мястэчка, з 1795 г. у Ігуменскім павеце Мінскай губерні, уласнасць памешчыкаў Незабытоўскіх. У 1861 г. мястэчка таксама належала Незабытоўскім, працавалі праваслаўная царква і малітоўная школа. У 1885 г. пабудавана новая царква з дрэва. У 1897 г. мястэчка Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 57 двароў, 563 жыхары. Дзейнічалі царква, народнае вучылішча, пітны дом, 7 крам, малітоўны дом. Побач з мястэчкам знаходзіўся аднайменны маёнтак, 115 жыхароў. У пачатку XX ст. пабудаваны лесапільны завод і

Будынак былога бровара ў в. Вязаўніца.

млын. У 1917 г. у мястэчку 24 двары, 568 жыхароў, у маёнтку 119 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі адкрыта працоўная школа 1-й ступені. У 1926 г. 98 двароў, 690 жыхароў, дзейнічалі лесапільны завод, кузня, млын. У 1939 г. створана Ліпеньская МТС. У час акупацыі ў Ліпені дзейнічала падпольная група, якую ўзначальвалі М.У.Кунько і М.П.Гоцін. У канцы 1941 г. гітлераўцы спалілі вёску. У 1967 г. з Ліпенем аб'яднаны суседнія вёскі Крынічкі, Новае Жыццё, Акоп, Тодараў Кут, Стараселле, Валадарск.

У 2001 г. 387 двароў, 933 жыхары, лясніцтва, сярэдняя школа, дрэваапрацоўчы цэх лясгаса, бальніца, аптэка, бібліятэка, Дом культуры, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, 3 магазіны.

У 1975 г. пастаўлены помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў баях у 1941—1944 гг. На будынку школы ўстаноўлены 2 мемарыяльныя дошкі. Адна — на ўшанаванне памяці былой вучаніцы, партызанкі Р.У.Кунько, якая загінула ў баі 1.7.1944 г. Другая — на ўшанаванне памяці партызан брыгады «За Радзіму» А.К.Бабіча, П.Л.Валькова, А.А.Рошчына, Ц.А.Сюбарава, Ц.А.Фокіна, якія загінулі ў няроўным баі з гітлераўцамі 26.11.1942 г. у вёсцы Ліпень.

Каля вёскі, ва ўрочышчы Стараселле, ёсць археалагічны помнік — селішча банцараўскай культуры (VI—VIII ст.), эпохі Кіеўскай Русі (X—XIII ст.).

МАЛІНАЎКА, вёска, у калгасе «Чырвоны сцяг», за 21 км ад Асіповіч, за 12 км на паўночны захад ад чыгуначнай станцыі Ялізава.

Заснавана ў 1923 г. У 1940 г. 27 двароў, 124 жыхары. У 2001 г. 26 двароў, 50 жыхароў.

У 1970 г. пастаўлены помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў баях у 1941 і 1944 гг.

НЯЧЧО, вёска, у калектыўна-долевай гаспадарцы «Ліпень», за 14 км ад Асіповіч, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Брыцалавічы.

У 1897 г. вядома як фальварак Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 1 двор, 26 жыхароў. У 1926 г. пасёлак, 17 двароў, 68 жыхароў. У 1967 г. да Няччо долучана вёска Падзіра. У 2001 г. 2 двары, 2 жыхары.

На тэрыторыі вёскі знаходзіцца археалагічны помнік — курганны могільнік, які мае 9 насыпаў. Належаў дрыгавічам.

ПАСЕКІ, вёска, у калгасе «Чырвоны сцяг», за 24 км ад Асіповіч, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Градзянка.

Узнікла ў 1920-я гады як хутар. У 1926 г. 3 двары, 15 жыхароў. У 1940 г. 23 двары, 69 жыхароў. У 2001 г. 12 двароў, 18 жыхароў.

РАФАЛІН, вёска, у калгасе «Чырвоны сцяг», за 23 км ад Асіповіч, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Ялізава.

Паводле перапісу 1897 г. фальварак Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 1 двор, 19 жыхароў. У 1917 г. памешчыцкі маёнтак, 1 двор, 98 жыхароў. У 1926 г. пасёлак, 26 двароў, 119 жыхароў. У 2001 г. 29 двароў, 35 жыхароў.

СЕМІРОВІЧЫ, вёска, у калгасе «Чырвоны сцяг», за 23 км ад Асіповіч, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Ялізава.

З пісьмовых крыніц вядома з XVI ст. У 1560 г. упамінаецца як сяло Серамавічы, шляхецкая ўласнасць. У 1640 г. сяло ў складзе маёнтка Вязаўніца Мінскіх павета і ваяводства Вялікага княства Літоўскага, таксама шляхецкая ўласнасць. У 1793 г. далучана да Расійскай імперыі, з 1795 г. у складзе Ігуменскага павета Мінскай губерні. У 1897 г. вёска Семіровічы (яна ж Серамавічы) Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 4 двары, 31 жыхар. Побач знаходзіўся аднайменны засценак, 11 двароў, 57 жыхароў. У пачатку XX ст. у вёсцы 11 двароў, 81 жыхар, у засценку 5 двароў, 41 жыхар. У 1926 г. вёска, 27 двароў, 128 жыхароў. У 2001 г. 19 двароў, 35 жыхароў.

УСЦІЖ, вёска, у калектыўна-долевай гаспадарцы «Ліпень», за 14 км ад Асіповіч, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Брыцалавічы, на правым беразе р. Свіслач.

Па пісьмовых крыніцах вядома з XIX ст. У 1848 г. вёска ў казённым маёнтку Брыцалавічы. Паводле перапісу 1897 г. вёска Свіслацкай воласці Бабруйскага павета, 14 двароў, 103 жыхары, дзейнічала царква. У пачатку XX ст. 17 двароў, 168 жыхароў. У 1926 г. 35 двароў, 179 жыхароў. У 1940 г. 78 двароў, 207 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну ў баях за Радзіму загінула 15 вяскоўцаў. У час акупацыі вёска спалена гітлераўскім карным атрадам. У 2001 г. 34 двары, 491 жыхар.

Каля вёскі два археалагічныя помнікі — селішча (адносіцца да 1-га тысяча-

годдзя) і курганны могільнік (мае 2 насыпы, належаў дрыгавічам).

ХІМНОЕ, вёска, у калектыўна-долевай гаспадарцы «Ліпень», за 14 км ад Асіповіч, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Брыцалавічы.

Па пісьмовых крыніцах вядома з XVII ст. У 1637 г. вёска ў складзе прыватнага маёнтка Халуй Мінскіх павета і ваяводства Вялікага княства Літоўскага. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, з 1795 г. у Ігуменскім павеце Мінскай губерні. У 1885 г. адкрыта школа царкоўнай граматы. У 1890 г. у школе вучылася 19 хлопчыкаў і 5 дзяўчынак. У 1897 г. вёска Хімное Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 48 двароў, 358 жыхароў. Дзейнічалі царква, школа царкоўнай граматы, карчма, хлебазапасны магазін. У 1917 г. 77 двароў, 445 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі створана працоўная школа 1-й ступені. У 1926 г. да вёскі далучаны вялікі зямельны ўчастак, на якім пабудавалі сядзібы маладыя сялянскія сем'і. У 1926 г. 75 двароў, 380 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі 46 двароў. Супраць акупантаў дзейнічала падпольная група. У 2001 г. 21 двор, 28 жыхароў.

Паблізу вёскі ёсць археалагічны помнік — курганны могільнік, які мае 5 курганоў.

ПАГАРЭЛЬСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АМІНАВІЧЫ, вёска, у калгасе «Камунар», за 20 км ад Асіповіч, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Уборак на лініі Верайцы — Градзянка, каля шашы Лапічы — Градзянка.

Вядомы з XVII ст. Упамінаюцца ў 1614 г. як вёска ў складзе прыватнага маёнтка Жыцін Мінскіх павета і ваяводства Рэчы Паспалітай. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, вёска, з 1795 г. у Ігуменскім павеце Мінскай губерні. У сярэдзіне XIX ст. уласнасць Вітгенштэйнаў. У 1897 г. вёска Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета Мінскай губерні, 39 двароў, 266 жыхароў. Працавалі хлебазапасны магазін і царква. Паблізу вёскі знаходзіўся аднайменны засценак, 11 двароў, 87 жыхароў. У пачатку XX ст. 48 двароў, 377 жыхароў, у засценку 12 двароў, 101 жыхар. У 1917 г. у вёсцы 88 двароў, 501 жыхар, у засценку 9 двароў, 51 жыхар. У 1926 г. вёска, 94 двары, 457 жыхароў. У гады Вялікай Айчыннай вайны супраць акупантаў дзейнічала падпольная група. Карнікі абрабавалі вёску, спалілі 12 двароў. У 2001 г. 43 двары, 90 жыхароў.

У 1981 г. пастаўлены помнік ураджэнцу вёскі Герою Савецкага Саюза М.П.Каралёву.

ГРАДЗЯНЕЦ, вёска, у калгасе «Камунар», за 29 км ад Асіповіч, за 1 км ад чыгуначнай станцыі Градзянка.

Заснавана ў 1920-я гады на былых памешчыцкіх землях колішнімі парабкамі і беднякамі. У 1940 г. 26 двароў, 117 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну ў баях за Радзіму загінула 5 вяскоўцаў. У час акупацыі вёска была часткова спалена гітлераўцамі, загінулі 24 мірныя жыхары. У 2001 г. 23 двары, 52 жыхары.

ЛАЗОВАЕ, вёска, у калгасе «Камунар», за 4 км на поўдзень ад чыгуначнай станцыі Градзянка, за 24 км ад Асіповіч, на шашы Лапічы — Градзянка.

Упамінаецца ў юрыдычных актах 1639 г. як урочышча ў Бабруйскім старостве Мінскага ваяводства Рэчы Паспалітай. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, вёска, з 1795 г. у Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета Мінскай губерні. У 1884 г. адкрыта школа царкоўнай граматы (у 1890 г. 12 вучняў, усе хлопчыкі). У 1897 г. 46 двароў, 325 жыхароў. Дзейнічала царква. Побач з вёскай знаходзілася памешчыцкая сядзіба Лазовае, 1 двор, 6 жыхароў. У пачатку XX ст. 56 двароў, 378 жыхароў. Побач з вёскай знаходзіўся смалакурны завод. У 1917 г. 88 двароў, 495 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі адкрыта працоўная школа 1-й ступені. У 1926 г. 93 двары, 402 жыхары. У 1940 г. 94 двары, 237 жыхароў. У час фашысцкай акупацыі жыхары Лазовага падтрымлівалі цесныя сувязі з атрадамі 1-й Асіповіцкай партызанскай брыгады, за што ў маі 1944 г. гітлераўцы спалілі вёску. У 2001 г. 27 двароў, 60 жыхароў.

У 1975 г. створаны мемарыяльны комплекс за 14 км ад вёскі ва ўрочышчы Расоха на месцы базіравання Асіповіцкіх падпольных райкомаў КП(б)Б і ЛКСМБ і Асіповіцкай ваенна-аператыўнай групы. У 1977 г. пастаўлены помнік на магіле 79 жыхароў в. Палядкі, якіх у маі 1944 г. спалілі разам з вёскай (41 двор) нямецка-фашысцкія захопнікі.

МАКАЎЕ, былая вёска ў Пагарэльскім сельсавеце. Размяшчалася за 32 км ад

Асіповіч, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Градзянка.

9.1.1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску разам з жыхарамі. Згарэла 48 двароў, загінула 229 чалавек. Вёска не адрадзілася. У 1968 г. на яе месцы пастаўлены абеліск. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе Хатынь.

ПАГАРЭЛАЕ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Камунар», за 21 км ад Асіповіч, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Уборак, на шашы Лапічы — Градзянка.

Вядома з сярэдзіны XVII ст. Упамінаецца ў юрыдычных актах 1639 г. як урочышча Пагарэлае, уваходзіла ў склад Бабруйскага староства Мінскага ваяводства Рэчы Паспалітай. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, сяло, з 1795 г. у Ігуменскім павеце Мінскай губерні. У 1886 г. цэнтр воласці і праваслаўнага прыхода Ігуменскага павета, 39 двароў, 360 жыхароў, 2 кірмашы на год, царква, народнае вучылішча. У 1897 г. 81 двор, 460 жыхароў, дзейнічалі ветраны млын, царква, піцейны дом, народнае вучылішча, царкоўна-прыходская школа. У пачатку XX ст. 92 двары, 570 жыхароў. Побач знаходзіўся фальварак Пагарэлае, 24 жыхары. У 1917 г. у сяле 135 двароў, 737 жыхароў, у фальварку Пагарэлае 11 жыхароў. У час грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі дзейнічаў валасны рэўком. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі адкрыты працоўная школа 1-й ступені, хата-чытальня. З 1924 г. цэнтр сельсавета. У 1940 г. 129 двароў, 645 жыхароў. У час акупацыі ў наваколлі вёскі дзейнічалі партызанскія атрады 1-й Асіповіцкай партызанскай брыгады, а ў Пагарэлым — падпольная група. У канцы 1941 г. партызаны знішчылі размешчаны

ў вёсцы нямецка-фашысцкі гарнізон. У лютым 1942 г. гітлераўскія карнікі спалілі Пагарэлае.

У 2001 г. 134 двары, 378 жыхароў, рамонтна-механічныя майстэрні, бібліятэка, млын, ветэрынарны пункт, школа, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, клуб, магазін.

У 1969 г. пастаўлены помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях у 1944 г.

ПАЛЯДКІ, былая вёска ў Пагарэльскім сельсавеце. Размяшчалася за 6 км ад чыгуначнай станцыі Уборак.

У 1926 г. пасёлак, 27 двароў, 106 жыхароў. У 1940 г. вёска, 41 двор, 159 жыхароў. У маі 1944 г. нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 79 жыхароў. Пасля вайны была адноўлена. Не існуе з 1983 г. — выбылі жыхары.

ЦАЛЯНСКАЯ БУДА, былая вёска ў Пагарэльскім сельсавеце. Размяшчалася за 4 км ад чыгуначнай станцыі Лапічы. Паселішча было заснавана сярод лесу, дзе знаходзілася невялікая старожка (будка). Заснавалі ўраджэнцы вёскі Цэль, таму яно і атрымала такую назву. У 1897 г. засценак Цалянская Буда Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 6 двароў, 59 жыхароў. У 1926 г. вядома як хутары Цалянская Буда, 17 двароў, 87 жыхароў. Перад Вялікай Айчыннай вайной вёска, 23 двары, 115 жыхароў. Зараз не існуе.

ПРАТАСЕВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЕРАЙЦЫ, вёска і чыгуначная станцыя, за 11 км ад Асіповіч.

Узніклі ў 1911 г. у час будоўлі чыгуначнай лініі Верайцы — Градзянка. У пачатку XX ст. станцыя і прыстанцыйны пасёлак у Замошскай воласці Бабруйскага павета. На станцыі меліся 2 двары, 15 жыхароў, у пасёлку 11 двароў, 52 жыхары. З адкрыццём чыгуначнай лініі Верайцы — Градзянка стала вузлавой станцыяй — штогод праз яе адпраўлялася 500 тысяч пудоў лесаматэрыялаў. Працаваў смалакурны завод. У 1917 г. на станцыі 68 двароў, 231 жыхар, у пасёлку 13 двароў, 68 жыхароў. У 2001 г. 138 двароў, 312 жыхароў, 3 крамы, аддзяленне сувязі, бібліятэка, сярэдняя школа, лазня.

У 1975 г. пастаўлены абеліск і стэла на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызана, якія загінулі ў баях з гітлераўцамі ў 1941—1944 гг. Сярод пахаваных Герой Савецкага Саюза М.Р.Абросімаў.

ВЕРХІ, вёска, у сельскагаспадарчым прадпрыемстве «Пратасевічы», за 14 км ад Асіповіч, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Верайцы.

Упершыню ўпамінаюцца ў юрыдычных актах 1639 г. як урочышча Бабруйскага староства Рэчыцкага павета Вялікага княства Літоўскага. З 1793 г. у Расійскай імперыі, вёска Замошскай воласці, Бабруйскага павета. У 1917 г. 26 двароў, 171 жыхар. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі адкрыта працоўная школа 1-й ступені. У 1926 г. хутары Вярхі, 47 двароў, 219 жыхароў. У 2001 г. 11 двароў, 19 жыхароў.

У 1974 г. пастаўлены помнік на магіле невядомага салдата. За 3 км ад Вярхоў на аднайменным прыпыначным пункце ў 1977 г. пастаўлены помнік на магіле партызанкі Соф'і Васільеўны Змачынскай, якая загінула ў 1943 г. у няроўным баі з акупантамі.

ДРАЖНЯ, вёска, у сельскагаспадарчым прадпрыемстве «Пратасевічы», за 12 км ад Асіповіч, за 2 км ад чыгуначнай станцыі Верайцы.

Вядома з XVIII ст. як вёска Дражня Бабруйскага павета Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага, уласнасць магнатаў Радзівілаў. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, з 1795 г. у Бабруйскім павеце Мінскай губерні. У 1847 г. 50 двароў, 338 жыхароў, уласнасць князёў Вітгенштэйнаў. У 1897 г. у Жыцінскай воласці Бабруйскага павета, 103 двары, 600 жыхароў. Працавала карчма і хлебазапасны магазін. На пачатку XX ст. існавалі 2 вёскі: Старая Дражня (19 двароў, 71 жыхар) і Новая Дражня (18 двароў, 123 жыхары). Абедзве вёскі ўваходзілі ў Замошскую воласць Бабруйскага павета. У 1917 г. у Старой Дражні 13 двароў, 86 жыхароў, у Новай Дражні 25 двароў, 146 жыхароў. У 1923 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені (у 1926 г. 94 вучні). У 1940 г. Старая Дражня і Новая Дражня аб'ядналіся ў адну вёску Дражня. У 2001 г. 34 двары, 82 жыхары, клуб, фельчарска-акушэрскі пункт.

ДУБАВОЕ, вёска, у сельскагаспадарчым прадпрыемстве «Пратасевічы». У 2000 г. 8 двароў, 12 жыхароў.

ЗАБАЛАЦЦЕ, вёска, у сельскагаспадарчым прадпрыемстве «Пратасевічы», за 4 км ад Асіповіч.

Вядома з XIX ст. У 1840 г. вёска Замошскай воласці Бабруйскага павета ў складзе прыватнага маёнтка «Пратасевічы», уласнасць князёў Вітгенштэйнаў. У 1897 г. 36 двароў, 244 жыхары. У 1917 г. 69 двароў, 387 жыхароў. У 1926 г. 81 двор, 381 жыхар.

У 2001 г. 116 двароў, 367 жыхароў, сядзіба сельскагаспадарчага прадпрыемства «Пратасевічы», аўтаматычная тэлефонная станцыя, лазня, дзіцячая музычная школа.

У 1951 г. пастаўлены абеліск на магіле партызанкі П.Т.Казлоўскай.

ПАБОКАВІЧЫ, вёска, у сельскагаспадарчым прадпрыемстве «Пратасевічы», за 11 км ад Асіповіч, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Дзераўцы, на шашы Асіповічы — Шышчыцы.

Вядома з XIX ст. У 1838 г. упамінаецца як урочышча Пабокавічы Бабруйскага павета, 13 рэвізскіх душ, уласнасць князёў Вітгенштэйнаў. У 1897 г. засценак Пабокавічы Жыцінскай воласці Бабруйскага павета, 15 двароў, 75 жыхароў. У 1917 г. вёска, 45 двароў, 249 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі адкрыта працоўная школа 1-й ступені (у 1926 г. 45 вучняў). У 1940 г. 63 двары, 378 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну ў кастрычніку 1943 г. вёска была спалена за сувязь з партызанамі. У 2001 г. 4 двары, 6 жыхароў.

ПАПЛАВЫ, вёска, у сельскагаспадарчым прадпрыемстве «Пратасевічы», за 8 км ад Асіповіч, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Дзераўцы, на шашы Асіповічы — Шышчыцы.

Упамінаецца ў юрыдычных актах 1639 г., адносілася да Бабруйскага староства Рэчыцкага павета Вялікага княства Літоўскага. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, з 1795 г. у Бабруйскім павеце Мінскай губерні. У пачатку XX ст. вёска Замошскай воласці Бабруйскага павета, 34 двары, 218 жыхароў. У 1917 г. 33 двары, 257 жыхароў. У 1940 г. 51 двор, 208 жыхароў. У 2001 г. 53 двары, 134 жыхары, клуб, крама.

ПЕРАРОЖКІ, вёска, у сельскагаспадарчым прадпрыемстве «Пратасевічы», за 12 км ад Асіповіч, за 2,5 км ад чыгуначнай станцыі Верайцы.

Вядома з пачатку XX ст. як вёска Замошскай воласці Бабруйскага павета, 11 двароў, 62 жыхары. У 1917 г. 29 двароў, 122 жыхары. У 1926 г. 25 двароў, 130 жыхароў. У 2001 г. 22 двары, 44 жыхары.

У 1977 г. на вясковых могілках пастаўлены помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1944 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў.

ПРАТАСЕВІЧЫ, вёска, у сельскагаспадарчым прадпрыемстве «Пратасевічы», цэнтр сельсавета, за 5 км ад Асіповіч.

Вядома з XVI ст. У 1513 г. упамінаецца як сяло Свіслацкай воласці Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага. У 1793 г. далучана да Расійскай імперыі. З 1795 г. у Бабруйскім павеце Мінскай губерні. На 1797 г. прыватнае сяло, 71 жыхар мужчынскага полу. Належала Радзівілам. У 1838 г. цэнтр маёнтка «Пратасевічы», 74 рэвізскія душы, уласнасць князёў Вітгенштэйнаў. У 1897 г. вёска Замошскай воласці Бабруйскага павета, 54 двары, 365 жыхароў, хлебазапасны магазін, царква. Побач існаваў маёнтак з той жа назвай, 15 жыхароў. У пачатку XX ст. 97 двароў, 513 жыхароў. У 1903 г. адкрыта народнае вучылішча. У 1917 г. 110 двароў, 678 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе народнага вучылішча створана працоўная школа 1-й ступені (у 1925 г. 77 вучняў). У 1926 г. 141 двор, 693 жыхары. У 1927 г. пабудавана памяшканне новай школы (існуе і зараз). У 1940 г. да вёскі далучаны пас. Балычоўшчына. З 1964 г. цэнтр сельсавета.

У 2001 г. 160 двароў, 413 жыхароў, фельчарска-акушэрскі пункт, сярэдняя школа, дзіцячы сад, бібліятэка, Дом культуры, магазін.

ПРАТАСЕВІЧЫ 2-я, вёска, у сельскагаспадарчым прадпрыемстве «Пратасевічы», за 4 км ад Асіповіч, на шашы Асіповічы — Шышчыцы.

У пачатку XX ст. вёска Замошскай воласці Бабруйскага павета, 6 двароў, 49 жыхароў. У 1917 г. 9 двароў, 83 жыхары. У 1926 г. 16 двароў, 66 жыхароў. У 2001 г. 9 двароў, 16 жыхароў.

ЦЭЛЬ, вёска, у сельскагаспадарчым прадпрыемстве «Пратасевічы», за 5 км ад чыгуначнай станцыі Лапічы, на шашы Мінск — Бабруйск.

Вядома з 1560 г. як дзяржаўнае сяло Свіслацкай воласці Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага, 24 двары. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі. З 1795 г.

уваходзіла ў Ігуменскі павет Мінскай губерні. У 1884 г. адкрыта школа царкоўнай граматы (у 1890 г. вучылася 12 хлопчыкаў). У 1897 г. у Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета, 34 двары, 329 жыхароў, царква, хлебазапасны магазін. У пачатку XX ст. вёска, 62 двары, 353 жыхары, працавала лясніцтва. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі створана працоўная школа 1-й ступені (у 1926 г. 47 вучняў). У 1926 г. 82 двары, 384 жыхары. У 2001 г. 56 двароў, 80 жыхароў, лясніцтва, 2 крамы, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, сярэдняя школа, бібліятэка, клуб.

У 1974 г. пастаўлены помнікі на магілах савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941 г. За 0,5 км на поўнач ад вёскі ў 1974 г. пастаўлена стэла ў гонар савецкіх воінаў-пераможцаў у Вялікай Айчыннай вайне. На ўсходняй ускраіне вёскі знаходзіцца археалагічны помнік — селішча ранняга жалезнага веку (I ст. да н.э. — II ст. н.э.) і эпохі Кіеўскай Русі (XI—XIII ст.).

СВІСЛАЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

БАРАНЦЫ, вёска, у калгасе «Усход», за 21 км ад Асіповіч, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Брыцалавічы, на шашы Асіповічы — Свіслач.

Па пісьмовых крыніцах вядома з XIX ст. У 1897 г. урочышча Баранцы Пагарэльскай воласці Ігуменскага павета Мінскай губерні, 2 двары, 22 жыхары. У 1917 г. 1 двор, 10 жыхароў. У 1926 г. на месцы сучаснай вёскі пад назвай Баранцы існавалі хутар і два пасёлкі, у якіх разам было 47 двароў, 217 жыхароў. У 1967 г. пасёлкі Баранцы 1-я і Баранцы 2-я аб'ядналіся ў адзін населены пункт — вёску Баранцы. У 2001 г. 1 двор, 1 жыхар.

БУДА, вёска, у калгасе «Беларусь», за 25 км ад Асіповіч, за 12 км ад чыгуначнай станцыі Ялізава.

У пачатку XX ст. вядома як фальварак Свіслацкай воласці Бабруйскага павета, 1 двор, 46 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі фальварак пераўтвораны ў пасёлак. У 1940 г. вёска, 18 двароў, 48 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну ў студзені 1943 г. гітлераўцы спалілі вёску. У 2001 г. 5 двароў, 9 жыхароў.

ВУГЛАТА, вёска, у калгасе «Усход», за 25 км ад Асіповіч, за 2 км ад чыгуначнай станцыі Ялізава.

У сярэдзіне XIX ст. вёска, уласнасць памешчыкаў Незабытоўскіх. У 1897 г. вёска Свіслацкай воласці Бабруйскага павета, 11 двароў, 74 жыхары. У 1917 г. 13 двароў, 65 жыхароў. У 1926 г. 30 гаспадарак, 123 жыхары. У 2001 г. 79 двароў, 145 жыхароў, магазін.

У 1975 г. пастаўлены помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў 1941—1944 гг. У 1984 г. пастаўлены помнік на брацкай магіле чырвонаармейцаў, якія загінулі ў 1920 г. у барацьбе супраць польскіх інтэрвентаў.

ВЯЗЫЧЫН, вёска, у калгасе «Усход», за 23 км ад Асіповіч, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Ялізава.

У сярэдзіне XIX ст. вёска Свіслацкай воласці Бабруйскага павета, уласнасць памешчыкаў Незабытоўскіх. У 1847 г. 14 двароў, 82 жыхары. У 1886 г. адкрыта школа царкоўнай граматы (у 1890 г. вучылася 15 хлопчыкаў). У 1897 г. у вёсцы 44 двары, 284 жыхары. Побач знаходзіўся фальварак Вязычын, 1 двор, 52 жыхары. У 1906 г. заснаваны вінакурны завод. У 1917 г. у вёсцы 59 двароў, 399 жыхароў, у фальварку 136 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі створана працоўная школа 1-й ступені (у 1926 г. 84 вучні). У 1923 г. да вёскі далучаны вялікі ўчастак былой памешчыцкай зямлі, на якім пабудавалі сядзібы колішнія парабкі і беднякі. У 1926 г. у вёсцы 53 гаспадаркі, 273 жыхары. У 1967 г. з Вязычынам аб'яднана суседняя вёска Прудзішча. У 2001 г. 71 двор, 140 жыхароў.

У 1974 г. пастаўлены помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан, якія ў 1941—1944 гг. загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

ГАЛЫНКА, вёска, у калгасе «Беларусь», за 28 км ад Асіповіч, за 11 км ад чыгуначнай станцыі Ясень, на правым беразе ракі Бярэзіна.

Па пісьмовых крыніцах вядома з XIX ст. У 1802 г. вёска Свіслацкай воласці Бабруйскага павета, дзейнічала царква. У 1847 г. вёска ў складзе памешчыцкага маёнтка Дурынічы той жа воласці. У 1863 г. тут пабудавана новая царква з дрэва. У 1897 г. сяло, 28 двароў, 191 жыхар, царква, дзяржаўная вінная лаўка. У 1906 г. адкрыта народнае вучылішча. У 1909 г. сяло, 20 двароў, 160 жыхароў. Пасля рэвалюцыі народнае вучылішча было пераўтворана ў

працоўную школу 1-й ступені (у 1925 г. 68 вучняў). У 2001 г. 50 двароў, 48 жыхароў, магазін.

Паблізу вёскі знаходзіцца археалагічны помнік — курганны могільнік, які мае 10 насыпаў.

КОПЧА, вёска, у калгасе «Беларусь», за 25 км ад Асіповіч, за 11 км ад чыгуначнай станцыі Ясень.

Вядома з XIX ст. як вёска Свіслацкай воласці Бабруйскага павета. У 1838 г. 33 рэвізскія душы, уласнасць памешчыка Забелы. У 1897 г. 22 двары, 139 жыхароў. У 1917 г. 21 двор, 124 жыхары. У 1940 г. 41 двор, 167 жыхароў. У 2001 г. 31 двор, 57 жыхароў.

КРАСНАЕ, вёска, цэнтр калгаса «Беларусь», за 27 км ад Асіповіч, за 8 км ад чыгуначнай станцыі Ялізава, на правым беразе ракі Бярэзіна.

Вядома з XIX ст. У 1897 г. хутар Краснае Гарадоцкай воласці Бабруйскага павета, 1 двор, 6 жыхароў. У 1909 г. урочышча, 1 двор, 8 жыхароў. У 1967 г. да Краснага далучана суседняя вёска Рыдлё, а ў 1976 г. — Кассё, у 1985 г. — Максімаўка.

У 2001 г. 175 двароў, 354 жыхары, фельчарска-акушэрскі пункт, аўтаматычная тэлефонная станцыя, аддзяленне сувязі, праўленне калгаса, комплексны прыёмны пункт, Дом ветэранаў, Дом культуры, бібліятэка, базавая школа, дзіцячы сад, 2 магазіны.

У 1969 г. пастаўлены помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан. Недалёка ад вёскі знаходзіцца археалагічны помнік — стаянка каменнага веку.

НАВАСЁЛКІ, вёска, у калгасе «Усход», за 27 км ад Асіповіч, за 11 км ад чыгуначнай станцыі Ялізава.

Вядома з XVII ст. Упамінаецца ў 1640 г. як сяло ў складзе шляхецкага маёнтка Вязаўніца Мінскага ваяводства Рэчы Паспалітай. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, вёска, з 1795 г. у Ігуменскім павеце Мінскай губерні. У 1897 г. 48 двароў, 294 жыхары. У 1917 г. 71 двор, 417 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі адкрылася працоўная школа 1-й ступені (у 1926 г. 57 вучняў). У 1923 г. да вёскі далучаны вялікі ўчастак былой памешчыцкай зямлі, на якім пабудавалі сядзібы былыя парабкі і беднякі. У 1926 г. 75 двароў, 367 жыхароў. У 1967 г. да Навасёлкаў далучана вёска Падзіра. У 2001 г. 68 двароў, 121 жыхар, магазін.

За 3 км ад вёскі, на правым беразе р. Бярэзіна, знаходзіцца археалагічны помнік — гарадзішча.

ПАЛІЦКАЕ, вёска, у калгасе «Усход», за 27 км ад Асіповіч, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Ялізава.

Заснавана ў 1923 г. на былых памешчыцкіх землях колішнімі парабкамі і беднякамі. У 1940 г. пасёлак, 12 двароў, 56 жыхароў. У 2001 г. 8 двароў, 13 жыхароў.

За 1,5 км ад вёскі было выяўлена гарадзішча культуры штрыхаванай керамікі (II ст. да н.э. — I ст. н.э.).

СВІСЛАЧ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Усход», за 26 км ад Асіповіч, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Ялізава, на шашы Градзянка — Сычкава, каля вусця ракі Свіслач.

Назва ўтворана ад наймення ракі Свіслач. Гэта адзін з самых старажытных населеных пунктаў у сучасным Асіповіцкім раёне.

Вядома з XI ст. Адзначана ў знакамітым летапісным спісе «А се имена всим градом рускым, далним и ближним» (1396). У XII—XIV ст. горад быў цэнтрам удзельнага княства, да канца XVI ст. цэнтрам Свіслацкай воласці Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага. З XVII ст. уласнасць роду Гарабурдаў, з 1666 г. — Радзівілаў. У 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, мястэчка, з 1795 г. цэнтр Свіслацкай воласці Бабруйскага павета Мінскай губерні. У 1861 г. у мястэчку Свіслач 576 жыхароў. У 1863 г. адкрыта народнае вучылішча. У 1897 г. побач з мястэчкам існавала вёска Свіслач; агульная колькасць насельніцтва абодвух паселішчаў складала 1759 чалавек (з іх 530 сялян), усяго жылых пабудоў 266. Дзейнічалі 2 праваслаўныя царквы, 2 сінагогі, касцёл, паштова-тэлеграфнае аддзяленне, конная паштовая станцыя, заезны двор, хлебазапасны магазін, 23 крамы, рачная параходная прыстань, 4 разы на год праводзіўся кірмаш. Побач з мястэчкам знаходзіўся фальварак Свіслач, дзе ў 1899 г. былі заснаваны млын і крупадзёрка. У пачатку XX ст. у мястэчку 190 двароў, 1970 жыхароў. У 1917 г. у мястэчку 179 двароў і 1289 жыхароў, у вёсцы 166 двароў і 938 жыхароў, у маёнтку 135 жыхароў. У 1922 г. у Свіслацкай сямігадовай школе працавала 11 настаўнікаў, вучылася 301 дзіця. У 1923 г. адкрыта

бальніца. З 1924 г. цэнтр сельсавета. У 1926 г. 306 двароў, 1662 жыхары, бібліятэка, хата-чытальня, дзве пачатковыя і сямігадовая школы, размешчаныя ў былых панскіх будынках. У 1927 г. стала працаваць метэастанцыя. У 1933 г. адкрыты дзіцячыя яслі, працавалі хлебапякарня, завод фруктовых вод, кошыкавая, шорная, шавецкая і смалярная майстэрні. У 1934 г. праведзена радыёфікацыя. У 1940 г. 317 двароў, 1418 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну Свіслач панесла значныя страты: 12—14.10.1941 г. гітлераўцы знішчылі 791 мірнага жыхара, а ў чэрвені 1943 г. амаль цалкам спалілі вёску. Пасля вайны ў Свіслачы працаваў дзіцячы дом.

У 2001 г. 390 двароў, 820 жыхароў, рамонтна-механічныя майстэрні, млын, аўтаматычная тэлефонная станцыя, аддзяленне сувязі, сярэдняя школа, філіял Беларусбанка, 3 магазіны, дзіцячы сад, амбулаторыя, санаторый «Свіслач», аптэка, Дом культуры, комплексны прыёмны пункт.

Пастаўлены помнікі на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць гітлераўскіх захопнікаў у 1941—1944 гг. Сярод пахаваных Героі Савецкага Саюза М.І.Кліменка і Д.Ц.Леўчанка. На ўскраіне вёскі, на беразе ракі Свіслач, ёсць археалагічны помнік — гарадзішча з рэшткамі старажытнага замка.

СЛАБАДА, вёска, у калгасе «Усход», за 25 км ад Асіповіч, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Ялізава, на шашы Градзянка — Сычкава.

У 1940 г. 33 двары, 143 жыхары. У час Вялікай Айчыннай вайны ў 1943 г. вёска была спалена гітлераўцамі. У 2001 г. 65 двароў, 132 жыхары.

У 1974 г. пастаўлены помнікі на дзвюх брацкіх магілах савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941—1944 гг.

СТАЛЯРЫ, вёска, у калгасе «Беларусь», за 26 км ад Асіповіч, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Ялізава, на правым беразе ракі Бярэзіна.

Вядома з XIX ст. У 1897 г. вёска Сталяры (яна ж Вярбішча) Свіслацкай воласці Бабруйскага павета, 10 двароў, 69 жыхароў. У 1917 г. 15 двароў, 98 жыхароў. У час Вялікай Айчыннай вайны вёска была разрабавана і часткова (10 двароў) спалена гітлераўскімі карнікамі. У 2001 г. 20 двароў, 29 жыхароў.

ЧУЧЧА, вёска, у калгасе «Беларусь», за 25 км ад Асіповіч, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Ялізава, на шашы Градзянка — Сычкава.

У 1847 г. вёска ў складзе казённага маёнтка Брацалавічы Слуцкай воласці Бабруйскага павета, мелася 7 зямельных участкаў, дзейнічалі карчма і вадзяны млын на р. Свіслач. У 1897 г. 35 двароў, 243 жыхары. У пачатку XX ст. 41 двор, 307 жыхароў, праваслаўная царква, народнае вучылішча (адкрыта ў 1908 г.). У 1926 г. 72 двары, 380 жыхароў, працоўная школа 1-й ступені (50 вучняў). У 2001 г. 85 двароў, 152 жыхары.

У 1969 г. пастаўлены помнік на брацкай магіле партызан, якія загінулі ў баі 30.6.1943 г., — бюст воіна на пастаменце. На тэрыторыі вёскі знаходзяцца археалагічныя помнікі — гарадзішча і курганны могільнік.

ШЭЙПІЧЫ, вёска, у калгасе «Беларусь», за 23 км ад Асіповіч, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Ялізава.

Па пісьмовых крыніцах вядома з XVI ст. У 1560 г. упамінаецца як дзяржаўнае сяло Свіслацкай воласці Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага. У 1869 г. прыватнае сяло, якое ўваходзіла ў склад маёнтка Свіслач, належала Гарабурдам. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, з 1795 г. вёска Свіслацкай воласці Бабруйскага павета. У сярэдзіне 1830-х гг. 15 двароў, 100 жыхароў. У сярэдзіне XIX ст. належала памешчыкам Незабытоўскім. У 1897 г. 26 двароў, 196 жыхароў. Дзейнічала праваслаўная царква. У 1917 г. 42 двары, 282 жыхары. У 1926 г. 66 двароў, 312 жыхароў. У 2001 г. 65 двароў, 100 жыхароў.

ЯСЕНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АЛЯКСАНДРАЎКА, вёска, у калгасе імя Леніна, за 16 км ад Асіповіч, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Татарка, на шашы Мінск — Бабруйск.

У пачатку XX ст. вёска ў Замошскай воласці Бабруйскага павета, 12 двароў, 130 жыхароў. У 1917 г. 23 двары, 143 жыхары. У 1926 г. 28 двароў, 156 жыхароў. У 2001 г. 1 двор, 1 жыхар.

АСЯРОДАК, вёска, у калгасе імя Леніна, за 20 км ад Асіповіч, за 11 км ад чыгуначнай станцыі Ясень, на беразе р. Ваўчанка.

Вядома з XIX ст. У 1897 г. вёска Асяродак Свіслацкай воласці Бабруйскага павета, 46 двароў, 274 жыхары. Працавалі вінная лаўка і хлебазапасны магазін. У 1940 г. 154 двары, 616 жыхароў. У чэрвені 1941 г. нямецка-фашысцкія захопнікі амаль цалкам спалілі вёску і загубілі 27 яе мірных жыхароў. У 2001 г. 67 двароў, 113 жыхароў, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін.

ВАЙНІЛАВА, вёска, у калгасе імя Леніна, за 21 км ад Асіповіч, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Ясень.

Вядома з XIX ст. У 1897 г. урочышча Свіслацкай воласці Бабруйскага павета, 3 двары, 26 жыхароў. У пачатку XX ст. паселішча ўяўляла сабой хутар, 8 двароў, 47 жыхароў. У 2001 г. 22 двары, 32 жыхары.

ГРЫНЁЎКА, вёска, у калгасе імя Леніна, за 21 км ад Асіповіч, за 2 км ад чыгуначнай станцыі Ясень.

У пачатку XX ст. вёска Замошскай воласці Бабруйскага павета, 25 двароў, 156 жыхароў. У 1917 г. 32 двары, 219 жыхароў. У 1926 г. 41 двор, 241 жыхар. У 2001 г. 28 двароў, 51 жыхар.

ЖУРАВЕЦ, вёска, у калгасе імя Леніна, за 19 км ад Асіповіч, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Ясень.

Вядома з XIX ст. У 1897 г. пасёлак Замошскай воласці Бабруйскага павета, 4 двары, 26 жыхароў. У 1917 г. вёска, 10 двароў, 67 жыхароў. У 1926 г. 13 двароў, 70 жыхароў. У 2001 г. 6 двароў, 7 жыхароў.

ЗАЕЛЬНІК, вёска, у калгасе імя Леніна, за 20 км ад Асіповіч, за 11 км ад чыгуначнай станцыі Ясень. У 2001 г. 55 двароў, 102 жыхары.

ЗАЛЕССЕ, вёска, у калгасе імя Леніна, за 15 км ад Асіповіч, за 8 км ад чыгуначнай станцыі Ясень.

Заснавана ў 1920-я гады. У 1940 г. 26 двароў, 79 жыхароў. У студзені 1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі вёску і загубілі 15 яе мірных жыхароў.

У 2001 г. 8 двароў, 10 жыхароў. Радзіма Героя Сацыялістычнай Працы А.М.Гарбацэвіча, які трагічна загінуў у 1981 г. і пахаваны ў в. Ясень.

ЛЮЛЕВА, вёска, за 18 км ад Асіповіч, за 2 км ад чыгуначнай станцыі Ясень.

У пачатку XX ст. у Замошскай воласці Бабруйскага павета, 12 двароў, 81 жыхар. У 1917 г. 15 двароў, 122 жыхары. У 1926 г. 23 двары, 146 жыхароў. У 2001 г. 7 двароў, 11 жыхароў.

МАТАВІЛА, вёска, у калгасе імя Леніна, за 18 км ад Асіповіч, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Ясень.

Вядома з XIX ст. У 1858 г. вёска ў складзе казённага маёнтка Брыцалавічы Свіслацкай воласці Бабруйскага павета. У 1897 г. 6 двароў, 31 жыхар. У 1926 г. 20 двароў, 87 жыхароў. У 1947 г. да вёскі быў далучаны хутар Перадзіла. У 2001 г. 11 двароў, 34 жыхары.

РАЖНЕТАВА, вёска, у калгасе імя Леніна, за 16 км ад Асіповіч, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Татарка.

Вядома з XIX ст. У 1838 г. паселішча ўяўляла сабой засценак Бабруйскага павета, памешчыцкая ўласнасць, 18 рэвізскіх душ. У 1897 г. побач існавалі засценак Ражнетаў і фальварак Ражнетаў, якія ўваходзілі ў Замошскую воласць Бабруйскага павета. У пачатку XX ст. тут былі вёска Ражнетава (6 двароў, 36 жыхароў) і засценак Ражнетаў (12 двароў, 66 жыхароў). У 1917 г. засценкі Ражнетава 1-е (11 двароў, 109 жыхароў) і Ражнетава 2-е (8 двароў, 61 жыхар). У 1921 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені (у 1925 г. 45 вучняў). У 1926 г. засценкі Ражнетава 1-е (16 двароў, 97 жыхароў) і Ражнетава 2-е (9 двароў, 58 жыхароў). У 1967 г. вёскі Ражнетава 1-е і Ражнетава 2-е аб'яднаны ў адзін населены пункт Ражнетава. У 2001 г. 6 двароў, 7 жыхароў.

ТАТАРКАВІЧЫ, вёска, у калгасе імя Леніна, за 21 км ад Асіповіч, за 8 км ад чыгуначнай станцыі Ясень.

Вядома з XVI ст. У 1560 г. сяло Татаркавічы Свіслацкай воласці Мінскага ваяводства ВКЛ. У 1561 г. сяло Татаркаўшчына, у складзе памешчыцкага маёнтка Свіслач. У 1793 г. далучана да Расійскай імперыі, вёска, з 1795 г. у Свіслацкай воласці Бабруйскага павета Мінскай губерні. У 1847 г. у складзе казённага (дзяржаўнага) маёнтка Брыцалавічы, меліся карчма і вадзяны млын. У 1897 г. 30 двароў, 236 жыхароў. Дзейнічалі праваслаўная царква, хлебазапасны магазін, вінная лаўка. У 1913 г. адкрыта народнае вучылішча. У 1917 г. 43 двары, 277 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе народнага вучылішча створана працоўная школа 1-й ступені (у 1925 г. 143 вучні). У 1925 г. пры школе

працавала вячэрняя школа. У 1926 г. узведзены новы школьны будынак. У 1940 г. 83 двары, 259 жыхароў.

У 2001 г. 29 двароў, 39 жыхароў. На мясцовых могілках пахаваны партызаны Я.Б.Загароўскі, К.М.Мірановіч і невядомы партызан. У 1967 г. на магілах пастаўлены абеліск.

ЯСЕНЬ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса імя Леніна, за 19 км ад Асіповіч, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Ясень, на шашы Мінск — Бабруйск.

Вядома з XVI ст. У 1524 г. шляхецкае сяло. У 1579 г. была царква. У 1581 г. сяло ў складзе прыватнага маёнтка Глуск Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства ВКЛ. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, вёска, з 1795 г. у Бабруйскім павеце Мінскай губерні. У 1824 г. замест старажытнай пабудавана новая праваслаўная царква. У сярэдзіне XIX ст. вёска з'яўлялася ўласнасцю памешчыка Лойкі. У 1897 г. у Замошскай воласці Бабруйскага павета, 70 сялянскіх гаспадарак, 80 жылых пабудоў, 532 жыхары, працавалі царква, хлебазапасны магазін, вінная лаўка, млын (у 1898 г. устаноўлены паравы рухавік). Побач з вёскай знаходзілася аднайменная сядзіба (4 двары, 29 жыхароў). У 1907 г. адкрыта народнае вучылішча, у якім настаўнікам працаваў Фёдар Дубоўскі (1917 г.). У 1909 г. 83 двары, 565 жыхароў. У 1917 г. 89 двароў, 658 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе народнага вучылішча створана працоўная школа 1-й ступені (у 1926 г. 96 вучняў). У 1922 г. адкрыта хата-чытальня. У 1926 г. 131 двор, 654 жыхары. У 1927 г. пабудавана новае памяшканне для школы. У 1940 г. 120 двароў, 482 жыхары. У маі 1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі вёску і загубілі 11 яе мірных жыхароў. З 1954 г. цэнтр сельсавета.

У 2001 г. 182 двары, 469 жыхароў, рамонтна-механічныя майстэрні, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, два магазіны, участковая бальніца, млын, сярэдняя школа, дзіцячы сад, Дом культуры, бібліятэка.

Помнікі: на ўшанаванне памяці настаўнікаў і вучняў мясцовай школы, якія загінулі ў 1941—1945 гг. (1967 г.), на магіле савецкага лётчыка А.Баранава (загінуў у баі ў 1941 г.), на магіле Героя Сацыялістычнай Працы А.М.Гарбацэвіча (1982 г.). Каля вёскі знаходзіцца археалагічны помнік — курганны могільнік, які мае 20 насыпаў. Належаў дрыгавічам, адносіцца да XI—XIII стагоддзяў.

ЯСЕНЬ, рабочы пасёлак і чыгуначная станцыя на лініі Асіповічы — Бабруйск за 21 км ад Асіповіч.

Заснаваны ў канцы XIX ст. у сувязі з будаўніцтвам Лібава-Роменскай чыгункі. У 1894 г. пабудаваны паравы млын. У 1897 г. побач існавалі чыгуначная станцыя Ясень (4 двары, 50 жыхароў) і пасёлак Ясень (29 двароў, 167 жыхароў). Працавалі лесапільны завод, гандлёвая лаўка, заезны двор, паравы млын. У пачатку XX ст. на чыгуначнай станцыі 4 двары, 20 жыхароў, у пасёлку 70 двароў, 377 жыхароў. У 1917 г. на станцыі 5 двароў, 60 жыхароў, у пасёлку 99 двароў, 827 жыхароў. 24 студзеня 1918 г. каля будынка чыгуначнай станцыі Ясень адбыўся жорсткі бой паміж часцямі Чырвонай арміі і легіянерамі корпуса Доўбар-Мусніцкага. У 1923 г. у пасёлку адкрыты хата-чытальня і фельчарскі пункт. З 1924 г. цэнтр сельсавета. У 1930-я гады тут працавалі лесазавод, паравы млын, мэблевая і кравецкая майстэрні, торфапрадпрыемтва. У 1940 г. 180 двароў, 756 жыхароў. З 1954 г. мае статус рабочага пасёлка, цэнтр пасялковага Савета.

У 2001 г. 158 двароў, 304 жыхары. Ёсць кандытарскі цэх, філіял Бабруйскай мэблевай фабрыкі № 2, магазін, аддзяленне сувязі, фельчарска-акушэрскі пункт, бібліятэка, клуб.

На могілках знаходзяцца 2 брацкія магілы савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1944 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1967 г. на магілах пастаўлены стэла і абеліск.

ЯСЯНОЎКА, вёска, у калгасе імя Леніна, за 2 км ад чыгуначнай станцыі Ясень.

Вядома з XVII ст. У пачатку XX ст. хутар Ясяноўка Замошскай воласці Бабруйскага павета, 3 двары, 30 жыхароў. У 1917 г. побач існавалі вёска Ясяноўка (13 двароў, 100 жыхароў) і хутар Ясяноўка (4 двары, 31 жыхар). У 1926 г. вёска (10 двароў, 43 жыхары). У 2001 г. 9 двароў, 13 жыхароў.

Г.І.Дулеба, У.П.Зорын, Дз.В.Саўрыцкі.

СКАРАЧЭННІ, ПРЫНЯТЫЯ Ў КНІЗЕ «ПАМЯЦЬ»

в. (д.) —	вёска (деревня)
ВМП —	вышэйшая мера пакарання
вобл. (обл.) —	вобласць (область)
Воп. —	вопіс
г. —	год, горад
гл. —	глядзі
г.п. —	гарадскі пасёлак
гв. —	гвардзейскі
інш. —	іншыя
Л. —	ліст
лейт. —	лейтэнант
м. —	мястэчка
мал. (мл.) —	малодшы (младший)
МТС —	машынна-трактарная станцыя
н. (р.) —	нарадзіўся (родился)
нам. (зам.) —	намеснік (заместитель)
пам. —	памочнік
п/п —	палявая пошта
пас. —	пасёлак
ППЛ —	папраўча-працоўны лагер
р. —	рака
рад. (ряд.) —	радавы (рядовой)
р-н —	раён
с. —	сяло
С. —	старонка
сп —	стралковы полк
сд —	стралковая дывізія
Спр. —	справа
с/с —	сельсавет
ст. —	стагоддзе, старшы, станцыя
стралк. —	стралковы
сярж. (серж.) —	сяржант (сержант)
Т. —	том
Ф. —	фонд
яфр. (ефр.) —	яфрэйтар (ефрейтор)

Змест

Да чытача 17
Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Асіповіцкага раёна 19

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ — 1917 21
Зямля нашых продкаў 21
У складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай 49
У складзе Расійскай імперыі 63

1917 — 1941 103
На крутым павароце гісторыі 103

1941 — 1945 191
Ішла вайна народная 191
Ахвяры вайны 368

1945 — ДА НАШЫХ ДЗЁН 561
З матэрыяльнай і духоўнай спадчыны 652

Прадстаўнікі грамадскасці, якія прымалі ўдзел у пошуку і зборы матэрыялаў для кнігі «Памяць. Асіповіцкі раён»:

А.І.Арлоў, М Ф.Арлоўская, А.Дз.Астрашэўская, Т.С.Бароніна, А.А.Бурак, С.А.Голубева, Ф.І.Давыдаў, В.І.Дрозд, Г.І.Дулеба, Ю.І.Ільюцін, В.Г.Каханоўская, В.І.Кучаравы, М.І.Лашанкоў, У.І.Лемяшонак, Л.І.Майсеенка, М.М.Малаковіч, Т.А.Маркава, В.Ф.Налівайка, А.Я.Парфільева, Т.П.Пасмецьева, З.К.Пацкевіч, Г.Ф.Прыходзька, І.І.Пузына, В.У.Чупахін, У.У.Ціслёнак, В.В.Шыльцаў.

Супрацоўнікі выдавецкага цэнтра БЕЛТА, якія працавалі над кнігай:
Г.К.Кісялёў — галоўны рэдактар, Л.М.Драбовіч — намеснік галоўнага рэдактара, З.І.Малейка — вядучы рэдактар, В.І.Багдановіч, Л.І.Рудніцкая — рэдактары-стылісты.

Фота: А.П.Дрыбаса (каляровая ўклейка), Ю.І.Ільюціна, Дз.В.Саўрыцкага, з фондаў краязнаўчых музеяў раёна, архіваў раённай газеты і іншых устаноў, а таксама асабістых архіваў грамадзян.

Картограф А.І.Паўлянковіч.

Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Асіповіцкага раёна. — Мн.: БЕЛТА,
П15 2002. — 720 с.: іл.

ISBN 985-6302-36-6.

Кніга асвятляе багатую гісторыю Асіповіцкага краю ад старажытных часоў да нашых дзён. У хроніцы выкарыстаны дакументы і матэрыялы з архіўных, музейных і друкаваных крыніц, у яе ўключаны гістарычныя нарысы, артыкулы, успаміны і іншыя матэрыялы пра найбольш цікавыя падзеі ў жыцці Асіповіччыны, яе людзей.

Значная частка хронікі прысвечана падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Прыводзяцца спісы партызан, падпольшчыкаў, воінаў Чырвонай арміі, якія загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, мірных жыхароў — ахвяр фашысцкага тэрору.

Прыводзяцца таксама звесткі пра жыхароў раёна, якія сталі ахвярамі палітычных рэпрэсій і пазней былі рэабілітаваны. Асобны раздзел кнігі прысвечаны апісанню багатай матэрыяльнай і культурнай спадчыны Асіповіччыны, гісторыі яе населеных пунктаў.

Кніга будзе карыснай усім, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю.

ББК 63.3 (4 Беи)

Навукова-папулярнае выданне

ПАМЯЦЬ

Гісторыка-дакументальная хроніка Асіповіцкага раёна

Рэдактары:
Ю.У.Каршакова, У.І.Лемяшонак, А.Л.Петрашкевіч, Н.П.Ракіцкая, А.В.Скараход
Мастацкі рэдактар
А.В.Лапін
Тэхнічны рэдактар
А.І.Хомчанка
Карэктары:
Л.С.Зіза, А.П.Кірэева, В.М.Лапцева
Падрыхтоўка арыгінал-макета:
А.В.Маісеенка, М.Э.Малярэвіч
Камп'ютэрны набор:
А.В.Амельянчук, Н.В.Гаўрылава, В.В.Гонтзар, С.А.Долгая, А.Б.Малярэвіч, З.У.Марцінчык, Н.А.Пяткоўская

ISBN 985-6302-36-6

Выданне падрыхтавана выдавецкім цэнтрам БЕЛТА.
Падпісана да друку з арыгінал-макета 20.12.2001.
Фармат 70x100 1/16. Папера афсетная.
Гарнітура Кудрашоўская энцыклапедычная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 58,5. Ум. фарб.-адб. 65.
Ул.-выд. арк. 69. Тыраж 3000 экз. Заказ 3129.
Падатковая льгота — Агульнадзяржаўны класіфікатар Рэспублікі Беларусь АКРБ 007-98, ч. 1; 22.11.20.600.
Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Беларускае тэлеграфнае агенцтва» (УП«БЕЛТА»).
Ліцэнзія ЛВ № 60 ад 29.11.1997.
Рэспубліка Беларусь. 220030, Мінск, вул. Кірава, 26.
Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Мінская фабрыка каляровага друку».
220024, Мінск, вул. Каржанеўскага, 20.